ARCHE Зьмест № 4’1999 ПАТАЛЁГІІ ГРАМАДЗТВА

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE 4(5)-99. Ад рэдакцыі: "...Ці мусім мы гаварыць аб паталёгіях, аб хваробах, тым самым як бы адводзячы ім законнае месца? Паталёгіі вывучаюць для таго, каб вылечыць, г.зн. прывесьці да нормы. Ведама ж — калі не лячыцца, дык можна памерці. Паталёгія грамадзтва — гэта адхіленьне ад нормы. Калі разглядаць грамадзтва, як жывы арганізм, дык не спраўджаецца сьцьверджаньне, быццам норма — гэта быць як усе ці як большасьць, бо гэтая большасьць можа быць хворая..."
3. ARCHE 4(5)-99. Грамадзтва граху. Павал Севярынец. "...Віншую, мы ўсёй грамадою ў трансе. Мы падаўляючай большасьцю і не здагадваемся пра мэты, задачы й чаканыя вынікі існаваньня свайго бялковага цела..."
4. ARCHE 4(5)-99. Па старонках беларускіх часопісаў. Алена Казлова."...Выдрукаваць гэтыя проста ўнікальныя па сваім псыхаэмацыйным тоне публікацыі змусіла нас не хваравітая прага пакпіць з наіўнасьці гаротных людзей ці пасьмяяцца зь вясёлых калямбураў, а вялікі боль спачуваньня ў душы..."
5. ARCHE 4(5)-99. Блізіня нуля. Валерка Булгакаў."...Чым больш мы гаворым „адраджэньне“, тым больш мы аддаляемся ад праўды і накіроўваемся ў гушчар адвольных дапушчэньняў і неўтаймоўных паганскіх хваласьпеваў непрадметным існасьцям — вонкавым багом. „Адраджэньне“ жорстка і празрыста сыгналізуе блізіню нуля..."
6. ARCHE 4(5)-99. Бэртальт Брэхт. Ёган Вольфганг Гётэ. Пераклады Дзядзькі Васіля. "...Анёла альбо не чапай, альбо лапай хутчэй, / З налёту ў пад’езд валачы і лезь пад хітон, / Заткні яму рот языком, пакуль не ачухаўся ён, / І ўвінчвай, шуруй, а як з лытак яму пацячэ, / Рачком да сьцяны прыхілі, задзяры фартушок..."

7. ARCHE 4(5)-99. Наркотыкі: гісторыя, склад, дзеяньне. Андрэй Хадановіч з выкарыстаньнем: Michel Reynaud, Les Toxicomanies."...Спажываньне наркотыкаў — праблема, якая паўстала ня сёньня й ня ўчора; ужываньне псыхатропных сродкаў, найчасьцей у рэлігійным і рытуальным кантэксьце, было характэрнае для ўсіх цывілізацыяў..."
8. Дзевяць гадоў я знаёмы з марыхуанай. Канстанцін Дронт у ARCHE 4(5)-99. Паталёгіі грамадзтва."...Мне здаецца, самы рэальны перадоз — гэта зь дзікага перапою пахмяліцца, “дзеўбануцца белым”, каб зрэнкі ажно павылазілі, і па глупстве яшчэ “па чорным” ударыць — і “каюк”. Звычайна овэрдозы прыкладна з такіх прычынаў і бываюць..."
9. ARCHE 4(5)-99. Малы чырвона–зялёны цытатнік. (Аляксандар Лукашэнка) "...„я говорю: вы меня не рассматривайте так пристально! Я приехал в свою столицу!.. Поэтому это моя Москва, это моя столица!“ (Радыёстанцыя „Эхо Москвы“, 23.05.1997 г.)..."
10. ARCHE 4(5)-99. Бронікі, альбо Навэля пра каня. Вячаслаў Адамчык."...Ня вельмі хацелася старому Жуку ісьці на паклон да старэйшага сына, зь якім летась, звозячы з поля снапы і ўкладаючы воз, яны пабіліся..."
11. Нябожчык. Жорж Батай у ARCHE 4(5)-99. Паталёгіі грамадзтва."...Граф узбудзіўся. Ягоны чэлес быў доўгі і чырванаваты. Голае цела і гэты чэлес былі сапраўды па–д’ябальску пачварныя. Галава тулілася ў кантаватых сутулых плячох. На бледным твары крывілася ўсмешка. Ён хацеў Марыю, і гэтае жаданне поўніла ўсе яго думкі...."
12. ARCHE 4(5)-99. Вясельле на хутары. Алесь Кавальчук."...Хто падумаў бы, што за 40 кілямэтраў ад Менску ў лесе можа стаяць закінутая хаціна, выбудаваная ледзь ня сто гадоў таму..."
13. ARCHE 4(5)-99. Стоўк Ньюінгтан блюз. Ірвін Уэлш."...Я апошні раз кальнуўся ў сарціры на пароме, пасьля выйшаў на палубу. Было файна: кроплі ляцелі ў твар, чайкі з клёкатам гналіся за паромам, доўгая хваля ўзбуджэньня пракацілася па целе..."
14. ARCHE 4(5)-99. Квартэт сэксуальных бедаў. Ірвін Уэлш. "...Яна была курва–садыстка, ён быў пізьдзюк–эгаіст. Яны

літаральна натыкнуліся адно на аднога ў бары Grassmarket аднойчы ўвечары..."

15. ARCHE 4(5)-99. Праз калідор. Ірвін Уэлш. "...Яны стаялі і глядзелі адно на аднога пару пакутлівых сэкунд — у абодвух заняло мову..."
16. ARCHE 4(5)-99. Бронікі, альбо Навэля пра каня. Вячаслаў Адамчык."...Ня вельмі хацелася старому Жуку ісьці на паклон да старэйшага сына, зь якім летась, звозячы з поля снапы і ўкладаючы воз, яны пабіліся..."
17. Выдавец. Адам Глёбус у ARCHE 4(5)-99. Паталёгіі грамадзтва. "...Вар'ят. Я маю справу з маньякам. Вакол мяне адны монстры... са сьпіртам у шпрыцах, з чэлесамі ў дупе, з парадамі крышку цяжарным жанчынам..."
18. ARCHE 4(5)-99. Аўтадафэ аўтатэіста. Анатоль Прасаловіч. "...Будызм разбурыў канцэпцыю майго „Я“ сваёй моднай у той час байкай пра рэінкарнацыю. Нашто тады яна, гэтая хвалёная несьмяротнасьць, калі я — Толік Прасаловіч, Просік, Талян, Талюша — перастану быць самім сабою, згублю, халера, сваё імя і памяць пра жыцьцё, маё жыцьцё, якім бы яно ні было. Я вельмі любіў гісторыю. Я намагаўся ўявіць сябе безыменным, і розум мой мутнеў ад роспачы. Былі, што праўда, дзеці–маўглі, безь імя, бяз роду і племені. Тады, у 14 год, я зразумеў, што мы, беларусы, і ёсьць гэтыя дзеці–маўглі, столькі разоў рэінкарнаваныя, а таму і бяспамятныя, народ, чыя нібыта бесьсьмяротная душа блукае сабе па неабсяжным Сусьвеце гісторыі..."
19. ARCHE 4(5)-99. Як гадавалася «трэцяе пакаленне». Ілья Куркоў."...«Трэцяе пакаленне» — гэта пакаленне нашых бацькоў..."
20. ARCHE 4(5)-99. Пад апекай сярэдняга брата. Андрэй Екадумаў. "...Сацыяльная сістэма заўсёды выпрацоўвае пэўны, адпаведны сабе тып персоны, нейкага „сярэдняга чалавека“, які на справе ніколі не сустракаецца, але ж — не сустракаецца ў чыстым выглядзе. Сярэдні чалавек, як нейкі культурны ўзор, складовы вобраз прадстаўніка пэўнага грамадства, нягледзячы на ўсе постмадэрнізмы і мультыкультуралізмы, існуе ў кожным з нас. Гэты пазбаўлены персоны, але ж неабходны дзеля існавання любой асобы агент сацыяльна-культурнага асяроддзя

стабілізуе грамадства. Ён акрэслівае межы прынцыпова мажлівага для большасці гэтага самага грамадства; большасці, якая і існуе як большасць толькі таму, што ва ўсведамленні людзей жыве безасабовы чалавечы стандарт, які быў створаны соцыякультурнай сістэмай і які стварае гэтую сістэму..."

21. ARCHE 4(5)-99. Зямля вачыма астранаўта. Вольфганг Закс. "...сацыяльныя канфлікты — ад паўстаньня індзейцаў у Ч'япас праз спрэчкі пра беспрацоўе ў Нямеччыне да вулічных пратэстаў у Джакарце — усё больш працятыя напяцьцём паміж глябальнымі патрабаваньнямі і лякальнымі правамі..."
22. ARCHE 4(5)-99. Калыханка для маладога літаратара. Андрэй Хадановіч. "...Сьпі, дзіцятка, птушкі ўжо паснулі, / зоры ў неба па ваду пайшлі. / Кукавадла вусьцішнай зязюлі, / люлі–люлі, прыляцелі кулі… / Стала ціха на усёй зямлі..."
23. ARCHE 4(5)-99. Бабулькі. Бога. "...я дваццаць год з калючай драцінай праз ваконца на сонейка глядзела, і ўсё ж такі шкадую, што не забіла больш..."
24. ARCHE 4(5)-99. Пра традыцыю. Тэадор Адорна."...Катэгорыя традыцыі па сутнасці ёсць катэгорыяй феадальнай, у тым сэнсе, у якім Зомбарт называў феадальную гаспадарку традыцыяналісцкай..."
25. ARCHE 4(5)-99. Славомир Адамович: Поет із країни поза епохами та дискурсами. Максим Стріха. "...Назву збірки "Плавільшчыкі расы" можна перекласти подвійно. "Раса" по–білоруському і "роса" (та, яка "очі виїсть"). Але водночас і "раса", яку, за переконанням поета, ще тільки належиться виплавити на окупованих теренах..."
26. ARCHE 4(5)-99. Иuђajedy. Џmicier Saioљkin. "...Mozna kanstatavac, sto vialikaja kolkasc nasych suhramadzianau licyc za normu kompleks pavodzinau, karysnym prystasavalnym vynikam jakoha josc stan, jaki z medycnaha punktu hledzannia mozna abaznacyc jak CUZAJEDZTVA..."
27. ARCHE 4(5)-99. Хвароба. Зьміцер Гарбуноў. "...Пазьней ужо, калі хвароба ўзьнікла зноў, рэабілітацыйнымі захадамі аказаліся шыкоўныя "Cordon's", "White Horse", "Calvados" і гэты сапраўдны цуд — "Белая Русь" берасьцейскай вытворчасьці (пляшка "пад вінт", чорны

корак з кармінавай Пагоняй, усяго 4.70 DM у Duty Free на КПП “Заходні Буг”). І ўсё гэта ў спалучэньні з Midnight Oil (асабліва “…The Beds Are Burning”), Cocteau Twins, Phish, Sugar Cubes, soundtrack–ам да “Pulp Fiction” Таранціна, пасьля Данчык, “Крама”, “Палац” і “Песьняры” часоў уваходжаньня ў чарты “білборду”..."
28. ARCHE 4(5)-99. Два дні ў Маскве й трынаццаць год між імі. Людміла Рублеўская."...Два дні адлегласьцю ў трынаццаць гадоў пакінулі ў маіх нататніках пункцірны партрэт Вялікага імпэрскага гораду..."
29. ARCHE 4(5)-99. Шэршні. Пэтэр Гандке."...Калі яго клічуць, яму нельга спыняцца і адказваць. Калі я гукнуў яму, ён спыніўся. Калі ён выцягнуў левую нагу, увалілася правая. Калі ён выцягнуў правую нагу, увалілася левая. Калі ён пачаў бегчы, то ўваліўся абедзьвюма. Пад покрывам лёду — сьнег з густога пылу..."

[image]
[image]

З ь м е с т 4 (5) - 1999

.

[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

---

4 [image] - 1999

Паталёгіі грамадзтва
[image]
[image]

ЗЬМЕСТ

Ад рэдакцыі
Павал Севярынец Грамадзтва граху
паталёгіі грамадзтва
Па старонках беларускіх часопісаў
Валерка Булгакаў. Блізіня нуля
Пераклады Дзядзькі Васіля *Бэртальт Брэхт. Ёган Вольфганг Гётэ*
Наркотыкі: гісторыя, склад, дзеяньне
Канстанцін Дронт. Дзевяць гадоў я знаёмы з марыхуанай
Малы чырвона–зялёны цытатнік
гісторыі
Вячаслаў Адамчык. Бронікі, альбо Навэля пра каня
Жорж Батай. Нябожчык
Алесь Кавальчук. Вясельле на хутары
Ірвін Уэлш. Стоўк Ньюінгтан блюз. Квартэт сэксуальных бедаў.
Праз калідор
аўтапартрэты
Славамір Адамовіч. Чарнавікі
Адам Глёбус. Выдавец
Анатоль Прасаловіч. Аўтадафэ аўтатэіста
архіў
Ілья Куркоў. Як гадавалася «трэцяе пакаленне»
гуманістыка
Андрэй Екадумаў. Пад апекай сярэдняга брата
Вольфганг Закс. Зямля вачыма астранаўта
лірыка
Андрэй Хадановіч. Калыханка для маладога літаратара
Бога. Бабулькі
філязофія

Тэадор Адорна. Пра традыцыю
крытыка
Максим Стріха. Славомир Адамович: Поет із країни поза епохами та дискурсами
прабел
Zmicier Saloskin. Cuzajedy
хроніка
Зьміцер Гарбуноў. Хвароба
запісы
Людміла Рублеўская. Два дні ў Маскве й трынаццаць год між імі
кніга
Пэтэр Гандке. Шэршні ([image] **ZIP:** 150 K)

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

ARCHE з ь м е с т 4 (5) - 1 9 9 9

[image]

да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] *Паталогіі ў 4(5)-1999* .
[image]
[image][image][image][

Кожны мае ў сабе часьцінку ідэалізму, якая ўраўнаважвае наша жыцьцё, цягне нас уверх зь непазьбежнага балота. Урэшце, толькі ў гэтай раўнавазе і магло ўзьнікнуць чалавецтва. Будзем спадзявацца, што яе нам удасца захаваць і надалей, — каб захаваць саміх сябе.
Віктар Аўтушка

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

да Зьместу 4(5)-1999

Павал Севярынец
Грамадзтва граху

Сказаць папраўдзе, я не адчуваю попаху серы. Ня выключана, што ўжо мы даўно прынюхаліся. Але балота, багна зь ціхімі вірамі, смуродная бездань твані з гулкім выбоўтваньнем газаў — вечнае ныючае балота пад нагамі, гэта факт. І яшчэ — поўня па–над усім, начное магільнае вока, што ўзіраецца ў задраныя дагары твары, у вокны, і гіпнатызуе, пакуль мы хорам ня ўзвыем.
Віншую, мы ўсёй грамадою ў трансе. Мы падаўляючай большасьцю і не здагадваемся пра мэты, задачы й чаканыя вынікі існаваньня свайго бялковага цела — і, як сьледзтва, помсьцім бацьком, кумірам ды пэнсіянэрам, гадзім у свае калыскі й вінавацім тых, зьнянавідных, чые целы крыху больш бялковыя.
Ня дзіва, што зь першых школьных клясаў галовам дапытлівым і цікаўным дазволена спасьцігаць максымум зьяваў матэматычнага сьветапарадку й жывёльнага варушэньня, усе кабалічныя лічбы зямлі і тэхнікі... толькі не *чалавецтва*. Ня людзтва. Бо сорамна, страшна прызнацца ў заканамернасьці подлага й падманнага, у абгрунтаванасьці п’янства й ляноты, у непазьбежнасьці крывадушша, разбэшчанасьці й хлусьні. Прызнацца сьвежанькаму дзіцёнку, якому толькі вось давялі, што сьнег белы, а цемра чорная, і што на нуль нічога ня дзеліцца.
Краіна ў руінах. Мы штосьці пішам, складаем кнігамі, плітамі й шуфлядамі па дамох і кватэрах; руінаў робіцца яшчэ трохі больш, а разуменьня яшчэ трохі менш. Шчасьце, што ёсьць

яшчэ Лукашэнка, які, паводле агульнага перакананьня, нясе адказнасьць за нашы грахі, інакш бы нам засталося адно праваліцца ў пекла ад ганьбы.
Гэта проста суцэльная паталёгія, наша *грамадзтва граху*. Грэх, быццам рак, паражае злаякаснымі ўтварэньнямі ўсе пульсуючыя залозы й порыстыя касьцявіны, нэрвовыя клеткі й найпяшчотнейшыя органы пачуцьцяў. Грэх кішэчніку, грэх крыві, поўны грэх мозгу. Дайшло да таго, што мы, сьмяротна хворыя на такое жыцьцё, ня чуем ані страху, ані болю, ані кону свайго. Прамінулі ўсе магчымыя інкубацыйныя й апэрацыйныя пэрыяды; усёй гадасьцю, пошласьцю, што ўнутры нас, ужо даўно павінна было званітаваць, а мы ўсё бадзёра мыем рукі перад абедам і не падаем іх былым сябрам. Дысфункцыі, імунныя агрэсіі і нагнаеньні пратравілі дарэшты, што было моцнага і спажыўнага, мяккацелага й мясістага, па сто разоў адрыгнулі й пачалі труціць, забіваць і жэрці адна адну. У памутнелых вачох усплываюць такія калоды й бярвеньні, што не відаць далягляду. Мы ня бачым за сьветам *сьвятла* — ад заходу да сьвітанку, ад сьвітанку да заходу — і ня ўгледзім да тае пары, пакуль нас, перасмыкнутых жахам, не паралізуе ад кішэньня чарвівых зьвілінаў у *самім сабе*, ад нутранога расплодзішча поскудзі й заразы, пакуль не пачуецца ціканьня сэрца, гатовага выбухнуць страшнай інфэкцыяй. І гэтае ўсьведамленьне — шок, ад якога кідае ў жар! — будзе ўжо не літаратурай і не кіно, не абаронай правоў вычварэнцаў і не любаваньнем калецтвамі — гэта будзе супрацьстаяньне дабра і зла сам–насам, гэта будзе жыцьцё ў рэжыме рэальнага часу.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі

наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

паталёгіі грамадзтва дзе Зьмяна 4(5)-1999

Па старонках беларускіх часопісаў

Гэтым разам ARCHE прадстаўляе выбраныя просьбы–мольбы аб дапамозе і цёплыя адказы–парады на іх чытачоў беларускага часопісу „Гаспадыня“, якія друкаваліся на працягу 1997—1999 гг. Выдрукаваць гэтыя проста ўнікальныя па сваім псыхаэмацыйным тоне публікацыі змусіла нас не хваравітая прага пакпіць з наіўнасьці гаротных людзей ці пасьмяяцца зь вясёлых калямбураў, а вялікі боль спачуваньня ў душы. Спадзяемся таксама, што й чытачы нашага часопісу не застануцца абыякавымі да перажываньняў сваіх суайчыньнікаў, зь якімі ім даводзіцца сустракацца на вуліцах і плошчах нашых гарадоў, і працягнуць гэтую сьветлую традыцыю чалавечага братэрства і ўзаемавыручкі — дашлюць нам свае водгукі.

Гаспадыня №12, 1997 г.
рубрыка Міласэрнасьць

Ужо шмат гадоў я хварэю. А якой хваробай, сама ня ведаю. У мяне нічога не баліць, пачуваюся добра. Абсьледаваньні ў дыягнастычным цэнтры — ніякіх адхіленьняў. І тым ня менш у мяне няма валасоў на галаве, а таксама броваў і вейкаў. Дактары кажуць, што на нэрвовай глебе.

Чым я толькі ні лячылася! Хто што параіць, усё рабіла: валяр’янку піла, супакаяльныя прымала, мазала галаву. Валасы крышку адрастуць і зноў выпадаюць. Пасьля я ўсё кінула — стамілася, прызвычаілася. І вось, чытаючы ваш часопіс,

загарэўся ў маёй душы агеньчык. Так шмат парадаў! Можа, і мне хто дапаможа. Хай напішуць у рэдакцыю.

Вэраніка.

Гаспадыня №1, 1998 г.

рубрыка Міласэрнасьць

Даўно хацела напісаць, але неяк не наважвалася. Але, калі прачытала артыкул „Валасатая ты, мая жанчына“ ў №7 за мінулы год, зразумела, што не адна я такая.

Вы гаворыце, што да гірсутызму трэба ставіцца разумна. Але, калі я гляджу на сваё цела, мой розум пакідае мяне.

Калі мне было 18 гадоў, я заўважыла, што тая частка майго цела, якая лічыцца боскай для любой дзяўчыны і жанчыны, пачынае мяне палохаць. На маіх грудзях вакол смачкоў зьявіўся невялікі пушок. Да якога лекара зьвяртацца, я тады ня ведала, а расказваць каму–небудзь было няёмка.

Так міналі гады. Але калі ў 21 год я выйшла замуж і зацяжарыла, гэты пух пачаў ператварацца ў грубы чорны волас і расьці да 1,5 см даўжынёй. Пасьля родаў мне прыходзілася стрыгчы іх, каб пакарміць дзіця. Цяпер мне 30 гадоў, у мяне двое дзетак, і гэтая праблема яшчэ больш пачала хваляваць мяне. Валасы сталі гусьцейшымі, растуць па ўсіх грудзях, вакол пупка, дасягаючы 3 см. Мне няёмка паказвацца тэрапэўту, калі захварэю.

Я саромеюся ўласнага мужа. І хаця мы зь ім пражылі 10 гадоў душа ў душу, ён усё яшчэ кажа, што кахае мяне і сумуе, калі бывае ў камандзіроўках, я стала страшна раўнівай і баюся, што ён кіне мяне. Прашу вас, памажыце мне не згубіць сябе і сям’ю! Няўжо пры нашай сучаснай мэдыцыне, калі робяць такія складаныя пластычныя апэрацыі, могуць зрабіць з мужчыны жанчыну і наадварот, нельга пазбавіцца ад такога недахопу, як лішнія валасы?

Можа, нехта палічыць, што гэта не хвароба, каб прасіць дапамогі, але я думаю інакш. Таму я спадзяюся, што хто–небудзь адгукнецца на мой ліст.

г.Ліда

Гаспадыня №9, 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

Ад залішняй валасатасьці

Можа, гэтыя рэцэпты сродкаў ад залішняй валасатасьці твару і цела жанчын дапамогуць тым, хто лічыць сябе „непаўнавартаснай“:

1. 150 г травы дурману звычайнага кіпяціць у 1 л вады — павінен атрымацца моцны адвар. Ватным тампонам праціраць участкі цела, зь якіх хочацца выдаліць валасы.

2. Сокам разрэзанага зялёнага грэцкага арэху трэба змазваць валасістую паверхню 2–3 разы.

3. Спаліць шкарлупу грэцкага арэху, расьцерці ў вадзе да ўтварэньня вадкай кашыцы і даць адстаяцца. Вадкасьцю змазваць некалькі разоў на дзень месцы непажаданага росту валасоў. Ад гэтых працэдураў рост валасоў спыняецца.

4. На 5 г крухмалу, 5 г нягашанай вапны, 10 г сернаватага натру, вады дастатковую колькасьць. Сумесьсю змазваць валасістыя месцы.

Да ведама: сернаваты натар — гэта сернакіслы натрый альбо натрыя сульфат, гляўбэрава соль — бясколерныя крышталы, якія рашчыняюцца ў вадзе, прымяняецца ў шкляной, тэкстыльнай прамысловасьці, мэталургіі, мэдыцыне, вэтэрынарыі.

Відрук Леакадзія Аляксандраўна.

Вул. Вандыша, д.17, г. Маладэчна, Менская вобл., 222310.

Гаспадыня №3, 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

Добры дзень, мілая „Гаспадынька“!

Чытаю часопіс пастаянна, бо працую ў сельскай бібліятэцы.

Я завяла спэцыяльны сшытак, у які запісваю спосабы і рэцэпты лячэньня розных захворваньняў. Яны могуць прыдацца, калі ня мне, то іншым людзям.

А цяпер мой рэцэпт кантрацэптыўнага сродку. Ён вельмі просты. Гэта — мача. Апішу больш падрабязна. Пасьля родаў (сыну 5 гадоў) карысталася кантрацэптыўнымі таблеткамі. Па–першае, вельмі дарагі сродак. Па–другое, падрывае здароўе. І вось нядаўна мне мая знаёмая, а затым і мэдсястра параілі спрынцавацца мачой. Адразу пасьля полавага акту ўзяць мачу (можна сваю, лепей — дзіцячую) і зрабіць вышэйапісаную працэдуру. Гэта танна, лёгка робіцца і добра адбіваецца на здароўі.

Буду вельмі радая, калі мой рэцэпт спатрэбіцца.
Усяго вам найлепшага!
Алена, Ашмянскі раён.

Гаспадыня №2 1998 г.
рубрыка Камэнтуе спэцыяліст
У 25 гадоў я нарадзіла. Пад час родаў быў разрыў прамежнасьці. Наклалі швы. Застаўся вялікі ўваход у похву.
Цяпер мне 30 гадоў. Ні я, ні муж не адчуваем фізычнага задавальненьня. Наша сям'я на мяжы распаду (іншых прычынаў няма). Даруйце за нясьціплае пытаньне, але „ў каго што баліць...", адкажыце, калі ласка, праз часопіс: ці можна крыху зашыць уваход у похву?
Калі так, то дзе робяць гэтую апэрацыю?
З павагай Наташа Т.
Камэнтар: Я хацеў бы зьвярнуць увагу на абарончую функцыю похвы ад пранікненьня розных мікрааранізмаў, а пасьля ўжо на ролю ў дасягненьні пачуцьця полавага задавальненьня. Сапраўды, некаторыя жанчыны пасьля родавых ускладненьняў адчуваюць дыскамфорт з–за анатамічных зьменаў у похве. На сёньняшні дзень гэта можна выправіць. Існуе шэраг апэрацыяў, якія мы называем пластычнымі. Яны прадугледжваюць узнаўленьне ўваходу ў похву ці пластыку пярэдняй, задняй сьценак. Прыктычна адбываецца звужэньне, у выніку якога ліквідуюцца прычыны, якія прыводзілі да парушэньняў паўнавартаснага сэксуальнага жыцьця.
Апэрацыі нескладаныя. Робяцца яны ўва ўсіх клініках г.Менску, а таксама ва ўсіх цэнтральных абласных і раённых кансультацыях.
Зьвяртаюся да вас, як да самага надзейнага сябра. Праўда, я больш ні з кім не змагла пагаварыць на гэтую тэму, а вам давяраю.
Справа ў тым, што мы толькі ажаніліся, а заводзіць дзяцей баімося. Усё зьвязана з тым, што мой муж два гады таму перахварэў на пранцы. Цяпер у яго ўсё нармальна, ён пастаянна правяраецца і здае аналізы. Але я ўсё ж хачу запытацца: ці не адаб'ецца гэта на будучым пакаленьні? Мы кахаем адзін аднога і хочам мець дзяцей.
Воля, Віцебская вобласьць.

Камэнтар: Паважаная Воля!
Калі муж зьняты з дыспансэрнага ўліку і дасьледаваньні крыві ня выявілі цяпер захворваньня, а вы, папярэдне прайшоўшы абсьледаваньне ў жаночай кансультацыі, атрымаеце адмоўны вынік, можаце спакойна цяжарыць і нараджаць і не баяцца наступстваў для дзіцяці.

Памажыце нашаму гору. У маёй дачкі, а ёй у красавіку будзе 16 год, мэнструацыя ідзе з мая 1995 году. Да кастрычніка 1995 году месячныя былі вялікія, яна часта губляла прытомнасьць, выклікалі хуткую дапамогу. Ляжала ў больніцы зь нізкім гемаглябінам. Пасьля больніцы крывацёк стаў меншым, але не спыніўся.

Вітамінатэрапія, фізіятэрапія, лячэньне зёлкамі — усё безвынікова.

Можа, хто ведае народны сродак, дапамажыце!

З павагай сям'я П. Адрас у рэдакцыі.

Камэнтар: Шаноўныя! У вашай дачкі праходзіць пэрыяд дасьпяваньня, калі адбываецца станаўленьне мэнструальнай функцыі арганізму. У некаторых дзяўчынак гэты працэс парушаецца з–за гарманальных расстройстваў. Праяўляецца гэта ў выглядзе маціцавых крывацёкаў. Магчымыя і іншыя расстройствы ў арганізьме. Таму ёй трэба прайсьці абсьледаваньне ў лекара–гінэколяга жаночай кансультацыі, лепей дзіцячага гінэколяга. Калі няма такой магчымасьці ў вашых умовах, трэба прыехаць у абласны горад. Без вызначэньня лекарам прычынаў крывацёкаў самастойныя ўжываньні лекаў альбо лекавых зёлкаў не дадуць станоўчага эфэкту і могуць нанесьці нават шкоду арганізму.

Гаспадыня №9, 1998 г.
рубрыка Мая вам парада

Шаноўная рэдакцыя „Гаспадыні"!

Не магу прамаўчаць. У адным з нумароў жанчына піша, што ў ейнай дачкі не спыняецца мэнструацыя з 1995 году. Я сама ў маладосьці такім самым чынам цярпела 1,5 месяцы. У мяне старэйшая сястра лекар, але калі мая мама прывяла старую бабку, яна не пярэчыла.

Вось і я вам раю, лячыцеся ў бабак, але толькі не ў шарлятанак, якіх цяпер шмат. Калі блізка няма, то хай

прыяжджаюць да мяне, што магу, зраблю і навучу, як дзейнічаць далей.

Касьцюкевіч Ганна Сяргееўна. Вул. Прытыцкага, д. 3, в. Парэчча, Акцябрскі раён, Гомельская вобл.

Гаспадыня №2, 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

...І пухліна зьнікла

Майму мужу лекары паставілі дыягназ: рак лёгкага. Я адмовілася ад усіх паслугаў афіцыйнай мэдыцыны і прынялася лячыць яго сама. Лячэньне было наступным.

Брала 30–40 г гарэлкі і столькі ж нерафінаванага алею, налівала ў бутэльку з коркам і энэргічна трэсла бутэльку хвілінаў пяць. Атрымлівалася 60–80 г эмульсіі. Прымаць лекі трэба 3 разы на дзень за 15 хвілін да ежы, а перад гэтым 2 гадзіны ня есьці. Кожны раз рыхтуем сьвежую сумесь. Запіваць нічым нельга.

Калі ў хворага пачнуцца ваніты, прыём паўтарыце. Курс лячэньня 10 дзён. Потым 5 дзён — перапынак. Курс паўтараюць некалькі разоў, пакуль стан хворага не палепшыцца.

Пры гэтым майце на ўвазе, што першы тыдзень — найцяжэйшы. Арганізм хворага вельмі часта не прымае лекі. Тут трэба праявіць волю і цярпеньне.

Пад час лячэньня хворага трэба адмовіцца ад малака, мяса, мучнога і салодкага — вугляводы „кормяць“ ракавую пухліну. А вось садавіна і гародніна павінны быць пастаянна.

Калі муж прымаў гэтыя лекі, у яго актыўна адыходзіла макрота. Празь некалькі тыдняў мы зрабілі здымак, пухліны на лёгкім не аказалася. Я веру ў гэты сродак і спадзяюся, што ён дапаможа каму–небудзь яшчэ.

Д. Юр'ева, „Сельская новь“.

Гаспадыня №3 1998 г.

рубрыка Міласэрнасьць

Добры дзень, паважаная рэдакцыя часопісу „Гаспадыня“!

Піша вам пастаянная ваша чытачка з гораду Пінску Алена Іванаўна М. Гора ў мяне, хоць з дому сыходзь. Можа, мне хто дапаможа.

І сьмех, і грэх, а рабіць нешта трэба. Справа ў тым, што я храплю. Ужо тры гады так храплю, што муж вушы ваткай затыкае. Мне яго так шкада. І сябе, і ўсіх сваіх блізкіх.

Парады, калі ласка, апублікуйце. Можа, яшчэ ёсьць такія бедакі.

Алена Іванаўна М., г. Пінск.

Гаспадыня №12, 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

Добры дзень, паважаная рэдакцыя „Гаспадынькі“!

Піша Вам Валянціна з г.Берасьце. Прачытала ліст Алены Іванаўны М. зь Пінску і вырашыла дапамагчы зямлячцы парадай. Гэты рэцэпт ад храпу я прачытала ў адной з газэтаў.

Трэба патаўчы капусны ліст зь мёдам альбо шклянку капуснага соку зьмяшаць з лыжкай мёду і выпіць на ноч. Курс лячэньня — месяц.

Вельмі спадзяюся, што гэты сродак ёй дапаможа. Я таксама ведаю, што капусны сок дапамагае ад язвы страўніка. У любым выпадку гэты рэцэпт ня можа прынесьці ніякай шкоды.

Валянціна Мадзеева, г.Берасьце

рубрыка Міласэрнасьць

Мой сын хварэе на нетрыманьне калу, а яму ўжо шэсьць гадоў. Усё спадзявалася, што пройдзе, перарасьце. Скора ў школу, што рабіць?

Людзі добрыя, калі хто ведае, як нам дапамагчы, напішыце!

231615, Гарадзенская вобласьць, Мастоўскі раён, п/а Мілевічы. Кароль М.Н.

Гаспадыня №2 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

Паважаная рэдакцыя!

Хачу прапанаваць эфэктыўны спосаб лячэньня эпілепсіі і іншых захворваньняў нэрвовай сыстэмы.

У галаве сьвіньні ёсьць дзьве маленькія косткі (у кожнай палавіне па адной), падобныя да чалавечага чэрапу. Калі варыце квашаніну, то колькі б вы яе ні варылі, гэтыя косткі не разварваюцца і нават не памякчаюцца. Здрабніць іх можна, толькі паклаўшы на жалезную апору і ўдарыўшы малатком. Зручна выкарыстоўваць два малаткі. Костку трэба пакласьці ў тканіну і здрабніць у парашок. Дадаваць па 1/4 ч. лыжкі ў ежу, пітво 1–2 разы на дзень.

Іпілепсія вылечваецца цалкам.

З павагай Лена Гарачава, г.Пінск

Гаспадыня №5 1998 г.

рубрыка Міласэрнасьць

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя!

Піша вам Аляксандар. Вельмі прашу апублікаваць маю просьбу ў часопісе „Гаспадыня“. Застаўся адзіны шанец, калі хто дапаможа з чытачоў.

Мне 25 гадоў. Хварэю на вельмі рэдкую хваробу — „пэйроні“ (ушчыльненьне на галоўцы чэлеса). Ушчыльненьне (бляшка) паступова павялічваецца. Лекары кажуць, што гэта невылечна, і нават пасьля апэрацыі могуць быць кепскія наступствы.

Вельмі прашу, калі нехта вылечыўся альбо ведае, як гэта зрабіць, напісаць мне.

Прашу рэдакцыю пераслаць лісты па маім адрасе. Загадзя ўдзячны людзям, якія адгукнуцца на маю трагедыю.

Аляксандар. Адрас у рэдакцыі.

Гаспадыня №11(75) 1998г.

рубрыка Сувіта жаночыя праблемы

Паважаная рэдакцыя!

Мне хацелася б, каб вы адказалі на маё пытаньне. Справа ў тым, што муж сьцьвярджае, што полавых сувязяў зь іншымі ў яго ніколі не было. Ці можа хвароба трыхаманоз быць ад кепскай вады?

Л.Н.

Я перажыла страшны сорам. Мне 30 гадоў і ў мяне двое дзетак. Сям’я ў нас, як я лічыла, ідэальная. Любіла мужа, думала, што я ў яго адзіная. Верыла яму сьлепа, давярала на сто працэнтаў, але дыягназ лекароў мяне шакаваў: „ганарэя“. Вы ўяўляеце, што рабілася са мной?

Ня ведаю, што гаварыць і што рабіць. Першае жаданьне — падаць на развод. Але калі пагаварыла з мужам, крыху суцішылася. Ён кляўся і клянецца, што ніколі і ні з кім ня спаў. І я яму пачала верыць.

Патлумачце мне, дурніцы, ці магла я падчапіць гэтую заразу, калі ні я, ні ён ні з кім не ўступалі ў полавыя сувязі. За 1,5 месяца да здачы аналізаў я была на прыёме ў гінэколяга, мне даставалі сьпіраль.

Лена.

Гаспадыня №12 1998 г.

рубрыка Мая вам парада

Не для гідлівых

Пасьля апэрацыі ў анкалёгіі (1974 г.) я моцна хварэла на застуды, саслабела, пачаўся кашаль, насмарк, бранхіт, і,

нарэшце, стала душыць бранхіяльная астма.

Насмарк быў з крывацёкам з носу. У паліклініцы мне прыпякалі сасуды. Лёгкія заліло макротамі, ня дыхала, а хрыпела. Сьпіна ўвесь час мерзла. Пашыла камізэльку з футры, але гэта не дапамагала. Да астмы дадалася алергія, яшчэ больш стала задыхацца.

Хадзіла ў паліклініку на лячэбную гімнастыку. Палёгка была часовай. Запісалася ў школу загартаваньня да трэнэра К.Прыходчанкі. Пакуль наведвала заняткі, усё было добра, перастала — усё пачалося спачатку. Ніякія лекі не дапамагалі, ужо зьбіралася ў „лепшы сьвет“. У такім стане знаходзілася 15 гадоў.

І, на маё шчасьце, лекар Палонская выратавала мне жыцьцё. Я прачытала артыкул, як пазбавіцца ад насмарку. Усё вельмі проста. Не смаркацца і не плявацца, а ўсё праглынаць. Гэтыя ўсе старыя аджылыя і зламаныя клеткі і напаўзабітыя мікробы, трапляючы ў страўнік, дзейнічаюць як упырск, што і ўмацоўвае імунную сыстэму.

На працягу месяца я пачысьціла лёгкія, зьняла футровую камізэльку. Так пачалося новае жыцьцё — бяз насмарку, без бранхіту, бяз астмы і алергіі.

Спачатку, пакуль чысьціла лёгкія, прыходзілася раніцай рабіць да 50 каўткоў, а потым усё менш і менш.

Працую з раніцы да позьняга вечару на агародзе, канечне, з разумным адпачынкам, многа чытаю, выпісваю дзесяць выданьняў, многа пішу. Сплю па начах, як у маладосьці. Астма адступіла і ня душыць. А мне ўжо 78 гадоў.

Параду лекара Палонскай выпрабавала на сабе, таму магу сьмела парэкамэндаваць яе іншым астматыкам, хто хоча жыць.

Зычу ўсім добрага здароўя!

Аляксандра Іванаўна Дзікун, 247410, п/а Здудзічы, д. 46, Сьветлагорскі раён, Гомельская вобласьць.

Гаспадыня №7, 1999 г.

рубрыка Мая вам парада

У №12 за 1998 год адна парада **Не для гідлівых** мяне зьдзівіла. Каўтаць макроту — жудасна. А між іншым, ёсьць прасьцейшы, хаця таксама ня вельмі прыемны, народны спосаб лячэньня насмарку, пра які я яшчэ нідзе не чытала.

За дзень між пальцамі на нагах зьяўляецца пах. Рукамі пацерці пальцы на нагах і паднесьці рукі да носу, удыхаць пах

ня больш як 3–5 хвілінаў. Легчы ў пасьцель.

Калі за ноч насмарк не прайшоў, паўтарыць працэдуру яшчэ раніцай і вечарам. Але звычайна насмарк зьнікае пасьля адной працэдуры. Паспрабуйце, гэта ня шкодна. Іншы раз і не такімі пахамі дыхаем.

Л.Ткачэнка, г.Хойнікі.

Гаспадыня №3 1999 г.

рубрыка Міласэрнасьць

Вырашыў зьвярнуцца праз ваш часопіс да людзей.

Я пад раніцу мычу. Бацькі кажуць, што гэта зь дзяцінства. І што самае галоўнае, калі прачынаюся, то ўвогуле нічога ня памятаю.

Можа, хто ведае, як гэтую хваробу вылечыць. Загадзя ўсім удзячны.

Аляксандар, адрас у рэдакцыі.

У мяне непрыемны пах з роту. Была ў лекароў, сказалі, што цалкам закрываецца праход між страваводам і страўнікам, а дапамогі — ніякай. Ужо нават мой сын, васьмі гадкоў, і тое пра гэта мне гаворыць, а пра мужа — пісаць ня хочацца. Што мне рабіць, як лячыцца?

Можа, хто–небудзь з чытачоў ці спэцыялістаў дапаможа парадамі.

З павагай і вялікім спадзяваньнем

Ала, адрас у рэдакцыі.

Гаспадыня №7 1999 г.

рубрыка Міласэрнасьць

Хачу папрасіць парады для маёй малодшай сястры. Ужо чатыры гады яна грызе пазногці. Тры дні пацерпіць і пайшла грызьці. І мазалі перцам, і каралі, і прасілі — не дапамагае.

Можа, людзі добрыя падкажуць, дадуць парады. Буду вельмі ўдзячная.

Адрас не пішыце, усё–ткі сорамна, не маленькая ўжо, 18 год.

Ірына.

Падрыхтавала Алена Казлова

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][im

[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

паталёгіі грамадзтва дзіўнага ў 4(5)-1999

Валерка Булгакаў
Блізіня нуля
Пра філязофію і „філязофію“ беларускіх думаньнікаў

Скутыя нашыя сілы. Нас палохаюць факты, падзеі, словы. Мы палохаемся праўды. Гэты роздум ні ў якім разе не задумваўся як „слова пра праўду“. Прадметам нашай увагі будуць вонкавыя абалонкі словаў, а таму мы не імкнемся здаўмецца, як выглядае „праўда“ ў сваім папярочным разрэзе. „Праўда“, „філязофія“, „розум“ — што можа быць сьмяшнейшым за гэтыя пустыя гукі?

Кажуць, што на нашых вачох разгортваецца драма народзінаў беларускай філязофіі. Калі гэта сапраўды так, то мы знарок абстрагуемся ад пытаньняў ейнай генэзы і ідэалягічных інсьпірацый, а паспрабуем спыніцца на сацыяльным аспэкце гэтай новай зьявы.

Наагул, спыніцца часта азначае „даць пачатак“. Так і зь філязофіяй. Пачатак філязофіі азначае спыненьне забыцьця быцьця. Спыненьне забыцьця быцьця — ня так істотна, у якіх сацыяльных формах яно можа ўвасабляцца — ёсьць найважнейшай адзнакай наявы філязофіі.

1. Першафілязофія і філязофія пачатку

Карл Яспэрс у цыклі нарысаў „Уводзіны ў філязофію“ стаічна, хоць і не бяз прысмаку гаркоты адзначае: „Die Philisophie soll sich also rechtfertigen. Das ist unmцglich“. Гэтае, на першы погляд, парадаксальнае цьверджаньне без асаблівай цяжкасьці прачытваецца выходзячы з заходняга дыскурсу філязофіі.

Апошні акурат і разгортваўся як пошук, сфармуляваньне і адказы на пытаньні — а што такое філязафічнае пытаньне, як не пункцірная лінія, што адлюстроўвае істотны, і ў той жа час розумасяжны выклік быцьця? — якія стаялі перад эўрапейскім інтэлектам. Чым магутней праяўлялася яго актыўнасьць, тым хутчэй набліжаўся стан вычарпанасьці, сьляды–адгалоскі якога мы знаходзім у зьмешчаным вышэй выказваньні К.Яспэрса. Вычарпанасьць тут азначае дасягненьне мяжы, вонках якой немагчыма агарнуць быцьцё з дапамогай дагэтулешняй паняцьцёвай сеткі.
Доўгачаканы і шмат кім адкрыта вітаны канец філязофіі ці, хутчэй, канец традыцыйных уяўленьняў пра яе ўрэшце і прывёў да канца гісторыі, канца геаграфіі і г.д.
„Віной“ гэтаму перш–наперш угрунтаванае традыцыяй, што сягае клясычных часоў, асноватворнае разуменьне думаньнікамі філязафічных сыстэм як моўных утопій, калі сама лёгіка мовы падказвае адказ: „Філязофія — гэта тое і тое“. Таксама нельга зьмяншаць вагу такога чыньніка „стомленасьці духу“, як сьціраньне межаў паміж філязофіяй і мэтафізыкай. Захоўваючы сваю інструмэнтальную функцыю, філязофія паступова ператвараецца ў форму [чыстага] мысьленьня.
Гэтая старанна культываваная цягам апошніх дзесяцігодзьдзяў „відаль канца“ не павінна, аднак, засланяць ад нас досьведу таго, што праяўляецца стала, па–за кан'юнктурным кантэкстам, што, нарэшце, якраз і складае прадмет праўды: нельга не сканстатаваць залежнасьць разьвіцьця філязофіі ад разьвіцьця літаратурнай мовы, наагул, філязофія — дысцыпліна, твор, тварэньне, пошук і ўдакладненьне таго, што ў прастамоўі называецца „праўдай“.
Вось жа, думаньнік насамрэч гэта вечны шукальнік і ўдакладняльнік „філязафічнай“ праўды, гатовы прынесьці сябе ў ахвяру нябачным, але цалкам павабным субстанцыям.

Беларускі філязафічны рух нараджаўся доўга і пакутліва (зразумела, да яго мы не далучаем рознага роду імпэрскія эрзацы, „беларускія“ толькі па літары ў духу *Інстытуту філязофіі і права*). Каляніяльнаму рэжыму надта рупіла ператварыць дзесяць мільёнаў беларусаў у дзесяць мільёнаў ідыётаў, так сказаць, паразіць іх у правах. Аднак напрыканцы

XX стагодзьдзя, калі ізноў здарылася адраджэньне, беларуская філязофія ўрэшце, ці не ўпершыню, набыла інстытуталізаванае выражэньне (яна прадстаўлена спэцыялізаваным часопісам, іншымі выданьнямі, навучальнай установай і г.д.) і аформілася ў сваіх найважнейшых прадстаўнікох–лідэрах — *Валянціну Акудовічу і Ігару Бабкову*.

Само паняцьце „адраджэньне“ на добры лад ня можа больш задавальняць. Не несучы ў сабе пазытыўнага стваральнага запалу, гэтае паняцьце няўхільна робіцца пяражыткам паэтычнага мысьленьня на службе ў аграрнай культуры, выяўным і недарэчным анахранізмам, нечым неадэкватным моманту, накшталт газавых ліхтароў ці спадніцы панёвы, сэнс і прызначэньне якіх ужо цяпер трэба тлумачыць дзецям. За шырмай „адраджэньня“ абярняся крыецца дзіцячая бездапаможнасьць дарослых мужчын, разгубленасьць і дэзарыентаванасьць, прага тлумачыць асабістыя няўдачы фатальным гістарычным працэсам, а часам і наагул войстрая творчая імпатэнцыя. Вобраз „Адраджэньня“ выразна карэлюе з вобразам „Сінявокай Беларусі“.

Чым больш мы гаворым „адраджэньне“, тым больш мы аддаляемся ад праўды і накіроўваемся ў гушчар адвольных дапушчэньняў і неўтаймоўных паганскіх хваласьпеваў непрадметным існасьцям — вонкавым багом. „Адраджэньне“ жорстка і празрыста сыгналізуе блізіню нуля, вакол якога пакутліва абарочваецца беларуская экзыстэнцыя, блуканьне вакол мёртвай кропкі, калі ў імглістай смузе губляюцца як шляхі наперад, так і шляхі назад.

Своеасаблівая містыка „адраджэньня“ выгадавала ў нас нават дагэтуль амаль невядомую грамадзкую праслойку — „адраджэнцаў“. Яны падаюць свой кволы голас у тралейбусах і на паэтычных чытаньнях, іх чуваць па радыё, на шматлюдных мітынгах і шэсьцях. „Адраджэнцаў“ лёгка пазнаць — у іх заклапочаны выгляд, насуплены твар, яны носяць пінскі трыкатаж. А як жа інакш — *ім доля судзіла Беларусь адраджаць, штодня прыносячы сябе ў ахвяру*.

Страшна ня тое, што „адраджэнцы“ мэтадам пробаў і абмылак выпрацавалі сваю карпаратыўную этыку, страшна другое — іх сьляпое нежаданьне замірыцца з тым фактам, што Беларусь ужо адроджана, г. зн. атрымала сваё месца ў часе і прасторы. І пэрспэктыўнай стратэгіяй нацыянальнага будаўніцтва цяпер

проста ня можа быць „адраджэньне“, фармуляванае ў цьмяных паэтычных катэгорыях. Іншая рэч — калі нават не ўрабіць, дык хаця б сьпярша разгрэбсьці неабсяжнае поле новай беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці, якая дагэтуль падсілкоўваецца культурнай архаікай і ненайлепшай літаратурай.
Аб’ектыўна, ролю ў гэтым працэсе новых беларускіх думаньнікаў цяжка пераацаніць. Аднак самі думаньнікі, відаць, так ня думаюць. Гэта іх займае ў апошнюю чаргу. Нашым думаньнікам куды цікавей займацца тым, што ляжыць на паверхні. Наагул, асноўныя праявы іх думальнай актыўнасьці можна схарактарызаваць так:
— маргінальнае зацікаўленьне, часта хваравітае і неадэкватнае бягучаму моманту, да маргінальных тэмаў і тэматычных кірункаў у філязофіі, што тлумачыцца не ў апошнюю чаргу „камунікацыйнай паўзай“ у кантактах з Захадам; што для беларускага філёзафа моднае і актуальнае, то для яго заходняга пабраціма ўжо даўно нагнала аскому;
— нізкая культура беларускай мовы (а мова — гэта „сяродак перамяшчэньня“ філёзафа); для нашых цяперашніх думаньнікаў беларуская мова, як правіла, другая, засвоеная цягам творчага ўзмужаньня;
— фрагмэнтарнасьць і павярхоўнасьць у разглядзе базавых канструктаў і інварыянтаў айчыннай традыцыі і, як вынік, схільнасьць да апісальніцтва і няздольнасьць выпрацоўкі раней не запатрабаваных падыходаў да яе;
— радыкальная і адначасна інфантыльная залежнасьць ад расейскіх гуманітарных крыніцаў, для значнай часткі беларускіх думаньнікаў — першакрыніцаў;

— шматгадовая няздольнасьць навязаць дыялёг зь іншамоўнымі аналягічнымі рухамі ў Беларусі, што тлумачыцца завышанай самаацэнкай і адначасна комплексам непаўнавартасьці.
Відаць, праўду гаварылі старавечныя пра праклён быць першым. Быць першым азначае быць асьлепленым праменьнем уласнай непаўторнасьці і заразом быць закладнікам сваёй нізкавокасьці. Той, хто першы, бачыць вакол сябе рэльефы, не заўважаючы абрысаў. Іх угледзіць стальшы. Быць першым значыць шукаць момант хуткай праўды, аднак *страшная праўда*

палягае ў тым, што не бывае *хуткай праўды*. Быць першым азначае быць сярэднім элемэнтам паміж прарокам і псыхапатам.
Аргумэнт маіх апанэнтаў будзе такім: нашы думаньнікі самім фактам сваёй прысутнасьці істотна ўплываюць на фармаваньне новай беларускай ідэнтычнасьці, спрыяюць, іншымі словамі, павелічэньню годнасьці „шараговага беларуса“, які цяпер можа з поўным правам сказаць: у мяне ёсьць ня толькі літаратура, але і філязофія. Справа, аднак, датычыць ня голай наяўнасьці, бо на Беларусі традыцыйна існавала і існуе шмат фігураў голай наяўнасьці, а, па–першае, творчай арыгінальнасьці, і, па–другое, грамадзкай рэлевантнасьці. *Беларуская філязофія, каб і надалей не заставацца філязафічнай самадзейнасьцю, каб урэшце выйсьці за межы нацыянальнай ізаляванасьці, якраз і павінна ажыцьцявіць разварот да нацыянальнага.*
Такім чынам, мы канстатуем існаваньне прымарных і сэкундарных філязафічных дыскурсаў. Ключавой апазыцыяй першага ёсьць філязофія/мэтафізыка, ключавой апазыцыяй другога — філязафаваньне/мысьленьне. Ключавым словам першага дыскурсу ёсьць *супярэчнасьць*, ключавым словам другога — *сутыкненьне*. Заганнае кола, у межах якога абарачаецца беларускі філязафічны рух — народ, каляніяльнасьць, супраціў — сурова сьведчыць, куды ён належыць.
Напрыклад, малады беларускі думаньнік І.Бабкоў здабыў сапраўдную вядомасьць ня столькі сваімі нешматлікімі філязафічнымі артыкуламі, колькі кангеніяльнымі прадмовамі да асобных нумароў часопіса „Фрагмэнты“. У адной зь іх ён не праводзіць дакладнай мяжы паміж навукамі аб духу і навукамі аб прыродзе. Што такое прырода, як ня места, мімэсыс, зямля, народ, думае І.Бабкоў. І патэтычна дадае: „У 1996 годзе адбылася падзея, што мусіць мець калясальныя наступствы для беларускага мысьленьня. Памёр “народ”“.
Ня можа ня радаваць такое дакладнае датаваньне скону гэтага таямнічага „народу“ (які „народ“? скуль ён узяўся? дзе, у якім канцы сьвету ён памёр?), бо акурат у такіх тонкасьцях, недаступных нават уяўленьню простага чалавека, філёзаф і пацьвярджае сваю, Богам дадзеную, годнасьць. 1996 год быў багаты на рознага роду падзеі. Прагматыка сытуацыі падказвае, што пунктам адліку ў вызначэньні гэтага, скажам шчыра,

заўчаснага скону для І.Бабкова служыць інсьпіраваны рэжымам другі рэфэрэндум, калі так дарагія кожнаму адраджэнскаму сэрцу вартасьці і сымбалі былі спляжаныя і пайшлі на глум. Адраджэнскаму сэрцу ясна, што ў гэтай невыноснай, можна сказаць, скандальнай калізіі вінаваты „народ“, што, у бабкоўскай фармулёўцы, „*бачыўся як натуральная (амаль прыродная), этнічна й генэтычна вызначаная супольнасьць*… (курсіў наш — *В.Б.*)“.

Больш, хіба, ня бачыцца.

І.Бабкоў гуляе са сваім чытачом у хованкі, ідучы ў рэчышчы адмысловай эстэтыкі замоўчваньня. Чытач дасьведчаны, хай ён сам і разьбіраецца. Тым часам аўтар піша адно слова, маючы на ўвеце тры: „Нам засталася адно самота скрыптара ды *la culture revolte*“. Як бачым, узьнікае амаль оруэлаўскі *newspeak*, за якім праглядаецца цень Янкі Купалы і постаць аднаго невядомага французскага гуманітарыя.

Але вярнемася да „народу“. Наколькі павінен быць магутны раздражняльнік, каб гаварыць такія жудасныя рэчы! І адначасна — заўважце — як спакусьліва іх гаварыць! Не нясеш ніякай адказнасьці за прамоўленае, а калі твой дыягназ пацьвердзіцца, абавязкова трапіш у аналы. А ўсё ж такі, які „народ“ памёр? Ці не памерла ці, хутчэй, аджыло проста яшчэ адно яўна недарэчнае ўяўленьне пра яго, культываванае дзесяцігодзьдзямі „адраджэнцамі“? А тады ці ня маем мы тут перад сабой падмену паняцьцяў, свайго роду вэрбальную гульню, калі тыя ці іншыя паняцьці адвольна нагружаюцца такой сэнсавай глыбінёй, якую немагчыма рацыянальна абгрунтаваць? Да таго ж, нацыянальная традыцыя прапануе ўважліваму аналітыку сваё разуменьне „народу“, вячыстага неўміручага народу, існаваньне якога ня вымерыць звычнымі нам адрэзкамі часу: да гэтага народу належаць Францішак Скарына, Янка Купала, Уладзімер Караткевіч…

Беларускі філязафічны рух, як правіла, не вытрымлівае крытыкі. Ён дагэтуль перабывае ў агрэгатным стане, да якога немагчыма ўжыць звычныя ацэнкі „добра–блага“. Знаходжаньне па–за крытыкай абумоўлівае яго канстытутыўныя рысы і характэрныя слабасьці: самадастатковасьць, самакаштоўнасьць, самазаспакоенасьць, інтравэртыўнасьць, зарыентаванасьць на бягучы момант і, што найважнейшае і што можна выказаць пры дапамозе зьбітага савецкага штампу, „неразуменьне глыбінных

патрэбаў і жаданьняў беларускага народу“.
Зразуметая так філязофія яшчэ доўга ня будзе нічым іншым, як няпэўнай агульнагуманітарнай дысцыплінай, своеасаблівым узмоцненым літаратуразнаўствам, заўсёды скіраваным усьлед...
Стандарт новай беларускай філязофіі, як і новай беларускай літаратуры, узьніклай у 30 гадох адыходзячага стагодзьдзя, у пазбаўленасьці мужчынскай сілы — халоднай адчужанасьці й ледзяной бязмоўнасьці, якая не спараджае душэўных парыванняў, а ўганяе ў роспач і адчай.

2. Валянцін Акудовіч і літаратурна–мастацкі рух „Бум–бам–літ“

В.Акудовіч у дадзенай сувязі нас цікавіць ня як асоба, якая вось ужо дзесяць апошніх гадоў неадменна перабывае на вастрыю інтэлектуальнага жыцьця ў Беларусі, а як „хросны бацька“ „Бум–бам–літу“. Прадмет нашых развагаў якраз і будзе ў тым, у якой меры выпадковае ці заканамернае гэтае спалучэньне Акудовіч плюс „Бум–бам–літ“, і што з гэтага вынікае.
В.Акудовіча можна зразумець. Для яго „Бум–бам–літ“ — гэта новыя мастацкія практыкі, сынкрэтычны акт эстэтычнага асваеньня сапраўднасьці на сутыку авангарднай літаратуры, выяўленчага мастацтва і тэатральнага відовішча, творчы аглямэрат унікальна абдораных індывідаў. Як жывая пульсацыя чалавечых мазгоў, „Бум–бам–літ“ захапляе В.Акудовіча настолькі, што апошні наважваецца стаць ягоным „хросным бацькам“, так сказаць, уступае зь ім у сваяцкія адносіны. Такім чынам, нельга не сканстатаваць *кранальную блізіну* В.Акудовіча і „Бум–бам–літу“.
Можна зразумець В.Акудовіча яшчэ і таму, што „Бум–бам–літ“ сапраўды быў пэўнай альтэрнатывай апрыкралым, спракуджаным афіцыйным утварэньням, якія ў савецкія часы ажыцьцяўлялі ідэалягічны кантроль над беларускай літаратурай. В.Акудовіч заўсёды дыстанцыяваўся ад гэткіх „ідэалягічных кантралёраў“, адмаўляючыся ад магчымых матар'яльных дабротаў на карысьць свабоды творчасьці. Падтрымліваючы і збліжаючыся з „Бум–бам–літам“, В.Акудовіч мяркуе, што адначасна падтрымлівае і рэалізуе права на

свабоду творчасьці.
Існуюць, відавочна, і іншыя матывы, якія мы проста не змаглі ўстанавіць і якія аказалі свой уплыў на дынаміку прыняцьця такога рашэньня.
Але калі В.Акудовіч сапраўды думае так, то тым самым ён радыкальна ідэалізуе „Бум–бам–літ“ і ўсё тое, што крыецца за ім. Гэтае аморфнае эклектычнае ўтварэньне дае немалую карысьць каляніяльнаму рэжыму. Не сакрэт, што новы савецкі каляніялізм збольшага пераадолеў тупіковыя лініі свайго ранейшага паводле часу аналяга — расейскага імпэрскага. Згодна зь яго абноўленай дактрынай, якая праводзіцца ў жыцьцё шмат дзясяткаў гадоў, не выпадае прытном адмаўляць існаваньне беларускай мовы і літаратуры. Досыць адно сфальшаваць — выкастраваць — іх унівэрсальную нутраную існасьць, ператвараючы мову ў псэўдамову, а літаратуру — у псэўдалітаратуру, агідную кожнаму нармальнаму чалавеку, існуючую па–за нарматыўнай, сусьветна прызнанай эстэтыкай і прадукуючую дэфэктыўныя ці, прынамсі, неадпаведныя духу часу вобразы і сэнсы.
Гэтая самадэструктыўная літаратурная традыцыя пасьпяхова датрывала да нашай сучаснасьці, увасабляючыся ў безьлічы „Бум–бам–літаў“ — незьлічоных „Узьлётах“, „Першацьветах“ і „Сьвітанках“. Гэта выгадна амаль усім — стварае ўяву літаратурнага жыцьця, каналізуе ў выгадным рэжыму рэчышчы культурастваральную энэргію беларусаў і пры гэтым не аказвае ніякага рэальнага ўзьдзеяньня на хаду падзеяў, ніяк не спрыяе нацыянальнай эманцыпацыі нашага нацыянальна паняволенага — цяпер ужо „знутра“ — народу. Што ж тады „Бум–бам–літ“, як ні яшчэ адзін эстэтычны сурагат, крывы выгін небясьпечна хворай сьвядомасьці, нежыцьцёвае спалучэньне вечных няўдачнікаў?
Загнаныя Масквой у рэзэрвацыі, беларусы ліхаманкава хапаюцца за кожную адзнаку таго, што яны яшчэ „ня ўмерлі“. Вонкавая хімэрычнасьць іхнага стану рэхам згукаецца ў празе стварэньня нутраных хімэр успрыняцьця. Вока В.Акудовіча ня бачыць рэальных абрысаў „Бум–бам–літу“ і дазваляе ўяўленьню несумерна дабудоўваць абраз.

3. Беларуская савецкая інтэлігенцыя і новыя беларускія інтэлектуалы

Беларуская савецкая інтэлігенцыя мае свае рахункі да новых беларускіх інтэлектуалаў. „Прадажнікі, здраднікі, зусім сорам згубілі, адно даляры ім уваччу мільгочуць, а радзіма ім збоку–прыпёку“, — гаворыць беларускі савецкі інтэлігент, тыцкаючы пальцам у бок новых беларускіх інтэлектуалаў. І дадае: „Нават беларускай мовай па–людзку гаварыць не навучыліся“. Ён збольшага мае рацыю — шмат новых беларускіх інтэлектуалаў з паўзамі гавораць па–беларуску і зацікаўлены найперш у няўхільным павышэньні свайго ўласнага дабрабыту, і толькі пасьля гэтага — „адраджэньнем Беларусі“.
Не застаюцца ў даўгу і новыя беларускія інтэлектуалы–думаньнікі. Больш таго, якраз ім ямчэй а спарней выступаць у ролі „выкрываньнікаў“. Таму іхныя фармулёўкі больш рэзкія і безапэляцыйныя: „Здрадлівая, прадажная беларуская інтэлігенцыя, якая ў сваёй пераважнай бальшыні ізноў узялася абслугоўваць рэжым, ня мае права на існаваньне і непазьбежна зь цягам часу адамрэ“. „І ніякая наркомаўка вас ня выратуе“, — зласьліва вястуюць новыя беларускія інтэлектуалы. Іх нельга не зразумець — тое, што яны называюць „беларускай савецкай інтэлігенцыяй“, уяўляе насамрэч друзлую, лядаштую і сапселую масу, якую лёгка апляваць.
Сутыкненьне новых беларускіх інтэлектуалаў і беларускай савецкай інтэлігенцыі вельмі паказальнае, калі прасачыць матывы, якія рухаюць гэтымі двума асяродкамі. Далёкасяжная мэта і першых, і другіх у тым, каб паказаць несамастойнасьць свайго суперніка: і першыя, і другія ў рэшце рэшт імкнуцца пераканаўча давесьці, што іхныя візаві выконваюць пэўным чынам аформлены сацыяльны заказ.
Сацыяльны заказ — гэта, відаць, сапраўды той супольны пачатак, які неад'емна лучыць новых беларускіх інтэлектуалаў зь беларускай савецкай інтэлігенцыяй. Жывая сувязь пакаленьняў абумоўлівае іх рэальную пазыцыю: бурна паразытаваць на зьменлівай палітычнай кан'юнктуры, пакінуўшы ў баку ўсе гэтыя байкі пра выпрацоўку аўтэнтычных культурных вартасьцяў. Тым часам ніякая, нават такая працяглая інэрцыя сьвядомасьці ня ў стане пахіснуць відавочнасьці праўды: якраз стварэньне аўтэнтычных культурных вартасьцяў і дае праўдзівую легітымацыю ўсім тым, чыім пакліканьнем стала мысьленьне ў любых незастыглых формах.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

паталёгіі грамадзтва да Зьмяшчэньня 4(5)-1999

Пераклады Дзядзькі Васіля

Бэртальт Брэхт

Пра спакушэньне анёлаў

Анёла альбо не чапай, альбо лапай хутчэй,
З налёту ў пад’езд валачы і лезь пад хітон,
Заткні яму рот языком, пакуль не ачухаўся ён,
І ўвінчвай, шуруй, а як з лытак яму пацячэ,
Рачком да сьцяны прыхілі, задзяры фартушок
І, як з горла ягонага вырвецца здушаны стогн,
Трымай яго моцна і двойчы яму запістонь,
Ня даўшы экстазу ператварыцца ў шок.

Хай юрзае дупкаю спраўна, анёлу скажы,
Яечкі табе хай пальцамі перабірае,
І толькі калі між зямлёй і раем ён залунае,
Бясстрашна валі дагары і ад шчырай душы

Пярдоль яго ў душу, ды толькі, калі затрапеча,
У твар не глядзі і крыл не зламай, чалавеча.

Саўна і спалука

Сьпярша ў нас ябуцца, а лазьню прымаюць
пасьля.
Чакаеш, калі над балейкай нагнецца, і вось
Любуешся голенькім задам, і лёгенька коўзь! —
Па ляжачках, як бы жартуючы, ненаўмысьля,

Трымаеш яе ў пазыцыі, потым здабычай
Хай будзе ёй гер: хай сама на яго садзіцца.
Калі ж ёй прысьпічыць спачатку падмыцца,
Уваж і, як вучыць нас продкавы звычай,
Паслужыцца ў ваньне. Хай кіпнем ліне на
каменьне,
Клубамі ў шыпеньні каб пара ўвышкі ўзьляцела,
Адхвошча пяшчотна цябе бярозавым вецьцем,
Бальзам уліе ў душу, і на гэтым сьвеце
Адкрыецца рай, і прыме твой дух асьвяжэньне,
І прыйдзе чысьцец, і змые аб'ёбіны зь цела.

Спанатры каханьня

Ня так яно, каб асалодай зноў
Не спакушаўся наш юрлівец гер,
Ён паўстае і свой сьвяты намер
Увасабляе ў вобраз вабных сноў.
О, гэты лёгкі цік твайго задка,
Даўно чаканы знак, — хітруе плоць!
Раскоша той, якую самахоць
Удабралашчыць надзіцца рука.

Развод каленцаў! О яна — спалучка!
І дрогкасьць — знак, што мускулу пара
Спатоліць юр зноў прагнага нутра!

О кволы выгін! Лена гладзіць ручка,
З усьмешкаю!..
О еднасьць нашых цел! —
Тым лепшая, чым лучыш нас часьцей!

Еган Вольфганг Гётэ

XXIII

Вось запаведнік чароўны, я кветак любові
чакаю,
Музы дагледзелі сад, мудра пасеялі тут.
Я ж чаранок пладаносны, ствол залаты

існаваньня
Радасна сам пасадзіў, шчасьця чакаю цяпер.
Службу нясі, мой прыапе*! Чаго мне баяцца
дарэмна
Злодзеяў! Сей і зрывай кветкі цудоўных уцех.
Толькі ханжоў не пускай, зласьлівых і кволых
няздольцаў;
Прыйдзе каторы, зірне ў засень любві, аплюе
Чыстай прыроды дарункі — сьмела кладзі на
яго
Сьцёгнаў праведны гнеў — кроўю наліты
ражон!

** Гэта той самы гер, толькі міталягічны.*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

PS: Я мерыўся надрукаваць гэтыя сьціпленькія пераклады ў „жаночым“ нумары ARCHE, каб неяк усё–такі дагадзіць ня толькі жаночай палавіне ды каб ня зводзіць усе праблемы фэмінізму адно да барацьбы за роўныя выбарчыя правы мужчын і жанчын у капіталістычным сьвеце. Але Андрэй* вазьмі ды скажы мне, што як што яно Брэхт быў камуністам, дык сьлед публікаваць пераклады зь яго паэзіі пад рубрыкай „Паталёгія“. Ну, чаму як камуніст, дык адразу ўжо і паталёгія? Былі ж у партыі і нармальныя. Гэта, мой пане, — паталягічны антыкамунізм! — мушу вам далажыць.
Я прачытаў шмат цікавых кніжак пра Брэхта, і ў ніводнай ані згадкі пра тое, каб камуніст Брэхт калі–небудзь на парткамах выступаў па заявах пакінутых камуністамі жонак альбо палюбоўніц. Не заўважана за ім такая паталёгія. Хадзілі, праўда, чуткі, што сам ён не заўсёды быў верны актрысе брэхтаўскага тэатру Гелене Вайгель, але тая Вайгель, няма чаго й казаць, сама ніколі на Брэхта ніякіх набрэхаў ня ўзводзіла. Дык за што ж тады — у „Паталёгію“? Ужо ці не за анёлаў часам? Калі спадар Андрэй думае, што бясплоцкія, бясполыя стварэньні, якімі Бог учыніў анёлаў, непрыдатныя на каханьне,

дык гэта ў яго ад паталягічнай неабазнанасьці ў формах, фігурах, пазытурах, канфігурацыях і, зрэшты, у анёльскіх упадабаньнях што да каханьня. А камуніст Брэхт — усё гэта ведаў і ў санэце сваім ня толькі сузіральна апісаў магчымыя прыёмы і пасажы, але ж і даў чытачам практычныя парады і засьцераженьні, плаўна пераходзячы ад духоўнага (анёлы) да матэрыяльнага (людзі) — у наступных санэтах.
Абсурдная пазыцыя спадара дырэктара справакавала мяне зьвярнуцца да высокай клясыкі: дзе–дзе, а ў клясыцы зь яе гекзамэтрамі, пэнтамэтрамі ды цэзурамі ёсьць высачэзныя ўзоры чыстай лірыкі і таго, што тагачасьнікі лірыкай не лічылі. Вось, напрыклад, сябар беспартыйнага Гётэ гер Гердэр называў 21–ю, 22–ю, 23–ю і 24–ю рымскія элегіі Гётэ — „блядзкай паэзіяй“ (*Hurenpoesie*,— каб вы ўжо ведалі!), не хацеў і ня раіў іх друкаваць. І ў многіх выданьнях немцы абдзялялі іх увагай альбо ж друкавалі ў дадатках драбнюсенькімі літаркамі. Нават расейцы пераклалі толькі 20 штук, а чатыры апошнія апусьцілі, відаць, з пачцівасьці да цнотаў гера Гердэра ды да свайго імпэрска–шавіністычна–парткамаўскага дэвоцтва, каб не раздурваць нацменаў лішняй свабодай слова і разбэшчанасьцю нораваў. Але хто, дзе і калі сказаў, што блядзтва — гэта мусова паталёгія! Калі яно так — дык усе мы, людзі, можа за выключэньнем імпатэнтаў, — паталягічна хворыя. А Гётэ, вялікі мысьляр і паэт, нават у свае 80 гадоў ня толькі сьцішкі пісаў і пісаў! Гэты вялікі маг — мог! Не пералічыць усіх музаў, якіх ён за свой век пераюрзаў. Усе гэтыя Лоты, Шарлоты, Бэціны, Хрысьціны… — з усімі імі Ёган ладзіў і кахаўся без усіх гэтых вашых фэмінізмаў, суфражызмаў і жаночых пытаньняў! Вялікі подзьвіг Гётэ — варты „жаночага“ нумара ARCHE!
А Вы, спадару дырэктар, яго ў „Паталёгію“!..
„Ах, Кафка, Кафка, — зь Нёмана вецер, са сракі дым!“ — сказаў бы на такую цнатлівасьць Уладзя Караткевіч. Паталёгія — гэта калі хвароба, гэта калі нават прафэсар вялікіх букваў Падлюжны** ня можа сказаць, як правільна пісаць па–беларуску сакавітае „Насьсьсяру!“ — з двума „сы“ ці як у „СССР“ — з трыма, ужо ня кажучы пра мяккія знакі. А высокая праўда Гётэ і Брэхта — яна праз усякія рубрыкі праўдай жа напаверх прадзярэцца! Што ж да якасьці перакладу, дык тут магчымыя розныя стылёвыя пахібкі і, мабыць, ці не пра перакладчыкаў сказаў польскі дасьціпнік Лец (цытую ў

арыгінале): „Nie kazdemu gownu jest danem byc na starosc cennym guanem“.
Дз. В–ль

**Андрэй — спадар дырэктар ARCHE Андрэй Дынько.*
*** Усякае падабенства з гэтым прозьвішчам, выдуманым, — чыста выпадковае (— Дз. В–ль).*

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

Наркотыкі: гісторыя, склад, дзеяньне

Гістарычны падыход дазваляе апісаць фэномэн ужываньня наркатычных сродкаў у культурным, сацыяльным і эканамічным кантэксьце, а таксама іхную эвалюцыю. Спажываньне наркотыкаў — праблема, якая паўстала ня сёньня й ня ўчора; ужываньне псыхатропных сродкаў, найчасьцей у рэлігійным і рытуальным кантэксьце, было характэрнае для ўсіх цывілізацыяў. Калі мы хочам зразумець зьяву сёньняшняй таксыкаманіі, нам трэба вярнуцца ў мінуўшчыну, каб дакладней акрэсьліць асаблівасьці новага тыпу паводзінаў, што назіраюцца ў краінах Заходняй Эўропы цягам другой паловы нашага стагодзьдзя.

1. Індыйскія каноплі (*cannabis sativa*)

Індыйскія каноплі ведамыя вельмі даўно. Ужо ў Кітаі, за больш як дзьве тысячы гадоў да нашай эры, імпэратар Шэн Нунь апісваў якасьці гэтай расьліны. Гэтая культура распаўсюдзілася ў Індыі й амаль што ва ўсіх рэгіёнах Усходу, каб пасьля сягнуць і заходніх краінаў. Калі Рабле ў XVI стагодзьдзі, у Францыі, у трэцяй кнізе „Гарганцюа й Пантагруэля“ пяе хвалу траве „пантагруэліён“, ці не пра каноплі йдзе тут гаворка? Цалкам магчыма.

Але толькі ў 1845 годзе зьявілася першая навуковая праца на гэтую тэму — кніга Маро дэ Тура „Пра гашыш і душэўнае адчужэньне“. Гэты лекар раіць ужываць каноплі, каб больш даведацца пра псыхічныя хваробы. Так, ён піша: „Напраўду, няма ніводнага простага альбо складанага вар’яцтва, якое не

сустракалася б у душэўных зрухах, разьвітых гашышам“. Ён рэкамэндуе *cannabis sativa* як тэрапэўтычны сродак, падкрэсьліваючы „магчымасьці, якія можа мець экстракт зь індыйскіх канапель у якасьці леку“.
Гэты наркотык трапіў таксама ў гісторыю французкай літаратуры; нельга абмінуць увагаю творы такіх пісьменьнікаў, як Шарль Бадлер, аўтар працаў „Штучны рай“ і „Віно й гашыш як сродкі пашырэньня чалавечай асобы“, альбо Тэафіль Гат’е, які нават заснаваў клюб аматараў гашышу.
XX стагодзьдзе таксама адкрывае нам паэтаў гэтага наркотыку, але гашыш — гэта больш ня сродак ап’яненьня абранай меншыні, а праўдзівая „манна“ для ўсёй моладзі.

Каноплі, зь сямейства канапляных, даюць краскі, экстрактам зь якіх — **марыхуана** (званая ў Паўночнай Афрыцы *kif*, а ў Індыі *bhang*) і **гашыш** (у Індыі *charras*):
— марыхуана гатуецца з красак і лісьця; звычайна яна зьмешваецца з тытунём, і працэнтавая колькасьць актыўнага прадукту адносна малая;
— канапляная смала, гашыш, выдзяляецца з расьліны пад час красаваньня; яе паляць альбо, радзей, ядуць; працэнтавая колькасьць чыстага рэчыва вышэйшая, чым у выпадку з марыхуанай;
— канапляны алей — вынік перагону смалы. Гэта досыць малаўжывальны прадукт.
Абмяркоўваючы пытаньне ўзьдзеяньня канапель на арганізму, трэ падкрэсьліць два прынцыповыя моманты:
— па–першае, колькасьць актыўнага рэчыва гэтай культуры можа вельмі істотна розьніцца ў залежнасьці ад зоны вырабу і таго, якія часткі расьліны былі ўжытыя: вось жа, розныя варункі й даюць нам прадукт вельмі рознай таксычнасьці;
— па–другое, вынікі досьледаў у гэтай галіне вельмі супярэчлівыя, асабліва гэта датычыцца даўгачаснага прыманьня. Небясьпека спажываньня канапель была й дагэтуль ёсьць тэмаю палемікі, якая грунтуецца, на нашую думку, ня столькі на навуковых аргумэнтах, колькі на чыньніках ідэалёгіі, асабліва калі ход пра лібэралізацыю ўжываньня наркотыкаў. Нягледзячы на гэтае, мы можам вызначыць пэўную колькасьць пытаньняў, дачынна якіх згаджаюцца міжсобку ўсе навукоўцы й

мэдыкі. Перадусім згадайма, што хуткасьць і інтэнсіўнасьць узьдзеяньня таксычных сродкаў на арганізм, натуральна, залежаць ад колькасьці ды якасьці прадукту, што мы паглынаем ці ўдыхаем, але ж таксама ад уласных псыхалягічных і фізіялягічных характарыстык кожнага чалавека.
На фізіялягічным роўні: пасьля ўдыханьня ці паглынаньня канапель назіраецца досыць мала фізычных зьменаў, калі не лічыць лёгкага пачашчэньня пульсу й нязначнага паніжэньня артэрыяльнага ціску. Ведама, што каноплі паляпшаюць апэтыт. Шмат досьледаў было праведзена наконт даўгачаснага ўжываньня канапель ды іхных вытворных. З пэўных досьледаў, што праводзіліся ў ЗША, вынікае, што надмернае ўжываньне канапель выклікае імунадэфіцыт і парушэньні спэрматагенэзы. Увадначас курцом канапель пагражаюць хваробы бронхаў і лёгкіх. Як і ў выпадку з тытунём, небясьпека ракавых захворваньняў зьвязаная з гарэньнем смолаў, якіх у гашышы ўтрая больш, чым у тытуні.
На псыхалягічным роўні: хаця ёсьць розныя індывідуальныя паказальнікі, можна бачыць, як у некаторых абвастраецца сэнсарнае ўспрыманьне, назіраецца стан эўфарыі, які часам суправаджаецца спадам працэсаў тармажэньня.
Доўга думалі, што каноплі могуць выклікаць псыхіятрычныя забурэньні. Напраўду, некаторыя навукоўцы й аматары паленьня апавядаюць пра непрыемныя, а часам нават вусьцішныя наступствы ўжываньня канапель, але такое здараецца рэдка. Як нам ведама, ніводны сур'ёзны дасьледнік ня лічыць разьвіцьцё ўстойлівых псыхатычных рэакцыяў наступствам працяглага ўжываньня канапель. Асобныя выпадкі назіраных у пацыентаў псыхозаў былі ўжо наступствамі псыхіятрычнага лекаваньня.
Ці выклікае працяглае ўжываньне канапель далейшы пераход да мацнейшага за іх гераіну?

Мы хацелі б падкрэсьліць, што першы–лепшы не стаецца таксыкаманам; каб у маладзёна ўзьнікла наркатычная залежнасьць, мусіць супасьці пэўная колькасьць чыньнікаў. Калі зірнуць на статыстыку, то сярод аматараў гераіну дапраўды каля 40% пачыналі з ужываньня канапель, але

найчасьцей спалучалі іх зь іншымі сродкамі, такімі як алькаголь, лекавыя прэпараты, рашчыньнікі. З другога боку, гэтыя асобы складаюць толькі каля 3% ад агульнай колькасьці спажыўцоў *cannabis sativa*. Вось жа, пераважная бальшыня „канапляфагаў“ ня робіць „скачку“ да гераіну.
Насамрэч небясьпека якасных зьменаў датычыць ня ўзьдзеяньня на арганізм канапель, а хутчэй самой асобы іх спажыўца й той маргіналізацыі, якая можа напаткаць наркамана.
Як каноплі пераносяцца чалавечым арганізмам і ці ўзьнікае залежнасьць ад іх?
Каноплі не выклікаюць фізычнай залежнасьці, то бок спыненьне іх спажываньня не спрычыняе ані псыхалягічных рэакцыяў, ані сындрому адмены (абстынэнцыі). Аднак пры надмерным ужываньні ў некаторых можа выпрацоўвацца псыхічная залежнасьць, і каноплі стаюцца абавязковаю патрэбай.
Талерантнасьць (неабходнасьць падвышаць дозу для атрыманьня ранейшага эфэкту) да канапель, што вядзе да вельмі моцнага павелічэньня дозы, зьява надзвычайная. Гэта, натуральна, залежыць ад канцэнтрацыі прадукту, таксама як і ад узьдзеяньня наркотыку, на якое разьлічвае й якое зазнае кожны яго спажывец.

2. Галюцынагены

2.1 ЛСД 25

ЛСД 25 (дыэтылямід лізэргінавай кісьліны) быў вынайдзены А.Гофманам у 1938 годзе; гэта напаўсынтэтычная вытворная алькалёідаў, выцягненая з жытняй спарыньні. (Алькалёіды — арганічныя рэчывы, галоўным чынам расьліннага паходжаньня.)
ЛСД існуе ў форме парашку, таблетак альбо крышталічнага рэчыва. Звычайна яно праглынаецца; часам ім насычаюць кавалак цукру, цукерку альбо прамакатку; у выняткавых выпадках яно ўводзіцца шпрыцом.
Дзеяньне ЛСД пачынаецца менш чым праз гадзіну й можа працягвацца да дванаццаці гадзінаў; гэта й ёсьць тым, што спажыўцы наркотыку называюць „падарожжам“, альбо „*trip*“–ам.
На фізіялягічным роўні ЛСД узьдзейнічае на цэнтральную

нэрвовую сыстэму. Звычайна адзначаецца пачашчэньне сэрцавага рытму, павышэньне артэрыяльнага ціску. Чалавек стаецца стурбаваным, траціць сон і апэтыт. Зьяўленьне храмасомных зьменаў і пагроза прыроджаных ганаў у дзіцяці, маці якога прымала вялікія дозы ЛСД, пакуль застаюцца дыскусійнымі для навукі пытаньнямі.

На псыхалягічным роўні дзеяньне ЛСД розьніцца ў залежнасьці ад шматлікіх чыньнікаў: асобы спажыўца, ягонага атачэньня пад час „падарожжа“, папярэдняй дозы наркотыку. Найчасьцей апісаныя рэакцыі выяўляюцца ў наступных сфэрах:

— скажэньні візуальнага, прасторавага й часавага ўспрыманьня, якія могуць даходзіць да галюцынацыяў: прадметы ажываюць, пакой, дзе знаходзіцца чалавек, памяншаецца альбо расьцягваецца ў бясконцай прасторы;

— саматычныя зьявы, такія як запамарока, трымценьне на пачатку „падарожжа“;

— большая хуткасьць працэсаў мысьленьня: чалавек аказваецца здольны зьвязваць думкі такім надзвычайным чынам, што ў яго ствараецца ўражаньне, быццам ён зь лёгкасьцю й праніклівасьцю вырашае ўсе праблемы й сягае вышэйшага роўню сьвядомасьці;

— эмоцыі, якія пад час аднаго й таго самага прыёму наркотыку могуць зьмяняцца ад гранічнай трывогі да суцэльнай бестурботнасьці. Суб’ект можа быць перапоўнены пачуцьцём радасьці альбо нават вялікага шчасьця ці, наадварот, ахоплены цяжкай трывогаю, адчуваньнем паражнечы, страхам сьмерці альбо вар’яцтва. У такія моманты ён баіцца, што ніколі ня зможа вярнуцца з свайго „падарожжа“; гэта тое, што называюць „*bad trip*“, альбо „кепскае падарожжа“. У гэтых варунках ЛСД правакуе суіцыдальныя паводзіны й абвостраныя псыхатычныя рэакцыі, такія, як прыпадзі шаленства, пачуцьцё распаду, манію перасьледу. Такое дзеяньне можа зьнячэўку паўтарацца праз тыдзень і нават празь месяц у форме кароткіх эпізодаў з раптоўнымі зьменамі настрою, скажэньнямі часавага й прасторавага ўспрыманьня. Гэта так званы „фэномэн аддачы“.

Як пераносіцца ЛСД і ці ўзьнікае залежнасьць ад яго?

Калі ЛСД прымаецца досыць часта, перад тым як паўтараць „падарожжа“, трэба кожнага разу чакаць некалькі дзён, каб

зноў атрымаць падобны эфэкт. Вось чаму ягонае ўжываньне звычайна застаецца нерэгулярным. Талерантнасьць назіраецца слабая. Фізычная залежнасьць не адзначалася, а залежнасьць псыхічная сустракаецца рэдка.

Як ЛСД спажываецца сёньня?

Пачынаючы з 1970–х гадоў, назіраецца значнае памяншэньне ўжываньня ЛСД у Заходняй Эўропе. Аднак калі–нікалі ў малых групах адзначаюцца „ўсплёскі“ цікавасьці да яго, звычайна непрацяглыя.

Нядаўна зьявіліся два новыя сродкі:

— **ЛСД light**, у якім галюцынаген заменены простым стымулятарам;

— **extasy**, хімічны сродак, што спалучае амфэтаміны з галюцынагенамі (МДМА, альбо мэтыл–дыяксыд–мэтамфэтамін). У 1980 г. гэты прадукт трапляе на амэрыканскі рынак, а з 1989–га лічыцца „модным“ у пэўных колах у Заходняй Эўропе. *Extasy*, званы таксама „наркотыкам каханьня“, мае кшталт белых альбо каляровых пігулак. На фізычным роўні ён выклікае гіпэртанію ды стымуляцыю сэрцавай дзейнасьці; у вялікіх дозах ён можа прывесьці да перабояў у працы сэрца, аж да яго спыненьня. На псыхалягічным роўні *extasy* прыносіць пачуцьцё асалоды; ён абвастрае адчуваньні й растарможвае. Калі гэты прадукт называлі „наркотыкам каханьня“, яму прыпісалі якасьці афрадызьяку, але й на сёньняшні момант не даведзена, што *extasy* беспасярэдне ўзьдзейвае на сэксуальнасьць.

2.2 Ішыя галюцынагены

Існуюць і іншыя натуральныя ды сынтэтычныя галюцынагены, але яны менш ужываныя. Яны чыняць дзеяньне, падобнае да дзеяньня ЛСД. Найбольш ведамыя:

— **мэскалін**, які вырабляецца з мэксыканскіх кактусаў, званых пэётль. Гэтае рэчыва доўгі час выкарыстоўвалася мэксыканскімі індзейцамі ў іхных рэлігійных цырымоніях. Анры Мішо адкрыў яго для сябе пад час свайго падарожжа ў Мэксыку й апісаў гэты досьвед у адным з сваіх твораў — „Няўрымсьлівай бясконцасьці“;

— **псыляцыбін**, што прыгатаўляецца з мэксыканскага „сакральнага грыба“, псыляцыба. Гэтае рэчыва таксама ўжывалася пад час сьвяточных рытуалаў.

Дачынна абодвух гэтых сродкаў не адзначана ані залежнасьці,

ані звыканьня з малымі дозамі.

3. Апіяты

3.1 Опіюм

Опіюм паходзіць з Мэсапатаміі й таксама вырабляецца з расьліны — з маку. Ён ужываецца зь вельмі даўніх часоў. У 1873 годзе Эбэр знайшоў эгіпэцкі папірус, датаваны 1550 г. да нашай эры, які згадвае пра моц опіюму, што „здольны супакоіць дзіцячы лямант“.

Цягам стагодзьдзяў опіюм сягнуў Кітаю. Ён зьявіўся там прыблізна ў VII стагодзьдзі, але выкарыстоўваўся тады адно ў мэдычных мэтах. Паліць яго пачынаюць толькі з XVIII стагодзьдзя. З гэтага моманту апіяманія разьвіваецца вельмі хутка, лютуючы паміж кітайскага насельніцтва. У X I X стагодзьдзі кітайскі імпэратар хацеў забараніць ужываньне гэтага наркотыку, але сутыкнуўся з Англіяй у „опіюмнай вайне“, што скончылася паразаю Кітаю. Перапрацоўка кітайскага маку ў опіюм, што пасьля мусіў прадавацца ў той самы Кітай за пасярэдніцтвам ангельскіх гандлёвых канцораў у Індыі, насамрэч сталася для Англіі крыніцаю вялізарных даходаў.

Паралельна опіюм працягвае сваю вандроўку ў кірунку да Індыі, куды ён праточваецца ў XV I стагодзьдзі. Эўропа скарылася яму пазьней. У Англію опіюм трапіў дзякуючы стасункам гэтай краіны зь Індыяй. Ён пачаў там распаўсюджвацца пры канцы XV III стагодзьдзя й асабліва ў X I X ст., ува ўсіх асяродках, улучна з найбяднейшымі.

Патроху курцы опіюму насяляюць усе вялікія месты Эўропы, перадусім порты, куды опіюм завозяць плаўбіты й жыхары калёніяў.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту

Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

паталёгіі грамадзтва

дзе Зьмяшчаецца 4(5)-1999

Канстанцін Дронт
Дзевяць гадоў я знаёмы з марыхуанай

Дзевяць гадоў я непасрэдна знаёмы з марыхуанай. Апошнія два–тры гады “куру” даволі часта, ці кожны дзень, ці празь дзень, хаця нярэдкія перапынкі ў адзін–два тыдні, часта больш месяца. Але пры магчымасьці не прапускаю міма дымок марыхуаны. Вельмі яна мне па душы.

Усё ж мушу сказаць, марыхуана выклікае пагаршэньне памяці. Іншым разам адчуваю, што не магу прыгадаць падрабязнасьці таго, як прайшоў учорашні дзень, быццам ён ня ўчора быў, а даўно. Я не засмучаюся, бо ведаю, зь якой прычыны адбылося хуткае забываньне. Акцэнт увагі зьмяшчаецца з пабытовых зьменаў да адчуваньняў творчага характару, вобразаў, навеяных музыкай, прагулкамі, памаўленьнем. Але ў цэлым забыўлівасьць усё ж такі вядзе да некаторай разгубленасьці, і перад напісаньнем тэстамэнту я параю паджылым людзям не курыць марыхуаны тыдзень, можна два. Усё ж “тыдзень піць” і “тыдзень курыць” — несупастаўляльныя рэчы па шкодзе для здароўя.

У шэрагу краінаў, у тым ліку краінаў СНД, стаўленьне органаў правасудзьдзя і саміх заканадаўчых нормаў для аматараў марыхуаны несувымерна небясьпечнейшае за “траву”. У нашай краіне “непадсуднай” дозай зьяўляецца колькасьць марыхуаны вагой да пяці грамаў. Артыкул КК за ўжываньне нядаўна быў адменены. Але артыкулы за перавозку, набыцьцё, збыт, распаўсюджаньне, выраб не адмяняліся. Значыць, факт наяўнасьці марыхуаны аўтаматычна цягне за сабой падазрэньне ў якім–небудзь з названых падсудных дзеяньняў, і

рызыка аказацца за кратамі існуе. Так што пакуль у РБ выратаваць ад крымінальнай адказнасьці за ўжываньне “лёгкага” (г.зн. слабога, бясшкоднага) наркотыку можа толькі кансьпірацыя. Нават сьмешна, як гэта сур’ёзна гучыць.

Два словы аб прэйскуранце (у якасьці інфармацыі):
У Менску пушка ад запалак з марыхуанай каштуе 10–15 даляраў, у Горадні — 5–7 даляраў, у Маскве — 15–20 даляраў, у Кіеве — 4–5, у Алма–Аце — што дасі, а ўва Ўзбэкістане, да ведама, за захаваньне і распаўсюджаньне наркотыкаў — сьмяротнае пакараньне.
Працэнт выкрываньня забойстваў ува Ўзбэкістане — высокі. Трапіўся з наркотыкамі — яшчэ ня сьмерць! Бярэш на сябе нераскрытае забойства — і жыві ў турме і радуйся. Вось ужо сапраўды агонь перакрыжаваны!
Да сярэдзіны 90–х пра гераін я толькі чуў. Заўсёды ставіўся з падазронам і перасьцярогай да апіятаў, таму не цікавіўся, чым “жывуць” знаёмыя “апіюшнікі”, і не заўважыў, калі з ужытку аматараў “чорнага”[1] амаль зьніклі “лябараторныя” тэрміны: рашчыньнік, ангідрыд, луг і да т.п. Пра гэта пачынаюць забываць. Толькі ад скрайняй галечы наркаманы ўжываюць самапальна выраблены “шыркі”[2] з набытай альбо знойдзенай макавай саломкі. Апрача невысокай якасьці атрыманага рошчыну і маральна–фізычных выдаткаў на выраб, некаторыя тэхналягічныя памылкі часта высьвятляліся толькі пасьля ўвядзеньня “шыркі”, і непажаданыя наступствы пражываліся непасрэдна. Час кухоннай альхіміі мінуў. Гераін бяз доўгіх пошукаў матэрыялізуецца сам сабой, калі ёсьць дастатковая сума грошай, і вы заявілі аб сваім жаданьні знаёмым, якія ведаюць “пушэраў”[3]. Колькасьць кропак, якія гандлююць гераінам, у кожным горадзе заўсёды здольная задаволіць попыт, пры павелічэньні якога прапарцыйна павялічваецца і маштаб дзейнасьці гандляроў. З забесьпячэньнем перапынкаў не бывае. Гэтая сыстэма працуе ня горш за харчовую праграму. Колькі б чалавеку не распавядалі пра хуткае прывыканьне да гераіну і рэзкую зьмену інтарэсаў, дзейнасьці на карысьць наркотыку, уявіць сабе гэты стан не нарказалежны чалавек ня можа і на чвэрць ступені. І ўва ўсёй прыгажосьці і паўнаце атрымлівае гэта, калі “залезе” ў “сыстэму”[4]. Гераін, у сілу

сваёй чысьціні, як хімічнае рэчыва, хутка ўключаецца ў абмен рэчываў, робячы з часам працу арганізму без сваёй прысутнасьці немагчымай. Чалавек, які ніколі раней не ўжываў опійных сродкаў, ужо пасьля пары дозаў гераіну запар адчуе сур'ёзнае недамаганьне без чарговай дозы. Пры сыстэматычных ін'екцыях памер дозы павялічваецца, і спыніць гэты працэс цяжка.

Калі "сыстэма" набрала разгон, воля і рэшткі цьвярозай ацэнкі ўсяго, што адбываецца, бязьдзейнічаюць. Па меры паслабленьня эфэкту прынятай дозы гераіну наркаман аказваецца перад пагрозай глябальнага катаклізму свайго арганізму, г.зн. абстынэнцыі. Адчуваючы вусьцішны страх, наркаман думае толькі аб тым, дзе знайсьці выратавальнае рэчыва. Вельмі багатых наркаманаў значна менш, чым сярэдне– і нізказабясьпечаных. Наркотыкі адбіраюць усю энэргію. Наркаман у прынцыпе цэлы дзень заняты. Альбо ён расьціснуты "кайфам" і ня хоча нешта прадпрымаць, альбо, як толькі зьяўляюцца сілы для аналізу пэрспэктываў, "тарчок"[5] паглынуты здабычай прэпарату, неабходнага яму адназначна. Як правіла, усё ўпіраецца ў сродкі. Вычарпаўшы грашовыя рэсурсы, крэдыт даверу, наркаман бяз роздумаў закладае альбо прадае ўсё з уласнай маёмасьці, што можа сабе дазволіць.

Рана ці позна, гераіншчык адчувае псыхічнае, маральнае і фізычнае зьнясіленьне. Патрабуецца перапынак. Бывае, псыхалёгія жаданьня пакінуць на час гераін заключаецца ў тым, што нарказалежны шчыра думае пра завязку назаўсёды. Мацёрыя гераіншчыкі выдатна сябе ведаюць, ніякімі ўяўнымі шчырымі ўстаноўкамі на поўнае спыненьне ня бавяцца. Яны папросту шукаюць спосабы найменш бяскроўнага выхаду ("саскоку") з "сыстэмы". Якія тут спосабы ў іх могуць быць?! Перайсьці на "шчыльнае" ўжываньне іншага наркотыку, які мог бы перабіць, заглушыць гераінавае галаданьне. Разумна зьніжаць дозу?! Амаль нерэальна. Чалавек–"сыстэма" ня зможа разумна разьмеркаваць рэчыва, ад якога ён моцна залежыць. Што трапляе ў рукі "тарчку", то і будзе ў яго паступаць былымі і большымі дозамі. Часта "апіюшнікі" выратоўваюцца алькаголем, марыхуанай. "Пераломваюцца" тыдзень–два, пераносячы тэмпэратуру, выкручваньне суставаў, агульную моцную слабасьць у суправаджэньні з дэпрэсіяй.

Ад перадозаў гераінам паміраюць часьцей, чым ад любога другога наркотыку. Аднаму можа падасца, што не стае моцнага “прыходу”[6], дозу трэба значна павялічыць. (А гераін па якасьці ўсё ж розны бывае. Вось патрапіцца добры, а наркаман “на вока” сыпане сабе, ды яшчэ і дадасьць ад сквапнасьці, якая ў тарчкоў вельмі разьвіваецца ў пляне ахвоты да наркотыкаў.) Пасьля доўгага адпачынку ад гераіну, калі арганізм перабудаваўся на нармальны рэжым, нехта пераацэньвае свае фізычныя магчымасьці і ўвальвае добрую дозу, хаця непадрыхтаваны, можа, і да палавіны. Перадоз. Мне здаецца, самы рэальны перадоз — гэта зь дзікага перапою пахмяліцца, “дзеўбануцца белым”[7], каб зрэнкі ажно павылазілі, і па глупстве яшчэ “па чорным” ударыць — і “каюк”. Звычайна овэрдозы прыкладна з такіх прычынаў і бываюць. Толькі сумесі розныя. Адсутнасьць дастатковага досьведу ўва ўжываньні рэчыва — таксама ня рэдкасьць. У ліку ўсякіх выпадковасьцяў частка зь іх займае сьвядомы прыём перадозу.

У 60–я гады, калі ЛСД стаў ужывацца ў ненавуковых мэтах, яго прызналі забароненым прэпаратам. Досьледы, зьвязаныя з вывучэньнем дзеяньня ЛСД на сьвядомасьць, прыпыніліся. Хаця сярод наркаманаў многія не адносяць ЛСД да наркотыкаў як такіх. Фізычнай залежнасьці ён за сабой ня цягне. Небясьпечны для псыхікі, калі ўжываць прэпарат шмат і запар: чалавек ня справіцца зь неспадзяванай плыняй інфармацыі.

Каб намякнуць на прынцып дзеяньня ЛСД на сьвядомасьць, я магу прывесьці толькі сумбурную ілюстрацыю з уласнага досьведу. Даўно прыдумана форма, у якой дасьпявае да ўжываньня ЛСД–25 (дакладная назва). Кіслата мае высокую канцэнтрацыю, і больш–менш прымальная доза можа разьмясьціцца, скажам, на насычанай ЛСД паперы памерам 6х6 мм. Нават і гэтага бывае шмат. Дастаткова і 1/2 ад 6х6. Такі мікракосмас! Прапанова арыентуецца на попыт. Гэта я да чаго. Каб той, хто зьеў “паперку”, не фіксаваўся, не завісаў на адкрыцьці асобных, часам жудасных сутнасьцяў, напрыклад, сваёй, да кіслаты дадаюць стымулятары, якія не даюць сумаваць і акцэнтуюць увагу на пазытыве. Бываюць яшчэ ўсялякія сумесі, прысутнасьць і колькасьць якіх вызначае разнавіднасьць, тып “паперкі” ЛСД. У кожнага гатунку ёсьць свая назва.

...Цяпер дакладна ўяўляю, як залежыць стан чалавека ад стану Сонца, Месяца, становішча іншых плянэтаў і, канечне, стану энэргіяў усіх шматлікіх аб'ектаў Сусьвету. Гэтыя фактары ўтвараюць складаную сыстэму, адным з фактаў якой зьяўляецца наяўнасьць жывой прыроды на Зямлі, частковай праяваю яе зьяўляюся я. Далей па загадзе ланцуга наступстваў, якія немагчыма вылічыць, урэшце, я пішу гэтыя радкі. А што мяне прымусіла? Паперкі, сьмешна сказаць... Я і навакольнае. Адно цэлае "Я" павінна па лёгіцы быць роўнае двум маім "Я" ў два разы меншым. І гэтак далей. Гнязьдзіцца ў мільярдах малых "Я" ўжо становіцца немагчыма, проста–такі невыносна. Тым больш яны ("Я"), дзелячыся кожнае на больш дробныя два, аўтаматычна разьлятаюцца па розных парамэтрах часу, прасторы і нечага яшчэ, што немагчыма выразіць... Неяк раптам я ўсьвядоміў, што забыўся на сваё існаваньне. А адзін раз усьвядоміў, што забыўся, значыць, прыгадаў пра "Я", перапалохаўся. "Малыя" ("Я") сплятаюцца, зьбіраюцца. Складаюся, як веер. Я. Адно "Я". Скрозь неадчувальнасьць цела ўсё ж прабіваецца гіпэрчалавечае (у сэнсе, жывёльнае) пачуцьцё страху за сябе — здаецца, што арганізм зь нечым не спраўляецца, і я паміраю. Паніка. Спроба выратавацца. Усё гэтае перажываньне ўклалася ў адно імгненьне, калі веер аказаўся складзеным. У наступнае імгненьне назіраю карціну сваіх дзеяньняў (у асноўным нават вачмі): хапаю шклянку, бягу на кухню па ваду. Толькі пачаў піць — адчуваю, што губляю прытомнасьць, і хутка губляю. Усё! Аглушыла зусім, візуальна калідор — карцінка, экран, у які гляджу, але ўсё менш усьведамляю адлюстраванае, ног ня чую. Мозг, нарэшце, успрымае ўсё настолькі прымітыўна, што страх сьмерці ўжо не ўспрымаецца. Каля крану з вадой я (цела) аказваюся ўжо без адзнакаў дзейнасьці мозгу. Сьвядомасьць заўважыла гэта і адразу аказалася ў целе. Я сьмяюся без адзінай ноткі, якая б абцяжарвала. Я перажыў паміраньне. І не памёр. Гэта шыфрам лягло ў маю душу. У мяне мелася псыхічная траўма, зьвязаная са згубай прытомнасьці, рэанімацыяй, бессэнсоўнай барацьбой за жыцьцё (цела). Сьвядомасьць прайграла сытуацыю з паміраньнем, дзе паказала асобнасьць сваёй сутнасьці, бо ў самы крытычны момант чым менш усьведамляў мозг навакольнае, і панятак "Я" аўтаматычна губляў актуальнасьць, тым больш адчувалася прысутнасьць (чыста назіральная)

сьвядомасьці па–за целам. Адбытае пераканала мяне ў несьмяротнасьці сьвядомасьці. Гэта вылечыла мяне ад панічнага страху сьмерці. Мне пашанцавала.
Хто мала знаёмы з падобнымі рэчамі, крышку не зразумее выкладзенага. Усё, што я апісаў, па сутнасьці, урывак віртуальнага падарожжа ў сьвядомасьць.
Супэрпадпольнасьць, некаторы дэфіцыт наркотыкаў стварылі субасяродзьдзе з дакладнымі, цьвёрдымі ўмоўнасьцямі і прынцыпамі ўзаемадачыненьняў, нават са сваім мэнтальным полем. Каб набыць наркотык, трэба ўлезьці ў павуціньне ўсякіх тусовак, кансьпірацыйных перазвонаў, потым знайсьці месца правядзеньня мерапрыемства, усё гэта празь нейкія перашкоды. Пакуль зьдзейсьніш намер, утворыцца цэлы сьвет ззаду. Знаёмых, падказчыкаў, братоў па зброі ўсякіх... Такая фундамэнтальнасьць ні стуль ні сьсюль. Са сваімі мітамі, навучаньнямі, мастацкай культурай мікрасьвету. У нейкі момант чалавек усьведамляе сябе паўнапраўным чальцом субкультуры, блізкай да наркотыкаў. Цяпер ён пастаянна мае верагоднасьць наркатычных прыгодаў. Дапусьцім, наркотыкі яму не патрэбныя, а неабходнае памаўленьне, тусоўка, шум, актыўная рэляксацыя. Кампанія, у якую чалавек прыйшоў весяліцца, адпачывае, і не без наркотыкаў. У сярэднім факт таго, што малады чалавек, ня думаючы, далучыцца да ўсіх, верагодны працэнтаў на 80. Такі, да непрыстойнасьці прымітыўны прыклад я прывёў, каб нагадаць пра сындром калектывізму, якому так паддадзеныя розумы падлеткаў.
Добра, што ў нас народ закамплексаваны, сродкаў на загул амаль няма, а галоўны маральны прыярытэт — быць Мужыком. Г.зн. быць біяадзінкай, якая ўмее: гарэлку, цёлку, ну, і “за базар адказаць”. А можна быць і добрым Мужыком: бадун, дом — шклянка — аўтазавод — шклянка — агромністая жонка, дом — шклянка — і так да бясконцасьці. Гэта ратуе Беларусь ад скачкоў распаўсюджаньня ВІЧ–інфэкцыі.

[image]
[image] *Пятаддзіі ў 4(5)-1999* .
[image]
[image][image][image][

тронете, я вас всех передавлю“. *(А.Лукашэнка. „Навіны“, 27.03.1998 г.)*
5. „Я знаю телодвижение каждого нашего спортсмена! Меня до сих пор трясет, когда нашего парня сняли за 2 км до финиша в марафонской ходьбе! Это сделал российский судья… Это предмет особого разговора в том числе и с руководством России“. *(Зь інтэрвію А.Лукашэнкі Краснаярскаму тэлебачаньню.)*

6. „…Я президент, а не врач, и дыхание не даю… Если директор генеральный „Пинскдрева“ является тем человеком, о котором Вы сказали, то третье дыхание ему будет, это я Вам гарантирую“. *(А.Лукашэнка. Адказы на пытаньні дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. БТ, 06.09.1996 г.)*
7. „Выбросьте вы, Борис Николаевич, из головы эти мысли о Беловежской пуще. Кравчук и Шушкевич заставили вас подписать это соглашение. Это была их цена за помощь в борьбе с Горбачевым, ведь они понимали, что два медведя в одной берлоге жить не могут, а вы тогда боролись за власть в России“. *(А.Лукашэнка. „Огонек“, №43, кастрычнік 1996 г.)*
8. „…Нашли время в течение 2 недель обсуждать проблемы, допустим, простреленных ягодиц молодой сотрудницы одного депутата. 2 дня и 2 ночи кипел Верховный Совет. Зал — то раздвигались стены, то снова сдвигались. Высоты потолка не хватало, там выше потолок, чем здесь, то поднимался потолок, то опускался. А что обсуждали?“ *(А.Лукашэнка. З выступу перад прадстаўнікамі грамадзкасьці Гарадзенскай вобласьці. БТ, 15.08.1996 г., 17:30.)*
9. „Что наши руководители предприятий с Гродненщины делают в Америке? Химики там или мелиораторы… Что вы там химичите в Соединенных Штатах Америки? Мне же докладывает каждый раз Мясникович обзор, кто куда поехал и за сколько! Так вот, спросите у этих людей от моего имени, что они оттуда привезли. Что вы там делаете? За чей счет вы туда ездите? Что вы там смотрите? Я там был неделю, придите — я вам все расскажу. Зачем вам еще туда ехать?!“ *(А.Лукашэнка. З выступу перад кіраўнікамі ўсіх узроўняў у Горадні 05.08.1998 г., трансьляцыя па БТ у 21:00.)*
10. „Принято решение о предоставлении отдельного здания для журфака рядом с резиденцией президента. Будете дышать

тем же, чем я“. *(А.Лукашэнка. З выступу на форуме журналістаў краінаў СНД у Менску 05.05.1998, „Имя“, 07.05.1998 г., №18 (150).)*
11. „С сегодняшнего дня воздействовать на СМИ, а также вмешиваться в их работу мы будем весьма активно. Я пришел как минимум на 10 лет, и журналистам к этому надо готовиться“. *(А.Лукашэнка. „Фемида“, 09.01.1995 г.)*
12. „Я ни за кого не буду голосовать. Ни за кого! Все равно обманут. Одни ушли со льготами, вторые придут — льготы прихватят. И еще президента будут давить. Не потому, что я тут против выборов. Ради бога!.. Но я не пойду голосовать“. *(А.Лукашэнка. З тэлевыступу напярэдадні парлямэнцкіх выбараў, 20.04.1995 г.)*
13. „Сегодня именно в Беларуси положено начало самому демократическому процессу в мире…“ *(А.Лукашэнка. З выступу перад членамі Верхняй палаты Нацыянальнага сходу, 10.06.1997 г.)*
14. „Это то великое изменение в будущем, которое произошло в нашей стране, когда из политиканства, когда из митингующей Беларуси мы стали цивилизованным обществом“. *(Выступ прэзыдэнта Беларусі А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў Беларусі 4.10.1997 г. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.97 г.)*
15. „Пускай Антончик едет за границу. Я ему куплю билет. А жену и детей его обеспечу, возьму на свое содержание!“ *(А.Лукашэнка. БТ, “Панарама”, жнівень, 1995 г.)*
16. „Сейчас сможете выйти, я сказал, что хочу поговорить… Не надо, вы знаете, и я знаю тоже, что вы знаете, а чего не знаете, вы меня не подстегивайте, коль поставили на эту трибуну“. *(А.Лукашэнка. „Фемида“, 19.06.1995 г.)*
17. „Гуманитарная наука никогда не станет и не будет полем для сумасбродства. Это я вам, извините за прямоту, хочу четко сказать“.
„Как только началась подготовка этого указа, развернулась страшная драка между учеными…“.
„Вы сегодня обижаетесь на то, что возникло ряд академий в отраслях: Академия аграрных наук, медицинских наук. Какой там? Канализационных нет еще? Будет уже. Ну, вот видите, даже канализационных наук, Президент говорит, будет“. *(З выступу прэзыдэнта Беларусі А.Лукашэнкі на Агульным*

сходзе Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, 19.05.1997 г.)
18. „Нынешний пакет законопроектов о приватизации Верховный Совет принял „под себя“, поскольку депутаты знали, что они первыми прибегут к кормушке… У этой кормушки все хрюкают одинаково — и красные, и белые“. *(А.Лукашэнка. „Советская Белоруссия“, 22.04.1994 г.)*
19. „Нам такая демократия с гвалтом не надо. Нам демократия надо, когда человек работает, получает хоть какую–то зарплату, чтобы и хлебушка купить, молочка, сметаны, творожку, иногда кусочек мяса, чтобы накормить ребенка и так далее. Ну, с мясом уже давайте летом много есть не будем“. *(А.Лукашэнка. З размовы з рабочымі Менскага аўтазаводу. 28.05.1998 г. „Навіны“, 10.06.1998 г.)*
20. „Мудрый Китай присматривался к политике нашей Беларуси. И сегодня я уже сказал Цзян Цзэмину, что он уже прищурил глаза на меня не смотрел, а смотрел прямо мне в лицо и заверил и меня, и весь белорусский народ, что Китай будет предан дружбе белорусского народа“. *(А.Лукашэнка. 31.12.1997 г., БТ, 23:29.)*

21. „О, женщины — это мои избиратели. Вот говорят, что Лукашенко одни женщины поддерживают. А я говорю: дай Бог, чтоб так было до конца жизни… И страна будет наша — женская. А я буду у вас руководителем партии вашей…“ *(А.Лукашэнка. З размовы з жыхарамі мікрараёну „Малінаўка“ г. Менску. „Свабода“, 08.10.1996 г.)*
22. „Я считаю, что члены моей семьи не должны влезать в политику. У вас, к примеру, есть жена? Что она, глупее моей жены? Но она же не редактирует вашу газету? Нет. И нечего женам делать в государственных делах… И я считаю, что когда какой–нибудь государственный деятель с супругой из самолета за руку идут и вообще публично демонстрируют любовь, это все зачастую показуха. Игра на публику. Я к этому не привык. Да и не в традициях это нашего народа — демонстрировать везде и всюду свое семейство. Да, есть жесткие протокольные нормы и так далее. Но у меня другая политика. Меня люди в Беларуси понимают. Иногда желтая пресса подпускает обывательские шпильки по поводу моей жены. Мол, вот бедная женщина сидит в деревне и лопатой копает землю каждый день. Тут надо разбираться. А может, и хорошо, когда человек

ближе к земле… У меня ведь нет даже квартиры своей. И жена продолжает жить в том, уже легендарном, деревенском доме… Да и что это за расстояние? Проблемы большие? Или что мы, молодожены, по 18–19 нам лет? И каждую минуту нужно видеться? Поэтому не переживайте, все нормально“. (*Інтэрвію А.Лукашэнкі расейскім журналістам. „Советская Белоруссия“, 14.10.1997 г.)*

23. „Татьяна Миткова недавно ведет репортаж, я ее очень уважаю, ну, и с такой издевкой называет меня „Отец нации“. В Беларуси меня никто так не называет, к сожалению, только в российских средствах массовой информации. Не надо так, не надо, мы ведь русские люди…“ *(А. Лукашэнка. БТ, 23.01.1998 г.)*

24. „Я часто вам говорю, что я три года вас на плечах несу!“ *(А.Лукашэнка. З выступу ў Горадні. Тэлетрансьляцыя па БТ 05.03.1998 г.)*

25. „Я свой народ два года перед собой как маленького ребенка несу, боясь где–то упасть. Ибо упадешь — все развалится, на кусочки развалится“. *(А.Лукашэнка, „Русский курьер“, 20–27.12.1996 г.)*

26. „И дети у меня хорошие. Их, что характерно, никто в Минске не знает, и это самое главное. Самое большое достоинство президентов, больших политиков — это когда никто не знает об их детях и других членах семьи“. *(Зь інтэрвію А.Лукашэнкі журналістам Саратаўскай і Пензенскай абласьцей, „Советская Белоруссия“, 14.11.1997 г.)*

27. „Мы можем проломить любую стену, если мы будем вместе!“ *(З выступу А.Лукашэнкі перад дэлегатамі ўстаноўчага зьезду „беларускага патрыятычнага саюзу моладзі“. 21.05.1997 г.)*

28. „Меня очень настораживает и волнует проблема, когда, видите ли, и в школе появляются оппозиционеры и сторонники существующей власти и народа белорусского. Не допустите этого. Не должно быть, дорогие мои, этого. Вы гробите учащихся. Вы им, особено оппозиционно настроенные преподаватели, вбрасываете в этом возрасте, когда человек очень усваивает любую идею, слишком много негативного, и, приходя в ВУЗы, он сразу транзитом выходит сюда на проспект и начинает бить окна и переворачивать автомобили…“ *(З выступу А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў*

Беларусі 4.10.1997. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.1997 г.)
29. „Государственная комиссия создана из умов наших людей, кстати, разных людей“. *(З выступу А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў Беларусі 4 кастрычніка 1997 году. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.1997 г.)*
30. „Как только учительство в последние два года заняло жесткую позицию и отказалось от войны против своего народа, его воли и властей, так сразу ситуация в стране начала входить в нормальное русло“. *(З выступу А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў Беларусі 4 кастрычніка 1997 году. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.1997 г.)*

31. „Ельцин со мной на корте не справляется, Коржаков не справляется, Лужков проиграл три раза… В последний раз с Лужковым мы играли на пять тысяч тонн сливочного масла: если я побеждаю, — Беларусь имеет право поставить их в Москву и продать по своей цене. Мэр все же проиграл. Я говорю: готовь теперь холодильники“. *(А.Лукашэнка. „Комсомольская правда“, 09.04.1996 г.)*
32. „Я лично формировал олимпийскую сборную в Японию в Нагано. И каждый тренер, и спортсмен, который не оправдал возлагавшихся на них надежд, ответят по всей строгости!“ *(А.Лукашэнка. „Народная газета“, 21.02.1998 г.)*
33. „Я категорически запрещаю всякие демонстрации, когда крестьянин в поле, когда он работает. Все переносится на зиму“. *(А.Лукашэнка. Беларускае тэлебачаньне, 29.07.1996 г., 9:00.)*
34. „Все должны работать, а не организовывать кампании по отрешению от власти президента. Я хочу заявить, что я намерен работать не только этот срок президентом, но и 2 будущих срока. Из этого попрошу политиков исходить и не отрешать меня от власти… Я хочу заявить однозначно: пока меня отрешит кто–то от власти, кой–кого я отрешу до того, как он подумает об этом“. *(А.Лукашэнка. Беларускае тэлебачаньне, 29.07.1996 г., 9:00.)*
35. „Мы пробовали выработать национальную идею. Ничего не получилось. И я предложил — давайте вернемся к христианским ценностям. Сам я два раза хожу в церковь, поддерживаю ее. Хотя если выступаю публично, признаюсь, что

атеист. Меня Митрополит Филарет не раз просил: „Вы уж на людях в атеизме не признавайтесь“. *(А.Лукашэнка. „Имя“, 06.11.1997 г.)*

36. „Меня часто били, не в прямом, конечно смысле, за то, что я не молчал, а всегда говорил правду, сражался за нее до крови в ногтях…“. *(А.Лукашэнка. З кнігі „А.Лукашенко — Президент Республики Беларусь“. Минск 1998 г.)*

37. „Сегодня мы и с Патриархом моим великим другом Алексием Вторым, и с Филаретом нашим Митрополитом обсуждали эту проблему. Я для них двери школы не закрываю. Идите. Не надо никаких программ. Идите к учителю, идите к ученику, убедите их там на месте, что не будет у большинства, у большинства отторжения от этого“. *(З выступу А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў Беларусі 4 кастрычніка 1997 году. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.199 г.)*

38. „Священнослужители были изгоями в обществе. Сегодня все схватились за свечки и побежали в церковь. Это страшно, это опасно, когда происходят такие тенденции. Многих из тех, кто эти свечки в руках там держит, я бы на порог церкви не пустил“. *(З выступу А.Лукашэнкі на першым зьезьдзе настаўнікаў Беларусі 4 кастрычніка 1997 году. “Беларускі Маніторынг” № 218, 06.10.1997 г.)*

39. „…В Беларуси был только один реформатор — это Лукашенко, когда я еще только депутатом стал, еще при Горбачеве, я и пленумы ЦК готовил, несмотря на свою молодость, меня Горбачев приглашал часто в Москву. Мы проработки делали, я рецензировал „500 дней“ Явлинского… я очень часто принимал участие в заседаниях правительства в Советском Союзе“. *(Зь інтэрвію Лукашэнкі Краснаярскаму тэлебачаньню. У Беларусі не паказвалася. Цытуецца па публікацыі ў газэце „Имя“, 30.08.1995 г.)*

40. „…Когда мне Тесовец со слезами на глазах позвонил около 12 ночи и сказал: Александр Григорьевич, не получается по–хорошему! Повынимали ножи, достали лезвия. Первое говорят, вскрываем вены, отрезаем себе головы, и вас повырезаем, кровью зальем здесь все. Ну, извините, такие угрозы в резиденции Президента — это уж слишком! … Депутаты — это граждане Республики Беларусь, которым не позволено нарушать порядок в резиденции Президента. Пришли сюда, отработали, сухо, чисто, тепло, убрано — будьте добры после

работы идти домой отдыхать. Поэтому мы покажем народу эту пленку и не только эту“. *(Тлумачэньні А.Лукашэнкі пасьля зьбіцьця дэпутатаў ад апазыцыі ў залі паседжаньняў Вярхоўнага Савета; стэнаграма 96–га паседжаньня Сэсіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Серада, 12.04.1995 г., 16 гадзін.)*

41. „И если у кого–то спесь, извините меня, как в народе говорят, роги начали вырастать или рога, как тут лучше сказать, наверно, роги, потому что рога в другом смысле говорят. Ну так их надо сбивать, пока не поздно!“ *(А.Лукашэнка. З выступу перад кіраўнікамі ўсіх узроўняў у Горадні, 05.03.1998 г., трансьляцыя па БТ у 21:00.)*

42. „В течение этого года в третий раз предпринимаются попытки тихо, спокойно свергнуть законноизбранного президента. Первая попытка была в октябре—ноябре прошлого года. Весной этого года была вторая, начинается третья. И все выжидают момент, все боятся только того, что президента еще простой народ в какой–то степени, может быть, поддерживает и верит ему… Сегодня какая–то контра окопалась в этом крыле правом Верховного Совета в Доме правительства“. *(БТ, 19.10.1996 г. 21:40. Рэпартаж з сустрэчы А.Лукашэнкі з вэтэранамі ў Доме афіцэраў.)*

43. „Впервые за последние десять лет в ночь с 31–го на 1–е абсолютно все минчане — 2 миллиона человек вышли на улицы. Я не ожидал, что 2 миллиона будет на улицах. Я бы на это диво тоже приехал посмотреть из своего леса“. *(А.Лукашэнка. БТ, „Панарама“, выступ на 60–гадовым юбілеі Менскай вобласьці, 16.01.1998 г., 21:09)*

44. „…Уважаемые депутаты Верховного Совета! Я не пришел просить извинения, как здесь Голубев этого требует. Вы этого, господин Голубев, от меня не требуйте, потому что не получите. Я просто хочу проинформировать вас, откуда ноги растут… Мы приняли закон, и этот закон надо сегодня осуществлять. Я сейчас скажу, откуда ноги растут… Да далеко не прыгнули, не шагнули, но ничего не развалилось больше того, что было развалено. А теперь по поводу ног. Я очень сомневался, что этот вопрос будет внесен в Верховный Совет, но меня постоянно информировали о тех движениях…“. *(А.Лукашэнка. З выступу на сэсіі Вярхоўнага Савета. Цытуецца па газэце „Фемида“ за 6.02.1995 г.)*

45. „Так что ж я буду кормить суверенитетом, даже не

суверэнітэтам, а размовамі пра суверэнітэт і незалежнасць, пра беларускую мову, беларускі народ? Так наелись же уже этой болботни. Поэтому мне выхода не было, я должен был спокойно решать эти вопросы, спокойно дать возможность людям выбрать, тихо (это вы должны были сделать) уравновесить языковую проблему. Это вы должны были сделать, а не я. Не кричать на улицах, не с транспарантами ходить, а уравновесить ее. Как? Вы должны были выработать методику вот с этими чиновниками. А я должен кусок хлеба для вас заработать“. *(Выступ А.Лукашэнкі на сустрэчы з кіраўніцтвам Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. 5.08.1998 г., БТ, “Панарама”, 21:00.)*

Оцени! 5 - отл. 4 - хор. 3 - уд. 2 - неуд. 1 - ...
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гісторыі да Зьместу 4(5)-1999

Вячаслаў Адамчык Бронікі, альбо Навэля пра каня

Вячаслаў Адамчык— прызнаны майстар “заходнебеларускай прозы”. Аўтар эпічнай тэтралёгіі “Чужая бацькаўшчына” (1977), сцэнароў да дакумэнтальных фільмаў пра Мележа, Таўлая, Якуба Коласа. Ягоныя сыны таксама сталі пісьменьнікамі: яны друкуюцца пад псэўданімамі Адам Глёбус і Міраслаў Шайбак. Жыў на адной пляцоўцы з Уладзімерам Караткевічам. У 1998 годзе выйшла ягоная кніга “Развітальная аповесць” (“Мастацкая літаратура”), складзеная зь дзёньнікаў і прозы. У ARCHE–“Вялікая айчынная вайна” было надрукаванае ягонае апавяданьне “Леанарда”.

Дзьве сям’і, і ў кожнай па два Бронікі — бацька і сын. І межавалі яны ня толькі полем, але і сенажацямі. Хоць якая там сенажаць — адно куп’ё, зарослае стрэлкамі конскай цыбулі ў белых кутасіках — пушніцы, як на яе яшчэ кажуць.

Вось там і пасьвіўся спутаны вераўчаным путам драбнаваты, але цягавіты Варанец — конь Броніка Жука. На пашу ў сьпякотны полудзень прыехаў на ім, прыгнаўшы перад сабою яшчэ пяцёра сівых авечак і цёмна–вішнёвую карову, меншы Жукоў хлопяц.

Ён і згледзеў, нават здалёк, як сюды ішоў, несучы за брызэнтовы пасак вінтоўку і ледзьве не чапляючыся ёю за купіны, іхны сусед па сенажаці і полі, белабровы Бронік Крывеня, па мянушцы Масьлянка, што нядаўна апынуўся ў

партызанах. Быў хто болей зь ім ці не, Жукоў хлопяц не заўважыў. Лежачы на разасланым каптане і затоена сочачы за Масьлянкам, ён чакаў нечага іншага, а не таго, што ўзброены Масьлянка падыдзе да іхнага Варанца, які прагна прыпадаў да травы, адмахваючыся доўгім ільсьніста–чорным хвастом ад заедзі, здыме пута, закіне каню за шыю і ціха павядзе з лужка. Вобруць засталася ляжаць на тым жа шарачковым каптане, на якім сядзеў уражаны і перапалоханы ўбачаным басаногі падлетак. Але сядзеў ён да той пары, покуль за зялёным ад мройнага аўсу боханістым грудком не схаваліся чорны пакорны конь і зьлінялая пілётка на белабрысай галаве. Пудкім зайцам хлопяц рвануўся зь месца і цярэз палі паімчаў у вёску. Бацьку ён застаў якраз дома — той на дрывотні, паблісквающы сякерай, калоў дровы і, убачыўшы ўстрывожанага сына і здагадваючыся, што ўчынілася нешта благое, убіў у калодку сякеру і падаўся насустрач сыну ўжо сам.
— Каня Масьлянка забраў, каня! — ледзьве адсопся задыханы хлопяц.
— Каня, кажаш?
— Каня.

— Тады бяжы назад, глядзі скаціну, а я пайду ў мястэчка, у паліцыю... Накажу Броніку.
...Ня вельмі хацелася старому Жуку ісьці на паклон да старэйшага сына, зь якім летась, звозячы з поля снапы і ўкладаючы воз, яны пабіліся. Праўда, біўся ён, бацька, калі ўкладзены сынам і ўжо ўціснуты рублям воз, пахіснуўшыся на разоры, раптам рассыпаўся. Нядобра і няспрытна ўложаныя снапы высьлізнулі з–пад рубля і шухнулі на яго, на старога Жука. Злосны, пунтовы і не заўсёды разважны бацька, як трымаў у руцэ ядлаўцовае пужальне, так і смальнуў ім па галаве і па сынавых плячах. Перад гэтым яшчэ перавярнуўшы тое пужальне тоўстым канцом. Сын адбегся, знайшоў на іржышчы камень, але ня кінуў у бацьку — асьцярогся — шпурнуў міма. І ў той жа міг, і тут жа ўцёк з поля. Дзе ён бадзяўся, што рабіў, але прыйсьці нанач дадому не прыйшоў. А празь дзён колькі старога Жука нібы аглушыла нечаканая і балючая новасьць — яго старэйшы Бронік запісаўся ў паліцыю. Жонка, праўда, зьбегала ў мястэчка, але сына да хаты ўжо не

прытурыла. Сам Бронік Жук, помсьлівы і злосны на сына, нікуды не хадзіў і нічога не дамагаўся — ведаў, што ўсё гэтае стараньне марнае і дарэмнае.
Сустрэліся яны выпадкам праз тыдняў колькі на вуліцы ў тым жа мястэчку — сын быў у дзюбатай шапцы і ў чорнай форме зь сівымі закарвашамі і каўняром. Яны абодва толькі зьдзіўлёна зіркнулі адзін на аднаго і моўчкі, нібы чужыя, разьмінуліся. Трохі адышоўшы ад крыўды і зьнявагі, паліцыянт тады–сяды прыходзіў дадому ў вёску, але на бацьку паглядаў скрыва, помнячы тое гарачае пужальне, што апякло голаў і плечы, і гаварыў толькі да мацеры. На бацькавыя роспыты адклікаўся няхочучы і суха, нават абыякава, даючы гэтым знаць, што з бацькам ніякага знашэньня мець ня хоча.

Можа і ён, стары Жук, не паступіўся б сваім гонарам, каб справа мела іншы паварот. Але ж шапка ня зваліцца, калі пераступіць цераз сваю пыху, бо гонар гонарам, а конь канём. Безь яго ў гаспадарцы, як бяз рук. І трэба схадзіць ня толькі да сына, каб ведаў з каго і які спрос, а ў блізкія Панікарты да Броніка Крывені, сын якога нарабіў столькі бяды — ды каб чый сын, а то іменьніка і равесьніка, зь якім калісьці ў маладыя гады ён, Бронік Жук, таварышкаваў, піў чарку, на вечарынкі ў далёкія вёскі хадзіў і зь якім нават жаніўся ў адзін дзень. Яны тады, маладыя, пад'юджваючы і падзадорваючы адзін аднаго, нават спрачаліся, чыё вясельле будзе гучнейшае.
А выйшла, што яго, Броніка Жука, на якім ігралі ажно тры музыканты — дудар, скрыпач і гарманісты, а ў Броніка Крывені трэнкалі адны цымбалы.
Пасьля польскай камасацыі, калі доўгія шнуры былі парэзаны на хутаранскія дзялкі, яны, абодва Бронікі, і па полі сталі суседзямі — іхныя надзелы апынуліся поруч, цераз зялёную калматую мяжу. Ужо і будынкі зьбіраліся перавезьці на хутар. Але ён, Бронік Жук, капаючы калодзесь, не дастаў да вады. Апусьціў у глыб васямнаццаць труб, а вады — ні кроплі. А ён, Бронік Крыveня, купіўшы яшчэ не старую хату ў суседніх Панікартах, не пасьпеў перавезьці на свой надзел — усё перабіла вайна. Прыйшлі бальшавікі, зьдзівіўшы і зьняверыўшы ўсіх арыштамі і вывазамі на Сібір, прымусовымі згонамі на „трудовое участие“ і запісамі ў калгасы. І Крыveня,

перабраўшыся ў купленую і даволі спраўную, зрубленую з непадсочанай сасны хату, да часу застаўся ў Панікартах.
А цяпер ужо, на трэцяй раце, зьявіліся немцы, перайначваючы ўсё на свой лад — касуюць тыя калгасы, зганяюць яўрэяў за калючы дрот у гета і вывозяць дужых маладых дзяўчат і хлапцоў у Нямеччыну. Таму і ўцякаюць падшыванцы — хто ў лес да партызанаў, хто ў мястэчка ў паліцыю. А там ужо і паразбэшчваліся, узяўшы ў рукі зброю. І во прыйшоў, забраў каня — і ня знайся. Што ўжо ня будзе, а цягавітага Варанца трэба вярнуць.
...Стары доўга стаяў перад ганкам карычневага ашалёванага дому на высокім падмурку і накрытага памутнелым ужо, як старое вядро, цынкавым дахам. Наўкруга карычневага дома з расхрыстанымі аканіцамі мігацела сетка драцяной агароджы. Выштукаваны прыгожы будынак да нядаўняга прыналежаў ганарыста–нізенькаму пры дзябёлай жонцы Моўшу Ліпскаму, гаспадару тутэйшага местачковага тартака, восеньню спаленага партызанамі. А самога Моўшу, пратрымаўшы паўгоду на пасадзе інжынэра ў сваім жа тартаку, пасьля пажару немцы ўсё ж расстралялі. Казалі, што гэта быў самы апошні яўрэй, якому Бог падараваў яшчэ некалькі месяцаў жыцьця.
Як ні турзаў Бронік Жук хітры замок у жалезнай фортцы, ён ніяк не адмыкаўся. І так і гэтак круціў ручку, але фортка не адчынялася. Покуль з дому на прыгожы ганак з баляскамі, убачыўшы дарэмныя мукі няспрытнага старога, ня выйшаў хлюставата–ганарысты з падбрытымі тонкімі вусікамі сам камэндант паліцыі ў чорнай уніформе. Стары Жук прызнаў у ім колішняга местачковага сальніка, што трымаў найлепшы кілбасны магазін.
— Я на пастарунак, — стары зноў пагрукаў жалезнаю форткаю з загадкавым замком.
— Па якой справе?
„Казаць ці не? — запнуўся стары і схаваў свае вочы. — Мусіць не“.
— Я пытаю, па якой справе?
— Справу маю да сына. Ён служыць тут у вас.
— Прозьвішча як?
— Браніслаў Жук.
— Ён дзяжурыць пры складзе за вакзалам. Там яго можна знайсьці.

Але знайсці склад было ня проста і яшчэ горш — небясьпечна: хадзіць каля чыгункі і цераз чыгунку было забаронена. І ні ў кога не распытаеш — наўкруга адны непадступныя немцы. І найбольш у чорнай форме чыгуначнай паліцыі ці аховы.
Але прыгледзеўшыся да аднога, трохі недалужнага і нягеглага, на якім форма сядзела вахлакавата, Жук здагадаўся, што гэта нехта з тутэйшых — і загаварыў. Салдат аказаўся сапраўды сваім тутэйшым хлопцам і нават ведаў Броніка.
Паказаўшы на доўгі пакгаўз за рампаю, на якой стаялі вялікія, зьнятыя, мусіць, з касьцёлаў, пацямнелыя званы і ляжалі медныя снарадныя гільзы і зломкі каляровага мэталу — усё ўжо гатовае да пагрузкі, — вугравaты хлопец у чорнай форме яшчэ гукнуў у крайнія, шырока рассунутыя (на кольцах) дзьверы:
— Жук, тут да цябе!
Вясёлы і ў добрым настроі малады Бронік, убачыўшы прыгнутага, зьнябожанага бацьку, раптам спахмурнеў:
— Ты чаго?
— Інтэрас маю да цябе.
— Які?

— Ты ж ведаеш, як на яго кажуць, Масьлянку... Ну, таго, што ў партызанах.
— Дзіва што.
— Ён жа ж забраў надоечы нашага каня.
— А чым жа я памагу? — насупіўся меншы Бронік.
— А тым, што скажаш немцам, дзе я прапаў.
— Як прапаў? — недаўменна зажмурыўся паліцыянт.
— Як драпянка за тры грошы. Я заўтра пайду ў Панікарты да Крывеняў і скажу, каб вярнулі каня.
— Ты здурэў, бацька.
— Не, яшчэ пры розуме. — Стары памаўчаў і, абцершы жменяю перасьмяглыя губы, сказаў нарэшце тое, дзеля чаго ішоў да сына: — Калі не вярнуся, каб ты ведаў, з каго спрос. Замальдуй, ці заяві немцам, яны ўміг разьбяруцца.
— Ну намудрыў, бацька, ты на сваю галаву, — пакруціў чорнаю дзюбатаю шапкаю кірпаносы паліцыянт і схаваўся ў пакгаўзе, дзе зноў выбухнуў вясёлы сьмех.
...Дзень выдаўся пагодны. На сонцы тлуста ільсьнілася

маладая, але ўжо шырокая ў пер'і ярына. Чародка белых хмарак сплывала ў ліловыя сутожкі неба. Пеністымі хвалямі на гарбаты грудок набягаў сьветлы, яшчэ не пацямнелы бярозавы гай. Па перадзе яго ружаваў, выгнаўшы залатыя стрэлкі, малады сасоньнік. Шарая дарога з грывамі травы абапол яе, дзе грэлі сьпіны замшэлыя каменьні, дабягала да сіне–ліловага жыта, што выпусьціла срэбна–сівы, вусаты колас, і хавалася ў ім.

Вялікімі босымі ступакамі Бронік Жук пляскаў па тупкай сцежцы збоку каляін. Смуглы, ужо добра загарэлы на вясновым сонцы, з срэбрам сівых кудзеркаватых валасоў, што выбіваліся з–пад старое заношанае кепкі, ішоў ён цяжкавата, па–старэчы падаўшыся ўсім тулавам наперад.

Абнюхваючы дарогу і час ад часу азіраючыся, каб не згубіць гаспадара, яго апярэджваў чорны вялікі сабака зь белым нагруднікам на персях.

Усё вечнае і паўторанае ў сваім харастве — маладое блакітнае неба, салаваты лес, мройна–трапяткая на ветры ярына — і нязводнае чалавечае зло на гэтай зялёнай зямлі — усё блыталася і мяшалася ў гарачых, адчайных думках старога Жука. Яны цяклі і кружылі, як кружыць вір вакол карча, набягаючы на страчанага каня.

Сабака, абнюхаўшы мышэй, драў лапамі іхныя норы, то гэльцаў за палахлівым жаваранкам, што мякка пырхаў з травы і нізенька ляцеў, адводзячы няхітрага сабаку ад свайго гнязда.

А стары Бронік Жук ужо даўно быў думкамі ў Крывеневай хаце, што адным доўгім пашаркам расьцягнулася ад брукаванай вуліцы да лужка, што зарос ружовым вобаратнікам і агоньчыкам смолкі, і дзе шмыгаў, як вуж, ручай, атулены вербамі.

Хацелася ж угадаць, хто будзе ў той хаце? Каго ён застане — аднаго Крывеню ці яго сына са зграяю недавяркаў і што скажа ім, ужо, ня дай, Божа, п'яным.

За думкамі і ня ўбачылася, як былі ўжо Панікарты. Чужыя, патаемна–цёмныя вокны з–пад саламяных застрэшкаў, здаецца, падазрона і ўважна пазіралі на старога Жука. За імі там–сям мільганулі і цікаўныя вочы. Згледзеўшы чужога калматага сабаку зь белым нагруднікам, у дварах на розныя галасы забрахалі ўсе панікарцкія. Ажно Бронікаў вялікі і, здаецца, не баязьлівы Рэкс падтуліў хвост.

— Ну ты чаго спалохаўся? — гаспадар паляпаў яго па загрыўку. — Ня бойся, я тут, пры табе.
Крывенева сядзіба была якраз пасярэдзіне кароценькай, на хат пятнаццаць, вёскі. За бусловым гняздом, што чорным вялікім вянком зачапілася за верхавіну старое грушы з дупламі для шпакоў і вераб'ёў. У гнязьдзе на адной назе стаяў, пэўна, над малымі, яшчэ не аперанымі бусьлянятамі, трохі смутны, зьнябожаны бусел.
Пусьціўшы за браму сабаку і загадаўшы яму тут сядзець, Бронік Жук увайшоў у чужы двор, чуйна азіраючы яго. З расчыненых хлявоў густа пахла гноем, і рохкала, шукаючы ратунку ад гарачыні, і рылася ў сваім загарадку кормная сьвіньня.
Бронік ступіў босаю нагою на гарачы камень, што ляжаў перад парогам, і, прыгнуўшыся, увайшоў у сені, а потым — у хату, успалахнуўшы чорны рой зьвінючых мух, што ўзьляцелі з падваконьня і лавы.
Нападобе было, што ў хаце нікога няма.

— Ёсьць у дома хто? — галосна спытаў Бронік Жук, зазіраючы яшчэ за печ, на ложкі.
На голас яго, жалосна мяўкнуўшы, з–пад стала выбегла мурзатае белае кацяня. І, задраўшы хвосьцік, прытульна пацерлася аб калошыну чужога чалавека, прызнаўшы, мусіць, за свайго.
— Дзе ж яны? — Бронік плячыма падаўся назад да дзьвярэй.
З надворку ўжо ўбачыў, як вуліцаю бегла дзяўчына–падлетак. Але нечакана зьніякавела перад брамаю — згледзела страхатліва вялікага сабаку, а потым і яго, Броніка Жука.
— Вой, хто ж гэта ў нас?
— Свой я, — Бронік падцягнуў на клубах шарачковыя порткі з латкамі на каленях і падаўся насустрач дзяўчыне. — А ты не дачка Броніка Крывені будзеш?
— Ага, — яна ўсё скоса паглядала на вялікага чорнага сабаку.
— Вой, які ён у вас страшны.
— Ды сабака як сабака. А бацька дзе?
— Вуньдзека, — азірнулася на вуліцу і пачала адчыняць, зьняўшы крук і папхнуўшы дзьве палавіны разам, шырокую браму.
Ідучы за плугам, што парыпваў на суваку — шырокай дошцы са

скабою, — з ворыва варочаўся сам Бронік Крывеня ў сподняй расхрыстанай сарочцы, у круглай, яшчэ царскай фуражцы, як яе называлі — картузе, зь няголеным колькі дзён тварам, сівым, нібы абсыпаным попелам. Над стомленым, натруджаным за дзень у плузе канём віўся і дацінаў яго разьюшаны гмыз.

Убачыўшы ў сваім двары Броніка Жука, Крывеня, нібы зьбіўся з хады, прыстакнуў на які міг, а потым выпрастаўся і, спыніўшы каня, падаў суседу руку. У поціску Крывеневай рукі Жук нібы ўлавіў, што яна трохі дрыжала. Ён, Крывеня, мусіць, ведаў пра забранага каня.

— Здароў быў, я да цябе, — Бронік Жук прытрымаў нахіленую палавіну брамы, каб лепш і вальней праехаў у двор Крывеня.

— Ды бачу, што да мяне, — Крывеня даехаў да шырокіх дзьвярэй падпаветкі і пачаў распрагаць каня.

— Арэш на сваім, а дзе схаваў майго?

— Не ў мяне трэба пытаць.

— А ў каго ж?

— Сам ведаеш, мы сваім сынам ужо не расказ.

— Я зьбегаю, яны тамака, — раптам страпянулася дзяўчына, — у Дземянісі п'юць.

— Тады пачакай, — прыпыніў дачку Крывеня, — якая з п'янымі гутарка.

— Конь у цябе ёсць, і ты можаш чакаць, — не стрываў і сарваўся на крык Бронік Жук.

— Ты на мяне не крычы, браце, — падняў на яго свае сінявата–ліловыя, як у барана, вочы заўсёды спакойны і разважны Крывеня.

І гэтых вачэй, іхнага колеру, нібы спалохаўся трапятліва–нэрвовы Бронік Жук і ўжо сам загаварыў лагадней:

— Не крычаць я прыйшоў, а папярэдзіць: не аддасьце каня — будзе кепска. Бо немцы і паліцыянты ведацьмуць, чый сын ходзіць з ружжом.

— А твой хіба не?

— Мой чужых коней не забірае.

— Яшчэ як сказаць, — і з–пад чорных броваў, што закручваліся вострымі коскамі, на Жука зноў патаемна зіркнулі сіне–ліловыя вочы.

— А ты, як ні кажы, а майго каня вярнуць мусіш! — Бронік Жук прыляпнуў рукою па сьцягне, клічучы за сабою чорнага, вялікага, як цяля, сабаку і выйшаў за браму.
Яго ніхто не аклікнуў. І праклёну не паслаў усьлед. І гэта яго душыла помсьліваю злосьцю і адчайнаю крыўдаю яшчэ больш. Ішоў ён сьпешна, забыўшыся нават, што ў калене баліць пабітая рэпка, якою ён сёньня зранку выцяўся аб кубеляц у цёмнай варыўні.
У крайняй хаце, чуваць было, стаяла п'яная гамана. Нехта спрабаваў нават зацягнуць песьню, але зьбіваўся, бо, пэўна, ня ведаў яе слоў.
„Не, гэтыя злыдні каня не прывядуць. Не!“ — усе шырэй і цьвярдзей ступаў Бронік Жук. Крыўда балючым камяком падступала да горла.
Выходзячы на палявую дарогу, яшчэ раз азірнуўся на шара–саламяныя, прымрэлыя ад гарачыні Панікарты. Перад гародчыкам крайняй хаты, дзе крэмавымі кветкамі сьвяціўся язьмін, сінела сукеначка таго самога дзяўчаці, што парывалася зьбегаць да Дземянісі і паклікаць брата, што забраў чужога каня.
„Напэўна, там дзе–небудзь у хляве і мой Варанец?..“ — раптам падумаў і прыпыніўся на ясна–зялёным ад падужэлай аўсянай руні крутаватым грудку разгарачаны і ўзбунтованы Бронік Жук.
„А можа, вярнуцца?“ — цяжка адрываючы ногі, ступіў на сьцежку, зацярушаную пухкім, як попел, і цёплым, як попел, сівым пылам.
Сабака азірнуўся на голас гаспадара. Недаўменна чакаў яго, седзячы пасярод дарогі.
Вялікая загарэлая рука з чорна–сінімі, вострымі, як маладзік, канцамі пазногцяў пагладзіла па галаве даверлівага і паслухмянага сабаку:
— І што скажаш рабіць? Ісьці казаць немцам? Тады пагібель усёй Крывеневай сям'і.
...Стрэл пачуў хіба сабака, бо палахліва ўздрыгнуў. Але ўжо пасьля таго, як прашыты куляю навылёт з замежка, з дарогі ў мройна–трапяткі ад парыўнага ветру і кусьцісты, шырокі ў пер'і авёс упаў яго гаспадар.
Стралялі з–пад крайняе хаты, рассунуўшы частакол і паклаўшы на жэрдку вінтоўку. Стралялі, пэўна, наўгад. Але куля сама

іншы раз выбірае цэль.
Перапуджаны сабака яшчэ пастаяў над мёртвым гаспадаром і нарэшце, панура апусціўшы голаў, пабег у вёску. Ён і прынёс дадому трывожную і загадкавую новасьць, чаму не вярнуўся гаспадар і што яго трэба ісьці шукаць...
На трэці дзень, гэтакі ж самы бясхмарны, сьпякотны і зь ветрам сухавеем, нямецкая танкетка, а усьлед за ёю два грузавікі з паліцыяй і коннаю казацкаю сотняю, падымаючы горкі пыл на палявой дарозе, марудна сунуліся на груд, зь якога ўжо былі відаць Панікарты — саламяна–шарая вёска ў пятнаццаць хат і чорным бусловым гняздом пасярод яе.
Стральбы ў навакольных вёсках ня чулі — кароткія аўтаматныя і кулямётныя чэргі глушыў парывісты вецер. Ён прыгінаў да зямлі і сіва–рудаваты дым. Але ў тым боку, куды яго слаў і зносіў вецер, смуродна і чадна пахла спаленым чалавечым мясам.
6--23 чэрвеня 1999 году
Валоўшчына-Менск

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima

гісторыі Зьместу 4(5)-1999

Жорж Батай
Нябожчык

Жорж Батай (1897—1962) грунтаваў сваю інтэрпрэтацыю грамадзтва й гісторыі, містычны досьвед і канцэпцыю літаратуры на ідэі трансгрэсіі (“Літаратура і зло”, 1957). Ягоны літаратурны досьвед не прызнае ніякіх маральных, рэлігійных і містычных прэсупазыцыяў (“гіпэрмараль” *AbbE C.* (1950). Ён шукаў крайнасьці жаданьняў, радасных мук, даходзячы да тых межаў, ля якіх юр і гідота перакрываюцца і нэўтралізуюць адно адно (“Сонечны анус” (1927), “Гісторыя вока” (1928), “Мадам Эдварда” (1937), “Алелюя” (1947). Батай вымагае ад пісьма аголенасьці і жорсткай правакатыўнасьці. Несумненна паталягічныя патрабаваньні.

КАЛІ Эдуард паваліўся мёртвы, яе напоўніла пустэча, доўгае трымценне прабегла па целе і анёлам узнесла яе ў нябёсы. Ейныя голыя грудзі ўзняліся ў храм мары, дзе яе вычэрпвала пачуццё непапраўнасці. Яна стаяла ля нябожчыка, адсутная, недзе па–над самой сабой, у нетаропкім, прыгаломшаным экстазе. Яна адчувала ў сабе адчай, але не зважала на гэты адчай. Паміраючы, Эдуард упрошваў яе распрануцца.
Яна не паспела! Яна стаяла, раскудлачаная; толькі грудзі паспелі выскачыць з–пад сцягненай сукенкі.
МАРЫЯ ЗАСТАЕЦЦА САМ–НАСАМ З НЯБОЖЧЫКАМ ЭДУАРДАМ
ЧАС ужо толькі што скасаваў законы, якія ўстанавіў нам страх. Яна здзела сукенку, перакінула праз локаць паліто. Яна была

голая ды шалёная. Яна скочыла на вуліцу ды кінулася бегчы пад спорным начным дажджом. Чаравікі хлюпалі ў брудзе, дождж струменіў па целе. Ёй захацелася сраць, але яна стрымалася. Лес ахінуў Марыю сваёй пяшчотаю, і яна расцягнулася на зямлі. Доўга сікала, і моч цёк па нагах. Лежачы, яна напявала немагчымым, шалёным галаском:
...гэта галізна,
гэта круцізна...
Потым, узняўшыся, яна накінула плашч, пабегла ў Кіі, і бегла аж да дзвярэй карчмы.
МАРЫЯ ГОЛАЯ ІДЗЕ З ДОМУ
У НЕРАШУЧАСЦІ стаяла яна ля дзвярэй, не маючы смеласці ўвайсці. Знутры даносіліся крыкі, спевы дзевак ды п'янюг. Яна адчула трымценне, але насалоджвалася гэтым трымценнем. Яна падумала: "Зайду, пабачаць мяне голую". І мусіла спярціся да сцяны. Яна расхінула паліто і запусціла ў міжножжа свае доўгія пальцы. Застылая ў трывозе, яна слухала і ўдыхала са сваіх пальцаў пах непадмытай поткі. Раптам гоман у карчме прыціх. У непрагледным змроку ішоў касы ад цеплаватага ветру дождж. Бабскі голас выводзіў сумную простанародную песню. Прыцішаны сценамі нізкі голас, у цемры, на дварэ, браў за жывое. Песня скончылася. Тупат ног і плясканні перайшлі ў авацыю.
Марыя рыдала ў цемры. Яна плакала ад свае бездапаможнасці, упіўшыся зубамі ў руку.
МАРЫЯ ЧАКАЕ ЛЯ КАРЧМЫ
ВЕДАЮЧЫ, што ўсё адно зойдзе, Марыя затрэслася.
Яна адчыніла дзверы, зрабіла тры крокі ў залу: дзверы зачыніліся ў яе за спінай ад скавышу.
Яна згадала, што некалі сніла, як гэтыя дзверы з грукатам назаўжды замыкаюцца за спінай.
Тутэйшыя парабкі, гаспадыня ды распусныя дзеўкі разглядалі яе.
Яна знерухомела спрыхаду, брудная, макравалосая, пад нядобрымі позіркамі. Яе быццам вятруга прынёс (вецер усё шамацеў на дварэ). Паліто прыкрывала цела, але яна адкінула каўнер.
МАРЫЯ ЎВАХОДЗІЦЬ У КАРЧМУ
ЯНА ціха спытала:
— Тут наліваюць?

Гаспадыня за стойкай адгукнулася:
— Кальвадосу?
І паставіла чарачку на стойку.
Марыі гэта не спадабалася.
— Дайце пляшку і вялікія шклянкі, — сказала яна.
Ейны голас гучаў ціха і цвёрда.
— Я буду піць з іх, — дадала яна і заплаціла.
Нейкі парабак у запэцканых ботах сціпла спытаў:
— Прыйшлі павесяліцца?
— Ну, — адгукнулася Марыя.
Яна зрабіла намаганне і ўсміхнулася: яе нібы перарэзала ўсмешкай. Яна прысела поруч з парабкам, прыціснулася нагою да яго нагі, узяла ягоную руку і зациснула сабе паміж ляжак.
Замацаўшы дзірку, парабак прахрыпеў:
— Бляха!
Астатнія напружана маўчалі.
Нейкая дзявуля, ускочыўшы, адхінула крысо ейнага паліто і войкнула:
— Глянь, яна ж голая!
Марыя, не звяртаючы ўвагі, хуценька праглынула шклянку кальвадосу.
— Яна любіць малачко, — мовіла гаспадыня.
Горкая адрыжка сцяла Марыі горла.
МАРЫЯ П'Е З ПАРАБКАМІ
МАРЫЯ сумна сказала:
— Адбылося.
Прадкі чорных мокрых валасоў ліплі ёй да твару. Яна пахітала сваёю пекнаю галоўкаю, устала, скінула паліто.
Нейкі ахламон, адзін з піткоў, накіраваўся з залы да яе. Ён хістаўся, хапаў рукамі паветра і роў:
— Падаць сюды голых баб!
Гаспадыня накінулася на яго:
— Зараз як адцягаю за шнобель...
І ўкруціла яго за нос.
Ён зароў.
— Не, за гэтае месца лепей, — сказала Марыя.
Падышла, расшпіліла прарэх і выцягнула са штаноў абвіслы чэлес.
Чэлес выклікаў рогат.
Са зверскім бясстрашшам, адным глытком Марыя выпіла яшчэ

шклянку.
Гаспадыня, вочы якой ззялі, як ліхтары, пяшчотным дотыкам кранула розверць ейнага азадку і мовіла:
— Яшчэ паласцімся гэтым.
Марыя наліла сабе яшчэ. Гарэлка булькатала, ліючыся.
Яна прагна, нібы перад смерцю, каўтала. Шклянка выпала ў яе з рук. Ейны бясколерны, але добра акрэслены азадак сваёй мяккасцю асвятляў залу.
МАРЫЯ ВЫЦЯГВАЕ ЧЭЛЕС П'ЯНЮГІ
АДЗІН з парабкаў стаяў наводдаль з гнеўным выразам на твары. Ён быў прыгожы аж задужа, у высокіх, аж занадта новых чорных рызінавых ботах.
Марыя падышла да яго з пляшкаю ў руцэ, учырванелая, вялікая. Панчохі ў яе спаўзлі, ногі запляталіся. Парабак узяў пляшку і прагна глынуў.
І нечакана моцна крыкнуў:
— Годзе! — з грукатам паставіўшы пляшку на стол.
Марыя спыталася:
— Ты хочаш іншага?
Ён адказаў усмешкай, у думках ужо завалодаўшы ёю.
Ён завёў механічнае піяніна, і, вяртаючыся, крутнуўся колькі разоў, трымаючы перад сабою ўяўную партнерку.
Адною рукой ён абхапіў Марыю, і яны пачалі даволі непрыстойна танчыць яву.
Марыя, ад агіды захінуўшы голаў, цалкам аддалася танцу.
МАРЫЯ ТАНЧЫЦЬ З П'ЕРО
АЛЕ раптам гаспадыня ўскочыла з крыкам:
— П'еро!
Выслізнуўшыся з рук збітага з панталыку парабка, Марыя павалілася.
Паслізнуўшыся, танклявае цела, як мех, храснулася аб падлогу.
— Курва! — П'еро адваротам рукава выцер вусны.
Падбегла гаспадыня. Укленчыўшы, яна асцярожна прыўзняла галаву: сліна, ці хутчэй нават пена, цякла з рота.
Адна з дзевак падала вільготную сурвэтку.
Свядомасць хутка вярнулася да Марыі, і яна слабым голасам папрасіла:
— Водкі!
— Дайце сюды шклянку, — загадала адной з дзевак гаспадыня.
Прынеслі шклянку. Яна выпіла і запатрабавала:

— Яшчэ!
Жанчына наліла яшчэ. Марыя выхапіла шклянку ў яе з рук і прагна, нібы спяшаючыся, выпіла.
Адкінуўшыся на рукі гаспадыні ды адной з дзевак, яна ўзняла галаву:
— Яшчэ! — вымавіла яна.
МАРЫЯ ВАЛІЦЦА НА ПАДЛОГУ, ДА СМЕРЦІ П'ЯНАЯ
Парабкі, дзеўкі, гаспадыня стоўпіліся вакол Марыі і чакалі, што яна скажа.
Марыя прашаптала адно толькі слова:
—...На досвітку, — сказала яна.
Потым яе голаў ізноў завалiўся. Хворая, хворая...
Гаспадыня спыталася:
— Што яна сказала?
Ніхто не змог адказаць.
МАРЫЯ ХОЧА СКАЗАЦЬ
ТАДЫ гаспадыня звярнулася да прыгажуна П'еро:
— Пасмакчы яе.
— Пасадзіць яе на крэсла? — запытала адна дзеўка.
Яны разам узнялі цела і ўсадзілі азадкам на крэсла.
П'еро ўкленчыў, паклаў ейныя ногі сабе на плечы.
Прыгажун пераможна ўсміхнуўся і запусціў свой язык у валоссе.
Хворая, прасветленая, Марыя выглядала шчаслівай і ўсміхалася, не расплюшчваючы вачэй.
П'ЕРО СМОКЧА МАРЫЮ
ЯНА адчувала прасветленасць, холад, без аглядкі выплёскваючы жыццё, нібы памыі, у сцёк.
Адно бязвольнае жаданне падтрымлівала ў ёй нейкую напружанасць: ёй хацелася аслабаніць жывот. Яна ўявіла жах усіх астатніх. Цяпер яна не была аддзеленая ад Эдуарда.
Голая потка: змяшаныя, пахі сарамацення й розверці разнявольвалі яе сэрца і язык П'еро, які змочваў яе, абдаючы, здавалася, холадам смерці.
П'яная ад алкаголю і навальных слёз, яна не плакала: яна падцягнула да сябе галаву гаспадыні, адкрываючы насустрач карыесу ейнага рота пажадлівую бездань сваіх вуснаў.
МАРЫЯ ЦАЛУЕ ГАСПАДЫНЮ Ў ВУСНЫ
МАРЫЯ адштурхнула гаспадыню і ўбачыла яе растрапаныя валасы і шырока расплюшчаныя ад шчасця вочы.

Твар гэтае кабыліцы ззяў п’яною пяшчотаю. Яна таксама была п’яная, ажно парывалася спяваць. У яе на вачах выступілі слёзы шчасця.
Гледзячы на гэтыя слёзы і нічога не бачачы, Марыя жыўцом патанала ў святле смерці. Яна выдыхнула:
— Піць.
П’еро смактаў, ажно захлынаўся. Гаспадыня ўслужліва паднесла пляшку. Марыя асушыла яе прагнымі глыткамі.
МАРЫЯ П’Е З РЫЛЦА
...ШТУРХАНІНА, жахлівы крык, звон разбітых пляшак, Марыіны лыткі распраміліся жабіным рухам. Хлопцы крычалі і штурхаліся. Гаспадыня дапамагла Марыі легчы на канапу. Ейныя пустыя вочы свяціліся захапленнем.
На дварэ ў парывах ветру лютавала бура. У цемры грукалі веснічкі.
— Слухайце, — сказала гаспадыня.
І ўсе пачулі завыванні ветру ў галінах дрэў, доўгія і жалобныя, як покліч вар’яткі.
Раптам дзверы адчыніліся насцеж, і парыў ветру ўварваўся ў залу.
У адно імгненне голая Марыя ўскочыла на ногі.
Яна закрычала:
— Эдуард!
І сум у яе голасе зліўся з трывожным завываннем ветру.
МАРЫЯ КАНЧАЕ
З гэтай нядобрай цемры выйшаў чалавек, з цяжкасцю склаўшы парасон. У дзвярным праёме паўстаў ягоны пацучыны абрыс.
— Хутчэй, пане графе! Заходзьце, — сказала гаспадыня, падыходзячы няцвёрдым крокам.
Карлік моўчкі зайшоў.
— Вы ўвесь мокры, — вяла сваё гаспадыня, зачыняючы дзверы.
Чалавек меў надзіва важны выгляд, ён быў поўны, гарбаты, ягоная вялікая галава глыбока ўрасла ў плечы.
Ён павітаўся з Марыяй, пасля павярнуўся да парабкаў:
— Дзень добры, П’еро, — мовіў ён, паціскаючы хлопцу руку, — здымі з мяне, будзь ласкавы, паліто.
П’еро дапамог графу вызваліцца з паліта. Граф ушчыкнуў яго за лытку.
П’еро ўсміхнуўся. Граф ветла паціснуў рукі прысутным.
— Дазволіце? — спытаў ён, нахіляючыся.

І прысеў за столік насупраць Марыі.
— Нясіце пляшкі, — гукнуў граф.
— Я ўжо напілася, — мовіла жанчына, — аж да ўсцачкі.
— Піце да ўсрачкі, дзіцятка маё...
І замоўк, паціраючы рукі.
Не без развязнасці.
МАРЫЯ СУСТРАКАЕЦЦА З КАРЛАМ
МАРЫІН нерухомы позірк сачыў за графам, а галава тачылася.
— Налівай, — сказала яна.
Граф напоўніў шклянкі.
Яна спакойна дадала:
— На досвітку я памру.
Шэра–блакітныя графавы вочы ўперыліся ў яе.
Бялёсыя бровы падскочылі, выкрываючы зморшчыны на занадта шырокім ілбе.
Марыя падняла шклянку і мовіла:
— Пі!
Граф таксама ўзяў шклянку і асушыў яе; яны выпілі залпам і адначасова.
Падышла гаспадыня і падсела да Марыі.
— Мне страшна, — сказала ёй Марыя.
Яна не зводзіла з графа вачэй.
Нешта падобнае да ікаўкі вырвалася з яе грудзей: вар'яцкім голасам яна прашаптала старой на вуха:
— Гэта здань Эдуарда.
— Якога такога Эдуарда? — ціхутка спыталася гаспадыня.
— Ён памёр, — гэтаксама ціха адгукнулася Марыя.
Яна ўзяла руку жанчыны і цэпнула яе зубамі.
— Сцерва, — узвыла пакусаная. Але, выхапіўшы руку, палашчыла Марыю, пацалавала яе ў плячук і, звяртаючыся да графа, сказала:
— І ўсё–ткі яна міленькая.
МАРЫЯ БАЧЫЦЬ ЗДАНЬ ЭДУАРДА
У сваю чаргу граф спытаў:
— Хто гэты Эдуард?
— Ужо і сам забыўся, хто ты такі, — адгукнулася Марыя.
Гэткім разам голас яе трымцеў:
— Прымусь яго выпіць, — папрасіла яна гаспадыню.
Здавалася, яна даведзеная да крайнасці.
Граф выдуў яшчэ шклянку, але прызнаўся:

— Алкаголь мяне слаба бярэ.
Таўставаты чалавечак з агромністаю галавою абыякава агледзеў Марыю, нібыта хочучы яе збянтэжыць.
Ён аднолькава, уціснуўшы непаваротлівую галаву ў плечы, пазіраў на ўсё наўкола.
Ён паклікаў:
— П'еро!
Парабак падбег.
— У мяне ўстае на гэтае дзіцё, — сказаў карла. — Прысядзь, будзь ласкавы, тут.
Парабак сеў, граф жа весела дадаў:
— Будзь такі добры, П'еро, палашчы мой посік. Я не рашаюся прасіць гэтае дзіцё...
Ён усміхнуўся.
— Яна ж не ты, яна ж не звыкла да монстраў.
Тут Марыя ўскочыла на канапку.
МАРЫЯ ЎСКОКВАЕ НА КАНАПКУ
— Я баюся, — сказала Марыя, — ты падобны да каменнага слупа.
Ён маўчаў. П'еро ўзяў у рукі ягоны посік.
Граф і насамрэч быў бясстрасны, бы слуп.
— Кацiся адсюль, — сказала яму Марыя, — інакш я цябе абасцу.
Яна ўзлезла на стол і прысела на кукішкі.
— Я буду толькі ў захапленні, — адказаў монстр. Ягоная шыя не варушылася: калі ён гаварыў, рухалася толькі падбароддзе.
Марыя пачала сікаць.
П'еро так моцна агладжваў графаў чэлес, што тому моч хлястаў проста ў твар.
Граф змок, пачырванеў. П'еро торгаў з усім размахам, і неўзабаве посік выпырснуў насенне на камізэльку. Граф сіпла дыхаў і дробненька трымцеў з ног да галавы.
МАРЫЯ СІКАЕ НА ГРАФА
МАРЫЯ ўсё яшчэ сікала.
На стале, застаўленым пляшкамі ды шклянкамі, яна рукамі расцірала моч па целе.
Яна намачыла ногі, азадак і твар.
— Глянь, — сказала яна, — я прыгожая.
Яна сядзела на кукішках, міжножжам проці монстравай галавы, і ў яго аж рот раскрыўся.

МАРЫЯ НАЦІРАЕЦЦА МОЧАМ
МАРЫЯ зласліва ўсміхнулася.
Візія страшнага жаху...
Адна нага слізганула, і яна сарамаценнем бразнулася аб графаву галаву.
Ён згубіў раўнавагу і звaліўся.
І абодва пакаціліся, лаючыся, пад неверагодны грукат.
МАРЫЯ ПАДАЕ НА МОНСТРА
НА падлозе жахлівая валтузня.
Разбушаваўшыся, Марыя ўкусіла графа за чэлес. Той зароў.
П'еро паваліўся на яе, скруціў ёй рукі. Астатнія трымалі за ногі.
Яна скуголіла:
— Пусці!
Пасля замаўчала.
Прыплюшчыла вочы і ледзьве дыхала.
Калі яна прыўзняла павекі, П'еро, чырвоны, потны, ляжаў на ёй.
— Вазьмі мяне, — сказала яна.
МАРЫЯ КУСАЕ КАРЛАЎ ЧЭЛЕС
— ВАЗЬМІ яе, П'еро, — азвалася гаспадыня.
Вакол ахвяры пачалі завіхацца.
Марыя ізноў апусціла галаву, збянтэжаная гэтымі прыгатаваннямі. Астатнія паклалі яе, рассунулі ногі. Яна часта шумна дыхала.
Сваёй нетаропкасцю сцэна нагадвала забой парсючка ці пахаваньне нейкага бога.
П'еро зняў штаны: граф пажадаў, каб ён быў голы.
Юнак наляцеў, як бык: граф дапамог увесці стамбур. Трапяткая ахвяра забілася. Яе цела білася пад ягоным з неверагоднай нянавісцю.
Астатнія глядзелі, аблізваючы сухія вусны, уражаныя гэтай раз'юшанасцю.
Целы, злучаныя друком П'еро, тузаліся й качаліся на падлозе.
Урэшце, выгнуўшыся, як лук, парабак задыхана ўскрыкнуў і пырснуў шумам, а Марыя адказала яму смяротным спазмам.
П'ЕРО ДАЕ МАРЫІ
...МАРЫЯ ачуняла.
Яна чула птушыныя спевы ў лясным гушчары.
Неймаверна вытанчаныя спевы пералівамі гукаліся ў каронах

дрэў. Лежачы ў роснай траве, яна бачыла, як яснее неба: у гэтае імгненне нараджаўся дзень.
Ёй стала холадна ад ледзянога прыступу шчасця, што лунала недзе ў гэтай невыразнай пустэчы. Аднак, як хацелася б ёй крыху прыўзняць галаву, і, хоць галава зноў бяссільна апусцілася долу, яна заставалася адданай святлу, лістоце і птушкам, насельніцам лесу.
На нейкае імгненне ўспамін пра дзіцячую боязь крануў яе. Яна заўважыла, што над ёю нахілілася вялікая, лабастая графава галава.
МАРЫЯ СЛУХАЕ СПЕВЫ ЛЯСНЫХ ПТУШАК
У карлавых вачох яна згледзела настойлівасць смерці. На ягоным твары было напісанае толькі бясконцае расчараванне, якое ў святле нейкага жахлівага наслання выглядала цынічным. Нянавісць узбурылася ў ёй, і ад набліжэння смерці ёй стала страшна.
Яна ўскочыла і сцяла зубы, а монстр кленчыў перад ёю.
Яна стаяла трымцела.
Адступіла на крок, зірнула на графа, і яе вывернула.
— Бачыш, — сказала яна.
— Цяпер лягчэй? — спытаў ён.
— Не, — пачуўся адказ.
Проста перад сабой яна ўбачыла ваніты. Лахманы паліто амаль не хавалі цела.
— Куды пойдзем? — спытала яна.
— Да вас, — адгукнуўся граф.
МАРЫЯ ВАНІТУЕ.
— ДА мяне, — прастагнала Марыя, і ў яе зноўку затачылася галава.
— Ці ты д'ябал, што хочаш да мяне? — спыталася яна.
— Але, — падхапіў карла, — раней мне казалі, што я д'ябал.
— Д'ябал, — паўтарыла Марыя, — а мне насраць на д'ябла!
— Вы ж толькі што ванітавалі.
— А цяпер насяру.
Яна прысела і справіла вялікую патрэбу прама на ваніты.
Монстр усё яшчэ стаяў на каленях.
Марыя спіною прыхінулася да дуба. Яна была не ў сабе, потная.
Яна прамовіла:
— Гэта яшчэ нічога. А *ў мяне дома* табе стане страшна...
Запозна...

Яна пахітала галавою і, раптам наскочыўшы на карлу, схапіла яго за каўнер і закрычала:
— Ідзеш?
— З ахвотай, — адказаў граф.
І дадаў амаль шэптам:
— Яна мяне вартая.
МАРЫЯ СЕРА НА ВАНІТЫ
МАРЫЯ, пачуўшы гэта, проста зірнула на яго. Ён узняўся з зямлі:
— Ніколі, — прамармытаў ён, — ніхто яшчэ гэтак са мной не размаўляў.
— Можаш каціцца, — сказала яна, — але калі ідзеш...
Граф суха перапыніў:
— Іду–іду. Вы аддасцёся мне.
Яна не сунімалася:
— Час ужо, — сказала яна. — Хадзем.
МАРЫЯ БЯРЭ ГРАФА З САБОЮ
ЯНЫ таропка ішлі.
Дзень заспеў іх ужо ля дому. Марыя штурхнула веснічкі. Яны прайшлі прысадаю між старых дрэваў, якім сонца ўжо пазалаціла вершалінкі.
Раздражнёная Марыя адчувала сваю змову з сонцам. Яна пусціла графа ў свой пакой.
— Усё скончана, — сказала яна сама сабе. — Яна была адначасова стомленая, уззлаваная і абыякавая.
— Распранайся, — кінула яму, — я буду ў суседнім пакоі.
Граф няспешна пачаў распранацца.
Скрозь лістоту з–за вакна прабіваліся промні святла, і сцяна ад святла стала рабою.
МАРЫЯ З КАРЛІКАМ ЗАХОДЗЯЦЬ У ДОМ
Граф узбудзіўся. Ягоны чэлес быў доўгі і чырванаваты. Голае цела і гэты чэлес былі сапраўды па–д'ябальску пачварныя. Галава тулілася ў кантаватых сутулых плячох. На бледным твары крывілася ўсмешка.
Ён хацеў Марыю, і гэтае жаданне поўніла ўсе яго думкі.
Ён адчыніў дзверы. Голая, маркотная, яна чакала яго ля ложка, спакуслівая і непрыгожая; разбітая пахмеллем і стомай.
— Што з вамі? — спытала Марыя.
Нябожчык напаўняў пакой, у беспарадку.
Граф ціха прамармытаў.

—...Я не ведаў...
І вымушаны быў абаперціся на крэсла: *чэлес бездапаможна павіс.*
Марыя жахліва ўсміхнулася:
— *Адбылося*!
І з дурнаватым выглядам паказала разбітую ампулу ў правай руцэ. І ўрэшце павалілася на падлогу.
МАРЫЯ ПАМІРАЕ
...НАРЭШЦЕ граф згледзеў абодва катафалкі, якія адзін за адным сунуліся да могілак.
Карла свіснуў скрозь зубы:
— Ну, і надула ж мяне...
Ён своечасова не заўважыў рава і паслізнуўся.
Цяжкі ўсплёск на імгненне патрывожыў спакойныя воды.
Заставалася сонца.
МАРЫЯ ІДЗЕ СЛЕДАМ ЗА НЯБОЖЧЫКАМ У ТРУНУ

Пераклаў з французскай Мікола Шакель
паводле Georges Bataille, *Le Mort*, 1967 © Jean–Jacques Pauvert, Paris.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гісторыі да Зьместу 4(5)-1999

Алесь Кавальчук
Вясельле на хутары

Пэўна, што на гэтым вясельлі я мусіў быць. З маладым мы пражылі два гады ў асьпіранцкім пакоі, а маладой я дапамог уладкавацца на працу на сваё былое мейсца ў музэй. І пазнаёміліся яны лепей, ходзячы па кватэрах у выбарчую кампанію, арганізаваную мною. Няма тут нічыёй заслугі, хутчэй проста лёс, які зводзіць і разводзіць людзей, сыходзячы зь нейкіх сваіх меркаваньняў. Дарэчы, уся нашая вясельная каманда была даўно зьвязаная з маладым ці з маладой і ўсіх нас мусілі напаіць на гэтым вясельлі, як добрых сяброў, ад якіх усё роўна не схаваешся.

А для гэтага й выбралі мейсца — Севаў хутар. І ніколі не ўзяўся б я за асадку, калі б ня ён, гэты хутар.
Хто падумаў бы, што за 40 кілямэтраў ад Менску ў лесе можа стаяць закінутая хаціна, выбудаваная ледзь ня сто гадоў таму, куды гаспадары наведваюцца раз на месяц, дзе ніколі не было электрычнасьці, даўно няма калодзежа і зьдзічэлая трава на закінутым дворышчы стаіць аж па грудзі. Пэўне ж, лепей гуляць вясельле на такім хутары, чым у зашмальцаваным менскім рэстаране.
Такім чынам, пасьля росьпісу маладых у Менску, зьбіраліся мы ў Ракаве адкуль і кіравалі на хутар.
Дабіраліся да Ракава ў пятнічку хто як мог. Вылавілі мяне на аўтастанцыі, дзе я стаяў па квіток, два хахлы, сябрукі маладога, бо ён і сам быў хахлом са Львова. Прыгожым такім, ціхім і сэнтымэнтальным хахлом–фізыкам, які ўмеў неакрэсьлена так разважаць і ўмеў гатаваць незвычайную каву. Праўда ж, і

нашая Натальля, беларусачка, цяпер ягоная жонка, высокая з доўгімі нагамі, была ня горшаю за яго. Была яна практычнаю кабетай з рамантычным выглядам і рэгулярна езьдзіла ў Польшчу папаўняць свой пасаг, цягаючы туды час ад часу сваіх далёкіх ад бізнэсу сябровак. Яна пераманіла Ігара са Львова, куды ён быў ужо вярнуўся пасьля менскай асьпірантуры, тычучы яго носам у сухі кран у львоўскай кватэры, у які ваду давалі толькі ноччу і тое ў няпэўныя часы. Менская цывілізацыя перамагла.

Ігаравыя дружкі падхапілі мяне на станцыі. Мы павіталіся. Я: Слава Ўкраіне! Яны: Жыве Беларусь! Тутэйшыя прыгажуні, якія ехалі ў валожынскім накірунку, разглядалі нас на ўсе свае блакітныя вочы. Мы селі ў таксі і пад нейкую расейскую разьлюлі–маліну пагналі па ракаўскай шашы.
Вецер дзьмуў у чатыры акны. Украінцы мае спалі, дзяўчынкі з касэты весела напявалі: “Я играю на балалайке. Это самый лучший русский инструмент!”, а я задаволена слухаў, як “Аўдзі” зь ціхім шоргатам расьсякае паветра, каўтаючы кілямэтры адзін за адным.
Хутка мы былі ў Ракаве, дзе толькі нас ужо і чакалі. І неслася з нашае таксоўкі на ўвесь Ракаў: “Я мечтаю жить на Ямайке. На Ямайке балалаек нет!” Бацька Севы закінуў нашых паненак з гарэлкаю і харчам да паловы дарогі, куды толькі мог пад’ехаць на сваёй машынцы, а мы пайшлі пехам. Праз запыленыя местачковыя хаты, дзьвярыма на вуліцу, паўз царкву, паўзь людзкія гароды, дзе людзі абганялі бульбу, пад новы віленскі шлях, які раней ішоў праз Ракаў.
Мы ішлі па шырокай пыльнай, у муку, дарозе, якая ўзьнімалася ўгору і выносілася ў сінюю, вымытую надвячоркам бездань неба. Паабапал дарогі ўсё было зялёным, пафарбаваным у чэрвеньскую сьвежую яшчэ зеляніну.
Вось так, здаецца, ішоў бы туды і ішоў, туды, наперад, куды імкнецца душа чалавека, якую вабяць за сабой бальшакі. Упершыню зь зімы я выбраўся зь вялікай задымленай і затлумленай пачвары–гораду. Там нават ужо забыўся на смак хлеба.
Пах сьвежаскошанай травы, навеяны аднекуль, кружыў голаў. Я ўздыхнуў напоўніцу і лёгкія мае парывіста затрапяталі. Гэтак,

мабыць, у птушкі, што выляцела з клеткі на волю, дзеля гэтага перахоплівае голас.
Мы ішлі па пыльным шляху да лесу. Высокі худы дружка–хахол сварыўся на камуністых, я падтакваў яму, а сам адчуваў, як тут, на ўзгорку, на ўсе бакі якога разьбеглася поле, а пад намі завісла вялізная, пустая і празрыстая сфэра неба, нечакана выпнулася маё ўнутранае Я, скінуўшы гарадзкую каросту абмежаванае зацiснутае прасторы.

Мы падышлі да лесу, разамлелага за дзень і патыхаючага вагкім млявым цяплом і ўцягнуліся ў яго, па жыле дарогі, кіруючыся на шыны Рагойшавай машынкі. Адбітак гумовых шынаў толькі і нагадваў нам пра цывілізацыю, якая зрэдзьчасу катала па гэтым нябітым шляху. Праўда, зьлева выплыў закінуты кар'ер, жоўтыя абрывы якога зацягнула зеляніна кустоўя. Мне падумалася, што ў такіх кар'ерах раней заўсёды любілі расстрэльваць. А затым паабапал шляху, можа ў паўкілямэтры адзін да аднаго пайшлі прагалы зарослага чарналесьсем поля, на якім яшчэ нешта сеялася і расло. Былыя хутары, падказаў Сева, усё, што ад іх засталося. І з новай моцаю накінуліся мы з дружкам–украінцам на камуністых.
А вось насустрач нам коціць Рагойша–старэйшы. Мы махаем яму рукамі — самі дойдзем. Ён ківае рудаватаю бародкай і мы разьвітваемся. Ён вяртаецца да местачковае цывілізацыі, а мы брыдзем на хутар, на якім ужо даўно ніхто не жыве.
Дарога выходзіць зь лесу і праваруч адкрываецца вялікая прагаліна, якую можна назваць сапраўдным полем. Паабапал шляху стаяць два хутары. Зьлева, на ўзгорку, у лесе — катэдж нейкага менскага варацілы з чырвонае рэстаўрацыйнае цэглы. І, як паведаміў нам Сева, з саўнай і басэйнам. "А як наконт дзевачак? — спытаўся п'яны яшчэ ад росьпісу другі ўкраінец. "Былі, — запэўніў Сева, — пакуль гаспадара не пасадзілі. Быў дырэктарам менскага ўнівэрмагу і зрабіў тут склад. Аднаго "Космасу" грузавік вывезьлі".
— А што з хатаю? — з павагай спытаўся Астравец.
— Хата, машына, усё было запісана на маці. Адседзіць пару гадоў ды выйдзе. Адшаруюць яму ў саўне кабеты з азадку турэмны бруд і будзе зноў кароль.
— Трэба ўзяць ды пашукаць, можа дзе золата тут закапана, —

прапанаваў знаходлівы Астравец.
— Глядзі, каб цябе тут не закапалі, — адказаў Сева.
— Якраз той, хто будзе шукаць, — адзначыла Паліна.
Усе апроч хахлоў зарагаталі, бо ведалі, што, мабыць, і пэрспэктывы з золатам наўрад ці здолелі вывесьці адключанага ад сьвету Астраўца са стану заўсёднай прастрацыі.
А з правага боку, за полем, стаяў жылы хутар з роўным радком вульлёў на гародзе і паліэтыленавымі цяпліцамі ля хаты.
— Бляха, як хочацца кінуць усё і пайсьці з гэтага зас... гораду. Вось так жыў бы і жыў, — з зайдрасьцю сказаў я, паглядаючы на гэты аўтаномны і незалежны сусьвет.

— Усё адно, ад прагрэсу далёка не ўцячэш, — мэлянхалічна заўважыў жаніх.
— На халеру мне прагрэс. Хадзіў бы ў Ракаў па хлеб ды соль, — адгукнуўся я.
За хутарам па дарозе паказаўся невялікі ставок, са старымі вербамі паабапал, каля якога чакалі нас паненкі.
— Вось так жывуць людзі, — з сумам заўважыў я, паглядаючы на вербы, што нахілілася вакол стаўка да самай вады.
— У Севы таксама возера ёсьць, — зазначыў Астравец.
— Пане Божа, ну што гэтаму чалавеку трэба, — працягваў я далей разьвіваць сваю натурфілязофію, — кавалак зямлі зь якога паўгектару, вазёрца, пасечку, цяплічку — жыві сабе, калупайся, гадуй сьвіньні ды дзяцей, любуйся прыродаю, лаві імгненьне свайго непаўторнага зямнога жыцьця, бо ўсё мінае і ня мае ніякага звароту. Хутка здохнем, і вокам міргнуць не пасьпеем.
Маладая пяшчотна пасьміхнулася мне.
— А чалавек нішчыцца ў гэтай палітыцы, таўчэцца ў бессэнсоўнай працы, скварыцца на асфальце, паліць у інтрыгах нэрвы. І навошта гэта ўсё, калі ёсьць адзіны прыстойны занятак — праца на зямлі.
— А пісаньне, дзеля творчасьці, — спытаўся Астравец, у якога была атрымалася пара неблагіх апавяданьняў.
— Народ ніколі не лічыў гэта працаю, — адказаў я. — Творчасьць заўжды была дзеяй узвышанай. У асалоду. І можаш мне паверыць, што больш натуральнай творчасьці за жаданьне адбіць стасункі чалавека з прыродай наўрад ці існуе. Ды і

чалавек там часьцінка прыроды, якая носіць скуры і ходзіць босымі нагамі па ральлі, а не пузатая і нахабная пачвара, якая з–за свайго брыдкага Я ня бачыць сьвету. Таму сярод безыменнага фальклёру так шмат геніяльных твораў, — скончыў я сваю сэнтэнцыю.
— Вядома, — пагадзіўся Астравец.
Далей мы пайшлі разам з паненкамі, цягнучы клункі з гарэлкаю і ежай. Адно, жаніх, няўцямна пасьміхаючыся, вёў пад руку маладую, якая ў сваю чаргу несла некалькі бухматых белых і крывавых гвазьдзікоў. Яны моцна кантраставалі на тле спакойных навакольных прыродных фарбаў, яшчэ болей прыцішаных надвячоркам, дзе дамінавалі паўтоны і паўцені.
У нашай прыродзе разгадка нашага нацыянальнага характару, думаў я, цягнучы торбу, у якой нешта зьвякала і булькацела. Някідкія гэтыя колеры, бляклыя, але ж моцна закранаюць душу, прываблівaюць і ўжо не адпускаюць.
— Што там з Палінаю можа быць, — меркаваў Астравец, — гэтыя ж алкашы маніліся заваліць на хутар.
Як высьветлілася — Колік з Сысом.

Паліна сядзела на хутары зраніцы. Прыбірала і чакала нас.
— А адкуль яны даведаліся, — спытаўся я.
Усе засьмяяліся. Нават маладая. Толькі жаніх ня мог адысьці ад свае незвычайнае ролі і працягваў пасьміхацца сам сабе. Перабіваючы адзін аднаго, распавялі мне і самі сабе яшчэ раз, рагочучы, як старанна хавалі ад Коліка і Сыса гэтую падзею. Так атрымалася, што пілі разам зь імі можа штомесяц, атрымліваючы кожны раз неспадзяванкі, але гэтым разам ніякіх прыгодаў не жадалі. А Пётра, — далей распавядалі, — прыехаў са Львова, пайшоў у “мутнае вока”, сустрэў Сыса, зь якім разам піў у свае ранейшыя прыезды і ў адзін міг усё расплявузгаў. Але ж даведаліся — і халера зь імі... Я падумаў, што яны ўрэшце таксама частка гэтай кампаніі. Праўда, тая, якую звычайна імкнуцца прыхаваць і не выстаўляць на людзі. Мо на гэтым хутары яны і будуць да месца.
Сыс, які ўступіў пасьля “Тутэйшых” у Саюз пісьменьнікаў, піў ужо не прасыхаючы два гады. А Колік, з выгляду — хлопчык зь пячоры Ташык–Таш, нязьменна дапамагаў яму ў гэтым расьцягнутым на два гады фэсьце.

Меней за ўсё хвалявала нас, ці будуць там нашыя алкашы. Значна болей — абгаворвалі і рагаталі, уяўляючы як там Паліна ўжываецца з шызою ў такіх нястрыманых памерах. Хаця болей забаўляліся гэтым, ня ведаючы пэўна, ці ёсьць яны там, на хутары.
Колік — траянскі конь з саламянымі косамі і бурачковым прапітым фэйсам, прыбягаў да Севы на хату ў Менску і спраўджваў пачутую ў "мутным воку" навіну. Інтэлігентная маці Севы мусіла сказаць праўду.
Дык ёсьць яны там ці не?

Мы прайшлі яшчэ мэтраў трыста па полі, паміж пасеянай з абодвух бакоў лагоднай, цёмнай зеляніны і нашыя сумненьні разьвеяліся на дым.
— Во, — спакойна заўважыў Сева і паказаў на недапітую пляшку піва, што стаяла пасярод дарогі.
Ну, пэўне, што яны. Хто ж яшчэ. Сыс быў майстрам на розныя жарты. Нездарма розныя разявакі хінуліся да яго. Моцны, вальяжны і вясёлы, ён умеў пажартаваць. Праўда, часта губляў мяжу паміж жартам і брыдою. Мала хто цяпер блізка падпускаў Сыса да сябе, таму і цягаўся ён з гэтым Колікам ад безвыходнасьці і яшчэ, мабыць, ад нейкай настальгічнай любові здаровага па сутнасьці чалавека да сваіх уласных балячак.
Колік для яго — як любімая скула. А для таго — кампанія з Сысом — за шчасьце і амаль заўсёды дармовая выпіўка.
Сыс любіць усялякіх лішэнцаў. Яшчэ ў студэнцкія часы ў Гомлі хадзілі мы ў гатэль "Прыпяць" да Някляева. Выпілі там пляшку каньяку, якую прынёс нейкі расейскі жыд–перакладчык. Сыс пытаўся ў мэтра пра вершы, пра зборнікі і друк, а я пра беларускія школкі — ці будуць яны на Беларусі калі–небудзь. Някляеву з намі, правінцыяламі, было цікава. Ён нават паслаў па тэлефоне нейкую пішучую паненку, якая набівалася да яго ў ложак. Ён гаварыў шмат, распавядаў пра сваё жыцьцё, пра войска, пра Маскву. Яму падабалася, як мы яго слухалі.
Вярталіся мы ўжо досыць позна, па пустой Савецкай, асьветленай нэонавымі шыльдамі і крамнаю сыгналізацыяй. Напарадзе зьявілася нейкая худзенькая дзяўчынка, што ішла нам насустрач. Мы ўжо разьмінуліся, як Толік павярнуўся і гукнуў яе: "Клава!" Тая павярнулася і гігікнула. Сыса

разьвярнула на ўсе сто восемдзесят.
— Што ты тут ходзіш, — прыдурваючыся, спытаўся падпіты Сыс, — ты ведаеш, што злодзеі ходзяць па начох.
— Я ня Клава, я Надзя, — адказала дзяўчына і моцна засапла, мабыць, спалохаўшыся.
Мы зразумелі, што яна дурнаватая.
— Хадзем з намі, Надзя, — сказаў Толік, — у нас цёпла, мы табе віна дамо. Хочаш віна?
— Хачу, сказала Надзя, — але баюся.
— Ды ня бойся ты, хадзем! — яшчэ раз запрасіў Сыс і яна пацягнулася за намі.
Ведама ж, лепей піць віно, чым боўтацца па прахалодных начных гомельскіх вуліцах.
— Во, дзяўчыну Дзеду прывядзём, — сказаў Сыс. Дзед наш, інтэрнацкі сусед, неўнывальны эканамісты, хадзіў з кійком, цягаў спаралізаваныя ногі і жанчыны пакуль што цураліся яго. Мы прыйшлі ў свой кватэрны інтэрнат, завалілі ў 61–ю, скандальна–багемную студэнцкую кватэру і ўзьнялі вялікі галас. Дзеда не было, паехаў да сястры, разьвязка не атрымалася, хаця ўяўляю сабе шалёныя вочы заспанага Дзеда, да якога б прывялі нейкую жоўтую ў брудных рбгах Надзю. Мы селі ўтраіх на варыўні, паставілі гарбатнік і пачаліся калупаньні ў затумленай сьвядомасьці гэтае дзяўчыны. Сыс калупаўся, не раўнуючы псыхоляг, і хоць гэта было як бы не дазволена, бо нельга знушчацца з дурнаватых, яно тым болей прыцягвала яго. Надзя распавяла нам шмат чаго. Урэшце мы налілі ў кубак гарбаты. Надзя каўтанула і пакрыўдзілася, што не віно. Мы адправілі яе спаць на пусты Дзедаў ложак, а самі пайшлі ў свой пакой.
Раніцою Надзя зьнікла, і вось я згадаў пра яе аж празь дзевяць гадоў. Колік — гэта таксама своеасаблівая сысоўская Надзя.

Зь лесу даляталі да нас рэдкія камары. Мы паціхеньку тэпалі, аглядаючы навакольле і пытаючы Севу пра хутар. Рэдкія косы бярозаў аддзялялі адное поле ад другога. Весела скакалі па зялёных белыя бэтонныя слупы, перавязаныя паміж сабою дратамі. Шлях пайшоў наперад, а мы зьвярнулі на затравелыя ў глеістых калюжынах каляіны. Яшчэ прайшоўшы мэтраў з трыста, за вялікаю, па пояс, травою, убачылі хату, абсаджанаю

старым разгалістым садам і кашлатым бэзам, а побач хлеў і дрывотню, пакрытую новым шыфэрам.
Каляіны віхлянулі паўз хату і пакаціліся некуды ўдол, а мы пацерабіліся па ледзь утаптанай у траве сьцежцы да ганку. Ганак быў зроблены адкрытаю галерэяю, з лавамі і сталом, застаўленым бруднымі пляшкамі і старым посудам. Паміж хатаю і хлявамі расьлі вялікія зарасьнікі лебяды. Мы скінулі торбы каля ўваходу і празь сенцы з гліняным убітым долам завалілі ў вільготную, адвыклую ад чалавечага духу хату, дзе ў фатэлі чакала нас Паліна, паглядаючы сваімі круглымі, трохі блазенскімі вачыма.
На вуліцы разьнеслася галёканьне Сыса і рыпучы голас Коліка. Я зірнуў у вакно. Яны вылазілі з травы, што расла за домам. Качаліся там, апаляліся, церпяліва чакалі на нас. Разам зь імі быў і Скобла.
— Мы ўжо думалі, што ня прыйдзеце, — гаворачы, аглядаў нас і нашыя торбы Сыс, — я б тады Коліку галаву адарваў.
Колік палыпаў запухлымі вочкамі і нешта рохкнуў у адказ.
— Поўдня блукалі, ледзьве знайшлі.
Сева пачаў распытвацца, кудою яны ішлі, пачаў высьвятляць, дзе яны заблудзілі. Атрымлівалася — гойсалі вакол. Паліна распавядала пад гэтыя роспыты, прыцішана сьмеючыся, што сядзела адная ў хаце, чула, як яны галёкалі то з аднаго, то з другога боку і ўсё гадала — патрапяць яны на хутар ці не.
— Чаго ты печ не пратапіла, — спытаўся я, — вільготна ў хаце.
— Мне Вячаслаў Пятровіч сказаў, што лепей не чапаць яе. І так працы хапіла, пакуль прыбрала ўсё.

Яшчэ па дарозе Сева распавёў, што ўвесну хутар былі абрабавалі. Павыцягвалі коўдры, прасьціны, увесь посуд. Затым рэчы з хутара бачылі ў Ракаве на дазнаньні, якое праводзілі міліцыянты, затрымаўшы мужа і жонку з суседняга хутару, што былі наняліся сямейным падрадам чысьціць лецішчы і працоўныя бытоўкі, не абмінаючы і Рагойшаў хутар. Але рэчы яны забраць яшчэ не пасьпелі, бо былі падчас дазнаньня ў Менску і ўсе коўдры з прасьцінамі міліцыянты завезьлі ў раён у Валожын.
Заманлівую прапанову баляваць на галерэі на сьвежым паветры адмялі, бо зьлякаліся камароў, якія паціху прынюхваліся да

нашае грамады і ежу — канапкі і кансэрвы пачалі выстаўляць у хаце, упрыгожваючы даволі аднастайнае застольле рознымі па вышыні пляшкамі гарэлкі і віна.
— Гарэлкі хопіць? — спытаўся Сыс.
— Хопіць, — супакоіў яго доўгі хахол Пётра, які пасьпеў ужо зусім працьверазець.
— Глядзіце, а то зараз пойдзем, самі застанецеся, калі гарэлкі няма, прыгразіў жартам Сыс.
Я згадаў, што гэтак жа ён хваляваўся, калі запівалі мой дзень народзінаў. Зьбіраліся тады ў Толіка Казлова ў акадэмічным інтэрнаце, куды яшчэ Караткевіч у свае часы быў прыходзіў замочваць свае “Каласы”.
Гарэлкі было шмат. Увесь час падыходзілі госьці, кожны прыносіў сваё, а мы ўсё пілі і пілі, аж пакуль Колік алкаш, які і тады быў прыпёрся хвастом за Сысом, не званіташаў лішкамі кубінскага рому проста на стол, заліўшы нашыя відэльцы і лыжкі.
Як мы ўсе тады кінуліся з пакою, душачыся дурным рогатам на калідор, дзе доўга палілі, пакуль Колік прыбіраў за сабой. Нарэшце ў вільготнай і цемнаватай хаце ўсё было падрыхтавана. Мы селі за стол і выпілі па першай. Тост сказаў малады за сябе і за жонку. Нейкая верагоднасьць была, што яны ня кінуць адно адное. Мы ўсе дружна падтрымалі тост і закусілі тоўстымі канапкамі са шпротамі і чырвонай ікрою.
— Чаго такі сумны, — спытаўся я ў Скоблы, які сапраўды ледзь жаваў сваю канапку.
— Радавацца павінен, — сказаў я і пляснуў па задняй кішэні, дзе ляжаў складзены “ЛіМ”. Надрукавалі ў ім абвестку, што прынялі ў Саюз пісьменьнікаў з нашых сяброў яго ды Толіка Казлова.
Міхась стомлена адказаў:
— Ледзь вас знайшлі.
Пачулі Сыс з Колікам і пачалі па–новаму распавядаць, як яны блудзілі вакол хутара, пытаючыся, дзе тут Монькі, так менавалася гэтая мясьціна — гэты і яшчэ два суседнія хутары. Мы выпілі яшчэ і яшчэ і пайшла нейкая бязладная гаворка. Усе пабіліся на невялікія купкі і кожны казаў за сваё, а затым усе выйшлі ад стала на двор дыхаць паветрам і паліць.
Я выйшаў з усімі зь вільготнай хаты на двор і пайшоў у канец загону, засеянага травою на падкормку сьвіньням, дзе стаяў

ладны, вялікі дуб. Гаспадары саджалі яго, мабыць, яшчэ тады, калі будавалі хату. Цяпер хата ўехала ў зямлю, а дуб сама што ўвабраўся ў сілу, заможна акругліў гольле і выставіў наперад сваё моцнае гладкае цела. Далей за дубам пачыналася непралазнае чарналесьсе. Падышла Паліна і прапанавала:
— Давайце падыдзем да Севавага возера.
Мы пайшлі па ледзь пазначанай сьцежцы наперад. Асіны, яліны, худыя бярэзіны перапляталіся тут і засьцілалі зямлю чорнаю вільготнаю лістотаю і цёмнарудою гліцаю. Праз колькі мэтраў паказалася возера — невялікая лагчынка, у якую тачылася аднекуль зь сярэдзіны чорная вада.
— Рыбы тут няма і вада чамусьці масьляністая, — сказала Паліна. Голас яе сьцішыўся, як быццам яна адчувала нейкую таямніцу, што хавала гэтае возера.
— А якое тут дно, — спытаўся я, паглядаючы на цёмную, бы завараная гарбата, ваду.
— Добрае, нявязкае дно, — адказала Паліна.
— Як файна. Хутар з уласным возерам. Каб яшчэ сюды якога карпа запусьціць ці карася. Гэтыя вадзяныя сьвіньні ў любой вадзе жывуць.

— Няма ў Вас адчуваньня рамантызму, — пакрыўджана сказала Паліна. — Калі возера, дык абавязкова патрэбна, каб рыба вадзілася і каб зь яго ваду пілі каровы. У тым жа і ўвесь цымус, што яно самое для сябе. І карпы ўсе тут паздыхалі. Яно не для кога. Пачнеш купацца, а зь цябе скура зьлязае. Уяўляеце сабе — ласкуткамі... Голас яе зноў задрыжэў, а вочы пачалі шклянець і толькі правая рука як бы здымала зь сябе гэтыя зьлезлыя доўгія пасы скуры.
— Дык вы ж тут ужо купаліся, — ліхаманкава спыніў я яе развагі.
— У тым і справа, што купаліся, — уздыхнула Паліна і мы пайшлі назад да дубу.
Пакуль мы ішлі, я згадваў, як некалі яна распавядала мне такім самым голасам пра трупікаў, на якія іх, дзевяціклясьніцаў зь біялягічнага гуртка вадзілі паглядзець у трупярню. У гэтых трупікаў ззаду чэрапа бралі нейкі беленькі адростачак і складалі ў слоічак — для гарманальных лекаў.
Сева дастаў з–пад паветкі сухія наколатыя паленцы, і зноўку

п’яныя ўкраінцы, наклаўшы непадалёку ад дуба мокрага ламачча, спрабавалі разьдзьмухаць агонь. Было шмат дыму і сьлёзаў.
Я адагнаў хахлоў, раскідаў іхні асуджаны агонь, наклаў сухіх ялінавых галінак і полымя ажыло. Затым яго ўзялося за палены і вогнішча запалала, адганяючы камароў, якія лезьлі з усіх бакоў.
Людзі разбрыліся хто куды. Нехта гаманіў каля возера. Гучна галёкалі каля хаты Сыс з Колікам. Ды па абаротах было заўважна, што не ўсур’ёз. Болей для таго, каб проста пакрычаць.
Я глядзеў на агонь у сьветлае неба, якое ўпарта не жадала цямнець. Цёмныя пасмы паветра імкнуліся ўгару і неба зьлёгку дрыжэла, гайдаючы разблёную, чорную на сьветлым аб’ёмным тле дубовую лістоту. Лёгкі вэрхал, які мы наводзілі, яшчэ болей вылучаў агромністую цішыню, што ахінула хутар. Цішыня апусьцілася на нашую зямлю, гэтак як і тысячу, і пяць тысяч год таму. Яна валадарыла тут. Жоўтае полымя агню было часткай гэтай усеахопнай цішыні.
Ад хаты прыцёгся малы ўкраінец Генік з трохлітровым слоікам, напханым мясам і нарэзанай скрылямі цыбуляй. Мы ўзялі вожагі, насадзілі па некалькі кавалкаў адбеленага воцтам мяса і пачалі смажыць яго на вялікім вагні.
— Дурні, трэба пачакаць пакуль выгараць дровы, — параіў нехта зь цёплае цемры.
Але мы трымалі вожагі высока і не баяліся, што нашае мяса пагарыць. Наадварот. Асьцюдзіўшы крыху, памахаўшы вожагам у паветры, я запіхнуў у рот кавалак духмянага мяса, са скрыльком дасмажанай цыбулі. Генік перадаў мне паўпляшкі лёгкага “Алігатэ” і я падгарчыў мяса віном, ад якога яно зусім растала ў роце. Я перадаў пляшку назад, а затым яна зноў вярнулася да мяне. Мы дружна дапілі “Алігатэ” і пагадзіліся, што невядома, як там бараніна ў шашлыках, але сьвініна на вожагах ня горшая.
У хаце пасьля перадыху сядалі па другім разе і мы пацягнуліся ад вогнішча на хутар, які зрабіўся зусім цёмным і глядзеўся вялікай чорнай капою на тле не жадаючага адпускаць сьвятло паветранага далягляду.
У хаце запалілі сьвечкі, якія запасьліва прыхапіў Сева. Патрабаваў нешта сказаць Сыс, узьняўшы чарку, як дзьверы

адчыніліся і зьявіўся Толік Казлоў пасьля сваёй часопіснай працы. Усе прывітальна зараўлі, а за ім паказалася Толікавая сяброўка па інтэрнаце Наталя з прозьвішчам Філін і нашыя дзяўчаткі ціха псыкнулі.
Толік як бы знарок падбіраў сабе непатрабавальных і непрывабных паненак, якія заўсёды гатавалі яму ежу, пралі бялізну, глядзелі за ім. Ён любіў чысьціню, а яны заадно кармілі ўсіх Толікавых сяброкоў.
Ня ведаю, ці заўважылі нашыя дзеўкі, якім поглядам абдарыла іх Наталя. Здаецца, размазала б па падлозе. Але мільгануў гэты погляд у адзін міг і ў наступны ўжо яна шырака пасьміхнулася ўсім і пяшчотна прамовіла: “Д–о–о–бры дз–е–ень!” “Ве–е–ечар!”, — паправілі яе хорам і напоўнілі новыя кубкі. Толік сказаў слова за маладога і маладую. Як п’е Казлоў, я ведаў яшчэ з унівэрсытэту. Ён выпіваў тры пляшкі гарэлкі за вечар, а затым тыднямі прапалоскваў зёлкамі свой гастрыт. Толік сказаў тост і ўсе выпілі, а я падцікаваў за Філінам. Яна з прагнасьцю накінулася на гарэлку. Крылы носа ў яе ўзьнесьліся, паказаліся маленькія жоўтыя клычкі, якія драпежна цокнулі аб край кілішка. Я, забыўшыся на свой кубак, зачаравана паглядаў на драпежнага Філіна, праўда, хутка апамятаўся і выліў гарэлку сабе ў рот.
Размоваў асаблівых не было і хто застаўся сядзець, а хто зноўку пайшоў на двор.
— Глядзеце, вунь Філініха Севу гвалціць, — нехта з паненак падглядзеў у вакно, як Сева спрабаваў давесьці нешта Наталі, абхапіўшы яе дзьвюма рукамі, а тая шматзначна, як пірацкая шхуна, пахіставала вялікімі клубамі.
Убачыўшы, што за імі назіраюць, Філін і Сева забуркацелі яшчэ жвавей, як у благім тэатры, дзе п’яныя артысты спрабуюць згуляць у каханьне.
Уся хата зараўла. Але артыстам гэта не зусім спадабалася, і пакрасаваўшыся яшчэ троху, яны закончылі дзею шалёным засосам. Хутка яны зьніклі за хлявом, а ў нас зьявілася чарговая тэма для размоваў.
— Яна згвалціць яго, — трагічным голасам прамовіла Паліна.
Козьлік раўнадушна каўтаў гарэлачку.
— Толік, яна ж згвалціць Севу, — манэрна паўтарыў Колік.
Толік не адрэагаваў ніяк, а яшчэ наліў і яшчэ выпіў.

— Што і праўда? — спытаўся я ў Паліны.
— А вы што думалі? — перапытала яна.
— Сева такі, што ён мала праяўляе сваёй ініцыятывы, — пачала павольна і сур'ёзна тлумачыць малая Алена. — Але калі яго хто цягне, ён не пярэчыць.
— Ну дык вып'ем за рашучых кабетаў, — прапанаваў Сыс, якому ўжо надакучылі нашыя размовы.
Не пасьпелі мы лыкнуць, як з–за хлева паказаліся Сева з Наталяю.
Мы сустрэлі пару дружным рогатам, і яшчэ раз выпілі разам зь імі.
Я схадзіў да вогнішча. Там ўжо рабілі калкі і клалі на іх у радок вожагі зь мясам, затым вярнуўся назад у хату, дзе засталіся Сыс з Колікам. У вакно зазірнула Паліна і таксама зайшла ў хату.
— Налівай, Паліна, — прапанаваў я, — Адныя гомельцы сабраліся, — а сам зазірнуў у суседнюю цёмную бакоўку. Абагравалася яна грубкаю, вакно было звонку зачынена аканіцамі, стаялі два голыя пасьля рабункаў ложкі і шафа.
— Во, — сказала Паліна, — на гэтым ложку спаў Караткевіч.
— Як п'яны быў, — дадаў Колік.
Паліна пайшла наліваць кілішкі, а я сеў каля Сыса.
— Усё п'еш? — спытаўся я.
Ён нічога не адказаў, непранікальна паглядаючы на пусты стол. Шкадоба, узмоцненая выпітай гарэлкаю, захліснула мяне і вочы мае затуманіліся сьлязьмі. Сыс каціўся са страшэнным грукатам у прорву і ніхто яму, апроч самога сябе, ня мог дапамагчы. Як распавёў Астравец, якому хваліўся Колік, за вясну Сыс быў цьвярозым тры дні, а Колік адзін дзень, мабыць, самыя пакутлівыя для іх дні гэтай вясной.
Шляхі нашыя разьбегліся гады з тры таму пасьля таго як ён уступіў у такі доўгачаканы Саюз пісьменьнікаў і пачаў гасіць зь Някляевым, Дударавым ды Чыгрынавым. Нахабна выдурваў у Чыгрынава грошы на каньяк, а той не адмаўляў, такім чынам падмазваючыся да "дэмакратаў", у якіх тады хадзіў Сыс.
Тады Сыса ў Саюзе баяліся і паважалі, бо апроч уласнага таленту, энэргіі і самаўпэўненасьці за ягонай сьпінаю стаялі таямнічыя і грозныя "Тутэйшыя". Занадта нечакана выплыла гэтае маладое, гарластае, нахабнае і скандальнае пакаленьне. І Сыс быў лідарам. Буйны целам, гладкі, упэўнены ў сваім

таленце хлопец.
— Што ж ты робіш, сьвіньнюк, — спытаўся я ў яго.
— Вось вы, Алесь, напішыце тое, што Толік напісаў, а затым будзеце чапляцца да яго, — паспрабавала бараніць яго Паліна.
Колік радасна пасьміхаўся сваімі апалымі вочкамі на азызлым ружова–блакітным твары. Ружовымі тут былі лоб, барада і вушы, а сінімі з рудым дамешкам — вачніцы і нос. У паўсьвятле міргаючае сьвечкі ўсё гэта пералівалася фантастычнымі вурдалацкімі колерамі.
Глупая ты, Паліна, падумаў я. Калі і напісаў ён, дык гэта тады, як дняваў і начаваў на Акадэмічнай у нашым інтэрнаце, хадзіў на “Тутэйшыя”, на “Талаку”, хадзіў у бібліятэкі, на сходы, на першыя мітынгі. Тады ён і пісаў, хоць і стагнаў, што часу няма і што грамадзкія справы замінаць яму жыць. А калі запісаўся ў “сапраўдныя пісьменьнікі”, калі адкалоўся ад актыўнай беларушчыны, тут вось і ўсё. І вершы скончыліся. Зноў палезла дурноцьце. Зьнік асяродак, дзе ён быў роўным сярод роўных, а можа, ён трохі і баяўся яго, бо не хапала інтэлекту і шмат што браў прыродным розумам, затое цяпер зьявіліся розныя Колікі ды Чыгрынавы і ім падобная халява. Зьявіліся нейкія свае цікавыя інтарэсы: напіцца, пажэрці.
Але нічога гэтага ўслых я не сказаў, бо Паліна глядзела на Сыса як на бронзавы бюст, Колік проста ня ў стане што–небудзь зразумець, а Сыс разумеў цяпер толькі тое, што ён жадаў разумець.
Цікавая чалавечая натура. Уладкаваная так, што апраўдвае любыя свае ўчынкі. І знаходзіць аргумэнты і доказы, якія даюць маральнае права на гэтыя ўчынкі. Пад любую гнюсоту падведзеныя пераканаўчыя тлумачэньні, найперш для сябе, бо ні перад кім іншым, як толькі перад сабою жадае чалавек выглядаць годным.
Мы выпівалі па другой, калі ў хату завалiў Скобла і паклікаў на шашлыкі. Усе ўзьняліся і пайшлі, бо гаварыць асабліва ўжо не было пра што. Я ўзяў сьвечку і пайшоў аглядаць хату яшчэ раз. Усярэдзіне хата выглядала ня менш пракаветна, чым звонку. Вялізныя трамы ў вялікім пакоі прагнуліся, бы шпангоўты на караблі, утрымлівалі столь, гатовую ўпасьці хоць зараз. Мост у вялікім пакоі быў засланы масьніцамі, мабыць, не на шмат маладзейшымі за самую хату. Адно сталярка ў вокнах выглядала новаю. У маленькай спаленцы нічога цікавага не

было. Адна сьценка яе была суцэльным пабеленым бокам печы і раней, як казаў Сева, тут быў вялікі палок, на якім выкачалася не адно пакаленьне дзяцей. Я падумаў аб гэтых дзецях і ў роце ў мяне адразу запахла сухой абпаленай глінаю, якую, як быў малым, любіў адкалупваць па пячных расколінах на чэрані і есьці. Бабуля палохала, сварылася, што калі–небудзь выкалупаю ўсё гліну і разам з цэглаю абвалюся ў пячное чэрава. Дзеці, мабыць, гойсалі па палацях як пацукі, туды–сюды. У паўцемры пакойчыку ім было цёпла і ўтульна.

Зь вялікага пакою дзьверы з клямкаю на варыўню, добрую палову якой займала печ. Рагойшы, мабыць, даўно кінулі яе паліць, карыстаючыся грубкаю ў вялікім пакоі, таму сьцягнулі сюды ўсю этнаграфію, што пазаставалася ад былых гаспадароў. Стаяла на стале маслабойка, віселі нейкія ночвы і начовачкі, скрозь былі раскладзеныя па паліцах патрушчаныя друшлаты і жалезныя прасы. Вочы злодзеяў абмінулі ўсе гэтыя непатрэбныя ў наш час рэчы і пакінулі ў хаце самае каштоўнае — дух мінуўшчыны.
Ранейшыя гаспадары хаты — трактарыст з жонкаю і дзецьмі прадалі Рагойшам хутар гадоў зь дзесяць таму, а самі перабраліся ў Ракаў. Жылі на хутары безь сьвятла, узімку з курамі і сьвіньнямі ў хаце, баяліся ваўкоў і марылі пра цывілізацыю. Сева распавядаў, што з падпечча выграб можа зь дзесяць вёдраў птушынага гаўна. Я ўявіў сабе трынаццацігадовага Севу, які цягнуў гэтае птушынае гаўно ў вядры і адчуў да яго нейкі подых павагі.
З варыўні дзьверы былі яшчэ і ў сенцы, доўгія і сьветлыя сенцы з гліняным мастом, двума вокнамі і маленькім столікам, за якім лепей чым дзе ў хаце, мабыць, можна было пісаць. Такія ж самыя сенцы, згадаў я, у ксяндза Чарняўскага ў Вішневе. Такія ж сьветлыя вокны і столік, палова якога заваленая духмянымі антонамі, гуркамі і кропам — файным беларускім нацюрмортам. А на другой палове, расклаўшы таўшчэзныя Бібліі на розных мовах, робіць Ойча свой смачны і пявучы беларускі варыянт Боскага слова. Полымя сьвечкі напалову асьвятляе пакоі. Мігатлівае сьвятло дрыжыць і варухаецца, а разам зь ім ходзяць па сьценах цені. І я згадваю бабуліну хату, куды мяне прывезьлі малога на зіму.

Раніца. Я ляжу ў ложку. Сьвятло дае толькі агонь зь печкі, які ледзь пачынае ўбірацца ў сілу і кідаецца, шукаючы выйсьця, сюды–туды. Я зачаравана гляджу на сполахі барвовых ценяў, якія гойсаюць па хаце, слухаю няспынны трэск агня, і душу маю ахінае сьцішанасьць ад няспыннага руху сусьвету, які разгарнуў перада мною вялізную, невытлумачальную для чалавека працу. Я адчуваю сябе зусім лішнім пры гэтай дзеі сьветаўтварэньня, куды выпадкова мяне дапусьцілі да яе сузіраньня. Так было.
Я хукаю на сьвячу і выходжу з хаты ў сьветлую ноч. Вогнішча каля дубу блішчыць жоўтай чысьцінёю на тле чорнага, як сажа, лесу. Я іду паркаю ноччу да вогнішча, думаючы пра тое, што і золата чалавек упадабаў за ягоную нязгасную чысьціню, бо гэтага так бракуе самому чалавеку.
Але сам я больш люблю срэбра, бо калі золата — чысьціня, і кожны хто мае золата, уяўляе, што мае часьцінку дасканаласьці, недасягальнага ідэалу, дык срэбра — гэта вада. А там, дзе ёсьць вада, ці яе сымбаль, срэбра, чалавек заўсёды можа наблізіцца да чысьціні, ці, па меншай меры, супакоіць сябе гэтай уяваю.

Я пасьпяваю ў пару. Каля вогнішча ўжо замацоўваюцца вожагі зь мясам, і галодныя ваўкі, пачуўшы пах смажаніны, бліскаюць вачыма ў недалёкім гушчары. А можа, гэта і не ваўчыныя вочы, а зоркі прабіваюцца празь пераплеценае гальлё? Разьбірацца няма калі. Я бяру вожаг з устыркнутымі на яго кавалкамі мяса, няўпэўнена прашу сухога белага віна і не атрымаўшы яго, пачынаю ня горай ад ваўка ірваць пасмажанае мяса. Я адчуваю як джынсы і швэдар на мне пераўтвараюцца ў лён і скуры. Мяккія расьліны і цёплыя жывёлы аддаюць мне сваю энэргію, бароняць ад гнюсу і начной прахалоды. І ці ня тут, каля вогнішча, я ўпершыню аддзяляю сябе ад навакольнага сьвету, які нарадзіў мяне і зь якім я жыву адным жыцьцём.
Вогнішча ўяўляецца нейкай памежнай кропкаю, якая дала штуршок для разуменьня маёй індывідуальнасьці. Разам з вогнішчам я апынуўся ў цэнтры сусьвету, і тыя зьвярыны, што рыкаюць наводдаль, паблісквaючы ў цемры вачыма, круцяцца вакол мяне, як зоркі вакол палярнага кала.
Гарачае паветра над вогнішчам хіснулася суцэльнай плыньню

ўбок, як залева ў дарозе, ссунутая дворнікамі на лабавым шкле, і дзікія рыкі зьвяроў у паветры зьмяніліся на вясёлы рогат маіх сяброў.
Каля вогнішча спаў упіты Пятро. Я сядзеў на палене, пастаўленым настарчака. Каля хаты травіў рэгулярна баланду Сыс. Мабыць, падколваў Коліка, які дзікім голасам крычэў: “Сыс! Ты дурны!” Ля возера распавядаў нешта Астравец, як заўжды, доўга і падрабязна, са смакам апісваючы нейкую лухту. Паненкі час ад часу ўлазілі ў ягоную гаворку. Па галасох я пазнаў Алену і Паліну. Зданямі каля вогнішча зьяўляліся і зьнікалі маладыя. За хлявом прыглушана сварыліся Сева зь Філінам. Козьліка не было, мабыць піў гарэлачку. Яшчэ адзін украінец Генік сядзеў на цыратовым плашчы каля Пётры. Яго я заўважыў апошнім.
Ад возера падышла Паліна, а ад хаты Колік. Дзіўная сіла зьвяла іх каля вогнішча. Сутыкнуўшыся, яны панесьліся некуды па карчоўю. Толькі трэск і гул пазначыў напрамак іхняга адыходу. Голас Астраўца ад возера не замоўк, а прыцішыўся і палагаднеў, стаў падобным да буркатаньня тлустага голуба, які ходзіць вакол галубкі, паціраючы крылцамі, ці на ласкавае скавытаньне шчанюка. Я ўявіў Астраўца зь ягоным грэнадзёрскім ростам і падумаў, што гэта не шчанюк, гэта здаравенны дог, які косіць пад шчанюка, бо ведае, што сваім бляўкатаньнем хутчэй, чым злосным і ярасным рыкам, ён даб’ецца смачнага вялікага маслб.
А вось яшчэ адна цікавая пара, якая насілася, галёкала недзе ў лесе — Колік і Паліна. Я сядзеў ля вогнішча і падкідваў у вагонь акуратныя паленцы, як чарговы раз іх вынесла на сьвятло. Чамусьці з розных бакоў. Пра Коліка Паліна заўсёды гаварыла пяшчотна і ўседаравальна. Вось ён такі незвычайны, не такі, як усе — два гады сядзеў у калёніі. Ці мала ідыётаў сядзела ў калёніі, думаў я. Ён спаў у Караткевіча на матрацы, цягнула далей Паліна. Ці мала алькаголікаў спала на матрацы ў Караткевіча, думаў я. Урэшце пасьля адной такой нашай гаворкі яна пакрыўдзілася і сказала, што я нічога не разумею.
— Колік, — пачаў я раскручваць яго, — давай закладземся на адцісканьне. Хто меней адціснецца — будзе крычаць: Я дурань! Я дурань!
— Давай, — загарэўся Колік.
Ён кінуўся на зямлю і пачаў адціскацца. Мы з Палінаю пачалі

ўголас лічыць:
— Пяць! Шэсьць! Сем!
Ён здох на чатырнаццаці. Я, чамусьці злосны на яго, пачаў ціснуць на ягоную псыхіку:
— Усё, Колік, будзеш ты зараз крычэць на ўвесь хутар: “Я дурань! Я дурань!” — я паспрабаваў перадражніць Колікаў прарэзьлівы рыпучы лямант і так захапіўся гэтай недалёкай будучнасьцю, што ў нейкі момант пачаў дзеяць найперш для сябе, чым для іх, гледзячы ў шэрае, налітае нябачным сьвятлом неба. А калі, перавёўшы ўздых, я паглядзеў на Коліка, дык ад зьдзіўленьня змоўк. Ён ляжаў, не ўстаючы, з растапыранымі ўбок лакцямі, і вачмі, поўнымі жаху і нейкай унутранай шкадобы да сябе, глядзеў на мяне, як паглядаюць асуджаныя на сьмерць на бліскучае лязо гільятыны, што бязьлітасна нацэлілася на адамаў яблык.
Праз гэты пагляд зірнуў на мяне інтэлект дзіцяці, што жыве па законах прыродных інстынктаў і шкодзіць, аж пакуль бацька не прыкрыкне на яго: “Сьціхні, бо я воўк, зараз зьем цябе!” І беднае дзіцё палохаецца, убачыўшы раптам у бацькоўскім абліччы драпежныя рысы ваўка.
Я зьніякавеў і адкінуўся на цёплую вячэрнюю траву, якая разморана патыхала сонцам і ўласным перабрадзілым сокам. Што можа аб’ядноўваць іх, думаў я, Паліну зь інтэлігентнай сям’і выкладчыкаў з гэтым касьцюкоўскім вахлаком?
Калі я прыўзьняў голаў і азірнуўся — іх ужо не было. Толькі аддаляючыся ішоў сьцяною трэск гальля.
Я зачаравана глядзеў на агонь, падкідаючы часам сухія паленцы. Усе колеры жыцьця таньчылі–пераліваліся ў ім. Глыбокі жоўты колер пераходзіў у яшчэ больш густы чырвоны, які нагадваў густое золата старых манэтаў. Біруза і змарагд успыхвалі раптоўна на астываючых чорных вугольлях па бакох, выпальваючы зь іх апошняе цяпло. Вугольле паступова набірала фіялетавы бляск. На самых кончыках языкоў таньчыў, пераскокваючы дзіўнымі пырскамі, ультрамарын. А сэрца вогнішча — малінавы жар пульсаваў, выпраменьваючы рытмічнымі хвалямі цеплыню.
Ці ёсьць на зямлі зьява, больш няпэўная за агонь? Жыцьцёвасьць ягоная падманлівая, бо нясе найперш сьмерць усяму жывому, апроч чалавека, які выкарыстоўвае гэтую сьмерць астатніх сабе на спажытак.

Зьвязаныя і санлівыя думкі снавалі ў маёй галаве. Яны абрываліся, няскончаныя, а затым наплывалі зноў. Я лянотна спрабаваў ухапіцца за іх. Нешта кацілася далей, затым ізноў ірвалося, мабыць ад выпітага віна, падумаў я, і кінуў гэтую марную справу. Я кінуў разважаць і загойдаўся на хвалях пачуцьцёвае плыні, успрымаючы толькі колеры, гукі і пахі. Я пазбавіўся думак. Мне здалося, што яны вылецелі з маёй галавы праз рот, нос і асабліва праз вушы, пакінуўшы галаву пустою і звонкаю. І я сам, шчодра паліты сернай кіслатою, распусьціўся па зямлі. Частцы маёй стала горача і суха ад агню, а частцы золка і вільготна, бо, здаецца, ужо выпала раса. А частка разам з параю і дымам узьнялася крыху над зямлёю і завісла там, зь цікаўнасьцю паглядаючы на ўсё, што траплялася на яе нябачны зрок.

Ня ведаю, колькі я знаходзіўся ў такім разнамерным стане, калі б не прыкмеціў той часткаю, што лётала ўгары, што ня дыхаю. Праўда, мне і не хацелася гэтага, але ў галаву ўрэшце прасьлізнула адная думка — трэба ўздыхнуць, хоць і была ўпэўненасьць, што ўсё адразу ж разбурыцца. Так і адбылося. Як толькі я ўздыхнуў, усё адразу вярнулася на сваё месца. Разам з выдыхнутым пахам выпітага віна я ўжо цалкам вярнуўся да прозы нашай вечарынкі.

Праўда, вечарынкі ўжо не было. Хто жадаў, укладаўся спаць, астатнія ж рабілі, што хацелі. Вось да вогнішча падышлі Пётра з Валяю. Буйнаватая Валя квітнела, а Пётра, не хаваючы перад гэтым, што жанаты ў сваім Львове, моцна трымаўся за яе, маючы ў руцэ пляшку сухога. Дзе ён яе выкапаў, падумаў я. Здаецца, ж сухое ўжо даўно выжлукцілі. Яны пасьцялілі прыцягнуты з сабою стары, з хутарскіх, мабыць, запасаў цыратовы дажджавік і селі на яго. Пётра сарваў зубамі мэталёвы корак і мы пацягнулі “з рыла” чырвонае густое віно, якое, перасякаючыся з вогнішчам, блішчэла ў пляшцы рубінавай крывёю. А затым запалілі амэрыканскіх цыгарэтаў. Пётра троху падфарцоўваў, а таму лічыў даляры і паліў “Marlboro”. Ён сядзеў, хістаючыся. Вытанчаная пабліскваючая залатым абручыкам цыгарэта прыліпла да ягонае ніжняе вусьніны. Попел ляцеў на джынсы і Пётра спрабаваў зьвязаць у адное нейкія камплімэнты, якія перарываліся ўздыхамі і прыцмокванньнем: “Валя, Валя!”

— Сапраўды казак, — з гонарам за Пётру прагаварыў я да Валі.

Яна, сарамліва пасьміхаючыся, прамаўчала. Пётра пахістаўся трохі, затым выплюнуў недапалак, які Валя асьцярожна адкінула са сваёй туфлі, і паклаў сваю растрапаную галавой на худой доўгай шыі на яе мяккія вялікія сьцёгны. Валя зрабіла выгляд, што не заўважыла, але рука яе праз хвіліну задумлёна пачала прыграбаць Пётравую чупрыну.
Вось такі недасканалы чалавек, падумаў я пра сябе. Спачатку зайздросьціць жанатым, а як жэніцца, дык сам пачынае зайздросьціць нежанатым. Мо таму людзі і жэняцца шмат разоў, пераходзячы з аднаго стану існаваньня ў другі?

У хуткім часе да агня прыйшоў яшчэ адзін хахол Генік. І мы сядзелі ўтрох моўчкі каля вогнішча. Пётра змоўк, і кожны з нас думаў пра нешта сваё, а мо і ні пра што ня думаў. Адзінае, што было зусім зразумелым — нам было ўсьцішна і добра.
Я зачаравана паглядаў на вялізны цёмны дуб, які засьціў паўнеба над галавою. Другая палова вільготнага пэрлямутравага неба патыхала таямнічым бязьмежжам. І тым магутнейшым выглядаў дуб, які захінуў палову з гэтага неабсяжнага неба.
Цёплая сьветлая ноч ахутвала мяне і гэты дзікі куточак прыроды.
Я прыплюшчыў вочы і пачуў, як нехта шоргае нагамі па траве. Падышлі маладая і малады. Наталя перабірала сваімі доўгімі нагамі і гарачыя водбліскі скакалі па яе лытках і сьцёгнах, мякка гаснучы пад доўгім швэдрам. Некалі яшчэ студэнткаю яна таньчыла ў вар'етэ. За такімі нагамі сапраўды можна было звар'яцець. Некалі ў асьпірантах мы зь Ігарам і Казловым размаўлялі былі пра яе ногі. Дакладней кажучы, гаварыў я. Ігар пасьміхаўся і ківаў галавою, а Козьлік сарамаціў мяне, бо я толькі ўзяў шлюб і ўжо як бы ня меў права ацэньваць іншыя ногі, апроч жончыных. Урэшце Козьлік у кабечых нагах разьбіраўся як сьвіньня ў памаранчах.
Жаночыя ногі, думаў я, лежучы пад дубам, гэта катэгорыя эстэтычная, адно з найлепшых дасягненьняў прыроды.
Пакуль плынь сьвядомасьці несла мяне, як па шпалах, па жаночых нагах, вочы мае назіралі за тым, як Наталя са сваімі вартымі захапленьня нагамі ўплывае ў цемру, а Ігар, як матылёк, пасьміхаючыся ўсяму сьвету, брыдзе за ёй. Думкі мае

не пасьпявалі за імі і калі я ўрэшце прыйшоў да заканчэньня сваіх развагаў і ўспамінаў, яны ўжо зьніклі і пакінулі пасьля сябе недапітую пляшку сухога, якая магічным чынам аднаўлялася каля вогнішча. Я пашукаў вачыма ранейшыя, пустыя пляшкі і не знайшоў іх. Мо' гэта была адная і тая ж пляшка? Я задумліва ўзяў яе ў рукі і пачаў смакаваць малдаўскі сухач, памешаны з пахам цыгарэтаў і жаночай парфумы.

Побач чуліся булькаючыя гукі. Я павярнуў голаў, цэдзячы віно, і ўбачыў за Валяю аджылага Пётру, які нахіліўся ў мяккую цемру і плечы ягоныя дробна трэсьліся ад усхліпаў. Плача, падумаў я. Не, рыгае, здагадаўся потым. Валя, не зварухнуўшыся, глядзела на вогнішча. Я перадаў ёй недапітае віно. Яна, не выціраючы рылца, павольна дасмактала яго і рэзка адкінула пляшку ўбок. Я вінавата сьцепануў плячыма. Валя — гладкая і спакойная дзяўчына. Такіх любяць старыя кабеты ў вёсках. А, мабыць, раней бралі, расхопліваючы, за жонак, бо, ведама ж, і дзеці здаровымі будуць, і ў працы ад яе хавайся — лепей ня зробіш. Але часіны перамяніліся. Зараз у модзе даўганогія, слабыя і худыя. Ні дзеці, ні праца нікому не патрэбныя. Валя ездзіць у Польшчу. Гандлюе там усім чым папала, а найбольш мужчынскімі ласкатунчыкамі.

Забясьпечыла імі ўжо не адную сотню палякаў і сама ходзіць як беларуская бульбіна ў фінскім пакунку з–пад малака.

Вогнішча дагарае. Я ўкідваю апошнія паленцы з–пад сябе. Агонь ізноў убіраецца ў сілу. Вакол наступае нэйтральны час сутоньня, калі болей ужо не цямнее, але ж і ноч не пераваліла на другі бок.

Пётра, ачомаўшыся, спрабуе зноў пакласьці галаву на Валіны гладкія сьцёгны пад квяцістай турэцкай спадніцаю. Тая спакойна нешта адказвае яму. Чутно адное — ідзі ты на фіг. Пётра хутка пагаджаецца, бо і сам, мабыць, разумее сваю паразу і ціхенька сыходзіць дахаты. За ім зьнікае і Валя.

Я застаюся адзін, думаючы, ці не начаваць мне тут, седзячы каля вогнішча, ці ўсё такі пайсьці ў хату паспаць. Думкі мае, разбаўленыя малдаўскім сухачом, плывуць павольна і ня хочуць прыходзіць ні да якой высновы. Адно, пацягнула некуды ў маладосьць, калі мне было 15–16 гадоў і было такое захапленьне гэтым сьветам, што ў вёсцы, куды прыяжджаў да бабулі, цэлыя ночы праседжваў на вуліцы, прыслухоўваючыся

да кожнага гуку і шоргату, убіраючы ў сябе ўвесь сусьвет. Ды гэта было так даўно. З тых часоў я пражыў яшчэ столькі ж. І сьвет ужо ня той, а я дык і тым болей.
Ад хаты прыбегла Паліна. Спыталася дрыжачым ад начной прахалоды голасам, ці думаю я тут начаваць і затым спыталася пра дажджавік, бо ў хаце было халодна. Урэшце знайшла яго.
— Вой, — падвысіла голас, зь якога зьнікла ўсялякае трымценьне, — што гэта?
— Вой, што гэта?! — яшчэ гучней спыталася яна, ведаючы ўжо што і паднесла рукі да агню.
— Ай–яй–яй, — безвыходна заенчыла ад адчаю, выціраючы рукі аб траву.
— Хто гэта? — пыталася ў мяне, ледзь ня плачучы, — хто?
— Яго ўжо тут няма, — паспрабаваў супакоіць яе я.
— Во сьвіньні, — енчыла Паліна, — брудныя гідкія сьвіньні, — і трава разьляталася ад яе ў розныя бакі, — і заўсёды мне шэньціць на што–небудзь такое.
Я заўсьміхаўся сам сабе, бо гэта было сапраўды так. Зусім нядаўна яна мусіла працаваць на падмену ў філіі свайго музэю. Прыйшоўшы туды і ўбачыўшы зачыненыя весьніцы, бо не зьявілася яшчэ наглядчыца, у якой быў ключ, яна пералезла праз плот і ўвайшла ў музэй. Праз тры хвіліны плот ужо штурмавалі міліцыянты. Аказваецца, музэй падключылі пад ахоўную сыгналізацыю, не папярэдзіўшы іх. Усё было б прасьцей, калі б добрасумленная Паліна не палезла праз плот.
— Вось вы ўсьміхаецеся, сьмешна вам, — пакрыўджана енчыла Паліна.
— Супакойся і ідзі спаць, — параіў я.
Паліна пабегла, клянучы сваю долю. А мяне ізноў падхапіла хваля ўспамінаў пра гомельскі ўнівэрсытэт, у якім я вучыўся, які менавалі паміж сабой унівэрсамам. Невялічкі гурток наш тады качаў беларушчыну на ўсіх узроўнях. Дзе і як толькі магчыма. Былі гады застою і з боку гэта ўсё выглядала, мабыць, досыць беспэрспэктыўна. Мы хадзілі ў беларускіх кашулях і куфайках і падкрэсьлена гаварылі па–беларуску. На вачох усяго курсу, і гісторыкаў — будучых функцыянэраў — раскладалі дошчачку, наразалі сала і цыбулю і елі, такім чынам сьцьвярджаючы сябе. У тыя гады паміж студэнцкай куфайкаю, салам і беларускай ідэяй была глыбокая повязь.
Я здрыгнуўся і вярнуўся да свайго цела, якое тулілася да

апошняга цёплага вугольля. Мабыць, трэба ісьці мабыць класьціся, падумаў я, бо ўжо пачынаюцца трызьненьні, якія да сёньняшняй ночы ня маюць ніякіх стасункаў. Чым сядзець і згадваць мінулае, лепей запомніць тое, чым жывеш сёньня.
Я пабрыў па начной траве, грузнучы ў мяккай зямлі, і хвалі густога водару, як духмяныя шаты, захінулі ўсяго мяне.
Я ўвайшоў у сенцы, пасклізнуўся, але ўтрымаўся на гліняным мосьце. От, Пётра, і тут зрабіў сваю гіблую справу, падумаў я, і зноў выйшаў на двор, дзе доўга шоргаў красоўкамі аб траву. Затым вярнуўся і прабраўся асьцярожна паўзь сьценачку, імкнучыся зноў ня ўлезьці ў паскудзтва. Здаецца, мне гэта ўдалося.
Я зайшоў у галоўны пакой і агледзеўся. На пярэдняй да мяне канапе, раскінуўся волатам, чэравам дагары, Сыс. За ім каля вакна ляжалі два ўкраінцы, а на канапе каля глухой сьцяны туліліся паненкі. Сыс ляжаў адзін пасярэдзіне. Я троху пасунуў яго, падгроб сабе пад галаву брудны нават навобмацак матрац і, выпрастаўшыся, заціх.
Было халодна і вільготна, як у вайсковым бункеры. Я паціху паехаў у дрымоту, чуючы, як з глухога пакойчыку ўсхапіўся Скобла і пайшоў па дровы. Ён мацюкнуўся ў сенцах, ледзь ня ўпаўшы, затым узбурыў Паліну і яны растапілі печку.
— Уюшку зусім выкіньце, — праз сон папрасіў я.
Вільгаць стала цёплаю і я ў думках з вайсковага схрону перабраўся ў вугальную шахту і зноўку паспрабаваў заснуць. Але ж не — Сева распавядаў у суседнім пакоі пра гістарычную канапу, на якой спаў Караткевіч у Адамчыкаў і якая нейкім чынам трапіла на гэты хутар, а таксама пра гістарычны матрац, на якім Колік спаў у Караткевіча і які цяпер, выходзіла, ляжаў пад маёй галавою.
— А гэтае, на чым я сплю, — спытаўся Козьлік аднекуль згары, — таксама гістарычная рэч? Толькі яна неяк ня так стаіць, — сумняваўся ён.
— І мне таксама здаецца, — расьпешчаным голасам падтрымала яго Філін, а затым засьмяялася ліпкім сьмехам, — нешта мы ніяк ня можам разьмясьціцца.
Правяраць, як там яно, ніхто ўжо ня стаў. Усе замоўклі, а можа гэта і я ўжо зноўку заснуў.

Мабыць, мала ў нас было пітва, бо праз сон я чуў, як народ сноўдаўся па хаце, дзынкаў шклянкамі, шукаў, нешта дапіваў. Аднастайна гудзела печ, распавядаў нешта Козьлік, паненкі сьмяяліся як не ў сябе, побач соп Сыс. Я ня мог адарваць галавы ад бруднага Караткевічавага матрацу, каб ухіліцца ад сьвятла запаленай сьвечкі, якая размалёўвала мой сон у жоўтыя колеры.

Я б доўга яшчэ, мабыць, так пакутаваў, калі б не Паліна, якая ўрэшце пачала ўлягацца і выцягнула з–пад маёй галавы ўтульны матрац.

Я разьляпіў вочы. Паліна ўжо зацягнула матрац на свой ложак і спрабавала накрыцца ім, як вялікая мядзьведзіца. Я зь цяжкасьцю паглядаў на той ложак, на якім варушыўся вялікі лоўж, і пачаў сарамаціць яе:

— Вось ты, бессаромная! Матрац украла! А на чым я цяпер буду спаць?

Вялікі адчай адбіўся ў маім голасе, бо я адчуваў, што моцы ўстаць і пазмагацца за матрац у мяне зусім няма.

— Паліна, бессаромная, аддавай матрац! — прасіў я яе.

На гэта яна па–медзьвяджачаму рыкала мне ў адказ:

— Ага! А я што, мерзнуць буду?

Ня мог я дараваць свайго матрацу за так і таму падумалася ў затуманенай галаве, што гэта не Паліна, а мядзьведзіца сьцягнула зь мяне гэты матрац. І адразу ў мяне зьнікла ўсялякае жаданьне змагацца за яго. Супраць мядзьведзіцы з голымі рукамі не папрэш. Вось была б у мяне Едрусева стрэльба — вэртыкальная двубойка з жаканамі, тады б я ёй паказаў, — спрабаваў я апраўдаць свой безнадзейны стан, і ўжо зусім супакоены, рэкнуўшы яшчэ нешта дзеля прыліку, як рэкаюць у сьпіну дзікай зьвярыне, што прайшла побач, пракаўтнуўшы твае прыпасы, і падалася некуды далей, я ўпаў галавою на вішнёвую канапу, падфарбаваную месяцам у чорнае бардо і кінуў змагацца з гэтым сьветам.

А ў хаце пачыналася сама што гулянка. Вішчэлі каля стала пашалелыя кабеты, чаўкаючы ратамі, набітымі салам. Храбусьцеў цыбуляю Козьлік, заядаючы гучныя булькі свайго кадыка. Філін сьмяялася так, што сіберам патыхала ў маю сонную патыліцу. Колік, во, Колік яшчэ рыпеў нешта, як бы аджылі і загаварылі ўсе масьніцы ў хаце разам узятыя. Гэты гвалт балюча біў па далікатных маіх мазгах. Чэрап мой

стончыўся ў яйкавую шкарлупіну ад вар'яцкага вэрхалу.
Не! Так немагчыма! Трэба штосьці мяняць! Я зноў падняў сваю хліпкую галаву на жабінай шыі, каб сказаць нешта, адплюшчыў свае лупатыя вочы.
Што гэта была за карціна! Пры бегаючых ценях сьвечкі весяліліся каля стала набухлыя чырвоныя пачвары і нешта адчайна пішчэлі, размахваючы рукамі. Я агледзеўся, убачыў Паліну, на якой гарой дыбіўся Караткевічаў матрац, убачыў сіняга Пётру. Магутны Сыс хроп побач, як волат, раскінуўшы ўбакі сваю левую руку і нагу. Ён бы і правыя раскінуў, але тут на канапе ляжаў я сваім бліскучым зялёным целам. Садом і гамора! — адчайна падумаў я, глуха крумкнуў і ўваліўся ў вішнёвую канапу на спакой.
* * *
Шаўковыя воды, празрыстыя, як крышталь, аж да нябачнасьці сваёй і заўважныя толькі па водбліскаў іскрыстага сонца ды хуткай плыні, абмывалі маё цела. Лёгкія хуткія аблокі, растрапаныя як страўсіныя пёры, на міг захіналі сонца, і трава, і пясок на дне ручаіны, і вада адразу мянялі свае калёры. Здавалася, пасьпяваў зьмяніцца і я сам, і ў скроні калола ад гэтае хуткае зьмены. А затым сонца зноў залівала наўкольле, і зіхцела жывымі дыямэнтамі па вадзе ручво, і налівалася пяшчотаю аксамітная трава, і сіняе неба кружыла голаў.

Далява лугоў між прасёлін пушчы.
Дзе хавацца, дзявацца ім
пад гушчынёй сваёй ахопленай,
і павеістым летняком?

Акаранелі пушчы на сваім месьце.
Але лугі разводнікі
раступаюць іх
даць ветразям сваім расквечаным
армадай сплыць
да віроў рачных.

Пад сьвяцістым сонцам любасьцяй спакметнай,
і ў сьценях сонцам дыктаваныя,
яны плывуць павольнай віняй хваляў
ахіненыя асакой шчыльнай.

Лугоў разложнасьць любім мы.
Рух гэтакі нестамлёны.
Воч вобмацкі чытаюць іх.
Яны кажуць:
— Убожнік ты.
Прывіды жыцьця твайго
у сіле красаты
здрабнеюць.

Чуўся ў паветры вершык Янкі Юхнаўца, прагавораны недзе побач, а можа, і мною самім. На памяць я яго ня ведаў і радкі браліся аднекуль самі, нязмушана ўсплываючы адзін за адным. І там, у сьне, я быў мурынам. Вялікім, чорным, аж зь сінім адлівам мурынам, які няведама як трапіў у гэты рай.

* * *

Сонечныя косы праз вакно ўпалі на маю скурчаную сьпіну. Я ляжаў на канапе, уцягнуўшы галаву ў плечы, з далонямі паміж каленяў і паступова адыходзіў ад сну.

Сонца асьвяціла змрочную хату і пры ранішнім сьвятле ў цёплым вільготным паветры інтэр'ер выглядаў не такім ужо смутным, як зь вечара. Пасьвятлела пабеленая печка і трамы над галавою не здаваліся такімі ўжо прагнутымі.

Заварушыўся, пазяхаючы Сыс, загаманілі, сьмеючыся, у суседнім пакоі. Я пачуў, што раніцаю сыйшлі Козьлік зь Філінам. І чамусьці мне згадаліся Каляды, якія мы сьвяткавалі гадоў пяць таму ў Гомлі. Козьлік, які працаваў тады ў Жлобіне, абяцаў прыехаць, але не зьявіўся і, як высьветлілася пазьней, узяў перад Калядамі шлюб, каб на Піліпаўку, як воўк, зьбегчы ад сваёй жонкі.

Я паспрабаваў расправіць свае скурчаныя косткі на цёплай, угрэтай ужо вільготнай канапе і з насалодаю пацягнуўся так, што аж закруцілася галава.

Я сеў на канапу і празь сенцы, пераступаючы падсохлую блявоціну, выйшаў на ганак. Цёплая летняя раніца сустрэла мяне. Лагоднае сонца без кантрастаў роўна асьвяціла цёмнае бярвеньне хаты і ганак з адкрытаю вэрандаю, і зьдзічэлы ў траве па пояс, двор, і стары хлеў з новым чыстым белым шыфэрам. Я сеў на цёплую лаву каля стала на вэрандзе зь вялікімі шчылінамі ў доле, рассунуў убакі брудныя слоікі, пустыя пляшкі, паклаў галаву на падстаўленыя далоні і бяздумна, бо думаць яшчэ не хацелася, разглядаў гэты

калярытны хлеў, што стаяў насупраць і нагадваў старога згрыбелага дзядка, які нацягнуў на голаў новы бліскучы вайсковы капялюш свайго ўнука, што толькі як дэмбільнуўся, і на радасьцях, проста са сваёй галавы, і замяніў змызганы, парваны дзедаў аблавух. — Насі і жыві яшчэ хоць сто гадоў.
Я глядзеў на хлеў, таму што ён быў проста перад маімі вачыма, і выбіраць не прыходзілася.
Зь сенцаў вылез памяты і спухлы Астравец. Не, я, мабыць, не такі, падумаў я, бо гарэлачкі ня піў.
— Хадзем, пакупаемся, — прапанаваў ён.
Не. Досыць я ноччу намучыўся. Мне зусім не хацелася зьмяняць фізычнае асяродзьдзе вакол свайго разамлелага і намучанага за ноч цела. Яно і так аджывала ад сонейка і цеплыні.
Зь сенцаў выпаў кандыбоберам Колік.
— Вунь яго бяры, — параіў я Астраўцу.
Колік пацягнуўся за ім усьлед.
— Колік, — сказаў я наўздагон, — толькі доўга ня мыйся. Бо як вымакнеш, дык усе жабы ад сьпірытусу паздыхаюць.
— Ідзі ты на хрэн, — сказаў ён не абарочваючыся.
Я зноў сьцішыўся ад сонечнай лагоднай цеплыні.
Паволі на ганак павылазілі ўсе жывыя. Хлопцы адразу запалілі, уяўляючы, што ад гэтага лягчэй, а паненкі з маладою разам спорна падтрымалі іх.
Стомлена і лена пасьмейваліся, згадваючы беднага Пётру і наш з Палінаю разбор з–за матрацу. Аказваецца пасярэдзіне ночы ім, як тым мышам, захацелася есьці. Яны зьнішчылі ўсё, што знайшлі. І пачаўленыя памідоры, і кавалкі недаедзенага хлеба і вымачылі мякішом усю жыжку з кансэрвавых бляшанак, дапілі ўсе недапіткі, якія патрапіліся ім.
Ці будзе апахмелка, з тугою думаў я, згадваючы, як Сыс нешта ўвечары спрабаваў крычэць наконт запасу назаўтра. Ці прыхаваў ён якіх паўпляшкі, ці пасьпеў.
Сьмех наш павесялеў, як згадалі пра Козьліка і пра Філіна. Аказалася, што спалі яны не на канапе, а на версе шафы. Як туды залезьлі — невядома, і як месьціліся — таксама невядома. І цьвёрда, і мулка, казаў нехта празь сьмех, і мы ўсе зноў пачыналі рагатаць. Цяжка сказаць, як можна было шафу пераблытаць з канапаю.
Прыйшлі мокрыя Колік з Астраўцом. Абодва пасьвяжэлыя, перакідваліся нейкімі кпінамі. Яны папрасілі запаліць.

Аказалася, што ўсе запасы хахляцкіх, амэрыканскіх і гарадзенскіх цыгарэтаў скончыліся. Тут кінуўся ў сенцы Сыс і эфэктна кінуў два пачкі “Космасу” на стол, спаміж леташніх заплесьнелых слоікаў. Ад радасьці ўсе гаркнулі: “Гура!” Гэтыя эмоцыі былі для мяне незразумелыя. Адно падумаў, што, мабыць, ёсьць усё ж такі ў яго і прыхаваная пляшка гарэлкі. Усе з радасьці, што знайшіся цыгарэты, зноў запалілі і пачалі меркаваць, а дзе ж спалі маладыя. Як высьветлілася, у хлеўчыку наскідалі ім нейкага рызьзя. Там яны і сустрэлі сваю першую законную шлюбную ноч. Папыталі ў Севы, а што там было раней. Аказалася, сьвіньні. Зноў пасьмяяліся.
Я спытаў у Паліны, а чаму такі сумны Сева. Яна ціхенька распавяла, што ён страшэнна злы на ўсіх пасьля ўчорашняга глуму над ім зь Філінам. Казаў ёй, што ноччу было жаданьне падперці ўсіх і спаліць хату разам з намі.
Я зь цікаўнасьцю паглядзеў на Севу. Яго, здавалася, нічым ня проймеш.
— Сам нарваўся, — заўважыў я. Калі хацелася цмактацца ці там яшчэ чаго — схаваўся б за хлеў.
— Дык вы што, Севу ня ведаеце, — сказала Паліна, — ня ён быў бы.
А тым часам Сыс пачынаў чарговую сваю дзею.
— Колік, — крычэў ён, — шукай!
Ён увесь ільсьніўся ад задавальненьня. Выпінала з–пад расхрыстанай кашулі здаровае чэрава і дзябёлыя грудзі Сыса. Рыхлыя складкі скуры і тлушчу па бакох безнадзейна цягнулі ўсё ўніз.
Ізноў балюча зашчымела ў мяне сэрца. Я глядзеў на вясёлы, буры з чырвонымі жылкамі на скулах ягоны твар, на бліскучыя, як заўсёды вылупленыя вочы, я глядзеў на гэты ўзьдзьмуты фэйс, на чэрава і налітыя нездаровым лоем бакі і грудзі, і мільганула ў вачох у мяне пастава маладога, дзесяць гадоў таму, шалёнага Сыса, які нагадваў гладкую раскормленую пантэру, за знарок павольнымі рухамі якой ніколі не ўгадаеш тога моманту, калі яна, уміг скруціўшыся спружынаю, выбухне дзікай жывёльнай энэргіяй і шахне пазурамі па глотцы, начыста выдзіраючы яе разам з абарванымі жыламі.
Тады ён быў дурны, але моцны і прыгожы, і ўсё было яшчэ наперадзе.
— Колік, шукай, засранец ты! — другі раз паўтарыў Сыс, і сам

пачынаў лічыць крокі наперад выстаўленай да хлева рукі.
— А зараз пяць крокаў улева, палез ён, лічачы свае крокі, на груд ламачча, што было наскіданае пасярэдзіне двара, і густа зарослае травою.
Ён лез наперад, расьпіхваючы траву сваімі тоўстымі, чырвонымі ад апалу нагамі і я ўжо ведаў, што ён шукае.
— Во! — зароў радасны Сыс і выцягнуў з травы пляшку белай.
— Га! — гукнулі ўсе зьдзіўленыя і захопленыя.
— Колік, трымай! — гукнуў Сыс і кінуў пляшку свайму хвасту.
Усе спуджана ўздыхнулі, але Колік спрытна перахапіў яе і пяшчотна, як дзіця, прытуліў да грудзей.
Сыс зьзяў ад задавальненьня. Вось дзеля гэтых хвілінаў усеагульнае ласкі і любові ён і блукаў учора паўдня па навакольлі.
Але тэатар працягваўся. Сыс ізноў забурчэў як трактар і палез па траве ў бок дубу і празь пяць крокаў выкалупаў з травы пад хлапечы рогат і віскі паненак яшчэ адную пляшку гарэлкі.
Ён быў сапраўдным героем.

Ліхаманкава пачалі шукаць закусь. Са стала на адкрытай вэрандзе пад шляхецкімі слупкамі папрыбіралі ўвесь брудны посуд і паставілі знойдзеныя Сысом пляшкі.
Хутка вызначылі, што на літар гарэлкі засталося ў нас два літры пітное вады і два няпоўныя пачкі цыгарэтаў. Ды гэта нікога асабліва не турбавала. Паненкі паўздыхалі дзеля прыліку, але ніхто ўсур'ёз не ўспрыняў іхнія ўздыхі. Я заўважыў яшчэ раней, што здаровыя фізычна і псыхічна кабеты п'юць як жлукты. Нашыя ж паненкі, пэўне, што былі здаровымі.
Разьлілі адную пляшку, выпілі і запалілі. Гарэлка ў цёплай траве ўжо пасьпела нагрэцца і выразна тхнула нафтаю. Сева хадзіў вакол хаты і забіваў аканіцы. Яму не цярпелася. Але ніхто не сьпяшаўся. Было сьветла і сонечна, так што зялёная трава выглядала амаль што белай.
Я пайшоў па разорах спаміж зяленіва да дубу, панюхаў ягоную сухую шэрую кару, каб перабіць нафтавую адрыжку і затым па сьцежцы праз чарналесьсе падышоў да возера, гэтай невялічкай ямінкі на целе зямлі, залітай яшчэ дагістарычнаю вадою.
Я чуйна прынюхаўся да паху чорнага лісьця, што тоўстым кілімам засьцілала спадзісты бераг і дно возера. Гэта быў пах

спрадвечнае вільгаці, які, пэўна, прыцягваў да сябе ўсё жывое ў навакольлі. Я глыбока ўздыхнуў і ў мяне на імгненьне перахапіла скроні і я адчуў, што празь міг, ад супрацьлеглага зусім недалёкага ад мяне берагу, вымкне статак расхрыстаных, ахутаных воблакам потнае пары, з налітымі крывёю вачыма, тураў.
І сэрца маё сьціснулася ад небясьпекі. І я гатовы быў кінуцца за куст і ўплішчыцца ў мокрае лісьце, каб зьнікнуць на час з гэтае зямлі, ратуючы сабе жыцьцё. І ў гэтае імгненьне страшэннае небясьпекі, якое прыйшло да мяне аднекуль зь сярэдзіны, вылучылася з крыві маёй і прабегла па скуры хваляй угору, прымусіўшы ўстаць валасы на галаве старчаком, у гэтае няўлоўнае імгненьне я адчуў сябе непадзельнаю часткаю ўсяе прыроды, часткаю, якая проста не існуе без навакольнага сьвету. Я ледзь не задыхнуўся ад зьвярына–пяшчотнага пачуцьця, што выбухнула ўва мне і на міг прыадчыніла таямніцу ўсяго існуючага ў гэтым сьвеце, усяго рэальнага, што было перад маімі вачыма і за сьпінаю, высьвяціўшы нейкі таемны пласт страшэнна далёкае мінуласьці, зь якой мы выпаўзьлі аж да сёньняшняга дня, пагубляўшы ледзь ня ўсё, што мелі. Гэта была мая зямля ўся, да астатняга лісьціка. І я згадаў, як продкі мае зь ледавікамі адыходзілі адсюль раз за разам і затым зноў вярталіся, а інакш і не магло быць.
Я пацягнуўся да хутара, імкнучыся не расплёскаць адчутае. Я астатні раз зірнуў на возерца, бо ведаў, што ўжо ніколі ня буду тут.
На ганку якраз разьлівалі другую пляшку. Ранішняя мявасьць прайшла. І ўсе павесялелі. Зноў жартавалі і сьмяяліся, як бы і не было мінулае начы. Урэшце з трэцяга разу сабраліся і расьцягнуўшыся купкамі выпаўзьлі з хутару. Сева суправаджаў нас грукатам сякеры, забіваючы наглуха дзьверы.
Мы цягнуліся па выбітай калдобінамі, зь якіх ніколі не сыходзіла вада, дарозе, ішлі па травяністых, зялёных, у разнакаляровых кроплях кветак, узьмежках, цягнучы за сабою пустыя торбы. Я паволі адставаў на гэтым жывым ланцугу, зьяжджаючы па пацерках людзей у хвост. Хутар не адпускаў мяне і я зь цяжкасьцю перастаўляў нагамі, чапляючыся вокам за стромкія электраслупы.
Мы прайшлі недагледжаныя калгасам палі, прайшлі пляшку зь недапітым півам, якую за гэты час на дарозе так ніхто і не

зачапіў, і выйшлі на ўзьлесак, паўзь які бег гэты забыты Богам людзкі шлях.
Я прыслухоўваўся да размоваў нашае пабітае на купкі кампаніі і думкі мае лёгка сьлізгацелі па польскіх кірмашох і недапітых пляшках гарэлкі, па дзяльбе кватэраў у Саюзе пісьменьнікаў і сэксуальных вычварэньнях блакітных у прыбіральнях на Камароўцы. Гэта было ўсё такім нецікавым. І мяне аднесла на другі пяшчаны бок шляху далей ад слоўнае лухты, якой у Менску забіваюцца ўсе мазгі.
І раптам з маіх валасоў пасыпаліся іскры, яны затраскацелі бы на пажары і няведамая сіла адкінула мяне ўбок. Я ашалела паглядаў на сымэтрычна закручанае шэрае колца, што ляжала– песьцілася ў гарачым дарожным пыле і толькі маленькая трохкутная галоўка на далікатнай шыйцы рытмічна выпускала дрыжачае джала ды шкляныя вочы зь цікаўнасьцю назіралі за мною.
Я хуценька саступіў, пераскочыўшы на другі бок дарогі, бліжай да ўсіх, азіраючыся на шэрую плямку лясной спадарыні. І толькі тут закалацілася сэрца і задрыжэлі рукі, а аднекуль, мабыць, з душы, зваліўся вялізны камень невытлумачальнае жахлівае небясьпекі. Інстынкт закрычэў у кожнай маёй цягліцы, супраціўляючыся прыгожай са сталёвым тусклым бляскам сьмерці.
А між тым лес распускаў водар цёплае хваёвае смалы і толькі вільготныя нізінкі дыхалі апрэлым лісьцем ды яшчэ пах цыгарэтаў набягаў часам з–за сьпінаў нашых паненак. Я пайшоў на абгон. Прыгамаваў толькі каля Севы, які пачаў мне прыгаворваць старыя назовы мясьцінаў, паўзь якія мы праходзілі.
Урэшце мы выйшлі зь лесу і шлях пакаціўся ўніз паміж кар'ера з аднаго боку і ўзрытай пусткаю з другога і зьнік у тунэлі пад высокім насыпам аб'язной аўтастрады, за якой хаваўся Ракаў. Кавалкі зраненай зямлі паабапал шляху раней таксама мелі нейкія назовы. Там дзе быў засыпаны розным местачковым сьмецьцем кар'ер раней быў узгорак, засеяны сасоньнікам, як патлумачыў Сева. Але прыйшлі бальшавікі і там, дзе быў гаёк, стала ямка.

Вялікі самазвал абагнаў нас, абдаўшы пылам. Вёз пясок з

кар’еру. Наперадзе замахалі рукамі Колік з Сысом. Засталося ісьці, можа, зь які кілямэтар. Але машына, на зьдзіўленьне, спынілася, і яны хутка, як тлустыя малпы, ускараскаліся ў высокую кабіну. Самазвал, счакаўшы крыху, папыліў далей, нырцануўшы ў тунэль пад аўтастраду.
Хутка і мы былі там. Пастаялі, пачакалі ўсіх астатніх. Паненкі на хаду абмяркоўвалі сваю знаёмую паэтку, якая была яшчэ на даўнейшым турзьлёце аддалася нейкаму памаўзьліваму чэху, убіла сабе ў голаў, што ён кахае яе, хоць ён як у ваду ўпаў у гэтую сваю Чэхаславаччыну, з канцамі, ды так, што яна нават і ня ведае, хто ён, чэх ці славак, і мэнчыцца вось ужо, можа, зь дзесяць гадоў.
— Ён яе трахнуў і паехаў, а яна затое столькі вершаў яму прысьвяціла, — дзівіўся Астравец.
— Вось яна, крыніца сапраўднай творчасьці, — пракамэнтаваў Сева.
На большае, як на камэнтары, у нас не было імпэту. І мы пайшлі далей.
Хата Севы стаяла ледзь не ў сярэдзіне мястэчка, у пяці хвілінах ад аўтастанцыі, як патлумачыў ён. А адкуль нам ведаць. Мы зайшлі ў хату, папілі вады. Ягоная маці ляжала зь вялікім ціскам, і таму мы ціхенька пахлябталі і сыйшлі на двор.
— Во буржуі. У Менску кватэра і тут хата, і хутар яшчэ, — падзівілася Валя, якая ўжо год як тулілася ў нейкім працоўным інтэрнаце, куды яе ўладкаваў брат.
— Угу, — пацьвердзіла Паліна, якая была прапісаная ў сваёй сяброўкі, а жыла яшчэ ў адной сяброўкі.
— Што тут дзіўнага, — без сумлеву запярэчыў Астравец, які сам толькі як перабраўся пасьля разьмену цешчынай кватэры ў аднапакаёўку з выглядам на заводзкі комін з жонкаю і дзецьмі, — усе так павінны жыць.
Толькі маладыя нашыя змаўчалі. Ім яшчэ трэба было шукаць кватэру.
Выйшаў Сева, балакаючы з хахламі на матчынай мове, і мы пацягнуліся на станцыю.
Пасажырка на Менск ужо стаяла — маленькі паўпусты Пазік. Усе ўзьлезьлі ў яго, а я схадзіў на станцыю па квіткі.
— А дзе ж Колік з Сысом, — згадалі аб іх.
— У піўбары, — махнулі паненкі рукою, — яны там як свае. Гэта ж першы піўбар ад Іслачы.

А–а–а, Ілач. Сьвятая тройца — Сыс, Колік і Асташонак надзіраліся ў ілацкім доме творчасьці, а ў Ракаў хадзілі па піва дабаўляць ці пахмяляцца.
Паненкі рагаталі з Асташонка, вялікі лоб, вырачаныя вочы і чорная барада якога ўпрыгожвалі вітрыну мясцовай фатаграфіі.
— Гэй, Алесь! — закрычэлі за вакном. Я паглядзеў і ўбачыў хлапцоў–асьпірантаў, здаецца, біёлягаў, зь якімі разам жылі ў інтэрнаце.
— Жыве Беларусь! — закрычэў маленькі, вясёленькі вечна Валодзя і ўзьняў сьціснуты кулак.
— Во, шызуха, — пырхнула Паліна, якая сядзела побач са мною і крутанула пальцам ля скроні.
Валодзя разгубіўся, а я адказаў Паліне:
— Сама ты шызуха. Гэта мо' адзінае, што ён па–беларуску ведае.
Я памахаў хлопцам рукою і вылез з пасажыркі. Яны будавалі ў Ракаве кароўнік.
Хутка мы паехалі. Я чакаў чамусьці, што зьявяцца Сыс з Колікам, нажлукціўшыся піва. Але іх не было і аўтобус паціху трэсься па цэнтральнай ракаўскай вуліцы.
І раптам паненкі радасна завішчэлі. Насупраць піўнухі стаяў Сыс і размахваў пустым вядром. Кіроўца не зарыентаваўся і спыніўся, так як заўсёды рабіў, падбіраючы пасажыраў каля кожнага слупа. Усё ж такі едуць, падумалася мне.
Сыс кідануўся ў піўнуху, мабыць, па Коліка. Кіроўца, калі ўжо спыніўся, вырашыў пачакаць. Праз хвіліну выбеглі ўспацелыя Сыс з Колікам, цягнучы вядро зь півам аж па рубец. Уставілі яго з разьбегу ў салён. Пена і пырскі ўзьняліся ў паветра.
— Га–а–а!! — зараўлі ачмурэлыя хахлы.
— Давай! — махнуў Сыс рукою кіроўцу і пляснуў далоняю па боку "пазіка", як па жарабцоваму азадку. Так пан загадваў некалі свайму лёкаю, адпраўляючы вазок з гасьцямі на станцыю. Кіроўца раззлавана газануў, а мы падхапілі вядро і пусьцілі яго па крузе.
Я абярнуўся і ўбачыў, як Сыс пацягнуўся назад у піўнуху, а за ім паскакаў Колік. Чамусьці мне здалося, што я ўжо ніколі ня ўбачу іх. Так яны і застануцца ў гэтым Ракаве, бо больш нідзе яны і нікому ўжо не патрэбныя.
Вясна 1992 г.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гісторыі да Зьместу 4(5)-1999

Ірвін Уэлш
Стоўк Ньюінгтан блюз

Ірвін Уэлш — шатляндзкі пісьменьнік, жыве ў Амстэрдаме. Нарадзіўся ў 1958 г. у М'юіргаўсе, прыгарадзе Эдынбургу, дзе і адбываецца дзеяньне ягонага самага вядомага раману *Trainspotting*, паводле якога Дэні Бойл зьняў фільм (у гэтым фільме Ўэлш сыграў дылера Мікі Форэстэра). Кнігі Ўэлша вельмі складаныя для перакладу, бо яны напісаныя фактычна на дзьвюх мовах: аўтарская мова — на цалкам якаснай літаратурнай ангельскай, а гутарка пэрсанажаў — на эдынбурскім дыялекце. Мова ва Ўэлша часам важнейшая за зьмест тэксту. Апошні раман Уэлша *Filth* (1999), апошняя экранізацыя — *The Acid House* (1999).

Я апошні раз кальнуўся ў сарціры на пароме, пасьля выйшаў на палубу. Было файна: кроплі ляцелі ў твар, чайкі з клёкатам гналіся за паромам, доўгая хваля ўзбуджэньня пракацілася па целе. Вось я ўжо стаю ракам. Схапіўся за парэнчу і рыгнуў у Паўночнае Мора. Нейкая жанчына заклапочана глядзіць. Я адказваю ёй пасьмешкай разуменьня. — Усё не магу звыкнуцца з гайданкай, — крычу і спускаюся ў бар, каб замовіць чорнае кавы, якой не зьбіраюся піць.

На пароме мне някепска, спакойна. Сяджу ў цішыні, пэўна, астатнім пасажырам здаюся трупам, але вяду асэнсаваны нутраны дыялёг. Пракручваю апошнія падзеі, выстаўляючы сябе ў ролі дабрадзея, апраўдваючы свае дробныя паскудзтвы тым, што мае ахвяры атрымалі важныя веды й паняцьце. Забалела мне ў цягніку: Гарвіч — Кольчэстэр — Маркс Тэй —

Кельвэдон — Чэльмзфард — Шэнфільд ЦЯГНІК НЯ МУСІЦЬ СПЫНЯЦЦА Ў БЛЯДЗКІМ ШЭНФІЛЬДЗЕ — Ромфард КОЖ-НЫ САНТЫМЭТАР ШЛЯХУ Я НА ГЭНЫМ ЦЯГНІКУ Я (а Мэнінгтры, скуль тут яшчэ ўзяўся гэны нахуй Мэнінгтры?) У ЛЁНДАН, Лівэрпул–Стрыт. Мэтро йдзе паўсюль, акрамя Гэкні. Надта там балотна. Я сыходжу на Бэтнам Грын і заскокваю ў 253–і, які едзе на Лоўэр Клэптан Роўд. Цягнуся ўздоўж Гомэртан Роўд на Кінгзмэд Эстэйт. Я спадзяюся, што Донаван яшчэ ў той закінутай кватэры на другім паверсе, куды ён калісь самавольна засяліўся. Таксама спадзяюся, што ён не злуе на мяне за тое, што было ў Стоквэле — гэта ўжо быльнягом парасло, упэўнены.

Я валю праз купку малых — у іх твары скуралупам. Яны малююць на сьцяне аэразольнымі балёнчыкамі стылёвыя і нечытэльныя надпісы. Як гэта ўсё састарэла, як гэта ўсё тхне стылем гета.

— Глядзі, куды прэш! Ябаны наркот!

Спачатку трахнуць гэтых дзяцей, а пасьля забіць, ці наадварот? Ні тое, ні тое. Ня час.

Дон яшчэ тут. Тыя ж жалезныя дзьверы. Цяпер галоўнае, ці ён дома, а калі дома, дык галоўнае, ці пусьціць мяне. Моцна грукаю.

— Хто там?

Голас Эндж. Дон і Эндж. Я ня зьдзіўлены. Я так і думаў, што яны сыдуцца.

— Адчыні, Эндж, калі ласка, адчыні, бля. Гэта я, Эўан.

Шчоўкаюць замкі, і на мяне глядзіць Эндж; ейныя вострыя рысы яшчэ больш выцягнуў, сфармаваў і адтачыў гераін. Яна дае мне зайсьці і зачыняе дзьверы.

— Дон тут?

— Не, выйшаў во.

— Маеш кальнуцца?

Ейныя вусны выгінаюцца, і цёмныя вочы разглядаюць мяне, як вочы коткі, якая загнала ў кут мыш. Бачна, што ёй хочацца схлусіць, але, заўважыўшы мой адчай, яна перадумвае.

— Як там Амстэрдам?

Гуляе са мной, курва ябаная.
— Мне трэба кальнуцца, Эндж.
Яна дастае крыху парашку і памагае прыгатаваць дозу і ўкалоць. Хваля праносіцца скрозь мяне, а за ёй прылівае млосьць. Вось я ўжо ракам. Блюю на газэту “Ва–банк”. Зь першай старонкі падміргвае Пол Гаскойн, які ляжыць на расьцяжцы, у гіпсе, і паказвае, што ўсё заябісь, падняўшы вялікія пальцы рук. Газэта васьмімесячнай даўніны.
Эндж гатуе сабе дозу і бярэ мой шпрыц. Я ня вельмі гэтаму рады, але ня надта магу што сказаць. Я гляджу на яе халодныя рыбіныя вочы, схаваныя між крыштальна–вострай плоцьцю. Можна добра параніцца аб яе нос, скулы ці сківіцы.
Яна сядзіць поруч, але глядзіць проста перад сабой, не павяртаючы твару да мяне. Пачынае распавядаць пра сваё жыцьцё, няспынна, павольна, нават манатонна. Я адчуваю сябе наркоцкім сьвятаром. Яна кажа, што яе згвалціла банда пацаноў, і ёй было так хуёва, так хуёва, што яна села на іглу. У мяне зьяўляецца адчуваньне дэжа–вю. Клянуся, яна гэта ўжо распавядала.
— Гэта балюча, Эўан. Гэта пізьдзец, як баліць унутры. Доза — адзінае, што здымае боль. Я нічога не магу парабіць. Я мёртвая ўнутры. Ты не разумееш. Ніводны мужык не зразумее. Яны забілі частку мяне, Эўан. Лепшую частку. Тое, што ты бачыш, гэта прывід ябаны. Каму справа, што робіцца з прывідам.
Яна нацягвае жгут, засаджвае шпрыц і ўздрыгвае, адчуваючы, як доза пракачваецца па венах.
Хоць доза яе заткнула. Было нешта жахлівае ў тым, як яна ўсё гэта распавядала зьмярцьвелым голасам. Я гляджу на “Ва–банк”. Пара мух ладзяць банкет на Гаскойне.
— Неданоскі сраныя... Можна ж было неяк зь імі разабрацца, — нарэшце адкрываю рот я.
Яна павяртаецца да мяне, павольна круціць галавой і зноўку адварочваецца.
— Не, ні хуя. У гэтых пацаноў крутыя падвязкі. Яны на баб палююць. Адзін заходзіць у клюб, здымае дзеўку, вядзе куды трэба. Астатнія чакаюць і пасьля карыстаюцца ёй як хочуць. Як паперкай.
Напэўна, каб крыху зразумець, што пры гэтым перажывае жанчына, трэба ўявіць, як тузін пацаноў гуляе з тваёй дупай у “засунь–высунь”.

— У мяне апошняя доза, — кажа яна ў дрымоце. — Хоць бы Дон яшчэ прыцяг.

— Ну, дзетанька, хоць бы прыцяг.
Можа праз пару гадзін, а можа праз пару хвілін заявіўся Дон.
— Якога хуя табе тут трэба?
Ён стаіць рукі ў бокі, вылупіўся на мяне.
— Ёлкі, рады зноў цябе бачыць, братан.
Гераін адбяліў Дону скуру, ці што? Майкл Джэксан, пэўна, мільёны забашляў, каб атрымаць той жа эфэкт, што Дон ад наркаты. Той выглядае, як эскімо, зь якога зьлізалі амаль увесь шакаляд. Калі падумаць, дык і Эндж раней была ружавейшая. Пэўна, калі прыняць дастаткова наркаты, можна цалкам пахерыць усе расавыя адметнасьці. Нарката сапраўды робіць усё астатняе ў асобе нязначным.
— Маеш? — Ягоная гаворка зьмянілася з высокага, амаль жаночага, паўночналёнданскага ныцьця на сакавіты, цяжкі ямайскі бас.
— Ні хуя. Я таму сюды і прыйшоў.
Дон павярнуўся да Эндж. Было бачна, што ён нічога не знайшоў і быў гатовы прыбіць яе, што аддала мне апошняе. Як толькі ён нешта сказаў, грукнулі дзьверы, і хоць яны спачатку вытрымалі, яшчэ праз парачку ўдараў вушак вываліўся са сьцяны ў кватэру. На парозе стаялі два мужыкі з адбойнымі малаткамі. Яны выглядалі так шалёна, што я амаль адчуў палёгку, калі ў іх з–за сьпінаў зьявіліся казлы з паліцыі й павязалі нас. На твары старога пізьдзюка з аддзелу па барацьбе з наркотыкамі было расчараваньне. Ён ведаў, што калі б мы нешта мелі, мы б ламануліся ў сарцір змываць парашок, але ніхто з нас не зварухнуўся. Нічога ў нас не было. Але яны ўсё адно пратрэсьлі ўсю хату. Адзін з паліцаяў падабраў мой шпрыц і пагледзеў на мяне з усьмешкай. Я толькі падняў бровы і ляніва яму пасьміхнуўся. — Вязіце эціх засранцав ёбаных в дзяжурку, — крыкнуў ён.
Нас выкінулі з кватэры, сьпіхнулі па лесьвіцы і загрузілі ў “мясавозку”. Аб дах машыны бразнула бутэлька. Машына спынілася, і два паліцаі выскачылі на двор, але ім было ў падлу ганяцца за дзецьмі, якія, хутчэй за ўсё, кінулі пляшку з балькону. Паліцаі зациснулі нас сваімі тушамі і зрэдку нешта

пагрозьліва і злосна мармыталі.
Я глядзеў на Дона, якога пасадзілі насупраць. Машына праехала міма мянтоўкі на Лоўэр Клэптан Роўд, пасьля мінула пастарунак у Долстане. Нас везьлі ў Стоўк Ньюінгтан. Вядомы пастарунак. Мне і, амаль упэўнены, Дону таксама адразу прыйшло ў галаву імя “Эрл Барэт”.
У пастарунку мне загадалі вывернуць кішэні. Я так і зрабіў, і на падлогу бразнулі ключы. Калі я нахіліўся, каб іх падняць, мой шалік зьвіс на падлогу. Адзін з паліцаяў наступіў на яго так, што я ня мог падняць галавы, прыціснуты, сагнуты ўдвая і бездапаможны.
— Пад’ём, пізда шатланская! — прыкрыкнуў іншы.
— Вы на маім шаліку стаіцё.
— Давай, падымай сваю сраку наркоцкую!
— Я, бля, ны можу рухнуцца, вы на маім шаліку стаіцё!
— Я цібе дам “шаліку”, ты, сраны джок.
Ён садануў мяне ў бок нагой ці кулаком, і я зваліўся на падлогу, склаўшыся, як сьцізорык. Гэта выйшла хутчэй ад шоку, чым ад моцы ўдару.
— Падымайся! Падымайся, ёб тваю!
Я зь цяжкасьцю ўзьняўся; кроў ударыла мне ў галаву, і мяне пацягнулі ў пакой для допытаў. Галава была нібы ў тумане, пакуль яны брахалі нейкія пытаньні. Я здолеў прамармытаць пару слабенькіх адказаў, а потым яны закінулі мяне ў выцьвярэзьнік. Гэта быў вялікі пакой, абкладзены белай кафляй, з лаўкамі па пэрымэтры і кучай пенапластава–вінілавых матрацаў на падлозе. Камэра была забітая алканаўтамі, дробнымі злодзеямі й гандлярамі траўкай. Я пазнаў парачку мурынаў з алеі на Садрынгем Роўд. Я спрабаваў на іх не глядзець. Тамашнія дылеры цярпець ня могуць тых, хто на йгле сядзіць. Расісцкія сьвіньні шыюць ім гандаль парашком, хоць яны прадаюць толькі “траўку”.

На шчасьце, яны не зьвярнулі на мяне асаблівай увагі, бо назіралі, як два белыя здаравідлы — адзін зь іх гаварыў з моцным ірляндзкім акцэнтам — качалі нагамі аднавухага трансвэстыта. Калі яны вырашылі, што ўжо досыць, дык насцалі на цела, раскінутае на падлозе.
Здавалася, я праседзеў там вечнасьць, і мне было ўсё больш

млосна і роспачна. Потым у камэру закінулі Дона, замучанага і зьбітага. Паліцай, які прыцягнуў Дона, бачыў, што аднавухага хлопца на падлозе добра адпізьдзілі, але ён толькі гідліва пакруціў галавой і замкнуў дзьверы. Дон сеў поруч са мной на лаўку, схаваўшы твар у далонях. Спачатку я заўважыў кроў на ягоных пальцах, а пасьля ўбачыў, што яна цячэ з носу і вуснаў, якія вельмі набраклі. Ён відавочна на чымсьці пасьлізнуўся і пракаціўся па лесьвіцы. Такое не аднойчы здаралася з чарнаскурымі небаракамі ў гэтым пастарунку. Напрыклад, з Эрлам Барэтам. Я ўбачыў, што Дон трасецца, і вырашыў загаварыць.
— Ну, братан, я малёк расчараваны ў крымінальным правасудзьдзі гэтай краіны, па меншай меры, у мясцовым выкананьні.
Дон павярнуўся да мяне, і я цалкам бачыў, як яго адшмурылі. Няслаба.
— Я хрэн адсюль выйду, братан, — прамовіў ён, дрыжачы, з шырокімі ад страху вачыма. — Ты ж чуў пра Барэта. Тут месца вядомае. Я, бля, не таго колеру, асабліва для пацана на йгле. Хрэн я адсюль жывы выйду.
Я зьбіраўся яго супакойваць, хоць ён казаў нешта вельмі падобнае да праўды. Тут да нас падвалілі тры мурыны. Да таго яны, відаць, глядзелі на нас і слухалі.
— Камандзір, калі ты тусуешся з такім гаўном, дык атрымліваеш, што заслужыў, — пагрозьліва прамовіў адзін зь іх.
Мы нарваліся на махач. Пацаны пачалі казаць пра парашок і дылераў, разаграючыся, каб абрынуць на нас сваю злосьць. Аднавухі трансвэстыт, відаць, распаліў іх.
Дапамога прыйшла ад паліцаяў. Калі яны схапілі нас і пацягнулі з камэры, я падумаў пра агонь ды полымя. Нас разьвялі па кабінэтах для допытаў. У маім не было крэслаў, і я сеў на стол. Мне давялося чакаць доўга.
Я ўскочыў, калі ўвайшлі два казлы. Яны прынесьлі крэслы. Сівы казёл з ружовай пысай прапанаваў мне сесьці. — Хто дал цібе эту дур? Ну, джок… Эўан, так цібя завут? Ты ж ні дзілер. Хто скідывает парашок? — запытаўся ён, гледзячы на мяне вачыма, поўнымі лянівага стомленага спачуваньня. Ён выглядаў на нармалёвага пацана.
ЯНЫ НІ ХУЯ НА МЯНЕ НЯ МАЮЦЬ

Другі паліцай, здаровы, як бычок, зь цёмным воласам і прычоскай, падобнай да місачкі ці пудынгу, выпаліў: „Да яво ёбаны дружок чырнажопы. Маўглі, што там сядзіт, праўда, джок? Ты лучша рот аткрывай, а то в саседняй комнаце чорненькая канарэйка ахотна чырыкает, і цібе, павер мне, ні панравілась бы такая песенка“.
Яны яшчэ крыху спрабавалі гуляць са мной, але ня здолелі дабрацца да таго месца ў маёй галаве, куды я схаваўся. Тады адзін зь іх дастаў пакецік зь белым парашком. Выглядала на добрае зельле.
— Малыя ў школах жрут эту хірню. Хто даёт ім эту дур, Эўан? — запытаўся Срэбнавалосы Хлопчык.
ЯНЫ НІ ХУЯ НА МЯНЕ НЯ МАЮЦЬ
— Я праста шраюся часам. Я ж сабе ны можу знайсьць нармалёва, ны то каб якому шчэ хуйлу.
— Відаць, прыдзёцца пазваць пераводчыка. Есьць сяводня на дзяжурстве “якое шчэ хуйло”, хто можат па–джоцку гаварыць? — пытаецца чорнавалосае хуйло. Срэбнавалосая Машына ігнаруе ягоную рэпліку.

Ён працягвае: усе вы, падлы ёбаныя, вы ўсе, бля, толька колецесь, праўда? Ніхто не прадаёт. Ано проста на дзярэв'ях расьцёт, так?
— Не–а, на палёх, — вымавіў я і адразу ж пашкадаваў.
— Што ты, бля, сказал? — ён падняўся.
— На макавых палёх. Опіюм. Расьце на палёх, — прамармытаў я.
Ягоная рука хапае мяне за шыю і сьціскае. Ён усё цісьне й цісьне. А я нібы назіраю, як некага іншага душаць да сьмерці. Я хапаю ягонае запясьце абедзьвюма рукамі, але не магу расьціснуць гэтай хваткі. Гэта робіць Срэбнавалосы. — Хваціт, Джордж. Дастатачна. Аддышысь, пацан.
У маёй галаве нешта грукае, і ў мяне такое адчуваньне, нібы ў мае лёгкія ніколі больш напоўніцу не набярэцца паветра.
— Мы знаем расклад, сынок; мы ужэ цібе падгатовілі заяву на подпісь. Я ні хачу, штоб ты падпісывал, што цібе ні нравіцца. Так што ні сьпяшы. Паглядзі. Пачытай. Падумай. Как я ужэ сказал, ні сьпяшы. Усё, што хочаш памяняць, мы памяняем, — буркоча ён.

Чорнавалосы таксама размаўляе ўжо бяз той злосьці.
— Здай нам чырнамазага, хлопец, і можаш сразу валіць адсюда с эцім пакецікам. Клёвый фармацэўтычный парашочак, праўда, Фрэнк?
Ён спакусьліва памахаў гераінам у мяне перад тварам.
— Гаварат, што так, Джордж. Ну, Эўан, ні саздавай сібе праблем. Ты, кажацца, нічаво хлопец, есьлі прысматрэцца. А тут ты засел па самыя ушы.
— Джокі ілі англічане, без разьніцы, праўда? Мы усе белые людзі. На хіра садзіцца за какова-та сранава Лумумбу? Ні дуры, джок. Ішчо адзін ябаны гаўнакожы сядзет, цібе *шыто* с таво, га? Што, ані ў нас в дзефіцыце?
Паліцаі. Уёбкі ў белых кашулях. Яны забралі Дру з Манктахону за страйк у 84–м. Цяпер яны хочуць Донавана. Ня той колер скуры. Хочуць зрабіць з пацана сапраўднага злодзея. Гэная заява чытаецца, як Агата Крысьці. Мы з Донам не заўсёды ладзілі, але ён нічога пацан. Ён, можа, нават найлепшы чувак з усіх маіх знаёмых. Але што ён там сказаў пра мяне? Салідарнасьць, ці ён спрабуе мяне тапіць? Гэная заява ябаная чытаецца, як Агата Крысьці. А што Эндж? Гэтая, пэўна, усё што хоч скажа любому хуйлу, абы толькі сваю шкуру ўратаваць. Пачынаецца боль, сапраўдны боль. Калі я падпішу, мне дадуць гераін, можна будзе шырнуцца. Пасьля я змагу журналістам распавесьці, як яны тут выцягвалі подпіс. ЯНЫ НІ ХУЯ НА МЯНЕ НЯ МАЮЦЬ Боль. Атрута Дон. ЦЯРПІ ПАЦАН боль гераін ДАЙЦЕ МНЕ РУЧКУ ЯБАНУЮ яны засодзяць Дона, засодзяць яго ёб вашу Агата бля Крысьці ДАЙЦЕ МНЕ РУЧКУ ЯБАНУЮ
— Дайце мне ручку.
— Я знал, што у цібя хваціт мазгов, джок.
Я запхнуў пакецік з парашком у заднюю кішэню. Яны парвалі пратакол.
Мне можна было йсьці. Калі я выйшаў у калідор, там ужо сядзела Эндж. Я ведаў, што яна таксама прадалася. Яна паглядзела на мяне з горыччу.
— Так, вы двое, — сказаў паліцай за сталом. — На выхад і штоб большэ ні нарываліс.

Два паліцаі, што мяне дапытвалі, стаялі за ягонай сьпінай. Я быў рады сысьці. Эндж так сьпяшалася, што саданулася ілбом

аб шкляныя дзьверы, рыхтык калі паліцай за сталом пра іх папярэджваў. Пачуўся агідны гук, і ейнае тулава адскочыла і завібравала, нібы на нагах–спружынах, як бывае ў мульціках. Я нэрвова засьмяяўся, далучыўшыся да рогату паліцаяў.
— Курва, бля, дурная, — хмыліцца цёмнавалосы паліцай.
Калі я вывеў Эндж на паветра, яна была ў нейкім шоку. Сьлёзы ліліся ў яе па твары. На ілбе набракаў гузак. — Ты, бля, заклаў яго, так? ТАК?
З вачэй пацякла туш. Яна выглядала, як Эліс Купэр.
Аднак акторка зь яе была неважнецкая. — А ты хіба не?
Ейнае маўчаньне было надта красамоўным; потым яна стомлена кіўнула.
— Угу, ну, не было іншага варыянту, праўда? Мне проста трэ было выйсьці. Мне сапраўды кепска там стала.
— Знаю, пагадзіўся я. — Мы шчэ з гэным пазьней разьбяромся. Пагутарым з адвакатам. Скажам хуйлу, што подпіс ставілі пад ціскам. Дон выйдзе без праблем. Шчэ кампэнсацыю прыдбае. Разьбяромся, ад наркаты прачысьцімася і да адваката. Дону нат карысьць будзе крыху пасядзець. З наркатой завяжа. Ён шчэ нам дзякаваць будзе, нахуй.
Я ведаў, нават у той момант, калі гэта казаў, што ўсё гэта херня. Я зьнікну, кіну Дона, што б зь ім там ні рабілі. Проста неяк лепей сябе адчуваў, калі пракручваў гэты сцэнар.
— Угу, завяжа з наркатой, — пагадзілася Эндж.
Каля пастарунку стаялі пікетоўцы. Выглядала на тое, што яны ладзілі пікет з начоўкай. Яны пратэставалі супраць дрэннага абыходжаньня мясцовай паліцыі з маладымі мурынамі. Асабліва ўсіх узварушыў выпадак з Эрлам Барэтам, пацаном, якога забралі аднойчы ўвечары, а вярнуўся з пастарунку ён у плястыкавым мяшку. Склізкія ў іх лесьвіцы, бля.
Я пазнаў хлопца з мурынскай газэты “Голас” і падышоў да яго.
— Слухай, дружа, там яны забралі аднаго пацана, мурына. Яго сур’ёзна адмалацілі. Нас прымусілі падпісаць заявы.
— Як яго зваць? — запытаўся хлопец з акцэнтам багатага афраангельца.
— Донаван Прэскат.
— Хлопец з Кінгзьміду? На йгле сядзіць…
Я ўбачыў, што ягоны твар зрабіўся жорсткі.
— Ён нічога дрэннага не зрабіў, — далучылася Эндж.
Я пагрозьліва наставіў на яго палец, зрываючы на хлопцы тую

злосьць, што адчуваў на сябе. — Напішы і здохні, хуйло! Бяз розьніцы, хто ён; ён мае тыя ж правы, што любы іншы пізьдзюк!
— А цябе як зваць, ацец? — запытаў нехта поруч.
— Прычым тут гэта?
— Хадзем у рэдакцыю. Зробім твой фотаздымак, — пасьміхнуўся афрыканец. Ён ведаў, што я ні за што не пагаджуся. Я ніводнаму хуйлу нічога не скажу, бо паліцаі адкрыюць на мяне паляўнічы сэзон.
— Рабіцё, што хочаце, бля, — сказаў я і адышоў.
Аграмадная баба падышла да мяне й загаласіла: яны там трымаюць добрых хлапцоў, сапраўдных хрысьціян. Лероя Дункана і Орыта Кембэла. Хлапцоў, якія ніколі дрэннага не рабілі. Вось пра каго мы тут кажам, а не пра нейкага бруднага злодзея–наркамана.
Высокі растафара ў акулярах а–ля Джон Ленан пагрозьліва памахаў у мяне перад тварам плякатам, на якім было напісана: РУКІ ПРЭЧ АД ЧАРНАСКУРАЙ МОЛАДЗІ !
Я павярнуўся да Эндж, і, адчуваючы халадок на скуры, звалiў. У вушах зьвінелі пагрозы і крыкі пагарды. Некаторы час мне здавалася, што за намі йдуць. Мы крочылі ў цішыні, ня вымавіўшы ні слова, да станцыі Долстан Кінгзлэнд. Сапраўдны горад параноі!
— Куды ты намыліўся? — запытала Эндж.
— Паеду на электрычцы, паўночналёнданская лінія да Кентын Таўна, там жыве мой дружбан Элбі. Я там разьбяруся з парашком, што сьвіньні далі, а пасьля махну ў Бум. Тым цывілізацыя, знаеш? Заябло ўжо ў Гэкні, горш, чым на вёсцы. Надта там, бля, глухая правінцыя. Зашмат хуйла, што любіць лезьці ў чужыя справы ды жыцьцю вучыць. Адрыў ад жыцьця — вось у чым іхная праблема. Нат тэліку няма. Недахоп сацыяльных кантактаў з рэштай рэгіёну. Правінцыя ябаная. Я як трызьніў. Я быў хворы і трызьніў.
— Я паеду з табой. Кватэры ўсё адно пізьдзец. Яе ўжо пэўна зьнішчылі. Паліцаі ж новыя дзьверы ня будуць ставіць.
Мне не хацелася браць Эндж на буксір; у ёй сапраўды глыбока засеў вірус няўдачы. Ён звычайна перадаецца пры блізкіх кантактах зь няўдачнікамі. Але я наўрад ці мог што сказаць ці зрабіць, бо падышоў цягнік, і мы залезьлі ў вагон, сеўшы насупраць адно аднога ў расьціснутай, хворай цішыні.
Калі цягнік рушыў, я ўпотай зірнуў на яе. Хоць бы яна не

чакала, што я буду зь ёй спаць. Мне цяпер не да сэксу. Мо Элбі пагодзіцца, калі ёй схочацца.
Гэта была трывожная думка, але толькі таму, што трывогай была поўная любая думка пра нешта, што мяне ня тычылася наўпрост. Але хутка я ад усяго гэтага вызвалюся, вызвалюся ад гэтай дробнай, прычэпістай цягамоціны, думаў я, мацаючы пакецік у кішэні штаноў.

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гісторыі да Зьместу 4(5)-1999

Ірвін Уэлш
Квартэт сэксуальных бедаў

Ірвін Уэлш — шатляндзкі пісьменьнік, жыве ў Амстэрдаме. Нарадзіўся ў 1958 г. у М'юіргаўсе, прыгарадзе Эдынбургу, дзе і адбываецца дзеяньне ягонага самага вядомага раману *Trainspotting*, паводле якога Дэні Бойл зьняў фільм (у гэтым фільме Ўэлш сыграў дылера Мікі Форэстэра). Кнігі Ўэлша вельмі складаныя для перакладу, бо яны напісаныя фактычна на дзьвюх мовах: аўтарская мова — на цалкам якаснай літаратурнай ангельскай, а гутарка пэрсанажаў — на эдынбурскім дыялекце. Мова ва Ўэлша часам важнейшая за зьмест тэксту. Апошні раман Уэлша *Filth* (1999), апошняя экранізацыя — *The Acid House* (1999).

Добры сын

Ён быў добрым сынам, і, як усе добрыя сыны, ён сапраўды любіў сваю маці. Дзе там, ён проста абагаўляў гэтую жанчыну. Аднак ён ня мог займацца зь ёй каханьнем; ува ўсялякім выпадку, у прысутнасьці бацькі, які назіраў за імі.

Ён падняўся з ложку і накінуў халат на сваю няўпэўненую галізну. Праходзячы міма бацькі, ён на парозе пакоя пачуў, як стары прамовіў:

Ну, Эдыпе, ты ў нас закамплексаваны пізьдзюк, нічога ня скажаш!

Як сышліся курва–садыстка і пізьдзюк–эгаіст

Яна была курва–садыстка, ён быў пізьдзюк–эгаіст. Яны літаральна натыкнуліся адно на аднога ў бары *Grassmarket* адноічы ўвечары. Яны былі ўжо крыху знаёмыя, але ніводны зь іх ня памятаў, скуль. Ува ўсялякім выпадку, яны казалі самі сабе й адзін адному, што ўжо знаёмыя.
Яна паводзіла сябе зьневажальна, але яму было насцаць, бо яго цікавілі толькі 80 шылінгаў ува ўласнай кішэні. Яны вырашылі пайсьці да яе трахнуцца. У яго не было сваёй хаты — а на храна мець хату, калі на кватэры за яго ўсё рабілі бацькі.
Седзячы ў ложку, яна назірала, як ён распранаецца. Яе твар скамянеў у пагардлівай ухмылцы, калі ён сьцягнуў пурпуровыя майткі. — Каво ты хочаш такой штучкай удавлетварыць? — запытала яна.
— Сябя, — адказаў ён, залазячы да яе ў ложак.
Пасьля акту яна жорстка раскрытыкавала ягоныя мужчынскія здольнасьці тырадай, ад якой крохкае сэксуальнае эга большасьці мужчын разьляцелася б на кавалачкі. Ён усё прапусьціў між вушэй. Апошнімі ягонымі думкамі перад правалам у п'яны сон былі думкі пра сьняданьне. Ён спадзяваўся, што ў яе будзе дастаткова жрачкі і што яна засмажыць нешта смачненькае.
Праз пару тыдняў яны ўжо жылі разам. Кажуць, што ў іх, здаецца, усё нармалёва.

Шмат сьмеху й сэксу

Ты сказала, калі мы разам ступілі на шлях гэтай вялікай прыгоды, што шмат сьмеху ёсьць важнай часткай адносінаў паміж мужчынам і жанчынай.
Я пагадзіўся.
Ты таксама заўважыла, што значныя колькасьці сэксу ня менш важныя.
Зноўку я пагадзіўся. Напоўніцу й цалкам.
Дарэчы, я памятаю твае словы дакладна: сьмех і сэкс — баромэтры адносінаў. Ты менавіта так заявіла, калі я нічога ня блытаю.
Ты не падумай, я цалкам з гэтым згодны.
Але ж не адначасова, курва ты ябаная.

Робэрт К.Лэйрд: сэксуальная гісторыя
Рэб ні разу ў жызьні ня трахаўся; бедны засранец. Ня то штоб яго эта очань валнавала, нада сказаць.

Пераклаў з ангельскай Аляксей Знаткевіч паводле Irvine Welsh. The Acid House. W.W.Norton&Co., 1994.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[redacted]

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гісторыі Зьместу 4(5)-1999

Ірвін Уэлш
Праз калідор

Ірвін Уэлш — шатляндзкі пісьменьнік, жыве ў Амстэрдаме. Нарадзіўся ў 1958 г. у М'юіргаўсе, прыгарадзе Эдынбургу, дзе і адбываецца дзеяньне ягонага самага вядомага раману *Trainspotting*, паводле якога Дэні Бойл зьняў фільм (у гэтым фільме Ўэлш сыграў дылера Мікі Форэстэра). Кнігі Ўэлша вельмі складаныя для перакладу, бо яны напісаныя фактычна на дзьвюх мовах: аўтарская мова — на цалкам якаснай літаратурнай ангельскай, а гутарка пэрсанажаў — на эдынбурскім дыялекце. Мова ва Ўэлша часам важнейшая за зьмест тэксту. Апошні раман Уэлша *Filth* (1999), апошняя экранізацыя — *The Acid House* (1999).

Стэфані голая ляжала ў ложку, адчуваючы скарацечную асалоду поўнага спакою і задавальненьня. Але тая хвіліна ўжо сыходзіла; яна ведала, што хутка ў сэрцы будзе пуста, і яна зноў адчуе сябе скаванай і разгубленай, а ейная ўпэўненасьць у сабе пачне бурыцца па краёх, як прагнілая дамба. Яна адключыла вібратар, яшчэ мокры ад сокаў похвы, вылезла з ложку і скіравала ў душ.
Фрэнк пагледзеў на плястыкавую ляльку з гумавай похвай, поўнай ягонае спэрмы. Здавалася, лялька зьдзімаецца адначасова зь ягонай эрэкцыяй. Ягоныя геніталіі нагадвалі агідную нарасьць, якой трэба саромецца — абсалютна чужая рэч. Лялька цяпер выглядала тым, чым была насамрэч: кавалкам плястыку, які прыладжаны да гратэскнай галавы

манэкена.
Крыху пазьней у той жа вечар Стэфані сустрэла Фрэнка ў калідоры. Яна ішла на “элітарны” фільм, ішла ў кіно адна. Ён вяртаўся з кітайскай ядальні зь вячэрай на вынас. Яны пачырванелі, пазнаўшы адно аднога; потым ён сарамліва пасьміхнуўся, і яна палахліва адказала тым жа. Ён пракашляўся. — На вуліцы дождж, — прамармытаў ён няўпэўнена.
— Праўда? — адказала Стэфані дрыжачым голасам.
— Даволі моцны, — прамямліў Фрэнк.
Яны стаялі і глядзелі адно на аднога пару пакутлівых сэкунд — у абодвух заняло мову. Потым яны пасьміхнуліся ў напружанай сынхроннасьці, і Фрэнк сышоў у свой пакой, а Стэфані рушыла далей па калідоры. Так яны зьніклі з вачэй адно аднога, абое напружаныя, нібы спрабуючы спыніць спазм, гэты пульс болю, сораму й пагарды да сябе.

Пераклаў з ангельскай Аляксей Знаткевіч паводле
Irvine Welsh. The Acid House. W.W.Norton&Co., 1994.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]
Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

аўтапартрэты да 3 нумару 4(5)-1999

Славамір Адамовіч Чарнавікі (часопісны варыянт)

Славамір Адамовіч (нар. 1962) — паэт–“правакатар”, стваральнік палітычнага пэрформансу — арганізацыі “Правы рэванш”. Першы палітычны вязень рэжыму Лукашэнкі, які 10 месяцаў (1996) прабыў у турме за верш “Убей президента”. У большасьці сваіх твораў Адамовіч выступае як тонкі лірык і мэтафарыст, асноўныя тэмы вершаў — каханьне, вайна, Бацькаўшчына; характар паэзіі экспрэсіўны, напорысты і адначасова прадметны, рэалістычны; проза лірычная, часта правакацыйная. У 1997 годзе на мітынгу ў абарону свабоды слова ў знак пратэсту супраць палітыкі ўладаў публічна зашыў сабе рот.

1986—1988. Прыкіна

Мы спаткаліся зь ёю ў “Талацэ”.
Я тады шукаў беларусаў, яна — мужа.
Мне было 24 гады, ёй — 26. Я стаў студэнтам дзённага аддзяленьня філялягічнага факультэту БДУ, яна працавала на нейкай інжынэрскай пасадзе ў нейкім сталічным трэсьце. Я ўжо гаварыў па–беларуску, яна — не, хоць і ўмела.
У яе былі формы і нейкая шчымлівінка ў абліччы — і я здаўся.
Я тэрмінова захацеў ажаніцца.
Вясельле заплянавалі на канец лістападу. На Камароўцы ёй купілі белы строй, мне ў салёне “Шчасьце” — гэдээраўскі

цёмна–сіні гарнітур зь “іскрой”, сынтэтычны гальштук і дыхтоўныя скураныя пантофлі.
У пасаг Прыкіна атрымлівала 12 мэтраў жылплошчы, канапу, капу, два мяккія крэслы, тэлевізар і сямейны альбом ад першага замужжа.
Першы быў ваенным, меў пад два мэтры росту і зьвераватую фізіяномію. Прыкіныя формы насіў на сваіх кляшчастых руках усяго два гады, а потым сышоў да іншай.
Другое вясельле Прыкінай і маё першае жанімства мы наладзілі ў рэстаране “Журавінка”, аддаўшы за мерапрыемства 400 савецкіх рублёў, што было эквівалентна кошту матацыклю “Менск”. У працэсе застольнай прыглядкі да сваіх новых родзічаў я зьмерз і пачаў псыхаваць, таму ў першую шлюбную ноч нічога ў мяне з Прыкінай ня здарылася. Пазьней узяла яна за моду даваць мне пад раніцу, перад самым уставаньнем.
Пасьля стараньняў над жаночым ляндшафтам у жаночы вулей філфаку ішлося лёгка і молада. Вулей віраваў, злаваўся, дражніў, але аўтарытэт Маткі падарваць ня змог.
Летам 1987–га Прыкіна зьбіралася мне нарадзіць. Ужо быў пашыты гранатавага колеру сарафан, ужо пацягнула маю мамачку на салёнае, ужо ішоў пяты месяц цяжарнасьці, і работу мы рабілі цяпер толькі на бачочку, але... Але здарыўся выкідыш, потым другі, і ў красавіку 1988–а году мы з Прыкінай разьвяліся.

1990. Мастафанава

Яна была рыжая і белацелая, зь мясістай цэраю і вялікім чэрапам, з плячыма, як абняць, і крыху вузейшай заднічкай. На ярка–зялёным фоне азёрна–лясістай Карэліі такую лісіцу цяжка было не заўважыць. І мы сталі хадзіць паркаю: на рэчку, да возера, па суніцы, на сьвежыя расьцярэбы, па марошку на тарфянікі.
Пэрыяд рамантычных пад’ездаў я расьцягнуў тыдні на два. Потым была пуня, набітая сенам, і ейны бацька, які рабіў выгляд, што дапільноўвае дачку, хоць насамрэч высочваў жонку, якая дзесьці схавала паўлітроўку самагнёту. Як толькі Мастафанавы–старэйшыя скруціліся спаць, мы з малодшай пачалі вызваляцца ад майткаў; мая рука хутка знайшла сваё, і

тады рыжая прашаптала, што ў яе “красныя прыйшлі”. Але я ўжо і сам адчуў, як на пальцах маёй правай, нацягваючы скуру, засыхае мэнструальная кроў.
“Гэта нармальна — твае рэгулы”, — адшаптаў я ў адказ і прыпаў да маёй мэнструальнай жанчыны. Быццам зямля пад снарадам, раскрылася пада мной Мастафанава. Водар семя й крыві заглушыў пахі сена. Камары, растрывожаныя нашым рытмам, падняліся вышэй. І толькі дзесьці ў раёне Пэтсама пахла трэцяй сусьветнай вайной.
Лістапад 1990–га. Карткі, талёны. Добра, што канец мой стаіць нават у мяне галоднага. Хітрасьці тут ніякай, проста спачатку мне трэба жанчына, а ўжо потым — хлеб.
І таму я ў Петразаводзку. Я прыехаў да маёй Мастафанавай. Ёй толькі што споўнілася 18, і яна працуе касіркай у прадуктовай краме. Вечарам мы вяртаемся ў ейную аднапакаёўку з паршывай сантэхнікай і наладжваем сякую–такую вячэру з вэрмутам і курацінай на закуску. Як некалі мой прыдуркаваты дзядзька Козюс, Мастафанава вельмі многа крышыць вакол сябе і забываецца выціраць рукі. Я насьцярожваюся, але яна своечасова сядае мне на калені. Праз хвіліну мы перамяшчаем нашы пэрсаналіі ў ложак.
У Мастафанавай на лабку валасы гэткія ж рыжыя і цьвярдыя, як і на галаве.
Праўда, мне няма калі гуляцца зь імі, бо касірка патрабуе ад мяне стараньняў чэлесам, а не ручных маніпуляцыяў. У яе там добра–ткі падцякае. Раблю ёй і раз, і другі, на бачок адвальваюся, прысынаю, а яна мне ціха так на вуха сваё расейскае: “Ещё хочу!” Ну, калі яшчэ хочаш, тады станавіся, *избушка*, да мяне попай.
У пазыцыі “ззаду” і мне зручней, і Мастафанаву дастае. Я так шчыра заганяю паветра ў касірчыну ракаўку, што ракаўка пачынае задаволена адгукацца: булькоча, пукае, цмокае і нават падсьвіствае.
Але нават пасьля пятага заходу Мастафанавай ня сьпіцца. Накрыўшыся з галавою, яна поўзае па мне, цалуючы то ў пуп, то ў змарнелы чэлес, аж пакуль я не засынаю.
На другі дзень Мастафанава першы раз хадзіла ў мясцовы тэатар. Давалі “Баядэру” Кальмана. Рэзкім пахам танных духоў мая дзевачка зьвяртала на сябе ўвагу тэатральнай публікі, што выклікала ў мяне сум і нянавісьць да сацыяльнай дэмагогіі.

Пасьля спэктаклю я хацеў звадзіць Мастафанаву на могілкі, але яна не дала сябе навярнуць на філязофскія роздумы. Гэта лішняе, калі працуеш на касе.

1992. Пэтыт

Дачка прафэсара і студэнтка гуманітарнага факультэту, яна прыйшла да мяне на трэці дзень новага году, ды так і засталася — на два месяцы.

Росту яна была паважнага, мэтар 80 з хвосьцікам, таму я ўвесь вечар перажываў, што не дастану да вуснаў, дастаўшы паміж ног. І наадварот, цалуючы ў вусны, не змагу патрапіць у бурштынавую. Прырода, аднак, і тут усё ўпарадкавала. Аказалася, што не даўжыня тулава, а даўжыня ног вызначае рост чалавека. Зрэшты, праблема была зьнятая, як толькі мы леглі. З Пэтыт увогуле не было праблемаў. Яна ўсё рабіла сама: укладвала мяне дагары, сядала зьверху і рабіла. Рабіла граматна, акуратна, адчуваючы магчымасьці партнэра. Пачаўшы ў 12, яна супакойвала сваю прыроду з мужчынамі, старэйшымі за яе, і больш–менш надзейнымі ў пляне гігіены. Як сапраўдная натуралка, яна не любіла з прэзэрватывам. Пэтыт — першая жанчына, якая паказала мне аральны варыянт. З пэнісам яна абыходзілася надзвычай далікатна, але семя не глытала, а размазвала яго рукой па жываце мужчыны альбо нырала ў эякулят сваім маладым тварыкам са сьлядамі ад болек–хацімчыкаў.

Праз год Пэтыт выйшла замуж за сабе падобнага, жыве без матэрыяльных праблем, здаецца, нарадзіла, але мужа ня любіць, хоць і запэўнівае сябе ў адваротным.

1992. Асьпірантка

Мы пазнаёміліся зь ёю ў інтэрнаце Акадэміі навук, у якім некалі зьбіраліся на свае паседжаньні сябры літаратурна–грамадзкага аб'яднаньня "Тутэйшыя". Яна была пад мой рост, хударлявая, але з ладнымі грудцамі і нармальнай такой срачкай. Яшчэ ў яе быў вельмі мілы і нават сэксуальны прыкус, з–за чаго асьпірантка крыху прышапельвала.

Любілася яна безь вялікага энтузіязму, хоць зь ёю я нават кунілінгус пачаў практыкаваць. Баялася зацяжарыць і таму

прымушала з гумкай, якую сама й купляла. Дастаць ейную вантробу я, здаецца, так і ня змог: заўсёды яна енчыла, што ёй “больно”. Уражвала тое, зь якой інтэнсіўнасьцю яна курыла свой “Космас” — паўтара пачкі ў дзень! У запасе ў яе заўсёды былі адзін–два блёкі.

1993. Прафэсіяналка

У яе было нешта зь верхняй вуснаю, нешта недалёкае ад таго, што называецца заечай губой. Але гэтая хібка не псавала твару. Наадварот, яна, трэба думаць, дапамагала жанчыне авалодваць майстэрствам аральных маніпуляцыяў. Мінэт Руслана рабіла проста геніяльна!

Мы зьляцеліся зь ёю ў цягніку “Віцебск—Баранавічы”. Яна расказала мне, што завяршае завочную вучобу ў Інстытуце культуры, што ў разводзе і мае сына шасьці гадоў, а на жыцьцё зарабляе апэрацыямі тыпу “купі–прадай” (Турцыя, Кітай, Усходняя Эўропа, тавар туды, тавар адтуль).

Выкройваючы час паміж спатканьнямі з сынам, экзамэнамі і паездкамі па тавар, яна забягала да мяне. Зь першага ж разу Руслана паказала, што і як можа даць вопытная жанчына. Калі яна сказала, каб я не канчаў туды, я і не канчаў, падрыхтаваўшыся завяршыць работу не вышэй жывоціка. Але праз хвіліну, адчуваючы, што я блізкі да кульмінацыі, Руслана шэпча сваё мілае “кончи в меня”. Зразумела, што я спачатку разгубіўся і ледзь не псыхануў: як гэта “кончи”, калі толькі што прасіла не канчаць? Праўда, удакладняць, што яна мае на ўвазе, я ня стаў, а пайшоў шляхам спробаў і памылак — і паднёс сваё дабро да яе грудзей. Астатняе Руслана зрабіла сама, хапіла некалькіх рухаў, і, як пішуць порначасопісікі, ніводнай кроплі не пралілося міма.

На другі дзень дагары ляжаў я, а жанчына далікатна і разам з тым упэўнена пазбаўляла мяне апошніх сокаў. І хоць стаўбурок мой памераў самых звычайных, але схаваць яго ўвесь у роце трэба ўмець. Руслана ўмела.

Цікава было зь ёю і пры звычайным кантакце. Праўда, ззаду яна атрымлівала менш, чым я, з–за ладных памераў сваёй уежджанай каляіны. Затое, сядаючы на мяне конна, Руслана заходзілася адразу. Працуючы сьценкамі ўзад–уперад і з боку ў

бок, яна залівала мяне трыццацісяміградуснай вадкасьцю і чырванела, як чырванеюць, падымаючы нешта вельмі цяжкае. Спачатку я падумаў, што сэксуальнага напружаньня не вытрымлівае мачавы пухір жанчыны, але вадкая субстанцыя была празрыстай і зусім не салёнай (па крайняй меры пра гэта я магу сьцьвярджаць дакладна). Не было яно ані спэрмай, ні тым больш любрыкатам. Зрэшты, чым бы яно ні было — вадою, лімфай альбо таямнічым фізрастворам любоўнай жарсьці — гэта ў любым выпадку быў лівень радасьці, у якім я пускаў бурбалкі задавальненьня.
Празь дзён сорак пасьля нашай сустрэчы яна разам з сынам ад'ежджала ў Кіраваград. Прыпаўшы тварам да вагоннай шыбы, жанчына глядзела так балюча і малітоўна, што на імгненьне падумалася, быццам бацька ейнага дзіцяці і ейны жорсткі муж, які выпраўляе родную жонку ў белы сьвет, — гэта і сапраўды я.

1993. Чытэльніца
Чорт бы пра яе пісаў, ды трэба дзеля агульнага дабра чалавекаў.
Я і сёньня злы на чытэльніцу. Здаецца, так і ўрэзаў бы гумай па срацы: а не займайся мінэтамі, калі па–нармальнаму ня хочаш! І сапраўды, на нармальны полавы акт яна ня йшла ну ніяк. Я паспрабаваў быў сілу прымяніць, дык мяне так зашчаміла ножкамі, што ледзь вырабіўся. Ну, думаю, гуляй тады са струком, пакуль не засну. Але тут жа выявілася, што мая нявіньніца і мінэт рабіць ня ўмее: па–першае, рвотныя спазмы пры спробе ўхапіць чэлес ня толькі ротам, але й горлам; па–другое, яна не глытала, а гэта ўвогуле мала чым адрозьніваецца ад мастурбацыі, якая дастае мяне 25 гадоў, хоць задушыся.
Чытэльніца, можа, і сёньня цэлая ходзіць, бо казала ж мне тады, што нечапаная і для мужа беражэ.

1993. Фіктыўная хоча замуж
Ліст №1
Прывітаньне і добрай раніцы! У цябе ня ведаю як, а ў мяне яна файная. Прывезла зь Менску ўсе свае ружы, скінула іх на падлогу і хаджу босымі нагамі па пялёстках. Дарэчы, цяпер ідзе

дождж, а навокал лес.
Чаму я пішу табе, калі ўсё — “словы дзеля словаў”? І які ты сапраўды, Міраслаў? Калі думаю пра цябе, дык чамусьці ўяўляецца восень, Мірскі замак, званічка, дзяўчынкі ў белых сукенках... Чаму ў цябе вочы нібы выпаленыя? Ня трэба мне зараз прасіць прабачэньня, але ўсё ж, Міраслаўчык... Ты быў у пятай клясе, калі я нарадзілася. Міраслаў, табе часта здраджвалі? І што цябе прымушае пакідаць пасьля сябе боль і пакутаваць самому? Пэўна, крыеш мяне матам, бо задаю зашмат пытаньняў? Тады задам яшчэ адно: што такое “фатэль”?
Твой імідж немагчымай істоты (файна зараз размаўляць з табой на “ты”) — ці ня штучны ён? Вытанчаны, кусьлівы, сьмешны, нахабны пяшчотны Міраслаўчык... Цяжка навучыцца быць побач. Вазьмі мяне замуж, Міраслаў. Вось прыйшла да цябе дзяўчына з ружовымі вуснамі і прапанавала быць тваёй жонкай. Буду ваксаваць твае боты і здаваць бутэлькі.
Не сумуй, дзядулька. Я вось думаю налета ўзяць адпачынак і пахадзіць па Беларускім Палесьсі. У вёсках — людзі, але я застацца нідзе не змагу. Ну нічога, лепш давай верш табе падару.

Мы все уходим понемногу,
Мы вышли не на ту дорогу,
Не тех от мира ждем вестей,
Сквозь эту ночь в прорывах плача
Мы, больше ничего не знача,
Сойдем в костер своих костей.
Гэта Жданаў, цікава, што ты яго ня ведаеш. А што ты любіш, Міраслаў, што цябе трымае? Прыяжджай да мяне, Міраслаўчык. У нас у Пінску ёсьць калегіюм, туды можна залезьці, на самы верх, і праз вакно глядзець на горад. Сафістычны ерэтык, ну што табе яшчэ такое абразьлівае сказаць? А нічога не скажу, усё. Усё!

Ліст №2
Прывітаньне! Прывітаньне, мой пакорны служка, Міраслаў Адамушка! Шкада мне цябе: сядзіш у дурным Менску, пыл глытаеш, туфту пішаш. Прыехаў бы лепш да мяне, я б цябе ў вёсачку якую–небудзь, дзе хаты з пачатку стагодзьдзя стаяць,

завезла. Эх, Мірончык, добры чалавечак быў, а стаў — урбанізаваная істота. Дарэчы, ты калі–небудзь быў на Палесьсі? У нас косяць сена пасярод дрыгвы, файна — каб падысьці да стажкоў, трэба — па калені ў вадзе. Мы з Вольгай асьвячаем сваёй прысутнасьцю ўсе навакольныя азёры і лужыны, бо яна, здаецца, падхапіла маю дурную звычку лезьці ў любую сустрэтую ваду адразу ў джынсах і швэдры.
Цікава: чытала я твой ліст, чытала разоў сорак і прыпомніць не магла, пра што я табе той раз пісала. Дый што ўзяць зь мяне, я, здаецца, калі пісала, не казаць што й цьвярозая была. Адно зразумела — што задала, відаць, табе процьму пытаньняў. Не, мне дакладна не хапае тваіх калючых вочак, каханы клясык! Натхненьня няма, на практыку хаджу, але нічога не пішу. Ох, міленькі мой Мірончык!..
20.07.93 году.

1995. Фіктыўная думае пра развод
Мінулі два гады. Адбыўся першы рэфэрэндум, адмянілі нацыянальныя сымбалі і дзяржаўны статус беларускай мовы…
Ліст №3
Бедалага, няўжо ўсю ліпеньска–жнівеньскую сьпякоту ты зьбіраешся праседзець у Менску, палохаючы грамадзкасьць сваімі зусім не рэваншысцкімі жарцікамі, і штодзень кіпяціць бялізну? Ці ня лепш завітаць да мяне ў Пінск? Пабачыш, адкуль бяруцца паляшучкі, маю Ясельду–рэчку, саламяныя вёскі з саламянымі дахамі, у якіх амаль ніхто не жыве, акрамя стогадовых бабуль (чамусьці толькі бабуль?). Дарэчы, у мяне можаш напаткаць цікавую кампанію: брата Віталя, майго Тараса з Чалябінску і S.S. Я страшна задаволеная роляю “ружы гімназістаў” і ўпершыню за апошні год выкінула з галавы ўсялякія праблемы, бо вырашыла правесьці клясычны адпачынак у стылі тургенеўскай барышні. Вось толькі цябе не хапае для пэўнага калярыту (жарт, вядома, ты заўсёды ў маім сэрцы на правах пэрманэнтнага кашмару).
Нічога, Мірончык, нічога, маленькі мой. Прыйдзе і нам з табой час разводаў — бяз залі суду, бяз судзьдзяў і падсудных, нават ня трэ будзе плаціць алімэнтаў (...). А наагул, толькі тут, дома, бачу каляровыя сны пра нешта незразумелае. Вось я ўзьлятаю высока–высока, не адчуваю больш зямлі, а вочы — на аблоках. Спрабую расправіць рукі, а яны марскім вузлом застываюць на

шыі кагосьці прыгожага, але ў той жа час зямнога, які цягне мяне ўніз. Адчуваю ягонае цела, вочы зьнікаюць у вішнёвым бяздоньні, і раптам цьвёрда ўстаю на граніт зямлі.
Я ведаю, што аднойчы восеньню, калі будуць паліць лісьце, мне ўдасца разарваць свой марскі вузел, пераадолець прыцягненьне і адляцець. А Ён і ўсе яны, і ты, шаноўны, знойдзеце сабе іншых, якія не глядзяць на неба і ня мараць пра яго.
12.07.95 году.

1996. Фіктыўная пасьля скасаваньня шлюбу
Ліст №4

Мираславчик! Прости мне сейчас “паганую расейскую мову”. Просто я неделю лишена возможности видеть что–либо, кроме голубых глаз командира челябинского РНЕ и слышать что–то не на русском. Мираславчик, простится ли мне то, что я всего лишь женщина и в подобные минуты не слышу даже собственного сердца, не нахожу слов, чтобы вытащить наружу то, что заставляет непрерывно плакать беззвучными слезами? Знаю лишь, что никого сейчас не хочу видеть столь сильно, как тебя. Такое вот письмо в одно солнечное утро, милый мой фиктивный муж. Ну почему в других, даже в голубоглазом и белоголовом мальчике я не нашла твоей жёсткости и твоего цинизма!? Мираслав, я выхожу замуж за Тараса, славного героя Белого дома, который по утрам будит меня нежными поцелуями, и я, улыбаясь сквозь слёзы, убегаю курить на балкон. Но я не могу перечить судьбе. Так надо, не знаю почему, но надо. Чувствую, что это мой путь, и молю Бога, чтобы хоть этот Новый год я ещё была здесь. Нет, не думай, что изменения в моей жизни заставят отказаться от написания книги об СБМ. Просто завершается определённый цикл жизни, и я ухожу на новый виток. Уходить всегда больно, так много людей, которым придётся многое объяснять, за многое просить прощения. Да, подло оставлять эту страну сейчас, когда у неё нет никого, кроме неврастеников типа тебя, играющих в штурмовые отряды. Мираслав, неужели бесполезно ожидать от тебя чего–то решительного? Ты не имеешь права играть в этой стране роль эмоционального стимула! И не надо предсказывать в стихах свою судьбу, это делали многие, и почти всегда сие происходило.
Боже, нужно остановить поток эмоций. Увы, сказывается

привычка искать у тебя ответы на все вопросы. И что же страшного в том, что, любя свою страну, я уезжаю с человеком умнейшим, порядочнейшим, благороднейшим. Ты сам оценишь его, когда увидишь. Тарас — замечательный мужчина, так стоит ли обращать внимание на то, что ночами я слушаю в ванной грустные французские песенки и временами зажмуриваю глаза, чтобы не выдать отвращения. Впрочем, всё, что я делаю сейчас, ты бы одобрил. А я уже вижу себя там, среди северных лесов. И не могу больше ждать осени, моего любимого времени года. Напиши мне полстрочки откровенного хамства. Пожалуйста. И поинтересуйся моей пропиской…

1995. Арганістка пачынае гуляць…
Ліст №1
Добры дзень… Мне здаецца, хутка зьненавіджу тэлефон з–за таго, што толькі тры хвіліны магу чуць твой голас, што не магу сказаць тое, што хачу. А хачу сказаць, што я ўсё мацней і мацней кахаю цябе, што гэтае пачуцьцё з кожным днём становіцца большым. Але пачынае жыць у сэрцы і нейкая няўпэўненасьць, асабліва, калі падбягаю да паштовай скрынкі, а там пуста, калі гляджу вечарам на тэлефон, а ён маўчыць. Ці не забыўся пра мяне, ці хочаш ты яшчэ, каб я была побач?
Як ты жывеш, як справы з работай?
Калі прыеду ў Менск — дакладна ня ведаю. N. пра мяне забылася, ня звоніць. Буду чакаць ад цябе ліста. Спадзяюся, ён ужо на падыходзе. Буду чакаць і думаць пра цябе. Цалую, твая Галька. 8.10.95 г.

1996. Гуляе
Ліст №2
Привет, моя любименькая козявочка! (…) А вообще, пишу я тебе какую–то, извини за выражение, пидорманию, ведь всё это фигня! Главное то, что ты есть, что *я тебя люблю*. До меня дошли сведения, что вы, достопочтенный сударь, очень часто удостаиваете вниманием дверь бизнес–школы “Тайпинг”, а особенно стоящих у этой двери тайпингисток! Уж не основами ли бизнеса вы хотите овладеть, а? А по поводу визита того

араба у меня есть оправдание: не виноватая я, он сам пришёл. Пиши мне побыстрее, ладно? А то мне так плохенько без моей козявочки! Твоя Галька. P.S. А маленький у нас будет в сто, не, в тысячу раз лучше, чем у соседей–ментов. Не веришь? Увидишь! Целую. 8.02.96 г.

1996. Хвалюецца
Ліст №3

Здравствуй… Прямо не знаю, с чего начать. Пишу после грандиозного шухера. Мама прочла твоё письмо, более того, выучила наизусть. Утром был собран семейный совет, на котором мы с тобой были обвинены в разврате и блядстве. Папа как–то к этому отнёсся более–менее спокойно, но махатма… Короче, она собирается писать тебе грозное письмо. Я, конечно, отрицала нашу с тобой интимную связь и объясняла всё твоим бурным воображением. Помни, что я тебя люблю, что мы должны пережить и это. Пережили изобилие, переживём и коммунизм. После 20–го приеду, тогда всё обсудим. Ты писал, что испытываешь удовольствие в преодоление маральна–псыхалягічных перашкод. Вот тебе и очередная доза кайфа. Пераадольваць перашкоды будзем разам. Спадзяюся, пераможам. Як думаеш?
Ладно, теперь пойду домой, буду слушать дальше литанию на тему нашей с тобой распущенности. Вот написала, покурила, вроде и легче стало. Люблю тебя, целую! Галька. 10.02.96 г.

1996. Абнадзейвае і шле модлы Пану Богу
Ліст №4

Добры дзень… Не пісала, бо ня ведала, куды пісаць, дзе ты знаходзішся. Два тыдні адпачывала я на турбазе ля мястэчка Кентшын (Польшча). Гэта Мазурскае Паазер'е, нешта падобнае да Браслаўскіх азёраў. Цудоўнае месца, але ўжо дні праз тры захацелася адтуль уцякаць. Сумна было. Ішлі дажджы.
Цяпер я займаюся авалодваньнем шафёрскага майстэрства. Першая мая спроба скончылася тым, што я заехала на гару сасновага паленьня і разьбіла падфарнік. Мама разам з бацькам зрабілі мне такі падарунак з нагоды атрыманьня дыплёму — купілі машыну фальксваген–пасат, колер — срэбны мэталік. Калі–небудзь сам убачыш.
Ну, што яшчэ? Зьбіраю ў лесе ягады, ад якіх у мяне празь пяць

хвілін усчынаюцца “казлы”. Вось і ўсё.
Чаму не напісаў, калі адбудзецца суд? А цяпер адказваю на галоўнае пытаньне. У мяне склалася такое ўражаньне, што на дадзены момант табе ўсё роўна, з кім браць шлюб. І хвалюе цябе толькі, каб жанчына (бяз розьніцы — хто) нарадзіла для цябе дзіця. Калі гэта так, то прабач... Зразумей, што я, як і ўсе людзі, вялікая эгаістка, і мне хочацца быць — хай сабе гэта і банальна — “единственной”.
Пазаўчора, калі ехалі з бацькам у лес, праяжджалі каля той асінкі, памятаеш, каторая рыпела, а насупраць яе мы з табой зьбіралі маліну. У гэтым годзе маліны мала.
Пастарайся напісаць мне да суду, буду чакаць. 5.08.96 г.
Люблю. Галіна.
P.S. Праз гадзіну пайду ў касьцёл і буду маліцца за “дзяржаўнага злачынцу”. Бог мяне зразумее, як думаеш?

1996. Піша да таварышкі
Ліст №5
Здравствуй, многоуважаемая Фадеевна! Мамо! Прости меня, засранку, за молчание. Сейчас буду оправдываться. В субботу, 2.10., я живо представила, что чувствует собачка, которая получает серпом по кокам. С 4 ноября по 9–е я должна была быть в Минске на курсах польского языка, но РОНО на такие мелочи денег не имеет. Представь, какой был “круты аблом”. В тоске протекает жизня моя поганая. Все обеспокоены нехваткой денег и эпидемией сифилиса, а я хочу на митинг, да грехи не пускают. А. позабыл меня, бедную. Видимо, он понял, что я не “тая жанчына, якая народзіць яму дзіця”. На роль инкубатора я не подхожу.
Бэдя на костылях передвигается быстрее, чем я пешком, и очень–очень... озабочен. Но я, полная воспоминаний и впечатлений от посещения пресловутой Прилуцкой улицы, никак не могу рискнуть и согласиться на близкий контакт. Писать о себе мне абсолютно нечего, работа, дом, да изредка прогулки с инвалидом в качестве сестры милосердия. Ты мне тоже лучше пиши, а то на телефонный звонок у Кристины Петровны реакция, как у твоей Жульки на поэтические пятки соседа. Уши у неё тут же принимают форму граммофона и в глазах появляется хищный блеск.
Собираешся ли ты на референдум?

Жду от тебя письма! Кстати, последнее письмо ты выслала 31.10., а я получила его 1–го ноября. Видно, госбезопасность прочитать не успела. Ты, мать, не унывай. Лично я не теряю надежды, что скоро встретимся. Цалую і абдымаю. Галина Стальевна. 4 ноября 1996.

Ліст №6

А теперь *паслухайце мае навіны*.

Бэдя мне предлагает уехать в Москву. Первое время можно будет перебиться у его двоюродной сестры или у отца. Потом можно снять квартиру. Единственная сложность — это прописка. Его, как "лицо кавказской национальности", тут же по этому вопросу засношают. Я могла бы с кем–нибудь расписаться (за деньги, конечно, и с тем, у кого есть жилплощадь), а потом купить хотя бы комнату. Но мне придётся торговать. А это для меня — атас! Что ты думаешь по этому поводу? Страшно хочется в Минск хоть на пару дней, но эта долбаная работа не позволяет.

Читала ли ты "Нашу Ніву"? 25–го начался суд над Мирославом. И без присутствия адвоката. А что говорят в Минске об этом, или уже все забыли?

Димочке посоветуй поберечься и на правах старшей проведи с ним инструктаж по безопасному сексу. Передавай всем привет. Галька.

1997. Кажа, што не хацела

Ліст №7

…Прабач, я сапраўды не хацела, каб усё так атрымалася. Калі табе яшчэ цікава, то напішу пра сябе. Як і раней, я працую ў школе, у мяне новая пасада — пэдагог–арганізатар — і 2 клясы (10 і 6). У вольны час спрабую вязаць (традыцыйны занятак старой панны) і чытаю кніжэнцыі па псыхалёгіі. Чакаю ліста. Цалую. Твая Галіна. 15.02.97 г.

1997. Гульня працягваецца

Ліст №8

Добры дзень… Дабралася я нармальна. Жанчына, якая ехала са мной разам у купэ, сказала, што "где–то я видела этого мальчика". Гэта пра цябе. Так што ты добра захаваўся.

А ўчора я сказала сваім, што зьбіраюся за цябе замуж. І што тут

пачалося! З 15.00 да 21.00, а потым дзесьці з трох ночы да сямі раніцы быў “кардэбалет”. Бацька многа не гаварыў: выпіў пляшку гарэлкі, і ўсё. А маці хацела атруціцца, я абудзілася ўначы з–за таго, што яна пачала шамацець у маім пакоі таблеткамі. Мне было заяўлена, што калі я свой выбар ужо зрабіла, то яны зробяць таксама і разьвяжуць мне рукі. Галоўнае, з чым яны ня могуць згадзіцца — твае дзьве жонкі, і кажуць: “Будзеш трэцяй, але не апошняй”. Люблю. Твая Галіна. 11.03.97 г.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

аўтапартрэты да 3 нумару 4(5)-1999

Адам Глёбус
Выдавец
Навэля з кнігі „Дамавікамэрон“

Адам Глёбус, літаратар і выдавец, адыграў рэвалюцыйную ролю ў разьвіцьці беларускага мастацтва, паэзіі, прозы і выдавецкай справы 80–х і 90–х. Культавая фігура сучаснай беларускай культуры. Апошнія кнігі — “Койданава” (“Літаратура”, 1997; апавяданьне зь яе на ўкраінскай мове ў часопісе “Березіль”, 1999) і “Новы дамавікамэрон” (“Літаратура”, 1998; у польскім выданьні “Demonokameron”, ZBP, 1998). Рыхтуецца ягоная кніга афарызмаў “Кантамінацыі”. У 1999 годзе выйшлі таксама ягоныя апавяданьні “Пачварнік” і “Графіціст” (“Наша Ніва”). Сярод рэалізаваных за апошні год расейскамоўных выдавецкіх праектаў — фундамэнтальныя “Классики философской мысли”, “Библиотека лирики”, “Мастера культуры”.
У ARCHE–“Кабеты” было надрукаванае ягонае эсэ “Яна і я”.

Ахвярую брату Міраславу

Выдавец раскрыў у кампутары сьпіс аўтараў. Да пачатку працоўнага дня заставалася дваццаць хвілінаў.
— Зрабі мне каву! Моцную! — гукнуў ён сакратарцы.
Сьпіс доўгі. Замоўлена мора кніжак. Мо–ра. І хоць бы адна

цікавая. Попыт нараджае прапановы. Кнігі–грошы, грошы–кнігі. Кругазварот паперы ў прыродзе. Колькі лесу павалілі…
— Вашая кава, цукар ня клала, — сакратарка, падобная да актрысы, паставіла на стол мэталёвы кубак на мэталёвым сподку.
Колькі дрэваў сьсеклі з–за гэтай макулятуры–маскультуры. Якая культура ў масах? Сьмех! Дрэваў шкада. Яны стаялі, зелянелі, жылі… Як там у Жуля Рэнара? Я ўжо хацеў бы стаць дрэвам. Я навучыўся стаяць і маўчаць. А я не хачу рабіцца дрэвам. Занадта вялікая верагоднасьць быць сьпілаваным і пайсьці на „Парады доктара *(ха–ха, які ён, к чорту, доктар?)* нарколяга“… *Тэлефон. Першы званок. Пачалося.*
— Гэта Х. Кажа, пільная справа, — зацiснуўшы слухаўку, шэпча сакратарка.
— Ён у нас паўгоду, як не працуе.
— Просіцца на два словы.
— Ты сказала, я ёсьць?

— Я сказала, чакайце…
— Добра, давай сюды гэтага Ха–Ху–Хі, — Выдавец узяў слухаўку.
— Я тут недалёка. Хацеў бы зайсьці. Вы надрукавалі трэці наклад маёй кнігі „Парады цяжарным жанчынам“.
— Заходзьце праз гадзінку. Буду рады бачыць, — гудкі ў слухаўцы.
Буду рады. Буду гадам. Быў, ёсьць і буду гадам. Трэці наклад! Ды хоць бы й сто трэці.
Выдавец зрабіў вялікі глыток наймоцнай, як ён любіць, кавы. Пэрсанальнай кавы з пэрсанальнага кубачка на сподачку. У дзьверы пазванілі. Панеслася.
— Можна да Вас?
— Вядома, — Выдавец схаваў каву ў стол.
Можна–няможна. Цялушка недатраханая. Зноў не зрабіла ў тэрмін жаночы дзюдзяктыў з мэнструацыямі. Паваліла тэрміны. Зрэшты, дупа ў яе як мае быць, і торс, і твар. Што ты ўзьеўся за нейкі там тыдзень?
— Дазвольце, я дзьверы прычыню?
Адкуль столькі какецтва й расфарбоўкі? Ня твар, а маска Тутанхамона. Асьцярожна. Чырвоная лямпачка. Праход

забаронены. STOP!
— У цябе сакрэты ад маёй сакратаркі? У мяне няма. Але, калі хочаш зачыніцца — зачыняйся.
На ёй новая сукенка. На памер меншая, чым трэба. Жанчына зь непастаяннай вагой. Моніка Левінскі. Цела так і выпірае — на, вазьмі, укусі, зьеж. Жанчына В. сядае ў фатэль. Агаляюцца шаўкавістыя сьцёгны.
— Я ўладкавалася на новую працу й дэтэктывы пісаць ня буду. Надакучыла. Цяжка. Грошай мала.
Прыплылі. Грошы. Сумна.
Выдавец выціснуў аднекуль са страўніка сумную ўсьмешку. Усё разумею. Нічым не дапамагу.
— Што за цікавая праца, калі не сакрэт?
— Журналісткай у газэту.
— Як гераіня зь недапісанага раману?
— Палітыка мяне не цікавіць. Можна ўзяць у Вас інтэрвію? Мне столькі цікавага пра Вас расказалі.
— Хто?
— Сябры.
— У мяне сяброў няма. Гадоў пяць, як зьнік апошні.

— З таго дня, як Вы сталі мільянэрам?
Ёханы манэ. Яшчэ й гэтая муйня. Плёткі нараджаюць міты. Міты жывуць вечна. Каго трахае твой кілаты муж? Ён што, толькі самазадавальняецца, сучы сын?
— Дзякуй інфляцыі, у нас усе мужчыны мільянэры й жабракі ў адной асобе.
— Я пра іншыя грошы.
— Іншых грошай не бывае. Павер. Хоць я й не даляравы мільянэр, але скажу... Грошы або ёсьць, або іх няма. Што намалявана на паперках, раялю не адыгрывае.
— Дык Вы не мільянэр?
— Расчаравалася?
— Крышку.
Яна сапраўды згубіла настрой. Гэта ж трэба. У мяне няма лімону баксаў. Я не атрымаў раману. Згубіў пісьменьніцу. Хуявастую, між іншым, пісьменьніцу. Піздавастую, так больш дакладна. А расстройваецца яна, кабыла чарнавокая. Думае, пачну суцяшаць. Хрэн у зубы. Абыдзешся.

— І што яшчэ расказалі пра мяне мае дарагія й любімыя мітычныя сябры?
— Што Вы — сэксуальны маньяк. Не прапускаеце ніводнай спадніцы й трахаеце ўсіх у дупу. Тым, хто кладзецца ў ложак, Вы плоціце ўтрая болей.
Ба–ба–ба! Бу–бу–бу! Я бу–бу цябе ў гу–бу. Я так болей не магу. Не хачу бу–бу ў губу. Я хачу бу–бу ў бу–бу. Сэкс–маньяк. Нельга было дазваляць зачыняць дзьверы. Так можна апынуцца ахвяраю сэкс–злачынства. Даў бы ў рыла. Радасьць мая, журналісцкая. Але ня дам. Вопыт–вопыт. Вытрымка.
— Ты расчаруешся цалкам, але ў мяне няма нават каханкі. Няма калі. Няма часу.
— У вас сакратарка падобная да актрысы.
— Яе выключылі з тэатральнага інстытуту — раз. Яна па адукацыі настаўніца малодшых клясаў — два. Яна пляменьніца маёй жонкі — тры. Толькі шчыра. Я падобны да маньяка–мільянэра? Як на душы. Ня думаючы.
— Вельмі падобны. І я была ўпэўненая, што Вы мяне трахнеце.
— У дупу?
— Так!
— Вось тут, зараз, у кабінэце ўстаўлю табе ў ASS?
— Так!
— Ня ўстаўлю.
— Чаму?
— На цябе не ўстае.

— Я пакрыўджуся...
Трып–трап–труп. Крыўдлівая самка са схільнасьцямі да гістэрыі. Толькі эпілептычнага прыпадку не ставала. Кава, пэўна, захалонула. Дзе мая чортава актрыса? Мяне ж трэба ратаваць. Сам сябе не ўратуеш, ніхто цябе ня выратуе.
— Будзе жаданьне пісаць білібердыстыку, заходзь. А інтэрвію я табе ня дам. Ніколі. Ні–ко–лі. Ні–ко–ля. Чао, бамбіна.
Выдавец дастаў каву й зрабіў другі глыток. Кіслая й халодная. Ён закурыў. В. сышла. Вільнула круглай сракаю й зваліла. Ён прыбраў яе прозьвішча са сьпісу аўтараў. Зазірнула сакратарка.
— Вас чакаюць X і Z.
— Хай зайдзе Z. Да тэлефону ня кліч. Я заняты.
— Я ня клічу. Запісваю ўсіх на заўтра й пазаўтра.

— Праходзь. Сядай. На табе твару няма...
На Z не было твару. Ён, зразумела, быў. Твар з расьсечаным у дзяцінстве лобам. Але сьмяротная бляклясць і завостраны, да стану птушынае дзюбы, нос дазвалялі спытацца...
— Дзе твой твар, дарагі мой Zi–Zu–Za?
— На гарышчы... Не паверыш. Цэлую ноч ня спаў. Усё з–за трыклятага трылеру, што ўзяўся пісаць. Жонку зь дзецьмі выправіў на вёску. Думаў, папрацую. Сеў за кампутар. Адкрыўся... Чую, нехта па гарышчы тупае. Туп–туп–туп па столі, да маёй кватэры. Туп–туп... Стаіўся. Стаіць нада мной. І я заціх. Адно вэнтылятар у кампутары шуміць. Фуркоча. Ён у мяне крышку няспраўны. Можа, дасі які аванс. Я памяці прыкуплю й клявіятуру памяняю. Яна ледзь ліпіць...
— Ты браў аванс.
— Усё аддаў жонцы. Прадукты ў вёску купілі. Нейкія шмоткі дзецям. Засталося на хлеб.
— Дам. Але ў апошні раз.
Заманаў. Здае трылер і застаецца мне вінен. І так кожны раз. Колькі ён таго хлеба жарэ? Вагон? Два? Хочацца кавы. Кава — рытуал. Каву трэба піць адному. Спачатку каву разам п'еш. Потым гарэлку. І пачынаецца трылер: „Ты абдзіраеш пісьменьнікаў. Ты кроў нашую смокчаш. Я табе свае органы прыношу. Сэрца, страўнік, печань... А ты плоціш капейкі...“
Было й болей ня будзе.
— Кампутар фуркоча. Я на карачках папоўз на кухню й выцягнуў з–за лядоўні сякеру. Выдатная сякера. Мяса секчы. Развальвае толькі так...
Ня толькі хлеб ты ясі. Ты яшчэ й мяса наварочваеш. Дарагі мой трылярыст.
— Ад бацькі засталася. Як бацька памёр, я сякеру ў горад прывёз. Спатрэбілася. Вярнуўся за стол. Сяджу. Сякера на каленях. Ціха. Пісаць не магу. Што за пісаньне зь сякераю ў руцэ. Пахадзіў. Гарбаты папіў. Лёг. Сякеру пад падушку паклаў. Толькі вочы заплюшчыў. Туп–туп–туп. Ходзіць, падла. Чую, адчыняе люк і па лесьвіцы злазіць. Лесьвіца ціхенька так пазвоньвае. Будаўнікі кепска прыварылі. Зьлез, падышоў пад мае дзьверы й стаіць. Я скаціўся з ложку, падкраўся да дзьвярэй, зірнуў у вочка. Цемрадзь. Лямпачку, гадзіна, выкруціў ці пабіў. Не пабіў. Каб пабіў, я б пачуў. Зараз, думаю, я цябе ўбачу. Пайшоў на кухню. Усё крадком, ціхенька, на

дыбачках. Набраў у шпрыц сьпірту... Ты ж ведаеш, я ў мэдінстытуце два курсы скончыў...
Ведаю. Як ня ведаць. Столькі лістоў з прэтэнзіямі атрымаў за „Парады доктара–нарколяга“. „Чаму пішуць недавучкі?“ „Вашыя кніжкі людзей калечаць!“ „Вас садзіць трэба!“ Нібыта наркаманаў і наркамафію трэба лекаваць кампрэсамі. Усе лісты ў сьметніцу выкінуць і забыць.
— Сьпірт сапраўдны. Адзін патолягаанатам адліў. У яго пад сталом бутля на дваццаць літраў. Найчысьцейшы мэдыцынскі сьпірт. Можна піць і не баяцца, што асьлепнеш. Поўны шпрыц набраў. Узяў запалкі. Падкраўся да дзьвярэй. Уставіў іголку ў замочную шчыліну. Выціснуў сьпірт і падпаліў. Сам да дзьвярнога вочка прынік. Думаю, цяпер я цябе, начны тупатун, дакладна ўбачу.
Вар'ят. Я маю справу з маньякам. Вакол мяне адны монстры... са сьпіртам у шпрыцах, з чэлесамі ў дупе, з парадамі крышку цяжарным жанчынам.
— На калідоры адны сінія сполахі і больш нічога не відаць. Я ўзьняў сякеру. Расхінуў дзьверы. Выскачыў. Абіўка гарыць. На пляцоўцы нікога. Толькі я зь сякераю ўзьнятаю. Дым павярнуў. Пад дэрмацінавай абіўкаю — вата. Дыму поўны дом. Я саколку зьняў. Пачаў тушыць агонь. Полымя зьбіў. Зачыніўся ў кватэры, сяджу. Што жонцы скажу пра абіўку? Скажу — хуліганьнё. Да раніцы праседзеў на ложку і ўсё слухаў. Будзе хто хадзіць, ня будзе. А раніцаю сусед пазваніў. Я так і так, нехта ў нас па гарышчы поўзае, тупае, дзьверы мне падпаліў. Дарэчы. Не дасі мне авансу? Трэба ж, пакуль жонка вернецца, дзьверы наноў абабіць. Ня буду ж я ёй пра шпрыц расказваць. А то падумае: „зь якім маньякам, я жыву“? Дасі?
— Дам. Я ж сказаў, што дам.
— Ты сказаў, што дасі на клявіятуру, а пра дзьверы ты ня ведаў.
— Я выпішу аванс, а ты сам вырашай, што на хлеб, што на сьпірт, што на дэрмацін...
— Добра–добра, ты не хвалюйся. Я ўсё зраблю як мае быць і трылер пакладу на твой стол у тэрмін, можа й раней. Я ж цяпер адзін. Можна працаваць і працаваць.
Ты напрацуеш. Без сумневаў. З музаю на гарышчы.
— Сусед кажа, і ён чуў нейкія крокі над галавою. Я ўзяў сякеру, і мы палезьлі на гарышча. Там галубоў відзьма–нявідзьма. Усё

засралі. І на гэтым памёце, закруціўшыся ў газэты, сьпіць бомж. Побач пустая бутэлька з–пад чарнілаў ляжыць. Пакаціў чарліка й дрыхне. Я раззлаваўся. Нагой па рэбрах як упіжджу. Гэта каб сусед падумаў, што бомж мне дзьверы спаліў. Сусед адцягнуў мяне. Бомж вылузаўся з газэтаў і ўцёк. Я хаджу як сам ня свой. А трэба ж працаваць. Трэба трылер пра сям'ю людажэраў скончыць. Што скажаш?

— Ты гэты эпізод у трылер устаў.

— Банальна. Нейкі бомж, валацуга... Блякла. Каб ён сапраўды падпаліў дзьверы, я выскачыў зь сякераю, а ён вырубіў мяне, зацягнуў у кватэру, расьпілаваў, зрабіў катлеты з цыбуляю з маіх мазгоў і зжэр. А так — банал.

— Ідзі падпішы дамовы ў сакратаркі й атрымай аванс. Апошні аванс, чуеш?

Кава пакрылася белаватай плеўкаю.

Дап'ю. Няма калі шыкаваць. Яшчэ гэты Х з парадамі не зусім цяжарным. Грошы папросіць. Можаш адсекчы мне галаву тупой сякераю, зрабіць катлеты з мазгоў і трахнуць мяне ў дупу, калі я памыляюся. Вопыт.

Вочкі ў Х міргаюць–міргаюць. Ён сядзіць у фатэлі, як вучань, што вершык забыўся. Анёл. Лып–лып, лып–лып.

Хочацца есьці. Разьбіраюся з Х і пайду палуднаваць. Што–небудзь лёгкае. Суп з цыбулі й сок. Шклянку вінаграднага зь лёдам.

— Слухаю, — суха вымавіў Выдавец.

Ён праверыў, ці не застаўся выпадкам Х у сьпісе аўтараў.

Няма. Правільна. І быць не павінна.

— Як справы? Даўно ня бачыліся, — яшчэ больш суха вылецела з Выдаўца.

— Я вынайшаў выдатную рэч. Латы з тонкай ліставой сталі. Цэлы дзень за кампутарам. І цяжкія часьціцы з экрану бамбуюць цела. Вочы за акулярамі. Я набыў сабе акуляры нулёвачку. Простае шкло, а выдатна абараняе вочы ад часьціцаў.

— Якіх часьціцаў?

— Вы ня ў курсе? Экран манітора выпраменьвае цяжкія часьціцы. Вельмі шкодныя для арганізму. Трэба абавязкова абараняцца. Вочы я хаваю за акуляры. А сэрца, лёгкія, печань й страўнік — за латамі. Тонкая сталь. Надзяваеш, і як за каменнай сьцяною. І яшчэ я ланцугом прыкоўваю сябе да батарэі — зазямленьне. Разумееце? Статычная электрычнасьць.

Яна назапашваецца ў целе...
— І як? Дапамагае? — Выдавец праглынуў вялізны кавалак сьмеху.
— Выдатна дапамагае. Раней пасьля працы я здымаў кашулю й зь яе іскры ў цемры сыпаліся. Цяпер ніводнага разраду. Адно пальцы стамляюцца, — Х выцягнуў рукі, — бачыце? Калоцяцца. Спрабаваў друкаваць у пальчатках — нязручна.
Цілі–ціліі. Друкаваць у пальчатках. Іскры з кашулі ў аднаго, іскры зь дзьвярэй у другога. Трэба да справы. Так можна да вечара слухаць трызьняціну й застацца без абеду. Вальтэр аддаваў 200 гадоў пасьмяротнай славы за добрую працу страўніка. Вальтэр меў што аддаць. А я мушу зьесьці свой суп.
— Чым абавязаны Вашаму візыту?
— Я зайшоў у „Цэнтральную кнігарню“. Пабачыў сваю кнігу. Зірнуў — трэці, дадатковы наклад. Парадаваўся. Добрая кніга. Людзі чытаюць. Выдавецтва зарабляе. Дай, думаю, патэлефаную. Калі выдавецтва добра зарабляе, чаму, думаю, з аўтарам не падзяліцца?
Хі–ха–ха. Выйграў. Катлет з мазгоў ня будзе. Толькі цыбульны суп і шклянка вінаграднага. Папрасіў падлюка грошы. Па–пра–сіў. І не атрымае.
— Вы ў якім цяпер выдавецтве працуеце?
— Хай гэта застанецца за дужкамі нашае размовы.
— Чаму ж за дужкамі? Я Вам у вочы скажу. Проста так, вазьму й скажу. Вы працуеце не ў маім выдавецтве. Не ў маім.
— Рыбіна шукае, дзе глыбей, чалавек — дзе болей плоцяць. Лып–лып рыбінымі вочкамі. Сьлізкі тыпус. Мярзотны, як жоўты, гнойны плявок.
— Трэці наклад.
— А колькі нараканьняў. Вы заўважылі, што кніжка перарабленая? Што побач з вашым прозьвішчам стаіць іншае?
— Не, не заўважыў.
— А вы схадзіце й паглядзіце. Пасьля першага пробнага накладу прыйшло столькі лістоў з прэтэнзіямі, што давялося шукаць чалавека й дарабляць рукапіс. У вас жа ні слова пра акт. А цяжарнасьць, як мне вядома, якраз і ўзьнікае падчас еблі. Толькі ебля бывае розная. Можна пратрахацца ўсё жыццё, а цяжарнасьці ня будзе. Вось я вас магу трахнуць, а цяжарнасьці нуль. Праўда? А ў Вашай кнізе, ні дзе, ні з кім, ні як трэба весьці полавае жыцьцё, не напісана. Вы накаталі твор

для Дзевы Марыі *(даруй мне, Божа!)*. А такіх на зямлі мала. Большасьць матак зацяжарвае ад мужчынскай спэрмы.
— Нашто Вы так са мной. Сказалі б проста: у нас цяжкі час, выдавецтва ледзь канцы з канцамі зводзіць.
— У мяне натуральнае выдавецтва, канцы з канцамі зводзяць підары.
Не хвалюйся. Ён сыдзе. Сыдзе, а ты застанешся.
— Я пайду.
— Дзякуй, што зайшлі.

Цыбульны суп у рэстарацыі „Грунвальд“ быў смачны, а сок кіслы.
07.08.1999

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] *Перакладчыкі ў 4(5)-1999* .
[image]
[image][image][image][

(—)
У царкву, а дакладней, у касьцёл, я ўпершыню завітаў са сваім сябрам Дзянісам Зёзікам у другой клясе. Цяперака бажніца сьлепіць бельлю муроў ды срэбрам крыжоў, а тады яшчэ гэта быў аблезлы ружовы будынак безь цяперашняй танклявай, крыху нягеглай вежыны, у якім гадоў дваццаць да таго месьціўся кінатэатар, а ў 1987, калі мы зь Зёзікам туды палезьлі, будынак гэты працягваў быць грамадзкім. Грамадзкай прыбіральняй. Майстры сваёй справы, спрытныя барысаўцы (дый барысаўкі, пэўне, таксама) любілі абкладаць сваімі пачалавецку вульгарнымі кучамі абшарпаныя, але яшчэ велічэзныя белыя калёны памяшканьня. Сьцены і аўтар былі шчодра абпісаныя любоўнымі шчыраваньнямі кшталту “Маша + Саша = Любовь” (Бог — гэта Любоў!) і дзесяткамі арыентавальных зацемак “Сдес был и с...л я”. Па цёмных сьлізкіх сходнях мы дапаўзьлі да таго месца, дзе колісь вылянгаўся арганісты–местачковец, а адтуль — на касьцёльнае паддашша. Я там і застаўся, і праседзеў там паўгадзіны.
Я глядзеў на рэшткі настольнага росьпісу, што таямніча выглядалі з–пад пабелкі, а Зёзік бегаў наўкола, штурхаў мяне, каб мы ўжо спускаліся, але куды яму было зразумець, што адразу пасьля “Герояў” я праглынуў “Стралу расамахі” і цьвёрда верыў, што зраблюся археолягам. Але ж Зёзік зразумеў. Таямніча падміргваючы, ён завёў мяне долу, у сутарэньні; мы ўпаўзьлі ў вільготна–цагельную дзірку, запэцкаліся, як дзюдзікі... Упоцемках Дзяніс пашарыў наўзгад, штосьці намацаў і сунуў гэта “штосьці” мне ў рукі. На вуліцы, пры сьвеце барысаўскага ацалелага ліхтара, я разгледзеў неспадзяваны падарунак: то быў кавалак касьцёльнае кафлі, на адваротным баку якой было выбіта: “Edmund Swiktorzecki, 1907”.
(—)
Калі мною ўпершыню авалодаў жах перад сьмерцю, мама супакойвала мяне тым, што нібыта, калі я вырасту, навукоўцы вынайдуць такі лек, які ўсяму чалавецтву падорыць несьмяротнасьць. Мала таго, што я ёй не паверыў. Мяне ўжо тады цікавілі яшчэ два пытаньні: “Колькі гэта будзе каштаваць, такое дзіва?” ды “Як гэта так, што *ўсе* будуць бесьсьмяротнымі?” Адказу я, здаецца, так і не пачуў, бо празь сьлёзы захліпнуўся ў царстве сну (чым ня сьмерць?),

уторкнуўшыся ў падушку, матуліну цёплую падушку…
(—)
Больш за Гермэса я любіў тытана Прамэтэя. Хутчэй, не любіў, а паважаў. Ён быў для мяне ў дзяцінстве сапраўдным сэкс–сымбалем, вобразам мужчыны, падобным да якога я марыў стацца. Першым недарэчным расчараваньнем у вывучэньні гішпанскай мовы быў факт адшуканьня ў трэцяй клясе ў слоўніку дзеяслова “prometer”, абяцаць. Усяго–ткі абяцаць. Тады я ўжо ведаў збольшага пра Ісуса Хрыста, які быў для мяне наўпроставым працягам вобразу Прамэтэя, толькі ў іншай кніжцы. Праўда, Прамэтэй зрабіў да халеры шмат карысных рэчаў для люду паспалітага, забіўшы на ўсіх алімпійскіх багоў, а Хрыстос толькі наабяцаў і Бацьку свайго нябеснага зусім не забіў, у адрозьненьне ад таго самага Зэўса. Даў сябе забіць дзеля Яго, Ягвы.
(—)

Зь дзесяці год я з адданых справе піянэраў зрабіўся беларускім нацыяналістам. Я вандраваў па ўсіх магчымых і немагчымых навакольлях Барысава і маёй вёскі Чычэвічы, што ляжыць далёка на Друці. У Беларусі ж, як вядома, выключнай, лічы, спадчынай зь мінуўшчыны зьяўляюцца “образцы культовой архитектуры”. Я быў адным з тых вельмі нешматлікіх барысаўцаў, якія ведалі, дзе знаходзіцца самы старажытны будынак места — Андрэеўская царква XVIII стагодзьдзя, не пазначаная ні ў адным гістарычным даведніку. Даводзячы, што раней у Доме Піянэраў, падобным сваім жоўтым колерам да вар’яцкага дому, раней месьцілася сынагога, я, дзесяцігадовы картававаты дзяцюк, у пэўным сэнсе наступаў на любыя мазылі нашым местачковым антысэмітам, якіх, на жаль, большасьць у гэтай краіне. Я, магчыма, быў адзіным, хто ведаў усе капліцы, камяні ды пабітыя іржой старасьвецкія крыжы на Кальварыі і даўніх праваслаўных могілках. У перабудове і так званым “духоўным адраджэньні” была адна рэч, якую я ўсёй душою ненавідзеў. Мяне перасмыкала ад рэстаўратараў, якія абцывілізоўвалі абшарпаныя, маркотныя і тым прыцягальныя цэрквы і касьцёлы, мае цэрквы і касьцёлы. Пасьля мне было нейк ніякавата глядзець на сьвятароў, што ў гэтых бажніцах служылі. Мне было млосна ад аднае думкі, што толькі яны зараз могуць праходзіць за аўтары і сыходзіць у сутарэньні, у

якіх дакладна не засталося і сьледу той маёй кафлі. Аднойчы я, ПСО (“председатель совета отряда”) нашае 4 “А” клясы, прапанаваў усім пайсьці ў адбудаваны барысаўскі касьцёл. Усе згадзіліся (мы зматваліся з урокаў русліт). Усе пайшлі (бо зусім недалёка ад базару, дзе можна было купіць шклянку-другую нямытых смачных семак). Усім спадабалася. Але ўсё ўражаньне сапсавала ўедлівая бабулька са старым польскім малітоўнікам у руках, якая празь енкі і сакральныя згрозы змусіла ўвесь мой піянэрскі атрад укленчыць пасярод памяшканьня і пераҗагнацца па-каталіцку. Больш ніхто з маіх аднаклясьнікаў у касьцёл ня сунуў і носу, акрамя, бадай, мяне, заўзятага атэіста–аматара імшы на беларускай мове, ды Ленкі Жызьнеўскай, якая там пабралася шлюбам. Гэтак, папы, ксяндзы і літарай Г бабулькі забралі ў мяне мае бажніцы, забралі ў мяне мае паганскія парафіі. Напаўразбураная царква — гэта капішча. Разбураная — гэта ўжо пра сатаністаў ды антыхрыстаў.

(—)

У шостай клясе, калі я ўжо нагледзеўся фільмаў аб жыцьці Хрыста і прачытаў чатыры эвангельлі, надарылася прачытаць некананізаванае, ад Нікадзіма, што друкавалася ўрыўкамі ў „Науке и Религии“, і паводле якога Хрыстос (пяцігадовы!) забівае, разьюшаны, свайго настаўніка. Умеў–такі забіваць. Тады ж пачалося захапленьне ўсходнімі адзінаборствамі, а зь імі і будысцкай філязофіяй, якая больш ці менш дасьціпна абгрунтоўвала несьмяротнасьць душы, што прынесла яшчэ адну праніклівую боязь — боязь перад бясконцым Пачаткам. Гэта зацемрыла, у нейкай ступені, страх перад Нічым сьмерці, перад бясконцым Сусьветам (нябожчык дзед Павел упарта сьцьвярджаў, што „дзе-та там усё ж такі ёсьць якая сьценка“). Абсалютнае Нішто Пачатку мучыла і нават супакойвала. Загойдвала.

(—)

У шостай клясе, калі мама ляжала доўга ў больніцы, я жыў у вёсцы і там прынадзіўся чытаць кнігі зь вялізнай бібліятэкі маёй бабулі, колішняй настаўніцы мовы і літаратуры. Пачаў чытаць і Коласавы „Ростані“ („На простынях“, як казалі ў нас у школе). Аднаго вечару, я, лежачы ў ложку, дайшоў да вар’яцка блізкіх мне роздумаў Лабановіча аб сьмерці, аб нежывым целе ў труне… Бабуля адпойвала мяне валяр’янкай і цытавала

заангажаванага сёлета Пушкіна: „Не дай мне Бог сойти с ума, уж лучше посох і сума“. Бабуля запэўнівала, што гадоў у шэсьцьдзесят–семдзесят многія людзі самі ўжо прагнуць сьмерці, стаміўшыся ад нядоляў, пахаваўшы не аднаго сваяка, сябра. Яшчэ адзін жах: як можна стаміцца ад гэтага цудоўнага, ружовага ў гарошачак жыцьця? Можна! Яшчэ жахлівей, казала бабуля, жыць вечна. Я адчуў сябе мурашкай, нікчэмным мізэрам, нічым. Я, здавалася, пачынаў патроху асвойвацца зь непазьбежным. Здавалася. Цікава, а ці чакаў сьмерці Лабановіч–Колас гадох у 50-х, стары, дасьведчаны, вядомы, але, напэўна, таксама стомлены чалавек?

(—)

Калі я толькі пачынаў назапашваць веды пра полавыя зносіны, у мяне зьявіўся новы, бязглузды, і таму непрыхавана арыгінальны аргумэнт супроць існаваньня несьмяротнасьці душы. Спадручным у маім ваяўнічым атэізьме стаўся звычайны юркі спэрматазойд, з найспрытнейшых, што дасягаў яйцаклеткі і ўдзельнічаў у сумесным зь ёй прадукаваньні эмбрыёну. Перад усімі саманадзейнымі аматарамі займальнай тэалёгіі я ставіў прыкладна такое пытаньне: „А ў які момант душа залятае ў зародак? А ці мае спэрматазойд душу? Не? Дык Вы, дзядзька, нейкі артадокс, з Вамі і размаўляць ня варта. Так? А як тады з дзьвюх астральных субстанцыяў атрымоўваецца толькі адна? Куды падзяецца другая?“ Сьвятары і тыя мае сябры, што далі веры палітрукам з „Эвангельлем“ замест „Цытатніка Мао“ ў руках, — усе яны да такой дыскусіі падрыхтаваныя звычайна не былі, і таму надакучлівыя намаганьні паставіць мяне на Шлях Выратаваньня ад Пякельных Кастрыкаў паступова згасалі. Тады я, каб не псаваць добрым людзям настрой, распавядаў агідны анэкдот пра тое, як спэрматазойд, здалёк заўважыўшы напарадзе нешта вялікае і чорнае, спрытна абагнаў мільёны сваіх слабейшых братаноў і, вільнуўшы хвосьцікам, усхвалявана спытаў у гэтага вялізнага і чорнага: „Няўжо гэта сапраўды ты, яйцаклетка?! Я так доўга марыў цябе пабачыць, і вось!..“ Аб’ект захапленьня незадаволена заварушыўся і гучным мужчынскім басам прабурчэў: „Во, яшчэ адзін ёлупень. Як вы мяне ўжо дасталі! Карыес я, разумееш, ка–ры–ес!“

(—)

Адчуваньне адчаю, прадбачаньне Вялікага і Бясконцага Нічога наведвала мяне не сказаць каб занадта часта. Але рэгулярна.

Пік прыйшоўся на пэрыяд полавага сталеньня, на пераходны ўзрост. Падлетак — чалавек, які жыве яшчэ вясною, праўда, ужо позьняй, чакае лета, як школьнікі і студэнты чакаюць найвялікшых вакацыяў, але ўжо ўсьведамляе, што за летам прыйдзе восень (зноў у школу!..), а за ёю — мёртвая Зіма зь Бясконцым Холадам і Паняй Аднастайнасьцяй. Маланка ад пяткаў да макаўкі скаланала мяне наўзвыч, калі я клаўся спаць, а вакол была цемра, за вакном выў заўжды галодны суседзкі сабака, а перад вачыма яшчэ круціліся такія–сякія кадры з чарговага „жахлівіка“, які паказалі па 8–м канале. Бывала, я ліхаманкава падскокваў на ложку, падрываўся на ногі… „Не хачу, не хачу, не хачу!..“ Часам будзіў суседа па пакоі (маму, дзядзьку, сябра) і для самазаспакаеньня пытаўся: „Ты баішся Сьмерці?“ Ніхто ніколі не сказаў: „Сьпі давай!“ Чалавек або пачынаў доўга разважаць, або, найчасьцей, замаўкаў так надоўга, што я часам губляў ужо надзею атрымаць адказ, калі раптам чулася ціхае і кароткае: „Ня ведаю“…
(—)
Калі я нарадзіўся на белы сьвет, мае бацькі, беспартыйныя пацыфічныя атэісты, нават і не падумалі, каб сыночка Талюшу пахрысьціць. Толькі данінай павагі беларускай традыцыі сталася маё настойлівае жаданьне хрышчэньня, якое ажыцьцявілася толькі ў верасьні 1989 году ў барысаўскім „псэўдарускім“ Петрапаўлаўскім саборы. Поп зь веданьнем справы акунуў двух немаўлятаў, што хрысьціліся разам са мною, а на мяне толькі пырснуў сьвянцонай вадою, нешта прамармытаў і разы з тры перахрысьціў. Мае хросныя, у мінулым тыя ж атэісты, захоўвалі салідны выгляд, але пасьля, у нас у хаце, усё роўна добра драбнулі за кумаўство і хрэсьбіны. Акрамя алюміневага з а–ля пазалотай крыжыка, які я столькі разоў губляў і такі згубіў недзе ў вясковым клюбе празь пяць гадоў, хрэсьбіны прынесьлі яшчэ адзін сымптом сталеньня, гэтым разам, сэзонны: на Вялікдзень трэ было езьдзіць да хросных бацькоў па яйкі. А я іх дужа не любіў, яйкі гэтыя. Адзінай забавай былі біткі: дзед Павел навучыў мяне, як намацаць яйка памацней, пацьвярдзей, і таму я заўсёды ўсіх перамагаў у носік, прынамсі. А бывала, і ў срачку.
(—)

Будызм разбурыў канцэпцыю майго „Я“ сваёй моднай у той час

байкай пра рэінкарнацыю. Нашто тады яна, гэтая хвалёная несьмяротнасьць, калі я — Толік Прасаловіч, Просік, Талян, Талюша — перастану быць самім сабою, згублю, халера, сваё імя і памяць пра жыцьцё, маё жыцьцё, якім бы яно ні было.
Я вельмі любіў гісторыю. Я намагаўся ўявіць сябе безыменным, і розум мой мутнеў ад роспачы. Былі, што праўда, дзеці–маўглі, безь імя, бяз роду і племені. Тады, у 14 год, я зразумеў, што мы, беларусы, і ёсьць гэтыя дзеці–маўглі, столькі разоў рэінкарнаваныя, а таму і бяспамятныя, народ, чыя нібыта бесьсьмяротная душа блукае сабе па неабсяжным Сусьвеце гісторыі.
А калі яшчэ пра будызм, то мараль аднае прыпавесьці пра Буду (буду!) зьяўляецца маім жыцьцёвым крэдам нават і сёньня. Буда ішоў з вучнямі па лесе, і раптам нехта сказаў, што дзесь непадалёк жыў вялікі гуру. Вушаты, як і я, спадар Шак'ямуні захацеў пабачыць знакамітасьць. Настаўнік–лесавік мэдытаваў пад высачэзным дрэвам. "Ён мэдытуе вось ужо 25 год", — шапнуў нехта. „Дзеля чаго ты сябе марнуеш, чалавеча?" — спытаўся ўражаны каралевіч. „Я зараз магу перайсьці раку па вадзе!" — з пыхай вымавіў гуру. „25 гадоў жыцьця! Якое глупства! Дзядзька, паглядзі: празь яе ўжо даўно пабудавалі мост!" Хрыстос таксама нібыта хадзіў па вадзе і шукаў рыбы апосталам. Мабыць, па Мёртвым моры хадзіў, бо там, кажуць, цяжка патануць, а колькі там было вагі ў яго, худзечы?
(—)
Мясцовых інтэрнацкіх наркаманаў стала асабліва шмат, калі ў моду ўвайшоў адмысловы савецкі амфэтамін пэрвітын, „вінт", што выганяўся зь дзіцячага леку „Салютан", які напаўгалодныя студэнты пяшчотна клікалі словам — украінскім гастранамічным сымбалем — „сала" і, зрэдку, „салютам". Цікава, што местачковыя дасьціпнікі і бел–чырвона–белы сьцяг клічуць „сала–мяса–сала". Гэта ўсё з галадухі. Дык вось, тыя, хто ўжываў амфэтаміны, сядзелі, як кажуць на слэнгу, „на белым", у адрозьненьне ад чарнушнікаў–гераіншчыкаў. Адзін з маіх патлатых сяброў увечары „адсалютаваў" мне аб тым, што ў іх зьявіліся раскручаныя калегі на Ўкраіне, канечне, і, сьцёбна падхіхікваючы, працягнуў мне пару–тройку ўлётак са здымкам „Дэві Марыі Хрыстос", чый твар, зашмальцаваны ад ксэраксаў, насамрэч нагадваў сала. Зь неблагіх, украінскіх гатункаў.

(—)
Шмат хто ў спрэчках выкарыстоўваў у якасьці доказу на карысьць несьмяротнасьці душы згадкі людзей, што прайшлі праз клінічную сьмерць, пра тое, што яны бачылі пасьля свайго ўмоўнага скону. Я ведаў, што мазгі жывуць і функцыянуюць ня менш, чым паўтары гадзіны па спыненьні сэрца, але ня гэта мяне ўражвала. У палове з апісаных выпадкаў перад чалавекам праносілася ўсё ягонае жыцьцё. Гэта было шчэ „нармальна“, калі, увогуле, нармальным можа быць хоць што–небудзь, зьвязанае са сьмерцю, няхай сабе потым і часова пераможанай. Куды менш зразумелым падавалася бачанае другой паловай: людзі сьведчылі, што перад імі паўставаў даўжэзны жахлівы тунэль з далёкім суцяшальна–прыцягальным сьвятлом напарадзе. Во табе і вынік жыцьця, во табе і справаздача. Набрыдаюць думкі аб апантаных верніках: вечная пасьмяротная радасьць у раі пасьля „ўгоднага Богу“ жыцьця на Зямлі… Ня выключана таксама, што гэтыя сьведчаньні належаць якім савецкім камуністам. Чым не фінал для жыцьця, асьлепленага цемрай бязглуздага выседжваньня сьветлай будучыні? Яшчэ адно падмацаваньне тэзысам аб цеснай повязі паміж тэорыяй марксізму–ленінізму з хрысьціянствам.
(—)
Я мог бы яшчэ да д’ябла шмат чаго напісаць на тэму рэлігіі, слова, аднакарэннага з „рэліктам“: пра веру ў сакральную Зьвярыную лічбу 666, пэсымістычнага прарока-атэіста Эклезыяста, маё знаёмства зь местачковым менскім юдаізмам, польскага п’янага паліцая, які спачатку нас арыштаваў, а потым, выпіўшы бутэльку нашых „Двух буслоў“, завёз нас у Крушыняны, каб паказаць адзіны ў Польшчы мячэт. Пра растаманскага бога Джа і майго сябра Ўладзіка, які ледзь ня згінуў у догме Сёку Асахары. Пра менскіх паганцаў ды сатаністаў, якіх можна было часьцяком сустрэць на аліварыйскім булдыры на Кісялёва, пакуль там не падаражэла піва. Але на гэты раз хопіць. Няхай сабе тав. Лукашэнка сам братаецца з тав. Філарэтам, а ў кожнай краме сталіцы вісяць скрыні, у якія небаракамі–бабулькамі ды былымі ваяўнічымі атэістамі запіхваюцца нікому не патрэбныя беларускія тугрыкі на пабудову чарговай зьменшанай копіі храму Хрыста Збаўцы. Няхай сабе ірляндзкія каталікі грэбуюць працягнуць руку свайму суседу–пратэстанту, няхай, але што гэта за вера, за

якую альжырскія фундамэнталісты сякуць шаблямі падазраваных у нявернасьці суайчыньнікаў, а сярэднявечныя крыжакі вынішчаюць усё на сваім шляху да Труны Гасподняй? Што гэта за рахманы Бог, які дае паміраць ад раку, голаду ці рук тэрарыста немаўляці?
Мой экзыстэнцыйны атэізм штодня сталее, а ўвушшу гучыць бэндэраўскае „Рэлігія — опіюм для народу“! Не давяраю я наркотыкам, наркаманам ды драг–дылерам. Ян Пабла Эскабар…
(—)
А калі б Хрыста не ўкрыжавалі, а, прыкладам, пасадзілі на кол, якім, цікава, быў бы зараз сымбаль хрысьціянаў, што б яны вешалі сабе на шыю і чым бы сьвяціліся макаўкі нашых бажніцаў?
(—)
(Зараз ноч, Натальля і я п’ем гарэлку ўжо ў нашай новай кватэры на Серабранцы, а не ў маім інтэрнатаўскім пакоі, адкуль нас вытурылі, як апошніх сабак, на вуліцу. Пасьля трэцяй я пытаюся, ці баіцца яна сьмерці, і Наташа маўкліва з ахвотай ківае. Дадае толькі: „Давай піць!“ Ціхенька, каб не пачулі якія суседзі, грае „Deviation“: „У гэтым засраным сьвеце не бывае спакою“… Я аўтатэіст.)

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

архіў да Зьместу 4(5)-1999

Ілья Куркоў
Як гадавалася «трэцяе пакаленне»

Ілья Куркоў — беларускі архівіст, археограф Нацыянальнага Архіву. У ARCHE-"Кабеты" друкавалася ягонае эсэ "Жанчыны Беларусі "эпохі калектывізацыі" ў дакументах ЦК КП(б)Б". Таксама аўтар тэксту "Як кахаюць беларускі" ("Беларусь", 5/ 98).

Комсомольская правда” приводит статистические данные, что каждый день в Москве рождается 225 детей — через каждые шесть с половиной минут рождается один новый член будущего социалистического общества *(смех в зале)*. Из этого вы поймете ту огромную легкость, с которой в нашем социалистическом обществе проходит производство ребятишек. Но вы поймите, что за шесть с половиной минут трудно сделать доклад. Оказывается доклад труднее сделать, чем произвести новых членов социалистического общества *(смех в зале)*”.[1]

Са справаздачнага дакладу першага сакратара ЦК КП(б)Б Гікалы на XV з’ездзе КП(б)Б (1934г.)

Лозунг “Усё лепшае — дзецям” не адно дзесяцігоддзе вісеў на фасадзе савецкай дзяржавы. На жаль, гэтыя добрыя словы даўно ўжо з’яўляюцца агульным месцам. А што мы ведаем сёння пра дзяцінства нашых суайчыннікаў у гады “Вялікага пералому”, калі памянёны лозунг пачаў актыўна выкарыстоўвацца дзяржаўнай прапагандай? Збольшага агульныя штампы: “няўхільны клопат партыі і ўраду”, “усеагульнае навучанне”, а таксама “юныя піянеры”, “кулацкія

сынкі", "беспрытульнікі"... Наяўнасць апошніх у 1920–я — 30–я гады зараз успрымаецца нават як нешта анекдатычнае. Памятаеце класіку?
— Дзядзя, дай дзесяць капеек!
— Можа, табе даць яшчэ ключ ад кватэры, дзе грошы ляжаць?
Дыялог гэты з раману "12 крэслаў" датуецца даволі дакладна — 25 красавіка 1927 году. Амаль праз год, у ліпені 1928 году, не ў літаратурнай, а ў рэальнай Беларусі адбылося пасяджэнне Сакратарыяту ЦК КП(б)Б, на якім разглядалася пытанне "Аб дзіцячай беспрытульнасці". Як бачна з матэрыялаў пасяджэння, погляды на азначаную праблему ў партыйнага кіраўніцтва былі некалькі супярэчлівыя. Так, з аднаго боку: "Дзіцячая беспрытульнасьць па БССР за апошнія гады, дзякуючы эканамічнаму ўзросту краіны і прынятых дзяржаваю і савецкай грамадзкасьцю мерапрыемствам, значна паменшылася...." І ў той жа час: "Адзначыць, што да гэтага часу слаба зьвярочвалась увага з боку савецкіх, партыйных і грамадзкіх арганізацый на ліквідацыю дзіцячай беспрытульнасьці, чаму і назіраецца ў некаторых месцах нават павялічэньне дзіцячай беспрытульнасьці, асабліва вулічнай"[2]. Прайшоў час. 28 верасня 1932 году ў рэзалюцыі гэтай жа ўстановы было адзначана: "... зусім нездавальняючае становішча дзіцячых дамоў, дрэнная пастаноўка вучэбна–выхаваўчай і арганізацыйна–гаспадарчай работы ў дзіцячых дамах, адсутнічаньне ўласнай харчовай базы... НК аховы здаро'ўя ў месячны тэрмін правесьці санітарны нагляд у дзіцячых дамах і мэд. агляды ўсіх дзяцей. Вывезьці зь дзіцячых дамоў хворых дзяцей (эпілептыкаў, сіфілітыкаў, цяжка–сухотных), зьмясьціўшы іх па спэцыяльным лячэбным установам. Наркамсабезу правесьці такую–ж работу ў адносінах калек"[3].

Увесну 1934 году ў Беларусі пачаўся рашучы наступ на беспрытульнасць. 27 красавіка былі зацверджаны "Прапановы Камісіі Бюро ЦК КП(б)Б па пытанні ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці", згодна з якімі ліквідаваць гэтую з'яву ў гарадах БССР меліся да 15 траўня 1934 году[4]. У тым жа годзе кіраўнік Маскоўска–Беларуска–Балтыйскай чыгункі дакладаў першаму сакратару ЦК КП(б)Б Гікалу і старшыні ЦВК Чарвякову аб беспрытульнасці на буйных чыгуначных вузлах

Беларусі: “По Орше: стационарный детприемник, рассчитанный на 10—12 человек, обычно содержит по 25—30, т.к. городской детприемник вследствие перегрузки не принимает ребят... на вокзале создается невыносимое положение. Детприемник превратился в очаг сыпного тифа, давшего вспышку в 12 человек беспризорных и несколько человек обслуживающего персонала, в том числе охраны... Минский стационарный приемник находится еще в худших условиях. Рассчитанный максимально на 6—8 человек, состоящий из необорудованного вагонного кузова, он совершенно не разрешает вопроса борьбы с беспризорностью на ст.Минск... По стационарным детприемникам в пределах Белоруссии (особенно Орше) много бездомных ребят из белорусских деревень. На этот контингент необходимо направить особое внимание, размещать их по детдомам, т.к. пребывание их в общих с беспризорными приемниках нецелесообразно”[5]. У 1934 годзе, такім чынам, назіраўся значны наплыў беспрытульных. Якія ж прычыны выклікалі гэтую з’яву, на думку тагачаснага кіраўніцтва Беларусі? — “ЦК адзначае значнае павялічэнне дзіцячай беспрытульнасці, асабліва ў буйных прамысловых цэнтрах з прычыны дрэннай пазашкольнай работы школ, слабай работы піонэрскіх і комсамольскіх арганізацый, зусім няўважлівых адносін да гэтай справы з боку прафсаюзных арганізацый, недастатковай папулярызацыі пытанняў комуністычнага выхавання сярод дарослых, рабочых і бацькоў”[6].

Праз год — 19.04.1935 г., ацэньваючы вынікі выканання пастановы ад 27.04.1934 г., А.Р.Чарвякоў павінен быў канстатаваць: “Это постановление на то время было выполнено. За 1934 год пропущено через приемники БССР беспризорных и безнадзорных детей около 7000 человек. Однако, несмотря на это, в настоящее время по БССР опять имеется уличная детская беспризорность, насчитывающая около 500 человек беспризорных и до 1000 безнадзорных детей... Изучение их состава показывает, что они являются преимущественно детьми раскулаченных и высланных, либо умерших кулаков, детьми репрессированных и высланных в судебном или административном порядке родителей, а также детьми обедневших единоличников, бросивших свое хозяйство и семью. Небольшую группу составляют дети вдов,

разведенных и др. категорий материально не обеспеченных одиноких женщин. Не прекращается также приток детей, убегающих из детских домов вследствие плохой постановки работы в этих детских домах". Далей у тым жа лісце А.Р.Чарвякоў адзначыў некаторыя змены ў савецкім заканадаўстве, якія далі магчымасць больш эфектыўна змагацца са злачыннасцю: "... существовавшее до последнего времени законодательство не разрешало подвергать изоляции малолетних правонарушителей моложе 14–ти летнего возраста. Все это значительно ослабляло борьбу с детской преступностью. В настоящее время опубликованы два постановления Правительства Союза ССР и в развитие их постановление правительства БССР, направленные на усиление борьбы с хулиганством и детской преступностью. Эти постановления требуют усиления борьбы против хулиганства, поножевщины, допуская распространение мер судебного воздействия на общих основаниях и по отношению к малолетним правонарушителям начиная с 12–ти летнего возраста"[7].

Некаторыя з мясцовых чыноўнікаў, магчыма, адчуўшы натхненне пасля прыняцця названых пастановаў, пайшлі яшчэ далей. З дакладной запіскі сакратара Мінскага гаркаму КП(б)Б Рыскіна першаму сакратару ЦК Гікалу: "Постановление ЦИК СССР о борьбе с детской преступностью вызвало широкий отклик среди трудящихся гор.Минска... Кроме ряда мероприятий по городу необходимо принятие мер к прекращению бесцельной передвижки беспризорных детей по железной дороге, присылка их в гор.Минск из районов, что до сих пор еще продолжается, и срочное открытие специального дома для трудно–воспитуемых детей до 12–ти лет"[8].

А зараз затрымайцеся на хвіліну і паспрабуйце адказаць: ведаеце каго–небудзь з сучасных дзяцей "да 12 гадоў", якія не былі б "цяжкімі для выхавання"?

У 1935 годзе ў БССР было 93 дзіцячыя дамы і прыёмнікі, у якіх знаходзілася 8525 чалавек[9].

8 ліпеня 1935 году на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б разглядалася дакладная запіска наркома ўнутраных спраўаў БССР Леплеўскага, дзе паведамлялася наступнае: "... мы вскрыли ряд фактов избиения детей в Минском, Бобруйском и Витебском детприемниках. Сейчас, при более детальном

ознакомлении с жизнью детприемников, мы столкнулись с новыми фактами массового избиения детей и другими издевательствами в названных приемниках, а также в г.Гомеле. ЭТИ ФАКТЫ ВСКРЫВАЮТ ЖУТКУЮ КАРТИНУ СПЛОШНЫХ ИЗДЕВАТЕЛЬСТВ НАД ДЕТЬМИ...[10] ...систематически избивали детей за опоздание к ужину, к обеду, за невыход на утреннюю зарядку, за грубость со служащими детприемника и т.п. Детей били по лицу, головам, по шее, драли за уши, заставляли есть траву, песок, кал... В настоящее время производится проверка, не было ли избиения детей в Оршанском, Полоцком и Могилевском детприемниках". У пастанове Бюро ЦК КП(б)Б па гэтым пытанні гаварылася аб неабходнасці строгай судовай адказнасці ўсіх вінаватых, а таксама аб пасылцы ў прыёмнікі на пастаянную працу прадстаўнікоў партыі і камсамолу[11].

Як ужо адзначалася, некаторыя з дакументаў, дзе закраналіся пытанні беспрытульнасці, мелі супярэчлівы характар. На працягу некалькіх гадоў партыйнае кіраўніцтва было павінна адзначаць чарговыя перамогі над беспрытульнасцю і адначасова канстатаваць рэальны стан справаў, з мэтай дамагчыся яго паляпшэння. Таму, напэўна, у адной з сумесных пастановаў ЦК КП(б)Б і СНК БССР у 1935 годзе гаварылася: "В условиях непрерывного улучшения материально–культурного положения трудящихся города и деревни и производимого государством отпуска огромных средств на содержание детских учреждений, наличие беспризорных детей в столице и других городах объясняется плохой работой местных советских органов и партийных, профессиональных и комсомольских организаций". І тут жа, праз некалькі старонак, чытаем наступны пункт: "Обязать НК Социального Обеспечения, т.Марусевич, перестроить работу касс общественной взаимопомощи колхозов так, чтобы содержание детей–сирот и помощь детям колхозников, впавших во временную нужду, считать одной из важнейших задач"[12].
"Велізарных дзяржаўных сродкаў" на ўсіх не хапала. Іх не хапала і праз тры гады — такую выснову можна зрабіць, калі ўзяць чарговую пастанову беларускіх ЦК і СНК ад 4.05.1938 г. Тут разгледжаны пытанні выканання пастановы маскоўскага кіраўніцтва, прынятай яшчэ 1.06.1935 г. у мэтах ліквідацыі

беспрытульнасці і паляпшэння становішча дзіцячых дамоў у БССР. Вось некаторыя з пунктаў: “... даручыць Саўнаркому і Наркомасветы БССР к 1 верасня 1938 г. стварыць два дзіцячыя дамы: адзін у Менску і адзін у Магілёве, ў якіх устанавіць утрыманне дзяцей на сродкі бацькоў... арганізаваць масавую растлумачальную работу сярод калгаснікаў і на прадпрыемствах — сярод рабочых аб выкананні пастановы ЦВК БССР ад 6 студзеня 1938 г. “Аб парадку перадачы дзяцей на выхаванне (патранат) у сем’і працоўных”... Ва многіх дзіцячых дамах зусім слабая дысцыпліна, нізкая паспяховасць у вучобе; ў радзе дзіцячых дамоў працвітае хуліганства, кражы, пабегі і інш. СНК БССР і ЦК КП(б)Б лічаць зусім неправільнай практыку Наркомасветы БССР у справе размеркавання выпускнікоў дзіцячых дамоў, выражаючуюся ў агульным прымацаванні да прадпрыемстваў альбо навучальных устаноў без уліку жадання і інтарэса дзяцей, не ствараюцца для іх нармальныя бытавыя і матэрыяльныя ўмовы”[13].

“Крайнімі”, як бачым, у шэрагу выпадкаў заставаліся працаўнікі асобных наркаматаў, а не тыя, хто рабіў вялікую палітыку. Цікавая сітуацыя склалася ў 1935 годзе, калі ў Крамлі разглядаўся праект адной з найбольш “фундаментальных” пастановаў цэнтральнага кіраўніцтва па ліквідацыі беспрытульнасці. Сталінскія наркомы, відаць, добра разумелі, што той, каго зараз зробяць адказным за не вельмі ўдзячную справу “сяброўства з дзецьмі”, павінен будзе змагацца з беспрытульнасцю да канчатковай перамогі, а іншыя тым часам будуць атрымліваць узнагароды на больш пачэсных франтах барацьбы за сацыялізм. Таму адбіваліся як маглі. У праекце, напрыклад, было запісана: “Считая совершенно нетерпимым положение, когда на улицах, особенно столиц и крупных городов, имеют место безобразные хулиганские выходки детей и подростков (драки, оскорбления взрослых, езда на трамвайных буферах и т.п.), возложить персональную ответственность на милицию за установление нормального и культурного порядка на улицах городов и за обеспечение должного поведения детей во всех общественных местах”. Па гэтай пазіцыі ўзніклі спрэчкі. Нарком унутраных спраў Генрых Ягода выказваў сваю думку: “Возражаю против редакции второй части п.12. Упор на милицию неправилен, ибо дело не в милиции, которая может изымать и изымает

хулиганствующих детей только по мере наличия мест для их размещения. Поэтому я считаю, что упор должен быть направлен на безусловный прием органами Наркомпроса изымаемых милицией детей". Старшыня Дзіцячай камісіі пры УЦВК Мікалай Сямашка пярэчыў: "Целиком стою за оставление п.12, ибо милиция совершенно недостаточно борется с хулиганством"[14].

Асобныя непаразуменні паміж кіраўнікамі існавалі і ў Беларусі. Нарком унутраных справаў БССР Берман 9 ліпеня 1937 году скардзіўся першаму сакратару ЦК Шаранговічу на тое, што пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 15.01.1936 г. часткова супярэчыць іх жа папярэдняй пастанове ад 19.06.1935 г., і таму ўстановы наркамату асветы атрымалі магчымасць не прымаць у дзіцячыя дамы ўсіх беспрытульных, якіх затрымлівае міліцыя[15]. Але тых, хто адмаўляў у прыёме, можна і зразумець — на іх у канчатковым рахунку ляжаў абавязак не толькі выхоўваць, але і забеспечваць дзяцей усім неабходным. Возьмем, напрыклад, чарговую пастанову Бюро ЦК ад 28.10.1938 г. Больш за дзесяць год рашуча змагаецца партыя з беспрытульнасцю і ўсё ж: "ЦК КП(б)Б установлено, что во многих детских домах БССР дети не имели обуви, осенне–зимней одежды, постельных принадлежностей, что ведет к срыву учебы в школах и заболеванию детей"[16].

Былі і іншыя цяжкасці. У адным з паведамленняў на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б адзначалася: "В Демьяновском детском доме Ветковского района из–за плохого досмотра за детьми имела место массовая заболеваемость детей стригучим лишаем, чесоткой, кровавым поносом и т.д. Детский дом обслуживает фельдшер, который лечит от всех болезней. При осмотре детей он не надевает халата, не моет рук, грязными пальцами осматривает глаза детей... В Заозерском детском доме Сенненского района после вскрытых прорывов в прошлом году РК ЛКСМБ установил шефство, послав туда группу комсомольских работников без достаточной проверки их состава. В результате этого детский дом был доведен до полного развала. Заведующий, бывший член ЛКСМ, оказался жуликом. Воспитатель Д. развращал воспитанниц и находился в половой связи с воспитанницей Л., о чем знали все служащие и дети. Средства подсобного хозяйства заведующий расходовал на пьянки с воспитателями, а детей кормил исключительно

перловой крупой... В Мстиславльском школьном детском доме воспитатель принуждал к сожительству девочек, являясь ночью к ним в спальню и всячески притесняя их, когда они ему отказывали. Все это установлено судом и виновник осужден на 8 лет. В школьном доме II концентра дети на протяжении последнего месяца устраивали два раза “бунты”, били стекла, посуду, ломали мебель в виде протеста против существующих порядков. Заведующий раскрадывал детское имущество, а также “в педагогических целях” поставил в спальню девочек свою кушетку, где спит во время дежурства... В дошкольном детском доме обнаружена чрезвычайная засоренность чуждым элементом. Там работали: дочь попа, дочь исправника, дочь помещика, дочь урядника, дочь городского головы, бывший городской голова, бывшая монашенка того монастыря, в здании которого размещен этот детский дом”[17].
Перад пачаткам вялікай айчыннай вайны ў БССР было 156 дзіцячых дамоў, з іх 29 дашкольных. Агульная колькасць выхаванцаў — 14404 чалавекі[18].
* * *

Гэтак, праблема з педагагічнымі кадрамі была далёка не апошняй для дзіцячых дамоў. А што адбывалася ў той жа час у звычайных школах? І тут назіраліся падобныя цяжкасці. Агульную сітуацыю даволі добра, на наш погляд, адлюстроўвае адна з апошніх у мірны час пастановаў Бюро ЦК КП(б)Б, прынятая 10 чэрвеня 1941 году “О директорах средних и неполных средних школ БССР”. У ёй адзначалася: “Наркомпрос БССР, имея в своей системе около 6 тысяч учителей с высшим образованием, во многих случаях назначал директорами средних и неполных средних школ, не имеющих высшего образования и опыта педагогической работы. Из 894 директоров школ Белоруссии, работающих в настоящее время, только 497 имеют высшее образование. Из 2848 директоров неполных средних школ республики с высшим образованием только 239 человек. Многие партийные и советские организации часто без ведома Наркомпроса и его местных органов увольняли директоров школ, перемещали на работу не по специальности, назначали директорами школ лиц “провалившихся” на другой работе и не имеющих опыта

учебно–воспитательной работы с детьми”[19]. Калі на дваццаць першым годзе савецкай улады ў Беларусі прымаецца такая пастанова, дык, напэўна, “келіх цярпення перапоўніўся”, а неабходнасць нешта змяніць у сістэме дзіцячай асветы стала відавочнай.

Прывядзем яшчэ некалькі прыкладаў.

У сакавіку 1935 году прэса пісала аб судзе над настаўнікам Бельскай школы, які абвінавачваўся ў згвалтаванні вучаніцы. Суд адбываўся ў Крычаве. Дзяўчына, не вытрымаўшы ганення ў школьным калектыве, загубіла сябе. Паведамлялася таксама, што ў мінулым годзе некаторыя настаўнікі гэтай школы “сістэматычна разбэшчвалі” старэйшых вучаніц, а дырэктар, сумесна з групай настаўнікаў і піянерважатым, наладжваў п’янкі замест антырэлігійнай працы[20]. Падобны выпадак адбыўся ў тым жа годзе і ў адной са школ Пухавіцкага раёна, дзе дырэктар фактычна пакрываў амаральныя паводзіны настаўніка ў адносінах да 15–гадовай вучаніцы. Фармальна меры былі прыняты толькі тады, калі дзяўчына павінна была зрабіць аборт, пра што “даведаўся ўвесь раён”[21]. У 1933 годзе дырэктар Міхнавіцкай няпоўнай сярэдняй школы згвалціў 13–гадовую вучаніцу, пасля чаго каля году жыў з ёй, абяцаючы “жаніцца, калі яна скончыць школу”. Усё гэта ведалі настаўнікі. Як вынік, дырэктар быў зняты з работы, выключаны з камсамолу і аддадзены пад суд, а педагагічны калектыў цалкам расфармаваны[22].

Тое, што вышэйшае кіраўніцтва Беларусі ў 30–я гады вельмі сур’ёзна ставілася да праблем выхавання, бачна з наступнай справы, якую разглядаў асабіста першы сакратар ЦК КП(б)Б М.Ф.Гікала. 21 сакавіка 1935 году кіраўніцтва НКУС БССР данасіла яму: “... отдельные школьники гор.Минска, связанные с несовершеннолетними преступниками, посещают притоны разврата, принимая участие в сбыте краденных вещей... В притонах несовершеннолетние преступники устраивали кутежи на деньги, вырученные от сбыта ворованных вещей, и на эти кутежи привлекали некоторых школьниц гор. Минска... Из признаний школьниц в Городском Отделе Народного Образования установлено, что они в пьяном состоянии имели половую связь с несовершеннолетними ворами, от которых получали вознаграждения”. Нельга не адзначыць, што тут жа ў справе, побач з пратаколамі паседжанняў Бюро ЦК КП(б)Б,

падшыты асабісты дзённік адной з гэтых дзяўчынак. Тут запісана, дзе і пры якіх абставінах яна сустракалася з “фартовымі пацанамі”, а таксама ўражанні ад гэтых сустрэч. Вось, напрыклад, некаторыя з радкоў, якія чыталі ў сакавіку 1935 году ў ЦК КП(б)Б: “Я сегодня барахолила с Колькой. Мы взяли такси и катались долго. Коля профундил 16 рублей. В такси мы очень бузили. Я думала, что машина перевернется. Когда я вылезла с машины, то у меня кружилась голова...”[23]. Дзённік, дарэчы, пісаны ў звычайным школьным сшытку. На вокладцы надрукаваны партрэт У.І.Леніна і яго ж словы: “Если я знаю, что знаю мало, то добьюсь того, чтобы знать больше”. Лозунг гэты, здаецца, занадта літаральна ўспрымаўся некаторымі дзяржаўнымі мужамі БССР.

Але размовы пра “сацыялістычнае выхаванне нашай будучыні” весці значна лягчэй, чым ажыццявіць яго на практыцы. У разгляданы перыяд аб’ектам выхавання зрабілася ўжо пакаленне, якое нарадзілася пры новым грамадскім ладзе, ніякага іншага не ведала, таму чарговыя недаробкі ўсё цяжэй было спісваць на “перажыткі цёмнага мінулага”. Як жа выхоўвалі дзяцей савецкая школа і савецкая вуліца? “В Минске на Революционной улице, № 4, живет некий темный элемент неизвестной профессии, который систематически созывает к себе детей, в том числе учеников 17 школы, и рассказывает им контрреволюционные рассказы, анекдоты. Он продает ученикам старую враждебную литературу, беря с них по 15 копеек за экземпляр”[24]. (З дакладной у ЦК).

На XV з’ездзе КП(б)Б у студзені 1934 году дэлегат Галкоўскі гаварыў:

“... Совершенно правильно указал товарищ Гикало, что мы очень слабо руководим нашим третьим поколением. А если вы помните, то в рапорте пионеров говорилось, что они, в свою очередь, недостаточно руководят октябрятами. А ведь это вина комсомола. Партия доверила нам воспитание третьего поколения и мы обязаны во что бы то ни стало этот пробел в своей работе ликвидировать”[25]. “Трэцяе пакаленне”, такім чынам — дзеці піянерскага ўзросту, першае і другое, адпаведна — члены партыі і камсамольцы. Чаму ж такая вялікая ўвага надавалася партыяй 10—12–гадовай “малечы”? А таму, напэўна, што ніякае на самой справе гэта пакаленне не “трэцяе”, а першае і адзінае. Першае “цалкам савецкае”

пакаленне беларусаў, якое ўжо нешта з сябе ўяўляла, і больш таго — часам вельмі актыўна дзейнічала! Вось што сказаў на тым з'ездзе сам М.Ф.Гікала па пытанні працы з піянерамі: "... имейте в виду, товарищи, что то положение школы, которое мы имеем (плохая организация дела с целым рядом националистических антисемитских выступлений, когда молодежь в школе доходит чуть ли не до фашистских разговоров иногда) — это говорит об исключительно слабой работе комсомола по руководству этим детским движением, имеющим величайшее значение"[26].

Кіраўнік КП(б)Б вёў размову не на пустым месцы. У ЦК ведалі аб найбольш характэрных выпадках праяўлення антысемітызму ў БССР. Вось, напрыклад: "В Негневичской школе Борисовского района выявлены факты антисемитизма по отношению к двум молодым учительницам–еврейкам т.т.Гордон и Лосик. Дело дошло до того, что ученик Телюк отказывался отвечать на вопросы учительницы Лосик. Директор школы т.Шупеня (член партии) в присутствии учеников начал кричать на т.Лосик, называя ее плохой учительницей за то, что она не может выговорить ясно букву "р"[27].

14 кастрычніка 1933 году група вучняў Слаўненскай чыгуначнай ФЗС зрабіла напад на яўрэйскую школу — разбілі мэблю, шкло, на сценах школы напісалі "антысеміцкія контррэвалюцыйныя лозунгі". У мясцовай камсамольскай ячэйцы была прынята пастанова: "... правесці растлумачальную працу сярод дзяцей, даказваючы ім, якую вялікую палітычную памылку зрабілі яны, выкінуўшы такі факт антысемітызму"[28].

У Быхаве 20 сакавіка 1935 году адбыўся напад вялікай групы вучняў, узброеных халоднай зброяй, на некалькіх яўрэйскіх дзяцей. У паведамленні адзначалася: "... асабліва шмат удзельнікаў з трэцяй, чацвёртай і чыгуначнай школ... З іх боку былі чутны воклічы з контррэвалюцыйнымі лозунгамі, з якімі яны сюды і прыйшлі: "Бі жыдоў"... адным з кіраўнікоў гэтай справы з'яўляўся вучань трэцяй школы, сын адказнага работніка, старога бальшавіка". Далей паведамлялася, што гэта ўжо другі такі выпадак "у агульна–гарадскім маштабе", але і зараз дадзенаму факту не надаецца належная ўвага. Дырэктар чацвертай школы Фрумкіна фактычна ўзяла пад сваю апеку

хуліганаў, каб толькі ўтрымаць назву “ўзорнай школы”. А між іншым, тут і раней былі выпадкі контррэвалюцыйных выступленняў вучняў (распяванне антысавецкай песні аб чэлюскінцах)[29].

Наступная група дакументаў дае падставы для разважання аб тым, што ў краіне пераможнага сацыялізму гадаваць дзяцей у сям’і было, магчыма, не лягчэй, чым у іншых, “больш адсталых”.

Сярод матэрыялаў ЦК КП(б)Б захаваліся некалькі тысяч лістоў грамадзян Беларусі, накіраваных у 1930–я гады сакратарам ЦК. Гэта заявы, скаргі, просьбы, прапановы і г.д. Прывядзем некаторыя з найбольш характэрных дакументаў, адпаведных нашай тэме.

Удава Я.Л.Яцунаса, які быў членам партыі і “чырвоным партызанам” у часы грамадзянскай вайны, звярталася да сакратара ЦК Валковіча з просьбай аб павелічэнні пенсіі: “Мой муж умер 10 января 1935 года. Осталось четверо детей не одетых и не обутых. Даже когда дети хотели идти провожать последний раз своего отца, то не было чего одеть. Соседи со двора принесли старые пальто и валенки своих детей. Придя с кладбища пришлось все вернуть, после чего дети заболели и пролежали месяц — трое дома, а четвертый в туберкулезном детском санатории. И теперь старший ребенок — 11 лет, больной. Питать нечем. После смерти мужа получаю пенсию 101 руб. 95 коп., чем трудно питать больных туберкулезных детей, и у самой за последнее время расшатались нервы”[30].

Былы супрацоўнік Акадэміі Навук БССР І.М.Лушчыцкі 28 студзеня 1940 году звяртаўся да першага сакратара ЦК П.К.Панамарэнкі з просьбай аб матэрыяльнай дапамозе. Ён паведамляў, што быў арыштаваны, каля двух гадоў знаходзіўся пад следствам, потым вызвалены: “... за время моего нахождения под стражей тяжелые испытания перенесла и моя семья. В результате материальных и других лишений умер годовалый сын. Ввиду тяжелых квартирных условий, созданных моей семье после моего ареста, на общей кухне при небрежном обращении соседей мою четырехлетнюю дочь обожгли кипятком. Она получила ожоги 3 степени и болеет уже второй месяц... Ввиду болезни детей жена долгое время не работала — не было кому досматривать детей. Жена для целей лечения детей и существования все распродала, вплоть до моей

библиотеки и постельного белья”[31].
З ліста былога старшыні Халопеніцкага раённага выканаўчага камітэту А.Р.Кіша кіраўнік БССР даведаўся, што той таксама быў арыштаваны, а пасля працяглага “следства” вызвалены ў лютым 1940 году: “... двадцать месяцев издевательств надо мной, о которых я подробно хочу рассказать лично, вырвали от меня физическое здоровье и потерю моей ни в чем не повинной семьи. За эти двадцать месяцев нахождения под стражей и плохих условий по отношению к моей семье жена покончила самоубийством (повесилась), двое детей остались беспризорными”. На дакуменце ёсць рэзалюцыя П.К.Панамарэнкі: “Вызвать ко мне”. У выніку А.Р.Кіш атрымаў тры пуцёўкі ў Барысаўскі санаторый ЦК КП(б)Б і 2000 рублёў[32].
У верасні 1939 году з Беларусі ў Чырвоную армію быў прызваны па мабілізацыі значны ўзроставы кантынгент — 1901—1920 гадоў нараджэння[33]. Сярод іх было шмат людзей сямейных. У адной з даведак вайсковага аддзела ЦК КП(б)Б адзначаны цікавы факт: “В период проведения мобилизации в сентябре 1939 году и в период действий РККА на Финляндском фронте трудящиеся Советской Белоруссии проявили подлинный советский патриотизм. Так, например, военнообязанный колхозник колхоза “Вторая пятилетка” Брагинского района Демченко Иван Иванович, несмотря на то, что его жена в час ночи родила ребенка и находилась в очень плохом состоянии, с чувством патриота своей социалистической родины явился во время — в 2 часа ночи в сельсовет”[34].
Сем’і мабілізаваных павінны былі атрымліваць дзяржаўную дапамогу, але, як сведчаць дакументы, з–за бюракратызму мясцовых установаў вельмі часта гэтага не адбывалася[35]. Некаторыя сем’і, такім чынам, былі пастаўлены на мяжу галечы. Маці чатырох дзяцей, жонка чырвонаармейца Максіма Марціновіча з г.Барысава не дабілася ад гарадскіх улад вырашэння свайго пытання. У адчаі яна звярнулася да камісара часткі, дзе служыў яе муж: “... мне отвечают: что Вы хотите, нужно идти на работу, детей в ясли... в чем их доставить зимой, если все босые, голые, все разутые, если в доме не имеется даже ватного одеяла... Мне всю жизнь сгубила эта двойня, за которых я все силы теряю и кормлю таких детей грудью из–за того, что им не могу купить литр молока. Разве я

могу их кормить грудью при таком плохом питании. Не жалею сама себя и ращу таких два бойца, которые в один день пойдут на защиту родины взамен своего отца. Я прошу у Вас совета, что мне делать в таком положении и с такими малыми детьми, если одному 8 лет, ходит в школу, этим остальным — 3 году и по году двое”[36].

Сакратар Палескага абкаму паведамляў у дакладной запісцы П.К.Панамарэнку: “... выявлен факт: у мобилизованного красноармейца Фещенко Степана Филипповича после смерти жены осталось трое детей от 5 лет до 3 месяцев. Родственник обратился к председателю райисполкома об оказании помощи и устройства детей, но тот до вмешательства обкома никаких мер не принял. В настоящее время дети определены”[37].

Такім чынам закрывалі справы — “дети определены”. Цяпер гэта ўжо мінулае. Прыйшоў час больш пільна ўгледзецца ў лёсы тых, хто нарадзіўся амаль адначасова з савецкай дзяржаўнасцю, тых, хто з матчыным малаком усмактаў новыя правілы жыццёвай гульні.

“Трэцяе пакаленне” — гэта пакаленне нашых бацькоў.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4, вопіс 2, справа 107, аркуш 123;
[2] НА РБ, ф.4, воп.8, спр.13, арк.793;
[3] НА РБ, ф.4, воп.8, спр.97, арк.14;
[4] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.157, арк.164;
[5] НА РБ, ф.4, воп.15, спр.80, арк.3;
[6] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.157, арк.167;
[7] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.152–153, 155;
[8] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.146–147;
[9] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.97;
[10] Так вылучаны дадзены сказ у арыгінале (машынапіс);
[11] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.249, арк.92, 148–153;
[12] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.190, 195–196;
[13] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.651, арк.175;
[14] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.173–174, 177;
[15] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.423, арк.24–25;
[16] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.622, арк.26;
[17] НА РБ, ф.4, воп.19, спр.14, арк.29; ф.4, воп.3, спр.244, арк.158;

[18] НА РБ, ф.4, воп.27, спр.357, арк.7;
[19] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.1200, арк.62;
[20] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.94;
[21] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.125;
[22] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.121, 131–132;
[23] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.233, арк.141–142, 153;
[24] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.81;
[25] НА РБ, ф.4, воп.2, спр.108, арк.274;
[26] НА РБ, ф.4, воп.2, спр.107, арк.182;
[27] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.81;
[28] НА РБ, ф.4, воп.14, спр.148, арк.6, 8;
[29] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.244, арк.140–144;
[30] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.239, арк.295;
[31] НА РБ, ф.4, воп.21, спр.2217, арк.177;
[32] НА РБ, ф.4, воп.21, спр.2219, арк.63–65;
[33] НА РБ, ф.4, воп.37, спр.8, арк.94;
[34] НА РБ, ф.4, воп.37, спр.14, арк.69;
[35] НА РБ, ф.4, воп.37, спр.12, арк.50;
[36] НА РБ, ф.4, воп.37, спр.12, арк.52–53;
[37] НА РБ, ф.4, воп.37, спр.14, арк.17.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гуманістыка да 3 кесту 4(5)-1999

Андрэй Екадумаў
Пад апекай сярэдняга брата

Андрэй Екадумаў — беларускі філёзаф, аўтар дысэртацыі «Сацыядынаміка сучаснай экасьвядомасьці й дыялёг культур».
У ARCHE–«Вялікая айчынная вайна» выйшаў ягоны артыкул «Великая Отечественная: миф плюс история».

Сацыяльная сістэма заўсёды выпрацоўвае пэўны, адпаведны сабе тып персоны, нейкага „сярэдняга чалавека“, які на справе ніколі не сустракаецца, але ж — не сустракаецца ў чыстым выглядзе. Сярэдні чалавек, як нейкі культурны ўзор, складовы вобраз прадстаўніка пэўнага грамадства, нягледзячы на ўсе постмадэрнізмы і мультыкультуралізмы, існуе ў кожным з нас. Гэты пазбаўлены персоны, але ж неабходны дзеля існавання любой асобы агент сацыяльна-культурнага асяроддзя стабілізуе грамадства. Ён акрэслівае межы прынцыпова мажлівага для большасці гэтага самага грамадства; большасці, якая і існуе як большасць толькі таму, што ва ўсведамленні людзей жыве безасабовы чалавечы стандарт, які быў створаны соцыякультурнай сістэмай і які стварае гэтую сістэму.
Наяўна амаль што незаўважны, твор і вытворца звычаяў, саміх па сабе зразумелых, *сярэдні чалавек культуры* жыве, паводле Аўгуста Фрыдрыха фон Гаека, паміж розумам і інстынктам. Але ж абавязковая сувязь сярэдняга чалавека культуры са сваім соцыякультурным светам стварае магчымасць адсачыць яго праз сістэму, разам з якой ён існаваў і эвалюцыянаваў.

Сярэдні чалавек замест старэйшага брата
Хоць каму і грэе сэрца ўспамін пра Вялікае княства Літоўскае,

але ж мы, сённяшнія, паходзім з часоў савецкіх. У Савецкім Саюзе існавала моцная ідэалогія, на падставе якой панавала своеасаблівая соцыякультурная граматыка. Іншымі словамі, над усімі культурнымі актамі была надбудавана культурная метамадэль — ідэальны ўзор, у адпаведнасці з якім ацэньвалася наяўнае грамадства і кожны чалавек у ім. Савецкая ідэалогія будавалася адначасова на супрацьлеглых ідэях казарменнага калектывізму і гуманізму і не мела дачынення да сапраўднай жыццёвай рэчаіснасці, аднак яна стварала нейкае поле ў культурнай прасторы, дзе Оруэлаў старэйшы брат меў магчымасць існаваць. Калектыўны старэйшы брат у вобразе татальнай партыі-дзяржавы ці персаналізаваны ў правадыры меў як быццам гістарычнае абгрунтаванне свайго вяршэнства і ўлады, свайго права сачыць за табой і ацэньваць цябе ў адпаведнасці з патрабаваннямі таталітарнай культурнай метамадэлі. Улада старэйшага брата была абгрунтавана ў марксісцка–ленінскім запавеце. Гэта была перш за ўсё ўлада ідэі, вучэння, якое слушнае і таму ўсемагутнае. Асабістая і амаль абсалютная ў межах чалавечых магчымасцяў улада Сталіна ці іншых таталітарных дыктатараў грунтавалася ў значнай ступені на падпарадкаванні іх чалавечай улады ўладзе бесцялесных, але ж вельмі ўплывовых на цялесны свет ідэй. Улада ідэй з цягам часу і зменай пакаленняў, з выкрыццём неадэкватнасці камуністычнага светапогляду і росквітам дваядумства нарэшце сышла на нішто. У апошнім пункце гэтага аслаблення — выбух нацыяналістычных і дэмакратычных рухаў на тэрыторыі СССР і Ўсходняй Еўропы, распад Савецкага Саюзу і крах камуністычнай ідэалогіі. Добра загнілая яшчэ ў часы застою, камуністычная метанарацыя знікла, камуністычная мадэль соцыякультурнай арганізацыі страціла дадатак „мета“ і зрабілася мадэллю ў мазаічным мностве іншых жыццёвых граматык. Але ж шматлікія стылі і тэхналогіі існавання, звязаныя з гэтай мадэллю і некалі ёй падпарадкаваныя, не зніклі, бо, акрамя культурных граматык, адпаведна з правіламі якіх будуецца жыццё, трансляцыя культурных клішэ ажыццяўляецца праз мімесіс. Старэйшы брат, увасабленне камуністычнай граматыкі, быў дапоўнены сістэмай соцыякультурных прыярытэтаў у сферы арганізацыі бытавых паводзін, якія засвойваюцца без першапачатковага засваення нейкай сістэмы пісаных правілаў, дапоўненыя тым

самым сярэднім чалавекам культуры, сярэднім братам, які судзіць цябе не зверху, а з таго самага ўзроўню, на якім ты знаходзішся.
Наш сярэдні чалавек–культурны ўзор фармаваўся пад націскам татальнай ідэалогіі, пад наглядам недасягальнага, на ўзроўні Бога, ідэальнага эсхаталагічнага правадыра-старэйшага брата, да якога сярэдняй сацыяльнай шрубкай ніколі не ўзняцца. Запаветы правадыра сярэдні чалавек можа толькі выконваць, прымаць, як запаветы і волю Госпада, але ж такая падпарадкаваная пазіцыя зусім не выключае пэўнай актыўнасці верніка, якая будзе накіравана на сцвярджэнне вышэйшай волі і праўды старэйшага брата, на вынішчэнне іншых воляў і праўдаў. І вось, нарэшце, наш старэйшы брат памёр, — але ж сярэдні брат жыве, і памяць не збіраецца, наш сярэдні чалавек культуры таталітарнага грамадства. „Сярэдні брат назірае за табой!“ — вось лозунг сучаснасці.
Пазіцыя старэйшага брата як назіральніка-кантралёра духоўнага стану асобы такая: „Ці адпавядаюць твае думкі і паводзіны вышэйшаму над усімі закону, які адзін я дасканала ведаю і маю права тлумачыць?“ Пазіцыя сярэдняга ж брата: „А ці падобны ты да мяне, ці падобны да ўсіх, як я, правільных?“ Так, у першым разе, мы атрымаем забарону ўсіх партый, акрамя кіруючай, крымінальнае пераследаванне сэкс–меншасцяў і адміністрацыйна–крымінальныя санкцыі супраць несанкцыянаванай мастацкай і літаратурнай дзейнасці, у другім — жаданне стрыгчы ўсіх валасатых, выказванні ў духу „кожны мужык павінен“ і „павінен быць парадак“, упартую ўпэўненасць ва ўласным праве і здольнасці судзіць аб усім на свеце з адзіна правільнага пункту гледжання. Але ж сярэдні брат і чалавек–маса Артэгі–і–Гасэта не адно і тое ж, няхай яны і блізкія. Бо сярэдні брат можа панаваць і ў мысленні чалавека з эліты — той сярэдні чалавек культуры таталітарнага грамадства, сярэдні чалавек, што генетычна звязаны з сацыяльна-псіхалагічнымі матрыцамі, увасобленымі ў вобразе старэйшага брата.

Улада генеральнай лініі
Адным з найбольш стабільных міфаў постсавецкай Беларусі застаецца міф аб высокай адукаванасці беларускага насельніцтва. Гэты міф падтрымліваюць і прадстаўнікі

афіцыйных структур, і значная частка апазіцыйна накіраваных інтэлектуалаў. У апошнім выпадку высокая адукаванасць насельніцтва як бы пацвярджае еўрапейскасць Беларусі. Між тым неяк выпадае з–пад увагі, што інтэлігенцыя класічнага, расейскага ці, няхай, расейска–беларускага ўзору вынішчана, а інтэлектуал заходняга ўзору за апошнія дзесяць гадоў проста не паспеў распладзіцца.

Сачы за сабой. Таталерантнасць
Мабыць, неўсвядомленая схільнасць да сацыяльнага механіцызму стварыла той тып нацыянальнага адраджэння, які мы назіралі на працягу постсавецкага часу і назіраем зараз. Новыя грамадска–палітычныя рухі, якія адхілілі ад улады камуністычную партыю ў краінах СНД і Балтыі, нібы выпісалі тутэйшым беларускім правадырам адраджэння беспрацэнтны гістарычны крэдыт — нібы перамога нацыяналістычнаму і дэмакратычнаму руху пасля зыходу са сцэны старэйшага камуністычнага брата гарантавана аўтаматычна, гарантавана самой гісторыяй. Сучасны стан беларускай культуры нават і без параўнання з краінамі Балтыі ці Польшчай сведчыць якраз аб супрацьлеглым. Канечне, заўсёды можна казаць, што „наш час яшчэ не надышоў“, але няма і ніякіх гарантый, што такі час надыдзе ўвогуле. Сярэдні брат, архетыповы персанаж беларускай ментальнасці, трымаўца генеральных ліній кантролю па сацыяльнай гарызанталі, стварыў, стварае і працягне ствараць сабе вертыкальнае дапаўненне — старэйшага брата.

Ацані ! 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - ...
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту

Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

гуманістыка да Зьместу 4(5)-1999

Вольфганг Закс
Зямля вачыма астранаўта

Вольфганг Закс — доктар сацыяльных навук, старшы навуковы супрацоўнік Вупэртальскага Інстытуту клімату, навакольнага асяродзьдзя і энэргіі. Ганс–Яхім Шнэльнгубэр — доктар прыродазнаўчых навук, прафэсар тэарэтычнай фізыкі Патсдамскага ўнівэрсытэту, дырэктар патсдамскага Інстытуту дасьледаваньня кліматычных наступстваў.

Пра спакусу кіраваньня сьветам у экалёгіі

Магчымасьць гаварыць пра „выратаваньне плянэты“ мы заўдзячваем арганізацыі, якую ніяк не западозрыш у сувязях з экалёгіяй — NASA. Ад 1966 году, калі касьмічны зонд *Lunar 2* на шляху да Месяца перадаў па радыё першыя здымкі Зямлі, у нашым уяўленьні зьявілася плянэта як рэальна існуючы аб’ект. Раптам яна сталася бачнай для кожнага, вось яна паўстала сярод чорнага сусьвету: ахінутая мяккім сьвятлом куля з мораў, кантынэнтаў і аблокаў. Пагляд з космасу стварыў Зямлю як аб’ект — аб’ект захапленьня, выратаваньня ці нават кіраваньня.

Найбольш зьдзіўляльным эфэктам касьмічнай оптыкі, зноў і зноў апяваным астранаўтамі, было зьмяншэньне Зямлі, драматычны пералом ува ўспрыманьні: Зямля, калісьці невымерна вялікая, памяншаецца да памераў ручнога мяча. Сапраўды — пераварот пэрспэктывы! Чалавек падаецца вялікім, а Зямля — малой: прапорцыя чалавека і Зямлі на вочы астранаўта папросту перакуленая з ног на галаву. Адлегласьць ад Зямлі, створаная магутнай рэактыўнай цягай — вось тое, праз што рэальны стан рэчаў зрушваецца і паўстае ў

перакуленым выглядзе. Гэта робіць даступным успрыманьне, якое не стасуецца болей зь людзкімі адчуваньнямі, і ўмагчымляе такое ўяўленьне пра сьвет, якое грунтуецца не на рэальных, а на ракетнатэхнічных прапорцыях.
Якое значэньне набывае такі пункт гледжаньня, калі ён стаецца звычным, нават уважаецца за натуральны? Груба кажучы, за апошнія дзесяцігодзьдзі паўсталі дзьве розныя рэакцыі. З аднаго боку, пра Зямлю гавораць мовай сэнтымэнтальнай трывіялізацыі: паглядзіце, якая яна маленькая і ўразьлівая, ёй трэба наша ўвага і дагляд! Зь іншага боку, чуваць галасы чалавечай усемагутнасьці, якія кажуць: паглядзіце, якая Зямля невялікая і даступная, яе можна асвоіць і трымаць пад кантролем! Абодва матывы — „клопату“ і „кантролю“ — могуць зьлівацца, самым наглядным чынам, бадай, у вобразе пацыента ў рэанімацыі. Таму таксама і Гансу–Яагіму Шнэльнгубэру прыпісваецца азначэньне „пацыент Зямля“.

Гегемонія глябальнага

Здымак Зямлі ёсьць прадуктам гістарычна ўнікальнага напружаньня сілаў. Рэактыўная тэхніка, тэхналёгія касьмічных палётаў, апрацоўка дадзеных і оптыка былі аб’яднаныя ў вялізную, надзвычай магутную тэхнічную сыстэму, каб паслаць чалавека на Месяц. Вядома, зь цягам часу касьмічныя палёты сталі менш відовішчнымі, але энэргатэхнічнае пераадоленьне сілы цяжару, пагляд з далечыні пры дапамозе сэнсарнай тэхнікі і высокадакладная сыстэма апрацоўкі дадзеных ёсьць перадумовамі самой магчымасьці гаварыць пра „Зямлю як сыстэму“.
Тое, што ад самага пачатку прываражыла назіральнікаў — гэта сынаптычная веліч карціны. Відаць проста ўсё: рэкі і горныя ланцугі, моры і выспы, пустэльні і пасы лясоў — і, урэшце, бачным робіцца круглае аблічча Зямлі цалкам. Гэтак касьмічная тэхніка працуе як макраскоп; яна забясьпечвае тое ўсёбачаньне, якое зрабіла здымак візуальнай асновай глябальнага мысьленьня. Творчая сіла карціны палягае ў тым, што зь фізычнага гледзішча адзінства Зямлі падаецца важнейшым за ейныя асобныя структуры, а з палітычнага гледзішча супольнасьць людзей падаецца важнейшай за іхныя

асобныя інтарэсы. Можна было б безь перабольшаньня сказаць, што перад вачыма астранаўта глябальнае набывае анталягічны прыярытэт перад лякальным.
Здымак Зямлі ёсьць эпістэмалягічным грунтам таксама і навукаў пра „глябальныя зьмены“, і той „геакібэрнэтыкі“, якая трызьніцца Патсдамскаму інстытуту кліматычных дасьледаваньняў ды роднасным інстытуцыям у іншых краінах[1]. Аб’ектам іхнага дасьледаваньня ёсьць „сыстэма Зямля“.
Таксама і тут дзейнічае прыярытэт глябальнага перад лякальным. Калі два дзесяцігодзьдзі таму эколягі пераймаліся пераважна асобнымі прыроднымі зонамі, прыкладам, азёрамі, пустэльнямі, трапічнымі лясамі, плыткаводзьдзямі ўздоўж берагу Паўночнага мора, дык плянэтарныя навукі дасьледуюць біясфэру як усеабдымную экасыстэму. Праблемы накшталт зьнікненьня лясоў на Барнэа, эрозіі глебы на сярэднім захадзе ЗША ці зьмяншэньне рыбных рэсурсаў Пэру аналізуюцца з гледзішча іхнага значэньня для глябальнай прыроднай дынамікі, аднак іхнае лякальнае/рэгіянальнае значэньне застаецца недастаткова асьветленым. Экалягічныя крызы пры гэткім разглядзе лёгка клясыфікуюцца паводле іхнай плянэтарнай рэлевантнасьці, адылі іхная сацыяльная рэлевантнасьць — тое, што яны абмяжоўваюць жыцьцёвыя магчымасьці тамтэйшых людзей — саступае на задні плян.
Як у дыягностыцы, так і ў тэрапіі дамінуе глябальнае. Але з канстатацыі таго, што лякальныя праблемы, прыкладам, аўтамабілі ў Нямеччыне, маюць глябальныя наступствы, зусім не абавязкова вынікае, што і стратэгіі мусяць грунтавацца на глябальным падыходзе. Яшчэ ў выказваньні „мысьліць глябальна, дзейнічаць лякальна“ ўтрымлівалася разуменьне таго, што глябальнай адказнасьці павінна папярэднічаць ініцыятыва на месцы. З улікам гэтага таксама і Шнэльнгубэрава выснова аб тым, што глябальныя крызы вымагаюць „тэхнічнай інструкцыі на Зямлю“ для „плянэтарнай тэхнікі бясьпекі“, — глябалістычная памылка.
Аднак гэтая схільнасьць да глябалізму ўласьцівая ўсім „global players“. Геакібэрнэтыку, такім чынам, можна разумець як прыватны — у межах экалягічнай навукі — варыянт таго пераходу да іншай эпохі, намёк на які ўтрымліваецца ў лёзунгу „глябалізацыя“. Транснацыянальныя прадпрыемствы, інтэрнэт, сьвет сродкаў масавай інфармацыі — усе разам гэтыя рэчы

спрыяюць думцы, што глябальнае ёсьць сур'ёзным, а лякальнае — у лепшым выпадку — наіўным. Як вынікае са здымку плянэты, абсяг іхных апэрацыяў распасьціраецца ажно да межаў Зямлі, прычым нацыянальныя, рэгіянальныя і лякальныя супольнасьці часта апынаюцца ў ролі перашкодаў ці матар'ялу для гульняў. Таму ня дзіва, што сацыяльныя канфлікты — ад паўстаньня індзейцаў у Ч'япас праз спрэчкі пра беспрацоўе ў Нямеччыне да вулічных пратэстаў у Джакарце — усё больш працятыя напяцьцём паміж глябальнымі патрабаваньнямі і лякальнымі правамі. Урэшце, пэўныя рэчы паказваюць на тое, што тут вымалёўваецца цэнтральны канфлікт наступнага стагодзьдзя. Усе праекты будучыні, у тым ліку праект геакібэрнэтыкі, павінны будуць чытацца менавіта ў гэтым сьвятле.

[1] *Wissenschaftlicher Beirat Globale Umweltverδnderungen (WBGU)*: Welt im Wandel: Herausforderung fьr die deutsche Wissenschdft, Berlin 1996, S. 21 і далей).

Бесчалавечныя веды

На здымках плянэты відаць усё: рэльеф горных ланцугоў удзень і агні гарадоў уначы, але не людзей. Занадта вялікая адлегласьць, занадта шырокае поле зроку; амаль шэсьць мільярдаў людзей, што жывуць на гэтай плянэце, зусім не відаць. Больш за тое: няма таксама культураў і нацыяў, ідэалёгіяў і інтарэсаў, успамінаў і спадзяваньняў, карацей, суцэльнай чалавечай рэальнасьці. Перахоплівае дыханьне сьвет як фізычны аб'ект, але не як перапляценьне цывілізацыяў. Здымак плянэты робіць бачнай Зямлю, але сьвет — нябачным. Таму ня дзіва, што і першыя крокі геакібэрнэтыкі выдаюць на тое, быццам яна маніцца кіраваць „касьмічным караблём Зямля", ня надта зважаючы на пасажыраў. Увага дасьледчыкаў накіроўваецца пераважна на вывучэньне і апісаньне дынамікі бія–геа–хімічных кругазваротаў у акіянах, глебе, вэгетацыі, атмасфэры і антрапагеннага зьмяненьня гэтай дынамікі. Ход ідзе пра рэкі энэргіі і ўзаемадзеяньне плыняў, каэфіцыенты адбіцьця і рэшткавую канцэнтрацыю газаў, але толькі зрэдзьчас пра сусьветны рынак і эканамічны рост, мадэлі спажываньня і няроўнасьць, крызы разьвіцьця і пасткі беднасьці. Вывучаць

зрушэньні ў мэтабалізьме Зямлі, каб пазначыць „пэрспэктыўныя кірункі“ сацыяльнага разьвіцьця, — гэта, вядома, вельмі пазнавальнае прадпрыемства, але ў лепшым выпадку палова справы. Як вядома, прыродзе досыць абыякавая экалягічная крыза; гэта людзі павадуюць яе, церпяць ад яе і мусяць яе пераадольваць. „Пагляд астранаўта“ вядзе да няправільнага кагнітыўнага пачатку: экалягічная крыза падаецца найперш праблемай прыроды, а не праблемай грамадзтва.

Як часта здаралася ў гісторыі інструмэнтаў пазнаньня, магутнаму ўзмацненьню ўспрыманьня адначасова спадарожнічае ягонае скарачэньне. Гэтак, мікраскоп павялічвае кавалак рэчаіснасьці, але рэзка звужае поле зроку. Пагляд астранаўта, наадварот, максымальна павялічвае поле зроку, але тут губляецца глыбінная рэзкасьць. У абодвух выпадках аб’ект вызваляецца ад ягонага кантэксту; мікраскапія выключае кантэкст рэчаў праз рэдукцыю, тымчасам як макраскапія распушчае яго ўва ўсёбачаньні. З гэтай прычыны глябальныя веды заўсёды могуць быць толькі статыстычнымі ведамі, далёкімі ад рэальнага жыцьця і ачышчанымі ад нагляднага досьведу.

Насамрэч мову геакібэрнэтыкі складаюць колькасныя велічыні, матэматычныя мадэлі і дыяграмы. Яна праектуе рэальнасьць, якую складаюць горы дадзеных, але ня людзі. Гэтыя дадзеныя не дазваляюць даведацца, чаму туарэгі вымушаныя вычэрпваць свае апошнія вадзяныя сьвідравіны ці чаму немцы так любяць ганяць па сваіх аўтабанах. Яны нічога ня кажуць пра тое, каму належыць трапічны лес, які сплаўляецца па Амазонцы ці чые індустрыі нажываюцца на забруджваньні Міжземнага мора. Такім чынам, прадукуюцца веды, якія ня маюць твару і месца жыхарства, абстракцыя, за якую даводзіцца плаціць істотную цану: замоўчваньне ў экалягічнай дыскусіі такіх рэчаў, як культура, улада і дабрачыннасьць. Такія веды даюць, бадай, лічбы, але не кантэкст; яны паказваюць дыяграмы, але ня дзейных асобаў; яны ўтрымліваюць разьлікі, але ня этыку; яны скіраваныя на стабільнасьць, але не на прыстойнае жыцьцё.

Эліту — да стырна

Зусім як сапраўдным астранаўтам, геакібэрнэтыкам пагражае

найвялікшая небясьпека, калі яны зноў занураюцца ў зямную атмасфэру. Адстаронены пагляд з далечыні, вось яшчэ бязважка скіраваны на Зямлю, трапляе ў моцныя турбуленцыі, калі набліжаецца да Зямлі, каб разгледзець магчымасьці да дзеяньня ў сьвеце людзей. Таксама і мэтафара пра рулявога (грэц.: *kybernetes*) ня можа схаваць гэтую слабасьць: пачынаючы ад Плятона, гутарка пра дзяржаўны карабель і палітыка ў якасьці рулявога служыць забесьпячэньню ўлады кампэтэнтных людзей і патрабаваньню даверу да іхнага навігацыйнага майстэрства[2]. Але хто кіруе? Хто ёсьць глябальным суб'ектам? Шнэльнгубэр тут робіцца шаманам глябальнай сьвядомасьці. Воля чалавецтва для яго, здаецца, узьнікае ў працэсе апляценьня электроннай сеткай паднацыянальных дзейных асобаў, накшталт злучэньняў дзяржаваў і няўрадавых арганізацыяў. Адразу прыгадваюцца філёзафы кібэрпрасторы, якія вітаюць узьнікненьне „глябальных мазгоў" (*global brain*) як новую ступень комплекснасьці эвалюцыі. Але ж чыя, уласна кажучы, воля тут абвяшчаецца воляй чалавецтва?
У расколатым сьвеце, дзе бальшыня людзей змагаецца за ваду і штодзённы хлеб, тут можа мецца на ўвазе толькі вузкая праслойка глябальнай спажывецкай і інфармацыйнай эліты, магчыма, толькі тыя тры працэнты, якія зараз маюць доступ да кампутару. У кожным выпадку, ані АБСЭ, ані ААН, ані няўрадавыя арганізацыі не рэпрэзэнтуюць чалавецтва; яны прадстаўляюць у лепшым выпадку глябалізаваную меншасьць заможных. Якая, праўда, любіць займаць глябальную пазыцыю назіральніка ды інтэрпрэтаваць собскія інтарэсы і пункты гледжаньня як глябальна сапраўдныя. Хто занадта проста робіць скачок ад плянэтарнага аналізу да плянэтарнага чыну, непазьбежна схіляецца да таго, каб уважаць транснацыянальных дзейных асобаў за ўвасабленьне сусьветнага розуму. Э наадварот: транснацыянальныя дзейныя асобы, што не разглядаюць у якасьці абсягу сваёй дзейнасьці нічога меншага за зямную кулю, непазьбежна схіляюцца да таго, каб уважаць геакібэрнэтычныя веды за аб'ектыўныя і вызначальныя. Бо, адцягнутыя ад месца і ачышчаныя ад зямных канфліктаў, гэтыя веды прапануюць агульны агляд плянэты, яны запрашаюць да разыгрываньня сцэнароў сусьветнага маштабу — і гэтак ствараюць ілюзію таго, што глябальныя стратэгіі могуць быць пасьпяховымі.

[2] *Мьnkler, H.*: Politische Bilder, Politik der Metaphern, Frankfurt a.M. 1994, S.126.

Экакратыя — нежыццяздольны праект

Сёньня спадарожнікі, перадача дадзеных і кампутарнае мадэляваньне даюць навуковай экалёгіі падставы да ажыўленьня амаль ужо забытых амбіцыяў. З таго часу, калі Фрэдэрык Клемэнц у ЗША трыццатых гадоў імкнуўся ўвасобіць свае тэхнічныя веды пра абарону глебы ў праграмах рэформаў сельскай гаспадаркі, ці калі Г. Эвэлін Гатчынсан на пачатку пяцідзясятых гадоў у якасьці ўдзельніка *Масу–Konferenzen* спадзяваўся з дапамогай кібэрнэтыкі пасунуць наперад таксама і рацыянальныя сацыяльныя рэформы, экалёгія не цураецца тэхналягічных праектаў. Навукова–тэхнічны дызайн, маўляў, павінен заступіць месца палітыкі. Падбадзёрваная шматабяцальнымі вынікамі віртуальнай сымуляцыі, гэтая мара зноў прарастае і зараз падымаецца геакібэрнэтыкай на глябальны ўзровень.

Аднак калі ў зьвязку з паглядам астранаўта высоўваецца яшчэ і нейкая пэрспэктыва кіраваньня, дык супярэчнасьці тэхнакратычнай амбіцыі адразу кідаюцца ў вочы. Шнэльнгубэрава візія ня надта саступае ганьбаванай ім саманадзейнасьці плянавальнікаў пачатку ХХ стагодзьдзя. Прыкладам, ён уяўляе сабе, што можна садоўніцкім чынам фармаваць вэгетацыйнае покрыва кантынэнтаў ці ўвесьці плянаваньне прасторы ў маштабах усёй зямной кулі. Пад уражаньнем ад глябальнай пэрспэктывы ён схіляецца да таго, каб разглядаць усю Зямлю ў якасьці арэны экалягічна эфэктыўнага плянаваньня, на якой месцы энэргетычнай і аграрнай вытворчасьці будуць выбірацца паводле іхных прадукцыйных перавагаў з гледзішча экалёгіі. Нібыта выкарыстаньне Зямлі не зьнітаванае з тысячамі традыцыяў, культураў і сацыяльных структураў! У гэтым сэнсе ідэя плянаваць выкарыстаньне прыроднага капіталу ў глябальным маштабе ня вельмі адрозьніваецца ад ідэі плянаваць выкарыстаньне грашовага капіталу ў глябальным маштабе. Менавіта забясьпечаная ракетнай тэхнікай адлегласьць назіральніка ад аб'екту робіць тут злы жарт з мысьленьнем: здаецца, што ўсё можна перасоўваць, нават у найвялікшых маштабах. Так успрыманьне, згубіўшы сувязь зь людзкімі

меркамі, вядзе да праектаў дзеяньняў, што ляжаць па–за межамі людзкой рэальнасьці. Таму мэты глябальнага кіраваньня навакольным асяродзьдзем непазьбежна ляжаць на курсе калізіі з самавольствам грамадзтваў і іхнымі прэтэнзіямі на прызнаньне і дэмакратыю.
Магчыма, гэтую небясьпеку меў наўвеце д–р Лаўлак, якога прафэсар Шнэльнгубэр прыцягвае ў якасьці аўтарытэту, калі даліў вады ў віно геакібэрнэтыкі наступнымі словамі: „Хутчэй казёл зробіцца садоўнікам, чымся людзі змогуць стаць садоўнікамі Зямлі“[3].

[3] *Lovelock, J.*: Planetary Medicine, у: *Resurgence*, Sept. — Oct. 1991, S. 38–45.

Пераклаў зь нямецкай Алесь Пяткевіч
паводле: Jahresbuch Цkologie, 1999.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999

[image]
[image] *Перакладчыкі ў 4(5)-1999* .
[image]
[image][image][image][

Сьпі, выратавальнік наш прыйдучы:
у абладзе фюрэра і дучэ
спадзяемся толькі на цябе!

Некалі ў варожым навакольлі
возьмесься з расою за касьсё
беларускай мовы, і ніколі
не забудзеш, што вучыў у школе:
геній у адказнасьці за ўсё!

Зьведаеш, што значыць акавіта,
і спазнаеш посьпех у кабет;
станеш апранацца самавіта,
станеш выражацца сакавіта,
станеш карыстацца з алфавіта
і забудзеш слова „альфабэт“…

Хрызаліда, кукалка, каўшанка,
запарука крылаў матыльку,
дурню — радасьць, знаўцу — абяцанка, —
слухай, як лунае калыханка
на халодных крылах скразьняку.

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

лірыка да Зьместу 4(5)-1999

Бога Бабулькі

— **П**рабачце, можна сесьці і разам з вамі побач
на сонца паглядзець? —
кабета ўжо старая на ўскраек лаўкі села,
дзе бабка ў бармe друзлай у промнях косьці грэла.
— Як цудна! — Дык, канечне, ня тое, што ў зямельцы
на могілках ляжаць!
Наўкола сьнег паліўся ды сінюкі сьпявалі,
дзьве бабці нетаропка гамонку зачыналі.
— Настаўніцай у школцы усё жыцьцё рабіла,
ды што тут гаварыць, —
я хатняй гаспадарцы вучыла ў ёй дзяўчынак,
па ўзросту скараціліпайшла на адпачынак.
— А я была забойцай, па турмах вандравала, —
такое вось быцьцё, —
за тое, што аднойчы забіла дзесяць хлопцаў
я дваццаць год з калючай драцінай праз ваконца
на сонейка глядзела, і ўсё ж такі шкадую,
што не забіла больш.
— Табе з душой зайздрошчу, ты дай мне, баба, веры, —
Заўжды жадала стрэліць, — ды зачыняла дзьверы…

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

філязофія да зьместу 4(5)-1999

Тэадор Адорна
Пра традыцыю

Тэадор Візэнгрунд Адорна (1903, Франкфурт–на–Майне — 1968) — нямецкамоўны філёзаф (*Zur Metakritik der Erkenntnistheorie*, 1956; *Negative Dialektik*, 1966), сацыёляг і мастацтвазнавец, найперш музыказнаўца (*Philosophie der neuen Musik*, 1949; *Musikalische Momente*, 1964). На беларускую мову Адорна перакладаецца ўпершыню. Цікава, што на французскую мову дагэтуль цалкам перакладзеныя толькі ягоныя “Музычныя моманты”.

1.

Слова “традыцыя” паходзіць ад *tradere* — перадаваць далей. Гаворка тут ідзе пра сувязь пакаленняў, пра тое, што пераходзіць у спадчыну з пакалення да пакалення; а таксама пра перадачу вытворчых навыкаў. Перадача далей прадугледжвае цялесную блізкасць, неспасрэднасць; так адна рука мусіць падаваць нешта другой. Непасрэднасць гэткага кшталту — гэта непасрэднасць менш ці больш натуральных стасункаў, напрыклад, сваяцкіх. Катэгорыя традыцыі па сутнасці ёсць катэгорыяй феадальнай, у тым сэнсе, у якім Зомбарт называў феадальную гаспадарку традыцыяналісцкай. Традыцыя застаецца ў супярэчнасці з рацыянальнасцю, хоць гэтая рацыянальнасць стваралася ў ейных межах. Яе асяродак утварае не свядомасць, але наперад дадзены, не даступны рэфлексіі абавязковы характар грамадскіх форм, прысутнасць таго, што мінула; паміжволі гэта перанеслася і на духоўныя аб’екты. Традыцыю ў вузкім сэнсе нельга замірыць з буржуазным грамадствам. Прынцып мены эквівалентаў, як і

прынцып прадуктыўнасці, хаця і не падарвалі прынцып сваяцтва, але падпарадкавалі сабе сям'ю. Інфляцыя, што паўтараецца праз кароткія прамежкі часу, сведчыць, наколькі анахранічнай стала ідэя спадкаемнасці і што духоўнае таксама аказалася не вельмі ўстойлівым перад крызісамі. Такая непасрэднасць перадачы з рукі ў руку ў выразах, якімі акрэсліваецца традыцыя, паказвае толькі адсталасць грамадскага механізму ўніверсальнага пасрэдніцтва, у якім дамінуе таварны характар рэчы. Тэхніка даўно забылася на руку, якая яе стварыла і працягам якой яна ёсць. Спалучыўшыся з тэхнічнымі сродкамі вытворчасці, рамяство страціла гэтулькі ж субстанцыяльнасці, як, напрыклад, і паймо навучання рамяству, якое было паклікана дбаць пра захаванне традыцыі, а менавіта традыцыі канчатковай. У такой радыкальна буржуазнай краіне, як Амерыка, з гэтага зрабілі ўсебаковыя высновы. Традыцыя — гэта хутчэй нешта падазронае альбо імпартны тавар з уяўнай вартасцю таго, што рэдка страчаецца. Там, за акіянам, адсутнасць традыцыянальных момантаў і звязаных з імі досведаў тармозіць усведамленне часавай кантынуальнасці. Тое, што тут і цяпер не выяўляе рынкавай спажывецкай вартасці, не мае значэння і падлягае забыццю. Нават калі хто-небудзь памірае, то гэта адбываецца амаль так, нібы яго ніколі не было; ён абсалютна замяняльны, як усё функцыянальнае; немагчыма замяніць толькі тое, што пазбаўлена функцыі. Адсюль роспачныя і архаічныя рытуалы бальзамавання. Яны пакліканы з дапамогай магіі пераадолець страту часавай свядомасці. Але гэтая страта карэніцца перш за ўсё ў саміх грамадскіх адносінах. Ва ўсім гэтым Еўропа не пераўзыходзіць Амерыкі, якая магла б там у яе вучыцца традыцыі, але ідзе ейным шляхам, а для гэтага ўвогуле непатрэбнае перайманне. Неаднаразова канстатаваны крызіс любой гістарычнай свядомасці ў Нямеччыне, аж да элементарнага няведання таго, што адбылося зусім нядаўна, гэта адно сімптом небяспечнага стану рэчаў. Найбольш відавочнай для людзей становіцца страта суцэльнасці часу. Тое, што час быў улюблёнай тэмай філасофіі, сведчыць, што ён пакідае душы людзей; італьянскі філосаф Энрыка Кастэлі разважаў пра гэта ў адной са сваіх кніг. На страту традыцыі рэагуе і ўсё сучаснае мастацтва. Яно згубіла гарантаваную традыцыяй відавочнасць сваіх адносінаў

з прадметам, з матэрыялам, а таксама і відавочнасць сваіх метадаў развіцця; яму даводзіцца зрабіць іх аб'ектам рэфлексіі. Робіцца відочнай унутраная вычарпанасць, ілюзорнасць традыцыйных момантаў, і вядомыя мастакі разбіваюць яе, нібы гіпс молатам. Тое, што можна было б вызначыць як інтэнцыю да апрадмечанасці, нясе ў сабе імпульсы, варожыя традыцыі. Нараканні на гэта, устаноўка на выратавальнасць традыцыі ёсць прыкметай бяссільнасці і супярэчыць сутнасці традыцыі. Рацыянальнасць мэтаў, роздумы пра тое, як добра было б валодаць традыцыяй у сапраўды альбо ўяўна дэфармаваным свеце, не можа ўвесці нешта, што скасавана рацыянальнасцю мэтаў.

2.

Рэальна страчаную традыцыю не заменіць эстэтычны сурагат. А менавіта да гэтага імкнецца буржуазнае грамадства. Прычыны такога памкнення такія ж рэальныя. Чым горш ягоныя прынцыпы ўспрымаюць тое, што не будзе з імі роўнае, тым з большым імпэтам спасылаюцца яны на традыцыю і апелююць да таго, што пазней, звонку, будзе прэтэндаваць на статус "вартасці". Буржуазнае грамадства вымушанае паступаць такім чынам. Бо розум, які вядзе рэй у працэсе грамадскай вытворчасці і ўзнаўлення вытворчасці і праз суд якога яно (грамадства) прапускае ўсё выраблена і існуючае, не ёсць дасканалым розумам. Нават наскрозь буржуазны Макс Вэбэр вызначыў яго як розум узаемадачыненняў мэтаў і сродкаў, а не як розум мэтаў самых па сабе; гэта ён пакінуў за суб'ектыўным, ірацыянальным волевыяўленнем. Цэлае — ва ўмовах панавання меншасці над сродкамі вытворчасці і непазбежных пры гэтым канфліктаў — становіцца такім жа бязглуздым, фатальным і пагрозлівым, як і раней. Чым больш рацыянальна злучаецца і выбудоўваецца цэлае, тым страшней узрастае яго гвалт над жывым чалавекам, а гэтаксама паглыбляецца нездольнасць розуму змяніць гэтую сітуацыю. Аднак калі ўкарэненая ў гэтай ірацыянальнасці рэчаіснасць хоча сябе рацыянальна апраўдаць, то яна мусіць звярнуцца па дапамогу да гэтай самай ірацыянальнасці, якая яе выкараняе, альбо да традыцыі, якая, як нешта неадвольнае, не дае да сябе падступіцца, становіцца фальшывай, калі да яе апелююць. Грамадства мэтаскіравана

ўжывае традыцыю ў якасці сродку распружання, у мастацтве выяўляе традыцыю як гаючую забаву, што можа своечасова супакоіць людзей, якія перажываюць атамізацыю таксама ў часе. На пачатку буржуазнай эры людзі трэцяга стану адчувалі, што прагрэсу і розуму гэтай эры, які віртуальна элімінуе любыя якасныя адрозненні паміж людзьмі, нечага бракуе. Яе паэты, прадстаўнікі галоўнай плыні, здзекваліся з *prix du progrŭs*, пачынаючы ад мальераўскай камедыі “Мешчанін у дваранстве” аж да “Familie Litumlei” Готфрыда Келера, якая дае сінтэтычныя партрэты продкаў. Уся гэтая літаратура кляймуе снабізм, іманента ўласцівы той форме грамадства, у якой фармальная роўнасць служыць сутнаснай няроўнасці і панаванню, хавае рану, на якую сыплецца соль. У рэшце рэшт традыцыя, забітая мяшчанскасцю і рознымі маніпуляцыямі, ператвараецца ў атруту. Гэтаксама натуральна традыцыйныя моманты, выдатныя мастацкія творы мінулага выраджаюцца — у той момант, калі свядомасць пачынае маліцца на іх як на рэліквію, — у складнікі ідэалогіі, якая захапляецца мінуўшчынай, каб нічога не змянілася ў сучаснасці, маўляў, змены прынясуць узрастаючую абмежаванасць і закаснеласць. Хто любіць тое, што прамінула, і, каб не ўпасці ва ўбоства, не дазваляе вырваць з сябе гэтую любоў, адначасова рызыкуе купіцца на вонкава энтузіястычныя запэўніванні ў тым, што ён не мае на ўвазе нічога благога і што з ім усё ж такі можна пагаварыць і на тэму сучаснасці.

3.

Фальшывая традыцыя, якая з’явілася амаль адначасова з кансалідацыяй буржуазнага грамадства, корпаецца ў фальшывым багацці. Яно аказала ўплыў на ранні рамантызм, але сапраўдную прыцягальнасць мела для неарамантызму. Спачатку да гэтага схіляла і паняцце сусветнай літаратуры, пазбаўленае, бесспрэчна, вузіні паняцця народнай літаратуры. Гэтае багацце фальшывае, бо — у адпаведнасці з буржуазным духам валодання ўласнасцю — яго ацэньваюць так, нібы мастак меў у распараджэнні ўсё, што ў абсягу матэрыі і мастацкіх формаў стаяла высока і дорага, раз ужо ў гэтым пераканала гісторыя. Менавіта з той прычыны, што ніводная традыцыя не з’яўляецца для мастака субстанцыйнай, звязваючай, кожная з іх

без супраціўлення становіцца яго здабычай. Гегель меў гэта на ўвазе, даючы вызначэнне новаму мастацтву, якое называў рамантычным; Гётэ не адмаўляўся ад яе, адно сёння алергія на традыцыю кладзе ёй канец. У той час калі для незалежнага мастака ўсё ўяўнае застаецца адкрытым, выкапнёвыя скарбы зусім не ідуць яму на карысць, як на гэта яшчэ апошнім часам, але ўжо інакшым чынам, спадзяваліся неакласіцыстычныя плыні, напрыклад, у сваёй позняй літаратурнай творчасці Жыд і Както. Калі мастак знаходзіць ім ужытак, то стварае твор рамесніцкі, вылушчвае з культурных дабротаў — што супярэчыць ягонаму ўласнаму стану — пустыя формы, якія немагчыма напоўніць: таму што аніводнае аўтэнтычнае мастацтва ніколі не напаўняла формы. Пасля распаду традыцыі мастак перажывае яе хутчэй праз супраціў, які аказвае яму нешта традыцыйнае, калі хоча запанаваць над ім. Тое, што ў самых розных мастацкіх медыях сёння называецца рэдукцыяй, падпарадкоўваецца досведу, згодна з якім нельга скарыстаць нічога апрача таго, чаго тут і цяпер вымагае форма. Прыспяшэнне зменаў мастацкіх праграм і плыняў, якое філістэр суправаджае грымасай як праяву моды, тлумачыцца ўсё большай сілай адмаўлення, што першы зафіксаваў Валеры. Стаўленне да традыцыі ператвараецца ў канон забароненых рэчаў. Ён усё больш убірае ў сябе, з павелічэннем самакрытычнай свядомасці, таксама і тое, што на першы погляд вечнае, а таксама нормы, якія, быўшы аспасродкавана або непасрэдна запазычаныя ад антычнасці, у буржуазную эпоху былі мабілізаваныя супраць распаду традыцыйных момантаў.

4.

Аднак наколькі суб'ектыўна традыцыя была расколатая альбо ідэалагічна разбэшчаная, настолькі аб'ектыўна гісторыя і надалей мае ўладу над усім, што ёсць і ўва што яна пранікла. Тое, што свет складаўся выключна з дадзеных без вымярэння глыбіні ўзнікнення — пазітыўны догмат, які часам цяжка адрозніць ад эстэтычнай рэчаіснасці, — такая ж ілюзорная думка, як і поўная веры ў аўтарытэт апеляцыя да традыцыі. Тое, што лічыцца агістарычным, абсалютным пачаткам, несвядома і таму небяспечна становіцца сапраўдным

здабыткам гісторыі; гэта бачна на прыкладзе архаізуючых анталагічных накірункаў філасофіі. Пісьменнік, які засцерагае сябе ад моманту ўяўнасці ў традыцыі і які не адчувае сваёй прыналежнасці да ніводнай з іх, тым не менш уцягнуты ў яе, перш за ўсё праз мову. Мова пісьменніка не ёсць агламератам жэтонаў, вабнасць і прыгаство кожнага слова і кожнага спалучэння слоў чэрпаюць аб'ектыўную экспрэсію са сваёй гісторыі, а ў ёй месціцца ўвесь гістарычны працэс. Забыццё, з якім некалі Брэхт звязваў ратунак, тым часам ператварылася ў механічную пустку; убоства абсалютнага "тут і цяпер" абярнулася абстрактным адмаўленнем фальшывага багацця, папросту апафеозам буржуазнага пурытанства. Часіна, пазбаўленая ўсялякага следу ўспаміну, ёсць абсалютна бяссільнай у сваёй прычэплівай думцы наконт таго, што сацыяльна апасродкаванае ёсць натуральнай формай ці натуральным матэрыялам. Гістарычныя метады, якія прыносяць у ахвяру гістарычныя заваёвы, падлягаюць па меры гэтага рэгрэсу. Такі акт мае сваю вартасць праўды толькі тады, калі адкінутыя зместы фармуюцца як акт роспачы, а не тады, калі яны тупа трыумфуюць. Ён праслаўляе дабратворнасць традыцыі, і пры гэтым рэакцыйнасць, у адрозненне ад традыцыі, будзе не толькі ідэалогіяй. Хто церпіць ад усемагутнасці таго, што толькі існуе, і песціць тугу па тым, чаго яшчэ ніколі не было, зможа адчуць большую блізкасць з выбарам на карысць паўднёванямецкага кірмашу, чым да нагрувашчання бетонных перакрыццяў, хаця ведае, наколькі моцна такое перакрыццё спрыяе кансервацыі затхласці, камплементу тэхнізаваных нягод. Як зацятая ў сабе традыцыя, так і абсалютная бестрадыцыйнасць з'яўляецца наіўнай: яна пазбаўленая адчування таго, што ў ранейшых рэчах крылася ва ўяўна чыстым, не закаламучаным парахнёй распаду стаўленні да рэчаў. Аднак забыццё ёсць агуманістычным, бо забываюцца пра шматлікія пакуты; бо след гістарычнасці ў рэчах, словах, колерах і тонах заўсёды ёсць следам перажытых пакутаў. Таму сёння традыцыя стаіць перад невырашальнай супярэчнасцю. Няма ніводнай наяўнай традыцыі і немагчыма апеляваць да яе; калі ж яна згубіць сваю моц, то пачнецца адыход да бесчалавечнасці.

5.

Гэтая антыномія вызначае магчымую пазіцыю свядомасці

адносна традыцыі. Думка Канта, што перад намі застаецца адкрытым толькі крытычны шлях, з'яўляецца адной з найбольш падмацаваных, праўдзівасць якой нашмат пераўзыходзіць абдумваныя ў той час зместы. Яна закранае не толькі адмысловую традыцыю, ад якой адхрышчваўся Кант, г. зн. традыцыю рацыяналістычнай школы, але і традыцыю ўвогуле. Не забыцца на яе і адначасова не прыстасавацца да яе, азначае ўвесці яе ў канфрантацыю з аднойчы дасягнутым станам свядомасці, самым развітым, і пытацца, што мае вызначальную сілу, а што не мае. Не існуе вечных запасаў, няма нямецкай хрэстаматыі, нават такой, якая існуе толькі ў ідэальных марах. Аднак зварот да мінулага, які не мае на ўвазе кансервацыі, сваёй непадкупнасцю дапамог выжыць не аднаму. Выдатныя традыцыяналісты мінулых пакаленняў, такія, як школа Геарга ці Гофмансталь, Борхардт і Шродэр пры любой рэстаўрацыйнай інтэнцыі адчувалі нешта такое, паколькі таму, што сур'ёзнае і масіўнае, яны аддавалі першынство перад ідэалізмам. Яны абстуквалі тэксты, прыслухоўваючыся, што адгукнецца пусткай, а што не. Яны зафіксавалі пераход ад традыцыі да таго, што непразрыстае, што не ўстанаўляе самога сябе, ім больш былі даспадобы творы, у якіх праўда была старанна расцярушана па ўсім тэксце, чым тыя, дзе яна ўзносіцца над імі ў якасці ідэалогіі і таму ўвогуле не ёсць праўдай. Аніводная іншая традыцыя не адпавядае гэтаму лепш, чым здраджаная і абсмяяная ў Нямеччыне эпоха Асветніцтва, падсподная традыцыя антытрадыцыяналізму. Але і супольная воля да ўваскрасення таксама павінна ўнесці сваю даніну. Яе пазітыўнасць стала падставай для ўсёй высокай літаратуры. Грунтоўнасць, саліднасць імітатараў Стыфтэра і тлумачальнікаў Гегеля сёння такая ж танная, як і напышлівыя жэсты. У агульнай маніпуляцыі санкцыянаванымі культурнымі вартасцямі тымчасам увасобілася тое, што нібыта не знявечана; ратуючы, знішчаюць таксама выдатныя ранейшыя творы. Яны не дазваляюць узнавіць сябе такімі, якімі яны калісьці былі. Аб'ектыўна, а не толькі ў рэфлексіі свядомасці, у сілу ўласнай дынамікі з іх спадаюць зменлівыя павалокі. Якраз гэта і ўстанаўляе традыцыю, адзіную, за якой яшчэ можна пайсці. Яе крытэрам ёсць *correspondance*. Як толькі з'яўляецца нешта новае, яна кідае святло на тое, што прысутнічае, і ад яго адбівае сваё святло. Гэткая *correspondance* не ёсць ані

пранікненнем, ані непасрэднай роднаснасцю, бо вымагае дыстанцыі. Благі традыцыяналізм адмяжоўваецца ад моманту праўды ў традыцыі з дапамогай таго, што памяншае дыстанцыю, па-блюзнерску звяртаецца да таго, што незваротна страчана, у той час калі яму даюць голас адно пры ўсведамленні незваротнай страты. Мадэллю натуральнага стасунку праз дыстанцыю ёсць бэкетаўскае захапленне “Effi Briest”. Ён паказвае, да якой ступені традыцыя, памеркаваная як *correspondance*, не зносіць традыцыяналізму як узору.

6.

Крытычнаму стаўленню да традыцыі будзе такім жа чужым жэст “гэта мяне не цікавіць”, як і саманадзейнае падвядзенне таго, што цяперашняе, пад надта шырокае гістарычнае паняцце накшталт маньерызму, патаемна паслухмянае максіме “ўсё ўжо было”. Такія дзеянні маюць нівеляцыйны эфект. Яны звязаныя з ненатуральнай верай у неперарыўнасць гісторыі і, адпаведна з гэтым, у вердыкт гісторыі; яны канфармісцкія. Там, дзе ідэасінкразія да мінулага стала аўтаматычнай, як у выпадку Ібсэна ці Вэдэкінда, яна скіроўваецца супраць таго, што не ўстанавілася, што не даразвілася гістарычна ці, як, напрыклад, эмансіпацыя жанчын, атрымала толькі частковае развіццё. У такога роду ідэасінкразіях мы сутыкаемся з сапраўднай тэмай рэфлексіі пра традыцыю, з тым, што было згубленае па шляху, занядбанае, пераможанае, і што ў выніку мае назву састарэлых рэчаў. Там шукае спатолі тое, што жыве ў традыцыі, а не ў корпусе твораў, прызначаных чыніць супраціў часу. І так пазбягае суверэннага гістарычнага разгляду, у якім фатальна скрыжоўваецца ненатуральная вера ў неперахаджаласць і жывая боязь старамоднасці. Тое, што жыццёвае ў творах, трэба шукаць у іх унутранай сутнасці, трэба шукаць наслаенні, якія былі нябачныя воку ў ранейшыя фазы і праяўляюцца толькі тады, калі іншыя адмаюць і адпадаюць. Тое, што “Абуджэнне вясны” Вэдэкінда змяшчала ў сабе эфемерныя элементы — гімназісцкую падстаўку для кніг і цёмныя прыбіральні дамоў XIX стагоддзя, невымоўную ауру вечаровай ракі ля гораду, гарбату, якую маці прыносіць дзецям на падносе, балбатню падлеткаў пра заручыны з рэферэндатарам Пфэле з лясніцтва, — нейкім неперахаджалым чынам, што заўсёды было і будзе, выяўляецца толькі тады, калі пастулаты гэтай п’есы, каб да моладзі ў пару пачыналі ставіцца паважна і з тактам, ужо

даўно былі выкананыя і сталі выклікаць абыякавасць, а без іх гэткія вобразы ніколі б не ўзніклі. Вердыкту пра састарэласць супрацьдзейнічае ўзорванне ў сутнасць рэчаў, якое яе аднаўляе. Пераадолець гэта могуць толькі такія паводзіны, якія прыносяць традыцыю ў свядомасць, але не схіляюцца перад ёй. Яе трэба ў такой жа самай меры бараніць ад шалу знікнення, як і ратаваць ад міфічнага аўтарытэта.

7.

Крытычнае стаўленне да традыцыі як сродак яе захавання ахоплівае не толькі прамінулыя рэчы, але закранае таксама і сучасную, якасна беручы, вытворчасць. Калі яна аўтэнтычная, то яна не пачнецца радасна з пачатку, не пераб'е адзін прыдуманы метад наступным. Яна хутчэй ёсць выразным адмаўленнем. Сцэнічныя творы Бэкета, парадыйныя ва ўсіх сваіх перспектывах, зынакшваюць традыцыйную драматычную форму. Вусцішныя п'ескі, у якія са зверска-камічнай сур'ёзнасцю ўціскаюцца дзьмутыя цяжары і ў якіх, урэшце, усё застаецца па-старому, з'яўляюцца рэплікамі на нарастанне і згасанне дзеяння, перыпетыі, катастрофы, развіццё характараў. Катэгорыі гэткага кшталту ёсць уяўнай надбудовай над тым, што ўзнікла, што насамрэч выклікае спачуццё і страх, над тым, што заўсёды застаецца аднолькавым. Разбурэнне гэтай надбудовы шляхам яе цялесна адчувальнай крытыкі дае матэрыял і зместы драматургіі, якая не хоча ведаць, чым ёсць тое, што яна кажа. Гэтаксама і тэрмін "антыдрама", нават калі ён мае прыкметы *clichй*, быў падабраны ўдала, як і тэрмін "антыгерой". Галоўныя персанажы — гэта ўжо толькі мігатлівыя цені суб'екта, які калісьці панаваў на сцэне. Блазнаванне, якім яны займаюцца, ёсць судом над ідэалам самаўладнай асобы, якая ў Бэкета заслужана сыходзіць на нішто. Тэрмін "абсурд", што прыняўся як азначэнне ягонай уласнай драматургіі і інспіраванай ім драматургіі, безумоўна, не можа нас задаволіць. Адносна традыцыйнага цвярозага чалавечага розуму, супраць якога тут узбуджаецца справа, ён ідзе на надта далёкасяжныя саступкі; з'яўляецца ўражанне, што абсурд выяўляе характар гэтага мастацтва, а не аб'ектыўны хаос, які яно агаляе. Згодніцкая свядомасць спрабуе праглынуць і тое, што немагчыма замірыць з ёй. Нягледзячы на гэта, нават гэткі прыкры ход не ёсць наскрозь фальшывым. Ён вызначае высокую літаратуру як канкрэтна рэалізаваную

крытыку традыцыйнага паняцця сэнсу, сэнсу руху свету, які раней падтрымлівала так званае высокае мастацтва, асабліва там, дзе яно выбірала традыцыю як свой закон. Падтрымліваючая функцыя традыцыі падлягае разбурэнню. Традыцыя сваёй уласнай экзістэнцыяй абумоўлівае: у тым, што наступае пасля ў часе, захоўваецца сэнс, які пераходзіць у спадчыну. Тая літаратура, якая лічылася навейшай, разбурае, зрэшты, па аналогіі з музыкай і жывапісам, ідэалогію такога сэнсу, які пад час катастрофы настолькі грунтоўна азначыў сваю бачнасць, што сумненне ў ім змяшчае ў сабе і сумненне ў прамінулым сэнсе. Яна дэкларуе паслушэнства традыцыі, і, больш за тое, ідзе за ёй: гамлетаўскае пытанне “быць ці не быць” яна трактуе настолькі літаральна, што хінецца да адказу “не быць”, для якога ў традыцыі ніколі не было месца гэтаксама, як у казцы ніколі не было месца для перамогі пачвары над прынцам. Прадуктыўная крытыка такога роду не вымагае папярэдняй філасофскай рэфлексіі. Яе здзяйсняюць рэагуючыя нервы мастака і іх тэхнічны кантроль. І першае, і другое сілкуецца гістарычным досведам. Кожная з рэдукцый Бэкета прадугледжвае крайнюю паўнату і сублімаванасць, ад якіх ён адхрышчваецца і якім наказвае паміраць у сметніках, кучах пяску і урнах, звяртаючыся нават да моўных формаў і дэфармаваных жартаў. Гэтаму роднасная ў новых раманістаў нястача сатысфакцый ад фікцыі такой нагналай аскомы сцэны, у якую ўсе ўзіраюцца і пра якую ўсё ведаюць. Усё гэта ўступае ў канфлікт з традыцыяй, якая выклікае раздражненне як арнамент, ілюзорнае ўваскрошанне сэнсу, які не існуе. Затое яму захоўваюць вернасць, калі не зважаюць на ягоную падманнасць.

8.

Пазіцыя аўтараў адносна крытыкі не менш дыялектычная, чым пазіцыя аўтэнтычных твораў. Паэт зусім не мусіць быць філосафам і нават не павінен ім быць. Асабліва калі пад гэтым мы разумеем блытаніну прыўнесенага звонку сэнсу, для якога слушна зарэзерваваны толькі жудасны тэрмін “выказванне”, з рэальнасцю самой рэчы. Бэкет адразу адкідае любыя развагі над уяўным сімвалічным зместам сваёй творчасці; яе сутнасным зместам ёсць тое, што вачам не паказваецца ніякая пазітыўная сутнасць. Нягледзячы на гэта, у стаўленні аўтараў да таго, што яны робяць, змянілася нешта прынцыповае. Тое,

што яны не могуць ні знайсці сябе ў традыцыі, ані лунаць у паражнечы, разбурае настолькі інтымна спалучанае з традыцыяй паняцце мастацкай наіўнасці. У немінучай рэфлексіі над тым, што магчымае і што немагчымае, у канчатковым авалоданні тэхнікамі і матэрыяламі і ў гарманічнасці іхных узаемаадносін канцэнтруецца гістарычная свядомасць. Яна радыкальна ліквідуе балаган, які Малер атаясамліваў з традыцыяй. Але ў варожа настроенай да традыцыі свядомасці таго, што гістарычна непазбежнае, таксама ўкарэнена традыцыя. Стаўленне мастака да свайго твору стала абсалютна сляпым і адначасова абсалютна празрыстым. Той, хто паводзіць сябе па-традыцыяналісцку, а менавіта такім чынам, што гаворыць, згодна са сваімі ўяўленнямі, проста з моста, маючы на мэце непасрэднасць уласнай індывідуальнасці, будзе пісаць тое, чаго ўжо нельга пісаць. Гэта, тым не менш, не трыумф “сентыментальнай” рэфлексіі мастака, тып эстэтычнага самаразумення якога ад часу класіцызму і рамантызму кантраставаў з наіўнасцю. Ён становіцца аб’ектам другой рэфлексіі, якая адбірае ў яго права вызначаць сэнс, права на “ідэю”, якое пакідаў за ім ідэалізм. Якраз настолькі развітая эстэтычная свядомасць канвергуе з наіўнай, непаняццёвы разгляд якой не высоўваў прэтэнзій на сэнс і, можа, таму часам яго ўлоўліваў. Але і на гэтую надзею нельга ўжо пакладацца. Паэзія ратуе сваю сапраўдную сутнасць толькі там, дзе пры найбліжэйшым кантакце з традыцыяй адкідае яе ад сябе. Хто не хоча пазбыцца свайго пяшчотнага шчасця, якое яна ўсцяж абяцае ў некаторых праявах, пазбыцца нявыкарыстанай магчымасці, што крыецца ў яе руінах, павінен вырачыся традыцыі, якая ператварае сэнс і магчымасць у хлусню. Традыцыя можа вярнуцца толькі ў тым, што няўмольна чыніць ёй супраціў.

З нямецкай мовы пераклаў Валерка Булгакаў паводле: Theodor W. Adorno. Ohne Leitbild. © Suhrkamp Verlag. Frankfurt am Main, 1967.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

крытыка да Зьместу 4(5)-1999

Максим Стріха Славомир Адамович: Поет із країни поза епохами та дискурсами (Славамір Адамовіч. Плавільшчыкі расы. Выбраныя вершы. — 200 с. — “Наша ніва”, 1999.)

Максім Стрыха — доктар фізыка-матэматычных навук, паэт, крытык, палітоляг, намесьнік старшыні Кіеўскага навуковага таварыства імя Пятра Магілы. Загадчык ідэалягічнага аддзелу Народна–дэмакратычнай партыі Ўкраіны (партыі Кучмы й Пуставойтанкі). Жыве і працуе ў Кіеве. У 1999 годзе ў ягоным суаўтарстве выйшла “Энцыкляпэдыя папулярнага ўкраіназнаўства”. Вялікі сябар Беларусі. Гэты тэкст быў надрукаваны ў месячніку „Критика“ (10/1999).

Років так із тринадцять тому, на світанні горбачовської перебудови, коли тільки–но почали публічно говорити про необхідність захисту української мови (використовуючи, до того ж, обережний евфемізм “посилення патріотичного та інтернаціонального виховання”), однією з вимог нашого

сміливого письменства було надати статус часопису альманахові “Сузір’я”, який друкував твори письменників з “братніх республік”.
Часописом “Сузір’я” так і не стало, а з розпадом Союзу й початком гіперінфляції припинило існування навіть у ролі неперіодичного альманаху. Але масових плачів за тим, що “брати” виявилися від нас відрізаними мовними й державними кордонами, не чути. Є проблеми гостріші — в самій Україні фактично немає літературного часопису, який видавався б скільки–небудь помітним накладом.
І все ж принаймні дві літератури сусідів далі перебувають коли не в центрі уваги наших інтелектуалів, то, принаймні, й не на самісіньких маргінесах.
Одна з цих літератур — російська. І це цілком природно, бо колишня метрополія зберігає для багатьох свій чар. Увага до білоруської літератури — дещо іншого штибу. Вона існує не так на рівні текстів, як на рівні прізвищ і подій. Помер Алєсь Адамович… Василь Биков емігрував до Гельсинкі… Уладзімер Някляєв попросив політичного притулку в Польщі…
Все це вельми чітко проектується на нашу власну ситуацію, — не так минулу, як можливу майбутню.
На жаль, як я вже казав, на рівні самих текстів білоруська література в нас практично відсутня. Лишається тільки пошкодувати за тими часами, коли “Дніпро” видавав масовим накладом прозу Уладзімера Караткевича, а в серії “Перлини світової лірики” виходив ошатний томик Максіма Багдановіча. А сьогодні маємо тільки поодинокі подачі в часописах, наклад кожного з яких не перевищує півтори тисячі, — й видану київським видавництвом “Факт” “чорнобильську” прозу Світлани Алексієвич. Втім, ця авторка є явищем не стільки національної білоруської, скільки “загальнорадянської” (хоч і дуже високоякісної) літератури. І Оксана Забужко перекладала не білоруський, а російський текст…
А білоруська література тим часом живе, — попри всі нагінки й переслідування. На дуже пристойному рівні видається тижневик “Наша Ніва”. Користуючись класифікацією нещодавно виданої “Малої української енциклопедії актуальної літератури”, часопис існує на стикові НМ та ПМ дискурсів (для тих, хто не читав епохального проекту журналу “Плерома”, розшифровую скорочення — “неомодерний” та

“постмодерний”), майже не вміщуючи ТР (сиріч “тестаментарно–рустикальних”, по–наському “назадницько–сільських”) текстів. Заради справедливості проте відзначмо, що білорусомовного села в Білорусі (на відміну від україномовного в Україні) практично не лишилося, і всі відродженьскі інспірації місцевих інтелектуалів пов’язано сьогодні чи не виключно з містами, насамперед з Мінськом і, меншою мірою, з Городнею. Існують, нарешті, цілком елітарні видавничі проекти, як–от альманах “Фрагмэнты” чи журнал “ARCHE”.

Втім, я далекий від думки, наче переконаними постмодерністами є всі, хто не втратив ще здатності читати по–білоруському. Очевидно, не плекають таких ілюзій і молоді білоруські інтелектуали. Тому, започатковуючи бібліотеку “Вострая брама” часопису “Наша Ніва”, вони поставили першою поетичною книгою збірку не якогось там “крутого авангардиста”, а підсумкову книжку Славоміра Адамовича. Відомість цього поета переступила межі, за його власним виразом, “республічки Бєларусь” ще роки три тому, коли поета було заарештовано за написання одного підбурювального з погляду влади вірша. “Аналізую: ну, в чому я не маю рації? Комусь відмовив у допомозі? Ні. Комусь сказав: придушуй їх? Ні. Навіть тих серед вашого брата, які писали: „Убий президента!“” — говорив Олександр Лукашенко на зустрічі з білоруськими письменниками у серпні 1998 року. Проте реально текст з провокативною назвою вартував поетові майже року суворого ув’язнення.

Ще більшою стала відомість Адамовича тоді, коли поет на знак протесту проти політики придушення свободи слова зашив собі голкою рота на одному з мітингів. Проте для читачів ліберальних російських чи українських видань Адамович лишався не так поетом, як одним з найяскравіших борців проти режиму “бацьки”. А поодинокі переклади й переважно політичні тексти Адамовича, які вряди–годи доводилося читати в періодиці, не давали уявлення про нього як про поета. Назву збірки “Плавільшчыкі расы” можна перекласти подвійно. “Раса” по–білоруському і “роса” (та, яка “очі виїсть”). Але водночас і “раса”, яку, за переконанням поета, ще тільки належиться виплавити на окупованих теренах, де проживає “тутейшае” білоруське населення. На користь саме такого

тлумачення назви свідчить і суто “арійська” фотографія на обкладинці (фото: оголена пара на тлі водойми, але не в еротичних, а радше цитатно–закличних позах, що навіюють спогади про “білявих бестій” та музику Вагнера).
Книгу завершує авторська прозова післямова “Сценарій тридцяти семи років”. Чесно кажучи, на мене ця поетова автобіографія справила моторошне враження. Насамперед — абсолютною випаленістю й витоптаністю культурного ландшафту, на тлі якого Адамовичу судилося жити й писати. Дитинство в глухій провінції, інтернат, ПТУ, робота в радгоспі, армія (з місяцем “губи” насамкінець), завод, “кепська історія”, яка коштувала двох років “умовно”, півроку в лікарні через набуту на заводі тяжку легеневу хворобу, навчання на філфаку БДУ, вигнання через конфлікт з викладачем–росіянином, поновлення, вигнання з роботи вже за Лукашенка, відсидка, переслідування. А між тим — шість поетичних книжок. Вже перша з них — “Кальварійські клени” (1990) — лишає враження абсолютно зрілого білоруського поета. Поета, який взявся невідь–звідки, якому, виходячи з його біографії, належалося б говорити “трасянкою”, пити горілку і сприймати літературу в кращому разі на рівні пісень Висоцького…
Щодо панівного дискурсу цієї книжки, то навіть автори МУЕАЛ, боюся, не наважилися б відразу поставити тут свій остаточний присуд. Ось її останній вірш “Жінка й початок дня”, написаний 24 січня 1999 року (тут і далі переклад з білоруської мій — *М.С.*):

Новий рік зустрів цілком однобоко,
третього січня їздив гуляти
до самотньої родом з–під Налібоків,
а сьогодні вперто снилися грати.
Підвівся не те, щоб аж надто пізно,
хоча й натомився з нічної зміни.
Ковтав від похмілля пігулки різні,
готуючи каву, попік коліно.
На дворі щулилися пішоходи:
холодний вітер, колючі сніжинки.
І тут крізь фіранку імли й негоди
Я вгледів форми гарної жінки.
Була вона вся у моєму стилі:

фігура повненька, ну й все відповідно.
Руки жінчині раму мили,
лиця за волоссям було не видно.
То ніжку ставила на підвіконня,
а то і дві, випинаючи груди.
Вперед вона ринула, наче Погоня,
Бігуді накрутивши в зачіску всюди.
Я мусив бігти в якихось справах,
та пам'ять мов витер раптовий поштовх:
чи то на мітинг до наче правих,
чи то на лівий пікет до пошти.
День починався. Хмарну шерегу
кудись несло в сніговій завії.
Я сів за стіл, розгорнув Ортегу
Й згадав про свої дитячі ще мрії.

Перед нами — типовий ПМ текст із згадкою про Ортегу й прихованою (вельми ризикованою для правовірного білоруського патріота) зоровою паралеллю: повненька жінка з бігудями в волоссі — наче та сама священна Погоня (*"Стародавню Литовську Погоню — не розбить, не спинить, не стримать!"*). Текст іронічний, навіть попри трагізм сьогоднішньої білоруської ситуації *("чи то на мітинг до наче правих, чи то на лівий пікет до пошти")*. Та все ж, насмілюся припустити, це текст навряд чи вирізнив би чимось поета на тлі сьогоднішньої білоруської (й тим більш — української) літературної панорами.

Зроблю невеликий відступ. Я цілком здатен отримати естетичне задоволення від "мужніх" (дехто скаже — "тоталітарних") текстів Кіплінга, Гумільова чи д'Аннунціо. Вони були добрі в свій час і на своєму місці — це, зрештою, визнав щодо першого з авторів навіть рафінований модерніст Т.С.Еліот у передмові до власного–таки вибору Кіплінгових поезій 1940 року.

Проте з епігонами "мужньої поезії" складніше. В мене часто викликали посмішку віршовані тексти, які з'являлися у нас на сторінках УНСОвської "Замкової гори". Йшлося навіть не про версифікаційну невправність, а радше про невідповідність проголошуваних "войовничих" цінностей до київської ситуації початку дев'яностих — доволі ліберальної і розхристаної.

Натомість сьогоднішня ситуація в Білорусі цілком інша. І термін “окупована країна” зовсім не є красивим висловом поета, з огляду на фізичні зникнення ряду провідних лідерів опозиції і звичні вже звірячі побиття міліцією менш відомих опозиційних активістів. І з цього погляду вірш Славомира Адамовича “Думаючи про гірше” зовсім не видається силуваним чи штучним:

Без мене жінкою станеш ти,
без батька народиш сина.
Мені ж на жорстоку війну іти,
я там у полі загину.

Наскрізною для поета темою є не тільки тема Війни з окупантами, але й тема Любові, жінки, заради якої варто йти воювати. Власне один з програмових поетових верлібрів (з присвятою “героям запілля”) так і називається: “Задля нашої любові”:

Ми підемо робити це сьогодні. Й весна допоможе нам. Весна увіллє в наші тіла могутню енергію кохання, любові й пристрасті. Кожен з нас покладе на рамена свою власну ношу. Ми промовлятимемо в такт крокам рядки улюблених віршів. З чоловіками поруч будуть жінки, юнакам допомагатимуть дівчата. Хтось візьме з собою букетик первоцвіту, хтось — стартовий пістолет, перероблений під дрібнокаліберні набої, а хтось, невисокий і кремезний, закине на спину заплічника з тринітротолуолом.

Після тривалих холодів прийде тепло, кулики опанують заплави, ще веселіше побіжить по деревах сік, зацвіте сон–трава, над бліндажами опорних баз затьохкає соловей.

Наша поема, на жаль, буде довгою. Але ми мусимо її дописати — задля нашої любові до Батьківщини, до наших вродливих жінок.

Ми підемо робити це сьогодні. Сміливо й стримано, ступаючи тихо і з вірою в серці. Ми вигукнемо нове гасло — “Patria o muerte!” А інакше неможливо, інакше нам буде погано. І тому ми почнемо робити це сьогодні. Обов’язково.

Наш рух територією, яка називається “Білорусь”, почався і триває під окупацією. Все, що ми робимо — робимо акцією опору. Ми чинитимемо опір задля наших жінок, бо вони

прагнуть піти за нами, але тільки за нами мужніми.
Батьківщина — це наша Велика Жінка, з її лона ми постали, в її межах хочемо знайти останнє заспокоєння. Батьківщина, Мати всього білоруського, єдиний і неповторний контекст білоруського духу. Ось за ЩО ми пишемо на шкурі ворога знаки білоруського опору.
Втім, Жінка для поета є не лише об'єктом обожнення, чи бойовим товаришем, який, в разі потреби, допоможе нести *"заплічника з тринітротолуолом"*. Ставлення до неї раз–по–раз робиться побожно–екстатичним, а сама вона набуває поганських рис чи то Берегині, чи то Валькірії:

Вона це робить із пристрастю
білої жінки арійської,
коли гіацинти квітнуть,
коли випадає сніг,
так, що в крові ворожій
холонуть еритроцити
й на сльози перевертається
нахабний чужинський сміх.

Після прочитання таких або подібних текстів розумієш Оглядача "Нашай Нівы", який ще шість років тому писав: "Адамович — „дикий" поет (дикий у сенсі — не свійський, не хатній, не приручений). Це той приклад, коли крізь поета промовляє щось незрівнянно більше, аніж він сам".
Цю сентенцію (разом з іншими відгуками — включаючи вже згадувані вище слова президента Лукашенка) за доброю європейською традицією вміщено на звороті обкладинки. І серед них натрапляєш на відгук ще одного помітного прозаїка й поета з літературного покоління вісімдесятих, Адама Гльобуса: "Коли такі люди захоплять лідерство в нашій еротичній літературі, на нас чекає похмура готика".
(Принагідно зауважу — термін "вісімдесятники" щодо цього покоління в Білорусі не прижився. Тут говорили про "третє покоління" — дітей зрусифікованих батьків–містян, які зі словником пробивалися назад до мови своїх дідів).
Але повернімося до еротики. Цитовані вище тексти дозволяють зрозуміти, що саме мав на увазі Гльобус. Проте далеко не всі еротичні тексти Адамовича — похмуро–готичні. Ось вірш з виклично–радісною назвою "Ave, homo!":

Радуйся, муже, тілу!
Вкрите засмагою, сміло
Ось воно пересувається
поміж асфальтом і небом,
дощик його поливає,
сонечко сушить і вітер,
руки підносить тіло,
показуючи пахвини,
ніжками тупцяє тіло,
а в тілі, неначе в пляшці,
кров булькоче та лімфа,
й відгукується селезінка,
з тіла робиться піфія,
тіло сміється дзвінко,
лаврами пахне тіло.

Чесно кажучи, в поезії сьогодні рідко натрапляєш на таке абсолютно здорове, не затьмарене збоченськими рефлексіями, й таке радісне ставлення до жіночого тіла. Але поет, схильний до радості буття, поставлений перед суворою білоруською дійсністю, яку він не хоче приймати:

Не хочеться бути ніким,
не хочеться бути бідним,
читать провінційний “ЛіМ”,
проходить у справі підслідним.
Не хочеться буть без води,
без сірників, мила й солі,
без мови, простої їди,
здорової жінки і волі.

Цей віршик “Не хочеться!” — справді вельми простий. В ньому немає патетичних закликів, як у, скажімо, еміграційного Некляєва, де кожна строфа інвективи до Лукашенка закінчується “Поверніть мову!”, “Поверніть герб!”, “Поверніть стяг!”. Але вірш справді вражає трагічністю — бо проблемою, на відміну від Некляєва доби його флірту з Лукашенком, є відсутність у поета не лише мови й символіки, але й *“води, сірників, мила й солі”*, не кажучи вже про *“жінку і волю”*, без яких поетам назагал ведеться вельми зле.

І таке становище дає право поетові на багато що таке, що в устах його українського сучасника виглядало б котурново й

просто смішно. Скажімо, вірш “Будьмо!” був би доречний не в кінці двадцятого століття, а радше — в романтичні часи “Весни народів” чи “Свободи на барикадах”:

Мудрі будьмо, як змії,
мов лиси — хитрі й проворні,
чисті — немов лелії
й перші у списках чорних.
Як матері будьмо ніжні,
убрані у світлі строї
жінки — ясні й дивовижні,
й мужі — наче сталь для зброї.
Теплі мов літнє сниво,
щедрі, немов на Коляди,
будьмо ні справа, ні зліва,
а там, де нам будуть раді.
Будьмо як трави в росах,
білі, мов гіацинти,
мов перші червневі покоси,
мов поклади антрациту.
Тихі будьмо, як глиця,
на гіллі ялин розлогих,
немов глибока криниця,
як перші легкі пологи.
Будьмо, сестри й братове,
разом рушаючи в наступ,
як меч, до бою готовий,
як грубий робочий заступ.

Але не провина, а біда поета, що історичний час у його Білорусі змістився. А може — хоч якою парадоксальною видасться така думка — це і його щастя, що 12 грудня 1997 року можна написати такий текст, і він викликатиме захват і співпереживання, а не іронічну усмішку?

А поки поетова автобіографія, вміщена в кінці книги, завершується без просвітку. Запис за 1998 рік: *“Занадто часто почуваюся самотнім, занадто часто любов заступає ненависть і хочеться піти висадити в повітря автомобіль”*. Запис за наступний, 1999–й: *“Живу. Моя адреса: 220013, Мінськ, вулиця Сурганова, будинок 45, корпус 3, гуртожиток, поверх 8, блок 5, кнопка дзвінка — праворуч”*.

То ж хто він є, цей Славомир Адамович: літературний провокатор, який здобув собі популярність насамперед ризикованими політичними жестами, на кшталт уже згадуваного зашивання рота (так вважає відомий білоруський поет Анатоль Сис)? Стилізатор з незвичайним “диким” хистом? Чи великий поет, якому з примхи долі судилося народитися в найменш влаштованому куточкові Європи кінця двадцятого століття, і який відтак не може грати за правилами, встановленими на тусовках при філологічних факультетах західних університетів?
Навряд чи хтось відповість із певністю на це запитання сьогодні. І навряд чи хтось із певністю передбачить, що і як саме писатиме Адамович, коли матиме змогу розгортати Ортегу вже не в гуртожиткові на околиці столиці Лукашенкаленду, а в пристойному помешканні десь у центрі респектабельної столиці постлукашенківської Білорусі. Суто по–людському хочеться побажати поетові якнайшвидше дожити до такого часу.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][ima
[image]
Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

[image]
[image] Patalohiji ъ 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

prabieida Џmiestu 4(5)-1999

Џmicier Saioљkin Иuћajedy

— **U**jaъlecni pra normu j patalohiju zaъћdy byli pytacniami жmianymi j spreиnymi. Asabliva љto datyиуж иaiavieka dy jaho sacyjalnaj dziejnaњci. Z pradstaъnikami flory j faъny nam usio bolљ–mienљ zrazumieia. My vynajљli dla koћnaha pradstaъnika navakolnaha њvietu peъnyja mieћy pavodzinaъ i paњla sami ћ abvieњcili im hetyja mieћy za normu.
Z иaiaviekam usio bolљ skiadana. Pa–pierљaje, jamu evalucyja padaravaia *Neocortex*, karu haiaъnoha mozhu. Pa–druhoje, jak byccam by niama kamu hetak ћa ћorstka, z vyљyni, davodziж nam adpaviednyja ramki. Z hetaje nahody vialikaja иastka naљych bratoъ pa bijalahiиnym vidzie ъreъniiasia ъ svajoj unikalnaњci j nieraъtornaњci. Praz uњviedamlecnie hetkaje ъnikalnaњci pastupova vykryљtalizavaiasia dumka pra, adpaviedna, asablvyja zakony ћyжcia dy ъzajemadaиyniecniaъ.

Adnak, kali razhledzieж hetuju prablemu bolљ pilna, to lohka zaъvaћyж, љto ъvieњ њviet pabudavany pavodle adnych kanonaъ. Иaiaviek u svajoj ћyжciadziejnaњci niиym nie adroџnivajecca jak ad elementarnaje kamorki (jakich jon sam utrymlivaje 10^{15}), hetak i ad usioj planety caikam. Koћny zajmaje svajo miesca ъ ћorstkaj hijerarchii prajavaъ ћyжcia. Malekuia, jakaja joњж systemaj elementarnych иaњcinak dy enerhijaъ, џjaъlajecca иastkaj fermentu. Fermenty skiadajuж arhaneiy, jakija ъ svaju иarhu budujuж kamorki. Kamorki skiadajuж orhany, systema jakich ujaъlaje џ siabie arhanizm (u tym liku i иaiavieиy).

Niahledziaиy na ъsiu raznastajnaћж pradstaъnikoъ roznych uzroъniaъ bijalahiинaj hijerarchii, bijalahiинyja pracesy va ъsich jaje ъdzielnikaъ iduж pavodle adnolkavaha scenaru. Pracesy, jakija prachodziaж u hramadztvie, zmadulavany ћho na ъzroъni elementarnych kamorak.
Kali jakaja kanstanta (ci to ъzroviec kisiarodu ъ naљaj kryvi, ci to ъzroviec aњviatlecnia ъ pakoi, ci to kurs nacyjanalnaje valuty jakoj krainy) adchilajecca ad svajho stabilnaha znaиecnia, imhnienna mabilizujucca mechanizmy, jakija namahajucca viarnuж jaje da aptymalnaha znaиecnia. Na ъsich prystupkach bijalahiинaje њpirali, иym bliћejљyja takija pakaziиyki da enerhavytvoriaњci (prykiadam, kiњlinna–iuhavaja raъnavaha nutranoha asiarodцdzia ъ mieћach asobnaha arhanizmu, kolkaћж ATF u mieћach asobnaj kamorki ci to kolkaћж zboћћa ъ mieћach krainy), tym bolљ vuzkija ramki ich vahacniaъ dy bolљ ћorstki kantrol. Vielmi cikava, љto navat na samym nizkim uzroъni arhanizacyi ћyжcia kiraъniиyja systemy majuж znaиna bolљuju stupiec abarony ad paљkodћacniaъ, иym systemy–vykanaъcy. Karekcyja ћ roznych adchilecniaъ viadziecca nie pavodle иarhi ich uцnikniecnia, a vykluина ъ adpaviednaњci z vaћnaњciu toj ci inљaj funkcyjanalnych systemaъ. Heta znaиuж, љto ъ vypadku niemahиutaњci zabiaњpieиuж funkcyjanavacnie ъsich svaich systemaъ, arhanizm budzie „adkluиaж“ ad pastavak enerhanoњbitaъ u pierљaju иarhu tyja ц ich, dziejnaћж jakich najmienљ istotnaja z punktu hledћacnia vyћyvacnia. Vyhladaje hetki vybar na pierљy pohlad vielmi dziъnym. Tak, kali pryjarytetnaje stanoviљиa sardeиnaj, lohaиnaj, centralnaj nervovaj systemaъ nie vyklikaje piareиacniaъ, dyk pierљaиarhovaje adkluиecnie systemaъ stravavacnia dy vydzialecnia moћna byio b pastaviж pad sumnieъ. Chiba moћna padsiikavaж arhanizm, adkluиuъљy stravavacnie dy adpraviъљy ъvieњ kisiarod na zabieњpiaиecnie ciahlicaъ? Chiba nie razumniej zrabiж naadvarot? Toje, љto atrymlivajecca, kali robicca naadvarot, my moћam љtodnia naziraж navokai. Jaki toik z taho, љto dziarћava nakiroъvaje svaje abmieћavanyja srodki na kaihasy dy zavody–bankruty (liиy, na padtrymku stravavacnia), adnaиasova adsiakajuиy ci „dojaиy“ zdolnyja da prybytkovaje pracy struktury (umoъna kaћuиy, ciahlicy)? Zapasy prajadajucca, ciahlicy parachniejuж.
Na lubym uzroъni lubaja systema pracuje na kaniatkovy karysny

prystasavalny vynik. Taki kanиatkovy karysny prystasavalny vynik i џjaъlajecca haioъnym systematvornym faktaram. Vahacni jaho pakazиykaъ joњж haioъnym matyvam zruchaъ uva ъsioj systemie. Dla peъnaje hrupy kamorak ћyvoha arhanizmu hetkim vynikam moћa byж pakazиyk uzroъniu enerhietyиna–plastyиnych reиyvaъ. Dla asobnaha иaiavieka heta buduж vyniki jaho dziejnaњci, jakija zadavalniajuж jaho charиovyja, abaronиyja, paiavyja dy inљyja bijalahiиnyja patreby. Na bolљ vysokim uzroъni arhanizacyi takim systematvornym faktaram mohuж byж vyniki sacyjalnaj dziejnaњci иaiavieka, psychaemacyjnyja prajavy, abumoъlenyja jaho hramadzkim dy indyvidualnym doњviedam, jaho stanoviљиam u hramadzka–ekanamiиnaj supolnaњci. Da taho ћ, padtrymacnie znaиecnia niejkaha asobnaha prystasavalnaha vyniku na naleћnym uzroъni maje na mecie ъmacavacnie nia tolki „svajoj“ systemy. Koћny, navat samy drobny, adaptacyjny praces nakiravany na „ahulnaje“ vyћyvacnie, a koћnaja, navat samaja maleckaja иastka luboj bijalahiиnaj systemy niasie hienetyиnuju infarmacyju pra niemahиymaњж adasoblenaha isnavacnia.
Hetkaja ъnifikacyja j ћorstkaja rehlamentacyja ъsich pracesaъ, љto prachodziaж u pryrodzie, joњж umovaju jaje tryvaiaњci, suprажstajacnia stresavym uџdziejacniam dy dalejљaha raџviжcia. Padtrymacnie hetaj unifikacyi na praciahu ъsioj svajoj ћyжciadziejnaњci — voњ љto џjaъlajecca adzinaj dla ъsich pradstaъnikoъ ћyvoha њvietu normaj.

Maje, lekaravy, naziracni, vymuљajuж zrabiж niesuciaљalnuju vysnovu: mienavita иaiaviek, jakomu dadziena byio heta ъsio zrazumieж, nia zdoleъ hetaha zrabiж. Chavajuиy svaje ъiasnyja intaresy za filazafavacniami pra љmatbakovaњж i nieadnaznaиnaњж koћnaje џjavy, ludzi paиali vyvodziж mutantaъ u vyhladzie „dazvolenych adchilecniaъ“, „vymuљanych paruљecniaъ“, „umoъnaje patalohii“ i hetak dalej.
Moћna kanstatavaж, љto vialikaja kolkaњж naљych suhramadzianaъ liиyж za normu kompleks pavodzinaъ, karysnym prystasavalnym vynikam jakoha joњж stan, jaki z medyиnaha punktu hledћacnia moћna abaznaиyж jak ИUЋAJEDZTVA. Kali ja љukaъ bolљ zrazumieiy adpaviednik siovu иuћajed, pierљaje, љto pryjљio ъ haiavu, — heta parazyt.
Иuћajedy — heta hielminty. Adrazu chaиu ъdakiadniж, љto nia

maju na ъvazie parazytavacnie ъ vyhladzie mechaniиnaha spaћyvacnia иuћych charиovych zapasaъ dy kradziaћu susiedzkich kanservacyjaъ, narychtavanych na zimu. Majecca na ъvazie иuћajedztva sacyjalnaje. Taki иaiaviek nie adaptavany da aktyъnaha iadu ћужcia. U jaho, jak u sapraъdnaha иuћajeda, absalutna nie raцvity orhany sacyjalnych paиuжciaъ. Jon nia zdolny da analizu sytuacyi vakoi siabie, nia baиуж mahиуманьciaъ palerљуж svajo ћужcio pad иas ahulnych цmienaъ. Jon uvohule nie adиuvaje patreby ъ цmienach. Kali jakoje miesca daje jamu srodki dla ћужcia (uzroviec ћужcia nia maje roцnicy, haioъnaje – padtrymacnie bijalahiинaha isnavacnia), hetaje miesca nie pakidajecca. Nasiedћanaje miesca pakidajecca tolki vymuљana, tolki ъ vypadku jaho likvidacyi.

Jak medyk, ja лtodnia sutykajusia z takimi ћorstka rehulavanymi dla иaiavieka jak dla bijalahiинaje systemy kanstantami, jak zdaroъie, chvaroba, ћужcio, ьmierж, praciah svajho vidu dy hadavacnie naљиadkaъ. Kali braж pad uvahu vuљej pryviedzienyja mnoju zakony, dyk varta byio b иakaж u adkaz na adchilecnie systemy ъ bok chvaroby, pahrozy ћужciu ci цnikniecnia naљиadkaъ bujnoj mabilizacyi ъsich mahиymych kampensatornych mechanizmaъ. Usich, ale, лto dla иaiavieka najbolљ istotna, nia tolki evalucyjna starych u vyhladzie aktyvacyi imunitetu dy farmavacnia zapalecnia, a ъ vyhladzie evalucyjna novych, pavodzinavych reakcyjaъ. Reakcyjaъ ц niepasrednym udzieiam vuљejљaj nervovaj systemy. Лto ћ my baиym u realnym ћужci? Иaiaviek bolљ za ъsio napruћvaje emacyjnuju sferu. Sferu, dareиy, jakaja maia иym moћa dapamahиy, ale jakaja spaћyvaje vielmi лmat nieabchodnaj na vyzdaraъlecnie enerhii. Ale pierљ za ъsio huиaж huинyja skarhi, ьloznyja apoviedy pra svaje pieraћyvacni, pra toje, jak usio navokai ciaћka i haioъnaje, лto jaho nichto nia leиуж! U hety ћ иas chvoryja pa–sapraъdnamu nie asensoъvajuж svajho stanu, nie admaъlajucca ad љkodnych zvyиak, nie vypracoъvajuж nutranoj patreby vykonvaж pryznaиanuju terapiju dy prytrymlivacca adpaviednych rekamendacyjaъ. I, samaje haioъnaje, nie vypracoъvajuж ujaъlecnia, лto treba samomu vypraviж zboj u svajoj systemie, viadoma, z dapamohaj nieabchodnych specyjalistaъ.
Jaљие ъ bolљaj stupieni heta prajaъlajecca ъva ъsim, лto цviazana

z takoj hienetyина determinavanaj funkcyjaj, jak praciah svajho vidu.
Uĥo praz paъhodu pracy ъ reanimacyi niemaълataъ ja caikam pryzvyиaiъsia da nastupnaha raԥviжcia razmovy. Paньla taho jak baжkam padrabiazna tiumaиyъsia krytyiny stan niemaълaci, apaviadaiasia pra zaleĥnanьж ĥyжcia ad dziejnanьci aparatury (лътиinaje dychacnie, padtrymacnie sardeиnaha rytmu), baжki najpierль zadajuж dva voиь jakija pytacni: „Ci dobra jano jeньж?“, „Ci narmalna jano kakaje?“ Spaиatku hetyja pytacni mianie biantеĥyli. A paньla ja ъsio zrazumieъ. Haioънaje, лъto turbuje иuĥajeda, heta stravavacnie dy vydzialecnie. Astatnija funkcyi ԥjaълajucca tolki absiuhoъvajuиymi. Jasny sens i inльaha sakramentalnaha pytacnia: „Doktar, a ci budzie jano razumnaje?“ Pa–pierльaje, nichto nia zmoĥa pradkazaж, jakim „razumnym“ budzie dzicio ъ buduиym, kali mieж na ъvazie intelekt. Sens hetaha pytacnia naъprost ԥviazany z papiarednim! Ci budzie jano ъ dalejлym zdolnaje samastojna znajньci „pajeньci“ dy „pakakaж“? Kali nie, dyk ci varta ъvohule jaho ratavaж? Heta paprostu ĥachliva. Ludzi, jakija nastojliva ъzdymajuж pytacnie pra metazhodnanьж dalejльaha laиecnia, na samoj spravie zavualavana prapanujuж hetaje laиecnie spyniж! Dareиy, niekatoryja prapanujuж heta pramym tekstam. Dla mianie, jak dla lekara, jaki hetaje samaje laиecnie pravodziж, heta prapanova ъiuyniж zvyиajnaje zabojstva. Иuĥajedztva nie vitaje siabanьci, jak i tryvaiaje apieki kim–niebudԥ. Tak byio zaъsiody. Bolь vysoka arhanizavanyja bijalahiинyja vidy namahajucca, nie лkadujuиy vysiikaъ, achoъvaж svajo nieлmatlikaje patomstva, a bolь nizkija biaruж kolkanьciu, nia nadta zvaĥajuиy na ich dalejлy los. Dzicio za niekalki miesiacaъ znachodĥacnia ъ addzialecni moĥa nie daиakacca, kab jaho narakli ъiasnym imiem. Nahoda taja samaja: „Nieviadoma, ci vyĥyvie jano ъvohule, a vy kaĥacie pra imia“. Sam fakt naradĥecnia byccam by jaльие nie dazvalaje niemaълaci liиycca paънavartasnym иaiaviekam. Napeъna, z hetaje ĥ nahody baжki pakidajuж svaich dzietak nie pachavanymi paньla ьmierci (dziarĥava, jurydyина, daje prava vybaru). Najvialikлy kiopat, na jaki jany zdolnyja, heta, naиytaълysia bulvarnych hazetak, skazaж pa telefonie: „My chavaж dzicia nia budziem. Ale ĥ vy jaho nie raԥbirajcie tam na orhany!“
Padobna, лъto ludzi ъsio иanьciej abirajuж svajoj normaj patalohiju. Z asobnych patalohijaъ farmujecca patalohija hramadztva.

Haiasuj za **ARCHE** :)
acani… 5 - fajna 4 - dobra 3 - tak sabie 2 - biaha 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]

Patalohiji ъ ARCHE 4(5)-1999 [image]

da ЦMIESTU da Раиatku STARONKI

E-mail redakcyji: **analityka@yahoo.com** Web-majstar Maksim Kapran: **mk**
Йакajем vaљych mejlaъ z pytacniami abo kamentarami nakont hetaha sajtu
Copyright © 1999 ARCHE "Раиatak" magazine
Apoљniaje abnaъliecnie: 28-11-1999

[image]
[image] *Публікацыі ў 4(5)-1999* .
[image]
[image][image][image][

ня менш, сябра быў патрэбны яму кожны дзень, кожную гадзіну, таму гэтая страта была вельмі адчувальнай.

Менавіта тады ён зразумеў, што зноў цяжка хворы. Неяк надышла думка, што “вірус” пасяліўся ў ім улетку мінулага году і з тых часоў нагадваў аб сваім існаваньні, але дагэтуль яму было незразумела, што гэта сапраўды такое. А зараз… Хвароба нібы забаўлялася зь ім. Яна катавала яго два–тры разы ў месяц. Прычым накідвалася часьцей за ўсё ў той час, калі пакуты ад яе крыху сьціхалі. Паміж тым ён заўважыў таксама, што трызьненьне гэтае прыносіла адначасова й пэўную прыемнасьць, а часам хварэць было нават салодка. Калі ён гадзінамі ляжаў распластаны ў ложку, у сьвядомасьці ўзьнікалі ўспаміны аб мінулых выпадках хваробы. “Лекаў” тады было досыць, дый час быў — ня тое, што зараз — юнак, маладзён… “Лекі” былі для яго звычайныя, у залежнасьці ад узросту, стану кішэняў і душы. Інтэнсіўная тэрапія ў спалучэньнях з аднаго боку, “Алазанская даліна” ці падвоены “Херэс”, з другога — “Трохкутнік”, “Дзеці сьнежня”, “Дзень Срэбра” Б.Грабеншчыкова, “Achtung Baby!” U2 (ён сам сабе чытаў другое слова беларускай лацінкай). А ўночы, зразумела, *soundtrack* Анджэла Бадаламэнці да “Twin Peaks” Дэвіда Лінча, ды яшчэ разгорнутая “Судовая сэксалёгія” Старовіча на падлозе каля ложку. У хваробы, такім чынам, не было ніякіх шанцаў.
Пазьней ужо, калі хвароба ўзьнікла зноў, рэабілітацыйнымі захадамі аказаліся шыкоўныя “Cordon’s”, “White Horse”, “Calvados” і гэты сапраўдны цуд — “Белая Русь” берасьцейскай вытворчасьці (пляшка “пад вінт”, чорны корак з кармінавай Пагоняй, усяго 4.70 DM у *Duty Free* на КПП “Заходні Буг”). І ўсё гэта ў спалучэньні з *Midnight Oil* (асабліва “…The Beds Are Burning”), *Cocteau Twins, Phish, Sugar Cubes, soundtrack*–ам да “Pulp Fiction” Таранціна, пасьля Данчык, “Крама”, “Палац” і “Песьняры” часоў уваходжаньня ў чарты “білборду”.
А цяпер у яго была толькі гарбата. Розных гатункаў, пераважна другасных, часам зусім нейкае сьмецьце. З гарбаты ён натхнёна рабіў чыфір, доўга назіраючы за рухамі пялёсткаў у слоіку з кіпнем і колерамі вадкасьці, што зьмяняюцца кожныя паўхвіліны. Пялёсткі гарбаты, што павольна тапіліся ў слоіку, чамусьці нагадвалі яму попел неатрыманых лістоў. Напой гэты,

атрутны для нармалёвага чалавека, уздымаў кроў і прымушаў думаць пра хваробу. Але відавочна псаваў сэрца. Ён ужываў яго амаль да ванітаў.
Хвароба была вельмі сур'ёзная. Сёньняшняе жыцьцё, у якім ён апынуўся некалькі гадоў таму, не дазваляла хварэць па–людзку. Ноччу апошняя думка перад сном была аб тым, што хвароба ўжо дастае й зьнясільвае. А раніцай першае асэнсаваньне — зноў ня дасьць сёньня жыцьця.
Але па–над усім гэтым панавала тонкая, крыху мазахісцкая асалода. Ніхто ня мог паўплываць на хваробу. Толькі ён мог вырашыць уласны лёс. Але зь цягам часу здавалася яму ўсё больш, што зрабіць гэта ўжо немагчыма. Дакладней, ён пакрысе схіляўся да думкі, што нічога рабіць ня будзе супраць гэтай навалы. Разьлік быў наступны.
Калі хвароба ўсё–такі сыдзе паціху (на што надзеі было няшмат), то потым ужо ён ніколі не дазволіць сабе падчапіць гэтае няшчасьце. Зрабіць гэтак будзе няцяжка: дастаткова ў будучыні падтрымліваць пэўны лад жыцьця. Да таго ж, пасьля кожнай хваробы ў мінулыя гады ў яго выпрацоўваўся своеасаблівы імунітэт. А ў гэты раз хвароба была непараўнальна мацнейшая, таму імунітэт абяцаў быць той, што трэба.
Вельмі шкада, але ён жорстка памыліўся. Ужо глыбокай ноччу, напіўшыся "атруты", ён амаль забыўся ў сьне. Гэта быў час, калі малюе ніколі ня бачаныя абрысы, будуе паветраныя замчышчы ягонае безнадзейна хворае ўяўленьне; калі сэрца б'ецца ў сутаргах ад чаканьня таго, што наўрад ці калі адбудзецца; калі ўласныя філіі з фобіямі ледзь не разьдзіраюць на часткі ягонае *alter ego*.
Раптоўна, сярод гэтых магутных акордаў разбуральнага аркестру, які сячэ душу на кавалкі, пачулася цудоўная мэлёдыя. Ён яшчэ адзначыў думку, што высьпела недзе ў падсьвядомасьці, — калі б ён зараз быў ня "тут", а "там", гэтая чароўная пяшчотная мэлёдыя панавала б над усім ягоным жыцьцём, пакінуўшы ад хваробы, ну, мабыць, невялічкі ўспамін. У гэты момант ён убачыў і зразумеў усё — хвароба пераўтваралася ў абсалютнае шчасьце, якога, зразумела, не існуе... Усё згасла раптоўна. Як і зьявілася. Цяпер ужо дакладна ўсё.
Ён не дажыў да свайго вызваленьня крыху больш за год. Проста

спынілася сэрца. Ніхто асабліва не цікавіўся — сьпісалі, як дзясяткі іншых небаракаў. Суседзі па нарах адзначалі, што быў ён апошнім часам нейкі засмучаны, падобна, хворы. Але ніколі ня скардзіўся ды ўсьміхаўся чамусьці свайму. Амаль ня спаў, увесь час чытаў свае незразумелыя іншым газэты, кнігі, пісаў у нататніку. Чалавек збольшага нядрэнны, ён нікому не зрабіў нічога дурнога, але й добрага таксама.
Вопратку ягоную падзялілі, што каму было патрэбна.
У тумбачцы засталіся толькі пусты пачак ад гарбаты, некалькі слоікаў, алоўкаў, чыстых сшыткаў. Быў яшчэ вялізны пакунак лістоў, але ён усё спаліў аднойчы, нібыта нешта прадчуваючы. Пляткарылі, што ў апошні год ён пазнаёміўся і ліставаўся зь нейкай дзяўчынай з волі і, здаецца, быў безнадзейна закаханы, ня бачачы ніколі хаця б ейнага фота. Але хто яна, адкуль — ніхто нічога ня ведаў, бо ён ніколі не распавядаў. Сышліся толькі ў адным — быў ён “па жыцьці” хворы. Праз тыдзень гэтая сьмерць амаль забылася, а празь месяц зрэдку хто ўзгадваў, ці быў такі.

Замест эпілёгу

У хваробы было звычайнае жаночае імя. Усяго чатыры літары, адзін рух ледзь адчыненых вуснаў… Для яго яно гучала нібы тое Элвісава “Love me tender…”, апошнім гукам, што сыходзіць з апошнім подыхам у апошняе імгненьне жыцьця.
Чэрвень 1999 г.

[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima
[image]

Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **28-11-1999**

Людміла Рублеўская
Два дні ў Маскве й трынаццаць год між імі

Людміла Рублеўская (нар. 1965) — паэтка па адукацыі. Да ўласна літаратурнай кар'еры па клічы сэрца скончыла Менскі архітэктурна–будаўнічы тэхнікум і два гады адрабіла ў праектна–канструктарскім бюро вытворчага аб'яднаньня "Гарызонт". Сярод апошніх публікацый прыкметна вылучаецца навукова–папулярны артыкул з ухілам у філязафічнасьць "Снам не вер?.." (Першацвет, 4—5/1999).

У 1985 годзе ўвесну ўзяла на ВА "Гарызонт" адгул (ужо ня памятаю дакладна, за сумленна здадзеную кроў ці за вечары, прашпацыраваныя ў якасьці дружыньніцы па прысадах парку Марата Казея) і першы раз у жыцьці паехала ў Маскву, у Літаратурны інстытут. Хаця ехаць было зусім і не патрэбна — дакумэнты я выслала раней, а паперка–рэкамэндацыя ад літаб'яднаньня, якую я зьбіралася завезьці ў прыёмную камісію, там нікога не цікавіла.

Але гэта была рытуальная паездка: мне было дзевятнаццаць гадоў.

Праз два гады супруг, набыты ў згаданым інстытуце, перавёз мяне на радзіму, да менскага філфаку й "Тутэйшых".

Наступнае спатканьне з Масквою адбылося ў 1998 годзе. Я зноў–такі нечакана, без асаблівае прычыны, купіла білеты — ужо на сябе й на дачку Вераніку, і мы на адзін дзень, прычым гэта выпаў дзень утварэньня БНР, паехалі ў горад маіх успамінаў.

Два дні адлегласьцю ў трынаццаць гадоў пакінулі ў маіх нататніках пункцірны партрэт Вялікага імпэрскага гораду.

1985

1. Масква не чысьцейшая за Менск.
2. Народу шмат. Ходзяць шпарка. Не зьдзіўляе.
3. У правілах парушаць правілы руху.
4. Народ зьлейшы.
5. Мэтро бруднейшае.
6. Вуліцы крывыя, дамы высокія.
7. Тубыльцам плюс, што захоўваюць назвы.
8. Літінстытут мой — халупа. Якіх мала.
9. Вучацца шмакадзяўкі.
10. Шмат замежнікаў.
11. Гандаль вузкаспэцыялізаваны. Усе тавары прадаюцца ў асобных памяшканьнях, разьвялі нават мяса і каўбасу.
12. Але паўсюль адна шыльда — “Прадукты”.
13. Маўзалей і Крэмль болей уражваюць на карцінках.
14. ГУМ — цікава, але фантан меншы, чым я чакала.
15. Захоўваюцца традыцыі сталіцы ў выглядзе насільшчыкаў і чысьцільшчыкаў абутку.
16. У насільшчыкаў выбітныя бляхі.
17. Няма тут нічога, чаго б не было ў нас, і няма шмат чаго, што ёсьць у нас.
18. Зьдзіўляе дурная сыстэма ў транспарце — дасюль з капейкамі важдаюцца — купляюць білеты ў кандуктараў ці ў аўтаматычных касах.
19. Але за білет коштам 4 кап. прынята кідаць 5 кап. — рэшты ж няма!
20. У двары інстытуту імя Горкага стаіць помнік Герцэну.
21. Насупраць Беларускага вакзалу стаіць помнік Горкаму.
22. У будынку, дзе сядзіць прыёмная камісія Літінстытуту, пахне плесьняй і мышамі.

23. На Дошцы Гонару вісяць Далматоўскі, Озераў і тры бугальтары.
24. Што ў іх іначай — дык гэта ўсе бабулькі інтэлігентныя.
25. Шукаю, дзе паесьці. Напісана: кафэ. Досьвед гаворыць: кафэ

— значыць забягалаўка, дзе стаяць і ядуць сасіскі. Бар — піўнуха, дзе п'юць. Зайшла. Зьняла паліто. Іду ў залю. Чырвоная сьпіральная лесьвіца ўніз. Катакомба. Віток, другі, трэці... У нос б'е моцны пах перагару. Паўцёмны інтымны кабак, абрынуты ў дым.
26. Маскалі зьвіхнуліся на замежным: "Фанта" — апэльсынавы сок з газіроўкай.
27. Цікавыя тут тэатры — Станіслаўскага, на Малой Броннай, Пушкіна — проста ў старых невялікіх будынках.
28. Цэрквы блішчаць. Але не працуюць.
29. Гэта ж галота! Па сала душацца ў чарзе!
30. Марозіва тут шмат. Рознае. Смачнае. Трэба ж нечым харчавацца.
31. Для масквічак галаўныя ўборы — гэта шапкі і хусткі. Капелюшоў ня носяць.
32. Беларускі вакзал рэстаўруюць. Лепей бы дзейнічалі ўзрыўчаткай.
33. Бачыла: "Мэрсэдэс" ля нейкай амбасады. Шык! І побач наша ўбогая чорная "Волга".
34. Голас у мэтро ў нас больш прыемны.
35. Прачытала ў інстытуце іхныя сацабавязацельствы. Студэнты павінны адлюстроўваць у сваіх творах палітыку партыі і ўраду. А таксама пісаць пра 50–годзьдзе інстытуту. Ура!
36. Эскалятар у мэтро доўгі, доўгі, а людзі яшчэ й бягуць, хаця ён і едзе хутка.
37. Увогуле, гэта адрозьненьне масквічоў — сьпяшацца.
38. Я езьдзіла для таго, каб усьвядоміць, што ня трэ было ехаць.

1998

1. У Маскву цяпер езьдзяць адны бабы. Мінуў час камандзіровачных з каньяком у дыпляматах. Бабы неахайныя, стомленыя, у швэдрах, з валізамі рознай, але ўнушальнай велічыні. З таварам.
2. На ўвесь вагон адзін мужык — наш сусед. Вязе стэрылізатары. Адразу падумалася пра жывёлагадоўлю. Аказалася — для цырульняў. Прадукцыя былога ваеннага заводу. Па тым, як раскупляюць у Расіі, мяркуе пра ўзровень жыцьця. Раскупляюць блага. Усю дарогу пастаўшчык

стэрылізатараў харчаваўся батонам і пачкам біякефіру.
3. Народ лае Ельцына і К° і спадзяецца, што беларускі “бацька” “паразумнее” і верне Савецкі Саюз.
4. Пралічыліся па часе. Прыбыцьцё ў Маскву — 5.49, а ў Маскве час на гадзіну пазьней. Нас пабудзілі а палове чацьвёртай ночы й па–нашаму безь дзесяці пяць мы апынуліся на халодным маскоўскім пэроне.
5. Жэтон мэтро і талёнчык на тралейбус каштуюць два рублі, схадзіць у прыбіральню — два з паловай. Гарбата — тры рублі. Тата даў нам з сабою 100 расейскіх рублёў і сказаў, што во як хопіць на дзень.
6. Масква эўрапеізуецца. У аздабленьні дакладнасьць — акуратна й прыгожа да дробязяў, да рыштаваньняў і сетак на будоўлях.
7. Там, дзе ў маім інстытуце была сталоўка, — кніжная крама.
8. Дзе была сымпатычная сасісачная — фірменны “Майскі чай”.
9. Купілі білеты ў тэатар сучаснай п’есы. Стары дом на Цьвятным бульвары. Стыль дэкаданс. Херувімы з абабітымі крылцамі, цяжкія цёмныя парцьеры й люстэркі ў ляпных рамках.
10. Сюжэт спэктаклю — ніякі. Ангельскі вершык пра масла на сьняданак каралю. Дзеці — у захапленьні. Жывы гук — камэрны аркестар і артысты–сьпевакі. Многа жартаў. Досыць элегантна. Нават паядынак у стылі ўсходніх адзінаборстваў між малочніцаю й каровай.
11. Галоўнае — дзьве гадзіны пасядзелі ў мяккіх фатэлях і бясплатна схадзілі ў прыбіральню.
12. Красная плошча. Дзядзька з гучнабрахальнікам запрашае на экскурсію па Крамлі. Кошт — каля 20 рублёў, дзецям — палова. Ну як не схадзіць! Далучыліся да групы дзяцей з расейскіх правінцыйных школак (іх беспамылкова адрозьніш ад масквічоў па абцерханым выглядзе). Пасьля аказалася, на тэрыторыю Крамля можна прайсьці за 2 рублі! Кінулі, як лохаў...
13. Храмы крамлёўскія адрэстаўраваныя, у кожным — выстава, і ў кожны — за асобную плату...
14. Падземны горад на Манэжнай плошчы. Як сказала адна масквічка, “бяседа пад час чумы”. Раскоша, для нас неверагодная. Тры паверхі фірмовых крамаў. Мармур, шкло, пазалота, разьба, мэтал, дываны, пальмы, люстэркі... Японія,

Кітай, Швайцарыя, Англія, Амэрыка… Бабілён. У цэнтры на тры паверхі — фантан з падсьветкай. Тры бронзавыя фігуры з чашай. Кіч постсавецкі. Наверсе — скляпеньне ў выглядзе мапы сьвету.
15. Аб’ява на фасадзе: “Прадаюцца з фабрыкі мужчынскія кашулі й бялізна. Уваход са двара”. Ура! Нам трэба маскоўскі падарунак для таты! Набудзем яму ў Дзень Волі Беларусі маскоўскія майткі!
16. Заходзім у двор — тыповы маскоўскі, але ў ім стаіць будан “экалягічнай прыбіральні”, падобны да бліскучай цыстэрны. Да будана прыстаўленая бабулька зьбіраць “мзду”.
17. Кашулі дарагія. Майткі з паркалю ў кветачкі фасону “парашут”, кароткія, а ўнізе неверагоднай шырыні: сонца–клёш. “Нейкі дзіўны фасон”, — зазначаю цётцы, што іх прадае. “А чё, у нас все так носят…”
18. Але ў гэтым занюханым месцы, сярод кашуляў і майткоў зь неабкіданымі швамі кабеты ў шэрых халатах гавораць пра… Галіну Ўланаву. Як шкада, што вось яна памерла. І якая яна была. Што пісала ў лістах да сяброў… Як яе хавалі… І ў гэтым таксама — Масква.
19. Што цікава — у транспарце грамадзяне перасталі выяўляць шчырую цікавасьць да таго, ёсьць у каго праязны ці не. У свой час усе, заходзячы, дэманстравалі суграмадзянам належную паперку ці аб’яўлялі пра яе наяўнасьць. Калі не — хоць нейкі ўедлівы пэнсіянэр ды запытае: “Товарищ, а у вас проездной?” Цяпер гэтая кранальная рыса зьнікла.
20. Беларускі вакзал цяпер падзяляецца на дзьве часткі — дзяржаўную і камэрцыйную. На камэрцыйнай — платныя залі адпачынку, бары, відэа й іншыя “прыбамбасы”. У старой пачакальні ўсё тыя ж зялёныя плястыкавыя крэслы.
21. Нашмат менш езьдзіць дзяцей. Амаль не відно іх на вакзале. А канікулы ж…
22. Колькі езьдзілі ў мэтро — баялася. Якраз пагразілася сэкта “Аум Сэнрыкё” ўчыніць тэракт — напусьціць атрутнага газу, як у Японіі. Абышлося.
23. Назад ехалі з чужымі электрачайнікамі “Сымэнс” пад лавай: знаёмыя папрасілі перадаць. Суседкі па купэ — маці й дачка з Байкалу, абліччы азіяцкія. Дачка вучыцца ў Маскве, у асьпірантуры. Мэнэджэр. Прасілі расказаць пра Беларусь, едуць да сваякоў, але самі ні разу там не былі. Ну, і мяне панесла… У

Караткевічавым духу… Пэўна, расчаруюцца, бедныя, пабачыўшы на свае вочы “горад волата Мянеска” і “славянскую Шатляндыю” зь верасовымі пусткамі, старымі замкамі й азёрамі ў пушчах…

[image]
[image] Паталёгіі ў 4(5)-1999 .
[image]
[image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [image] [ima

кніга да Зьместу 4(5)-1999

Пэтэр Гандке Шэршні

Пэтэр Гандке нарадзіўся ў 1942 годзе ў Карынціі (Аўстрыя). Цэнтральная фігура нямецкамоўнага постмадэрнізму. З 1954 па 1959 навучаўся ў гуманітарнай гімназіі для выхаванцаў сьвятароў, з 1961 па 1965 вывучаў права. Аўтар кніг “Шэршні” (1966), “Крамнік” і “Вітаньне” (абедзьве ў 1967), “Нутро формы нутра” (1969), п’ес “Аблайваньне публікі” (1966), “Самаабвінавачваньне”, “Прароцтва” (абедзьве ў 1966), “Крык: Ратуйце!”(1967), “Каспэр” (1968).

“Шэршні” — гэта спроба апісаць паўставаньне раману. Пэўны чалавек ужо ладна гадоў таму прачытаў кніжку, альбо ён нават не прачытаў яе, а яму трапіліся зьвесткі пра яе. І вось аднойчы летам нейкі зьбег абставінаў, мабыць, паяднаньне таго, што адбываецца зь ім, і таго, што напаткала сьляпога героя раману, нагадвае яму пра тую напаўзабытую кніжку, якую ён нібыта калісь чытаў, а можа нават і не чытаў. З аскепкаў, нізак словаў, сказаў, напаўстрачаных вобразаў чалавек прыдумляе раман, і нельга вызначыць, ці дзея “новага” раману датычыць толькі “героя” старога раману, ці яна датычыць і таго, хто яе прыдумляе. Гэтым вось новым раманам і зьяўляюцца “Шэршні”. У гэтай кнізе ўдалося дасягнуць таго, да чаго імкнуліся і

імкнуцца многія сучасныя аўтары: цалкам адкрытая фабула, у якой нічога няма ад зацьвярдзеласьці, але і нічога не выпараецца, фабула, якая служыць для чытача мадэльлю верагоднага жыцьця, і “пульсацыя нежывых рэчаў”. Пісьменьнік і сёньня трымае руку на пульсе жыцьця. Сёлета ён рашуча асудзіў “натаўскую агрэсію ў Югаславіі”.

Ты пойдзеш
вернешся
не загінеш на вайне

Пачатак успаміну

Тады, сказаў мой брат, я нібыта сядзеў ля печы, утаропіўшыся ў полымя.

Калі ён прыйшоў, яшчэ мераскацеў дождж, яшчэ не занялося на дзень, ён узышоў ззаду на пагорак, не зважаючы на драцяную агароджу ступіў на поле, і дрот падрапаў яму твар; ён пабег уніз праз поле, а яно тады было ўжо пад папарам. Гразь і прыгнанае ветрам гнілое лісьце ліплі да падэшваў; крок за крокам ён набліжаўся да дому, перад дрэвамі ён зноў рушыў подбегам, бег па траве, па дарозе; на гэты бок дарогі ён, не спыняючыся, абцёр з падэшваў зьлева і справа камякі калу і папраставаў уздоўж мура да складанкі дроў. Там ён прасадзіў нагу ў шчыліну між паленамі і спачатку ўроскарач, а потым выпрастаўшыся падаўся па складанцы ўверх, імкнучыся як мага хутчэй ужо цяпер нешта там убачыць у доме за падвойнымі шыбамі — і нібыта ўбачыў! Казаў, быццам убачыў, што нехта сядзіць перад агнём, быццам убачыў, што ўнутры на ложку перад агнём сяджу я.

Ён сказаў, што я быццам бы так стуліў плечы пад пашкуматанай на палоскі кашуляй, што цёмная скура спаміж вузкіх вострых складак матар’ялу, якія набягалі промнямі ад напятага на сьпіне месца аж на рукавы, у спалучэньні зь сьветлым матар’ялам паласаціла сьпіну, а рукі так цесна абхоплівалі грудзі, што Ганс бачыў, як кончыкі пальцаў на сьпіне ўсё больш сьціскаюць кашулю, а пазногці ў вугальных плямах напалавіну пабялелі ад усё больш напятых маіх

самаабдымкаў, і таму што яны, як ён сьведчыў, тым больш заглыбляліся ў скуру, чым даўжэй я душыў у абдымках сваё цела, — з гэтае прычыны яны прыцягвалі да рэбраў разам з матар'ялам і скуру. Аднак я ня рухаўся; глыбака апусьціўшы галаву, натапырыўшы ўперад вострыя плечы, якія мала не датыкаліся да вушэй, я сядзеў напалову ў выгіне матраца, напалову на краі ложка, наўскасяк прыткнуўшы ногі да краю адчыненае скрынкі, на дне якой ляжалі шуфлік і пакрышаны вугаль, і адстаронена глядзеў на полымя.
Сьпярша ён (так ён казаў) прыняў мяне за другога. Ён кінуў позірк на тапчан, на якім надоечы спаў з другім братам, але там нікога не было. Доўгі час ён разглядваў пусты ложак. Потым тлумачыў — здавалася, што на падушцы ляжыць чыясьці галава, але хутчэй за ўсё яго ўвялі ў зман водбліскі агню, якія так і скакалі па сьценах.
Ён зноў засяродзіўся, пачаў другім разам аглядаць пакой і яшчэ раз зірнуў на мяне. Ён бачыў, як напята прасоўваюцца пальцы, усё больш бялеюць пазногці. Ён бачыў парэпаную ад рыхлага сухога бруду скуру. Адвёў позірк. Паглядзеў вобмельгам на дзьверы. Яго позірк кінуўся прэч ад пустых дзьвярэй, вярнуўся да агню. Ён глядзеў на полымя, якое ў сталай суладнасьці з рытмам цягі то імкнулася ўсьлед за ветрам сваімі зьвівамі, то застывала, трымаючы штыль. Адразу твар шырака паехаў– глянуў праз шыбу на край мура, але там знутры з–за двайнога шкла пасоўваньня расплюснутай на шыбе шчакі не было чуваць.
Ён стаіўся, закінуўшы назад галаву, і ўзорыўся на выступ даху; яго рука на хаду ўхапіла гзымс над акном, як на тросе выважыла цела, ён выпрастана ўкленчыў на складанцы і наўскось глядзеў на мяне праз даўгія сьляды пальцаў ды шырокую палоску ад шчакі на засмужанай ад пылу шыбе. Я якраз рэзка прыняў ногі з краю скрынкі і паўкругам перамясьціў іх, добра бачныя спачатку, потым ахінутыя цемрай перад сьветлым зыркім агнём, потым зноў сьветлыя ў цёмным пакоі, назад на сяньнік, які яны пры дотыку ўкінулі ў траскучае полымя. Так вось ён нейкі час бачыў галаву таго, хто сядзеў, збоку; ён знаў мяне, таму і пазнаў. Ягоная рука каўзанулася з гзымсу. Ён перанёс цяжар цела на пяткі і схаваў галаву за шырокай сярэдняй рамай; ён прыклаў выгнуты тыл далоні да ілба, распростаў далонь, прасунуўшы яе паміж шыбай ды ілбом

і зафіксаваў позірк на мне. А я між тым нібыта павярнуў твар да календара над пустым тапчаном, але вочы, пукатасьць якіх была яму заўважнай збоку, нічога ня бачылі. Не зьмянілася і паставa рук. Цяпер ён чакаў паставаў паўторнага засынаньня. Пальцы адпусьцілі кашулю на сьпіне, пакінуўшы потныя сьляды, рукі, так і не расчапіўшыся, абсунуліся на жывот, верх тулава хіснуўся назад на жалезную бакавіну ложку. У той час як я неадрыўна глядзеў на каляндар, брат мой пачаў шкрабаць пазногцем вялікага пальца па шыбе.

Я не адразу паглядзеў у акно. У той час, калі ён карачыўся і пластаўся на кострыку дроваў, я сонны да зьнямогі сядзеў на траскучым саламяным матрацы. Толькі пасьля таго, як ён укленчыў і ўсьпёрся рукамі на толь, я, быццам гук дасягнуў мяне толькі цяпер з далёкай адлегласьці, пачуў шаргатаньне пазногця па шыбе: спачатку глухі гук бяз рэха, зь якім пазногаць стукаў аб шкло, потым рыпучае церце аб шыбу, нібы па драўлянай падлозе валачылі цяжкую шафу альбо скрынку. Я паволі павярнуў галаву да шыбы і нібыта пачаў глядзець у той бок, а мой брат выціраў кулаком з шыбіны пару ад рытмічнага свайго дыханьня. Ён стаіўся. Я, здавалася яму, глядзеў на акно, а ён глядзеў на мяне; калі я ўдыхнуў паветра, твар мой звузіўся, але не таму, што я ўгледзеў яго, а таму, што я ўсё яшчэ ўслухоўваўся, што цягнуць шафу; дзеля гэтага вочы, зрэнкі якіх цэлілі проста на яго, былі скіраваныя ўнутро на шаргатаньне, сачылі эфэкт слыху.
Ужо гэтым ранкам, як сказаў мой брат, я мірганьнем павекаў прыпадобніўся сьляпому і глядзеў як сьляпы.
За вакном я ўспрымаў толькі змрочнае неба; з расплывістых плямаў я дадумваў таполі і за полем на пагорку як мяжу паміж небам і зямлёй драцяную агароджу; аднак галаву брата, які за вакном нецярпліва чакаў на мой адказ, я ня бачыў.
Як ён сказаў, яшчэ праз колькі часу я ўстаў. Аднак нечакана я пайшоў не да вакна, а да дзьвярэй насупраць, бо ж шафу маглі валачыць толькі тут у доме; мне здавалася, што гук выходзіць з пакойчыка маёй сястры.
Я нібыта хутка адняў засаўку. Калі дзьверы адчыніліся, другая рука, якая ўжо націснула ручку, правалілася ў пустку калідора. Цішыня мінулася, зашчэпленая за церце дрэва па дрэве і

рыпеньне шарніраў. Яна трэснула ад удару латуні аб парэнчы лесьвіцы. Дзьверы біліся аб парэнчы гучна ўсё цішэй і цішэй; цёрлася валачэньнем дрэва аб дрэва; потым да мяне зноў падплыла і ўсталявалася цішыня.
Я выгукнуў у яе і ў цемрадзь нейкае імя, якое, адно што выгукнуўшы, ужо не разумеў. Мой брат пачуў гук голасу; што выгукваў мой голас, было яму невядома; ён зноў пачаў шкрэбсьціся ў шыбу. Нерухомы, без уласнага руху, ён застаўся на ранейшым месцы, ня зводзячы зь мяне напружанага позірку. Я перакрочыў парог і ступіў на бэтон, які сваёй сьцюдзёнасьцю ў момант збасаножыў мяне, і зноў а зноў выгукаў ягонае незразумелае імя; потым я выгукнуў яшчэ гучней незразумелае імя другога майго адсутнага брата, быццам ссоўваньне шафы было ўжо знакам іхнага вяртаньня.

Ён ня мог бачыць, што я ў калідоры стаў на дыбачкі і шукаю на сьцяне кончыкамі пальцаў акенца; але ён бачыў, як ад шкрабатаньня пальцаў кот, які драмаў пад лесьвіцай сярод матыкаў і лапатаў, падняў галаву і расплюшчыў вочы.
Мне прыйшло на розум, што я ня чую зумканьня лічыльніка. Толькі тут я ўразумеў, што зьвер з задзёртым хвастом прасьлізнуў праз парог у пакой; галава з тулавам праставала да шыбы. Толькі цяпер я ўспомніў, што ўночы прыляталі бамбіць. У калідоры мой позірк спачатку прыцягнула засохлая гразь, слой якой на бэтонных плітах з кожным зробленым углыбкі ад уваходу крокам усё танчэў; тое самае было і там, дзе бацька атопваўся мінулай ноччу, трымаючы ў кулаку дрот ад газьніцы, што боўталася ля калена дзеля бессэнсоўных пошукаў; там, дзе ён атопваўся, заставаліся бурачковыя калюжкі; яшчэ адбліскваючы з краёў рэчкай, яны пранікалі аж да маіх дзьвярэй і ў мой пакой у зьменлівае, бо вецер гайдаў каптур лямпы, кола сьвятла на падлозе — я адсоўваўся пасьля ягонага стуку, праклёнаў і баханьня ў дзьверы; я спакойна стаяў ля яго ў сарочцы, а позірк майго бацькі аббягаў пакой, не спатыкаючы апроч мяне больш нікога, і яму нічога не заставалася, як, цяжка гледзячы перад сабой, стаяць на адным месцы пасярод пустога пакою зь сьмярдзючай чадам лямпай, якая пахіла зьвісала зь яго рукі.
Цяпер там, куды я пазіраў, былі рэльефна адбітыя ў засохлай у

міжчасьсі ручайнай гразі абцасы ботаў.

Кот гучна замяўкаў ля вакна.
Гук засмактаў мяне з калідору назад у пакой; за шыбай я ўбачыў твар майго брата, і я пазнаў, бо ж я знаў яго.
У цябе скура брудная, сказаў я, і ў чорных пісягах. Кожны раз, калі я хацеў засяродзіць позірк на табе, гойсаючыя водбліскі–адбіткі агню, на які я быў дагэтуль утаропіўшыся, гасілі выяву твайго твару.
Між тым сьнег, што прагнаў, заступіў дождж, спараджаў у пакоі ўсё большую сьветліню, і яна ўзрастала адпаведна з кожным новым узьвівам завеі. Ён не рабіў мне ніякіх знакоў. І я не рабіў яму ніякіх знакоў. Ён і я ведалі аднолькава добра, што бачым адзін аднаго. Я моўчкі глядзеў на галаву перад полем, да якога яна была так блізка, быццам я глядзеў на яе ў падзорную трубу. Не мяняючы палажэньня пільна ўзораных вачэй, ён абсунуўся тулавам на складанку; на пачатку руху крыху ззаду ад сярэдзіны галавы нахохлілася колькі пасмаў. Яны апалі, перш чым твар зьнік з засягу майго зроку.

Уцёкі
У лістападзе зранку часта ідзе сьнег. Гэтую дзею часта апісваюць так: “Той, хто прачнуўся, і той, хто прачынаецца, глядзіць у акно, каб вызначыць па ступені сьветліні, колькі часу. Звонку ён бачыць, як дождж пераходзіць у сьнег. Кавалак толі, які цэлым слоем споўз з паленаў, бо зь яго, мабыць, нехта скокнуў (кот?), цяпер завальвае шапкай белы сьнег; на месцах, якія яшчэ цёплыя, бо там няйначай сядзела на каленях нейкая цёплакроўная істота, усё яшчэ расплываюцца сьняжынкі. Дождж вось толькі–толькі перайшоў у сьнег. Хмары зьмяшаліся і страцілі форму. Неба аднатоннае. Бачыў ты ці ня бачыў, але вецер перастаў, так што ты ня чуеш анічога. Таполі на краі поля, трава ля дарогі, травінкі на краі поля, засьпетыя зьнянацку хуткай сьнежнай навалай; і таму вось плугу (тут можна было б назваць некаторыя іншыя сельскагаспадарчыя прылады), які пад дажджом, здавалася, дыхаў, цяпер заняло дыханьне. Сьнег падае, але сьняжынак не відаць на фоне

хмараў, і ты іх бачыш паасобку толькі тады, калі зірнеш на караставатую кару дрэваў, якая ўсё больш цямнее па меры ўзмацненьня сьнегападу, і яны кладуцца бы пух на кару, але над полем іх не адрозьніць", і вось зноў яны бачныя паасобку на фоне мокрай цёмнай курткі дзіцяці, якое па барознах бяжыць шляхам, якім прыйшло, наверх, да небасягу, а рукі адстаўлены ад тулава, бяжыць, сьціснуўшы кулакі, якія, бы ўзьвівы ўверх–уніз поля, рухаюцца ўверх–уніз, падэшвы ўтоптваюць у барозны мокрае грудзьдзё, "і ўрэшце ты бачыш, як сьнег зноў раптоўна атуляе падрэзаную плугам зямлю, якая дагэтуль яшчэ ня страціла дажджыстай афарбоўкі".
У назіральніка, які стаіць на прыстаўленым крэсьле перад расчыненым акном, трымаючы руку перад сабой у сьнежным пуху, абсягі імкліва блытаюцца, захрасаюць разам з пустым позіркам унутро, белая роўнядзь неба прасякаецца бурачковай і жоўтай роўнядзяй палёў, белая роўнядзь поля і пажоўкла–жоўтая роўнядзь неба прасякае белыя роўніцы толі на складанцы, на якой нядаўна з–за цеплыні цела (але гэта быў ня кот) растаў сьнег, а белая роўнядзь неба ды белая роўнядзь поля, працятыя толькі дзідамі таполяў, прасякваюць белую пустку вачэй і прарэзваюць ды крэмзаюць на кавалкі белую пустую роўнядзь мазгоў.

Утойваньне весткі

Цяжкая замкавая бэлька зь верхавіны мура трушком і подбегам набліжалася да героя, які ўзыходзіў па сходах з сваёй весткай, яна ўсё бліжэй і бліжэй прасоўвалася да зьвернутай да яе сеткавіцы, яна торкалася туды–назад, у той час як ён усё пашыраўся і разгортваўся дзякуючы так званаму "пошчаку" і "валачэньню" драўляных, падбітых цьвікамі пантопляў па драўляных прыступках; спачатку, як я прыкмеціў адсюль зьнізу, мне, таму, хто падняўся наверх, быў заўважны толькі адзін абчасаны вэртыкальна бок, над ім вузкія як здалёк, так і зблізку ліштвы, на ім паласаты грубы цень ад крокваў, рэзка падсьвечаных зьверху сьвежым сьвятлом з слыхавога акна на шчыце, так што яшчэ ўтоенымі для набліжэньня позірку былі трэскі–задзіры, пад якімі бэлька была яшчэ больш чорнай, і рассыпаныя дзе–нідзе гарошкам чорныя точыны з купкамі

парахна пад імі; але потым, у меру таго як торкаючыся і дрыжучы набліжалася бэлька, гэтыя праявы, якія мне дагэтуль толькі ўяўляліся, зь няпэўнага задняга пляну сягнулі на пярэдні, і стаў бачным бязь ценю гарызантальны бок бэлькі, ад якога кроквы наўскасяк вялі да вільчака, і на іх я заўважыў павуціньне, у якім віселі камякі пылу ды спавітыя і высмактаныя мушыныя цельцы. Пакуль я ішоў зь весткай уздоўж бэлькі зьверху па падстрэшшы і дайшоў да сестрынага пакою, ніці павуціньня, якія я ідучы сьцягваў з цэглаў, ляпіліся да рукі.

“Маленькае круглае люстэрка адразу ахінулі яе распрасьцёртыя пальцы; ёй нават ня трэ было хаваць насьценнае люстэрка, у якім я бачыў яе плечы”.

Але гэтай раніцай я натрапіў на сваю сястру ня ў ейным пакойчыку. Раптам я згадаў, як яна пахне; я згадаў гэтыя пахі, праверыў іх усе. Я праверыў клеевы пах ляку для пазногцяў, пах вадкасьці, пры дапамозе якой яна яго змывала адразу пасьля таго як нанесла і перад тым як нанесьці яго ў чарговы раз, пах астылае рамонкавае гарбаты, якой яна прамывала вочы дзеля большага бліску, пах пірага з назьбіраных пустых пуздрэлачак з–пад пудры, пах “славутай парфумы”, якой яна апырсквала пакой, пах тых падобных да цытрыны яблыкаў, чайны пах адпаведнага ваеннаму часу мыла, якое ляжала ў куфэрку паміж вопраткі, што дасталася ў спадчыну ад маці. Прадметы ў пакоі падаваліся мне бясколернымі і бляклымі, быццам я перад гэтым доўга безь перапынку глядзеў на сонца і быццам я толькі што прачнуўся і ня мог адрозьніваць нічога апроч цемры і сьвятла; аднак потым мне падумалася, што гэта быў агонь, на які я доўга глядзеў там унізе, а потым сьнег, празь які я сьпяшаўся позіркам усьлед за бягучым братам, — гэта яны рабілі мяне неўспрымальным да колераў, так што мне здавалася, што бясколернае ўспрыманьне прадметаў насьміхаецца зь мяне, трымаючы, каб я ня мог успрымаць гэтага сваім асьлепленым полымем, дальтанічным зрокам, у няпэўнасьці адносна таго, што прадметы самі ў залежнасьці ад таго, ці ў пакоі станавілася сьвятлей, напрыклад, з–за павольнага адкрыцьця дзьвярэй, давалі ненатруджанаму воку знак наконт таго, што адбываецца, давалі тым, што пачыналі граць фарбамі і прыстасоўвацца больш рэзкімі контурамі да большай асьветленасьці, якая ўзьнікала хай сабе з–за таго, што

за маёй сьпінай бязгучна шырылася пройма некім расчыняных дзьвярэй.

Некранутасьць стала, шафы, камоды і прыбранага ложку здавалася падманлівай.
Але я не азіраўся, а стаіў быў дыханьне, каб адным крыкам разарваць цішыню.
І тут я пачуў дробны перастук яе пантопляў з боку сходаў, што вялі на падстрэшша. Што яна згубіла на тым падстрэшшы?
Я хутка выйшаў з пакойчыка.
Яна спынілася і з вышыні сваіх высокіх пантопляў на калодцы паглядзела на мяне зьверху ўніз. Мы абое адразу ўнурылі позірк далоўкі і, не прамаўляючы ні слова, рушылі адзін насустрач аднаму да пачатку сходаў на першы паверх.
Яна моўчкі пачала спускацца. Я палез сьледам, смакуючы яе хаду з пошчакам, з наляганьнем на пяты. Я зьбіраў словы, якіх мне забракла, калі я выйшаў зь дзьвярэй ейнага пакою.
Ці магу я перашкодзіць ёй пайсьці і займацца тым, чым яна прывыкла займацца?
Раскінуўшы газэту, яна сядзіць на кукішках, абапіраючыся на гэтыя пяты, якія я цяпер разглядаю, альбо ў нейкай іншай паставе на кухні перад плітой, трымае раўнавагу, узяўшыся за парэнчы, і разгойдваецца на дыбачках туды–сюды, разьдзьмухваючы агонь і выціраючы сьлёзы тылам далоні. Але калі я прамоўлю вестку, я тым самым магу парушыць гэтую натуральную хаду рэчаў, і ўсё можа памяняцца. Аднак словы выйшлі зь мяне перш, чым я іх вымавіў, асобнымі складамі і літарамі, зразумець якія было не ў маіх сілах; я ня мог прадбачыць, што яна пачала б рабіць, каб я сказаў ёй гэта, я ня мог прадбачыць ні таго, як яна будзе выражаць жах, ні яе пасьпешлівых пытаньняў, ні як яна ў роспачы кінецца прэч. І калі ўжо я ня мог сабе ўявіць гэтага, я бадай што хацеў прадыктаваць сабе гэтыя вобразы словамі, — я пусьціўся за ёй па такім тонкім ільдзе, што нічога не сказаў пра вестку.
Калі я маўчаў, і калі маўчала сястра, і калі яна перастуквала пантоплямі, ідучы ўніз па сходах, і калі я спускаўся ўсьлед за ёй, бацька яшчэ гробся цераз трысьнягі.

Перавоз патанулага брата

Калі бацька апавядальніка гробся цераз трысьнягі, па гасьцінцы ішло трое мужчынаў. У той час, як доўжылася яго падарожжа, яны ішлі ад местачковае царквы, дзе да двух зь іх прыбіўся трэці, жандар, да дому, перад якім яны ля сьвінога катуха на прыступках ганка знайшлі двух змучаных цяжкай ноччу дзяцей. Яны ўвайшлі і глуха пратупалі па калідоры і зноў увайшлі і ўсьселіся і сядзелі ля сьцяны ў пакоі, у чаканьні скіраваўшы вочы да дзьвярэй, у той час як бацька апавядальніка гробся цераз трысьнягі, якія ён прыватызаваў, дзякуючы арэнднай дамове зь дзяржавай.

Калі ён яшчэ сам сядзеў тут у доме на гэтай самай лаўцы, на якой цяпер сядзелі прыхадні, падымаў адну нагу ў калене і з сапеньнем сьцягаў бот з нагі за ніз халявы, то спачатку якраз абодва першыя, на выгляд цывільныя, у сутоньні ішлі перад і за адной з звычайных у гэтай мясцовасьці калясак па гасьцінцы зь мястэчка Заморск да мястэчка Пустэльнікі. Адзін зь іх потым пабудзіў у мястэчку жандара, калі бацька апавядальніка на таку над хлявом, ужо трымаючы серп у руцэ, пальцамі намацваў у цямрэчы сурдут і блакітныя брызэнтавыя штаны, якія віселі мокрыя ад дажджу на цьвіку на сьцяне; і калі ён кінуў штаны на воз з драбінамі і выгнаў каня з хлява і запрог яго, другі мужчына з разбуджаным ужо жандарам вярнуўся на царкоўны пляц.

Бацька апавядальніка закінуў сурдут на плячо, нагнуўся і прыстаў раз ці два на калена, каб падняць лейцы, якія конь, што без прынукі ўзяўся наперад з возам, валок за сабой па брукаваным двары; ён выхапіў з–за халявы пугу і яе дзяржальнам па складох адбахаў па раме воза свой праклён; а ў гэты час жандар ставіў мужчыну, які перад царквой пільнаваў каляску, пытаньні, якія патрабавалі ўдакладненьня пасьля таго, што расказаў першы. Той, каго пыталіся, прыхінуўся ля калёны пад купалам, стоячы нагу за нагу; ён адказваў на сваім драўляным нязграбным дыялекце, не мяняючы паставы цела. Яго спадарожнік у адпаведнасьці з загадам жандара скінуў з каляскі мех, а ў гэты час бацька апавядальніка, разагнаўшы каня, прыціснуў тормаз перад блізкім крутым зьездам. Затарможаныя колы то пракручваліся, то ішлі юзам і кідалі ў твар чалавеку, які сагнуўшыся, улягаў у вагу тормазу і бег за возам уніз па схіле, камякі гразі ды пырскалі бруднай вадой,

аж пакуль воз, пасьля таго як колы заблякаваліся, не тузануўся мякка туды–сюды і не пачаў прытанцоўваючы гладка абсоўвацца па дарозе. Чалавек, бегучы, выпінаўся, скалупваў з твару гразь, нагінаўся і адтарможваў, спачатку павольна, размашыстымі, цяжкімі рухамі ўсяго цела, потым лёгка, адно кісьцю рукі паварочваў з пошчакам вагу тормаза ў супрацьлеглы бок, так што воз пакаціўся і падпёр каня, а чалавек, выбягаючы ад сярэдзіны возу ўбок і наперад і дзіка напінаючы левую лейчыну, збочыў па гасьцінцы направа.
У той час як бацька апавядальніка з подбегу заскочыў ззаду на воз і апусьціўся на адну з драбін упоперак да напрамку язды, безуважны да ўсяго наўкол, жандар ля каляскі прамовіў словы прызнаньня і кіўнуў галавой. Потым зноў заклалі на павозку мех, жандар зацёр мысам бота ў пясчанік тое, што ён думаў; потым ён прамовіў словы, якія мусілі суправаджаць жэст. Першы мужчына ўступіў у чатырохкутнік паміж дышламі і папярэчынай. Ён зачапіў локцем папярэчыну і выважыў каляску, другі зразумеў гэта як сыгнал, што трэба рушыць, і падабраўся ззаду.
Знаёма для вуха выстуквалі і вызвоньвалі колы аб каменьне, потым гук глух і шорхаў шырокімі, гліністымі каляінамі побач з дарогай і губляўся, чым даўжэй кацілася павозка ў тым напрамку, у якім ехаў таксама бацька апавядальніка, перш чым ён павярнуў на дарогу да става, панура седзячы на драбіне пад сьнежнай завейкай і пачэсваючы дзяржальнай пугі лытку ў халяве бота.

Да гэтых двух месцаў дзеі дадалося, пакуль бацька ехаў да става, а мужчыны ішлі гасьцінцам, яшчэ трэцяе месца дзеі, у якім апісвалася, як апавядальнік выйшаў з адчыненага дому і з ганка глядзеў на двор.
Пры гэтым ён пільна глядзеў у бок сястры, якая перад ім ішла па двары, пільна глядзеў на яе. З пустым кошыкам на локці яна хутка ішла ўздоўж сьцяны хлява да сьвірна. Безуважная пад час хады, яна раптам павярнула галаву да сьвіранога акна і насьцярожылася, уражана спынілася і разгарнулася да акна ўсім целам. Яна падняла галаву. Яна апусьцілася на калені. Апавядальнік пільна глядзеў на яе.
Аднак у той час як яна ўсё стаяла і глядзела, а апавядальнік

пільна сачыў за ёю, і ў той час як трое мужчынаў з каляскай ішлі па гасьцінцы, бацька апавядальніка ўжо заматаў ля става лейцы за кусты, нацягнуў брызэнтавыя штаны паверх ботаў і другіх штаноў пад грудзі, прайшоў цераз трысьнёг да дрэва, адшпіліў падцяжкі, адкінуў убок пугу, потым, зашпільваючы і завязваючы гузікі і тармазкі на ўсіх штанах пасьля таго, як справіў патрэбу, залез на хісткую лодку, адчаліў ад берага і пагробся, адштурхнуўшыся вяслом ад слупа, цераз трысьнёг.
У той час як трое мужчын з каляскай ішлі гасьцінцам, бацька апавядальніка укленчыў сьпераду на носе на самаробным трапе зь ліштваў, і калені яго прыгрузьлі ў чорнай бугрыстай гразі, якая выступала з–пад няшчытных ліштваў; тым часам, як яны ўсё ішлі і ішлі гасьцінцам, ён, выцяты распростанай трысьняжынай па твары, пракляў, скрыгочучы зубамі, і зямлю, і ваду, і паветра, выкасаваў сярпом з вады вінаватую расьліну, інэрцыя руху штурхнула яго наперад, ён торкнуўся ад сярэдзіны лодкі празь ліштву да зяленіва, хістаючыся, зьбіў трысьнягі ў жмут, пачаў гуртаваць з рэзанкі (так на чужой гаворцы называецца вельмі прыдатная на корм для скаціны вадзяная расьліна) ахапкі, фармаваў зь іх нягнуткімі грубымі пальцамі снапкі, з шумам усьцягваў рэзанку на лодку, ужо згуртаваў другі снапок, вырваў яго пад шоргат і сіпеньне сярпа па–над трапам, перакінуў у лодку, вырваў яшчэ адзін снапок і паклаў у лодку, і яшчэ наступны, у той час як расьліны ў лодцы нечым малочна–зялёным адцянілі яго сьпіну, моцнымі рухамі вёслаў рушыў далей, паставіў рыпучае вясло напоперак ходу лодкі, з–за рэзкага тармажэньня торкнуўся наперад, зноў сеў ямчэй, седзячы — яго рукі трымалі вёслы, а вада зь яго так і сьцякала цур'ём ды кроплямі — чакаў, калі суцішыцца хлюпаньне, апусьціўся на калені, кленчыў там, сьнег на заломе і на бартах капелюша, дым перад безуважна пыхкаючымі губамі; ён сядзеў, чорны пасярод куп'я травы, абвеяны сьнегам, у той час як мужчыны няўхільна ішлі гасьцінцам з каляскай, браў сабе хвіліну спачыну ў трысьняговай блытанцы, у моры трысьнягу, якое зноў і зноў выклікала ў апавядальніка галавакружэньне, блізка каля сябе выразныя абрысы расьлінаў з бурачковымі патаўшчэньнямі, ззаду безаблічная пустэча як глыбакая, блякла–зялёная прастора, у якую з шоргатам і шапаценьнем падае сьнег.
У той час як мужчыны ішлі гасьцінцам, бацька апавядальніка

пагробся па трысьнягу назад. У той час як абодва мужчыны цягнулі і штурхалі каляску, а жандар выкрочваў побач зь імі, сястра апавядальніка несла цераз надворак у кошыку бульбу для скаціны. У той час як апавядальнік моўчкі назіраў з ганка, бацька апавядальніка глядзеў на п'явак, якія клубіліся ў вадзе. У той час як мужчыны з каляскай падышлі да скрыжаваньня дарог, дзяўчына ля катуха гатавала сьвіньням есьці. У той час як яна запаўняла бульбай чоп у катуху, бацька апавядальніка апусьціў руку ў балотную твань, каб злавіць п'явак. У той час як бацька, растапырыўшы пальцы, разглядваў злоўленую п'яўку, мужчыны спыніліся перад скрыжаваньнем і запыталі, куды ісьці далей. У той час як жандар папераджальна жэстыкуляваў рукамі, бацька высыпаў на п'яўку з кішэні загадзя прызапашаную соль. У той час як апавядальнік з ганку папрасіў дзяўчыну, каб яна дала яму бульбіну, мужчыны падабраліся і павезьлі каляску па дарозе дадому. У той час як сястра апавядальніка узяла бульбіну з катуха і кінула яму на ганак, бацька ў лодцы выняў нож. У той час як апавядальнік перакідваў гарачую бульбіну з адной рукі ў другую і дзьмухаў на пальцы, бацька разрэзаў п'яўку на борце лодкі на дрогкія кавалкі.

У той час як бацька апавядальніка пасьля гэтага выціраў нож аб брызэнтавыя блакітныя штаны, а першы мужчына ўбачыў, як вось у завейцы паказаўся дом, і ўсе трое ў згодзе заківалі галовамі, адказваючы на пытаньні, паскорылі хаду і нарэшце дайшлі да брамы, дзяўчына апякла сабе палец аб гарачы запарнік, каровы ў хляве пачалі мычаць ад голаду, а з другога хлява іх падтрымалі сьвіньні.

У той час як бацька апавядальніка заматаў ланцуг за слуп, аўтар апавяданьня на ганку перастаў жаваць, убачыўшы каляску.

У той час як бацька гробся цераз трысьнягі, у ягонага сына, які ляжаў у калясцы, на аблепленым гразьзю твары ляжаў мяшок, які хай сабе і захаваў смак многіх рэчаў, але яму ні адзін смак ня быў больш даступны.

Прамова жандара

Жандар забясьпечвае ў вёсцы выкананьне законаў; у гэтым яму

перададзена частка паўнамоцтваў дзяржавы. Ён прасякаецца гэтымі паўнамоцтвамі звонку тым, што дзе б ён ні ішоў, ён ходзіць у трывалых, дыхтоўных ботах, а ў дрэннае надвор'е мае на плячох тоўсты шынэль; адной рукой ён трымаецца за бляху над каўнерам, а другую падымае ў прывітаньні, якое, як і ўніформа, гэтаксама належыць да фармальнага боку ўлады. Аднак пасьля далёкай дарогі ўніформа ўжо ня тая; карычневыя плямы гразі выглядаюць больш цёмнымі на сьветлым шынэлі і больш сьветлымі на цёмных ялавых ботах. Рыпеньне ботаў, у якіх ён цяпер кіруецца праз двор, вядомае як службовае, але здаецца, што яно яму замінае ў хадзе, таму што ён мяняе крок і цяпер, каб пазьбегнуць гэтага рыпеньня, ступае плоска, ня цягне нагі, перастаўшы напружваць пальцы ў суставах. Але яго боты ўсё яшчэ рыпяць.
Двое першых мужчынаў як прыйшлі, так і засталіся стаяць у браме. Трэба ўявіць сабе сястру, як яна па–ранейшаму прыгорбленая стаіць у водбліскаў агню ля катуха ўнутры чорнага круга, у якім тае вакол полымя сьнег; пара коса падымаецца ад катуха, ад напоўненага з гарой бульбай чопа каля яе ног, ад яе рукі зь вялікім чарпаком і ахінае яе.

Уявім сабе адсутнага бацьку, як ён на беразе става асаджвае каня з возам назад паміж дрэвамі. Заблякаваны воз ідзе юзам. Ён дае назад аж у хмызьнякі, і калі яму гэта не пасуе, то ён проста кулаком паганяе каня ўперад. Пасьля гэтага ён ставіць воз і каня так наўскось да дарогі, што потым яму можна будзе разьвярнуцца. Нацiснуўшы абцасам, ён заганяе вілы ў кучу рэзанкі і грузіць, вываважваючы другім абцасам і рукамі цяжар і адначасна падымаючы зубы вілак; так ён вызваляе зь пераблытанага зяленіва ўзятку за ўзяткай і перагружае пырскаючую вадой траву з лодкі на воз.
У той час як жандар ідзе шырокімі крокамі, падыходзіць да апавядальніка, ён бязгучна фармуе губамі словы, якія ўжо падрыхтаваў па дарозе сюды (я аднойчы прачнуўся, ляжаў і слухаў, як бацька ў гасьцёўні што ёсьць сілы біў маці; спачатку я адрозьніваў прывычныя словы, якімі за сьцяной абменьваліся бацькі, і я добра чуў буханьне ўдараў, хоць побач са мной і пачалі ўжо з рогатам і лямантам біцца браты, малпуючы бацькоў; але потым, калі ён пачаў біць мацней, я стаў

дранцьвець і здранцьвеў, і кроў зашумела ў жылах і аглушыла мяне, так што я перастаў успрымаць усялякі шум і мог чуць толькі шалёную кроў у сабе).
Жандар пытае мяне тройчы, у той час як я аглушана прапускаю міма вушэй ягоныя словы, ці такое ў мяне імя, — пакуль я нарэшце не пацьвярджаю гэта. Тады я без запытаньня кажу, што бацька паехаў да става, — каб не сядзець проста так і не глядзець моўчкі на гасподу: ён мусіць хутка быць, працягваю я; і папраўляюся — мусіў. Гарачая бульбіна апякае мне руку. Бацька апавядальніка адмотвае лейцы ад куста, валачэ іх, ідучы ўздоўж воза, заскоквае, але яшчэ скачучы ўзгадвае пра нешта іншае, зноў саскоквае, тупае па мяккім дыване травы да дрэва з цыбулінападобнай адзнакай патрэбы на кары, падымае там забытую пугу, глыбака засоўвае яе за халяву, перад тым як цяпер заскочыць на воз, зноў выцягвае яе і хавае за халяву толькі пасьля таго, як усеўся шырака раскінуўшы ногі на самым версе стога. Конь ужо выцягнуў яго і калёсы з дрыгвяністых каляінаў.
Тая, што адтуль уцякае, гэта мая сястра, рапартую я. Жандар дае знак мужчынам, патайно махаючы рукой. Хоць яны і рушылі з каляскай ад брамы, уражаньне такое, што яны ня рухаюцца; няйначай кручэньне зямлі падганяе іх, застылых, да мяне; чым бліжэй іх падганяе, тым больш падае на безабаронныя вочы мех у калясцы, на якім ужо зьявіўся сьнег. Нязьменна траскочуць і грукаюць па каменьні і па грэблі розныя колы розных вазоў.
Бацька заціскае верх люлькі паміж указальным і вялікім пальцам і закладае ды набівае ў яе кончыкам вялікага пальца вільготны тытунь. Ён нагінаецца, запальвае і падносіць да тытуню збоку запалку і зацягвае пад каптурком згорнутай рукой доўгае перакрыўленае полымя запалкі ў галоўку люлькі. Нерухома, ня гледзячы на бярвеньні грэблі пад коламі, сядзіць ён там на стозе і выдыхае гарызантальны дым у вэртыкальна падаючы сьнег. Ён хутка будзе тут, паўтараю я, у той час як за мной глуха праходзяць па калідоры ў пакой мужчыны з закрытым грузам.

Тым часам бацька супроць маёй волі нацягвае лейцы і спыняе каня. Ён злазіць шырокім бокам з воза і, паклаўшы

растапыраныя далоні на сьцёгны, прыжмурыўшыся, дасьледуе задняе кола. Аберуч ён згінае і выломвае з кустоў алешыну і скалупвае з тармазной калодкі гразь, ужываючы алешыну як вагу.

Жандар не адступаецца. Ён нават падвойвае колькасьць пытаньняў, ходзячы па пакоі ўзад і ўперад. Ён сунімае рыпеньне ботаў тым, што спыняецца. Калі, стоячы, ён больш ня можа выносіць свой рыпучы голас, ён зноў загадвае сабе безупынна хадзіць, і перашкаджае, і заглушае рыпучыя боты, даючы азвацца свайму рыпучаму голасу, дэманструючы яго тым, хто слухае, а таксама ўсебакова дасьледуючы яго прамоўніцкае ўзьдзеяньне, аднак ён ня можа ім прымусіць устаць тых падарожнікаў, што сядзяць ля мура, альбо дабіцца ад іх таго, каб яны, зьліtаваўшыся над ім, прыйшлі яму на дапамогу нейкім малазначным балбатаньнем, — абы бавіць час. Тады ён здаваляецца тым, што сыпле мне свае пытаньні як гарох аб сьценку: быццам яму вядома, што гэта мой брат Матт; для яго навіна, што прапаў мой брат Ганс; і што яго не датычыць, дзе я, апытваны, быў дзень таму назад; ягонае заданьне, тлумачыць жандар, устанавіць, чаму “яму не была даведзеная да ведама нічым не вытлумачальная адсутнасьць двух братоў”; што там думае сабе мой бацька (альбо хто там яшчэ павінен адказваць за гэта), задзірыста крычыць ён з самага аддаленага кутка пакоя, — гэта абсалютна няважна, пра гэта зусім няма чаго гаварыць, пра гэта можна забыцца. Быццам ты быў абсалютны нуль! — вылятае зь яго рота апошні сказ якраз тады, як ён утаймоўвае свае неспакойныя крокі і нарэшце спыняецца. Быццам усё не магло быць зусім іначай! — раззлавана пачынае сварыцца ён ізноў, і напяты твар яго сьведчыць пра незадаволенасьць. Быццам няма спосабаў і сродкаў! — выбухвае ён і адразу, ледзьве кінуўшы з акна на безуважна сядзячых чужаніцаў гэтыя падазроныя словы, зноў занурваецца ў нерухомасьць і маўчаньне, у якім ён, баязьліва касавурачыся наўкола сябе, ідзе супольна з гэтымі зьнерухомленымі сьледам за сваімі вольнымі думкамі.

Між тым бацька зіркае на боты, змрочна ашчэрыўшыся, цыркае праз зубы на гуму. Ён пачынае ўспрымаць глухі перастук колаў. Воз з грукатам перакатваецца зь бярвеньняў грэблі на бярвеньні мосту. Пераехаўшы мост, ён услухваецца ў такі ж вядомы, як чваканьне і ўздыханьне, гук капытоў у гразі, у

зьвяганьне ланцугоў, у ёканьне ў конскай утробе, у знаёмае шаргатаньне сьняжынак у сухой лістоце кукурузнага поля. Ён кіруе да пад'ёму. Стромкасьць асаджвае яго назад і прыціскае сьпінай да дзяржальна вілак, якія тырчаць у стозе. Ён вызваляецца, грабучы рукамі і нахіляючы тулава да каленяў. Потым ён расставіўшы рукі ўпіраецца ў драбіны і ашчапервае пальцамі папярэчкі. Над кожным крокам каня вымахвае ўверх яго галава. Мой бацька падымаецца на ногі і збоку саскоквае з возу. Ён кульгае ўперад да каня, хапае яго за цуглі і прэ ўверх на гару. У каня з–за цяжару задзіраецца ўверх галава; цяпер ён стаіць тут бы на паказ з жоўтымі, у шматках пены зубамі, танцуючы на двух нагах, быццам ён хоча служыць, — а потым з стогнам і жаласным рыпеньнем воз, віляючы з боку на бок, валачэ яго, хоць ён і прыпаў на калені, улучна зь нязгодна ўпёртым чалавекам, кулак якога, бо ён так дзіка ўхапіўся ўсёй даланёй у грыву, ператварыўся ў лапішчу, у кувалду, — у адваротны сьвет уніз па дарозе. Я бачу іх зноў ля падэшвы гары. Рухомая пярэдняя вось вывернула воз на ўзаранае поле. Прыпадаючы на ногі, чалавек абыходзіць каня і вялізнымі крокамі прастуе праз поле аж да круглага бруса, да якога прыкаваная гэтая праклятая ручка гэтага праклятага тормаза; ён нагінаецца да яго і прасоўвае пад брус, падабраўшы ногі і сплёўшы пальцы рук, спалучаныя далоні. Нейкі час ён разважае, стоячы ў гэтай падрыхтоўчай позе, потым распростваецца і вырашае інакш. Не марудзячы ён падскоквае да незацуглянага каня і цугляе яго, безь нічога ніякага расшчымляючы яму пашчу ланцугом. Пасьля гэтага ён паляпвае яму даланёй па шыі і адначасна, хутка ведучы руку з цуглямі ўперад, спрабуе адным скачком вымыкнуць каня і воз з ральлі; ягоная рука не абмякла ў нямогласьці і не апала, яна цяпер знаходзіцца паміж ягоным нахіленым і наструненым у бок руху целам і напятымі цуглямі; яна цяпер цягне, у той час як бацька, твар, грудзі і калені амаль паралельна да зямлі, памыкаецца праз сустрэчную завею па полі, каня, падскокваючую фурманку і цела, да якога яна сама належыць, пад дзікую бесьперапынную лаянку, якой не дае рады нават задышка, да выратавальнай дарогі. Там бацька спыняецца і з зацятым выразам твару аглядаецца на дарогу. Яго позірк падае на люльку, якую ён вытрас з сурдуту, тупаючы па ральлі. Ён пускае цуглі, зачапляе нагой камень, вядзе яго, рухаючы то

адным ступаком, то другім, пад задняе кола. Левую руку засунуўшы ў кішэнь, а правую трымаючы напагатове, каб пацягнуцца за люлькай, ён, згінаючыся ў каленях, ставіць ногі на пахіласьць і чэзьне і зьнікае, скурчваецца і сыходзіць на ніштo цяпер вось у напрамку ўніз і зьнізу ўверх перад маім няўхільным унутраным вокам ажно пад зямную кулю. Але перш як яму зьнікнуць канчаткова, сапеньне каня і скрыгатаньне колаў, якія пераехалі камень, зноў выкрываюць яго. Пальцы намацваюць у паветры люльку, у той час як астатняе цела ўжо пасьпяшае наперад, пераймае цуглі, абшчапервае грыву, дробна ўпіраецца ботамі ў зямлю, пускае вось цуглі і грыву; аддаючыся цязе воза, губляецца само перад сабой ува ўладзе прыцягненьня зямлі, з возам, збруяй ды палахліва іржучым канём, у якога з–пад капытоў сыплюцца іскры як ад жалезнага абруча; перш як пакласьціся, ён трушком праробліваe свой шлях.

Між тым жандар улоўлівае слыхам, што апавядае адзін з мужчынаў пра падзею, якая прывяла іх сюды. Пасьля кожнага сказу апавядальнік адварочвае галаву, не прымаючы яе ад мура, на які яна ўсьпёртая, у бок другога мужчыны, што побач зь ім на лаўцы, і паўтарае ўбок для свайго спадарожніка тое, што яны абодва, бо ж былі яны разам сьведкамі, і бяз гэтага ведаюць; ён гаворыць да спадарожніка на нетутэйшай, незразумелай гаворцы, хрыпліва і керхаючы выходзяць гукі зь яго глоткі, да таго ж ён, размахваючы рукамі, паказвае жандару, як яны сябе паводзілі. Ён паказвае, як яны, нічога не падазраючы, пасьля работы ішлі сабе сваёй дарогай, ён даводзіць жандару, робячы твар бесклапотным і вясёлым, што ім спадарожнічалі шчырая радасьць і сонца; потым з кожным разам твар яго азмрочвае нешта такое, што адкрывае нейкую жахлівую праўду; словы, якія похапкам сыплюцца зь яго вуснаў, аж запінаюцца адно аб адно, ён вымаўляе цяпер з кеханьнем і падвываньнем, аж пакуль ён і ягоны спадарожнік, які падвываючы пацьвярджае яго словы, ад усьведамленьня таго, што яны там мусілі пабачыць, не хапаюцца рукамі за галовы. Ён ня хоча нічога прыхарошваць, іхны лямант перабівае ад печы жандар — такі ўжо выпаў час, што ты нават як прыватная асоба ня можаш не прыходзіць да такіх думак, якія — тут ён, не даючы сябе перабіць, груба павышае голас — як і ўсё маюць свой зваротны бок, а менавіта, зьбірае ён у адно

разрозьненыя словы і сказы, што табе, хочаш ці ня хочаш, а зойме слых і зрок! Нецярпліва глядзіць ён пасьля гэтай натацыі на аціхлых мужчынаў, якім адваротныя бакі думак азмрочана заходзяць і выходзяць праз адкрыты рот. Якраз тут перайшоўшы ад аднаго да другога, супакоена закончыў сваю прамову жандар.

Бацька кленчыць на ральлі, упёршы адну нагу ў баразну, і прыціраецца плячом да перакуленага возу. Зьверху з дарогі ягоныя рухі з–за глыбіні сьнежнай белі здаюцца цельпукаватымі і нягеглымі. Бакавіна возу, якая вольна вісіць у паветры, зноў кратаецца за зямлю, калі ён падбіраецца пад другі канец возу і каленам выважвае яго з поля. Ён зноў ставіць воз на самога сябе, верхнюю частку наверсе, а ніз унізе. Уклаўшы дошкі і прыставіўшы драбіны, ён накідвае траву. Ён убівае ў купы травы зубы вілаў; на вуліцы чутно шаргатаньне сьцяблоў. Ён абчэсвае збоку лішак травы і чапляе абчасанае на вілы. Ягоны твар торгаецца і курчыцца, і ў роце відно шэрагі зубоў. Раз ужо сястра ідзе да яго ўніз з дрыжыкамі ў каленях, то яна можа гэта чуць; яна магла чуць, як ён крые.

Мабыць, там нешта з канём здарылася, кажу я.

Раптам бацька ўвесь зайшоўся ровам.

Што там такое? — пытае жандар.

Нічога, кажу я і адхінаюся на навыперадкі апавядаючых мужчынаў, так што жандар задуменна губляецца ў сваіх развагах.

Бацька жыватом сьпёрся на воз і малоціць кулакамі па траве. Калі сястра перадае яму вестку, ён нутрана ўзвывае, раскідваючы ў бакі шарготкую траву.

Аднак жа яна сустрэла яго на дарозе, апавядала сястра. Калі ён убачыў, што яна падбягае, ён нават не спыніўся; толькі калі яна памалу паднялася ззаду на едучы воз, ён суцішыў бег каня і хутка прытармазіў; калі яна потым паўзла да яго па купе травы, ён паволі павярнуў бараду да пляча і паглядзеў на яе; так вось седзячы за ім, заглыбіўшы рукі ў шорсткія сьцёблы, каб не спаўзьці, яна перадала яму вестку. Тут ён спыніўся. Аднаго дня перад гэтым, апавядаў ён пазьней, калі ён быў п’яны, ён бачыў, як яго сын, у якога на той час валасы, як ён ляжаў пад мяшком, былі яшчэ застыла–сырыя, стаяў на каленях з сваімі братамі адразу за парэнчамі балькону; адзін перад другім, але кожны быў заняты сам сабой, і яны праз выразаную ў дрэве

дэкаратыўную адтуліну па загадзя разьлічанай траекторыі цалялі сваім струмянём у двор; выйграваў той, хто даставаўся найдалей. Матт, на чыім твары цяпер як знак адсутнасьці жыцьця напялася заглыбленая вэртыкальная баразна паміж сьценкай носу і сярэдзінай верхняй губы, так што зусім гладкія скура і мяса цяпер як у заколатай сьвіньні адстаялі ад запалага рота і зубоў, быў сярод нас трох пераможцам.
Сястра сказала, што бацька сядзеў ціха так, пакуль яна зь ім сядзела. Потым ён торгнуў лейцы і зноў рушыў.

Шолахі
Гарачы вецер гоніць пыл у акно. Я чую шолах фіранкі. Я чую шолах пяску, які б'ецца аб шкло. Я чую шолах адчыненай шафы. Я чую шолах мокрага лісьця на дрэвах. Я чую шолах травы пад дрэвамі. Я чую шолах колаў вэлясыпэду. Я чую шолах дроту паміж таполямі. Я чую шолах абруча, які вісіць на адрыне. Я чую шолах мокрага адзеньня на дроце. Я чую шум дзьвярэй сьвірна, якія стукаюць аб дрывотнік. Я чую шолах едучага цягніка.
"Сьведчу, што я тады сядзеў перад печчу і ўтрапёна глядзеў на агонь".

Аповед сястры
Мая сястра праз расьцярушаныя крылы молі глядзела ў адчыненую шафу.
Часта ўвечары, падаўшы на стол вячэру, яна падымалася ў адведзены ёй пакой і там бавіла час перад трумо, пакуль яе ў выпадку неабходнасьці ня клікалі зьнізу.

Тады яна спачатку безуважна глядзела на моль паміж пальцамі, якая несла на сьпіне чорна–кружлясты панцыр. Двума меншымі пальцамі абедзьвюх рук яна асьцярожна расчэсвала чатыры крылы; чатырма пальцамі яна расьцягвала, распрасьціралa гэтыя чатыры крылы, два малыя вузкія і два вялікія, якія былі пад імі. Яна адпускала з аднаго боку пару крылаў, так што моль, пырхаючы, ападала на другія пальцы. Яна нюхала пыл на руцэ і глядзела, усё яшчэ зблізку, нахіліўшыся, на дзьве

суседнія кулі, якія былі галавой молі, і на чорны пункт пасярэдзіне галавы. Двума пазногцямі абодвух пальцаў яна пазбавіла моль абедзьвюх галоў, потым яна зноў разьвінула паміж пальцаў яе крылы.
Гэта і ёсьць часіна, калі яна праз расьцярушаныя крылы глядзіць у шафу. Яна адкідае ад сябе моль. У чорным шорсткім строі яна адкідваецца на сьпінку крэсла, у той час як зрэнкі вачэй, пашыраючыся, патанаюць у зманлівым цальнягу шафавае цямрэчы; пад зыркім электрычным сьвятлом, якое зноў уключылі ўвечары (бамбіць больш не прыляталі), яны разглядаюць нерухома павіслыя кадаўбы вопратак і змрочна занавешаную, ахінутую тайнай прастору за імі, якой, здаецца, нідзе не схавацца ад яе позіркаў. Глыбіня прасторы, у якой блукае яе зрок, цяжарам кладзецца ёй на галаву, вочы пачынаюць гарэць; хутка, быццам заклён, яе вусны вымаўляюць слова. Нарэшце вобраз вопратак і засмоктваючай прасторы за імі замыкаецца ў яе галаве на адпаведны запас назоваў, і яна пачынае распазнаваць і называць прадметы. Паліто, прас, моль і пыл. У той час як яна, пазбаўленая чараў гукамі, якія яна прамаўляе, водзіць вачыма навокал, яна працягвае агучваць назовы: акно, мур, дзьверы, ручка, печ, іржа, агонь. Куфэрак, люстэрка, ложак, люстэрка. Адбітак пальца рукі. Адбітак пальца рукі на люстэрку. Яна пачынае сьмяяцца і разглядае свой твар, што сьмяецца. Сьнег, камень, вада. Лёд, цьвік, дошка. Вада, мех, пясок. Калі яна падымаецца і кіруецца ў шорсткім матчыным строі да акна, яна чуе з хлява несумерны зь яе разьмераным поступам грубы звон ланцугоў і шаханьне корму ў каровіных зяпах. Яна хапатліва вяртаецца і проста з руху, якім ідзе назад, апускаецца перад вялікім люстэркам на калені. Тут яна чуе ўжо і мармытаньне людзей, якія моляцца ў пакоі пад ёй. Яна падымаецца. Яна крочыць да шафы, закрывае і замыкае яе нутро. Потым яна кіруецца да люстэрка, якое пажоўкла вісіць на сьцяне, і паварочваючыся паволі закідае назад галаву. Паволі закідваючы назад галаву, яна насуперак павароту касавурыць вочы да люстэрка. Разам шырака разяўляецца рот. Адвальваецца сківіца. Пачынае загладжвацца баразна паміж носам і губой.
Аднак паколькі яна пра гэта нічога ня ведае, то яна зноў нахіляецца наперад і, не адрываючы позірку ад люстэрка, кіруецца назад да крэсла, бярэ яшчэ адно люстэрка. Яна зноў

кіруецца да люстэрка, якое вісіць на сьцяне. Яна падымае другое люстэрка. Яна паварочвае твар і разглядае ў другім люстэрку, што трымае воддаль сябе, як праз паступовае заплюшчваньне павек узьнікае і адбіваецца ў люстэрку на сьцяне профіль. Яна разглядае ў люстэрку адбіты разяўлены рот і гладкую порыстую скуру паміж насавой перагародкай і сярэдзінай верхняй губы: тут раней была вэртыкальная вышчарбленая баразна. Яна глядзіць на вобраз, які яна стварыла ў люстэрку паводле свайго брата. У яе атрымліваецца скапіяваць патанулага.
Яна зусім блізка падыходзіць да адбітка, так што люстэрка затуманьваецца ад дыханьня, і ў той час як пальцы выціраюць запацелае шкло, яна цікаўна разглядвае няспынна выцісканыя з глоткі лямант і галашэньне на перакошаным твары. Стол. Акно. Крэсла. Акно, стол, крэсла. Крэсла стол акно. Акно: акно: акно!

Як здарылася тапельства

Апавядаю я.
Я быў найстарэйшы з трох братоў. Мы былі сынамі нашага бацькі і нашай маці, якую я згадваю як зычлівую і прыстойную жанчыну.
Прыйшоў той час, калі мы звычайна хадзілі ў школу. Туды мы ішлі сьцежкай ля рэчкі. Іншым разам мы галасавалі малакавозу на гасьцінцы; пазьней шафёр пачаў спыняцца сам, калі ён бачыў, што мы ідзём альбо стаім. Ён чакаў, пакуль мы не залезем па колах цераз борт і ня ўсядземся паміж бідонамі на свае ранцы. Але часьцей за ўсё малакавоз праяжджаў раней, чымся мы выходзілі з дому на гасьцінец. Тады мы звычайна зрэзвалі дарогу, паварочваючы з гасьцінца і ідучы цясьнінай уздоўж рэчкі.
Школьны будынак знаходзіўся ў мястэчку Заморск. Школа больш блізкага мястэчка Пустэльнікі год таму згарэла. З гэтай прычыны ўсе дзеці школьнага ўзросту мястэчка Пустэльнікі мусілі хадзіць на заняткі ў Заморск. Пазьней, калі вайна закранула і школу ў мястэчку Заморск, дзеці школьнага ўзросту мястэчкаў Заморск і Пустэльнікі мусілі хадзіць у школу мястэчка Ўзвышанск. Мястэчка Ўзвышанск, якое дзякуючы

афіцыйнаму статусу было горадам, знаходзілася ў напрамку на поўдзень за столькі і столькі кілямэтраў ад мястэчка Заморск і за столькі і столькі кілямэтраў ад мястэчка Пустэльнікі. Адлегласьць населеных пунктаў адносна адзін другога і іх месцазнаходжаньне зь цягам часу не зьмяніліся. Яшчэ пазьней, незадоўга перад канцом баявых дзеяньняў, пасьля таго як у сэкулярызаваным кляштары мястэчка Пустэльнікі былі зычліва адбудаваныя некалькі памяшканьняў, дзеці школьнага ўзросту гэтага мястэчка пачалі хадзіць на заняткі ў абацтва, у той час як асобы, адказныя за выхаваньне дзяцей школьнага ўзросту мястэчка Заморск, былі пастаўленыя перад выбарам, пасылаць дзяцей у школу мястэчка Пустэльнікі, якая знаходзілася на поўнач у столькіх і столькіх кілямэтрах ля гасьцінца, альбо ў школу мястэчка Ўзвышанск, якая знаходзілася на адлегласьці, якую можна вылічыць, на поўдзень ля асфальтаванае дарогі. Большасьць спыніла выбар у няпэўныя часы, калі ніхто ня ведаў, што мог прынесьці наступны дзень, на мястэчку Пустэльнікі, якое ня мела права гораду, не гаворачы ўжо пра пэрспэктыву стаць жаданай мэтай для паветраных атакаў з прычыны існаваньня на сваёй тэрыторыі небясьпечных ваенных лягероў; мястэчка нават страціла права праводзіць рэгулярны кірмаш.

На дарогу ў школу было тры прыказкі, якія былі ў сталым ужытку: Я іду ў кляштар. Я выпраўляюся за мора. Я іду ўніз на ўзвышша.

Я пачынаю апавядаць яшчэ раз.

Звычайна мы хадзілі ў школу ўздоўж рэчкі. Але аднойчы, у лістападзе, мае браты пайшлі адны. Школьная ўстанова знаходзілася тады ў мястэчку Заморск. Але яны пайшлі не ў мястэчка, а спачатку прабавілі дзень на ставе, дзе яны ламалі трысьняговыя пачаткі і падымалі з трысьнягу фазаны, дзікія качкі ды іншую дзічыну, потым у палёх паміж мястэчкамі, дзе яны раздушвалі ляжачыя дзе–нідзе гнілыя гарбузы і кідаліся наўцёкі з пакрадзенай бручкай.

Можна было б працягваць у гэтым жа духу, апавёўшы, што ў апошні раз іх бачылі разам, калі яны дзесьці ўжо пад вечар, перш як пачаўся дождж, выйшлі з кукурузы, падняліся ўверх па адхоне да гасьцінца і на пэўнай адлегласьці адзін ад аднаго (як кінуць каменем) сядзелі на прыдарожным бардзюры і жавалі скрадзеную бручку. Гэта ўсё толькі прыклады.

Прыкладам будзе й тое, калі я скажу, што іх бачылі з аўтамабіля, які спачатку праімчаўся з мястэчка Пустэльнікі ў накірунку на мястэчка Заморск. Пад час гэтай першай паездкі, як было расказана, іх бачылі, калі яны якраз выбеглі з кукурузы, знаходзіліся на адкрытым месцы і, чэшучы галовы, выглядалі нешта ў паветры і ўслухваліся ў гудзеньне. Такімі іх бачылі, аднак, толькі на працягу шчаўчка фотаапарату, таму што як толькі яны пачулі шум, які стаў узмацняцца, яны адразу зашыліся ў кукурузу і акрылі галовы рукамі, у той час як гудзеньне скокнула ад гарызонту і заспакаяльна прымацавалася да аўтамабіля, чые шыны з скрыгатам і грукатам выстрэльвалі друз з шашы ў поле. Цяпер яны самі, падняўшы галовы, назіралі праз голыя сьцёблы кукурузы пыл, які шыны выдрапвалі з друзу; празь сьцішэньне і заканчэньне гудзеньня зь імклівага аўтамабіля яны чулі аднатоннае безупыннае на высокай ноце выцьцё сабакі.
Калі аўтамабіль імчаўся зь мястэчка Заморск назад у мястэчка Пустэльнікі, яны ўжо бесклапотна падняліся па шэрай траве да гасьцінца і спакойна сядзелі ў нейкіх дваццацёх мэтрах адзін ад аднаго на бардзюры. Яны сядзелі, аднолькава нахіліўшыся наперад і моцна заціснуўшы ў руцэ бручку, у той час як рука беспасярэдне перад раскрытым, а шчакавінай яшчэ часткова жуючым ротам адрэзвала тонкія скрылікі і, яшчэ рэжучы, накіроўвала іх лязом да губаў, так што ім толькі і трэба было, што высунуцца ўперад і падхапіць спажыву. Калі браты ў другі раз пачулі гук, падобны да гудзеньня бамбоўцаў, яны ўтаропіліся ў бок, адкуль ён ішоў, і адразу зьнерухомелі, быццам уцятыя. Нязграбна гарбацілі шчаку непраглынутыя кавалкі. Яны дапялі, што аўтамабіль едзе з другога боку сьвету. Яны з натугай дыхалі. Скура на тварах пачырванела.
Аднак з аўтамабіля іх убачылі, калі яны зноў узяліся актыўна жаваць; было сказана, што яны харчаваліся, не зважаючы болей на аўтамабіль. Яны не зьвярнулі ўвагі і на сабаку, які працягваў бясконца выць унутры аўтамабіля. Тут пайшоў дождж; каб акрыцца, у братоў былі на каленях сумкі; адзін зь іх якраз акрыўся мешкавінай. Гукалі, што ён устаў, устаючы падхапіў сасьлізгнулую з каленяў сумку, зрабіў зь мешкавіны каптур для галавы, акрыўся, перахапіў зьвіслую тканіну і, мокрую, заправіў яе ў штаны; пазьнейшыя яго рухі ўсё больш і больш, у меру таго як аддаляўся аўтамабіль, які шалёна імчаўся,

выціраліся дарогай і палямі, якія выцягвалі з сабой прэч аж да небакраю няроўныя купіны маіх братоў, — гледзячы на іх праз залепленую дажджом заднюю шыбу, выглядала на тое, што яны кіпелі, варыліся, — і там разроўнялі, расплаўлялі іх.

Я апавядаю.
Я сьпяшаюся расказаць далей.
Аднаго дня ў лістападзе, як было засьведчана, мае браты сядзелі на бардзюры гасьцінца паміж мястэчкам Пустэльнікі і мястэчкам Заморск.
Цяпер я закончу гісторыю пераказам з другіх вуснаў.
Пасьля таго, як яны пасядзелі на бардзюры, яны прывялі свае ногі ў дзеяньне. Яны пайшлі далей і назад па дарозе, пакуль не дайшлі да скрыжаваньня, дзе яны павярнулі, пакуль не прыйшлі яшчэ да аднаго скрыжаваньня, дзе яны павярнулі і пайшлі далей. Гэтым узбочным шляхам яны выйшлі да рэчкі і ішлі ўздоўж яе, пакуль не прыйшлі да цясьніны. Яны ішлі праз гэтую цясьніну, пакуль не прыйшлі пад мост да скрыжаваньня, дзе яны між тым не паварочвалі. Другімі днямі было так, што яны пасьля гэтага скрыжаваньня збочвалі і паміж мястэчкам Пустэльнікі і мястэчкам Скокі, якое ляжыць на поўнач, зноў выходзілі на гасьцінец, па якім яны ішлі далей, пакуль не дасягалі скрыжаваньня, дзе яны ішлі бакавой дарогай, пакуль не прыходзілі дадому, праз калідор якога яны праходзілі ў гэты пакой, у якім я цяпер ляжу. Але тады яны, нібыта, пачынаючы ад моста не паўтаралі гэтага шляху; яны затрымаліся там і размаўлялі. Пасьля гэтага яны павярнулі і пайшлі назад, у скалістую цясьніну. Тады яны быццам яшчэ былі ўдвух.
Язь–баязь, сказаў адзін. Сам баязь, сказаў другі: вось прыклад іхных размоў.
Цяпер яны стаялі ў цясьніне і размаўлялі; яны крычалі і моцна жэстыкулявалі.
Ты ня скочыш. (Быццам адзін зь іх занадта баязьлівы, каб скочыць.)
Дай мне ліяну. (Другі павінен сарваць першаму з прыбярэжнага дрэва ліяну.)
Баязьлівец. (Першага зноў заводзяць.)
Ліяна. (Маецца на ўвазе, што ня трэба дарма час на размовы траціць.)

Ганс падаў Матту ліяну. Матт зь ліянай вярнуўся да скалы. Дзьве скалы, паміж якімі цячэ рэчка, разам утвараюць цясьніну. Спачатку я, потым ты. (Пасьля аднаго павінен скакаць другі.)
Так. (Ён згодны.)
Той зь ліянай задраўшы галаву глядзеў на другі бераг. (Гэта дазваляе меркаваць, што ён яшчэ вагаецца.)
Ты баішся. (Яшчэ раз закранаецца гонар другога.)
Не. (Папрок не прымаецца.)
Баішся ты. (Папрок хітра вяртаецца аўтару.)
Раптам ён разьбягаецца. Ганс чуў нібыта шкрабатаньне падэшваў, калі той адштурхнуўся ад скалы. Матт праляцеў высака над рэчкай і ўпаў на калені ў траву на другім беразе. Калі ён скочыў, ліяна стала разгойдвацца, і Ганс, пацэліўшы, злавіў яе. Матт пасьлініў палец і сьлінай выцер плямы ад травы на каленях.
Я перакажу да канца.
Ганс кінуў ліяну Матту. Матт зачапіўся за яе, пераскочыў назад да скалы і адштурхнуўся. Ганс паклікаў яго. Ён не аказваўся. Калі ён скакаў на гэты бок, сіла руху сарвала ліяну з дрэва. Рух сарваў ліяну з дрэва. Ён упаў у ваду.

Назовы шолахаў

Шолах фіранкі на ветры разумеецца сам па сабе як шум; яго можна параўнаць зь сіпеньнем агрэсіўнага агню ў печы; калі фіранка з шчыльнай тканіны, то яе шум на ветры называецца траскатаньнем; гэты выраз ужываецца таксама для сьцягоў. Шолах пяску, які вецер б'е аб шыбы, называецца шорганьнем; магчыма таксама параўнаньне з плескатаньнем дажджу па бляшаным даху; больш жорсткае плескатаньне дажджу аб бляшаны дах называецца дробатам. Шолах шафы, якая адчыняецца на ветры, называецца рыпеньнем. Шолах таполяў на ветры параўноўваюць зь мяккім цурчаньнем вады. Шолах зялезнага абруча, які вецер скідае зь сьцяны адрыны на падворак, разумецца як звон. Шолах мокрай травы пад ветрам называюць шапаценьнем; можна ўжыць тут таксама параўнаньне з шумам галаўні, якую акунаюць у ваду. Калі травінкі сухія, то іхны шум на ветры называецца шаргатаньнем. Шум незамацаванага балотніка на вэлясыпэдзе называецца

ляпаньнем. Шолах нацягнутага дроту на ветры называецца зычаньнем; шолах мокрай кашулі на дроце ўспрымаецца як лапатаньне; часта лапатаньне кашуляў на ветры параўноўваюць з глухімі ўдарамі птушыных крылаў; зноў–такі, аднастайны гук шматлікіх крылаў чарады малых альбо аддаленых птушак называюць посьвістам. Шолах сьвіранных дзьвярэй, што па тым баку падворку, калі яны ўдараюцца аб штабель дошак, называецца груканьнем; але калі ці дошкі, ці ліштвы дзьвярэй падгнілі ад мокрадзі, то наскок на штабель дзьвярэй, гнаных ветрам, будзе называцца буханьнем. Шум вэлясыпэда, перш як ён апракінецца, называецца ляскатаньнем; шум сьпіцаў, якія пасьля гэтага яшчэ круцяцца, гэта зумкатаньне, шум штангі, якая перад гэтым удараецца аб камень, гэта стуканьне.

Жамяра на конскіх вачох

Мы ўжо апісалі, як бацька, пераважнай часткай у прыцемках, запрагае каня; як ён, нагнуўшыся, папіхае ўпарта сагнутую пярэднюю нагу каня над капытом паміж бабкай і каленам, каб яна ступіла за дышаль да другіх ног, і як конь паслухмяна ступае гэтай нагой праз дышаль і адначасна выходзіць заднімі нагамі. Я ўзгадваю, як ён вяртаецца, жорстка ўпіраецца плячом і галавой у конскую тушу і шматкроць ляпае плоскай даланёй, сыплючы з рота кароткія злосныя каманды, па тым месцы конскай ляжкі, дзе скура пачынае зьбірацца ў доўгія столкі, як толькі конь, павольна пераступаючыся перад возам, пачынае рух гэтай нагі, і дзе доўгія столкі скуры зноў зьнікаюць, калі конь, мяняючы крок, пачынае цяпер ступаць другой нагой; я ўспамінаю, як яго рука ляпае па конскім крыжы і як ён тады сьціскае руку ў кулак, і як ён піхаецца галавой у заліты потам конскае бруха, і як конь пасьля гэтага манерна ставіць капыт на кант, і як ён манерна–паслухмяна заходзіць за дышаль, як ён перастае крычаць, як выпрастваюцца сьціснутыя ў кулакі пальцы і як ён падымае імі капялюш з бруку. Потым ідуць звыклыя рухі, якімі ён закрываецца капялюшам, якімі ён крочыць наперад, якімі ён з мэтай праверкі абыходзіць вакол каня, якімі ён, абыходзячы каня, устаўляе абодва канцы дышляў у прызначаныя для іх колцы ланцугоў, рухі, якімі ён

абмотвае ланцугі вакол канцоў дышляў і прывязвае іх. Рухі, якімі ён аціраe мокры твар перадплеччам рукі і якімі ён потым выціраe аб кашулю на грудзёх пот з твару “быццам бруд з нажа”. Але гэта належыць ужо да другога апісаньня, у якім паказваецца, як воз з травой па дарозе са ставу да хаты перакульваецца, як з–за аварыі дышаль вылузваецца з ланцуговага суплёту, як чалавек плячом ставіць на колы воз, які ляжыць збоку поля на крушні каменьня, і як ён вось цяпер зноў запрагае каня. Але і гэта ўжо зроблена, калі ён выціраe з твару пот і заўважае на тыле далоні і на рукаве кашулі кропачкі дробных мухаў (якіх я часта знаходзіў на маім твары, калі я ўлетку езьдзіў на вэлясыпэдзе па ваколіцы, і якіх я адну за другой пераносіў з рукі на пусты аркуш з сшытка, і якія потым на гэтым аркушы былі ў сказах, якія я запісваў на загад бацькі, знакамі прыпынку).
“Мухі здохлыя”. Ён скідвае іх спачатку з рукі на грудзі, потым выварочвае руку і скідвае іх таксама з рукава. “Калі ён гэта робіць, узыходзіць сонца. Адначасна з сонцам гарачы вецер урываецца ў шэрасьць, якая ня ёсьць ні цемрай, ні відном, і ў якой рухі здаваліся сьпятрэлымі і змарнелымі, і якая адрывае ад прадметаў, якія стаяць на зямлі, доўгія цені, і выпетрывае і разломвае твар чалавека”, які, не падняўшы галавы на гэтую праяву, атрасае з кашулі кончыкамі пальцаў рэшту мух. У той час як ягоная другая рука цягнецца па цуглі, ён цяпер заўважае расплывістыя чорныя кропкі на нагавіцах: крылцы непашкоджана вытыркаюцца з кропак. Ён напінае на ўказальны палец вялікую насоўку, сашкрэбвае кропкі з нагавіцаў і страсае іх з анучы; пазьней, перад полуднем, ён раскіне насоўку на каменнай падлозе царквы і ў часе ператварэньня хлеба, падцягнуўшы нагавіцы ўверх, каб не пакамечыліся, стане каленам адной нагі на рэшту мух, што прыклеіліся да хусткі. Але гэта яшчэ ня здарылася. Апісаньне было спынена, калі ён стаіць перад канём, і калі ён пры ўзыходзе сонца разглядвае большыя мухі, “якія згуртаваліся на адкрытых вільготных вачах каня як на сьвежым памёце; дзеля таго, што яны так цесна зьбітыя, што за смактаньнем і піцьцём ледзьве могуць рухацца, бальшыня зь іх, калі конь міргае вачыма, застаецца сядзець на краёх павекаў, быццам яны зьяўляюцца часткай гэтых міргаючых вачэй. Тыя нешматлікія, якія ўзьлятаюць, адразу зноў прыбіваюцца да гурта альбо цікуюць побач. Яшчэ адзін

рой жыве ў храпках каня. Цела і выемка пад хвастом па прыпацелых чарэслах таксама наскрозь аблепленая мухамі". Ён разглядае авадня, які, склаўшы крылы, прабіваецца да вока праз кішачы рой; яго шэрае цела апісваюць як доўгае, пляскатае і вузкае; ён з таго драбнейшага заводу, палёт аднаго прадстаўніка якога амаль нячутны і якога заўважаеш толькі тады, калі ён кусае цябе ззаду на сьпіне. Ад патрэсканай перавязі цугляў пад вухам ён цяпер — руху і пасоўваньня яго ног зусім не відаць — падабраўся паміж мух да края вока. На сагнутых лапках сядзіць ён ля верхняга павека пасярод лускападобнага мушынага рою. Чалавек не спускае зь яго вачэй; яго вочы глыбака пасаджаныя ў чэрап і сьвецяцца бляклым колерам сталага веку. "На ветры з боку крупа кашлацяцца валасы, кашлацяцца травінкі паміж каменьнямі, кашлацяцца цені валасоў над ілбом, цені кашлатай грывы і кашлатых чартапалохаў паміж каменьнямі ператвараюцца ў ветрацені, аднак больш выразны фон мокрай травы на возе, вілаў у траве, самога воза, каня і чалавека ўсё яшчэ застаецца нерухомым". Аднак калі конь быццам страсае галаву з шыі і быццам скідвае яе і, не зважаючы на гнёт хамута і дышля, падскоквае ўверх і становіцца на дыбкі, зь ім у руху ўзьвіваецца і гэты рой, і сплеценыя адзін з адным цені на краю поля. Чалавек прынукае палахлівага каня да руху. Цягнучы за цуглі, конь зрушвае воз, мухі ўзьлятаюць і пачынаюць атаку, зноў бяруць у асаду на нейкі момант выслабаненыя вочы, трава падскоквае на дошках, вілы пачынаюць хістацца, колы вырэзваюць свой сьлед у полі, мухі зноў роем увіваюцца ля вачэй. "Авадзень, прыдушаны павекам, вытыркаецца, пасьля таго як ён нанёс укус, сваім расьціснутым ушыркі целам наўскасяк з конскага вока." У той час як я ўзгадваю вобраз каня і вобраз ідучага побач з канём чалавека, у той час як я чую з двара шум падаючага вэлясыпэда і ўсе тыя іншыя шумы, у той час як намацваю пад ложкам чаравікі, мне да галавы прыходзіць згадка пра бзычаньне авадня, вялізнага авадня, да якога, здаецца, прыслухоўваецца конь, іншы конь з выцягнутай наперад галавой, пра тое бзычаньне, якое, калі яно наблізілася, ператварылася ў магутнае брумканьне, якое раптам сьціхла; я адначасна згадваю, як конь, запрэжаны ў воз з снапамі, адразу выбрыкнуў нагамі, яшчэ раней, чымся авадзень уцяў яго, і пачаў біць хвастом па бакох; згадваю, калі я стаю тут, калі я

намацваю шлях да адчыненае шафы, як Ганс вырваў з поля сухую саломіну, як конь, калі авадзень упіўся ў ягоную скуру, раптам аслабіў супраціў, як ён бездапаможна сноўдаў галавой у паветры, як ён пачынаючы з шыі здранцьвеў і як Ганс лёгка ўзяў авадня паміж вялікім і ўказальным пальцам і надарваў галаву і зусім адлучыў яго ад конскага трыбуха; згадваю, выбіраючы тут сабе з шафы што апрануць на сьвята, як ужо другім вялікім і ўказальным пальцам мой брат заводзіць вершалінку вырванай з поля саломіны ў мажную заднюю частку аваднёвага тулава, як ён упарта затыкае цьвёрдае гнуткае сьцябло ўнутро авадня, як авадзень таксама гнецца і, курчачыся, спрабуе выкруціцца, і як не беручы да галавы мой брат працягвае яго пратыкаць, як авадзень здаецца; я згадваю, што потым браты ўтрох басанож стаяць на пожні, што яны ўтрох шасьцьма вачыма разглядваюць авадня, што ён, злосны і жоўты, з штучным джыгалам сядзіць перада мной на руцэ, што мы весела сьвістам і воклічамі заахвочваем авадня да палёту, што мае пальцы глыбей засоўваюць джыгала, што ён вэртыкальна ўзьлятае ўверх, што ён застыў у паветры над намі, што, зрабіўшы кульбіт, ён з бзыкам, зыкам і зумкаценьнем адлятае і што яго нельга больш перасьледаваць ні цупкімі рукамі, ні нагамі, ні позіркамі, у той дзень адным летам, дзеля таго што сьвяціла сонца, якое сьвеціць і сёньня, аднаго сонечнага дня, які таксама быў нядзеляй, які ёсьць нядзеляй, таму што я прачнуўся да часу і ляжаў бяз сну і напалову спаў і зноў ляжаў ды спаў, таму што я аж пакуль не заснуў, чуў з падворку шолахі на ветры, таму што я зьдзіўляўся гукам, таму што я думаў і разважаў, таму што я спаў і напалову спаў і больш ня выйшаў са сну, таму што я заўважыў, што зычаньне лініі электраперадачы за домам зьнікла, што зьнікла тое зычаньне, зычаньне, якое нагадвае мне пра брата, якога больш няма тут, якога цяпер няма больш тут, у гэтым будынку, у гэтым мястэчку, у гэтай мясцовасьці, гэтым ранкам і гэтым летам, калі сонца сьвеціць мне ў твар, калі я акунаю рукі ў цеплаватую, пазбаўленую пасьля начной навальніцы смаку і рудую як зямля ваду і глуха стукаю пазногцямі ў дно міскі.

Ніхто ня бачыць твар сьляпога ў люстэрку?

Абуджэньне

Час паміж абуджэньнем і выспанасьцю, прамежак пачынаючы з удара сэрца, дзякуючы якому пачуцьці ляжачага вяртаюцца да яго, так што ён зноў можа слухаць і нюхаць і ўспрымаць на смак, гэты час, сказаў мой брат, натрапляе на безабаронную, адкрытую сьвядомасьць; таму што ляжачаму яшчэ не вярнулася ўспрымальнасьць, ён ня можа болей абараніцца ад думак, якія ідуць да яго, у той час як выспаны ён можа зусім добра паразумецца зь імі, адмазаўшыся ад іх добрым абедам, заліўшы іх смачнымі напоямі, заглушыўшы іх сваімі хапатлівымі пальцамі, прымусіўшы іх замаўчаць няспынным балбатаньнем, зьвязаўшы іх успрыманьнем шолахаў альбо аслабіўшы іх празь яшчэ нейкае пачуцьцёвае раздражненьне; наадварот, павучаў ён мяне, час ад абуджэньня і да таго моманту, у які ляжачы прыходзіць у сябе, зьяўляецца часам бяды таго, хто прачнуўся, злым часам, часам каяты, які змушае яго курчыцца ад сораму, часам халоднага поту, часам усьведамленьня, сказаў ён, празрыстым часам, ледніковым пэрыядам часу, ваенным часам, сказаў ён, ліхім часам.

Хоць маё цела яшчэ было спаралюшавана сном, я ўжо адчуваў далоні, якія зьвісалі адна побач з другой з ложка. Калі я сьцяў пальцы і пакратаў іхнымі пучкамі пукатасьці далоні, то мне падалося, што я намацаў на іх засохлы бруд; я адчуваў на пукатасьцях і пучкох пальцаў ня скуру, і дзеля свайго досьведу дацяміў, да чаго я датыкаўся і чым датыкаўся. Скура трашчэла, як высушаная на сонцы нягнуткая папера. Калі ўначы ні ішоў дождж, я даведваўся пра гэта, калі наступаў дзень, па далонях: яны былі засохлыя, скурчаныя і зьвісалі зусім незалежна ад рук, быццам яны былі зацэмэнтаваныя брудам. У мяне ўжо быў аднойчы засохлы бруд на пальцах, калі я спаў. Напярэдадні ўвечары я быў у пясочніцы і ў пошуках некага перакапаў пясок, які з–за дажджу споўз з адхонаў; вярнуўшыся дахаты, я не памыў рукі; схаваўшыся пад коўдрай, я паспрабаваў заснуць. Гэта было як у часы, калі бацька не вяртаўся аднекуль увечары: мы ўсе ляжалі пад коўдрамі і спрабавалі заснуць, і штораз, калі мы ранкам выглядвалі яго, ён ужо патыхаў смуродам у пакоі. Было многа сродкаў для таго, каб заснуць. Напрыклад, часта згадваецца лічэньне. Аднак у некаторыя ночы думкі ўжо даўно ішлі па крузе, перш як я лавіў іх і заўважаў, што я, сам таго ня ведаючы, паралельна з думаньнем усё яшчэ лічу. Таму я ляжаў,

стаіўшы дыханьне, каб выціснуць думкі з галавы; між тым яны зноў напаўзалі адусюль зь цемры. Потым я тармазіў адну думку і пераключаў увагу на другую, якая ніяк не хацела аформіцца; я цалкам аддаваўся ёй, у той час як прытарможаная зноў даганяла мяне, таго, хто яе прытармазіў, і авалодвала мною. Альбо я дыхаў так няглыбака, што паветра ў горле, у грудзёх і ў страўніку ператваралася ў сталёвую спружыну, якая прымушала мяне хістацца туды–сюды, пакуль я зноў ня ўсмоктваў паветра на поўныя грудзі, а разам зь ім і дрэнныя думкі. Альбо я, дыхаючы, засяроджваў сьвядомасьць на самім дыханьні, якое ўваходзіла ў мяне і выходзіла зь мяне, і я разважаў над гэтым, пакуль дыханьне і сьвядомасьць не заблытваліся адно з другім і кроў не прылівала мне да галавы. Гэта здаралася, аднак, і тады, калі я разьнявольваўся і пачынаў дыхаць яшчэ да таго, як наступіць голад на паветра, і як я прычэкваў тады, калі цела маё без удзелу волі, дыхаючы згодна з уласнымі правіламі, пачне падымацца і апускацца, таму што цяпер рабілася так, што я стойваўся з запалым страўнікам і нічога ня чуў, акрамя таго шуму ў слыхавай адтуліне, якім я поўніўся і ад якога пухнуў і які мне вельмі дацінаў, так што я нарэшце мусіў браць дыханьне пад кантроль. Потым я меў завядзёнку безвач ісьці па калідоры на кухню, усьляпую адчыняць дзьверы кухоннай шафы і з мурашкамі на пальцах намацваць хлеб і нож. Калі я зноў ляжаў у ложку і еў хлеб, то ў прыкусе імжыла стома; я мог расьцягнуцца і жаваць, безь перастанку напіхваючы хлеб у рот, і дажаваць думкі з хлебам у сьне. Але калі я прачынаўся, яны зноў былі ў сухасьці на языку, а таксама і ў рэшце хлеба, які, нагадваючы мне пра тое, што было, ляжаў у моцна сьціснутай руцэ. Я ня рухаўся. Я прыходзіў да разуменьня, адкуль смак на языку і адкуль пясок, які рабіў ломкай скуру на пальцах, быццам звонку ішоў дождж; аднойчы, так мне гэта прыйшло на розум, у мяне быў на пальцах бруд, калі я спаў. Потым, калі я аднаго разу варухнуўся (калі б я ні пачынаў варушыцца), мае мазгі ўспаміналі пра шолахі, якія вуха чула калісьці даўно, пра пах вуглю ў глотцы і водбліскі ад жару на змрочных мурах, якімі перапоўненыя былі ўжо шырака адчыненыя вочы, у той час як я без супраціву ляжаў яшчэ нейкі час (ліхі час, сказаў мой брат) паміж абуджэньнем сьвядомасьці і абуджэньнем пачуцьцяў. Потым я нібы сядзеў перад печчу, утаропіўшыся ў полымя.

Вэлясыпэд

“Пару дзён таму”.

Пару дзён таму іду я паўз спартовую пляцоўку і чую, што крычаць дзеці. Я спыняюся і чакаю, калі яны наблізяцца; я чую, як яны падбіваюць перад сабой мяч і як яны паступова перастаюць крычаць, і як яны гавораць перабіваючы адзін аднаго, і як яны гавораць гучней, і як яны ўсё больш расьцягваюць словы, і як яны гавораць больш павольна, чым больш павольна яны набліжаюцца. Я стаю і слухаю, што яны кажуць і пра што распавядаюць, і я слухаю, пра што яны распавядаюць, як яны гавораць і як паўтараюць сказанае. Я чую, што яны без упыну гавораць пра нейкі вэлясыпэд; я чую, як адзін зь іх распавядае і пытае, ці не належыць гэты вэлясыпэд часам мне; потым я чую, як тое самае гаворыць другі, а потым чую, як тое самае гаворыць трэці: ці не належыць гэты вэлясыпэд мне.

Які вэлясыпэд? гавару я.

Той, ля кінатэатру, чую я адказ аднаго зь іх.

Адкуль у мяне мог бы быць нейкі там вэлясыпэд? кажу я.

Нібы я там яго ўчора паставіў, чую, як гаворыць другі.

Калі? гавару я.

Увечары, зноў чую, як гаворыць адзін зь іх.

Калі ўвечары? гавару я.

Я чую, як адзін зь іх называе час.

У гэты час я быў дома, гавару я.

У гэты час ты быў у мястэчку, чую, як гаворыць другі.

Мне не было чаго шукаць у мястэчку, гавару я.

А ты нічога і не шукаў, зноў чую, як гаворыць другі.

Мне не было чаго там рабіць, гавару я.

Яшчэ як табе было што там рабіць, чую, як кажа адзін.

У мяне было, гавару, другіх справаў даволі, чымся ісьці ў мястэчка.

Твой твар выдае, што ты хлусіш, чую, як гаворыць другі.

Ну добра, кажу, я, як вы гаворыце, ішоў па мястэчку і каціў вэлясыпэд.

Я каціў вэлясыпэд паўзь іх, чую, як гаворыць адзін.

Правільна, гавару, вы бачылі, як я ў азначаны час каціў па

мястэчку вэлясыпэд, ахвотна вам веру. Такім чынам, я перакінуў куртку праз руль і штурхаў вэлясыпэд па мястэчку, трымаючы яго адной рукой за сядло, а другой за хамут руля; сьцены дамоў, якія пабудаваны адзін да аднаго ўпрытул, давалі мне накірунак. Вы стаялі ля акна, можа быць, вы падцягнулі крэслы, большыя стаялі на падлозе, меншыя на крэслах ззаду вялікіх, вы стаялі за акном, не штурхаючы адно аднаго і ня тоўпячыся і не паказваючы воклічамі, заўвагамі на чалавека, які сьлепа піхаў перад сабой па мястэчку вэлясыпэд; зусім наадварот, вы заставаліся спакойнымі, вы спакойна круцілі галовамі, прапускаючыя мяне позіркам, а я памалу ішоў па шырокай, пыльнай палосе побач з вуліцай паўз муры дамоў насустрач сонцу паўз стойку для вэлясыпэдаў аўтабляхара, паўз стойку для вэлясыпэдаў першага шынка, паўз стойку для вэлясыпэдаў другога шынка, паўз стойкі для вэлясыпэдаў рамізьніка, паўз стойку для вэлясыпэдаў трэцяга шынка, паўз стойкі для вэлясыпэдаў маёй сястры, паўз стойку для вэлясыпэдаў гандляра электратаварамі, паўз стойку для вэлясыпэдаў гандляра напоямі і паўз стойку для вэлясыпэдаў гандляра сельскагаспадарчымі прадуктамі аж да кінатэатру, дзе я нарэшце прысланіў вэлясыпэд да сьцяны пад вітрынай.
Як ні ў чым не бывала, чую, як гаворыць зноў другі, я разьмераным крокам прайшоў праз усё мястэчка.
Такім чынам, акрамя вас мяне мусіў заўважыць яшчэ нехта, гавару я.
Увесь сьвет бачыў цябе, чую, гаворыць другі.
Але ж ніхто з тых, хто мяне бачыў, не прамовіў ні слова, гавару я.
Шмат каго не было, чую, як зноў гаворыць адзін, шмат хто выйшаў з дому; вокны шынкоў, чую, як гаворыць другі, не маглі стрымаць наплыву наведнікаў; тыя, хто выходзіў на вуліцу, чую, як зноў гаворыць другі, ад цікаўнасьці і пасьпеху перадавалі гэта адзін аднаму, але словы, чую, як гаворыць чацьвёрты, яны, зважаючы на мяне, не прамаўлялі.
У адпаведнасьці з гэтым, гавару, я паставіў вэлясыпэд пад вітрынай і зноў пайшоў.
Ды не, чую, як гавораць некалькі чалавек адзін цераз аднаго, я прыткнуў яго да слупа прыпынку ля кінатэатру; потым я стаяў побач і чакаў на аўтобус.
Гэта зразумела, гавару, але як вы растлумачыце сабе, што я

паставіў вэлясыпэд туды?
Да яго рамы быў прывязаны цэтлік, чую, як гаворыць адзін; на цэтліку, чую, як гаворыць другі, быў напісаны адрас; адзін з наведнікаў, чую, як гаворыць трэці, набраўся нават сьмеласьці спытаць мяне, каму я хачу пераслаць вэлясыпэд; я нібыта ня доўга думаючы, адказаў, што гэта вэлясыпэд майго брата; я спатыкнуўся на яго сёньня ў сьвірне і ўпаў; пара яму з двара, кінуў я коратка таму, хто пытаўся; нажніцамі я штампануў дзірку, прасунуў празь дзірку палоску паперы і потым прывязаў цэтлік да рамы.

А ну апішэце вэлясыпэд, гавару я.
Гэта вэлясыпэд зь перадачамі, чую, як гаворыць адзін. А тросік перадачы парваны зьверху каля руля; на ім узьдзьмулася фарба; тут і там пухіры ўжо палопаліся, вэлясыпэд занадта доўга стаяў на сонцы і на дажджы; ён занадта доўга стаяў пад адкрытым небам, чую, як гаворыць другі, адышоў задні балотнік і аж да стоп–сыгналу даў касую, вышчарбленую расколіну. “Калі ты будзеш закідаць на яго нагу, ты лёгка можаш зачапіцца нагавіцамі. Трэба зважаць; гума на левым панажы крыху адышла. Найлепш здымай чаравікі, каб не сасьлізнула нага. Ідзі сюды. Гэта зусім проста. Табе трэба толькі паставіць левую нагу на левы понаж, разьбегчыся, прыхінуцца да руля і, адштурхнуўшыся, перакінуць ззаду правую нагу цераз задняе кола. Падкурчы пальцы на нагах, калі стаіш на панажы. Не глядзі на дарогу перад пярэднім колам, глядзі туды, куды ты едзеш. Глядзі на кіёк. Глядзі сюды на кіёк, баязьлівец такі. Ідзі з вэлясыпэдам назад да ганка і станавіся на ніжнюю прыступку. А цяпер стоячы закідвай нагу за раму. Цісьні цяпер пальцамі на понаж і штурхайся. Ідыёт. Уставай. Уставай жа. Падымай вэлясыпэд. Станавіся на прыступку. Падымай нагу і націскай на понаж. Трымай вэлясыпэд роўна. Адштурхніся ад прыступкі. Табе трэба толькі адштурхнуцца і адразу злавіць другой нагой понаж. Потым ты цісканеш яго ўніз, і першы понаж падымецца, і ты нахінеш яго ўніз. Не глядзі на ногі. Глядзі туды, дзе кіёк. Сюды глядзі. Штурхайся цяпер. Глядзі, камень. Выкіроўвай. Выкіроўвай, кажу. Казаў жа, глядзі, камень. Уставай. Уставай ужо. Нічога. Ідзі сюды. Станавіся на прыступку. Не глядзі на ногі. Глядзі

туды, куды ты павінен ехаць. Трымайся. Руль трымай мацней. Не глядзі на рукі. Цяпер піхайся. Не забывайся націскаць на панажы. Кіруйся ўбок. Глядзі на кіёк. Націскай нагой на тормаз, сказана табе!”
У вэлясыпэдаў зь перадачамі няма нажнога тормаза, гавару я.
Ніхто і ня кажа пра нажны тормаз, чую, як гаворыць адзін; вэлясыпэд пафарбаваны ў чырвонае і белае, чую, як гаворыць другі; доўгая белая страла ў чырвонай рамцы, чую, як гаворыць адзін; панажы, калі я ішоў, круціліся, пагнуты задні балотнік цёрся аб раму, у адным месцы рамы сьпіцы дзынкалі аб крывы мэтал, і гула дынама–машыны.
Я што праўда сярод белага дня ішоў па мястэчку? гавару я.
Бадай што так, чую, як гаворыць другі, аднак увечары ты зноў ішоў назад.
Расказвайце далей, гавару я.
А менавіта я не аддаў вэлясыпэд у апошні аўтобус, чую, як гаворыць другі; зьдзіўлена абмяркоўвалі тыя, хто выходзіў, маё набліжэньне і непатрэбнае спыненьне перад адкрытай машынай; між тым, чую, як гаворыць другі, зь сьветлых палосак на кантактнай частцы пратэктара яны не маглі зрабіць аніякае іншае высновы, акрамя таго, што я ішоў з вэлясыпэдам па пыльнай палосе побач з вуліцай.
Добра, гавару, няхай я стаяў, як вы сьцьвярджаеце, перад адчыненымі дзьвярыма, пакуль сьціснутае паветра не затуліла створкамі дзьвярэй выхад; потым я на месцы і адразу, трымаючы вэлясыпэд у руках, без аніякага выніку пасунуўся да сябе назад празь мястэчка.
Ня так, чую, як гаворыць адзін. Якраз наадварот, чую, як гаворыць другі, я застаўся і прастаяў ня рухаючыся да познай ночы.
Я пярэчу, гавару я, наўрад ці маглі б вы да познай ночы быць там.
Нам гэта перадалі, чую, як гаворыць адзін.
Хто? гавару я.
Людзі з кіно, чую, як зноў гаворыць адзін.
І вы ані не сумняяцеся? гавару я.
Гэта ж быў кароткі фільм, чую, як гаворыць другі; гэта і ня быў нават фільм, чую, як зноў гаворыць другі; у кінатэатры быў сход, чую, як гаворыць яшчэ адзін.
Гэта быў кароткі фільм, чую, як гаворыць адзін, альбо

рэклямная акцыя, чую, як гаворыць адзін, альбо вучэньні грамадзянскай абароны, чую, як гаворыць адзін, альбо разявакі зьбегліся, чую, як гаворыць адзін, не, заклік адміністрацыі, чую, як гаворыць другі, агалошаньне абвесткі, чую, як зноў гаворыць другі, трывога, чую, як гаворыць адзін, абвяшчэньне надзвычайнага становішча, чую, як гаворыць адзін, публічная перасьцярога, чую, як гаворыць яшчэ адзін; і я слухаю, як яны гавораць наперабой і падказваюць адзін аднаму словы і гавораць ціха і гучна і цішэй і зусім ціха, і выгаворваюць, і я чую, як яны адно ставяць пад сумлеў, другое прызнаюць і пярэчаць адзін аднаму і падказваюць адно аднаму супярэчнасьці, і я слухаю, як яны гавораць і выгаворваюцца, аж пакуль справа не даходзіць да таго, што я стаю, магу стаяць, магу стаяць сабе тут і гляджу на іх. Хоць я і сьляпы, я гляджу на іх.

Апрананьне

Тымчасам Ґрэґар Бэнэдыкт (так яго клічуць альбо нешта накшталт таго) апрануўся па–нядзельнаму.

Ён сядзеў на ложку і чысьціў чаравікі. Ён пагаліўся і памыўся. Ён пайшоў да ложка і мяккай шчоткай навёў бліск на скуру. Ён пайшоў да стала і прысеў ля стала на ўслон.

Ён апрануў на ногі шкарпэткі. Ён устаў і пайшоў да шафы. На гэтую дзейнасьць ён патраціў многа часу. Апранаючы шкарпэткі, ён патраціў менш часу.

Ён павярнуў ключ і адкрыў дзьверцы шафы. Ён выняў з шафы гарнітур. Ён сьцягнуў з плечыкаў нагавіцы і паклаў пінжак на ложак. Ён сеў побач зь пінжаком. Ён залез левай нагой у калашыну. Ён залез правай нагой у калашыну. Ён патраціў на гэта, і не таму што ён сьляпы, шмат часу.

Ён устаў і падцягнуў нагавіцы. Ён зашпіліў іх. Ён працягнуў пас праз спражку. Ён зашпіліў спражку. Вялікім пальцам накіраваў ён цьвічок спражкі праз звычную, пашыраную ў параўнаньні з другімі дзірку. Паступова ён прасунуў канец паса праз усе петлі.

І на гэта ён патраціў даволі часу.

Цяпер ён стаяў паміж сталом і ложкам.

Ён пераадолеў нерухомасьць і падышоў да шафы. Ён узяў з шафы гальштук.
Ён пайшоў да акна. Па дарозе ён працягнуў пятлю гальштука праз галаву. Ён зашпіліў кашулю і паставіў каўнер тырчма. Ён узяў вузел гальштука двума пальцамі, а другой рукой зацягнуў пятлю вакол шыі.
Завязваньне гальштука доўгі час займала яго.
Ён пайшоў да ложка і ўзяў пінжак. Ён накінуў пінжак на плячо і пайшоў да шафы. Ён зачыніў дзьверцы шафы і павярнуў ключ.
Ён скінуў пінжак з пляча. Рукой ён адтуліў яго ад сябе.
У гэты час ён стаяў пасярод пакоя.
Правую сьціснутую руку прасунуў пад левую руку і ў пінжак.
Ён нацягнуў пінжак на правае плячо. Правай сьціснутай рукой ён замацаваў пінжак на правым плячы. Ён растуліў кулак правай рукі на плячы.
Растульваньне кулака каштавала сьляпому многа часу.
Левай рукой ён хватануўся ззаду. Ягоная левая рука ўехала ў пінжак. Ён пацягнуў пінжак уверх і нацягнуў яго на плячо.
Ён пайшоў да ложка. Ён нахінуўся, каб узяць шчотку. Ён паклаў шчотку ў адпаведную скрыньку. Ён пайшоў з скрынькай да стала. Ён засунуў яе пад стол.
Гэты працэс забраў у яго колькі часу.
Ён пайшоў да мыйніцы і выліў праз мыйку ваду зь міскі.
Ён стаў побач.
Тылам далоні ён пачасаў бараду.
Потым ён даволі доўгі час ішоў да дзьвярэй, доўгі час ішоў па калідоры і вельмі доўгі час спускаўся з ганка.
Ён хутка перайшоў падворак.
Ён вярнуўся.
Цяпер ён, глыбака засунуўшы рукі ў кішэні, стаіць прытуліўшыся да сьцяны дому побач з прыступкамі ганка.
Трэба ўявіць яго сабе, як ён стаіць, курыць, зь вялікай, урачыста нахіленай галавой, шыя ў ценю, у ценю і рука, якая, як заўсёды, абхоплівае ніжні рант крыса, а твар у сонцы, не заняты нічым, акрамя таго, што выпускае дым з рота і адтулінаў вачэй.
Думкі прыходзяць і адыходзяць.

Ён уяўляе сабе едучы цягнік.

Зьяўленьне жанчыны

Пасьля гэтага я зноў дому і сяджу на кухні, і я чую, як мой бацька, які скончыў працу, праходзіць тыя пару крокаў па бэтоне ў калідоры і як ён, стоячы на месцы, скідае боты, спачатку прытрымліваючы ззаду за ўнутраную частку пад'ёму адзін, і як ён такім чынам вылузвае пятку да халявы і як мяч прысаджвае на нагу пусты бот і з стукам пуляе яго аб сьцяну пад сходы, як ён пасьля гэтага вольнай ужо цяпер нагой, якая, упёртая ў раму дзьвярэй, служыць яму лаўкай для здыманьня ботаў, турзаючы і тупаючы цягне з нагі другі бот і, не перастаючы быць у рухах разчэйшым альбо спакайнейшым, пуляе па сьцяне і гэтым ботам. Потым я чую, як ён з сапенькем уваходзіць, ідучы далей выхоплівае з пліты коўш і тыцкае яго пад кран. Я чую гергатаньне крану і глухое помканьне паветра, калі бацька засоўвае ў кран палец, пустое смактаньне пальца, якое абрываецца глухім помканьнем, калі ён зноў вымае палец. Я зноў чую ў трубе толькі гергатаньне. У той час як ён вешае коўш на край мыйкі, ён схінаецца ўніз і абхоплівае кран губамі; як толькі ён уцягвае ў сябе паветра, я чую ў ягоным страўніку тугое, высокае керханьне, якое я сам сабе параўноўваю з крыкам фазана. Ён з чмяканьнем прымае губы ад латуні і стаіць згорбіўшыся, з губ цяпер ужо пры каўшы з ломкім гукам падае вада на бляху, а потым, зьвёўшыся амаль да бязгучнасьці, вада на ваду; аднак перш чым яна падступае да губ, бацька хутка апракідвае коўш і вылівае яго. Калі потым ліючая з крана вада становіцца халоднай, ён зноў набірае яе і пачынае сёрбаць і глытаць, пастаянна паварочваючы судзіну наперад у рот, аж пакуль яму не закрывае рот. Праз паўкруг перад сваім тварам ён глядзіць на мяне вачыма, якія зусім ня рухаюцца, і п'ючы выплюхвае ў ваду пытаньне, якое я не разумею; толькі па падвышаным тоне апошняга слова я пазнаю, што ён пра нешта пытаецца, таму я належным чынам ківаю і прамаўляю слова, якое належыцца пры ківаньні. Ён выпростваецца на ўсю сваю велічыню, выцірае рот, аднак ня тылам далоні, а яе патаўшчэньнем перад вялікім пальцам, і размыкае губы, пакідаючы маленькую адтуліну. Пасьля гэтага ён вешае коўш назад на гучок і закручвае за сабой кран; сьпінай да мяне, падняўшы спачатку левае, потым правае плячо, ён шкрабе сябе пад пахай, потым залазіць рукой у нагавіцы і чэша пад чэравам, напасьледак вялікім пальцам

правай нагі скрабе костку левай і ставіць сваё пытаньне ў другі раз. Ён пытаецца ў мяне (другімі словамі), дзе я быў увечары. Я быў у мястэчку, адказваю я, прайшоўся крыху сабе. Было некалькі дробных справаў, паправіўся я, бяз справы я там не застаўся. Чуць такое яму радасна, гаворыць бацька (другімі словамі), тручы пальцы аб анучу для посуду. Але дзе ж ты там бадзяўся? Я заходзіў у глядзельную залю кінатэатру, пярэчу я, але там было зусім пуста. Тады я памкнуўся да сястры ў шынок і там спытаўся пра сёе–тое. Вечарам, заканчваю я свой аповед, мне ўжо нічога іншага не заставалася, як ісьці дахаты. Ня гледзячы на мяне, бацька круціцца на адным месцы, нешта выглядаючы, і прастуе да судніка. Я пазнаю ціхае шмяканьне пантопляў, калі ён адсланяе ідучы босыя ногі ад падлогі, і потым шчоўканьне ў каленях, калі ён прысядае на кукішкі і адчыняе дзьверцу шуфляды. Я чую, як ён, адно засунуўшы руку ў суднік, ужо зноў дастае яе і патэльню, прысядае на калені, зноў выпростваецца, пальцамі нагі наўскась закрываючы шуфляду і на хаду прапіхвае мне да стала часткамі сваё наступнае пытаньне, апошняе слова якога вымаўляе ўжо вяртаючыся да пліты: ці гэта я паставіў вэлясыпэд ля сьвірна? Бо ён наўрад ці мог. Ён гаворыць, што можа лёгка паверыць, што вэлясыпэд мне дзе–небудзь, хай сабе ў мястэчку, настолькі абрыд, што я ніяк ня мог зрабіць іначай, акрамя як прывалачы яго сюды. Я хітаю галавой і гавару словы, якія належаць да хітаньня. Ці гэта праўда? пытаецца ён (другімі словамі). Гэта праўда, настойваю я на сваім адказе. Калі я прыйшоў? Я кажу яму час, калі я прыйшоў, спачатку з свайго месца за сталом проста ў твар, калі ён нахіляецца і вымае з шуфляды нож, потым такім самым цьвёрдым голасам яму ўсьлед да халадзільніка, зь якога ён бярэ масла.

Аднак перш як ён, з патэльняй пад пахай, у адной руцэ масла, у другой нож, паварочваецца да пліты, перакочвае масла з адной рукі ў другую, якая трымае нож, свабоднымі пальцамі мацае пад пахай да дзяржальна патэльні і перастаўляе інструмэнт з–пад пахі на роўнядзь пліты; перш як я пазнаю аддаючае рэхам у пліце клёканьне выключальніка, шкрабаньне нажа аб паперу, у якую загорнутае масла, мяккі гук падзеньня і спаўзаньня масла на награванай патэльні, сіпеньне і гатаваньне таючага масла; перш як бацька зноў прастуе да пліты, разьбівае на патэльню яйка, выкідвае шкарлупіны ў

сьметніцу, перш як ён сыпле на яйка соль; перш як я пазнаю насупраць мяне за сталом шоргат крэсла, перазвон сталёвага судзьдзя для яды, турзаньне за перакошаную шуфляду; перш як бацька, штурхаючы шуфляду адначасна грудзямі і чэравам, пры хцівым маўчаньні сядае да мяне за стол і з занесенай для захвату над лустай хлеба на воскавым абрусе левай рукой закалвае зубцы відэльца наўскась зьверху ўніз у яйка на патэльні і праз плячо, адварочваючыся, кідае, перабіты ў ядзе, позіркі на яе; і перш як я чую выбух увушшу — увайшла яна, ідучы, павесіла хвартушок на пліту, сухімі босымі нагамі ходка і спакойна рушыла да канапы, я пазнаў пах хлява, яна цяжка і спакойна апусьцілася на канапу, грузна паставіла ў шырокай сукенцы ногі адна побач з другой, зачапіла ўласнай нагой ножку канапы, прытулілася там, седзячы, да сьцяны і глядзела сюды, не міргаючы павекамі і не падглядваючы на мяне цішком, — альбо не глядзела. Потым, раз гэта выконвае ён, раз ён гатуе на пліце сабе вячэру, яна сядзіць занурыўшыся ў сябе, сядзіць з адсутным тварам, калі ўжо ён з поўнай патэльняй наведвае стол, калі ўжо цяжка апускаецца на крэсла, калі ўжо хапатліва пачынае зьядаць вячэру, сядзіць нахіліўшыся наперад на скосе седзіва, выпускае з шырака разамкнутага рота згаданыя гукі, бяздумным позіркам глядзіць на маўкліва–чуйнага сьляпога; нарэшце амаль не адкрываючы рот пытае бацьку пра гэта, быццам яго і не было тут самога, ці ўжо сыты сын, чуе, як над сталом бацька з боку пражоўваючых зубоў пытае (другімі словамі) сына, ці ён, сын, ужо сыты, чуе, як ён, сын, дае бацьку для яе, для бацькавай жонкі, адказ, што ён, сын, наеўся, павячэраўшы ў мястэчку ў сястры і што ён дзякуе за пытаньне; і чуе цяпер, як бацька, напіхаўшы рот, пераказвае ёй другімі словамі адказ, што сын ужо сыты; нажэрся ў сястры. Памалу–памалу яна ўстае і разглядвае чэзлыя потныя сьляды ад падэшваў яе мужа на падлозе і чорныя палосы поту на голых нагах пад сталом, якія падымаюцца і курчацца, як толькі галава торгаецца па ежу.

Што са мной? пытае яна, пасьля таго як у маіх вушах выбухнуў гук. Ён перадае пытаньне другімі словамі. Гэта відэлец упаў? пытаю я ўслухваючыся.

Але гэта толькі выпала ў яе з рук альбо з сукенкі, калі яна ўстала, нягнуткая папера ліста.

Лінія электраперадачы
Драты лініі электраперадачы выходзяць з электрастанцыі Бронц. “Яны цягнуцца адтуль ува ўсходнім накірунку да мястэчка Чау, збочваюць на паўночны ўсход, праз прасекі цягнуцца на гару Вал, у тым самым накірунку апускаюцца да мястэчка Грудэн, неўпрыкмет пакідаюць мястэчка Шланц, мястэчка Рыч, мястэчка Полаш, мястэчка Чэрнаглаў, мястэчка Дзявіцк, мястэчка Прокі, мястэчка Акоп, мястэчкі Дваццаць, Трыццаць і Балоты, неспадзеўкі паварочваюць на поўнач і цягнуцца далей у гэтым накірунку празь мястэчка Гразі, празь мястэчка Прух, празь мястэчка Смакі, празь мястэчкі Сродма, С’ютра, Трэкіш, Крыж і цягнуцца далей празь мястэчка Узвышша і празь мястэчка Заморск да мястэчка Пустэльнікі”, дзе я стаю пад бакавінамі апоры і прыкладваю вуха да бакавой нясучай, пасьля таго як я, з нагой на бэтонным фундамэнце, стукнуў каменем па гулкім рыштаваньні там, дзе я стаяў, і пачуў над сабой гул і шаргатаньне шорсткіх крылаў, дзе я цяпер чую далёкае водгульле, на поўнач, “куды ўверх па полі вядуць драты, ад мястэчка Пустэльнікі празь мястэчка Скокі, празь мястэчка Канары, празь мястэчкі Сьвятакаламанаўку, Сьвятабэнэдыктынаўку, Сьвятаянаўку ў ценю, Сьвятакасьмінку–і–Даміянаўку пры дарозе, Сьвятагатаўку, Сьвятаагнэсаўку, Сьвяталюцыеўку (просіць за нас)” і ў гэтым накірунку далей праз падобныя месцы, аж пакуль мне ня чутна болей бамбардавальнікаў.
“Ідыёты стаяць з ранку да вечара ля сьцяны дому, пускаючы сьліну з рота, і гуляюць з сваім ценем у сонечны гадзіньнік”.

Час, праведзены ля сьцяны
У той час, як я стаю ля сьцяны (апісаньне яшчэ не прасунулася далей), я наважваюся ісьці цераз падворак да сьвірна і паставіць на колы вэлясыпэд. Ноччу я чуў, як вецер альбо дождж зрабіў зямлю пад коламі сьлізкай, апракінуў яго. Так будзе прынамсі пазьней за сьняданкам спрабаваць растлумачыць гэта бацька. Я зьбіраюся зрабіць гэта, не перастаючы церці абедзьвюма даланямі справа і зьлева па

сьцяне. Я стаю ля сьцяны дому і паказваю сваім ценем час. Цяпер толькі бярэцца на дзень. Я зьбіраюся ісьці да сьвірна, растлумачваючы сам сабе, як гэта карысна падняць там вэлясыпэд. Я нерухома стаю ля сьцяны. Дождж парным цяплом падымаецца ад зямлі. “Перад справамі гаворыцца многа слоў. Паміж словамі і справамі праходзіць час”. Цела цяжка набрыньвае млявасьцю. Пальцы шорстка шкрабуць сьцяну. Прыходзяць шмат якія думкі, аднак ні з воднай зь іх не гавораць млосныя члены. Мой цень на сьцяне дома мізарнее. Загады мазгоў натыкаюцца на глухое каменьне. Я не магу сысьці зь месца і прайсьці ў сьвіран. Шоргаючыя кончыкі пальцаў млява соўваюцца па зярністай тынкоўцы. Час праходзіць у руках, дарма што я шалёна злуюся на млявасьць, — я з–за шаленства амаль губляю над сабой кантроль. Я не магу перасіліць сябе і накіравацца з гэтага месца празь бездань падворку ў другое месца. Што я ні камандую сваім нагам, гэта ня зрушвае мяне зь месца ў дарогу, якой дзесяць крокаў. Сьцяна пыльная. Круглястыя павукі торкаюцца на доўгіх нагах уніз і ўверх. У тынкоўцы адтуліны бы кеглявідныя ўваходныя адтуліны стрэлаў. У адтулінах цэлы дзень вісяць, растапырыўшы крылы, заснулыя молі. Пальцы маглі б распрастацца і пагладзіць адну з моляў. Але моль застаецца бяз руху. Я адштурхваюся. Я стаяў ля сьцяны з завязанымі вачыма. Я выкарыстоўваю час, шукаючы з гэтымі завязанымі вачыма дарогу ад сьцяны да сьвірна. Я іду спатыкаючыся, быццам я толькі што стаў сьляпы. Між тым каля сьвірна я не знаходжу ніякага вэлясыпэда. Ці там хоць калі быў які? Мой бацька яшчэ едзе ад става. Бацькава жонка яшчэ ня выйшла з дому. Пра нейкую трэцюю асобу я да гэтага часу ня чуў.

Я ўяўляю сабе едучы цягнік.

Кот

Хоць у сьвірне і няма травы, але там пахне травой. Пах ідзе ад другога воза, стаіць з паднятым дышлем ззаду на вяршыні бэтоннага мура; першы воз яшчэ ў дарозе; для яго прызначаныя пляц і прастора, куды я ступаю. Я адчуваю пад падэшвамі адбіткі капытоў у стаптанай гліністай глебе, пілавіньне і рыпучыя кавалкі кары, якія паадвальваліся, калі пілавалі бярвеньні. Каленам я натыкаюся збоку на дзяржальна сякеры;

калі я намацваю яго, я заўважаю, што лязо ад штуршка вызвалілася з амаль разваленай ударам калоды і цяпер паступова выходзіць наперад, а дзяржальна ў маёй руцэ ідзе ўніз. Перш як сякеры вываліцца з калоды, я перахоплівaю яе, вымахваю над сабой, даю дзяржальну прасьлізнуць праз адно зьлёгку абнялыя яго пальцы амаль да самага зялеза і дрыготкай рукой уганяю лязо цераз усю шыю ў дробных жылах ў калоду. Іншым разам тады курыца, калі моцна не трымаць яе за крылы, лятае без галавы па сьвірне; яна імчыцца па бэтоне, б'ецца аб складанку дроў, аб ліштвы, аб бэлькі столі, аб пілы, якія вісяць на ліштвах, аб дрыжачае яшчэ дзяржальна сякеры, зьмятае з калоды ўласную галаву і яшчэ раз стукаецца ў мур, які што мага адмахвае яе на падлогу, дзе тая, ляпаючы крыламі, бегае па крузе і малоціць па пілавіньні чырвоным шлянгам шыі, які рытмічна выкідае на драўляны пыл кроў.
Альбо ты што другое хочаш? спытаў ты.
З воза, на якім я сяджу, чуцён магутны плюскат вады, якая праз поўны вадасьцёк абрыньваецца на падворак спачатку з даху сьвірна, потым далей з даху хлява і з даху дому. Мала што бачна: куры пасталі ў дзьвярах хлява, на гзымсах двух вакон і на гзымсе перад чорнымі дошкамі току. Яны стаяць шчытна адна пры адной, ня рухаючыся. Не, яны не натапырваюць пер"е. Вось адну зь іх выціскаюць з падваконьня; летучы яна разьвінае крылы. Я слыхам распазнаю лапатаньне крылаў і пырсканьне калюгі. Курыца справа і зьлева заточвае аб камень дзюбу і пярэкулем кідаецца да дзьвярэй хлява; яна шчыміцца праз шэраг другіх; сярод нерухомых жоўтых ног яе больш нельга адрозьніць. У калюжынах я бачу варонкі ад кропляў, заглыбленьні і выкіды ад апалых струмянёў, якія потым гонка плывуць бурбалкамі па вадзе. Я чую плескатаньне дажджу па бляшаным даху сьвірну і бесьперапыннае сіпеньне і пошчак на надворку. Ніжняя частка брамы ўжо цёмная ад вільгаці; на фарбе бачныя адштурхнутыя ёю кроплі; там, дзе яна аблушчылася, дрэва ўжо паглынула ваду. Дзьверы цяпер крышку падаюцца ўнутро, але клямка застаецца на сваім месцы; рух дзьвярэй пазнаецца толькі па растучай цені, якая пашыраецца з боку клямкі. Я нічога ня чую. Зьяўляецца кот. Ты што, нічога лепшага ня змог прыдумаць? Гэта кот, сказаў ты. Яго нясе ўніз па прыступках; пад вадасьцёкам ён пракоўзваецца ўздоўж сьцяны хлява, застывае цяпер перад каленам

вадасьцёку, пераскоквае трубу і шыбуе ўздоўж сьцяны далей. Цяпер ён узіраецца на чародкі курэй. Я між тым нічога ня чую. Ён паварочвае галаву да курэй, якія дрэмлюць на гзымсе акна. Тады ён рэзка павяртае галаву да сьвірана. Ён усё яшчэ цікуе пад дахам хлява. Я чую толькі сіпеньне і пошчак кропляў на падворку; наўрад ці твой покліч даляцеў да ягонага вуха. Ён пачуў мяне. Ён подскакам кіруецца сюды. Вось ён ужо ў сьвірне. Я ня чуў, як ён прыбег. Я ўсё яшчэ ня чую яго. Ён стаіць на пілавіньні і абтрасаецца. Калі ён бег ўжо па дажджы і калі ўжо дождж вогкімі аблокамі туга прыпускае па падворку, гэтага руху варта было чакаць. Цяпер ён, нічога не падазраючы, скача цераз паленьне, заскоквае на козлы і сядае там на драбінах. Ён зноў падымаецца, каб рухацца. Сасьлізгвае ўніз і неспакойна цялёпаецца да складанкі дроў. Гэта вельмі кашчавы кот; ён блізкі да галоднай сьмерці; вочы па кутках поўныя гною; на хрыбце месцамі бачная голая скура. Цяпер ён прысеў наверсе на складанцы; ён зноў рушыў; ён кідае касы позірк сюды; ён круціцца на месцы і па паленах бяжыць у дальнюю палову сьвірну. У баразьне, якую выбілі кроплі, пад дахам ляжыць на зямлі кантаватае палена. Гук кропляў, якія падаюць на палена, адрозьніваецца ад гуку кропляў, якія падаюць на друз, пясок і калюгі вадасьцёку. Кот стаіць на кучы дроваў у дальнім кутку сьвірну; ягоная поўсьць дыбіцца; ён высочвае зьверху, ён круціць галавой. Вось ён, неадрыўна гледзячы на воз, на якім мы сядзім, кіруецца цераз дровы ўздоўж задняй сьцяны. Ён надта худы. Пад поўсьцю бачныя скабы: адна, другая, трэцяя, чацьвёртая...

Я чую шум кропляў, якія падаюць з цэглаў на кантаватае палена; ад кропляў у драўніне зьяўляецца шум; хай сабе ён глушэйшы і цішэйшы за шапаценьне кропляў па друзе і калюгах вадасьцёку, але ён выразна чутны мне. Драўніна пакрытая шкляністым слоем вады; у дзірках ад сучкоў выбліскваюць кроплі, перш як быць паглынутамі наступнымі. Дождж сьціхае. Кот скача на бэлькі столі, ён скача яшчэ раз, ён зачапляецца лапамі за драты, якія тырчаць з бэтону. Я чую, як кроплі падаюць у баразну. Іхнае шапаценьне цяпер паўсюль аднолькавае. Кот бяжыць назад у куток, там ён прыціскаецца да падлогі і падкрадваецца бліжэй; ён адскоквае ўбок і затойваецца за дровамі; ён раптам пачынае віскатаць і якатаць нешта дзіцячае, становіцца на заднія лапы і цягнецца да бэлек

столі; ён цягнецца, аж пакуль не стаіць адно на кіпцях, і прыціскаецца жыватом да сьцяны. Пры гэтым яго сьпіна пайшла ямамі; галава ў яго торгаецца са сьпіны; ён паглынае позіркамі непразрыстую столь; пярэднімі кіпцямі ён дзіка шкрабе бэтон. Я чую шкрабаньне, казаў ужо я. А цяпер я чую сьвіст паветра і ўдар цела. Ён адно скура і косьці, ты ўжо казаў: ты можаш памацаць — у жываце адбіліся канты бэтоннай апалубкі. Я чую ўдар і якатаньне; якатаньне выцясьняе ўдары, а ўдары спрычыньваюць якатаньне. Я чую ўдары, скуголеньне, якатаньне. Потым я чую толькі якатаньне. Потым я чую ўдары і якатаньне. Потым я чую толькі ўдары. Потым я чую ўдары, скуголеньне і якатаньне. Усе гэтыя гукі ўтвараюць трохтактнае адзінства.

Я паслабляю пальцы і нарэшце адпускаю дзяржальна сякеры. Я чую, як па надворку, з кашулямі цераз руку, крочыць жонка бацькі. Яе рухі пераходзяць адзін у другі; мае рухі, якія я цяпер пачынаю рабіць, настолькі аддаленыя адзін ад аднаго, што яны зь цяжкасьцю чаргуюцца; спыненьне яшчэ ідучых целаў роднаснае адно аднаму. Менавіта я першым успрымаю гэта і крычу тое, што пачуў, ёй усьлед: пасьля гэтага ўжо яна вачыма пацьвярджае пачутае. Потым мы, перш як увайсьці ў дом, разам слухаем, яна наверсе ля дзьвярэй, я ўнізе на падворку, як воз паварочвае з гасьцінца наверх на дарогу да дома і як зьнізу бацька з патрэскваючай пад яго вагой купы трысьнягу яшчэ здалёк у добрым настроі выкрыквае прысутным свае вітаньні.

Пачатак эпізоду за сьняданкам

“Калі я быў там”.

Калі я быў там у доме, я па начах чуў, як едуць цягнікі, і да паўночы чуў, як унізе ў горадзе езьдзяць трамваі, і ўсю ноч напралёт чуў на аб’язной дарозе цяжарнікі дальняга прызначэньня. Я адрозьніваў шумы і адным надзяляў маторы, другім рэйкі, другім сігнал, адным стрэлкі, адным пару; я надзяляў шумам мататаў барзьдзіню, а барзьдзіню чаравікам і нагой, якая наском наступае на понаж, і рукой, якая цягнула за вагар, і я надзяляў чаравік і руку чалавекам, а чалавека надзяляў галавой паміж плячэй, а галаву вузкімі стомленымі вачыма і вочы позіркамі. А позіркі я напачатку нічым не

надзяляў. Але потым я надзяліў іх адваротным бегам асфальтавай смалы, а бег межамі берагоў, бардзюрнымі камянямі, а межы расхінаньнем зеўраньня кашэчых вачэй і чэзлымі кружляючымі ценямі.
Я надзяляў шумы, якія я чуў, вобразамі. Я надзяляў вобразы шумамі, якіх я ня чуў. Я надзяляў шумы, якія я ня чуў, вобразамі. Шум счапленьня і сучляненьняў я надзяляў заднім вагонам трамвая. Сьветлы сьлед трамвайных вагонаў я надзяляў асобнымі вобразамі пасажыраў за вокнамі, калені пасажыраў кішэнямі, рукі складзенымі, яшчэ пахнучымі кіслай газэтнай фарбай, пасьведчаньнем, капелюшом, белымі пальчаткамі зь сьлядамі губной памады на пучцы сярэдняга пальца. Вобраз рота я надзяляў гукамі, і варушлівы рот я надзяляў адпаведнымі гукамі. Я ўявіў адзін рот і другі рот і прымусіў іх памяняцца гукамі, а вобразы ўзаемазаменных целаў прыхінуцца адно да другога. Я надзяліў губы вобразам рухомага рота, а рухомы рот гукамі. Я надзяліў прыхінутыя адзін да аднаго вобразы целаў размовай. Я прымусіў вобразы целаў устаць, зрабіў так, што вобраз аднаго твару, ідучы наперад, паглядзеў на вобраз другога твару, прымусіў вобраз другога твару ззаду кіўнуць галавой вобразу першага. Я пабудаваў дакладны вобраз гэтага ківаньня, я ўявіў вобраз выцягнутай вэртыкальнай прамой рукі і пальцаў, якія моцна абхапілі парэнчы. Парэнчы я надзяліў потым вобразам пустых хісткіх петляў. Я правёў па вагоне шэраг людзкіх постацяў. Я прымусіў іх зайсьці, прайсьці, я прымусіў іх выйсьці.
Заціханьне вагону і цішу я надзяліў сьветлавым колам канцавой станцыі, бэтоннымі лаўкамі на газоне, паўценем павеці і замкнёнай прыбіральняй. І гэтыя нябачныя вобразы я надзяляў шумамі, якіх я ня чуў, а гэтыя шумы зноў нябачнымі вобразамі людзей, якія зьнікалі зь сьветлавога кола ўва ўсе бакі сьвету, цёмным і сьветлым веяньнем вопратак над асфальтам, паваротамі галавы перад тым, як перайсьці вуліцу, патуханьнем цыгарэтаў і сьветлым водбліскам газэты ў сьметніцы. Пасьля таго, як я нячутныя гукі надзяліў вобразамі, я надзяліў нячутную цішыню, якая наступіла сьледам, вобразам кандуктара, які сядзеў на больш высокім сядзеньні перад адчыненымі дзьвярыма і запісваў лічбы, вобразам кіроўцы, які хадзіў туды–назад у коле сьвятла, падбіваючы нагой скамечаны талён, і вобразам чалавека, чый абрыс, спачатку сьветлы,

потым зацемнены з–за сустрэчнага сьвятла з другога боку вуліцы, зь цемры рухаўся па дзірване да трамвая. Аднак потым пачалі праяўляцца шумы ад'езду, якія я чуў і ўспрымаў, так што я стаміўся надзяляць у гэтым месцы шумы вобразамі і нябачныя вобразы іхнымі шумамі. Я надзяляў другія шумы, якія я чуў, другімі вобразамі.

Я чуў далёкае пагрукваньне едучага цягніка. Я выклікаў у сабе вобраз едучага цягніка. Я дадаў да пагрукваньня гукі, якіх я ня чуў, і з гэтых гукаў я ствараў вобразы, таксама і тады, калі пагрукваньне цягніка ўжо аддалілася і змоўкла. Кожны гук я абазначыў вывучаным сымбалем і імем і, дзеля таго каб бавіць час, параўноўваў з другімі гукамі. Я бавіў час, называючы гук тармажэньня бруеньнем і раўнуючы бруеньне з шумам парывістага ветру пад час залевы.

Потым бруеньне раптам перапынілася. За ім настала амаль бясшумнае качэньне колаў; я параўнаў яго з шумам рамянёў бэтонамяшалкі, матор якой ужо адключаны. Я чуў усё больш пругкі вецер, усё больш частае падвойнае татаканьне і глухі паўтор буфэраў, і з гэтых шумоў, якія я яшчэ чуў, я стварыў сабе вобраз цягніка на цяпер яшчэ вольнай каляіне. Цягнік я надзяліў пырскаючым алеем, лятучымі ўздоўж вагонаў іскрамі і матава–чорнымі вокнамі вагонаў. За вокнамі я паклаў пасажыраў. Іх я надзяліў лаўкамі, складзенымі як падушкі паліто, якія ляжалі ў галаве да згібу локця, паміж тварам і посьцілкай падсунутая рука, якая абараняла скуру ад гузікаў, а тых, хто сядзеў ля акна, я надзяліў фіранкай і пальцамі, якія нацягвалі фіранку на галаву, і галава апускалася торгаючыся. Я ўявіў сабе купэ, біркі зь імёнамі на валізках у багажнай сетцы, парасоны, якія хістаюцца на кручках, разьвязаныя матузкі чаравікаў на падлозе, абсунутыя панчохі, падцягнутыя да жывата калені, бачныя палоскі скуры паміж нагавіцамі і панчохамі. Цішыню, у якой я цяпер ляжаў, я надзяліў цягніком, які па цемрадзі ехаў праз прасьцяг, і сьцішаным дыханьнем сьпячых у едучых вагонах. Вагоны я надзяліў напаўгучным пошаптам і рыпеньнем, а сядзеньні ў яшчэ пустым купэ патрэскваньнем.

Потым я рашчыніў усе гукі ў гудзеньні расьсяканага паветра. І я параўнаў гудзеньне з чутным выцьцём электрастанцыі і з посьвістам вады ў кране перад тым, як яна пачынае ліцца. Гудзеньне набралася сілы, зноў аслабла і зноў набралася сілы.

Я ўявіў пустое купэ. Я надаў яму пах халоднага дыму, апэльсынавага шалупіньня, вільготнай гумы, расталага шакаладу, і да пахаў я далучыў вобразы тых, хто быў у купэ раней. Я прымусіў вобразы пальцаў з пазногцямі аблупліваць садавіну і надзяліў вобраз ціхім сапеньнем адстаючага шалупіньня, а над шалупіньнем унікаючыя адны другіх губы. Гэтыя губы я надзяліў пытаньнем, а галаву насупраць адмоўным хітаньнем. Потым я прымусіў вобраз вялікага пальца разьдзяліць вобраз плада і падаць скрылік вобразу другога, і хоць я ўяўляў сабе вобраз другога адмоўнага хітаньня галавой, я ганебна дазволіў вобразу рукі ўзяць вобраз скрыліка плоду і паднесьці яго да вобразу рота, які я перад гэтым надзяліў адным словам. Цяпер я даў магчымасьць абодвум пасажырам зьесьці часткі плоду, аднаму, уласьніку, з хуткай мімікай і жаваньнем па ўсім твары, другому з павольным смактаньнем і грызеньнем перапалага яму скрыліка. Потым я адключыў вобразы пахаў і абязьлюдніў купэ.
Я надзяліў цішыню, у якой я ляжаў, гудзеньнем. Гудзеньне я не надзяліў нічым: я ляжаў і ўяўляў сабе гудзеньне. Потым я надзяліў цішыню грукатам тармажэньня, зноў павольным, амаль бязгучным качэньнем колаў, другім грукатам тармажэньня, кляцаньнем стрэлак, выездам на іх цягніка. Неўзабаве я падпусьціў пранізьлівае сіпеньне пары, глухі стук вагонных дзьвярэй аднекуль, торганьне назад, ясную, выразна чутную цішыню. Я надзяліў цішыню цішынёй, потым вобразамі людзей, якія прачынаюцца, гукамі запытаў, рухамі галоваў, што паварочваюцца да акна, гукамі адказаў, размовамі, якія раптам сталі зразумелымі, яркімі гукамі, якія даносяцца з пэрону.
Я ствараю вобраз пэрону. Я надзяляю яго электракарам. Я гашу вобраз рухомага электакара і пакідаю пэрон пустым. Я ствараю вобраз чакальні. Для гэтага я прымушаю шчоўкнуць дынамік. Я ствараю вобраз падвойных адкрываных у абодва бакі дзьвярэй чакальні і прыладаў для сядзеньня за дзьвярыма. І лаўкі чакальні я ствараю пустымі. Аднак дзьвярніцы целяпаюцца. Я ствараю вобраз вадзянога крана ў сьцяне вакзалу і вадазбору пад ім. Я ствараю вобраз пустога купэ. Цяпер я надзяляю фантан постацьцю мужчыны. Я прымушаю вялікі палец чалавека заглыбіцца пад матузок марацкай кайстры на плячы і пацягнуць, а локцем паддаць марацкую кайстру вышай і на сьпіну. Я ствараю вобраз чалавека, які нахінаецца, я надзяляю

яго вобразам загнутай коўшыкам рукі і вобразам сёрбаючых губ. Далей я запускаю аб'яву па гучнагаварыцелі. Я адначасна ствараю вобраз п'ючага і вобраз пустога купэ. Я прымушаю чалавека піць хутчэй. Сам сабой наплывае вобраз электрычнага гадзіньніка. Я выключаю гэты вобраз. Я прымушаю чалавека пацягнуцца і выпрастацца. Я прымушаю яго выцерці рукавом мокрыя губы. Я гашу гэты вобраз. Я бачу чалавека, які стаіць ля вадазбору. Я гашу, зацямняю вобраз электрычнага гадзіньніка. Я гашу вобраз цягніка і зацямняю вобраз пэрону. Між тым паміма маёй волі пагашаны вобраз надзяляецца вобразам цярпліва стаячага ў мроіве чалавека, ад якога адыходзіць вобраз сьветлага раскудлачанага матузка марацкай кайстры, ад якой на куртцы набухаюць столкі. Хутчэй, кажу я. Я бачу загнуты крукам палец паміж ключыцай і матузком. Міжволі я бачу вобраз шчыліны паміж дзьвярніцамі дзьвярэй у чакальню. Я аддаюся гэтым вобразам. Чалавек сам сабой надзяляецца крокамі, крокі надзяляюцца гукам, гук крокаў — шумам каляхуючай вады, якая перад ад'ездам выбягае з паравога катла. Я ствараю вобраз чалавека, які ставіць нагу на падножку. Хутчэй, кажу я. Аднак гэты вобраз гасьне. Я бачу, як ён шоргаючы ідзе ад вадазбору да чакальні. Я бачу шчыліну паміж дзьвярніцамі дзьвярэй у чакальню. Само сабой выплывае пустое купэ, пад якім я адчуваю непазьбежнае торганьне ад таго, што спрацоўваюць буфэры. Я ствараю вобраз чалавека ў вагонным праходзе. Вобраз чэзьне. Я зноў бачу, што чалавек стаіць ля вадазбору; я бачу, як ён прыгінае плячо і спускае марацкую кайстру па матузку на згіб локця. Я гашу вобраз пэрону і ствараю вобраз едучага цягніка. Я прымушаю чалавека спатыкаючыся ісьці па вагонным праходзе. Я ствараю вобраз коса пасаджанай галавы чалавека і матляньне марацкай кайстры. Я надзяляю цішыню прыглушаным сіпеньнем чалавека. Я надзяляю шумы цягніка шумам другога цягніка, які набліжаецца па другой каляіне. Я надзяляю цягнікі, калі яны пачынаюць ехаць упоравень, адным грукатам і ровам, ад якога адстае абшыўка вагону. Я прымушаю чалавека на хаду трэсьці замкнутыя дзьверы, я ствараю вобраз сонных істотаў за дзьвярыма. Аднак я бачу, што чалавек стаіць каля вадазбору. Я гашу гэты вобраз і надзяляю стаячым чалавекам дзьверы ў пустое купэ. Гэты вобраз гасьне. Я надзяляю зноў узьніклае купэ стаячым звонку абрысам чалавека, а вобраз чалавека ў

праходзе вагону, які прыкладвае лоб да дзьвярэй і ў роздуме падзёргвае губамі, я надзяляю рухам рукі, а руку гарызантальнай ручкай.

Між тым чалавек зноў закідвае марацкую кайстру на плячо. Я бачу, як ён ідзе назад да чакальні. Я гашу гэты вобраз. Я ствараю вобраз чалавека, які адчыняе грымоткія дзьверы. Аднак я бачу, як ён нагой расхінае дзьвярніцу дзьвярэй у чакальню і ўваходзіць туды, і я гашу гэты вобраз. Я бачу, як ён зноў ідзе ўздоўж лавак. З гэтага я ствараю прагінастыя лаўкі пустога купэ; аднак я бачу лаўкі чакальні. Я гашу вобраз. Я бачу, як ён садзіцца і яшчэ сядаючы вызваляецца ад кайстры. І тое, што я бачу, перамагае волю.
Я бачу цела чалавека на лаўцы паміж вольна зьвіслымі пальцамі. Ён у памяшканьні без кампаніі. Ён падымае пагляд над чаравікамі. Ляжаць на лаўках станаўко забаронена. Ён разглядае зьбіты ў лямец пыл у зморшчынах чаравіках. Потым ён выпроствае сьпіну і блукае позіркам па сьценах. Нідзе не відаць выключальніка, пры дапамозе якога ён мог бы зацямніць памяшканьне, каб паспаць.
Ён сеў і прачытаў на пыле сваіх чаравікаў свой шлях. Ён паслухаў гудзеньне сьвятла. Перад дзьвярыма пэрону зьявіўся паліцыянт, рукі ў звыклай паставе там, дзе заканчваецца сьпіна; гнаны клопатам пра парадак і цішыню, ён палічыў за лепшае ўвайсьці і стоячы ўступіць з чалавекам, які сядзіць і пазьбягае глядзець яму ў вочы, у размову пра ягоны ўзрост, месца жыхарства ды прафэсію; чалавек адказаў яму, як было на самой справе. Потым паліцыянт, які тым, што ён пытаў і гаварыў, хацеў ператварыць бясконцую ноч на вакзале ў хуткаплынны дзень, учыніў чалавеку запыт наконт ягоных плянаў; ані не прамарудзіўшы, той раскрыў яму свае пляны, аднак незадаволеным позіркам ён даў паліцыянту зразумець, што хацеў бы спыніць размову. Абодва былі адзіныя і яшчэ ў тым, што разам выйшлі празь дзьверы ў вялікую залю, аднак звонку іхныя шляхі разышліся: паліцыянт з палёгкаю пайшоў да акенца, якое пачало зь ляскатам расчыняцца, а мужчына з кайстрай, пазьбягаючы кампаніі другога, панура пашыбаваў да туалета.
Там ён згружае марацкую кайстру з пляча і вымае з кішані

дзьве мядзяныя манэткі, адну зь якіх ён засоўвае ў аўтамат для продажу парфумы. Далей ён прысядае і націскае на вагар, так што парфума пахкай балачынай пырскае яму на кашулю.
Ён выпростваецца і паціхеньку цягне марацкую кайстру за сабой па плітах падлогі, схапіўшыся за яе матузок. Ягоны твар як заўжды неспакойны і ўзбуджаны, хоць цяпер, напарфуміўшыся, ён выглядае задаволеным.
Другую з манэт ён кончыкам вялікага пальца папіхае ў манэтапрыёмнік кабіны. Цяпер ён звыклым рухам адчыняе дзьверы, апускае марацкую кайстру пад ногі і цялёваецца далей да бачка. Без цырымоніяў ён ступае на вызваленую прастору, накідвае кручок і зачыняе дзьверы.
Абедзьвюма нагамі ён штурхануў марацкую кайстру аж да сьцяны. Прысеўшы на кукішкі, ён аслабляе на кайстры матузкі і дастае газэту. Аркуш за аркушам ён расьсьцілае яе на плітах. Ён назірае, як вільготныя плямы распаўзаюцца на паперы. Ён пакрывае і высушвае плямы другой газэтай. Шалёны выбух вады ўва ўсіх кабінах скрадвае шамаценьне паперы.
На посьцілцы ён уладкаваўся адпачываць. Абапершыся на палову вышыні на рукі, ён яшчэ разглядае здымкі і малюнкі, надпісы, напісаныя і выдрапаныя на сьценах навокал.
Потым ён паклаў шыю і патыліцу на марацкую кайстру. Кабіна занадта кароткая, таму ён пераварочваецца на бок і падцягвае калені да чэрава.
Цяпер ён ляжыць зусім як той, хто сьпіць у едучым цягніку.
На эмалі ачка ён бачыць адбітак нечага, што ён называе сваім тварам; у шчыліне паміж плітамі падлогі і пасадачнай часткай ракавіны ён заўважае карычневы акатыш засохлага салідолу; ён бачыць у ім кароткія калючыя валасы і падобны да пуху пыл на яго тыльным баку, што спакушае яго да таго, каб падзьмуць; ён бачыць, што эмаль вакол адной дзіркі для вінта абколатая; ён бачыць вінт, якога не стае.
Не абараняючыся ад таго, што ім апаноўвае, чалавек, з шарготкай рукой пад вухам, заглыбляецца позіркам у пералівы белага, якія пашыраюцца, паглыбляюцца і захопліваюць яго, аж пакуль ягоныя вочы не становяцца белымі, бы глязура.
“Ён сьпіць”.
Абедзьвюма рукамі я шукаю кубачку дарогу ад рота на стол. Пасьля таго як я наткнуўся на стол, воскавы абрус пачынае клеіцца да пальцаў, калі я хачу прыняць рукі, хоць здаецца, што

скура пацее толькі знутры.
Кабета, якая млява сядзіць ля пліты на ўслоне і да дрыжыкаў захапляецца сьпінай жуючага бацькі і тварам глытаючага сына, аднатонна пытаецца ў бацькавае сьпіны, што я кагадзе гаварыў. Бацька, у якога на зубох рыпіць скарынка, перш як заглынуць кавалак, самазабыўна з поўным ротам перапытвае, не прыглушваючы між тым рыпеньня, у мяне тое самае амаль тымі самымі словамі.
“Ад каго быў ліст?” хацелася спытаць мне.
Аднак я толькі голасна пытаюся ў адказ, ці не пара выходзіць. Калі трэба будзе, ён мне пра гэта скажа, адказаў бацька другімі словамі, надаўшы сабе пэўнасьці тым, што адкашляўся з горла. Пасьля гэтага я чую, як скочваецца з шыкаценьнем, выразна памяншаючыся, на пліту вадзяная кропля. Я ўздрыгваю. Кабета падымаецца.
Але калі я з вобразамі дасягнуў межаў досьведу, мне больш нічога не дапамагло. Я ляжаў у змрочным памяшканьні сярод сьпячых і ня сьпячых сьляпых і ня мог больш ані з чога стварыць вобраз. Пачаўся быў шум трамвайных стрэлак, шум цяжарнікоў на аб’язной дарозе, шум цягнікоў, якія зьехаліся, і я называў шумы, якія я чуў, і я зноў і зноў паўтараў назовы гэтых шумоў і даваў назовам шумоў назовы вобразаў, і назовам вобразаў назовы шумоў, якія я ня чуў, але ні для воднага я ня мог стварыць сабе вобраз. Я ўзгадваў вакзалы, у якіх цяпер, калі ўжо я ляжаў тут, натоўпамі стаялі людзі, і я ня мог гэтага зразумець; я згадваў равучыя грукатлівыя цягнікі, якія едуць празь цемру, павеці на станцыях, лаўкі пад павецямі, дзьве надкусаныя складзеныя скібкі хлеба на лаўках, пырхаючую пад ветрам паперу пад хлебам, і я ня мог зразумець і гэта. Тых заснулых у цягніку згадваў я, асьветленыя чакальні, людзей, сьпячых на лаўках чакальняў, сьпячых у прыбіральнях вакзалаў, сьпячых і не пад паветкамі станцыяў, расплюшчаныя вочы сьпячых, заплюшчаныя вочы тых, хто ня сьпіць, сьліну на губах сьпячых, неакрэсьленыя вобразы і словы ў галовах нясьпячых і сьпячых, людзей, жывых істотаў, дзе б яны ні былі — удома альбо ў дарозе, але ўсяго гэтага я ня мог болей зразумець, таму што я там ляжаў ня сьпячы і сьляпы сярод сьляпых, таму што час, пакуль не паверне на дзень, быў мне доўгім як сон, і таму што я так думаў пра здарэньні і рэчы, якія можна ахапіць думкай, быццам ёсьць толькі іхныя назовы.

Нешта выпала ў апісаньні. Не. Не згадана наўмысна. Не, забыта. Не. Я ня ведаю, пра што

Бацькаў твар

Пасьля таго як было апісана, як бацька вяртаецца са става: як ён прывязвае каня, як ён абярэмкамі носіць траву ў хлеў і як ён скіроўвае воз за канцы дышляў на патрэбнае месца ў сьвірне, апісаньне адразу спыняецца на пераапрананьні і потым сьняданку; але пасьля таго як было апісана, як бацька на кухні есьць сьняданак, далей ідзе доўгае апісаньне ягонага твару. Між тым ён гаворыць з сынам, нешта яму апавядаючы. Звонку твар бацькі апісваецца як лагодны. Мая галава павернутая набок, каб ён мог гаварыць мне ў вуха. Я чую таксама, як звонку сьпяшаецца па сходах, падабраўшы сукенку і не дакранаючыся пятамі паверхні прыступак, жонка. Цяпер я яе больш ня чую. На адной прыступцы яна спынілася і заглянула наверх; яна бачыць ужо апісаную раней бэльку на версе мура і ніжнюю паверхню чарапіцаў. Я чую, як яна паволі ідзе далей; адна яе рука цягнецца за ёю сьледам па парэнчах, так што я чую, як скура рыпіць па дрэве. Яна нешта ўбачыла. Нешта забыта ў апісаньні. Мой бацька мне нешта апавядае. “Пры гэтым здаецца, што ягоны твар утароплены на ўласны рот, які выпускае з–пад вусоў словы бы ваду, і здаецца, што ягоная галава слухае ўласны голас”. Калі бровы ўздрыгваюць, лоб падскоквае аж да валасоў і такім чынам паглынае палоску, белую ад ценю капелюша, і бародаўка на найвышэйшай зморшчыне лоба заціскаецца гэтым зморшчваньнем; аднак калі ён зноў апускае бровы і зводзіць іх на пераносьсі, то пасярэдзіне лоба паўстае вэртыкальная зарубка, і столкі напінаюцца ў гойстрыя рыскі, на краёх якіх адбліскваюць аб’ёмныя палоскі поту; і карычневая бародаўка выпаўзае з валасоў, і за ёю апускаецца чырванавата–гарызантальны адбітак ад капелюша. Не падымаючы рота і шчок, бацька костачкай сагнутага пальца трэ вока; у той час як ён выдаляе праз павеку на сьлёзным мяшэчку чорную пляму і пазногцем выдрапвае муху з твару, рот працягвае ўжо аповед у ранейшым нязьменным тоне. Ён упіраецца локцямі ў стол. Рукавы сурдуту напаўзаюць на рукавы кашулі. Ён упіраецца тварам у паднятыя

кулакі. Кулакі асьвятляюць твар. Ён сядзіць павярнуўшыся ад акна, і твар падсьвечваецца яшчэ водбліскам сонца ад сьцяны, так што здаецца, што косткі прасьвечваюць знутры; скура над ярэмнай косткай, якая цягнецца ад краю нашых вушэй да сярэдзіны вушной ракавіны, адбліскваe матава, як і ўсялякі раз пасьля галеньня. Валасы яшчэ цёмныя ад поту і пасмамі прыгладжаныя да галавы, аднак пад адбіткам капелюша яны ўкруг падняліся заблытанымі пасмамі, на якіх пот ужо засох. Валасы шчаціністымі пучкамі растуць у яго з вушэй і з носу; калі паглядзець бліжай, то ўбачыш, што зьляжалыя ў лямец бровы адлеглымі канцамі вытыркаюцца на скроні; праз вусы, дзе іншым разам бачная вэртыкальная столка, сівая пасма цягнецца аж да сярэдзіны рота”. Парывіста дыхаючы, чалавек падсмоктвае ніжнюю губу. Так ён услухваецца з тонкай, усё таўсьцеючай ніткай сьліны паміж верхняй і ніжняй губой; сказы і словы, якія ён ужо ўтварыў у глотцы, цяпер гучаць зь яго больш суха і ціха, як бы самі сабой; нарэшце рот зачыняецца для ўсялякай артыкуляцыі і засыхае. Чалавек сядзіць ля стала на крэсьле; яго твар упёрся ў кулакі; ногі, згодна з апісаньнем, ён адставіў ад тулава і падсунуў наўскась у мой бок пад лаўку. Ён перапыніў аповед: нешта заняло яму мову. Вось ён уцягвае паветра і выперхвае яго зноў. Як ні ў чым не бывала ён высоўвае наперад губу і пачынае гаварыць усім тварам. Ён пачаў гаварыць і ніткай сваёй сьліны зноў зачапіў нітку свайго аповеду. Прыкладам, ён апавёў пра тое, як яму давялося ўпірацца зь перакінутым возам і зноў нагружаць траву.

Забыты прадмет

Бэлька была названая. Дзіркі ад шашаля ў бэльцы былі названыя. Пілавіньне вакол некаторых дзірак было названае. Аднак нешта было забыта. Не, гэта было прапушчана наўмысна. Можа. Сукі ў бэльцы. Напісаныя цясьлярскім алоўкам на драўніне лічбы. Чырвоныя сьляды ад шнура адвесу на кантах. Задзёртыя шчэпкі. Пыл ад цэглаў на стружках. Павуціньне на стружках. Крылы і пустыя чорныя целы мухаў у павуціньні. Кроквы пад дахам. Кара на некаторых кроквах. Закамянелыя грудкі цэмэнту на адной дрэнна сфармаванай цагліне. Застыглыя кроплі смалы на кроквах. Шэраг вішнёвых

костак на гарызантальнай паверхні бэлькі. Засохлае карычневае мяса на костках. Не. Нешта было забыта. Нешта наўмысна не было згадана. На бэльцы? Не. На муры? Не. На падлозе? Не. На цэглах? Так.

Страта назову

Шумы пад дахам, якія я пачуў, я ўспрыняў. Я ўспрымаў шумы і гукі на кухні. Шумы і гукі на падворку і ў хляве, якія я пачуў, — я ўспрыняў. Нешта на кухні, што гаварыла: я ўспрыняў гэта; нешта другое пад дахам у каморцы, што хадзіла: я ўспрыняў і гэта; і нешта другое я ўспрыняў, што хадзіла потым па сходах; нешта другое яшчэ перад гэтым прайшлося па сходах, але яшчэ раней было нешта, яно прайшлося пад дахам побач з мурам, і яшчэ нешта другое зноў сядзела яшчэ да мяне на кухні, яно гаварыла, яно яшчэ гаворыць: яно блядое сядзела на кухні, і я ўспрыняў яго. Гэтае нешта ўспрыняло гэтае другое нешта: яно сядзела на кухні і прасяклася прысутнасьцю другога. Аднак было таксама нешта, што здранцьвела на прыступках, што здранцьвелае ішло па прыступках; яно стаяла на прыступках, калі зышло да іх, стаяла, ідучы па іх, і рабіла сукенкай і чаравікамі шолахі, якія я здуру ўспрымаў за сапраўдныя. Гэтае нешта нешта апавядала; другое, якое не было нечым, слухала; тое, што не было нечым і што слухала, слухаў я, хто ня быў нечым, слухаў і ўсё–такі не ўспрымаў. Дом зеўраў пустэчай. У пакоях стаялі крэслы і лаўкі, ложкі і сталы. У зьліве вады пад кранам лопнула бурбалка. Гэта ўсё мяне, хто адасобіў сябе ад усяго і быў другім, зрабіла зьдзіўленым і адчужаным, і я вельмі зьдзівіўся і не знаходзіў болей назову ні для чога ў доме, але я ўсьведамляў яго прысутнасьць. Нешта, што было нечым іншым, чымся я, то ўзыходзіла на сходы, то спускалася па іх: я ўсьведаміў яго прысутнасьць; нешта іншае выслухоўваючы расказвала мне на кухні нейкую гісторыю — я ўсьведамляў гэта. Аднак нешта слухала, і я не ўсьведамляў яго, не ўспрыняўшы раней.

Асінае гняздо на кроквах? Але.

Паход у царкву

Калі жанчына з сумкай вярнулася з сваёй каморкі, яна запыталася, ці можна нам ісьці. Бацька, падымаючыся, паведаміў ёй, што мы гатовыя. У адказ на гэта я кіўнуў галавой і падняўся ўсьлед за ім. Ці не хачу я ўзяць кій, спыталася яна пасьпешліва. Ці ня маю я намеру ўзяць з сабой кій, перадаў інфармацыю бацька. Так, пасьпяшаўся адказаць я. Так, пратлумачыў бацька ўскоснаю мовай, ён хоча яго ўзяць. Яна пайшла ў мой пакой і прынесла палку. Яна працягнула яе бацьку, а бацька перадаў яе мне. Я ўзяў кій і пайшоў да дзьвярэй, якія яна трымала адчыненымі; бацька пайшоў сьледам. Жанчына апошняй ступіла ў калідор і зачыніла за сабой кухню. Потым яна паўз нас прайшла да брамы і выпусьціла мяне на прасьцяг. Бацька ішоў сьледам. Яна замкнула дзьверы брамы і спытала, ці не забыліся мы што–небудзь. Нібыта нічога такога, што было б яму вядома, запэўніў бацька, мы не забыліся нічога вартага размовы. Грошы на ахвяраваньне? спытала жанчына. Вось, праўда, гэта ён забыўся, адкрыта прызнаў бацька. Яна ўзяла з кішані ключ і адамкнула дзьверы. Яна пайшла па грошы на ахвяраваньне, а мы стаялі і размаўлялі. Пасьля, калі дзьверы зноўку былі замкнутыя, яна сышла ўніз па прыступках і ўручыла грошы бацьку. Ён паклаў грошы ў кішэнь і маўчаньнем абазначыў падзяку. Ці мы цяпер ужо пойдзем? запыталася яна ветліва. Ён ня ведае, што б ім яшчэ магло замінаць, зазначыў бацька, а сын у такой ягонай якасьці хуценька падтрымаў яго. Яна азірнулася; яна стала паміж намі, мы расступіліся, бацька падставіў ёй сагнуты локаць, яна ўзяла пад руку бацьку, які быў ёй мужам, мы пакрочылі цераз двор да сьцежкі, мы пакрочылі ўніз па сьцежцы да дарогі. Будзе парыць, заўважыў па дарозе бацька, і кожны з нас традыцыйна па–свойму падтрымаў яго: ужо цяпер даволі парыць, сказаў я. І як гэта там будзе далей, заклапочана сказаў бацька. Бо ж ён пасьля яды зьбіраўся згуляць з суседзьмі ў карты. А яна хоча пайсьці спаць, уставіла сваё жанчына. Пад вечар яны абое плянуюць падыхаць чыстым паветрам вонках дому. Між тым мы цэлымі асягнулі выратавальнае шашы. Мы выйшлі на яе і цяпер пакрочылі хутчэй. Ці езьдзіць у нядзелю малакавоз? запытаўся я. Нічога падобнага, запрацівіўся бацька, у нядзелю, наколькі яму вядома, ніякі малакавоз ня езьдзіць. Але ж бідоны стаяць на стэлажах! не адступаўся я. Але, але,

пацьвердзіў бацька. Аднак, перш як ён перавёў дыханьне і змог працягнуць сваю лінію, нам, што ходка рухаліся па шашы, напаткалася на супрацьлеглым баку не сказаць каб непрыгожая жанчына сталага ўжо веку ў сьвяточным строі. Тут бацька падняў капялюш і павітаўся гучна ды прыязна; яна ціха і прыязна адказала на вітаньне і зазначыла, калі мінала нас, што пачынае парыць. Бадай што, — знайшоўся пасьля гэтага мой бацька. Але ж гэтыя бідоны на стэлажах, зьвярнуўся ён адразу зноў да мяне, — яны ўжо пустыя, бо на такой гарачыні малако да наступнага рабочага дня скісла б. Гэта я ўжо разумею, ня даў сябе спалохаць я, хоць мне і моташна стала пасьля бацькавай заўвагі, і я пачаў без упыну стаўляць далейшыя пытаньні і запытаўся, калі прыедзе аўтобус. Пра які гэта я аўтобус, заглыбіўся ў тэму бацька. Ну, пра наступны, даў я адказ. Гэты, што ў дзесяць, удакладніў ён. Так, гэты, пацьвердзіў я ягонае пытаньне. Першы пайшоў яшчэ ў сем, рабіў свае выкладкі бацька, другі пойдзе, як ён ужо сказаў, пасьля кірмашу а дзесятай, недзе каля другой, як ён узгадаў, будзе трэці; расклад, згодна зь якім рухаецца чацьвёрты, выпаў яму з памяці, апошні будзе ісьці ўвечары ў восем. Я падзякаваў яму. Павітаўшыся, нас перагнаў — аж вецер зашамацеў — вэлясыпэдыст; мы запаволілі крокі і адказалі на вітаньне. Бацька гукнуў яму ўсьлед належнае. Так, гэта правільна, крыкнуў цераз плячо, аддаляючыся, вэлясыпэдыст, гэта самае яму кінулася ў вочы, яшчэ калі ён ехаў сюды. Мы зноў паскорылі крокі; я спытаў, хто быў той вэлясыпэдыст, і, як звычайна, бацька назваў ягоную прафэсію. Мы ў надзвычайным пасьпеху крочылі далей. Перад выездам зь мястэчка да нас далучыліся другія; пасьля таго як яны павіталіся і пасьля таго як мы прывіталі іх у адказ, яны гаварылі ўва ўнісон і выказвалі тое, што адпавядала іхным думкам. Так, гэта правільна, падмацаваў іхныя погляды бацька, ён можа толькі пацьвердзіць тое, што яны сказалі: бо і для яго гэта не засталося незаўважаным. Між іншым нас ніхто не падганяе, прыцішыў ён наш пасьпех, падняўшы голас да мяне, у нас яшчэ часу аж занадта, ані каліва мы ня страцім. Што гэта за мужчыны, спытаў я гучна. Як? адразу зьдзівіўся тут бацька, я ня ведаю гэтых старых знаёмых, няўжо я забыўся на тое, як гучыць іхны голас? Дзеля ўсяго на сьвеце, працягваў дзівавацца ён, гэта нешта для яго новае, гэта запраўды сьмеху варта; як гэта я

раптам, працягваў ён, прыдумаў такое — пытацца пра знаёмых? Як гэта? дапытваўся ён, і дзе ты сёньня ў думках? І пра што я пры гэтым думаю? Ну як, пасьпяшаўся я адказаць, не даючы волю словам, так што пасьля паўзы яму нічога не заставалася, як з добрым тварам пачаць адказваць; вось гэта каваль, даваў тады адказ бацька, гэты батрак з маёнтку, гэны дарожны рабочы. Я напышлівымі словамі падзякаваў і павітаўся з мужчынамі; яны адказалі на прывітаньне ў той час, як мы ўсе ўжо рушылі далей. Сярод іх мы ўвайшлі ў мястэчка і направа ды налева віталіся зь людзьмі, якія стаялі сабе на ўзбочыне адзін побач з другім дый гаварылі, і людзі, якія стаялі адзін побач з другім і гаварылі, віталіся з намі, хто з кавалём, кавалёнкам і кавалішкай, батраком з маёнтку, дарожным рабочым і дачкой дарожнага рабочага крочылі празь мястэчка да царквы. Тыя, хто ішоў, віталіся першымі; тыя, хто стаяў, адказвалі на вітаньне; вітаньне, сказанае ідучы, гучала іначай, чымся тое, якое прамаўлялася стоячы. Усе з тых, хто гаварыў, калі мы пасьпешліва ішлі ўздоўж шыхтоў, з вохканьнем ды ўздыханьнем выказвалі боязь, што гэта можа стаць прыкладам для перайманьня і што гэта зноў–такі не выключае, што зь сёньня на заўтра шмат чаго можа памяняцца, без таго каб тут патрэбныя былі нейкія закляцьці. Хто гэта быў такі? бесьперапынна пытаўся я, і хто там, і хто стаіць там побач з тым з вэлясыпэдам, і чаму ён маўчаў, калі я толькі што наткнуўся на яго. Ён яго ня ведае, адказваў мне на гэта мой бацька, і той побач з тым з вэлясыпэдам яму незнаёмы; можа, два сябры, меркаваў ён, выехалі на вэлясыпэдзе па ваколіцы, дзе–небудзь з Узвышанску, гаварыў ён больш сам да сябе, альбо і наогул зь мястэчка Крыж, бо нешта яму незразумелае паходжаньне іхных абліччаў. Не спыняючыся, мы крочылі па мястэчку і кіраваліся па завулку ў царкву; мы загаворвалі адзін да аднаго і віталі направа і налева груды людзей, адзіночных асобаў і групы, якія стаялі ля муроў; бяз дрыжыкаў у каленях мы разам падняліся па прыступках у царкву. Бацька з гатоўнасьцю даў дарогу кавалю; такім чынам, першым увайшоў той. Трымаючы на руках сына і дачку, сьледам прайшоў з жонкай і сынам спадар Бэнэдыкт; за ім пашыхтаваліся дарожны рабочы і дачка дарожнага рабочага, апошнім увайшоў батрак з маёнтка. Між тым разам і паасобку мы прыйшлі на сьвята запозна. Аднак ня надта клапоцячыся пра гэта, жанчыны

адразу далучыліся да жанчын і селі на прытрыманыя для іх месцы, дзеці пакрочылі да дзіцячых лаваў і селі там, а мужчыны спадобіліся стаяць пад хорамі. Дык няхай вырву я, крычаў якраз сьвятар з амбону, вока сабе, калі я злуюся, каб мне быць пакараным вечнай цемрай, дзе я, прамаўляў ён да мяне, жудасна стагнацьму і зубамі скрыгатацьму датуль, пакуль мне, за тое, што я так сваволіў і ганарыўся і трымаў людзей за дурняў, ад каяты і болю цела не пачне агідна сьмярдзець да неба. Зь вечнасьці ў вечнасьць, сьцьвярджаў ён з усёй сур'ёзнасьцю.

Мужчына з марацкай кайстрай

Пасьля таго як мужчына прачнуўся, ён сядае і рукамі бярэцца за наскі чаравікаў. Ён хістаецца ўперад і назад. Устаючы, ён прыпадымае з падлогі марацкую кайстру. Зноўку нехта грукае ў дзьверы. Мужчына яшчэ раз стаўляе кайстру на падлогу, рыецца ў кішані і дастае зь яе пачак цыгарэтаў; ягоны палец нырае пад дно пачка, губы наўскась выхопліваюць зь яго цыгарэту. Распрастана, апусьціўшы рукі, стаіць ён ля бакавой сьцяны туалету і курыць. Нехта адбівае сабе кулак, малоцячы ў дзьверы. Недапалак сіпіць у вадзе ўнітазу. Мужчына зьбірае з падлогі паперу, камечыць яе і нагой запіхвае ўва ўнітаз. Ён тузае за ланцужок. Пачапіўшы марацкую кайстру на сагнутую руку, ён выходзіць. Той звонку глядзіць на яго; ягоных слоў пасьля запуску вады не чуваць. Мужчына не аглядваецца і не адказвае. Пад кранам ён змывае з рук пыл. Ён выйшаў з кабіны; ён ідзе з туалету; ён пакідае вакзал.

Агляд мура

"Браты часта запаўзалі, прычым адзін вёў другога", так было напісана ў адным месцы, "па стромкіх сходах царкоўнай званіцы наверх у памяшканьне, дзе былі званы".

За магіламі ўнізе ля мура бачныя карычневыя, іржавыя пасмы дажджу, зьверху на вяршыні мура няшчытныя гонты даху на муры, пад дахам тоўстыя папярэчныя бэлькі, паміж дахам мура

і мурам даўгая палоска неба, на тле неба хвалістая, прыгорбленая хада ката.
Кот.
Я бачу, як кот крадучыся паглынае неба. Я бачу, як з мура падае камень. Я бачу, як на магілах грабуцца куры. Я бачу, як на могілкі заходзіць нейкая жанчына.
Парэнчы.
Я стаю ля парэнчаў. Я стаўлю нагу на ніжнюю ліштву. Я падымаю другую нагу. Я зусім сядаю на парэнчы. Я абхопліваю пальцамі верхнюю ліштву. Я плюю на жанчыну ўнізе.
Жанчына. Жанчына нясе судзьдзё. У левай руцэ ў яе шкляная ваза. Яна распасьцірае вялікую руку над вазай. Я не гляджу праз руку на дно вазы.
Дно вазы.
Дно вазы чорнае ад гнілога лісьця кветак. Вада разьядае рэшткі кветак. Часткі рэшткаў узбуруньваюць ваду. Яна нясе і цягне вазу а чайнік шыхтамі надмагільляў. Другая пасма сьліны распырскваецца ў паветры, як і першая. Жанчына няўхільна рухаецца шыхтамі надмагільляў. Яна ставіць судзьдзё на жвір. Яна ставіць шклянку на гзымс пастамэнту. Яна ставіць другую вазу з гзымсу на жвір, яна выцягвае з гэтай вазы пучок пачарнелых сьцёблаў. Яна пераварочвае далонь. Яна трэ тылам далоні нос. Яна нюхае. Яна адчувае пах загнілай вады, гнілых лістоў, згнілых пялёсткаў кветак. Яна зморшчвае твар вакол носа.
Парэнчы.
Я еду конна па парэнчах. Пяткамі я стукаюся ў ліштвы. Я нахіляюся ўперад. Я выцягваю нагу. Я дасягаю пальцамі гзымсу мура. Я ўзмахам далучаю да першай нагі другую. Абедзьвюма нагамі я стаю на гзымсе камяніцы. Я стаю па той бок парэнчаў. Я стаю на муры і гляджу ўніз.
Жанчына.
Жанчына ідзе да студні. Яна вылівае зеленаватую ваду разам з кветкамі на кучу. Яна апаласквае вазу. Яна хутка ідзе назад. Куры, дробна перабіраючы нагамі, разьбягаюцца ўбакі. Яна падымае і апускае судзьдзё. Яна хутка абыходзіць магілу.
Надмагільле.
Я апускаюся на калені. Я кленчу на гзымсе. Я высьлізгваю на каленях за гзымс.
Жанчына.

Я выводжу пяткі за межы гзымсу. Я сасьлізгваю ўніз пальцамі. Я спаўзаю каленьмі з гзымсу.
Жанчына.
Я вішу ў паветры, я трымаюся пальцамі за ліштвы, о, я вішу на муры.
Жанчына выцірае закрайкам сукенкі пыл з каменьняў. Яна выцірае сукенкай пыл з надпісу. Яна выпускае пакамечаную сукенку з рукі. Ты бачыш на сукенцы шэрыя адбіткі надпісу.

“Наш любы брат Матыяс Бэнэдыкт, тапелец”.

Літургія

Але калі вы цягнеце сьвіньню на падворак, яна вішчыць. Трэба чацьвёра мужчынаў, каб выцягнуць сьвіньню на падворак, па адным на кожную нагу. Калі сьвіньня раве, куры лапочуць крыламі, з–пад іхных кіпцюроў разьлятаецца ўва ўсе бакі пясок, куры квохчуць, віруюць у паветры, заскокваюць на дах, ад вільчака бы хрыпатае вароніна карканьне даносіцца яўканьне ката. Калі б’е трывогу птушыны вывадак, у хляве зьвіняць ланцугамі каровы. Упёршы ногі ў раму дзьвярэй ды ў мур, двое мужчын рыўком выцягваюць сьвіньню праз выхад сьвінарніка; у дзьвярах дому чакаюць дзеці; пасярод двара ля запарніка стаіць доўгае мэталёвае карыта. З чопу, што стаіць пасярэдзіне двара, уздымацца пара. Двое мужчынаў трымаюць за пярэднія капыты, двое за заднія, напятае цела сьвіньні, якое торгаецца ўва ўсе бакі, спаміж уласнымі напятымі нагамі і сагнутымі, падскокваючымі нагамі мужчынаў. Хто там заткнуў рукамі вушы? Ніхто не заткнуў рукамі вушы. З драўлянай сьцяны сьвірну абрыньваецца жалезны абруч, валасаты вусень ападае з шыбіны хлява, і абруч куляецца праз падворак. Але калі сьвіньня завісае над мэталёвым чопам, яна моўкне, упадаюць у моўкнасьць курыныя дзюбы, куры кіпцямі скрабуць верх мура, дзеці напружваюць зрок, кот цікуе сярод курэй, жалезны абруч канвульсіўна прылягае набок, адзвоньвае на камянёх сваё падзеньне, перастаюць зьвінець у хляве ланцугі кароў. Адзін з мужчынаў падае вокам знак другім. Потым куры зноў зьлятаюць з даху, вусень пхнецца па шыбе, пара белым і шчытным выпарэньнем засьціць вочы мужчынаў.

Пабачце баранчыка божага, сказаў сьвятар, які здымае. Пабачце баранчыка божага, паўтарыў ён, пабачце яго, які здымае грахі. І ў трэці раз ён сказаў: пабачце баранчыка божага, пабачце яго, які здымае грахі сьвету. Асьцярожна, каб той не зазьвінеў, служка падняў з кіліму званочак, сьціснуў яго ў кулаку і тройчы рэзка выкінуў руку ўперад, расьціскаючы, а потым зноў адразу сьціскаючы яе ў меру вяртаньня ў кулак. Тройчы званочак адбіў час. Зрабіўшы гэта, служка не паклаў званочка; наўмысна ўзяўшы пальцамі другой рукі язычок званочка, каб той не зьвінеў, ён распрастаўшыся чакаў, пакуль сьвятар ня ўкленчыў; але калі сьвятар укленчыў, служка пазваніў у чацьвёрты раз. Адразу потым ён сьвядома паклаў званочак назад на кілім і павярнуў галаву да другога служкі; той сядзеў зьлева на самай ніжняй прыступцы; абодва адным духам зьняліся пасьля гэтага з прыступкі, адным духам сталі проста над кілімам і адначасна, прыставіўшы складзеныя чаўнаком рукі да барады, зрабілі крок адзін насустрач другому. Яны цалкам павярнуліся да аўтара і прыхілілі перад ім калені; пасьля таго як гэта было зроблена, яны скіравалі пагляд уверх да скляпеньня і ўніз на грамаду, і наўскась налева і направа, нажніцы ў момант раскрыцьця, яны накіраваліся да вячэрных лаваў. Тым часам як яны, быццам апісваючы ножкамі цыркуля паўкругі, насустрач адзін аднаму ссоўвалі разам рухомыя часткі лаваў, замыкалі іх у фронт і такім чынам адгароджвалі прастору аўтара, грамада таксама, скрыжаваўшы рукі на грудзёх, апусьціўшы галаву, спора кіравалася з нэфаў царквы наперад; тут з чарай і аплаткамі, неяк бокам, гледзячы на кілім, да народу прыступкамі, потым па каменных плітах падлогі прайшоў сьвятар. Служкі сьвятара дзелавіта раскінулі на лаўцы затканыя, вышытыя ўзорамі посьцілкі, чорны шыхт народу з лаваў абсунуўся на калені, сьвятар, цягнучы ў хадзе адну нагу, надзяліў кожнага аплаткай хлеба на языку. Потым здарылася наступнае: народ, схіліўшыся і праглынуўшы аплаткі, адвандраваў назад у прытворы, служкі зноў сьцягнулі з лаваў посьцілкі, потым яны, стоячы паўкругам адзін насупраць аднаго, зноў разамкнулі фронт лаваў; сьвятар з сваім рыштункам таксама падаўся назад да аўтара; тут ён посьцілкай выцер келіх і паставіў за створкі. Аднак пасьля гэтага здарылася наступнае: разьбіты на купкі народ супакоена

запаўняў пустыя месцы на лаўках; загнутыя языкі далізвалі рэшткі хлеба з паднябеньня; служкі, склаўшы рукі, хуткім крокам адразу папраставалі ўсьлед за сьвятаром да аўтара; адным духам яны потым прыхілілі калені перад сярэдзінай прыступак; потым рэзка адасобіліся і, склаўшы рукі пад барадою, пашыбавалі адзін ад аднаго ў належны бок; адзін пайшоў направа да нішы ў муры, другі налева да свайго месца на самай ніжняй прыступцы. Але пасьля гэтага, ані хлусячы, здарылася наступнае: зь нішы ў муры той, хто быў справа, узяў судзіну з крывёй Хрыстовай і вадой, збоку ўзьбег па прыступках, абліў над чарай віном і вадой пальцы сьвятара. Левы адразу ў поўны рост падняўся да далматы; асьцярожна, як сьвятар чару да народу, ён наўскась паднёс далмату з падстаўкай. Але потым здарылася наступнае: пасярэдзіне служка спаткаўся з другім, каторы вярнуўся з пустымі рукамі ад нішы ў муры; яны прыхілілі калені, той, які быў справа, пашыбаваў налева, а левы з далматай наўскась перад сабой падняўся адразу направа і паставіў цяжар на аўтар. Зноў з пустымі рукамі ён якраз па прамой сыйшоў уніз, і абодва яны адначасна прыпаднялі прыполы строяў і апусьціліся на калені. Сьвятар, у гэтым можна было не сумнявацца, пайшоў направа да далматы і адкрыў разьдзел надзённы; маючы намер нешта сказаць, ён пайшоў назад на сярэдзіну; *domnus wobisku*, сказаў сьвятар да народу; *etkuspiritutu*, адгукнуліся служкі як прадстаўнікі народу. Пасьля сьвятар, скажы і запішы, зноў пайшоў направа да далматы; там ён прачытаў апошнюю малітву; ён вярнуўся назад на сярэдзіну, яны зноў сказалі свае словы, сьвятар хутка пацалаваў аўтар і адкрытым жэстам выпрастаўся да народу і адпусьціў грахі. Сьвятар зноў накіраваўся да аўтара, зноў павярнуўся і шырокім жэстам рук дабраславіў народ і служак. Пасьля гэтага ўсе ўсталі, правы служка папраставаў да далматы, між тым як левы пайшоў да сярэдзіны, а правы пайшоў наўскась налева з далматай, і сьвятар, вось што здарылася, пайшоў налева, ён прамаўляў, зьлева збоку на другой прыступцы служка ківаючы рэагаваў на ягоныя словы, ён сыйшоў уніз па прыступках, ён стаў зьлева, і сьвятар стаў зьлева, справа стаяў толькі правы служка, нешта пэўна ж здарылася, народ перад гэтым разам падняўся з лаваў, нейкі кароткі час прасейвалі ў сіце пясок з друзам, яшчэ раз усе разам прыхілілі калені, сьвятар зачыніў далмату і пайшоў на

сярэдзіну, левы узяў далмату, правы мітру, усе ўтрох, падняўшы твары да купалу і ўбок да народу, мерным крокам падняліся да аўтара, яны павярнуліся, як адзін ў сваіх строях прыхілілі калені, правы падаў сьвятару мітру, сьвятар узьнёс яе сабе на галаву, яны зноў павярнуліся да народу, правы пайшоў наперад, нага ў нагу за ім накіраваўся з далматай перад грудзьмі левы, з часткай свайго рыштунку сьвятар, гонячы іх удвух перад сабой, пакрочыў ззаду; аднак ня здарылася нічога. *Je k smerti obsojen* — пачаў я з свайго месца на лаве чытаць на чужой гаворцы; *useme te krish na suoie rame* — працягваў мой брат з другога месца; *pade prauish pod krisham* — працягваў я; *srezha svoie sholostno mater* — працягваў ён; *pomagh krish nositi* — працягваў я; *poda petni pert* — працягваў ён; *pade drudesh pod krisham*? спытаў я; *troshta te Jerusalemske shene*? — запытаўся ён у адказ; *pade trekish pod krisham* — павёў быў я; *je do nasiga sliezhen inu jemo so te grenki shauz piti dali* — працягнуў ён; *po na krish perbit* — працягнуў я; *je pouishan inu umerie na krishu* — працягваў ён; *je od krisha dou uset inu na roke Marie poloshen* – працягваў я; *bo u grob poloshen*, прачытаў ён да канца. Чуў гэта? спытаў я. Ужо прайшло, сказаў ён. Я чуў, сказаў я. Яны да гэтага ня дойдуць, сказаў ён. Берагуць сябе для большых местаў. Чуў ужо, сказаў я.
Што? пытае бацька. Аўтобус, кажу я. Дакладна а дзясятай, кажа бацька.

Упарадкаваны адыход з царквы

Народ напірае да выхаду. Аднак адчыненая толькі адна зь дзьвярніцаў. Дык як тады народ зможа ўпарадкавана прайсьці праз выхад? Тым больш што з абодвух бакоў дзьвярэй мураваныя чары для вады. Не пакратаўшы пальцамі ваду ў чарах, народ ня пойдзе да дзьвярэй. Народ напірае да выхаду. Адзін з народу цяпер нахіляецца да зачыненай дзьвярніцы. Але другія ціснуць на яго, і чалавека так шчытна прыціскаюць да дзьвярніцы, што ягоная рука і далонь ня маюць больш свабоды выцягнуць вэртыкальную засаўку дзьвярніцы з гнязда ў падлозе. Маса народу нарэшце выціскае чалавека да адчыненай паловы і на двор. Народ напірае да выхаду. Пры гэтым рукі народу працягнуты да чараў з вадою: рукі мужчын да правае,

рукі жанчын да левае. Як зможа той, хто стаіць пасярод народу, памачыць пальцы ў вадзе? Ён ня можа дастаць ні справа цераз галовы і плечы мужчынаў, ні зьлева цераз зачасаныя па–нядзельнаму высака валасы жанчынаў. Рукі яму прыціснутыя напіраючым народам да цела; выглядае на тое, што ня ён намацвае сабе дарогу наперад сваімі нагамі, а месца, на якім ён застыў, быццам нясе яго далей у пасоўваньні і шорганьні народу. Аднак другому там наперадзе, які ўпёрся каленам у зачыненыя дзьверы, удасца вырваць зялеза з гнязда ў падлозе. Але дзьверы адчыняюцца ўнутро. Так што якая карысьць з таго, што засаўка выцягнутая з гнязда ў падлозе, калі народ, які напірае, не дае адчыніць дзьвярэй? Таму, можа, чалавек хоча назад у царкву?

Высунуўшы твар і шыю ў адчыненую палову, ён вычэквае звонку перад зачыненай дзьвярніцаю і дарэмна цісьнецца плячыма ў выцісканыя масы людзей. Як толькі ён ставіць нагу на парог, яму адсоўваюць калені і плечы. Хоць ён тое, што мае сказаць, пасярод народу лёгка мог бы крыкнуць другому, ён захоўвае сьвятасьць месца, трымаючы поўную цішыню, адно што ён трудна дыхае, закусіўшы зубамі губу. Народ напірае да выхаду. Аднак у той час як народ напірае да выхаду, ён часьцяком топчацца на месцы; некалькі чалавек, моцна прыціснутых да зачыненае дзьвярніцы, закліньваюць наплыў другіх, праціскаючыся да пратуліны збоку; і тыя, хто мочыць пальцы ў вадзе, прымушаюць сваёй затрымкай наплываючы натоўп стаяць. Як жа тады той, хто, скажам, хоча прайсьці звонку ўнутро, зможа перадаць сваю навіну таму, хто засеў унутры пасярод народу? Як зможа той пасярод народу падняць руку і памахаць ёю, каб гэты першы яго ўбачыў? Прынамсі, народ цясьніцца на месцы, мушынае віраваньне на конскім воку. Між тым другому ўдалося крыху прасунуць дзьвярніцу ўнутро царквы. Тут трэба было чакаць, што звонку падыдуць многія, каб канчаткова плячыма і рукамі прапіхнуць дзьвярніцу ўнутро. Аднак звонку толькі адзін улягае ў дзьвярніцу. Белыя рукавы кашуляў, імкнучыся да каменнай чары, замыкаюцца перад выхадам у сетку. Ззаду народ пачынае выказваць незадавальненьне ў адрас чалавека, які ў непрыдатны час хоча выйсьці; сьпераду народ пачынае выказваць незадавальненьне ў адрас чалавека, які ў непрыдатны час хоча ўвайсьці. Аўтобус прыбыў дакладна а дзясятай. У перагудзе званоў чалавек

пасярод народу ня чуў, як ён ад'ехаў. Можна было разьлічваць, што ён будзе стаяць каля кіно столькі і столькі хвілінаў. Між тым пасажыры ўжо напэўна выйшлі. Таму, хто бачыць, як яны выходзяць, каб дабегчы да царквы, патрэбна столькі і столькі хвілінаў. Ці зможа чалавек, які дарэмна спрабуе цяпер адчыніць дзьверы ўнутро, своечасова паведаміць пра тое, што ён убачыў? Народ напірае да выхаду. У таго, хто стаіць пасярод народу, выступае вакол вачэй пот; пальцы другой рукі мочаць цяпер ягоныя пальцы; ён вырывае руку зь цеснаты і абмочвае пальцамі лоб; ён праводзіць рукой па лобе і па валасох і трымае яе над галавой; цяпер ён мог бы зьвярнуць на сябе ўвагу, памахаўшы ёю. Жанчына побач зь ім памачыла сабе пальцы вадою. Хто была гэтая жанчына побач зь сьляпым? Ці ўдасца яму зь яе дапамогай трапіць на вуліцу, не запазьніўшыся? Паколькі ён ня можа апусьціць руку, ён працягвае трымаць яе распростанай над плячом. Ён адчувае, як у яго на сьпіне халадзее скура; пад рытмічнае прыляганьне натоўпу ён адчувае пад зьмерзлай скурай канвульсійнае жыцьцё сырога пякоткага мяса; ад цяжару цела раптам падкошваюцца ногі; пад каленямі і ў ступакох пачынае моцна сьвярбець, дзьверы, думае ён, трэба, каб адчыняліся *навонкі* на выпадак пажару; але можна ўявіць сабе і іншыя выпадкі. Ён уцягвае галаву ў плечы і напірае да выхаду. Народ напірае да выхаду. Ці ўдасца народу выбрацца на двор, перш чым

Спатыкаючыся, я вывальваюся зь дзьвярэй. Жонка бацькі падымае з бруку мой кій. Яна працягвае яго бацьку. Бацька працягвае яго мне. Я дзякую. Ён кажа нейкае адно слова аб прамове сьвятара. Так, але, заўважае нехта другі па суседзтве. Што праўда, тое праўда, згаджаецца ён. Пад засеньню брыля над уваходам мы падымаемся, пляткарачы, па прыступках на месца, асьветленае сонцам.

Сьвіньню колюць

"Цяпер сьвіньню акунаюць у мэталёвы чоп і пераварочваюць у кіпні. Потым шчаціньне сашкрабаецца нажом з сыходзячай ад пары скуры. Разам са шчаціньнем аб край чопу здымаецца зь ляза нажа лоісты бруд".

Абвяшчэньне распараджэньняў на вясковым пляцы

Чалавек, які з ходніка, вялікі палец у згіне аркуша, пад аркушам другія пальцы, чытае наплываючаму натоўпу, які ўсё яшчэ вымыкаецца з царкоўнага завулка, распараджэньні адміністрацыі, сьпёрся локцем на рог дому; адно калена ён прыпадняў, пятой упёрся ззаду у цокаль мура; ягоны левы вялікі палец зачэплены крукам за самую ніжнюю пройму пінжака. Гэта яшчэ малады чалавек. З высокага каменя, ягонага заўсёднага месца, ён можа па–над тварамі, якія прагна ўглядваюцца ў яго, бачыць вуліцу, а таксама тыя шырокія, яшчэ тлуставата адбліскваючыя пасьля ночнага дажджу палоскі абапал дарогі, на якіх дзеці і падлеткі, праходзячы міма прыпаркаваных машын, могуць пісаць на блясе і шкле свае словы.

“Апошнім часам часта можна было назіраць, што падлеткі і дзеці на працягу дня заставаліся без аніякага нагляду. Яны бадзяюцца па мястэчках і чыняць шкоду. Яны пэцкаюць і пішуць крэйдай на сьцяне кінатэатру розныя словы”. Калі чалавек падымае галаву, ён бачыць над тварамі, якія ўтаропіліся ў яго, і за дзецьмі і падлеткамі, якія павярнуліся і разглядваюць яго, закопчаную сьцяну кінатэатру зь яркімі адбліскваючымі рэклямнымі вітрынамі, а перад будынкам апырсканую засохлым брудам шыльду прыпынку.

“Каля слупа прыпынка стаіць вэлясыпэд, колер белы з чырвоным, апырсканы засохлым брудам, на чырвонай раме белая страла, даволі прыхоплены іржой, зь некалькіма перадачамі, тросік пераключэньня барзьдзіні парваны, на балотніку няма катафоту, званок бяз накрыўкі, сядло моцна пацёртае”, адзін з хлопчыкаў, праходзячы міма, б’е кулаком па сядзеньні.

Ён чуе, як у зачыненых аўтамабілях выюць сабакі. “У часе сьвята некаторыя ўладальнікі сабак маюць звычку неабдумана зачыняць сваіх сабак у машынах; тыя скачуць на шыбы і сваім выцьцём парушаюць нядзельны спакой; альбо яны запаўзаюць пад сядзеньні, куды не дастае сонца, і там выюць і вішчаць, злуючы многіх грамадзянаў”. Калі потым дзьверы адчыняюць, у машыне сьмярдзіць гнілаватай вадой; суха шорхае замоўклы

сабачы язык па заспакаяльных руках, а вочы ў жывёлы набраклыя крывёю. Цяпер сабаку дзеля таго, каб праветрыць машыну, найперш адпускаюць крыху пабегаць. Ён абпаўзае вакол машыны, хаваецца ў цень ад яе і там сядае на зямлю. Толькі празь нейкі час ён, высалапіўшы язык і задышліва хехаючы, вяртаецца ўсё ж да нармальнага дыханьня. Хоць дзьверы машыны цяпер адчыненыя, унутры ўсё яшчэ сьмярдзіць гніласнымі выпаражненьнямі; уладальнік аўта і жонка ўладальніка махаюць дзьвярыма, нагнятаючы ў аўтамабіль паветра. Скура задніх сядзеньняў апякае мацаючыя пальцы; яны з гэтага робяць выснову, што аўтамабіль пакрыты цёмнай фарбай. Сабака па абутку пасажыраў паўзе на сваё месца.

“На гэта зьвяртаецца ўвага”.

Чалавек, адводзячы пагляд на твары, якія прагна ўглядаюцца ў яго, працягвае правай рукой левай руцэ аркуш і ставіць другую пяту на цокаль мура. Потым ён зачытвае зь месца на перагібе апошняе распараджэньне, якое да гэтага закрываў ягоны вялікі палец.

Вось так далёка прасунуліся справы, як тут яго перапыніў сьвіст.

Сьвіст замінае сходу.

Ён адзіны з прысутных, хто глядзеў у накірунку сьвісту, усе іншыя глядзелі на яго; і тыя ў аўтамабілях апусьцілі ў дзьверах шыбы і паглядзелі на яго; нават тыя у самых задніх шыхтох праглынулі сваё мармытаньне і прагна паглядзелі ў ягоны бок; тое самае і тыя, хто ўжо безуважна кіраваліся дахаты, пасьля таго як ён замоўк, ідучы павярнулі галовы да яго назад. Каго клікалі? Каму падалі пра нешта сыгнал? Каму з прысутных быў прызначаны гэты сьвіст?

Той, хто ідзе, спыняецца. Той, хто стаіць, адыходзіць убок, каб можна было бачыць таго, хто сьвістаў. Чалавек на ўзвышшы быў адзіны, хто глядзеў у накірунку сьвісту; але паколькі ў ягонай памяці застаўся толькі расплывісты вобраз вялікага пальца, ён ня ведае, хто сьвістаў. Той, хто нічога ня бачыць, таму што ён невісны, вымушаны задаволіцца дзейкамі другіх. Седзячы ў аўтамабілі, ён нахіляецца наперад і ўслухваецца ў пытаньні і мармытаньне. Нарэшце той, каго паклікалі, адказвае такім самым сьвістам. Той, хто там цераз дарогу сьвіснуў першым, крычыць, навошта ён сьвістаў. Іду, крычыць той, каго

клікалі, у адказ. Сьвет не абрынуўся долу. Сход зноў гуртуецца; твары зноўку прагна ўзіраюцца на чалавека на ходніку, які вышуквае пальцамі словы на аркушы. “Парушэньні такога роду надалей забараняюцца”, чытае ён.
Ён складвае паперчыну на калене і пальцамі абцірае пыл з пляча. Калі натоўп пачынае разыходзіцца, на ім паўстаюць расколіны. Яны разьдзіраўліваюцца да пустых, адшкрэбленых да карычневага палосак з гэтага і з таго боку вуліцы. Шыбы аўтамабіляў адбліскваючы вырастаюць перад тварамі, маторы затушоўваюць выцьцё сабакі, дыханьне якога горача патыхае на лытку пасажыра. Уладальнік аўто, побач зь ім жонка ўладальніка, на задніх сядзеньнях трое запрошаных спадарожнікаў пасьля таго, як машына зь месца рэзка бярэ на дарогу, зноў перамяшчаюць свае целы, што запалі былі ў заглыбленьні сядзеньняў, наперад.

Аповед сястры
Мая сястра сказала, я стаў сьляпым у той дзень у лістападзе. Па глыбокім сьнезе мяне нібыта даставілі аднекуль назад у мястэчка на ваеннай машыне двое вайскоўцаў. Гэта было ўжо пад вечар. Праз акно, калі яна сядзела перад люстэркамі, сьвятло ад прымчалага па калдобінах аўтамабіля паволі, у суладзьдзі з калдобінамі, кружляла па столі пакойчыка.

Мужчына з марацкай кайстрай
Ганс, мабыць, прапусьціў гэты аўтобус. Перш як прыйсьці на пляц, ён бадай што бачыў, як аўтобус ад’яжджае. Відаць, ён стаяў і назіраў ягоны ад’езд. Ён хутчэй за ўсё ня бег. Бадай што, ён ішоў па горадзе, апусьціўшы галаву, мыс чаравіка як перасьледаваньнік уласнага ценю. Ён ведае гэты горад. Ён там часта бываў. Бадай што, ён не забыўся, якія там вуліцы. Відаць, ён моўчкі ішоў праз горад, зь непакрытай галавой, на ўзроўні сьцягна — варушлівая марацкая кайстра. Калі час яшчэ ня выйшаў, то ён мог бы ля выезду з гораду альбо яшчэ далей чакаць аўтамабіля побач з шашой, абапёршыся рукой на памост для малочнай тары. Ён ведае кіроўцу малакавозу з ранейшых часоў; ён часта езьдзіў у школу паміж малочнымі біклагамі, маючы пад сабой, калі апісаньне ня хлусіць, замест сядзеньня

сумку. Паколькі гэта было даўно, то кіроўца яго, відаць, не пазнаў; тым ня менш ён, мабыць, спыніўся, каб паставіць на машыну біклагі з памосту. Бадай што кіроўцу дапамагаў рабочы; чалавек з марацкай кайстрай назіраў за абодвума. Рабочы чалавеку незнаёмы, і рабочаму незнаёмы чалавек, які, паставіўшы нагу на самую ніжнюю ліштву памосту, моўчкі глядзіць, як яны, наўскась паставіўшы біклагі, у якіх іншым разам плёхае малако, на абруч, перакатваюць іх па кадаўбе машыны. Кіроўца хутчэй за ўсё зноў закрыў задні борт; адначасна рабочы няйначай як перакінуў пустыя біклагі з шашы праз калена на памост; сьледам за няпэўным блуканьнем яго позіркаў чалавек з марацкай кайстрай між тым усё яшчэ будзе стаяць моўчкі. Кіроўца падымаецца ў кабіну; з другога боку заскоквае рабочы. У той час як ён выцірае рукі ў малацэ аб нагавіцы, кіроўца выцягвае рукі з рукавоў сьпяцоўкі; аднак ён ня вешае яе ззаду сябе на кручок, а, пасьля таго як яна вольна аб'яжджае яму з пляча, прыціскаецца да сьпінкі і такім чынам прыладжвае жмут матар'ялу да ніжняе часткі сьпіны. Мы часта назіралі за ім такое. Бадай, толькі потым ён штурхне рукой рабочага; рабочы паглядзіць на кіроўцу; кіроўца, не выглядаючы на чалавека звонку, мабыць, толькі падыме адно з броваў, пасьля чаго рабочы выгляне да чалавека. Гэй, коратка зьвяртаецца такім чынам рабочы да чалавека. Чалавек паварушыў барадой і ўсьміхнуўся. Ён, бадай што, падышоў бліжэй, рабочы адкрыў яму дзьверцу, чалавек хіба што залез у кабіну і няйначай як паставіў марацкую кайстру паміж каленьмі. Калі час яшчэ ня вышаў, то ён хутчэй за ўсё пад'ехаў малакавозам. Ён моўчкі сядзеў паміж абодвума; можа быць, ён нават спаў, ківаючыся галавой на грудзі. Ураньні кабіна бадай што яшчэ не патыхала сьпёкай, як цяпер. Відаць, цяжарнік спыняўся ля асобных памостаў; кіроўца і рабочы ставілі ў кадаўб біклагі; тыя, хто ішлі міма, бадай што не маглі не заўважыць проста сядзячага ў кабіне чалавека. Ён моцна заматаў за далоні матузок кайстры. І твар яго таксама быў закрыты.

Сабака

Ціха, бухціць жонка ўладальніка. Ты супакоішся? Пытаецца

яна. Ты цяпер нарэшце супакоішся? удакладняе яна пытаньне. Ты супакоіўся нарэшце? Пытаецца яна з горыччу. Супакойся, упрошвае яна. Супакойся.

Мужчына з марацкай кайстрай

Пазьней у кабіне напэўна стала горача. “Як пырхаючыя крылы вусяка” дрыжэла бадай што пад рукой кіроўцы чорнае наверша пераключальніка барзьдзіні. Рабочы лупай запаліў цыгарэту; ад гэтай цыгарэты ён потым прыкурыў другую і засунуў кіроўцу паміж губ. Дым, відаць, пабудзіў сьпячага чалавека. Нават калі ён і ня спаў, то дым бадай што змусіў яго падняць галаву. Мабыць, ён папрасіў спыніцца. Мабыць, потым ён, не падзякаваўшы, выйшаў з кабіны. Гэта хутчэй за ўсё здарылася яшчэ на гасьцінцы, можа каля аднаго з скрыжаваньняў. У той час як мы былі ў царкве, ён хутчэй за ўсё ўжо ішоў ад гэтага скрыжаваньня ўздоўж рэчкі празь цясьніну. У той час як я высеў тут і яшчэ гаварыў з уладальнікам і жонкай уладальніка, ён бадай што ўжо пераадолеў шлях цераз цясьніну. У той час як мы крочым па дарозе наверх да хутара, ён няйначай як ужо дасягнуў другой дарогі. І ў той час як мы цяпер перад брамай, пачуўшы гукі, павернемся, ён ужо, відаць, рэзка матляючы кайстрай над галавой, задышліва пачаў падымацца па сьцежцы ўсьлед за намі і выгукваць маё імя.

Але ў нядзелю цяжарнікі ня езьдзяць.

Сьмерць маці

Тады, казала сястра, калі памерла маці, яна бачыла, як хворая сядзела там наверсе ў крэсьле з высокай сьпінкай. Нібыта жанчына выглядала нешта ў двары праз выразныя парэнчы. Яна як мага болей нахілілася наперад і сьпёршы выстаўленую ўперад галаву лобам на руку, здавалася б, адсочвала яе зьверху. Дзяўчына ўбачыла, як за жанчынай прабегла дзіця; гэта нібыта быў я. Я ня помню такога, сказаў я. Ты добра помніш, сказала сястра. Я бачыла, як ты бег, сказала яна; яна бачыла, як падалі з шчылін у падлозе, калі я бег, сухія травінкі і кукурузнае зярнё; таксама пад нагамі рыпелі дошкі на калідоры. Яна павесіла кошык на сьцяну сьвірну і адтуль галёкнула да жанчыны наверсе. Яна адышлася туды і паказала

свае жэсты і як яна галёкала. Хворая не адгукнулася; не падымаючы галавы ад рукі, яна праз карункі разьбы галоднымі вачыма выглядала нешта на падворку; зьнізу, хоць яна і паднялася на дыбачкі, дзяўчына ўбачыла толькі руку і пільныя вочы. Калі куры, квохчучы і натапырваючы пер'е каля галавы, пабеглі ад сьвірну, яна празь іхную гурму кінулася ў дом. У калідоры яна згубіла туфлік; яна паскакала на адной назе назад і бегучы абула яго на босую нагу. Яна сказала, што яна ўзьбегла па сходах. Але яна ўпала на калена і не пачула, як наверсе над ёю на калідоры перакінулася крэсла; і другога гуку, "бзычаньня", перад перакульваньнем крэсла яна таксама ня чула. Потым яна не глядзела на ляжачую жанчыну, сказала яна. Больш за тое, яна спачатку паставіла ўпалае крэсла і старанна склала на яго коўдры. Яна паказала мне, як яна паставіла крэсла. Я ня помню такога, сказаў я. Маці кленчыла на дошках; твар яна моцна прыціснула да дзіркі ад сучка. Цяпер здавалася, што яна пільна глядзіць праз падлогу калідора ўніз на курэй. Сястра сказала, што яна ў шаленстве прасунула кончыкі пальцаў у дзьве шчыліны вакол адной дошкі і паспрабавала адарваць дошку ад падлогі, прычым яе шыя торгаючыся біла галавой аб падлогу. Дзяўчына стаяла адвярнуўшы твар, яна гладзіла, разгладжвала коўдры на крэсьле. Яна спачатку ня бачыла, што жанчына плюе, сказала сястра; яна ня рухалася зь месца; я глядзела на жанчыну, якая стоячы на каленях прылегла да дзіркі ад сука і плявала на падворак на курэй. Сястра паўтарыла рухі, якімі жанчына плявала. Яе не апракінулася на сьпіну, сказала яна; больш за тое, як яна там сядзела і керхала, так раптам ёй выкінула з глухім стукам ногі; жанчына прылягла вухам да дзіркі ад сука і з адкрытым тварам ўслухвалася ў сварку і квахтаньне курэй. Вочы выступілі з вачніцаў; з шчакі выпаўзьлі вырынутыя рэшткі яды. Яна скасавурылася на раман у мяккай вокладцы побач з сабой; ня побач з сабой, сказаў я: побач з сваім целам. Што зьдзеялася? сказала сястра. Што зьдзеялася? Я ня мог згадаць: ні цыбулю, якая сушылася над маці на вяроўках і ад павеваў ветру памалу гайдалася туды–сюды, ні пытаньняў дзяўчыны, якая нахінулася да жанчыны і выцягвала яе пальцы з шчылінаў падлогі. Цыбуля гайдалася яшчэ да грукату, зь якім упала крэсла, сказала сястра. Цені ці не засталіся на месцы. Яна саскочыла з плота, на якім сядзела, і паказала, як яна цягнула

рукі жанчыны з шчылінаў: так, сказала яна і выпрасталася; валасы закрывалі ёй твар. Яна праз пасмы глядзела на мяне. Я застаўся сядзець на самай высокай жэрдцы плоту і абапёрся рукой на слуп; раз–пораз я падымаў плечы і бездапаможна глядзеў на прахон уверсе. Ня ведаю, сказаў я. Што гэты выпадак наогул мае супольнага з усёй гісторыяй?

“Ґрэґар Бэнэдыкт — манюка”.

Надпіс, вышкраблены на муры

Той, чыё імя напісана на муры, абвінавачваецца ў правапарушэньні, непаўнавартасьці альбо ганебным учынку. Ягонае імя вялікімі літарамі выпісана крэйдай на муры. Паколькі зярністая тынкоўка зьядае крэйду, той, хто піша, маючы толькі адзін кавалачак, відаць, эканоміць неяк; гэта не адзіны мур, які ён хоча пакрыць надпісамі. Калі ён піша, пяткі падымаюцца ад зямлі, а рука так высака задзіраецца над галавой, што пальцы, калі пішуць, пачынаюць трэсьціся; аднак у меру выкананьня надпісу, калі суставы ног пачынаюць балець, радок памалу абсоўваецца ўніз. Калі мур сьветлы, тады той, хто піша, ужыве нябелую крэйду; у гэтым выпадку імя таго, каго абвінавачвае надпіс, будзе зьзяць на муры блакітным альбо чырвоным. Той, хто сярод белага дня штурхаў па мястэчку вэлясыпэд і нахабным чынам адмаўляе гэта, — таго называюць манюкам. Яго імя зьзяе на муры дому. Той, хто адмаўляецца, між тым напэўна ня маніць: ён толькі аспрэчвае тое, што прыпісваюць яму другія. Мажліва, ён нават упэўнены ў тым, што гаворыць праўду, а другія, мажліва, упэўненыя, што пішуць на мурах хлусьню; тым ня менш ён, калі яго спыталі, і ён адказаў адмоўна, называецца манюкам, а ягонае імя зьзяе на муры. Але толькі напісаць імя на муры было б недастаткова, бо там зьзяе занадта шмат такіх і другіх надпісаў з ранейшых часоў, каб той, хто праходзіць міма, учытваўся ў гэты адзін як у асаблівы. Таму імя таго, хто абвінавачваецца ў праступку, будзе напісана і на сьвірнах; перад тым, як напісаць, з дошак абарвуць перадвыбарныя плякаты і заклікі рабіць якую–небудзь добрую справу, каб расчысьціць месца для надпісу. Сьцяна току будзе збольшага чорная; такім чынам, для яе адпаведнай будзе

сьвятлейшая крэйда; ёсьць небясьпека, што надпіс затруць анучай, так што трэба падкрасьціся позна ўначы зь лесьвіцай альбо знайсьці для напісаньня кравецкую цьвёрдую крэйду альбо наагул гіпс. Пражылкі дошак накіроўваюць, куды пісаць; з гэтае прычыны трэба будзе выбраць для напісаньня дошкі з простымі пражылкамі. Імя падазраванага будзе белымі літарамі зьзяць на сьцяне сьвірну; у пыле ля падвалінаў будзе бачнае заглыбленьне ад пальцаў; у іншым выпадку ночны вецер зноў ужо засыпле сьляды пальцаў ды скошаныя ямкі ад лесьвіцы. Тыя, хто праходзіць міма, будуць гучна чытаць абвінавачанаму, нават калі ён хай сабе вярнуўся з праходкі і, абдумваючы сваё становішча, занурыўся ў сябе ля адчыненага акна, словы зь сьцяны тока. Ён зможа слухаць іх, выцягнуўшы ногі над мыцельнікам пасьля доўгай вандроўкі; пэўна ж, ён імі ня надта будзе турбавацца.

Слова "дзеяцца"

Нешта дзеецца. Каб дзеялася, трэба каб адмянілася другая дзея; альбо каб нешта, што дагэтуль было бяз руху, мусіла нарэшце зрушыцца. Калі нешта усё яшчэ знаходзіцца ў стане спакою, зь ім нічога ня зьдзеецца; яно альбо будзе рухацца само сабой, альбо нешта звонку прывядзе яго ў рух: і тады яно ўжо зьдзеялася. Няма патрэбы другому бачыць рух; няма патрэбы яго чуць; і думка ёсьць рухам, хай сабе яна й нябачная: калі паўстае думка, то гэта дзеецца. І боль, які ўзьнікае, ёсьць рухам; ён узьнікае ў целе, якое разглядае нехта, без таго каб той, хто разглядае, адчуваў яго; дзеецца, таму што нешта, што дагэтуль было ў целе бяз руху, прыйшло ў рух. Калі нешта пачынаецца, то дзеецца; калі нешта зьмяняецца, тады дзеецца; дзеецца таксама нешта, што заканчваецца; але калі нешта ўсё яшчэ застаецца бязь зьменаў, хай сабе гэта будзе стан спакою альбо нязьменнага руху, але калі нешта ні зьмяняецца само сабой, ні зазнае зьменаў звонку, то зь ім нічога ня дзеецца; калі нешта праходзіць зададзеным яму натуральным чынам, не мяняючыся як–небудзь, то, хай сабе яно нават і рухаецца, зь ім нічога ня дзеецца. У мыцельніку, зь якога спрадвеку сьмярдзіць гнілым малаком і падгнілай вадой, нічога ня дзеецца і ня зьдзеецца, але вось з тым, хто нахіліўшыся наперад, раптам уцягвае ў сябе гэты пах, дык напэўна.

Што між тым зьдзеялася:

Ключ

Трэба заўважыць, пачаў бацька, які стаяў перад брамай з расшпіленым пінжаком, упёршы рукі ў бакі, гаворачы да жонкі, якая стаяла побач зь ім; трэба заўважыць, гаварыў ён прыгмурваючы вочы і гледзячы ўніз на сьцежку, што ён нікога не падазрае ў наўмыснай перадачы ключа; размова ідзе для яго толькі пра тое, каб вызначыць месца яго страты, — каб мы маглі б нарэшце скрануцца зь месца. Што ўжо зьдзеялася, сказала на гэта жонка, таго нельга зьмяніць. Хіба ён ляжыць на сьцежцы, разважыў бацька, не надаўшы ўвагі яе рэпліцы. Ніколі нельга ведаць, дадаў ён, безуважна кінуўшы позірк на курэй. У царкве, сказала жонка, ён яшчэ быў у сумцы. Магчыма, ты яго згубіла ў аўтамабілі, дапамог ёй бацька. Там, адказала яна, я не трымала сумку ў руках. Дык тады гэта бадай што здарылася ў мястэчку, разважыў сам сабе бацька. Там ён яшчэ напэўна быў унутры, расчаравала яго жонка. А ці напэўна? запытаўся бацька. Напэўна, бяз роздуму дала адказ жонка: калі я, так сьведчыла яна, нешта вымала з сумкі, ключ трапіў ёй з–за таго, што яна гэта шукала, паміж пальцаў. Але што яна вымала з сумкі? Ліст, адказала яна; яна аддала яго сваёй сястры. Скажы, дзе гэта адбылося, падбадзёрыў яе бацька. У царкве, узгадала жонка, калі народ напіраў да выхаду. І там, дапоўніў яе бацька, ён яшчэ быў унутры? Я ж гэта ўжо сказала, сказала жонка. Павінен жа ён дзесьці быць, даў выхад свайму раздражненьню бацька, ня мог жа ён скрозь зямлю праваліцца. Тут ён бадай што мае рацыю, сказала жонка, але ў нас яшчэ ёсьць твой ключ. Згодзен, пакпіў у адказ бацька, і тым ня менш ён хоча ведаць, дзе згублены ключ; што праўда, тое праўда — ён гаворыць ня проста дзеля забавы. Твой ключ, сказала жонка, у пінжаку. Бацька запэўніў, што яна хоча занадта хутка ўсё замяць.Так, ня стала спрачацца яна. Мне здаецца, я нешта ведаю, раптам прыйшло яму ў галаву. Не, адкінуў ён сваю ідэю падумаўшы, нічога з гэтага ня выйдзе. Стоп! усклікнуў ён цяпер нечакана — ці пэўная яна, што яна не чапала сумку ў аўтамабілі? Не чапала яна яе, прыняў я бок жонкі. Захоўвай спакой, крыкнуў на мяне бацька. Гэта яшчэ што! Няхай бы ён пасьпяшаўся, сказала

жонка, каб ёй пасьпець зварыць есьці. Вось дык сьмех! — усё больш запальваўся бацька, не чапала! Мы не чапалі сумкі! Даўно ўжо пара, абураўся ён, каб з рэчамі так абыходзіліся! Мы яго яшчэ ня ведаем! шматабяцальна працягваў ён. Мы, здаецца, яшчэ ня ведаем, якім ён можа быць!
Ужо паверце, такімі самымі словамі напампоўваў чалавек сваю значнасьць перад сынамі, вы ня хутка забудзеце гэты дзень! Слухайце, сварыўся ён далей, каб жа залежала ад яго, то нам бы давялося цяжка! Мы насьмельваемся, нагнятаў ён свой шал, стаць перад яго вачыма? Пра гэта мы яшчэ пашкадуем! разьятрыўся ён. Вы навалач паганая! ужыў ён імя ўласнае. Вы махляры! Прэч з вачэй маіх! І адразу! загадаў ён. Ці ведаем мы, хто мы такія? спытаў ён. Нягоднікі і ліхадзеі! сам сабе даў ён адказ, лайдакі, бандыты, рабаўнікі зь вялікай дарогі! Вы немарасьць ночная! і аспрэчыў сябе: круцялі, байструкі! Ён нас яшчэ навучыць іншаму! Не пакіне, абвясьціў ён, каменя на камені!
Аднак ён разважыў сабе гэта інакш, супакоіўшы свой гнеў доўгімі ланцугамі слоў і выгаварыўшыся да лепшага настрою. Пасьля гэтага ён павярнуўся на абцасах і пачаў быццам сьвярдзёлкам тыцкаць ключом у дзьверы; перад тым як увайсьці, ён усё яшчэ бухцеў, няхай жа будзе чыстым яго абутак, хоць самую вялікую гразь трэба пакінуць на жалезцы ля ўваходу. Зьверху ўніз, нахіліўшы галаву да пляча, ён глядзеў на нас у сваім цёмным гневе. І калі ён увайшоў, сыны ўсё яшчэ чулі вышчарбленае і расьцягнутае даўжынёю калідора хрыпатае буркатаньне ягонага бясконцага праклёну. Мы ціха пайшлі сьледам за бацькам у дом.

Мыцельнік

Тут, у кутку пакоя, дзе цяпер стаіць шафа, падлога з бэтону; перад гэтым тут стаяў сэпаратар; тут зь сярэдзіны столі, адкуль цяпер зьвісае толькі чорная шчэць дратоў, вісеў раней той абажур, пад якім цэлы дзень раіліся мухі; але тут пасярэдзіне шырокага падваконьня, дзе цяпер сьмярдзіць мыцельнік, раней таксама сьмярдзелі з мыцельніку раздушаныя мухі і гнілыя рэшткі малака; за сталом у кухні язык адчуваў, аблізваючы пасьля яды пальцы, мушыныя крылы і кішкі разам з крошкамі

гарэлай хлебнай скарынкі. Тры разы на тыдзень у сэпаратары вяршкі аддзяляліся ад малака. У прамежкавы час унутры сэпаратара і ў чопах на бэтоне гнілі рэшткі малака і вяршкоў. Толькі перад работай яны выпалоскваліся цёплай вадой. Аднак найчасьцей яны настолькі засыхалі, што іх трэба было адшкрабаць ад бляхі нажом; потым памыі вылівалі з чопу сюды ў мыцельнік. Я сядзеў перад ім на крэсьле альбо я ставіў да сьцяны ўслон, станавіўся на яго і ўцягваў у сябе пах; рот мой быў шырака адчынены, ноздры ня рухаліся; я дыхаў павярхоўна, як быццам бы я бег; твар быў бязь ценяў. На перакошаны твар скочылі б цені, шчокі сталі б тоўстымі, губы запалі б унутро. Гэта звычайны выраз гідлівасьці, сказаў мой брат. Ён стаяў пад абажурам, вакол яго кружылі мухі, мушыныя галовы, калі яны летучы стукаліся аб ягоную скуру, былі халодыя, — як ён гаварыў. Чаму кружылі мухі пад абажурам лямпы? Чаму яны не сядзелі на чопах альбо на сэпаратары альбо тут пад маім тварам вакол зьліву ў мыцельніку? Брат стаяў нерухома, з дрыготкімі пальцамі, толькі рот падступна прамаўляў да мяне; ягоныя рукі памалу ўзьбіраліся ўверх па целе. Я ціха павярнуўся, вуха было скіраванае ў ягоны бок; я чуў, што ягоны рот разьляпіўся; потым ён урэзаў кулаком па абажуры, лямпа хвалямі завагалася ад удару, асталыя мухі вярнуліся ў свой калаварот і зноў пачалі ганяцца адна за другой пад усё больш роўным торганьнем абажура. Ён пайшоў да мяне і працягнуў руку, сьціснутую ў кулак, да мыцельніку; я чуў, як цёрліся і малолі пальцы; рука ўзьлятала ўверх; калі ён ўзмахваў ёю, я чуў, як у кулаку зумкаціць яшчэ адна муха; між тым ён ужо пабег да сэпаратару і, не асабліва дбаючы, запаласкаў тое, што злавіў, рэшткамі гнілое масьлянкі з чопу, які ён узяў з сабой, ды выліў у мыцельнік: панюхай, казаў ён потым, панюхай цяпер. Я перагнуўся і пачуў, як гэта ўсё цячэ па трубах. Усё яшчэ нічога? спытаўся ён, усё яшчэ нічога? Не, адказаў я і зрабіў выдых. Аднак адразу пасьля гэтага пада мной у зьліве стала ціха; паколькі я, прамовіўшы, зноў зрабіў удых, то заглынуў зь ім, бо ня мог закрыць адкрытую глотку, і хвалю смуроду, які, быццам полымя, падняўся са зьліву і прагнаў усе жаданьні. Цяпер пахне? спытаў брат, пахне? Не, упарта адказваў я, нічога ня пахне, зусім нічога ня пахне, ня пахне нічога навогул.

Асінае гняздо

“З жмуцікам паперы паміж сківіцамі аса паступова выконвае сваю будаўнічую работу, паўзучы наўскась зьверху ўніз; яна накіравалася па ўскрайку ўжо гатовай часткі і праткала мяккую, змочаную яе сьлінай палоску далей; але работа часта перапынялася, потым узнаўлялася, бо хутка вычэрпваўся запас. Тады трэба было паблізу току абшкрэбсьці зубамі збуцьвелую ад мокрага паветра і выбеленую сонцам галінку дрэва, выцягнуць валокны, расшчапаць іх, зьвіць у гнуткі лямец; з гэтага новага жмуціка потым працягвалася будаўніцтва над намі. Мы бачылі, як аса закруціла ніжнюю частку тулава і нырнула ў зеў яе пабудовы. Боязь, сказаў ты. Сам боязь, запярэчыў я. Гаворачы так, мы стаялі па калена ў сене і ішлі яшчэ далей і глядзелі немігаючымі прагнымі ўтароплеными наверх вачыма на цагліны току”.

Што зьдзеялася далей:

Мы абодва пайшлі на гумно, сказаў я. Мы прыцягнулі з гумна лесьвіцу. Праз падворак мы вярнуліся на ток.

У гумне я поўз уздоўж мура па складанцы дроў, казаў ты. Я зьняў лесьвіцу з крука. Рукамі я спусьціў яе да цябе. Канец лесьвіцы я паклаў поперак складанкі дроў.

Я праціснуў мой канец лесьвіцы мыскамі да падлогі, сказаў я. Ты прапоўз з складанкі па папярэчынах лесьвіцы ўніз. Я паставіў лесьвіцу на рабро і павалок яе па гумне. Ты адным скачком дагнаў і злавіў задні канец і панёс яго сьледам за мной на падворак.

Мы пранесьлі лесьвіцу праз падворак назад на ток, сказаў ты. Ты ўвагнаў нагу ў дзьверы; пры гэтым табе у твар пасыпаліся струкі ад зерня, якіх надзьмула ў пазы. Ты адпіхнуў мяне і лесьвіцу.

Мы без адвалокі накіраваліся на ток, сказаў я. Я з вузейшым канцом лесьвіцы пайшоў проста да задняга канца. Я бяз шуму выпусьціў з рук свой канец лесьвіцы.

Цяпер я падняў лесьвіцу, сказаў ты. Крок за крокам, падымаючы рукі ўсьлед за плывучымі ўверх папярэчынамі, ты прасоўваўся пад лесьвіцай. З–за рухаў жывата выехала з нагавіцаў кашуля. Ты шырака расставіў ногі і ўпёрся імі ўпоперак канцоў лесьвіцы. Ты, як і я, падымаў лесьвіцу і

падсоўваў яе вэртыкальна бліжэй да сябе. Я перадаў лесьвіцу табе.
Мы прыставілі яе да бэлькі пад дахам, сказаў я. Ты падаў мне палку. Зацісnуўшы палку ў руцэ, я падняўся наверх.
Лезучы ўверх, ты глядзеў на абутак, сказаў ты. Ты глядзеў на мяне праз згінаньне і выцягваньне ног. Гразьзю з сваіх падэшваў ты наскроб брылі на кантаватыя папярэчыны.
Я глядзеў празь мяняючыя адна другую ногі на цябе, сказаў ты.
Ты пада мной прыціснуўся каленьмі і лобам да лесьвіцы. Ты адвярнуў галаву і глядзеў часта і ўсё часьцей на дзьверы.
Дзьверы току былі яшчэ адчыненыя.
Пасярэдзіне лесьвіцы ты спыніўся, сказаў ты. Зьверху ты, зачапіўшы туфлі каля пяты за папярэчыну, паскідаў іх уніз. Ты стаяў у шкарпэтках. Пальцы зачапіліся за папярэчыну. Ты адхінуўся назад.
Я сеў на лесьвіцу, сказаў я. Дзьверы ўсё яшчэ былі адчыненыя.
Ты ўцягнуў галаву ў плечы.
Абедзьвюма рукамі ты абшчаперыў палку і папіхнуў яе ўверх, сказаў ты. Ты ня трапіў у гняздо. Удар адно зрушыў зь месца цэглу зь перавязной бэлькі. Мы абодва нахінуліся і праз адчыненыя дзьверы паглядзелі на падворак.
Толькі ты нахінуўся, сказаў я. Я адразу саўгануў яшчэ раз. Зноў я ня трапіў у гняздо. Але я зачапіў яго, і яно адстала ад цэглы.
Яно адляцела ўніз, сказаў ты. Я прысеў на самай ніжняй папярэчыне. Нашыя галовы рухаліся, адсочваючы падзеньне гнязда. Спачатку мы абодва глядзелі ў падстрэшша. Потым нашы галовы паступова апусьціліся ўніз. Спачатку апусьцілася твая, а мая была скіраваная проста перада мной на падлогу. У такой пастаце мы больш ня рухаліся.
Гняздо падала па сьпіралі, сказаў я. Яго гнала праз пыл паветра і пераварочвала па падлозе току.
Мы захоўвалі цішыню. Перад дзьвярыма на мякіне і зерні адтулінай уверх ляжала гняздо. Яно выдрапала на запушаным пыле падлогі свой сьлед.
Адтуліна заставалася пустой і ненаселенай, сказаў ты. Яны пажэрлі зерне толькі вакол яе. Пасьля я ўстаў.
Ты, нахінуўшыся, адпіхнуўся ад лесьвіцы, сказаў я. Адну руку з сагнутымі напагатове пальцамі ты страхуючыся завёў за сьпіну. Нахінуўшыся, ты на дыбачках падышоў да гнязда. Аднак асінае гняздо было пустое. Ты бачыў, як яно падае з падстрэшша

пустое.
Гняздо было не пустое, сказаў ты. У адной з сотаў я нешта знайшоў.
Ты нічога не знайшоў, сказаў я. Ты толькі стаяў каля гнязда гатовы да ўцёкаў. З падворку на ток задзьмуў вецер. Павевам ветру гняздо падняло ў паветра. Ад страху ты скочыў на гняздо.
Я ўзяў яго ў рукі, сказаў ты. Я па адным ададраў наўзы. Да гэтага моманту ты сядзеў на папярэчыне.
Я падняўся зь лесьвіцы, сказаў я.
Мы разьмясьціліся з гняздом на сене. Ты выцягнуў раздушаную асу за крылы зь яе ячэі.
Вецер паразганяў курэй і з рыпеньнем і грукатам зачыніў дзьверы, сказаў ты.
Я больш не магу бачыць асу на тваёй руцэ, сказаў я.
Яна яшчэ ня мёртвая, сказаў ты. Яна ківае галавой. У цела стромка, як голка, уваткнута крыло. Пярэднія лапкі хапаюць паветра.
Ну, цяпер, сказаў я.
Не, сказаў ты. Яна курчыцца і шкрабатліва абмацвае скуру майго пальца. Нага дрыжыць. Тулава дрыжыць. Асу ўсю выгінае. Яна падымае дрыготкія крылы для палёту. Яе трасе знутры. Боль ці яшчэ што скаланае яе ўсю. Яна ляжыць тут. Яна крыжуе лапкі над целам. Яна падбіраецца і курчыцца. Крылы торгаюцца. Яна калзыча скуру. Нешта стаўляе яе дагары нагамі; яе скаланае нутраное трымценьне. Яна ўгінае ў сябе брушка. Ты можаш чуць, як шоргаюцца і шапочуць крылы. Боль ці яшчэ што апракідвае яе, яна выгуквае гэта. Яна ганяе на месцы па крузе. Яна лямантуе. Яна выгінае зь сябе брушка. Яна курчыцца, яна выцягваецца і

Паводка

У рацэ стаіць нейкі чалавек, сказаў брат. Ён стаіць пасярод крушні апусьціўшы галаву; рукі зьвісаюць яму ўздоўж тулава. Ён спусьціўся ў рэчышча зь берага, на якім мы сядзім, і па каменьнях памалу пайшоў да вады; паколькі мы так далёка ад яго, то здаецца, што ён стаіць беспасярэдне перад хвалямі: адным крокам ён няйначай можа зайсьці па калена ў ваду,

пасьля другога крока плынь пацягнула б яго з сабой. Але ён не стаіць так блізка ад вады, а ў некалькіх мэтрах пасярод валуноў перад калюгамі з стаячай вадой; уласна кажучы, ён павінен быў бы чуць, як я гавару.
Ён ня чуе цябе, сказаў я. Альбо ён чуе цябе толькі як бульканьне вады вакол галіны. Калі ты крыкнеш, ён павернецца.
Не, кажу я. Ён спалохаўся б. Калі ён хутка павернецца, ён пасьлізьнецца на камені і ўпадзе.
Хіба ён выглядае нешта? спытаў я.
Ня ведаю, сказаў мой брат. Я бачу яго толькі ззаду; палоска ягонага твару адсьвечвае сонцам, так што я не магу нічога разабраць.
У яго рот адкрыты ад стомы, сказаў я. Ён ішоў па каменьнях не замачыўшы ног і стаіць там і сьпіць у рэчышчы. Пасмы паветра ўлягліся вакол яго і заляпілі ягоны твар.
Ён ня сьпіць, сказаў мой брат. Ён глядзіць цераз ваду.
Ён саскочыў тут, сказаў я, і паміж вёдрамі і матрацамі прайшоў да вады.
Ён не прайшоў да вады, сказаў брат. Ён паволі ішоў па каменьнях і спыніўся пасярод крушні.
Вазьмі мяне за руку і дапамажы мне спусьціцца ўніз, сказаў я. Я пайду да чалавека і спытаю ў яго, што ён там выглядвае.
Ідзі, сказаў брат.
Ідзі цішэй, сказаў я. Ён павернецца.
Ён нас ня чуе, сказаў я. Ён якраз скрыжоўвае рукі на грудзёх і засоўвае далоні пад пінжак, каб пагрэцца. Ён стаіць і глядзіць проста перад сабой.
А сонца ўжо зайшло? спытаў я.
Сонца? спытаў брат.
Холадна стала неяк адразу, сказаў я.
Ты зайшоў у цень, сказаў ён.
У цень дрэваў з другога берага? спытаў я.
Не, сказаў брат, у цень чалавека. Твой твар у ценю чалавека.
Што робіць чалавек? спытаў я.
Ён глядзіць на камень, сказаў ён.
Ён не аглядваецца на нас? спытаў я.
Ён увесь час глядзіць на камень, сказаў ён.
Кантаваты камень? спытаў я.
Камень круглы, сказаў брат. Ён ляжыць ніжняй часткай у ставе,

да якой ад ракі вядзе пратока. Вада вакол каменя празрыстая і спакойная, бы перад тым, як замерзнуць. У глеі на дне я магу бачыць сьвячэньне; гнілая галіна тырчыць з глею; за яе канец заматалася палоска нейкага сукна.
І там ніякіх зьвяроў? спытаў я. Ніякага рака ані чарвяка?
Камар, сказаў брат.
Ён ня рухаецца? спытаў я.
Ён плывае па крузе, сказаў ён.
Ён здохлы? спытаў я.
Але, сказаў ён.
Калі ён здохлы, то напэўна вада рухаецца, сказаў я.
Вада прыбывае, сказаў ён.
Чаму прыбывае вада? спытаў я.
Пачынаецца прыліў, сказаў брат.
Гэта ж рака, сказаў я, а ня мора.
Гэта мора, сказаў ён. Гэта акіян.
Гэта рака, сказаў я, і мы адныя. Перад намі няма ніякага чалавека.
Так, сказаў ён. Мы адныя. Мы ад берага па адхоне спусьціліся ў рэчышча і стаім перад каменем пасярод крушні. Верхняя частка каменя яшчэ не занятая вадой; на ёй барозны, як зьвівы на сьлімаковым доміку; там лёг засохлы бруд; больш нічога не відаць.
Можа, мурашка, сказаў я.
Дзьве, сказаў брат, дзьве мурашкі. Яны выратаваліся, уцёкшы на скалу, і цяпер поўзаюць па ёй. З самалёту яны выглядаюць мурашкамі. Запракінуўшы галовы, яны махаюць рукамі і крычаць.
Гэта дзеці? спытаў я.
Але, сказаў брат. Яны ляжаць на скале, аброслай лішайнікам. Адно дзіцё ўстае і глядзіць па–над вадой: ці прыбывае яшчэ? кажа яно другому: я не магу нічога бачыць. Мне холадна.
Мне таксама холадна, сказаў я.
Апрані мой швэдар, сказаў брат.
Пайшлі валей назад, сказаў я.
Не, сказаў ён. Што такое? спытаў я. Чаму ты крычыш?
Вада, сказаў ён.
Гавары гучней, сказаў я. З–за гудзеньня матораў я не магу нічога пачуць.
Вада рухалася наперад і выціскала абодвух на маленькую

пляцоўку, сказаў ён. Адно дзіця цягне за сабой другое. Аднак вада яшчэ падымаецца; па ёй самой нельга заўважыць руху. На ёй уверх–уніз гойдаецца саламяная страха; флюгер на вільчыку моцна круціцца адначасова з разгойдваньнем страхі: вецер там унізе, напэўна, штармавы. Там, дзе салома аддзертая з крокваў, трапечуцца адзежыны, якія павымыла з скрыняў і куфраў; вада сплюснула і перакасіла страху.
Што робяць дзеці? спытаў я.
Яны гавораць, сказаў брат.
Што гавораць яны? спытаў я.
Яны гавораць пра ваду, сказаў ён.
Колькі месца ў іх яшчэ ёсьць? спытаў я.
Ты змог бы зрабіць там тры крокі, сказаў ён. Яны, скрыжаваўшы ногі, сядзяць адзін побач з другім, сьпёршыся пляскатымі далонямі на скалу; каля іхных пятаў стаіць вада; яна празрыстая і спакойная. Між тым яны гучна крычаць; я бачу гэта па чорных, рухомых дзірках на тварах, якія скіраваныя да нас; з носу аднаго зь іх ідзе кроў. У гэтага дзіцяці толькі правы чаравік, які мыском таксама зьвернуты да нас; на пальцах левай нагі я бачу споўзлую шкарпэтку. Ногі другога дзіцяці голыя; косткі цяруцца адна аб другую.
Дзе наш трос? спытаў я.
Мы забыліся на яго, сказаў ён.
А вада? спытаў я.
Вада яшчэ стаіць вакол нас абодвух, сказаў ён. Яны сядзяць пасярэдзіне сухога круга і ціха ды хапатліва гавораць. Раптам яны падымаюць галовы і глядзяць уверх на флюгер; толькі цяпер, калі ён нерухомы, чутнае яго рыпеньне; мы тут наверсе нічога ня ведаем пра гэта. Вада ў адным месцы якраз крыху прасоўваецца ў круг і замочвае абцас аднаго зь дзяцей. Хоць яны і ня бачаць ваду ў цемры, абодва адразу перастаюць гаварыць; аднак яны не прыціскаюцца адзін да аднаго — яны сядзяць услухваючыся з адкрытым ротам. У гэты момант
Не, сказаў я.
У гэты момант, сказаў брат, зь цемры выносіць мёртвую сьвіньню, і яна паволі праплывае паўзь дзяцей. Не кантралюючы рухі рук, яны труць тыльным бокам далоняў вочы і здранцьвела глядзяць на сьвіньню. Сьвіное бруха з смочкамі пагойдваючыся адсьвечвае белым з вады; яно стукаецца аб страху, коратка шкрабе аб бэльку і валюхаецца

далей. Сьвіньня, кажа адзін да другога, поўны сподзіву. Сьвіньня, кажа другі і ў зьдзіўленьні аблізвае кроў з губы. І ў той час як яны сядзяць і гавораць пра сьвіньню, на гарызонце на фоне вады ўзьнікае трымценьне, якое ідзе празь вёскі і лясы, і мы яго ня бачым.
Пайшлі назад, сказаў я, пайшлі назад!
І адным махам, сказаў ён, адным махам, адным махам вада падымаецца, вада падымаецца, адным махам вада падымаецца і, вада падымаецца, адным махам вада падымаецца, вада падымаецца і і і і і і і і і і і іііі
Не! сказаў я.
І цяпер, сказаў ён.

Мёртвая аса
Яна пахне як спалены запалак, сказаў я. Яна пахне як разжаваны хлеб. Яна пахне як глей пасьля паводкі. Яна пахне як агонь пад дажджом.

Чалавек з марацкай кайстрай
Да абеду дамы і другія будынкі мястэчка стаяць у празрыстым кіпені. Назіральнік можа бачыць, як мкнуцца і трымцяць хвалі над дахамі, дзе чырвоныя цэглы пачынаюць запальваць ваду. І жар бясколернага дыму, пад якім у кожным жытле смажыцца мяса на абед, узрушвае і рабацініць ваду. Над дахамі дамоў, над асфальтам і над дахамі прыпаркаваных аўтамабіляў вада ад парываў полымя набягае павалокай і восьпінамі. Вада паглынае гук крокаў; з вараным, перакрыўленым тварам, наўскась трымаючы рукі перад вачыма, тупае той, хто знаходзіцца там звонку, супраць масы. Губы глуха белыя і адслоеныя ад зубоў, зрэнкі выпаленыя да чарнаты, па–над высунутым языком вада праз шырака адкрыты рот праліваецца ў горла, і йдучы, рухаючыся без упыну, ня можа яе праглынуць: ён нават ня йдзе: ня йдучага, яго памалу зносіць наперад плынь. Палосы пылу на гасьцінцы гэта водарасьці, якія наскрозь спавіваюць ваду; на дне бязгучна перакочваюцца жмуты паперы і пасмы сена, што ўпалі з фурманкі; вусені на асфальце, хоць яны ўстаюць на дыбкі і выцягваюцца, ня рухаюць ужо целам самахоць, а іржа, на якой яны ляжаць,

згінае і гняце іх уверх; іхныя рухі пазычаныя, падобна рухам пылу, сена і паперы.
Тут, дзе йдучы ўжо даўно пакінуў мястэчка за сьпінай (бо ў населенай прасторы мястэчка на вуліцы няма поўзаючых жывёлаў), вада кіпіць ужо толькі над асфальтам на мяжы сушы і неба, якое расшыраецца і расьцягваецца ў меру таго, чым далей прасоўваецца вандроўнік, а таксама вакол самога йдучага, які апрануты ў цёмнае і нясе на плячы чорную аблямаваную скурай марацкую кайстру. Ён больш ня можа павярнуць вочы ўбок; яны таксама зварыліся і кругла–нерухома выпучыліся з вачных праёмаў. Ён больш ня чуе гуку ўласных крокаў; ніхто, нават калі б ён ступіў да яго і пачаў бы прыслухоўвацца, ня змог бы пачуць на мяккай вуліцы яго адыходзячых крокаў. Назіральнік убачыў бы, што яго як паперу бязгучна нясе над дном. Чалавек ня змог бы прысесьці на бардзюр; і седзячы ён ня змог бы сьпёршыся ззаду рукамі намацаць нагамі край каменя, каб прыдбаць апору: безупынная плынь, не даючы чалавеку з марацкай кайстрай засяродзіцца, зрушыла і панесла б цела далей яшчэ перад тым, як яно асела.
У кіпню папера ўсплывае не адразу; яна хутчэй паступова разьядаецца віруючай гарачынёй і запаволена выбухае шматкамі, якія, спавітыя токам вады, адзін за другім усплываюць наверх са дна.
Трава ля гасьцінца пакрытая бросьняю; колцы смалы на слупох лопаюць і цякуць; шаргатаньне ўнутры слупоў набухае ўвушшу да конскага тупату.
Абвараныя вочы сталі безабаронныя і перад позіркамі: вобразы, якія памяць выпрадукавала на сятчатцы як абаронны вал, ад полымя расплавіліся ў невідушчасьць; у той час як вандроўнік ідзе, агонь безь перашкоды падае ў ягоныя мазгі.
Зьнізу ягоныя падэшвы падсьвечваюцца. Кароткі тоўсты цень, якому марацкая кайстра надае яшчэ і гарба, рэзка высьвечваецца за ім. Калі б назіральнік задаў сабе працу падысьці бліжэй, ад ягонага вока не схавалася б, што на падэшвы чалавека прыклеіліся плямы смалы. Выглядае на тое, быццам ён меў жаданьне йсьці да наступнага мястэчка ўва ўласным цені.
Калі плынь заварочвае шыю і галаву назад, ён бачыць, што над ім стаіць у полымі без астачы ўся вадзяная паверхня. У другі раз ён заўважае, што ў гэтым полымі стаіць вымерлае мястэчка,

празь якое ён ідзе.
Паабедзе ляпаюць па дрэве званы.
Тармозячыя аўтамабілі глуха высморкваюцца ў вуліцу.
Калі ты прыслухаешся, ты ў пустэчы пачуеш, як пазяхае сонца.
Перад тым як вада ў рондлі канчаткова пачынае кіпець, яна выпарае са дна бліскучыя пэрліны: вада ідзе пэрлінамі, так гучыць выраз.
Цень карацейшы — думкі куртацейшыя.

Апошнюю прымаўку ўплёў у свае праклёны бацька, ідучы калідорам.

Стома

Іншым разам, калі я сяджу тут, мяне агортвае стома. Якраз толькі што я адчуваў пад разьняволенымі рукамі яшчэ і круглыя падлакотнікі крэсла; дрэва ўрэзалася ў напятую столку скуры паміж указальным і вялікім пальцам; якраз вось цяпер я чуў яшчэ, як стукнула дзьверца шафы; мыцельнік пах абваранымі мурашкамі; пакой апісваюць як даволі халодны; звонку гурма птушак порстка паднялася з плоту і прашумела нізка над дахам. Але тут наверсе без майго ўдзелу ногі паволі выцягваюцца на падлозе, і абцас шкрэбаючы выпісвае на дошках жэст стомленасьці; галава цяжка адкідваецца на сьпінку крэсла.
У адзін момант цела наглуха заплывае воскам. Незнаёма прабіваецца з даху рагатаньне птушак, стук шафы ператварыўся ў скрыгатаньне і шапяляваўленьне, замоўклыя драты лініі перадачы, на якія да гэтага яшчэ рэагавала вуха, цяпер настолькі нячутныя, што іхнае маўчаньне мяне не кранае. Шумы і пахі зьбіраюцца на скуры, не пранікаючы ўнутро. Цела заплаўленае воскам і нерухомае ад стомы. У той час як я сяджу, ува мне паўстаюць разважаньні; паколькі я ня ведаю, дзе я, паколькі я забыўся сам на сябе, з–за таго, што звонку ў мяне больш нішто не пранікае, паведамляючы такім чынам, дзе знаходзіцца маё цела, і паколькі маю ўвагу больш не прыцягвае ні адзін шум, думкі носяць мяне па нічыйнай зямлі; тое, што я сабе ўчыняю, гэта ня думкі, а думкі, учыненыя мне.

Я бачу, як ува мне мільгаюць месцы і відалі, якія я яшчэ ніколі ня бачыў; чорная бананавая шалупіна на пыльнай палявой дарозе адчужвае мяне; я дзівуюся на пажоўклыя валокны на нутраным баку шалупіны і на трапяткую постаць нейкай птушкі зь белым брушкам на тым самым месцы.
Але я яшчэ ня спаў. У хвалях паветра шуміць, паўтараючыся і ўзмацняючыся, прыбой гукаў, цьвёрдых і халодных, як целы мух па здранцьвелай скуры. Я чую іх, седзячы тут, як гукі без паходжаньня, спароджаныя ротам альбо чым бы там ні было яшчэ, што спараджае яго звонку. Потым у пустое памяшканьне, дзе я сяджу, абрыньваецца град каменьня; дзякуючы шуму галава пасоўваецца ад сьпінкі крэсла наперад, так што яна са сьвістам абрыньваецца на шыю зь вялікай вышыні, і пад час доўгага падзеньня галавы ўвушшу зьвініць паветра.
Гукі, якія да гэтага наслаіліся на скуры, цяпер таксама ўрываюцца ў цела. Гэта гукі, якія спачатку праходзяць гладка, але потым прыліпаюць да скуры і там праштурхваюць самі сябе вастрэй і цьвярдзей і таму горача ўсьвідроўваюцца ў цела. Гук робіць вадкім воск і разьбівае стому. Ён цяпер такі блізкі, што вуха адрозьнівае яго як гук, які азначае нейкае, маё імя.
Воклічы падымаюць галаву ад сьпінкі і адрываюць рукі ад падлакотнікаў; яшчэ здаецца, што яны пляскатыя, але калі (цяпер) звонку ў калідоры адчыняцца дзьверы, то яны, расьцягнуўшыся ўва ўсе бакі, упадуць у пакой і пабудзяць мяне.

Аповед сястры

Яна кажа, што калі яна ўбачыла, як фары джыпу кружляюць па сьцяне, то зьбегла ўніз у залю, дзе бабы, сабраўшыся пасьля таго як даведаліся пра вестку, прамаўлялі над мёртвым братам, чые твар і цела ўжо былі памытыя і ўрачыста прыбраныя, свае малітвы; яна, аднак, нічога не расказала жалобным госьцям пра джып, які набліжаўся; адвярнуўшы твар, яна нібыта падышла да труны і куды папала папырскала крапілам крыху вады з шклянкі, якая раней ужывалася для піцьця, на паднятую дзе–нідзе столкамі ільняную посьцілку, якая пакрывала цела патанулага брата. У той час як яна потым адхіснулася да лавы пры сьцяне і сядзела на ёй, цесна сьціснуўшы калені, і вялікімі вачыма глядзела на дзьверы, за сталом бабы гаварылі тое, што

яны гаварылі, толькі бязладна варушачы губамі наперад і назад, і да таго ж яны не датыкаліся адна да адной, так што словы іхнае малітвы, якія былі пазбаўленыя гукаў, пагатоў што бабы яшчэ і сьпявалі хорам, здавалася, паходзілі не ад жывых істотаў, а ад мёртвых стварэньняў з–пад зямлі; рукі, нават калі бабы не гаварылі, ляжалі счэпленыя адна ў адну на стале і сваім мерным рухам наперад і назад, які прадыктоўваўся бязмоўнай раўнамернасьцю хора, заціралі на нацёртай сольлю драўлянай стальніцы мокрыя кругі ад чайных сподачкаў.
Не апрануўшыся яшчэ да гэтага часу ў цёмныя строі і не павязаўшы на галовы чорныя ядвабныя хусткі, яны цесна згуртаваліся вакол стала, ногі ў высокіх гумовых гамашах. З кропкамі бруду на ваўняных панчохах, яны прыйшлі ў тым парадку, у якім сядзелі за сталом; атрымаўшы вестку пра тапельца, яны пакінулі ўсё як яно ляжала ці стаяла і праз усё больш і больш густа падаючы сьнег расхрыстаныя прыбеглі з суседніх дамоў, каб прыбраць нябожчыка, забясьпечыць яму патрэбнае; зрабіўшы гэта, яны пасьля таго як сьцямнела, сядзелі вакол стала і маліліся: адна зь іх пыталася, на што другія ў ейнай манеры падымалі галаву і наперабой мармыталі адказы, пакуль першая, якая пад час адказу трымала галаву апушчанай, зноў падняўшы галаву, не працягвала свае пытаньні.
Яна глядзела на дзьверы, сказала мая сястра, ніхто з бабаў нібыта не пачуў, як спыніўся джып; тым ня менш яна чакала, што яны адразу перапыняць сваю малітву і, спадцішка паглядзеўшы на яе, стуляцца галовамі і пачнуць шэптам натуральную размову. Але нічога такога: заглыбленыя ў сваю малітву, яны не ўспрынялі, што адбывалася там на падворку. Перад брамай прадстаўнікі ўзброеных сілаў, якім, што зусім пэўна, пры ўваходзе былі ўчыненыя перашкоды з–за нейкага інцыдэнту, з–за якога, яна не магла на месцы высьветліць, затрымаліся на час хіба што кароткіх перамоваў, якія адбыліся звонку, так што яна ўпала ў аблуду, што, магчыма, пачутае ёй толькі прымірсьцілася; аднак пасьля жаўнеры, абабіўшы з ботаў сьнег, цяжкай хадою ўваліліся ў калідор.
Дзьверы ў залю, у якой знаходзіліся спачуваючыя госьці, а таксама сястра, былі апрацаваныя карычневай марылкай; коса і няшчыльна, зь якое прычыны гэта ні было б, унутры ў замку тырчэў ключ.

Локцямі і насілкамі жаўнеры чапляліся за сьцяну, аднак на кола малельніц нават гэты выразны шум не зрабіў уражаньня. Яны панесьлі мяне калідорам. Голас, сказала яна, які падказваў тым, хто нёс, дарогу і дзьверы, так уразіў іх сваім гучаньнем, што яна пасьпешна паднялася з лавы і накіравалася да дзьвярэй; альбо інакш, удакладніла яна: яе ўвагу, чаму, ёй і цяпер незразумела, адразу прыцягнулі дзьверы альбо відаль дзьвярэй, якія зараз вось маглі расчыніцца. Між тым, як апавядала яна, ля ўваходу пачуўся шоргат абутку некага трэцяга і некага чацьвертага.
Што, спытала яна мяне, ты рабіў бы, калі б ты якраз працягнуў руку да клямкі, альбо калі ты навогул ужо ўзяў клямку ў кулак, і яна адным махам разам з тваёй рукой адціснулася ўніз, і незамацаваны ключ вываліўся зь дзьвярэй?

Увайшла жанчына і бяз слоў запрасіла мяне да стала.

Пачатак яды

Унурыўшы галаву ў газэту, бацька на кухні, моўчкі, не чытаючы, ахоўвае свой гнеў. Я, каленьмі адсунуўшы стол ад лавы, каб можна было прайсьці, працісквaюся на месца насупраць яго. Жанчына адыходзіць, вяртаецца і, не зьвяртаючы ўвагі на мужавы пальцы і на адкрытую газэту, сьцеліць безь нічога ніякага на стале белы абрус. Бацька моўчкі выцягвае рукі з газэтай і круглымі вачыма назірае, як яна распраўляе і разгладжвае абрус. Калі яна замацоўвае абрус па крузе на кантах прышчэпкамі, ён апускае рукі з газэтай назад на стол і распрастоўвае паперу пальцам, пакуль я ня чую, як тая прарываецца на сярэднім згіне; пасьля гэтага ён пускае газэту з рук, і яна млява падае на мае рукі. Я памалу высоўваю пальцы, так што газэта, якую ён нібыта чытае, спаўзае і плоска сьлізгае на стальніцу. Гэта павінна прымусіць яго альбо перагнуцца цераз стол, каб можна было расшыфраваць літары, альбо працягнуць далей рукі, падсунуць газэціну ў свой бок, а для гэтага пасунуцца з крэслам бліжэй да стала, калі ён ня хоча паступіцца выглядам чалавека, якому за чытаньнем няма справы да ўсяго на сьвеце; ён наважваецца на тое, каб паставіць локці перад сабой на газэту і ўтрымаць галаву ад падзеньня,

падпёршы яе пад барадой кулакамі. Пляскатыя талеркі на талерцы далоні, вялікі палец зьверху, у другой руцэ супавая талерка, як па канаце набліжаецца да стала жанчына. Я сьлепа выкладваю руку наперад і стаўлю яе з талеркай перад сабой на стол. Мужчына зацята чытае артыкулы з газэты, варочаючы ўнутры сябе свой пякучы гнеў, у той час як жанчына падсоўвае яму пад старонкі судзіну пад суп. Аднак ён маўчыць; ён толькі выпростваецца на крэсьле і з чутным чмяканьнем праглынае нявымаўленыя словы. Паколькі я гэта чую, я бяру зь яго прыклад і падцягваю, як ён, ногі пад сябе. Жанчына ставіць на стол круглую дошку і потым ставіць на дошку рондаль. Між тым мужчына аніякім чынам не дае адхіліць сваю ўвагу ад чытаньня; ён моўчкі вытрымлівае нават пару ад супу, што ахінае яму твар. Цяпер яна пачынае разьліваць суп у талеркі; з поўным апалонікам яна чакае над газэтай; потым, калі бацька нічога ня робіць, яна зноў выцягвае талерку і перакідвае ў яе апалонік. Хоць пырскі трапляюць мужчыну на камізэльку, ён усё яшчэ не загаворвае; ён таксама не зьбіраецца спыніць свой занятак, пакуль ён ня чуе, што перад ім і побач зь ім ядуць. Відаль дзьвюх асобаў, якія ўжо задавальняюць сваю патрэбу, нахінаючыся да талеркі і адхінаючыся ад яе, у той час як ён усё яшчэ павінен супрацьстаяць ім, не падыходзіць для таго, каб умацаваць яго ў цярпеньні. Хіба ён павінен углядацца, як яны тут за яго грошы наядаюцца? Такім чынам, ён падымае газэту, складвае яе і дапытліва цікуе вачыма навокал. Жанчына ўстае, замест яго бярэ газэтныя старонкі і нясе іх да судніка. Я пад сталом бяру ў прыгаршчы краі абруса, якія пасьля мыцьця ад крухмалу склеіліся ў кутасы. Між тым яна зноў моўчкі далучаецца да нас. Мужчына усім целам падсоўваецца да талеркі; калі ён цяпер апускае лыжку ў рот, пара шыбае яму ў вочы; ён затрымівае свой інструмэнт для яды ў супе і зноў цёмна–пагрозьліва аглядваецца. І жанчына таксама падцягвае ногі пад сябе, так што пальцы шкрабуць па падлозе. Усе, хто цяпер гатовы да яды, шчытна падцялі пад сябе ногі; паміж гэтым трыкутнікам ног напружылася вольная прастора, у цэнтры якой з двума промнямі ляжыць магніт. Мужчына тыцкае лыжкай у суп і зачэрпвае, ціснучы на яе і топячы вялікім пальцам, а потым закрыўленай рукой вымаючы яе з талеркі. Мы робім так, як ён. Адначасна звонку на падворку ад падножжа мура ўсё больш вялікай калёнай да акна кухні

кіруюцца мурашкі; таму што мы ўжо глытаем, і таму што да таго ж мужчына яшчэ злосны, ніхто з нас не пачынае гаворкі, ніхто з нас ня хоча распачынаць гаворкі!

Гнеў праходзіць

Ці можа ў чалавеку, які есьць, існаваць гнеў?

Калі ўгнеўлены есьць хлеб, і хлеб ужо чэрствы і пакрыўся цьвіляй, так што скарынкі і сухары драпаюць дзясны, тады вочы ў яго стануць змрочнымі, небясьпечнымі, і ён пачне жаваць яшчэ мацней і хіжэй. Мацнеючыя вібрацыі шыі паказваюць нарастаньне пачуцьця; пальцы ў чаравіках падымаюць у вышыні разьюшаную нагу.

Але цяпер, на шчасьце, угнеўлены есьць ня гэты хлеб, а добра запраўлены спэцыямі суп; да гэтага яшчэ далучаецца тое, што да гасподы, у якой ён есьць, амаль не даходзіць шум другіх, зь якімі ён утварае цесную супольнасьць; каб не злаваць яго бязь меры, яны стараюцца есьці суп ціха. Такім чынам, ён змушаны абставінамі ўслухоўвацца ўва ўласныя шумы, дарма што ён усё–такі намагаецца любымі сіламі працягваць гнявіцца.

Спачатку ён есьць так, як мае звычку есьці заўсёды, — нахіліўшыся над талеркай і засмоктваючы лыжку губамі ад краю ўглыбкі рота, ледзьве рука напалову правядзе яе ад талеркі; але цяпер, паколькі на кухні амаль ціха, ён зь непрыемнасьцю чуе, як суп гучна пераліваецца з лыжкі назад у талерку; ён ня можа пазбавіцца ад сьвісту паміж зубамі; падступна катуе яго чмяканьне губ; нарэшце і храп ды хруканьне ў шыі пры кожным каўтаньні наводзяць чалавека на іншыя думкі.

Такім чынам, ці можа ў ім, калі ён есьць, знаходзіцца гнеў? Ці не адхіляць яго ад распаленых пачуцьцяў шумы ў амаль ціхім пакоі?

Нарэшце ён зробіць так, што ён, каб другія больш ня чулі ягонага дакучлівага глытаньня, спачатку адтэрмінуе сваю помсту, сядзе проста і пачне зь імі размову, можа пра мурашыную матку, якая, кульнуўшыся праз адчыненае акно на падлогу кухні, цяпер зьбіраецца, перакуліўшыся праз галаву, схаваць сваё брушка ў шчыліну і назад у зямлю, хоць пад кухняй толькі сьмецьце і гліна.

Мурашкі

У кожным леце ёсьць дзень, у які яны падымаюцца з сваёй земляной гасподы; перад гэтым і пасьля можна пабачыць толькі калі–нікалі некалькіх зь іх, адну за другой, на іхных мурашыных сьцежках. Ты якраз абсунуўся з падваконьня па тынкоўцы на падворак; ты іх не адчуваеш на руках і ззаду на нагавіцах; але перад тым, як пайсьці, ты ўжо чуеш, як яны вывальваюць гурмой зь зямлі праз гарызантальны праход. Ты аглядаешся; ты бачыш, як цякучая смала зьнізу выплывае на мур; ты бачыш, як у смале плываюць шэрыя плоскія каменьчыкі; ты бачыш, як каменьчыкі на сьпіне рою кіпнем пырскаюць да акна; ты не адрозьніваеш, нават калі падыдзеш бліжэй, у роі асобных інсэктаў, хіба што вунь тую з крыламі, ты ня бачыш пад імі ані пясчынкі ў тынкоўцы. Адступаючы, ты ўтараплівaешся на рой, які без упыну лезе ўверх па муры; ты глядзіш і глядзіш, пакуль ты ня можаш больш адвесьці пагляд, — вось ты і даглядзеўся! Яшчэ адчыненае акно кухні. Калі ты паклічаш, нехта выгляне. Той, хто падыдзе да акна, пакладзе рукі на падваконьне і высунецца; паколькі ён яшчэ стомлены ад яды, то рукі ўціскаюць далоні ў падваконьне, так што ён ня можа іх болей выслабаніць; такім чынам, ён стаіць нахіліўшыся наперад з разьняволенымі рукамі; як толькі ён бачыць, што яны набягаюць, у яго вырываецца з горла вокліч. Але яны між тым ужо дасягнулі ягоных пальцаў і прабіваюцца ўверх праз рэдкія пучкі валасоў на пальцах, праз лагчыну паміж косткамі, па венах і супраць валасоў да закачанай кашулі. Ты чакаеш, што ён адскочыць, што ён выкіне рукі перад сабой углыб кухні і што ён іх будзе ўдоўж і ўпоперак размазваць аб раму дзьвярэй, аб стол і аб падпорку пліты. Аднак ён застаецца ў той пастаце, у якой стаіць цяпер; ён толькі рассоўвае пачарнелыя, скручаныя рукі і такім чынам закрывае акно. Між тым рой не спыняючыся ўжо зацякае пад кашулю; тыя з крыламі ўздымаюцца ў паветра і пырхаюць яму ў твар. Потым ты можаш бачыць, як звонку другія кучамі набягаюць на мур і на падваконьне: яны пералазяць адна цераз адну; заднія скідваюць пярэдніх на шыбу як вал; высьлізганьне лапаў, адскокваньне галоў, распырскваньне мурашынай вадкасьці, шуршаньне

крылаў ты чуеш як лёгкае кіпеньне, як шыпеньне ветра ў кароткай мокрай траве. Яны насыпаюць перад шыбай чарнаватую гару. Ты ня можаш ні глядзець на кухню, ні чуць там што–небудзь: ты стаіш зачараваны спэктаклем. Калі дзьверы дому падаюцца ўнутро, ты бачыш, што ў тваім застыглым паглядзе перамяшчаецца адно нейкі цень, які ўздоўж мура вандруе да акна. Тады ты хутка трасеш галавой, так што цень праяўляецца перад тваімі вачыма; ты распазнаеш рукі, якія трымаюць карычневы эмаляваны чайнік, ты распазнаеш на руках цяпер ужо спушчаную кашулю, а на твары, на які пырхалі тыя з крыламі, ты распазнаеш пад рэзка сапучым носам вусы, якія добра вядомыя табе. Чалавек трымае чайнік не паміж абедзьвюма вэртыкальна закругленымі рукамі; больш за тое, ён накінуў насоўку на ручку і такім чынам трымае чайнік у адстаўленай руцэ; калі ён апускае дзюбку чайніка, ты бачыш, як над ёй віруе паветра; аднак да гэтага часу адтуль яшчэ не выдзяляецца пара, не выцякае вада, і табе здаецца, што вадкасьць учэпіста прыклеілася ўнутры судзіны. Потым нарэшце выскоквае струмень і робіць упырск у вал. Чалавек адразу перахоплівае чайнік, адстаўляе яго далёка ад сябе і, нахіліўшы галаву, разглядае акно. Ты можаш бачыць, як рой блішчыць і ільсьніцца; пах абвараных целаў закрадваецца табе нечым новым у глотку; ты пракоўтваеш і глядзіш, пакуль ты ня бачыш, што штурм акна яшчэ працягваецца і што тыя наверсе, якія ўжо мёртвыя, адпіхваюцца жывымі зьнізу і падаюць. Чалавек адыходзіць убок, па шырокай дузе вымахвае за сабой чайнік, глыбака ўнізе набірае размах і размашыста ліе варатак, забіраючы ўверх, на вайсковую калёну і аж да сярэдзіны шыбы. Потым ты бачыш, як ён кулаком гваздае па шыбе і як пасьля там авангард рою курчыцца, разьдзяляецца на асобіны і ападае да другіх на падваконьне. Ён зьвяртаецца да цябе і даручае, рэзка кінуўшы галавою, бегчы ў дом. На кухні ты сустракаеш жанчыну, якая ўжо апалонікам нясьпешна пералівае ваду зь ёмістасьці на пліце ў вялізную выварку; ты хапаеш з стала кубак і дапамагаеш ёй. Абматаўшы вушкі пярэднікам і лахманамі колішняй фіранкі, вы, згорбіўшыся і кульгаючы, цягнеце выварку да мужчыны на падворак. Толькі калі вы ўжо выйшлі з дому, табе раптам кідаюцца ў вочы скукожаныя зернеткі на фаерках пліты, стуленыя і раздушаныя зернеткі ў шчылінах падлогі, і на талерках ды ў місках, якія,

напоўненыя смачнымі стравамі, яшчэ ледзьве былі кранутыя гатовымі да яды людзьмі, падпаленыя, адасобленыя часткі членаў, як мышыны памёт, які мае кіслы смак, а пад і над імі адорваныя крылы тых, што мелі іх. Вы паставіце выварку перад акном, ты вымеш з вушка ручнік. Калі ты пачнеш выстукваць яго аб мур, ты ўбачыш гэтыя раздушаныя члены таксама і ў столках ручніка; далей мужчына вачыма дасьць табе знак, каб ты адышоў. Такім чынам, ты адскочыш да прыступак; ты прысядзеш і будзеш назіраць, як муж дабівае рою. Калі ён, захаваўшы адлегласьць, уціскае чайнік у выварку, калі ён вывалакае чайнік, які поўны, аж пераліваецца, з вываркі, калі рука з чайнікам адно мільгае ў паветры, калі пасьля вада поўніцай плюхаецца на сьцяну, ты ўсё яшчэ чуеш, што рой атакуе шыбы, табе яшчэ здаецца, што ты чуеш, як вал бзычыць і сыкаціць, ты ўсё яшчэ пракоўтваеш, як бы ты ні дыхаў, гэты ёдкі і кіслы пах. Ты бачыш, што тут жа стаіць жанчына; яна не глядзіць на цябе. Стоячы так, як кажуць, рукі ў бокі, яна не глядзіць нікуды; альбо калі яна і глядзіць куды–небудзь, яна гэтага ня ведае. Ну мог бы ўжо скончыць, кажа яна да мужчыны; мог бы ўжо скончыць. Аднак ён не супыняецца: не мяняючы руху, так што ён, чым часьцей ён яго выконвае, тым больш адасабляецца ад яго і замыкаецца на самім сабе ды застывае, ён схіляе галаву над вываркай, уціскае судзіну ў ваду, выплюхвае вар на мільгаценьне, зноў заціскае пасудзіну ў ваду і зноў плюхае на мільгаценьне. Між тым ты можаш бачыць, як дзьве з тых з крыламі (альбо болей) учапіліся яму ў твар, які, здаецца, ні за, ні супраць гэтага; другія сплываюць рэкамі і вадаспадамі ўніз па муры, маленькія і раскрышаныя плывуць назад у шчыліны зямлі. Потым жанчына зь яе спакойнымі рухамі становіцца паміж мужчынам і акном. Хоць ён цяпер і спыніў свае рухі ўверх–уніз і чакае, аднак тым самым ён пазбаўляецца застыгласьці. Гледзячы на яе, ён пытаецца; яна нічога не адказвае, а скамечаным пярэднікам выцірае па крузе калюжыны, утвораныя кроплямі з падваконьня, ён выпускае чайнік з рукі, і той падае ў пустую выварку. Ён засыпае шчыліны, падсоўваючы туфлямі пясок з двара да сьцяны; ён трамбуе пясок, топча нагой, пакуль зямля не становіцца сухой. Пры гэтым ён зважае на жаночыя ногі, каб не наступіць на іх; я патрапляю заўважыць гэта да таго, як ён падыходзіць з мурашкамі на твары і сядае вышэй мяне на верхнюю

прыступку.
Потым я нечакана чую размову асобаў аднекуль з другога месца; у яго нешта на лобе, чую, як кажа жанчына. Мужчына ўсё яшчэ не маўчыць. Але потым ён адчувае на скуры: мурашка, — чую, як кажа ён аднекуль з другога месца. Аднак ён не адважваецца кінуць нож, якім ён толькі што адрэзаў мяса, на край талеркі і стукнуць тылам далоні па лобе; ён нават перастае жаваць; ён таксама ня рухае вачыма, хоць рух зрэнкаў сюды і туды ня стаў бы цягнуць за сабой скуру. Кавалак у ягоным роце робіць яго твар шышкаватым; косьці сьвецяцца “бляклай фарбай дамоў перад навальніцай”. Ён не адважваецца паварушыць павекамі альбо падняць бровы на лоб; нязьедзены кавалак адкідвае на ягонае вуха нерухомы цень; глянец на ярэмнай косьці выпараецца. Колькі ён яшчэ зможа сядзець, не даючы сьліне змыць кавалак унутро, з–за чаго ўвесь твар прыйшоў бы ў рух, які хіба што спалохаў альбо раздражніў бы інсэкта? Бо гэта не мурашка, сказаў мой брат.

Перастань, сказаў я.
Не, сказаў ён.
Але.
Не.
Але, сказаў я.
Не.
Але!
Але, сказаў ён.
Не, сказаў я.
Перастань, сказаў ён.
Не.
Таму што ён працягвае есьці, таму што ён працягвае гаварыць, “як быццам нічога ня зьдзеялася”, таму што ягоны голас, як ён падняў руку да лоба, толькі крышку зьмяніўся і запаволіўся, бацька, напэўна, толькі змахнуў абгарэлы вяршок нейкай травы з твару.

Дзьверы
“У доме тым было пяцёра дзьвярэй”.
У доме там было і ёсьць пяцёра дзьвярэй, празь якія я іду,

пакуль не зайду ў мой пакой. Дом быў і ёсьць пабудаваны над горадам, адкуль я падымаюся да дому. Спачатку ідзе брама ў муры, празь якую я іду да брамніка ўва двор. Потым я наўскась цераз двор і празь дзьверы іду ў дом; цяпер я ў вітальні. Трэція дзьверы адчыняюцца ў абодва бакі; празь іх я зь вітальні ўваходжу ў калідор, які ідзе па крузе праз увесь першы паверх; праз гэты доўгі калідор я іду да двухбаковых дзьвярэй, якія выводзяць зь першага паверху на лесьвічную пляцоўку; нарэшце я праз калідор на верхнім паверсе іду да дзьвярэй у мой пакой.

Такім чынам, я ад трамвая ўнізе іду пад гару да брамы ў муры. Я нясу з сабой скураную сумку, колер якой я не магу распазнаць, аднак якая, так мне здаецца, цёмная, таму што яна набірае цяпла ад сонца, у якім я іду. Я іду крок за крокам, я стаўлю адну нагу перад другой, я нясу кій і сумку ў адной руцэ, вольнымі пальцамі я ідучы трымаюся за ніжнюю аблямоўку курткі. Перад тым як падысьці да брамы, я чую, як нехта мяне даганяе і абганяе. Па тым, што ён ідзе хутка і што ён ставіць ногі на дарогу жвава і ўпэўнена, я разумею, што ён відушчы. Ён мінае мяне, гэта мужчына, мабыць ня з гораду альбо густа населенай мясцовасьці, ён ідзе ў высокіх, нягнуткіх падкаваных чаравіках, ад яго сьмярдзіць козамі і гноем. Ён падыдзе да брамы раней за мяне; таму я іду павольней і для гэтага, сьціснуўшы сумку пад падбародзьдзем, выцягваю закладкі з спражак сумкі і пачынаю калупацца ўнутры яе, залазячы туды і сюды і робячы такім чынам перад ім выгляд, быццам я нешта шукаю, так што я, шукаючы, натуральна, іду памалу. Аднак потым я чую, што мужчына, хоць ён і адчыніў ужо браму, і нішто не замінае яму прайсьці ўва двор, усё яшчэ стаіць, заціснуўшы клямку ў руцэ, і чакае; я думаю, ён чакае, што хто–небудзь, хто ідзе знутры двара да выхаду, прыкладам, высакапастаўленая асоба, выйдзе, і такім чынам толькі вызваліць мужчыну праход, так што і я застаюся там, дзе стаю, і чакаю. Аднак пасьля гэтага я чую, што і мужчына стаіць і чакаючы глядзіць на мяне. Я зацягваю сумку, пасьпешліва для прыліку засоўваю быццам бы знойдзеную паперу ў куртку і хутка праходжу міма мужчыны ўва двор. Калі я іду праз двор, то чую, як ззаду мяне мужчына мыском чаравіка і абедзьвюма рукамі зачыняе браму, вольна прыхіляецца да будкі брамніка і вясковым голасам вымаўляе пытаньні, звычайныя пры першым

наведваньні. Маючы на мэце выйграць між тым як мага болей часу, каб я мог адчыніць дзьверы адзін, я іду цераз двор да будынку; ад пасьпеху я пачынаю кульгаць, нагавіцы тармозяць ногі. Я чую, як мужчына мімахадзь прамаўляе сваю падзяку за даведку і потым ідзе за мной; ён пакуль яшчэ ідзе паволі; азіраючыся, ён упэўніваецца, ці тыя гэта муры і дом, куды яго накіравалі; ён нават спыняецца і глядзіць назад, ці той, каго ён распытваў, не пакажа яму жэстам галавы, правільна ён ідзе альбо не. Цяпер у мяне быў бы час увайсьці ў дом; між тым я стаю там, дзе я ёсьць, у нагавіцах, якімі вецер шчытна абляпляе мне шчыкалаткі. Так склалася, што мужчына нерашуча глядзіць на мяне; пасьля ён мінае мяне, праходзіць наперад і сьпяшаецца да дзьвярэй. Я іду ўсьлед за ім; ён стаіць за адчыненай дзьвярніцай і назірае, як я іду, праходжу міма яго ў дзьверы і ўваходжу ў вітальню. Я маўчу і адразу прастую да двухбаковых дзьвярэй; у мужчыны між тым зьяўляецца працы зачыніць дзьвярніцу, бадай што яго зьдзіўляе, што дзьвярніца, якую ён хоча зациснуць у паз, не паддаецца, бо ён ня ведае дзьвярэй, якія зачыняюцца самі сабой. Аднак ён не зважае на ўпартую дзьвярніцу: не затрымліваючыся ён мінае мяне, пры гэтым яшчэ дадае кроку і яшчэ перада мной піхае двухбаковыя дзьверы. Ён цісьне на дзьвярніцу, праходзіць, адначасна бярэцца за ручку з навершам і старанна цягне сябе і дзьвярніцу па дузе назад да сьцяны. І я таксама з майго боку дзьвярэй ухіляюся да сьцяны, каб дзьвярніца не адмахнула мне, ідучы назад, у твар. Але яна не адмахвае; мужчына стаіць насупраць мяне і ўсё яшчэ працягнутай рукой ветліва прытрымлівае перад сьляпым дзьверы. Не гаворачы і пазьбягаючы мімікі, я торгаюся наперад і міма мужчыны праходжу ў калідор. На сьценах былі і ёсьць гарызантальныя рэйкі, якія суправаджаюць насельнікаў дому ў іхным шляху як парэнчы; калі мужчына цяпер выпускае дзьвярніцу з рук, паветра ад маху дзьвярэй штурхае мяне ззаду да рэйкі. Я трымаюся за яе і так іду па калідоры, пакуль не пачынаю чуць і крокі мужчыны: адна з падковак на ягоным чаравіку паламаная, так што ён крочыць па каменнай падлозе з рыпеньнем і скрыгатам. Я цяпер шыбую справа (альбо зьлева) перад ім да дзьвярэй, якія вядуць на лесьвічную пляцоўку. Па другой рэйцы кіруюцца сагнуўшыся сьляпыя, якія ідуць у залу на абед. Потым я спыняюся; я чую, як насупраць мяне доўгай чарадой праходзяць сьляпыя; я чую, як яны соўгаюць і

шоргаюць нагамі; яны старанна праводзяць свае знаёмыя і незнаёмыя целы з вывернутымі навонкі ступакамі, якія яны пляскаты прыціскаюць іх да падлогі; яны азіраюцца, не выпускаючы з рук рэйку, ля якой яны пашыхтаваныя, і гучна і ўсхвалявана гавораць пра вяскоўца, які ім сустрэўся; яны яго ня ведаюць, і гучнымі галасамі яны просяць адзін аднаго даць даведку. Між тым ён ідзе да дзьвярэй, спадзеючыся адчыніць іх; калі ён, адчыніўшы дзьверы, адтуль паглядзеў бы назад на калідор, то ён мог бы ўбачыць нейкага чалавека, які хутка ідзе, павярнуўшы вуха да дзьвярэй і выставіўшы папярадзе руку з растапыранымі пальцамі, каб абмацваць дарогу; ён мог бы бачыць, як гэты адзіны сьляпы, ідучы бокам ля рэйкі, порстка прасоўваецца наперад. Мужчына цярпліва чакае; ён пацягнуў дзьвярніцу на сябе і чакае, што я прайду. Я шляхотна праходжу і дзякую. Калі я ішоў доўгімі сходамі, ён бадай што прычэкваў там наверсе, каб адчыніць і дзьверы ў пакой. Мы падняліся разам; паколькі ён усё яшчэ маўчыць, то я прамаўчу свае словы. Мы шчасьліва дасягаем верхняга паверху. Цяпер кожны з нас можа выбраць адну зь дзьвюх дарог. Я іду сваёй, ён глядзіць у другі бок, але потым ідзе сьледам за мной. Калі ён мяне ведае, ён будзе глядзець на тое, перад каторымі зь дзьвярэй я спынюся, і ён падыдзе і адчыніць мне яе. Адзін за другім мы памалу і ўсё больш памалу ідзем калідорам; перад аднымі — нейкімі — дзьвярыма я спыняюся, стаю і чакаю; кароткімі мацаючымі крокамі, мармытліва счытваючы з шыльдаў нумары, ён праходзіць праз гэты прасьцяг паміж мною і дзьвярыма і кіруецца, мармычучы, па калідоры далей. Я іду сьледам за ім.

Спакуса

Твая рука растапыранымі пальцамі набліжаецца да вады. Паколькі скура рукі чакае халодную ваду, яна наперад скарачаецца і закрывае свае поры. Перш як акунуцца, яна прымае меры па абароне ад холаду, скарачаючы скуру ля кончыкаў пальцаў, і гэта так, што ты нічога не заўважаеш. Адначасна ў руцэ ўзьнікае цяжкасьць касьцей, якая выклікаецца ўсмоктваючай сілай набліжэньня вады. Цяжары, якія прырастаюць на кончыках пальцаў, цягнуць руку да вабнае

паверхні. Перш як рука акунецца ў ваду, напружацца вільготныя паскі поту і волка выступяць з столак скуры; потым іх паглыне вада. Уласна кажучы, не цяжар у кончыках пальцаў прыцягвае руку да вады, а вада сама стварае, бо яна здаецца табе халоднай, для рукі цяжары і прысмоктвае да сябе кончыкі пальцаў, калі ты без сумлеву ідзеш працягнуўшы руку і растапырыўшы пальцы да чопу, каб халодная вада асьцюдзіла цябе. У касьцях рукі, чым бліжэй ты падыходзіш, тым больш узрастае тое падзёргваньне, якое выпраменьваецца холадам, што чакае цяпер руку. Вадкасьць, у якую цаляе твая мокрая ад поту рука, паводле твайго меркаваньня, такая халодная, як гэта звычайна бывае з вадой дзе заўгодна на прыродзе. Перад тым як пайсьці да вады і ўжо па дарозе да вады твая рука прыстасоўваецца да холаду, і ты пра гэта ня ведаеш.
Усё яшчэ разгублены, ты акунаеш руку ў чоп.
Аднак вада ў ім яшчэ клякоча, нагрэтая адкрытым агнём.

Пасьля абеду посуд брудны; каб ён зноў быў чысты да наступнае яды, для мыцьця посуду тарнуецца цёплая альбо і наогул гарачая вада. Яшчэ загадзя на вялікую фаерку пліты пастаўленая была выварка альбо прынамсі ладны рондаль зь яшчэ халоднай вадой; на пасудзіне была бляшаная накрыўка, прызначаная для таго, каб, затрымліваючы ў казане цёплае паветра, а пазьней пару, прымусіць булькатаць і бурліць ваду, пасьля таго як фаерка будзе нагрэтая токам.
Між тым увесь ужыты посуд складзены стосамі на пліце перад мыцельнікам, так што ён заўсёды пад рукой, калі яна яго хапае. У мыцельнік засоўваюць круглы гумовы корак, і вада выліваецца з вываркі ў мыцельнік. Трасучы рукой, туды ў вільгаць усыпаюць белаваты парашок, які, напачатку сухі і зярністы, падтапляецца і завісае ў верхнім слоі вады, але потым, калі вада, якая пайшла гарбамі, паглынае яго, расьсейваецца пылам і асядае на дно. Наматаўшы на палец раскудлачаную анучу, рука цяпер чысьціць кубачкі з–пад ранішняй кавы, рондаль, у якім было гатаванае малако, і чайнік з чорнай павалокай ад кавы. З кубачкаў дрыготка падаюць у ваду бляклыя лохмы каўнае плеўкі і драбкі зацьвярдзелага цукру, якія паступова рассмоктваюцца. Драцянай вяхоткай выдрапваецца з малочнага рондлю тоўсты, набрынялы вяршковы вобад; ад дна рондлю адстаюць

блакітнаватыя, карычневыя і жаўтлявыя з–за вады крыгі прысталай да каструльнае бляхі малочнай плеўкі; з чайніка булькочучая вада сама партыя за партыяй вымывае воблакі вязкага бруду. Чысты посуд складваецца ў другі аддзел мыцельніка. Пры гэтым другая рука з анучай ужо ўхоплівае па–над плітой і па крузе вывозіць адтуль брудныя талеркі; першая рука, вызваліўшыся ад памытых талерак, зноў кіруецца ў ваду, так што рукі амаль сустракаюць адна адну, і абшчапервае асобныя талеркі, у той час як другая рука кругамі вышароўвае яе анучай. Азярынкі супавага туку адасабляюцца адна ад адной і выплёхваюцца цераз край у ваду, пылінкі перцу без пабочнай дапамогі выстрэльваюць з глыбіні талеркі да паверхні, перац і мігатлівыя вочкі туку пагойдваючыся кіруюцца поруч з плеўкамі вяршкоў у засмужаныя цяпер парай булённыя віры. Рука без анучы выцягвае памытыя талеркі і перакідвае судзіны адну ля адной у другі аддзел мыцельніку. З патэльні яна вымывае карэлую цыбулю, нажом вышкрабае з бляшанкі халодны застыглы тук, шчоткай выграбае расшкуматаныя чорныя лісты спэцыі з дна патэльні, яна перакідвае патэльню на чыстыя талеркі, яна акунае рондаль у ваду, яна, паварочваючы і нахіляючы, сашкрэбвае зь сьценак рондлю прысохлы жоўты накіп, яна нарэшце накрывае памытым рондлем чыстыя сподачкі і талеркі і патэльню.
Цяпер яна акунае ў булён мяшалку; пальцы з анучай працісквающца паміж яе перапонкамі; расьцягваючы і згінаючы перапонкі, пальцы ссоўваюць кашу буйнымі камякамі ад дзяржальна мяшалкі да пукатай верхавіны і адтуль як зьбіты ўжо камяк выштурхоўваюць у ваду. Пасьля гэтага яна засоўвае інструмэнт у пратуліну паміж чыстымі рондлямі, так што ён тырчыць там, і, не спыняючыся, вышароўвае ўжо з драпінаў кухоннай дошкі валокны сырога адбітага мяса. Пазногцямі яна выкалупвае валокны таксама з драўляных зубцоў кухоннай доўбні. Потым яна кладзе доўбню і дошку на чысты стос. Апошняй яна акунае ў ваду місу з рэшткамі салаты, пакуль яна цалкам не напаўняецца вадой і не патанае. З дна булён падфарбоўваюць празрыстыя зялёныя пасмы воцату, а травіны зёлак сягаюць наверх і дакранаюцца да берага місы, калі рука нырае паміж іх і вылоўлівае з дна сталовы рыштунак. Нажы, відэльцы і лыжкі, якія рука выстаўляе на сьвятло, яна адразу зьбівае ў абойму і рассыпае налева пасярод чыстага стосу.

Другая рука ўжо высьвідроўвае са зьліву круглую затычку. Хоць яна і нерухома застыгла ў калыханьні вады, яна, здаецца, падымаецца ў апусканьні булёну, чый мазкі чорны сьлед штуршкамі ападае на голай руцэ. Вольная рука бесьперапынна адкручвае кран зьверху, так што выбух вады адтуль выпалоскваe лоісты бруд, пасмы зёлак, валокны мяса, малочныя плеўкі і аблеглыя рэшткі бульбы з рукі і далей у дзіру, у прызначаную для ўсіх іх яму.
У такім вось стане знаходзяцца справы, калі высьвятляецца, што патрэбен кубачак для піцьця з самага дна посуду. На гэта мыцьцёха пярэчыць, што шумам можна парушыць спакой тых, хто пасьля яды ўжо накіраваўся адпачываць. Навошта тут увогуле кубачак? гучыць нястрыманае пытаньне. Навошта зноў разьбіраць талеркі, судзьдзё, рондлі, патэльню, мяшалку і місу, якія сьпёртыя адно на адно такім чынам, што зьмяненьне іхнага палажэньня абумовіць абрыньваньне ўсяго, навошта перастаўляць іх у другі аддзел мыцельніка? Калі цябе ўжо мучыць смага, кажа жанчына, дык можаш, хіба, каб напіцца, скласьці коўшыкам далонь альбо ўзяць адзін з кубкаў там у судніку, альбо кубак вунь перад табой на стале, альбо тут каля мяне бляшаны кубак, які стаіць на пліце. Чаму навогул ты хочаш піць? Ты хочаш толькі паслухаць, як будзе разьбіты посуд? Альбо хочаш сам яго разьбіць? А як жа, кажу я, і яна ад свайго робленага зьдзіўленьня пачынае сьмяяцца: ідзі, кажа яна, ідзі сюды; і калі я не разумею: ну ідзі ж, ідзі да мяне, ты пойдзеш, нарэшце, ці не?
“Кожны раз”, гаворыцца ў апісаньні, “калі жанчына, усё роўна дзе, усё роўна чаму, усё роўна як, усё роўна калі загаворвала да мяне, што я нібыта маю ісьці да яе (ідзі, ідзеце да мяне, ну дык ідзеце, ідзеце ж), альбо пытала мяне, ці хачу я ісьці да яе (хочаш, ці не хацелі б Вы прыйсьці, калі ты хочаш прыйсьці), гэтыя словы, колькі б гадоў ні было жанчыне, праціналі мяне страхам да пят, так што я нейкі час ня мог зрушыцца зь месца”.

Мёртвы час папоўдні

У гэтую пару году бацька мае звычку пасьля яды адпачываць. Ён ляжыць адзін у залі на сваім ложку, рукі, згорнутыя ў кулакі, побач, тварам да акна. Ён сьпіць з шырака раскрытым

ротам.
Перад тым як пайсьці, ён доўга моўчкі сядзіць за сталом і трымае перад сабой у руках пустую талерку; незадаволена праніклівым вокам ён высьвечвае прысутных; ён цёмна і пагрозьліва падглядвае глыбака пасаджанымі вачыма. Туфлі пачаргова цьвёрда выстукваюць па падлозе, у той час як ён аслабаняе талерку і ляпае яе на стол. Але паколькі абрус тоўсты і воскавы абрус зьнізу кампэнсуе ўдар, гук ад яго атрымліваецца плоскі і несапраўдны. Гэта зноў выклікае ў бацькі бачнае незадавальненьне; ён узгадвае пра некага яшчэ і раптам падымаецца. Цішыня лопаецца. Прагнучы ўнутры сьмертазабіўства, ён робіць крок разьбегу; пасьпешліва і бязладна ён суне, закачвае і падцягвае рукавы аж да плячэй і, шэпчучы нешта, нагінаецца наперад; неласкава ашчапервае ён рукой люльку і накіроўваецца адпачываць.

Потым (калі гэта прайшло, калі гэта зьдзеялася, пасьля, пазьней, пасьля гэтага), потым ён (сьляпы) хоча абсалютна сьлепа ісьці ў мястэчка, каб чакаць на плянавы прыезд аўтобуса.

Восы

Яна, жонка мужа, адпачывае ў пакоі, які перад гэтым належаў сястры; пакой, згодна з апісаньнем, сьветлы, гардзіна такога роду, што яна не зацямняе акна, а хутчэй ад сонца яно прасьвечваецца; аднак шафа не павінна быць адкрытай. Яна бяз сну ляжыць на ложку; яна спачывае, як спачывае, яна спачывае, як хоча спачываць. Таксама не павінна быць, альбо павінна быць, што яна распранаецца памалу, хутка альбо памалу і, скінуўшы вопратку, накрывае ложак. Яна ляжыць у такой пастаце, што яе цела разьняволенае, у той час як ногі зьведзеныя і падцягнутыя. Яна ляжыць апранутая, яна была апранутая, за выняткам чаравікаў, якія там ляжаць абцасамі ўверх растрэсеныя па ўсім пакоі; аднак абраз ні ў якім выпадку ня сьведчыць пра тое, што яна задумала нешта іншае, чым адпачынак, які можа прайсьці толькі дрэнна, калі ляжаць з падцягнутымі нагамі.
Яна апранутая. Яна спачывае, як муж, да гэтага часу ня

зрушыўшыся зь месца. Яна яшчэ ня рухаецца. Не праходзіць моманту, каб яна ня выглянула хутка ў акно. Рукі яна паклала на грудзі, далоні рук на процілеглыя плечы. Яна глядзіць, яна сьмяецца, яна сьмяецца і глядзіць убок. Яна ня склала рукі на грудзёх; бо цяпер дзеецца тое, што яна як бы выцягвае выраслыя ў яе з двух бакоў крылы з–пад галавы; яна таксама не выцягвае іх ад сябе, а квола апускае іх побач зь целам і паступова шырэй раскрывае нутраную паверхню далоняў уверх, так што гэты паварот далоняў стварае ўражаньне, што быццам чым больш яна разгортвае сьвятлейшыя ў параўнаньні з тылам далоняў нутраныя паверхні рук, тым ярчэй падсьвечваецца пакой. Паколькі вочы закрытыя, яна сьпіць альбо закрыўшы вочы робіць выгляд, хоць дрыжачыя павекі відавочна выдаюць яе, быццам сьпіць; да непаўніні адпачынку дадаецца тое, што вушы ўлоўліваюць звонку, з даху, з крокваў даху тое агіднае гудзеньне. Пальцы сухія, разьняволеныя, шырака растапыраныя на посьцілцы, альбо на дошках на той выпадак, калі жанчына ляжа на падлогу. Але яна ляжыць на ложку. І твар сухі, валасы пахнуць яшчэ вадой з кухні, яны маюць смак сухіх пер'яў, у той час як карані валасоў пахнуць дымам. Рот цяпер цьвёрды альбо зацяты, застыглыя да закарэласьці губы змыкаюцца, быццам зросшыся, у роце, там, куды не сягае сонца, покрыва губ будзе вільгатнейшым і мякчэйшым. Гэтая закарэлая палоска на губах, падпаленая і высушаная сонцам, сьцінае і склейвае яе рот так, што яна шуршыць і трэскаецца; між тым яна не крывавіць, адно прыадкрывае пад сабой блядую паску новай скуры. Адна паска вырвалася з палоскі вакол губ і цяпер вісіць перад моцна сьцятым ротам; аднак падбародзьдзе, якое ўжо дрыжыць, перадае гэты свой рух вышэй і скаланае зярністую скуру пад вачыма і прымушае яе дрыжаць, прычым гэтае дрыжаньне зноў–такі выганяе на лоб глянец і пот па ўсім прасьцягу ад скроняў і да месца, дзе пачынаюцца валасы, якія над вухам, дзе чуецца гудзеньне, маюць ужо смак вільготных, мокрых ад булёну курыных пер'яў. Цяпер рот растуляецца, аж пакуль ён не пачынае зеўраць і не выкочвае зь сябе тоўсты язык, быццам імкнучыся задушыцца.

Мірна ляжыць жанчына ў пакойчыку і сьпіць.

Не. І "не" гэта ня слова, якое яна гаворыць, таму што яна не гаворыць нічога, а маўчыць, у той час як у асіным гнязьдзе звонку пачынаюць люта гудзець восы. Смыляць губы; і пальцы

жанчыны цяпер больш не сухія: яны сталі потнымі і глыбака ўчапіліся ў пасьцель. Выглядае на тое, што жанчына ня можа знайсьці сну, якога шукае, бо яна няспынна напінаецца і кідаецца туды–сюды; мала таго, яна кладзецца, працівячыся другой сіле, на бок так, што яе цела стаіць на сьцягне, і малапасьпяхова змагаецца рукамі і нагамі. Як (няхай гэта будзе яе клопат) яна зможа ў гэтым палажэньні спаць, з гудзеньнем і зумкаценьнем восаў ля галавы, як зможа яна адпачыць з шчытна прыціснутымі сьцёгнамі, з напухлай скурай на сьцёгнах, якія знутры ўжо зусім сьлізкія, гарачыя, увільготненыя? Няхай і гэта будзе яе клопатам.
У адпаведнасьці з гэтым здарыцца так, што яна ляжа вольна на сьпіну і нарэшце выканае жаданьне. Тут на калене ёсьць шнар, але ёй не патрэбная прыкмета, у яе няма шнару, гэта маршчакаватая скура, якая потым, калі яна падцягвае калені да тулава, разроўніваецца і становіцца гладкай. А цяпер ільга пастаянна і настойліва расколваць гэтыя калені іншымі каленьмі, зьверху прыціснуць ёй язык, які мае пошлы смак гліны, да паднябеньня, рукамі раскласьці ёй рукі, пасьля гэтага ўпоперак пакласьці іх па краёх ложка і так поўнаму цікаўнасьці глядзець уніз на яе ўскудлачаны твар, што зайшоўся сьмехам, бо яна ляжыць зьнізу, прыціснутая і зеўраючая, разважліва глядзець на яе, як яна ўпрэцца локцямі, аж падымуцца плечы, як мала будзе не ставаць, каб яна паднялася, як яна бясьсільна адкінецца назад і будзе хапаць паветра дрыготкімі пальцамі, у той час як пяты, у залежнасьці ад месца, дзе яна ляжыць, узрушваюць посьцілкі на ложку альбо потна соўгаюць па дошках падлогі, і як яна гэтым ротам, гэтым вось чужым ротам з прыдушаным стогнам змагаецца за паветра, як паступова ад гаснучых вачэй твар абкрышваецца і набывае дурнаваты выраз, як яна з натуральнай, а ня робленай мінай упадае цяпер у сон, у неспакойны, з уздрыгамі, ліхаманкавы сон, зь якога толькі цяпер, адзін раз, як з вады выскоквае яе цела, аднак без таго, каб з губ з плямамі зацьвярдзелай крыві зьляцеў яшчэ хоць які гук, такім чынам, як цела падскоквае, прасьвяціў мяне брат, і яшчэ ў паветры скаланаецца неўтаймоўным надцятым трымценьнем, якое не сунімаецца, калі рой восаў з гудзеньнем увальваецца ў гардзіну, якая ўсё болей прыпадымаецца і едзе ўверх, у той час як рой цеснай кучай асядае на вадкую, дыхаючую скуру і горача і раскошна ўсаджвае джалы ў мяса;

але гэта малыя восы, супакоіў я сябе, сярэднія восы, сказаў ён, нават не такія доўгія, як пазногаць на тваім пальцы на назе, наўрад ці як вось гэтыя на маёй руцэ, сказаў ён.

Жанчына

Жанчына адпачывае ў пакойчыку, як яна і павінна была адпачываць; яна адпачывае, як яна хоча адпачываць. Паколькі яна адпачывае, то яна загароджвае дарогу другому. Другі сядзіць ля сьцяны і разважае, што яму рабіць. Вецер, які дзьме ў фіранку, з шаргаценьнем перасоўвае прышчэпкі па гзымсе і робіць у столках гардзіны ямы і бухты. Ён сьлепіць мяне сонцам і скіроўвае сьвятло на жанчыну, якая рукой ад локця затуляе вочы, так што яна сьлепа выглядвае з рота толькі шэрагам заголеных зубоў. Яна стуліла плечы і апусьціла іх назад на сьпінку: у мястэчка? пытае яна: цяпер? чаму цяпер у мястэчка?

Яна можа таксама нахіліцца наперад, яна можа яго, які зацяўся і маўчыць, які ў пэўным сэнсе адсутнічае тут, яна можа яго разглядаць і пры гэтым абняць спалучанымі рукамі ногі, падцягнуць калені да грудзёў і схаваць круглы верх калена пад сківіцай: так, у такой часта апісанай клясычнай паставе яна можа павярнуць да яго свой твар і ззаду разглядаць ягоную галаву.

Цяпер яе губы засьмяглі, пасьля прыпадку гойстрага шаленства яны зморшчыліся вэртыкальнымі сеткаватымі столкамі; іх краямі яна цяпер, гідка шоргаючы, чэша тыл далоні. Яна крывіць палец і наўскась праводзіць каля носа па шчацэ баразну; але не пасьпявае яна сьветла выступіць на скуры, як кроў, набрыньваючы, зноў афарбоўвае яе; выдаляючы са шчакі гэты пыл альбо што там яшчэ, яна сьцягвае твар глыбака ў вуглы рота: чаму цяпер? пытае яна нацягнута: чаму ты хочаш цяпер у мястэчка?

Ён сядзіць побач зь ёй на крэсьле; калі ён падымаецца, ён знаходзіцца ў сваёй чыставатай белай кашулі, на якой ззаду на рукавах яшчэ ёсьць столкі ад праса, у гэтых да цьвёрдага выпрасаваных штанах, манжэты якіх пры ўставаньні спаўзаюць на ступню, і ў гарачых, бы цэмэнт, чаравіках, у якіх замураванае ягонае цела, ён знаходзіцца ў сваёй талерцы. Ён

дзіўна тырчыць тут у гэтым строі, які прычараваў яго і трымае тут; ён тут нічога не згубіў; ён хацеў бы пайсьці; ён хацеў бы зрабіць крок міма яе; ён хацеў бы пайсьці далей. Што ўсялілася ў яго? Ці гэта гэты вось строй, які ён не адчувае альбо, калі ён яго адчувае, то адчувае як ня свой, гэта гэты вось строй, які затрымлівае яго ў гэты час гэтага дня, у неадпаведны час, тут у пакойчыку?

Ён зноўку коратка, як у паўсьне, бачыць выпаленую да шэрасьці дарогу і на ёй чорныя пасмы бананавай шалупіны з трапечучым на месцы ценем птушкі зь белым брушкам; не, ён ня спаў, альбо прынамсі ён быў прытомны: калі ён яшчэ сядзеў на крэсьле і чуў, як яна пытае (калі гэта зьдзеялася?), не, ня чуў, каб хтосьці пытаўся, толькі чуў, як аднекуль пытаньні самі пыталіся ў яго, у шумы ўрэзаўся адзін гук, які ён ня мог растлумачыць у сваім стане; ён хоць і чуў гук, але ня мог вытлумачыць яго ў сваім стане; ён думае: тады; і амаль весела ён думае: я сядзеў, я чуў, я думаў, у гэты час, які для яго прайшоў і ёсьць колішнім. Але цяпер (ён думае: цяпер) ён узгадвае, што ён сядзеў там на ложку альбо на крэсьле і чуў гук, які ён цяпер пазнае як бой гадзіньніка, як адзін адзінкавы ўдар гадзіньніка ў залі; і ён успамінае далей: як пасьля першага ўдару, не пасьпеў гук зрушыць ягоную руку з калена, глыбака пад ёй з калена, не, зь яго самога, яшчэ калі падала рука, два наступныя ўдары акунулі ў вар тое, што як чужое адпала ад яго і разьлічвала на холад, але і як страх зьлякалізаваўся на пальцах, якія больш яму не належалі, у той час як мазгі працягвалі служыць. Цяпер ён называе гукі, якія амаль без упыну адбівалі ў ягонай дрыготкай руцэ сыход чвэрці нейкай гадзіны, і страх рукі гойстра пранікаў у мазгі.

Ён знаходзіцца побач зь незнаёмай жанчынай у незнаёмым пакоі. Жанчына ляжыць упоперак ложка ў шырокім строі, столкі сукна якога сягаюць вышэй каленяў, якія яна цяпер распроствае, так што босыя пяткі глуха датыкаюцца да падлогі; галава жанчыны зьвісае з другога боку ложка; яна ляжыць на сьпіне і разглядвае столь над сабой. Калі ён думае гэта, у яго зноў ідзе кругам галава. Яе твар нябачны ад сьцяны, таму што ён зьвісае ніжэй канту ложку; так што (для каго, думае ён) бачныя толькі напружаная шыя з трыкутным абмежаваньнем касьцей падбародзьдзя і ніжняй сківіцы; зь ягонага месца дык жанчына выглядае абезгалоўленай; яна ківае голым абрубкам

шыі і трыкутнікам мякка закругленых касьцей; падбародзьдзе выдае на наканечнік палкі, думае ён; не, шыя сама ёсьць косткай, а падбародзьдзе — гэта тоўсты верх гэтай косткі.
Ён нешта рабіў з гэтай жанчынай. Цяпер ён хацеў бы пайсьці. Што замінае яму? Што замінае яму выйсьці і пад дахам уздоўж бэлькі пайсьці да сходаў? Яму ня трэба нічога другога, акрамя як падабраць палку, падняць і працягнуць яе і намацаць уверсе ля крокваў дарогу, сваю дарогу наперад. Аднак ён ня можа, так ён гаворыць да свайго пачуцьця адказнасьці, адрозьніваць ні лева, ні права, ні верху, ні нізу; сьляпы, як ён ёсьць, дадае ён. Не, яна не ляжала ўпоперак ложку, бо ён ня чуе, што яна ўстае: яна хутчэй стаяла, у той час як ён сядзеў, там ля акна, твар напалову ў фіранцы, і зусім ня вецер з шаргатаньнем перасунуў прышчэпкі. Падвойная драпіроўка, вызначае ён: па столках гнуткай мяккай сукенкі, цьвёрдай простай вэртыкальна павешанай гардзіны.
Ён ня чуў, як яна ўстала; ён таксама ня чуў, каб яна скранулася зь месца. Нечакана яна стаіць перад ім і, ня кажучы ні слова, выводзіць яго, блізка ля сьцяны пад вільчаком, клапоціцца, запавольваючы ягоныя занадта шпаркія крокі, уніз па траскатлівай лесьвіцы, калідорам міма бацькі, які там унутры сьпіць і чмякае ў гневе, і празь дзьверы дому, якія ўжо здалёк патыхаюць на яго твар гарачынёй, адразу на сонца, пад якім ён ужо ідзе не спыняючыся, таму што яго прысьпешвае час.
Ён думае пра сябе як пра нейкага другога; пра тое, што зь ім дзеецца, ён думае, калі яно дзеецца, як пра нешта, што зь ім зьдзеялася ўжо даўно; а пра нешта, што зь ім ужо даўно зьдзеялася, ён час ад часу думае як пра нешта, што зь ім яшчэ зьдзеецца. Аднойчы ён стаў сьляпым.

Асіны сакол

Гэта ня тая дарога. Такім чынам, гэта была дарога, як тая да кар'еру? Не, гэта не была і дарога да кар'еру; гэта была незнаёмая дарога, якую я ніколі ня бачыў, палявая дарога, якая не вядзе праз палі. Гэтую птушку зь белым брушкам я ўжо аднойчы бачыў, але не трапечучай на месцы і не над чорнай бананавай шалупінай; і бананавую шалупіну я аднойчы бачыў, але не на дарозе, а на бэтонным цокалі драцянога плоту, які

агароджваў школу, на якую пазьней упалі бомбы. Птушка, якую я бачыў, ценем біла па растапыранай бананавай шалупіне; хоць паскі шалупіны і ляжалі ў пыле зусім безабаронныя, яны падскоквалі і расьцягваліся пад рэзкімі ўдарамі ценю. Я бачыў, як гэтая птушка стаяла перад дрэвам ля кар'еру; аднак яна ня рылася і грэбалася ў зямлі, як звычайна апісваюць яе дзейнасьць, а глядзела на дрэва, адкрыўшы "моцна загнутую" дзюбу. Мы бачылі, як яна стаяла і глядзела на дрэва. Яна, хістаючыся, дробнымі крокамі бегала туды–сюды; праскакаўшы чвэрць круга, яна зноў, скасавурыўшы галаву, кінула вокам да дрэва; потым яна пачала каркаць. Мы падкраліся, выцягнуўшы шыі; мы чулі, як яна каркала, мы бачылі, як яна шырака пырснула ззаду памётам, асьляпляльна разьвінула крылы і пабегла прэч. Камяні, якія мы кідалі, глуха падалі ззаду яе ў пясок. Я бачыў птушку, я бачыў, як цень птушкі, які быў мне вядомы, трапятаўся на чорнай бананавай шалупіне, і цень падымаў пыл, таму што крылы птушкі былі так блізка. Гэта не была дарога, па якой я цяпер іду: на ёй я ня бачыў каменьня, гэтых адбіткаў скураных падэшваў, з шэрагам расколінаў–сьвідравінаў, на якія я цяпер наступаю, гэтых пляскатых кансэрвавых бляшанак альбо гэтых закрутак ад бутэлек, гэтага разьбітага, пыльнага конскага гаўна, гэтай паперы цяпер, якая, можа, не, гэта ня ліст, які навобмацак цьвёрды і ломкі пасьля дажджу ўночы, гэта не была тая гладкая, не такая ўжо і неглыбокая каляіна ад вобадаў вазоў, якія раздрабняюць і сшліфоўваюць на вапнавы парашок камень, які выступае над паверхняй дарогі; гэта была ня тая дарога, на якой я цяпер, цяпер наступаю на круглую гнілушку, ня тая дарога, на якой я цяпер наступаю на пусты кукурузны пачатак, ня тая дарога, на якой наступны крок прывядзе мяне да пустога цэмэнтнага мяшка, гэта была ня тая дарога, якая цяпер насаджвае чаравік на тоўсты цьвік, на гэтую шрубу, на гэтую патронную гільзу, якую мысок чаравіка адкідвае ў траву, ня тая дарога, на якой цяпер з гэтага кроку з гары атрымліваюцца карацейшыя крокі, з трэскам раздушваючыя трубкі згубленай зялёнкі, якая, нагрувашчваючыся ўва ўсё большыя кучы, чым далей я іду, указвае мне на схіл, якім дарога набліжаецца да гасьцінца, гэта была ня гэтая дарога тут, якою я хутка крочу да гасьцінца: цень птушкі трапятаўся на другой дарозе.

Я зноў бачу яе: яна больш не трапечацца; яна стаіць спакойна і

патанае ў чарнаватай разбэрсанай шалупіне. Птушка адштурхоўваецца і смокча, ажно падае, пад брушкам уласны цень; ценем яна разьбівае шалупіну, якая можа быць таксама шалупінай гнілога апэльсыну. Унутранасьць разрываецца сьветлымі, патрэсканымі кратэрамі; вакол месца падзеі камякі, якія падаюць зь дзюбы, абляпляюцца пылам. Але кіпці птушкі ўчапляюцца ня толькі ў гэты фрукт; дарэмна я стараюся ўбачыць, што раздушвае там птушка кіпцюрамі; бо цяпер трапяткія крылы ўздымаюць і гоняць пыл над сабой і над шалупінай і над дарогай і шэраю смугою пакрываюць, як можна прачытаць у многіх апісаньнях, гэтую відаль, так што я, як ні ўглядваюся, не магу распазнаць ні месца, ні што навокал яго. Ужо прысьпешваюць нагу крокі і нясуць у гарачую цякучую смалу.

Сонца

Мне будзе ўсё роўна, калі ніхто не прыйшоў, таму што я думаю гэта. Калі я гэта думаю, што там нікога няма, гэта пакіне мяне халодным, калі ніхто не прыйшоў. Я мушу сказаць сабе, што мне ўсё роўна, каб мне стала ўсё роўна, калі ніхто не прыйшоў. Як ні паліць сонца, я мушу думаць і праз думаньне рыхтаваць сябе да таго, што мой брат яшчэ не прыйшоў. Калі я думаю гэта, мне будзе ўсё роўна, таму што было падумана загадзя, што ён ня прыйдзе. Гэта сонца, пры якім я мушу думаць, што ніхто не выходзіць, калі я знаходжуся ў мястэчку, альбо што той, хто выходзіць, мне незнаёмы. Паколькі я ня ведаю нікога, аўтобус мне будзе абыякавы. Мне будзе ўсё роўна, калі ніхто не прыедзе, так што тут няма нікога, таму што я магу гэта сказаць. Паколькі я гэта думаю, ці прыедзе нехта, пакуль ходзіць сонца, калі мне гэта ўсё роўна. Як ён піша ў лісьце, дзе ходзіць сонца, каб ніхто ня ведаў, што гэта сонца. Будзе ўсё роўна, калі ён няхай сабе і пусты, паколькі сонца ходзіць, калі тут будзе сонца перад тым, як прыбудзе аўтобус. Так як тут хаджу я, каб не стаяць, таму што падумана раней, каб сонца цягнула мяне. Як ты пішаш у лісьце, каб ніхто ня ведаў, што гэта сонца. Як калі б я мог цяпер гаварыць, паколькі ён стаіць там на сонцы, хоць мне гэта і ўсё роўна. Будзе ўсё роўна, калі ніхто не прыедзе, таму што я думаю гэта. Таму што я думаю

гэта, хоць сонца цягне мяне так, што яно пакідае мяне халодным. Каб я быў напагатове, калі думаю гэта, хоць сонца і цягне мяне. Як быццам ён праедзе міма, гэта мне будзе ўсё роўна, бо сонца ж едзе, хоць яно і пакідае мяне халодным, калі гэта зьдзеялася, таму што я думаю гэта.

Нядзельная праходка

Другі Карцёжнік, які першым трапіўся яму на вуліцы, называецца ў гонар свайго памерлага бацькі Кухар, хоць ён і цясьляр, таму што ягоны памерлы бацька калісьці даўно быў кельнэрам у адным зь вялікіх мястэчак гэтага краю. Ён крочыць далей пад шырокім, цяністым капелюшом, чые палі, абціснутыя і абвіслыя, здаюцца назіральніку завялымі, так што ўвесь капялюш тут згодна з называньнем цэлага адной часткай называецца віславуш. Як толькі ён заўважае другога, ён пытаецца, сьцішаючы хаду, аднак не спыняючы яе зусім, ён пытаецца, што яму хочацца спытацца. Зразумела, адказвае коратка другі, які згодна зь меркаваньнем Карцёжніка сьпяшаецца, бо ён не глядзіць, мінаючыся, быццам ён нешта там прапусьціў, калі стаў бы спакойна і паразмаўляў, каб ён, Карцёжнік, валодаў інфармацыяй і, пакуль яны там не разышліся, прыйшоў на гульню не зарана і таксама не запозна. Другі ідзе хутка, і не выглядае на тое, што ягоная кашуля на сьпіне прамокла, ён спатыкаючыся рухаецца наперад, у той час як ягоны інструмэнт хады вынюхвае, у той час як галава ківаецца, вуха высоўваецца, а вольная рука ахоўвае яго ад сутыкненьня зь меркаваным мурам, сьляпы, які гуляе ў сьляпую карову, але пры гэтым ня йдзе па крузе, а проста, таму што адгадвае схованку таго, хто хаваецца, у паставе, якую мае нехта ў цемры, калі ён шукае выключальнік, але з тварам хітрым, велічным, баявой шыльдай сьляпых, закрыўшы голыя павекі, з гэтым засяроджаным выразам, які пякучае сонца яшчэ маскуе чорным, так што наступныя, хто набліжаецца супольным гуртом і якіх ён ужо здалёк распазнаў як Першага Карцёжніка і Трэцяга, хто пачынае гульню, не адразу могуць наважыцца, ці варта ім зьвярнуцца да яго, пакуль нарэшце Трэці, названы ў гонар свайго павешанага пад час вайны на ясені бацькі Рабаўніком, хоць ён сам закопвае нябожчыкаў, Першаму, які ад свайго бацькі, памерлага сваёй сьмерцю, хоць ён сам і ёсьць страхар, паколькі ягоны бацька некалі выношваў

(няўдалы) план выехаць адсюль куды–небудзь за мяжу, атрымаў імя Замежнік, — такім чынам, пакуль Трэці Першаму з сумненьнем у голасе, падміргваючы, не пачынае шаптаць пытаньне, ці маглі б яны замінаць другому ў ягоным руху, бо, калі ўсё ня ўводзіць іх у зман, сьляпы, здаецца, ува ўладзе нейкай думкі, як быццам ён сёньня позьніцца на фільм альбо на футбол; аднак яны маўчаць, мінаючы яго, альбо яны толькі сьціпла вітаюць яго парай кароткіх цёплых слоў, каб ён не адчуў, што яму перашкодзілі, як ён там цяпер, не трымаючыся за што–небудзь (бо ён ня мае на сабе курткі, за якую мог бы трымацца), раўнамерна сьлепа вядзе сябе сам, так што ён ужо раптам бяз дай прычыны заторкаўся на самую сярэдзіну вуліцы, альбо што яму спадарожныя машыны зусім забіраюць глузды, і ён ня ведае, куды ідзе, а ў канцы нават забываецца, што ён ідзе, што аднак, праўда, немагчыма, таму што ён адчувае пад падэшвамі друз і пясок, якія яго накіроўваюць; і няхай сабе ён нават збочвае: тыя, хто едуць, якія ўсё ж такі маюць вочы ў галаве, убачаць яго і затармозяць. Сьпярша гэта; і па–другое, ён ужо ідзе побач з спартовай пляцоўкай, дзе даволі тых, хто аклікае яго, якія могуць яго папярэдзіць, што я, аднак, не лічу за неабходнае, бо гэта яго звыклая дарога, якую цяпер зьлева і справа атачаюць два шыхты дзяцей, аднак без таго каб, скажам, самкнуўшыся самі сабой перад ім у ланцуг, зычыць сьляпому ў нядзелю нейкага зла, як гэта ў іх вядзецца. Яны празь яго не адрываюць вачэй ад футбольнага матчу, каб ён не падумаў, што ён ім важны, хоць ён у сваёй існасьці манюка, што патаемна ставіцца яму ў папрок, у той час як у далейшым гэтыя галасы, якія аблайваюць яго, яшчэ не выдзяляюцца сярод другіх, бо якраз працяг матчу стрымлівае языкі, так што гэта нічога больш ня значыць, калі яны акурат цяпер (паехалі, за справу) пачнуць доўгачаканы лямант, паколькі той (што ідзе як Бог пашле) ужо далёка, перад шыльдай з назовам мястэчка, дзе ён таго, хто прамовіў слова, недаслага сына мясьніка, названага таварышамі з–за бацькі, які першы дае слова наступнаму ў шэрагу, а потым яшчэ недарослых сыноў павітухі, названых таварышамі з–за маці, адзін зь якіх, адвёўшы вочы ад стомленых гульцоў і прывязаўшы да слова эпітэт, перадае яго другому, што гэты потым перадае далей, дзе сьляпы, калі ён ужо пакінуў за сьпінай шыльду з назовам мястэчка, ня можа больш успрымаць увесь іхны лямант, які вылятае з–пад

надзьмутых шчок, і прызначаны альбо не для яго, альбо толькі крыху для яго, а болей для задыханых гульцоў на полі, якія гэты лямант не ўспрымаюць усур'ёз. За шыльдай яму сустракаюцца гурмы тых, хто пасьля асьвяжальнага сну бадзёра рухаюцца па волі, папарадзе ўсіх самотныя дочкі настаўніка, названыя ў гонар нядаўна памерлага бацькі Самотнымі Дочкамі Настаўніка, у атачэньні мужчыны сярэдняга ўзросту, які наняты дзеля выкананьня дробных спраў управай мястэчка і які названы з–за ягоных бацькоў (яго знайшлі ў дзяржаўным сэктары) Бахурам, у атачэньні Другога Настаўніка, зь невядомых прычын названага Трэцім Настаўнікам, у атачэньні цёткі дачок, настаўніцы, якая была да гэтага дырэктаркай школы, названай Адукацыяй, у атачэньні маці цёткі, названай з–за яе сьветапогляду Царквой, у атачэньні кіраўніка ўправы, выбранага прадстаўніка грамадзянаў, названага Дзяржаўным Ладам, далейшыя асобы атачэньня — гэта дарослыя сыны кіраўніка, названыя Дзецюкамі, далейшая асоба атачэньня гэта п'яны лекар, названы з–за ягонага сына, якога ён зрабіў пад п'яную лавачку, Хатняй Палкай, г.зн. Ідыётам, далейшыя асобы атачэньня гэта падлеткі–сыны Другога Настаўніка, названыя А, Б і В, далейшыя асобы атачэньня гэта падлеткі–сыны Вэтэрынара, названыя Сапраўдным і Несапраўдным, далейшая асоба атачэньня гэта падлетак–сын сакратара ўправы, з–за размоваў бацькі названы Вайной, і апошняя асоба суправаджэньня гэта недарослы яшчэ малюпасенькі сын парабка з маёнтку, названы з–за размоў свайго бацькі Мірам, — і ўсе яны не адыходзілі ні на крок, ішлі строга сьледам за Самотнымі Дочкамі Настаўніка, у той час як тыя марнатравілі час і з галасам ды жартамі кіраваліся за мястэчка на прыроду, разам і паасобку праваджаючы вачыма сьпешную хаду сьляпога, які не вінаваты ў тым, што ён такі, таму што ён ня можа стаць на сваю абарону (мяшаецца ззаду ў размову сын парабка з маёнтку), быццам гэта мае нейкае значэньне, калі ты такі, бо ж так ці так кожнаму патрэбнае добрае слова, так што гэта залежыць ад яго, хоць, не сказаўшы нічога, гледачы ня могуць уцяміць, чаму ён не дазваляе весьці сябе, і як жа гэта наогул не пазбаўлена камізму, што ён так вось шыбуе (ні слова далей! даволі! гнеўна патрабуе маці цёткі), у той час як, падымаючы пыл, з дакладнасьцю да хвіліны ў мястэчка ўяжджае аўтобус. Жандар, названы так, хоць ён і ня носіць

зброі, бачыць пад акном, зь якога ён у выпадку неабходнасьці добра ці кепска можа агледзець усё мястэчка, сына спадара Бэнэдыкта, які рыхтуецца праз пыл праставаць да пад'ехалага аўтобуса. Нягледзячы на тое, што ён, зразумела чаму, з–за доўгай хады пад пякучым сонцам, выглядае крыху вычарпаным і недагледжаным, ён робіць, сьпяшаючыся да машыны, зусім сумленнае і выклікаючае давер уражаньне, якое зусім скасоўвае падазрэньне, што абудзілася было ў жандарма з–за гэтага празьмернага пасьпеху, тым больш, што да гэтага яшчэ далучаецца ўсьведамленьне, што, наколькі яму вядома, да яго вушэй не дайшло да гэтага часу нічога, што сьведчыла б супраць гэтай асобы. Двое мужчынаў перад кіно, зь мянушкамі Лято і Тато, засунуўшы вялікія пальцы пад пас, убачыўшы, як сьляпы трудзіць ногі, стараючыся пасьпець на аўтобус яшчэ да таго, як ён ад'едзе, перастаюць размаўляць і напружана сочаць за ягонымі крокамі, перш як адзін зь іх павернецца да адкрытых дзьвярэй аўтобуса, у якім якраз кіроўца, у той час як сьляпы падыходзіць празь вісячыя яшчэ аблокі пылу, закрывае сумку з квіткамі і вешае яе за раменьчык побач з сабой, у якім цяпер кіроўца, у той час як сьляпы (ён прыйдзе, ня прыйдзе) трапляе кіем ззаду па выкідной трубе, зачыняе дзьверы, у якім кіроўца (хутчэй, што такое, не здавацца, не спыняцца, ён жа ня хоча, аж да дзьвярэй, да дзьвярэй жа яму трэба), даволі ён ужо чакаў, выціскае шчапленьне, уключае перадачу, адначасна аслабляе ручны тормаз і чым больш аслабляе, тым больш націскае на газ і адпускае шчапленьне і кранае зь месца, так што выйграў адзін альбо другі, такі быў заклад, але сыход можна было ведаць і прадбачыць ужо загадзя.

Гульня ў карты

Аднойчы я сядзеў пад сталом, у той час як яны гулялі ў карты, і ня мог вылезьці болей. Я спаў там унізе, і калі я прачнуўся, то ўбачыў вакол сябе восем туфляў і восем ног, якія былі слупамі маёй загародкі. Я ўзьбіўся на карачкі і стукнуўся макаўкай аб стол, так што зазьвінелі відэльцы і лыжкі ў шуфлядзе. Я нагнуўся і прынюхаўся да пахаў мужчынаў, якія гулялі, прыслухаўся да гукаў, якія яны рабілі, а пальцамі абмацаў вільготныя плямы, якія яны рабілі, рассоўваючы калені і

плюючы на падлогу. Часьцей за ўсё рука, мацаючы, трапляла на ўжо застылыя шклістыя плеўкі выхарканага за мінулыя нядзелі і такім чынам засьпявалася зьнянацку асобнымі сьвежымі яшчэ купкамі, у якія ўкоўзваліся пальцы. У думках я сядзеў пад сталом. Я сядзеў пад сталом у роздуме, тыцкаючыся галавой то сюды, то туды ў пошуках выйсьця: туфлі майго бацькі, якія я пазнаў, бо разьвязаныя шнуркі былі пад падэшвамі і з шчыліны шнуроўкі зьвісаў язычок, былі шырака расстаўленыя, у той час як калені ў нагавіцах над імі цесна цёрліся адно аб другое; паміж імі была шырокая прастора, якая звужалася ўверх, так што таму, хто хацеў выбрацца, дастаткова было разагнацца і прасунуцца празь іх — і ён быў бы на волі. Я адпоўз на даланю назад, пакуль не наткнуўся пятамі ззаду на туфлі Трэцяга Гульца, і прамерыў адлегласьць разгону: козыр! усклікнуў бацька. Я рушыў і прапіхнуўся паміж слупамі загароджы, аднак бацька, перагнуўшыся цераз стол, магутным рухам зграбаючы ўсе карты да сябе, адразу прыціснуў калені, зьвёў ногі і шчытна прыхапіў шыю сына ў абцугі: прайшоў! трыюмфаваў ён, накрыўшы даланёю стос картаў; ён сабраў карты ў калоду, ператусаваў яе, не падымаючы пры гэтым рукі ад стала, ня дыхаючы, не паслабляючы ногі ўнізе; левым вялікім пальцам, якім ён час ад часу працягваў па ніжняй губе, ён выштурхоўваў карты з калоды, якую трымаў у правай, і потым паасобку засоўваў засталыя карты паміж выштурхнутымі ў напаўзакрытай левай далані, перш як ён, пасьля таго як справа ад яго Першы Гулец зрушыў калоду, пачаў раздаваць карты налева, па гадзіньнікавай стрэлцы, цяпер з дапамогай правага вялікага пальца (раней ён карыстаўся левым), які ён сьліняў аб губу, для чаго выпрастваў сьпіну, адкідваючыся на сьпінку крэсла, адкуль ён кожнаму выдаткоўваў карту, якая была на чарзе. Калі я пацягнуў галаву з натапыранымі наперад вушамі да сябе, бацька не замінаў у гэтым сыну: гэты ня пройдзе! крыкнуў ён таму, хто заходзіў першым, на што той, хто заходзіў першым, адказаў: а як жа, а як жа, на што ягоны партнэр выгукнуў: хто сьмяецца апошнім! пасьля чаго апошні ціха спытаў у іх, што яны скажуць цяпер, і строга паказаў другому на рот. Ягоныя ногі былі сьціснутыя, але з абодвух бакоў можна было праціснуцца; аднак як толькі я пасунуўся быў, ён хуценька выставіў тут і там туфлю, зьверху спакойна кідаючы карту за картай і насьмешліва гледзячы на абодвух. Я

сеў проста і паглядзеў уверх на шуфляду, якая ззаду ля тыльнай сьценкі яшчэ пакідала шчыліну пальцам: што такое! закрычаў бацька, сюды давай! усклікнуў той, хто заходзіў першым, даруйце ласкава! крыкнуў ягоны партнэр, ну пачакайце! ціха папярэдзіў іх усіх апошні, калі я стукнуў яго шуфлядай у жывот, і калі ён ціха засунуў яе на месца: я што, перабраў? сарваўся ён потым, усклаўшы на другіх задушлівую злосьць, якая заняла ў ім дых. Я чуў, як ён усёй сагнутай рукой, не апракідваючы ці хоць толькі закрываючы пабітыя карты, згортваў адбоі ў стос перад сабой. Тут штосьці ня так! усклікнуў пасьля ладнай паўзы той, хто заходзіў першым, які сядзеў на лаве ля сьцяны і мне, хоць і падняў ногі, гаворачы гэтыя словы, ня мог быць карысным. Я падпоўз да адной ножкі стала і праверыў вачыма шкарпэткі ягонага партнэра, якога гульня, здаецца, хвалявала: сапраўды! крычаў ён нада мной у стальніцу, тут нешта нячыста! Пры гэтым, калі ён выштурхнуў гэтыя словы з рота, ён выставіў нагу наперад і трапіў мне якраз у твар. Пасьля гэтага я запоўз на сярэдзіну. Я лёг на сьпіну. Я перакаціўся на жывот. Я склаўся і пачаў хадзіць на каленях па крузе. Я хадзіў на каленях па крузе, так што плечы датыкаліся да слупоў маёй загародкі; аднак мужчыны не далі сябе падмануць. Я ўзяў бацькавы ногі за косткі і выглянуў празь іх у пакой: у кутку на ложку сядзеў мой заспаны брат; ён паглядзеў на мяне ў адказ; красамоўнымі позіркамі я адкрыў яму сваё бядотнае становішча, без таго каб ён выказаў гарачае імкненьне пайсьці насустрач; хутчэй ён пасьля сну, тупа ўтаропіўшыся пад стол і нічога ня бачачы, ахоўваў свой дрымотны стан, які ў нейкім сэнсе пазбаўляў яго думак, хай сабе гэта датычыла і гэтай вось галавы, якая прасунулася праз калені сядзячага мужчыны. Аднак той, хто быў маім бацька, адным рухам рукі кінуўшы веер картаў на стол, так што той склаўся ў калоду, нагнуўшыся другой рукой палез пад стол і вызваліўся ад захвату сына, што адбілася на інтанацыі ягонага голасу наверсе, які гучаў пранізьліва і быў уплецены ў ягоную плынь словаў як (інакш кажучы) цяжкае дыханьне, ён ня можа, і гэта правільна, як тое, што ён тут сядзіць, спакойна глядзець далей, як цераз меру выпрабоўваецца ягоная годнасьць гаспадара дому, як яна наогул падрываецца нейкай навалаччу, прайдзісьветам. Ён і надалей выгаворваў прысутным, аднак і з таго, што было сказана далей, не было адназначна зразумела,

хто альбо што яму было настолькі агідным, што ён ня мог больш стрымліваць незадавальненьне; не спыніўшыся на гэтым, ён настойліва даводзіў усім, што яны павінны адкрыць вушы і зважаць, якую няпраўду і ашуку ім падаюць сёньня, такую, прарочыў ён, што сусед суседу, а муж жонцы мусяць глядзець на пальцы, каб аднойчы ранкам, прачнуўшыся, не знайсьці хлявы а ёўні пустымі, бо гэтая пабудка, выпісваў ён ім, ня будзе для іх прыемнай! Канец гульні! забойча ўсклікнуў ён, увесь пачырванеўшы; па твары ў яго пайшлі плямы. Трэба ў гэтым разабрацца! ухвальна выгукнуў той, хто заходзіў першым. Само сабой зразумела! крыкнуў ягоны партнэр. Але ж ты раздаваў, адмежаваўся ад незаслужанага папроку апошні. І раздаў дрэнна! падхапіў адпор той, хто заходзіў першым. Зрушваць трэба было правільна! перадаў папрок згодна з гадзіньнікавай стрэлкай бацька. Правільна! набраўся нахабства пярэчыць партнэр, быццам справа ў зрушваньні! Яшчэ адно слова! грозна паабяцаў яму бацька. Пярэйдзем да справы! сказаў апошні. Да справы! падтрымаў той, хто заходзіў першым. І без адвалокі! заявіў партнэр. Ну давай хадзі! нарэшце саступіў бацька, пасьля таго як ён нейкі час пільна ўглядаўся то ў аднаго, то ў другога. Я падаў знак брату; я падаў яму знак яшчэ раз; адначасна я прамармытваў гэтыя знакі. Потым я сам ператварыўся ў знак, узяўшы з–пад стала зьнізу на галаву і на сьпёртыя на плечы адкрытыя далоні стол; я зграмадзіў ногі пята да пяты разам, а наперадзе іх рассунуў; далоні напружыліся; калі я скасіў вочы цераз шчокі на рукі, то ўбачыў, як пад кашуляй дрыжаць мускулы. Каленныя шайбы азначыліся белым, я ўбачыў, што пальцы на нагах спляліся і згубілі апору, у абсягу пахвіны я, не пасьпеў яшчэ стол падняцца ў паветра, адчуў трымценьне і ўздрыгі ад страху, і вочы зайшлі мне пад лоб. Я якраз падняў стол усімі чатырма ножкамі над падлогай, так што мужчыны маглі ўсе разам соваць пад ім нагамі, а стол, каб ім гэтага захацелася, стаў бы на іхныя ногі. Але калі я з нагружанай галавой павярнуўся да брата, стол павяло набок і на плячо; я пачуў, як ён дзьвюма ножкамі зноў даткнуўся падлогі. Тут я апусьціў галаву, і ён стаў на падлогу засталымі дзьвюма ножкамі і стаяў, як раней; толькі грашавыя стаўкі нада мной зьлёгку адгукаліся і пазвоньвалі, як гукалі пазьней адзін аднаму мужчыны. Дык чыя чарга тусаваць? крыкнуў зьверху бацька, так, чыя? закрычаў

той, хто заходзіў першым, і я сябе пытаюся! закрычаў ягоны партнэр, ты тусуеш, ціха даў зразумець апошні, я! закрычаў той, хто заходзіў першым, тут нешта цёмна! выгукнуў ягоны партнэр, раздавай давай, ціха расьсеяў іхныя сумневы апошні, ён ня даў больш сказаць нікому, так што яны пачалі актыўна бурліць, згубіўшы радасьць жыцьця.

Слова “схавацца”

Я хацеў бы схавацца. Такім чынам, я выходжу і хаваюся. Выходзячы, я думаю, дзе мне можна схавацца. Потым я думаю, што іду ня я, а ногі пада мной, і што думаю ня я, а мае мазгі, таму што калі думаць, што гэтыя ногі належаць да мяне, што гэта мае ногі, якія тут ідуць, то тады гэта магу быць ня я, бо гэта мае мазгі, бо мазгі мае, а што маё, можа быць ня мной. Ня мной можа быць той, хто тут думае. Я не магу схавацца. Мае мазгі падумалі, ці магу я схавацца ад другіх; але я не магу схавацца, бо нешта ня можа схавацца само па сабе: я магу схаваць не сябе. Такім чынам, і маё цела ня можа схавацца: яно можа схаваць не сябе; альбо толькі я магу схаваць сваё цела, альбо цела можа схаваць мяне; але маё цела гэта не я: вось прычына, чаму я не магу схавацца. Аднак я магу ўсьцешыцца; я магу, паколькі я ня толькі ня ведаю, што такое я, але і, — і гэта мае асаблівае значэньне, — таму што я ня ведаю, што такое ўсьцешыцца з чаго–небудзь, вырашыўшы прыкінуцца і зрабіць выгляд, быццам мне ня дзіўна, быццам я ведаю, што такое я, каб я мог, прыкідваючыся, праказацца ў нейкім месцы і схавацца ад другіх, і каб пры гэтым ад страху ў жылах ногі не маглі болей несьці цела. Я павесялюся зь нечага альбо я павесялюся з самога сябе, зайшоўшы ў схованку, і так пазабаўлюся. Я пазабаўлюся, я схаваюся, я спытаюся, кім ёсьць я, зрабіўшы выгляд, што я магу пытацца. Між тым маё цела хаваецца пры дапамозе ног. Мне ня трэба хавацца ад самога сябе, бо я не магу бачыць самога сябе; таму што я сьляпы, гэта значыць, мае вочы сьляпыя, гэта значыць, мае вочы гэта ня вочы, — так сказаць, гэта значыць, што мяне няма. Але хаваючыся, я магу лёгка павесяліцца зь сябе і забыцца.

Вэстыбюль

“У гэты час вэстыбюль ў кіно яшчэ можна знайсьці пустым; жанчына, якая прадае квіткі, якімі даецца права займаць месца на ўвесь час сэансу, ужо была ў вэстыбюлі да гэтага, спадзеючыся, што цяпер, за, можа, якую гадзіну да пачатку, нейкія асобы будуць горача хацець пранікнуць у гэтае негарачае, зь сьвежым паветрам памяшканьне і стаяць тут і там ды разглядаць пляншэты і фатаграфіі, і па выразах твараў асобаў, зьнятых на фатаграфіях, адгадваць, будзе камэдыя ці трагедыя. Але потым, калі чаканыя людзі не зьявіліся (што магло быць прычынай?) яна альбо заснула ў сваёй шкляной будцы, раўнюсенька расклаўшы руку ад локця на касавы стол, закусіўшы ў ёй бязгучна губы, а другую руку, якая квола зьвісае за ёй цераз сьпінку крэсла, таксама прынёсшы ў ахвяру сну, альбо яна выйшла і пры гэтым забылася замкнуць дзьверы. Вядома, што ў вэстыбюлі пануе халадок. Прынамсі, так здаецца гэта таму, хто робіць першыя крокі. Цяпер можна прайсьці праз вэстыбюль далей, бо ён пусты. Нічога не чуваць — ёсьць такі выраз. Цяпер можна пасядзець на асобных лаўках, і пры гэтым умовіцца наконт далейшых дзеяньняў. Кончыкі пальцаў, калі зашчыміць цела паміж габляванымі, пакрытымі бясколерным лякам сталамі і лаўкамі, працягнуць празь ляк чатыры паскі поту з чатырма засмужанымі краямі. Цяпер ля сьцяны ў зашчымленага паміж лаўкай і сталом зьяўляецца магчымасьць абдумаць сытуацыю. Адзін зробіць гэта, другі нічога ня зробіць, ціха седзячы ззаду стала. Ніводзін гук не замінае сядзячаму, халадок камфортна вее да яго ад сьцяны і ад стала, ён напаўняе ягоныя пальцы, якія ён трымае перад сабой вольна, быццам яны адвінчаныя ад рукі. Перадумовы для яго спрыяльныя: як ён цяпер сядзіць, то ў яго яшчэ ёсьць час; ён тут, паколькі ён сядзіць у сваім кутку, ногі, як гаворыцца, ён адкінуў, ён мае тут магчымасьць абараніцца ад таго, што зь ім дзеецца; ён можа тэрмін, які доўжыцца ад часу, калі ён увайшоў, да часу, калі ўваходзяць першыя наведнікі і калі ён павінен будзе пайсьці, выкарыстаць напоўніцу, заглыбіўшыся ў свае думкі, каб яны маглі спыніцца на нечым добрым. Спакой (гэта другі выраз, які ён згадвае) шуміць у ягонай галаве. У той час як ён сядзіць і ўспамінае, яго твар у некаторыя моманты праясьняецца і хутка зноў хмурыцца; замест таго каб думаць, ён выпраменьвае, з усьмешкай і без, у стол, у лаўку, у сьцяну і вакол сябе зноў і зноў воблакі гарачыні, пакуль першыя

наведнікі не дастукваюцца да жанчыны з шкляной будкі і не праганяюць яго з вэстыбюлю”.

Сырэна трывогі

Кінамэханік, торба зь півам паміж нагамі, кінамэханік, трайны абкладанік пад рукой, трайны абкладанік у буркатлівым роце, кінамэханік ляжыць на двух крэслах і малой табурэтцы, ён ляжыць у сваёй кабіне ззаду за садам, пустая бутэлька з падцёкамі пены стаіць там, дзе яна стаіць, альбо ляжыць там, дзе прызначана ляжаць пустым бутэлькам, пад мужчынам альбо дзе яшчэ. Ён ня сьпіць, ён выпіў альбо застаўся цьвярозы, але хоць ён сьпіць альбо не, напэўна ён усё яшчэ жуе ў роце свой хлеб, і калі гэта правільна, што ён да гэтага спаў, то цяпер ён болей ня сьпіць. Аднак калі ён і ня сьпіць, то ўсё роўна выглядае на тое, што ён яшчэ не зусім прачнуўся, калі ён хістаючыся ўсхопліваецца, і ад стала, за якім ён сядзеў і склейваў кінастужку, накіроўваецца наперад да аўдыёстужкі. Ён будзіць сам сябе тым, што пальцамі пераварочвае акенца, так што істужка, якая рухаецца, цягнецца ў яго па пазногцях і выводзіць яго з дрымоты. Але калі ён і ня цалкам прачнуўся з–за гэтага пясочнага пачуцьця на пазногцях, то (гэта будзе трэці выраз) дынамік у будцы і паралельна зь ім падключаны дынамік унізе ў залі, які раве праз мэмбрану папулярную музыку перад сэансам, страсяноць яго ад сну. Ягоныя рухі, якія пасоўваюць яго паміж двума дэманстрацыйнымі апаратамі да сярэдняй проймы, тым ня менш засталіся вернымі сабе; толькі па скрыгаце зубоў, якія, кусаючы, зацяняюць касьцямі сківіцы шчокі, чытаецца ямчэйшае жаваньне як адзіная прыкмета таго, што ён прачнуўся. Адкрыўшы акенца і паклаўшы яго гарызантальна на чэрап, ён праз адтуліну выглядвае ўніз у залю: ён бачыць адну за другой пятнаццаць (альбо болей, альбо меней) з чорнай проймай палосак верхняга канту сьпінак, сініх ад лілёвага сьвятла з матавай столі над імі, аранжавых і фіялетавых каля выхадаў ад чырвонага сьвятла над дзьвярамі. Ніхто з наведвальнікаў яшчэ не ўвайшоў у залю, хоць музыка ўжо запрашае ўваходзіць. Круглая печ пасярэдзіне глухой сьцяны, гэта чацьвёрты выраз, адсьвечвае мэталам. Экран і подыюм перад экранам пакуль што вонках апісаньня;

дыхтоўная чырвоная заслона перад уваходам, унізе па лініі абрэзу замазана тлушчавай ваксай, лянотна выпучваецца, як толькі звонку нехта з наведнікаў альбо нехта, хто хоча нешта гучна сказаць, уваходзіць у вэстыбюль і як толькі тыя, хто прыйшоў, групамі зноў пакідаюць вэстыбюль; але вось размова іншых звонку надзіва як спакойная і разьмераная; дзяўчына ў буфэце прадае свае саладжэньнікі, тое, што яна гаворыць, з–за асаблівасьці яе вымаўленьня можна належна зразумець пасярод падобных адзін да аднаго галасоў нават у будцы; аднак кінамэханік з–за таго, што яблык, які ён есьць, сваім хрустам аглушае яму вушы, нічога не пачуў з гаманы дзяўчыны. Так што і пытаньне, якое ставілі яму ў будцы, павінна быць пастаўлена яму яшчэ і яшчэ, у той час як ён, высунуўшы галаву з акенца, у той самай сагнутай пастаце, яшчэ маючы перад сабой пустую залю, адсоўваецца назад. Якую сувязь мае гэта з пахам клею, якую сувязь можа мець гэта зь сіпеньнем там у апараце, ці гэтым надфілем, якім ён цяпер яшчэ раз трэ кінастужку, заціснутую ў прэс? У той час як зьнізу з таго боку заслоны нейкая дзяўчына бесклапотна паставіла адну нагу перад другой і, грызучы пазногці, падрыхтавалася да таго, што ёй абарвуць квіток, зьверху кінамэханік ужо паказвае ягонаму наведніку ягонае месца на прыстаўным крэсьле, а той прыхільна выслухвае ягоныя тлумачэньні. Кінамэханік і ягоны наведнік ведаюць адзін аднаго з маладых гадоў. Часта тут сядзіць наведнік, хоць пабочным асобам уваход і забаронены, і, жуючы як і кінамэханік, ён слухае дэманстраваныя фільмы, каб прабавіць час. Але сёньня ён пытаецца, засьпеты зьнянацку тым першым густым гудзеньнем там на вуліцы, якое ён сам ня можа растлумачыць; пры гэтым ягоная рука выдрапвае ззаду яго барозны ў калюжынах разьлітага кінаклею, які потым, калі ён трымае руку ля носу, пахне звычайным клеем і фарбай. Заля яшчэ пустая. Што, пытаецца наведнік, выціраючы пальцы аб насоўку, магло прымусіць людзей яшчэ не ўвайсьці ў залю? На экране бачная толькі бяскрыўдная застаўка, якая рэклямуе нейкі тавар; надпіс пад ёй з назовам гандлёвага прадпрыемства ўзмацняецца для вушэй за пасярэдніцтвам гукавой дарожкі праз дынамік. Кінамэханік, гэта апошні выраз, падымае плечы; ён уганяе зубы ў мяккі ад сонца яблык, так што разьяжджаюцца губы, і пры гэтым эканоміць словы з рота для адказу. Чырвоная заслона цяпер моцна выпучваецца то ў залю, то зь яе; пакупнікі

квіткоў арганізавана, але хутка пакідаюць вэстыбюль празь дзьверы, якія адчыняюцца навонкі; жанчына ў шкляной будцы апускае шыбу і апошняй пакідае, пасьля таго як яна зноў і зноў чула гудзеньне, не выдаючы сваёй хадой ці паводзінамі хваляваньня, кінатэатар. Кінамэханік, які, трымаючы галаву для таго каб назіраць пад акенцам, цяпер падбародзьдзем на ключыцу нізка кладзе перамолваючы твар, “жарнавы–шчокі”, і напалову адварочваючы яго цераз плячо, мог бы цяпер абмяняцца з сваім наведнікам шматзначным позіркам; ім ня трэба было б заводзіць размову. Але наведнік пачынае многа гаварыць, выражацца адкрыта і надта бесклапотна, намацаўшы ззаду ў шуфлядзе стала яблык і, ужо заглыбляючы ў яго зубы, агарошвае кінамэханіка пытаньнем наконт аварыйнага асьвятленьня. Так выходзіць, што той адчужана адказвае пытаньнем на пытаньне, ці мае наведнік на ўвазе пытаньне наогул. Што будзе, канкрэтызуе сваё пытаньне госьць, калі стужка пачне гарэць? У будцы ёсьць сыгналізацыя, якая называецца супрацьпажарнай сыгналізацыяй, павучае яго пасьля гэтага кінамэханік, які, прагаворваючы свае словы, працягвае далонь па крузе вакол патыліцы наперад да горла, быццам каб абцерці пот, пасьля чаго ён засоўвае руку паміж гузікамі кашулі: гэтая сыгналізацыя, працягвае ён лекцыю далей, складаецца зь дзьвюх кантактных шынаў, якія замкнутыя з дапамогай баваўнянага пыжа. Калі стужка загарыцца, то бавоўна выгарыць, супрацьпажарная перамычка западзе, у залі, тлумачыць ён, адразу запаліцца аварыйнае асьвятленьне, якое не падключана да агульнай сеткі, а сілкуецца, абвяшчае кінамэханік, чэшучы і напінаючы ў столкі скуру на грудзёх пад кашуляй, ад акумулятара; адпаведныя лямпачкі знаходзяцца на столі, дакладней сказаць, пад двума рыфлёнымі шклянымі каптурамі, а менавіта такім чынам, што блёк мае дзьве лямпачкі на столькі і столькі ват і гарыць зыркім белым сьвятлом. Аднак напачатку ў залі будзе зусім цёмна? укліньвае пытаньне наведнік і хутка глытае кавалак, каб пачуць наступны адказ кінамэханіка. За выняткам выпадку, што адмовіць уся сетка, адгукаецца на наведніка кінамэханік, ёсьць як бы там ні было яшчэ лінія аварыйнага сьвятла пад дошкамі падлогі, якая дзеіць увесь час; аднак калі асноўная сетка адключыцца, усур’ёз дапускае кінамэханік, ідучы да адчыненых дзьвярэй на сходы і выплёўваючы агрызак у сад,

няхай сабе з–за буры, няхай сабе з–за якога–небудзь другога надзвычайнага здарэньня, — тады ў залі стане, бо ж раней увагу прыцягвала да сябе толькі сьвятло ад дэманстрацыі фільму, якга (якга — бярэ наведнік слова на заметку) цёмна, як у эгіпецкім палоне, потым сьветла як днём (сьветла як днём) ад аварыйнага асьвятленьня, якое ён ужо згадваў першапачаткова. Гледачы пад час сэансу не адрывалі вачэй ад экрану, дадае для нагляднасьці кінамэханік, — як раптам тут гэтая цемра эгіпэцкая засьціць вочы, так што глядач больш ня ведае, дзе ў яго галава, што зноў–такі мае наступствам, што ён сам, сядзіць ён ці ляжыць, у паветры ён ці пад вадой, болей не арыентуецца, з–за чаго часта здараецца, робіць выснову кінамэханік, што пасьля гэтага гледачы, каб займець пэўнасьць, дзе яны знаходзяцца, альбо ці знаходзяцца яны наагул у залі, пачынаюць сьвістаць, гусьці і тупаць нагамі, быццам гэта сродак упэўніцца ўва ўласнай прысутнасьці і сваім існаваньні. Потым, на сьвятле, вочы ну быццам лопнулі, тлумачыць кінамэханік: шукаюць цукеркі і жуйкі ў роце, — ён усё ж адразу аслабляе ўзьдзеяньне сваіх словаў, — калі яны цяпер увогуле заслугоўваюць такога назову, гэтыя салажэньнікі, а знаходзяць адно толькі як прыкры смак у роце і ў дадатак разгубленасьць і боль у страваводзе. Для пацьверджаньня кінамэханік шнарыць языком па паднябеньні, на якім беспрычынны сьвёрб паказвае яму, што, напэўна, недзе засталася яшчэ рэшта. Ён знаходзіць рэшту ў руцэ. А што, калі пажарная сыгналізацыя не спрацуе? У кантакце з патронам лямпкі знаходзіцца аварыйны выключальнік, не стамляецца тлумачыць кінамэханік: зь ягонай дапамогай патрон абясточваецца, так што перамычкі западаюць і такім чынам забясьпечваюць стужку ад агню. Але калі адмовіць і аварыйны выключальнік, запабягае кінамэханік далейшым пытаньням, якія ў наведніка ўжо на языку, то звонку каля драўляных сходаў ёсьць яшчэ так званы эвакуацыйны выключальнік, пры дапамозе якога будку можна абясточыць таксама і ў выпадку ўцёкаў. Добра і прыгожа. А ці не магчыма такое, што загарыцца ня стужка, а, скажам, крэсла альбо вопратка ўнізе ў залі, напрыклад, зімой з–за іскраў з часовай печы, якую паляць пілаваньнем? Альбо пакінем у спакоі агонь, возьмем другое: ці не магчыма, што як–небудзь у бітма набітую залю ўпадзе бомба?

Кінамэханік між тым зноў прыхінуўся да акенца. Ужо час, кажа

ён з палёгкай, чуючы, як зноў становяцца больш гучнымі крокі народу ўнізе ў вэстыбюлі і бачачы, як ён сам, рассоўваючы заслону, бляды і яшчэ бязмоўны, напірае ў залю. Народ яшчэ не напірае да выхаду; бо ён ня ведае, што яго чакае.
Нічога яго не чакае, адкараскваецца наведнік, ужо ідучы да дзьвярэй на сходы, ад сваіх думак, зь якімі ён так па–дурному гуляўся. Але паколькі ён ня выказаў другіх сваіх думак, кінамэханік, які выкалупвае сабе з зуба пальцам зярнятка і да таго ж заняты другім (і стужка ў апараце б'ецца, адбліскваючы) ня можа даўмецца, чаго хоча яго госьць.
У залі нешматлікі народ, якому пасьля суфле перад сэансам заняло мову, дзякуючы нейкаму дзіву зноў пачынае гутарыць; рукі на вольных падлакотніках, скасіўшы вочы на экран, гаворка йдзе, гэта яму, кінамэханіку, не абавязкова зразумела, пра няшчасьце альбо надзвычайны выпадак альбо здарэньне на вуліцы.

Вестка

Чаму ён так сьпяшаецца? Калі ён чуе пра нешта, што яно нібыта якраз здараецца, альбо што яно ўжо здарылася: кажуць, недзе гарыць, зь некім здарылася бяда: калі ён хоць і чуе, што нешта здарылася, але ня можа зразумець, што ж гэта, альбо калі ён не разумее імя таго, хто закрануты здарэньнем, тады пачутае прыцягвае яго да месца здарэньня; спачатку ён лічыць самога сябе прычынай таго, што зьбегліся людзі, і мучыцца пытаньнем, ці не гарыць ён, альбо ці зь ягонай галавы, як было ўжо аднойчы, не цячэ моцна кроў. Калі на вуліцы выбухае сьмех, і ён ня можа адгадаць, з чаго там сьмяюцца, то ён пасьпешліва праводзіць рукамі па твары і па вопратцы, ці няма на ім чаго–небудзь ганебнага. Потым ён заўважае, што гэта датычыць не яго, альбо не яго асабіста, а таго, хто, можа, стаіць зь ім побач. Ніхто з тых, хто ўсё яшчэ грудам тоўпіцца на вуліцы, не наважваецца сказаць гэта. Калі ён набліжаецца, ім ня трэба было б перапыняць іхнай размовы альбо пераходзіць на шэпт; каб увесьці яго ў зман, было б даволі, калі б яны працягвалі гаварыць, як гаварылі, альбо наогул сталі б вонкава сур'ёзным абменам думкамі, які ў коле тых суразмоўцаў круціцца вакол прашумелай празь мястэчка вэлясыпэднай

гонкі, прычым як адзін, так і другі заўзята абмяркоўвалі б нумары гоншчыкаў, якія, калі іх параўнаць, маглі б быць няправільнымі. Яны адхіляюць яго ад сапраўднага здарэньня, якраз таму, што ён, мінаючы іх, навастрае слых на размовы. Ён настроены на найгоршае; аднак ён стараецца выглядаць прыязным, прычым выразам твару ён дэманструе тое, што называюць вытрымкай, мяркуючы такім чынам аблегчыць ім цяжкія словы; аднак усё яшчэ размовы ідуць пра вэлягоншчыкаў, якія яго не датычаць. Ён не дае сябе запалохаць іхнымі размовамі; нешта здарылася зь ягоным братам; а менавіта за ягонай сьпінай, калі ён цяжка валачэ ногі і ідзе яшчэ павальней, пакрыёма паварочваюцца, што ажно чутно, да яго твары; ён пазнае гэта паводле выразьнейшых і зразумельшых слоў гаворкі: да гэтага гаварылі ў складзеныя рупарам рукі; цяпер адна рука за другой апускаюцца, а рот працягвае гаварыць бяз большага напружаньня тое самае, што гаварыў і дагэтуль. Часта ён, ідучы, прыпыняе крок і чакае; гэта магло б даць ім імпульс гаварыць зь ім адкрыта, патаемна думае ён. Прывітаньне альбо іншае абыякавае слова не было б для яго дрэнным знакам; тое, што яны толькі робяць выгляд, што не зважаюць на яго, непакоіць палку ў руцэ настолькі, што яна мала не вывальваецца яму з пальцаў. Ён будзе шукаць адказ на гэта. Можа, гэта выпадковасьць, ягоная сястра мае неблізу адсюль шынок.

Спрэчка

Спрэчка закрывае яму дарогу ў дом сястры.

Спрэчка — гэта маленькая вайна з той розьніцай, што вайна вядзецца паміж штучнымі асобамі, дзяржавамі, такім чынам, што ў часе яе натуральныя асобы зь мяса і крыві ўжываюцца толькі як сродкі, тады як у простай спрэчцы тыя, хто спрачаецца, ёсьць гаспадарамі сваёй волі, а не падданымі штучнай асобы, якой яны падпарадкоўваюцца, калі ідзе вайна. Двубой апісваецца як элемэнт вайны. Сутнасьць двубою ў тым, каб актам гвалту прымусіць праціўніка выконваць уласную волю.

З спрэчкі з словамі, якая яшчэ не нясе ў сабе прымусу, узьнікае спрэчка з кулакамі, якая хоча прымусіць да выкананьня сваёй

волі.
Ніхто ня можа быць у спрэчцы з самім сабой, хіба што тады, калі спрачаюцца ягоныя думкі.
Цяжка адной руцэ спрачацца з другой, яшчэ цяжэй аднаму воку з другім. Павінна быць магчымасьць практыкаваць гвалт, які патрабуе перамогі ў спрэчцы, практыкаваць не на сабе, а на іншай асобе; гэты другі гвалт узбройваецца вынаходкай мастацтваў і навук, каб адказаць на першы гвалт. Першы гвалт робіць тое самае.
Шкло на сталох без сумлеву ёсьць вынаходкай навукі. Кулакі дадзеныя тым, хто спрачаецца, ад нараджэньня. Словы перад спрэчкай, словы, якія лётаюць туды–сюды, — гэта вынаходка мастацтва.
У шынку ёсьць правілы паводзінаў, датрыманьне якіх даволі важнае з–за колькасьці нетрывалага шкла. Гэтыя правілы паводзінаў парушаюцца, калі спрэчка словаў і жэстаў ператвараецца ў кулачны бой. Гвалт, які тут мае быць ужыты, зьяўляецца для простай натуральнай спрэчкі сродкам накінуць другому, ворагу, сваю волю; каб дасягчы гэтай мэты, трэба вывесьці ворага з строю; гэта, як кажуць, і ёсьць уласна мэтай ваенных дзеяньняў. З–за таго, што ў спрэчцы паміж праціўнікамі парушаюцца правілы, спачатку ўзьнікае тое, што не падпадае пад правілы, у гэтым выпадку перамена месцазнаходжаньня крэсла, якое адзін з удзельнікаў спрэчкі, устаўшы, рэзка падсунуў да сьцяны ззаду; бо згодна з правіламі крэсла стаіць каля стала.
Новыя правілы ўзьнікаюць зноў толькі з парушаных старых. Барацьба ўзьнікае праз парушэньне правіла ва ўмовах узьнікненьня новага правіла. Бяз правілаў ніводная барацьба не была б задавальненьнем.
Кожнае правіла гульні ўзьнікае праз скасаваньне другога. Барацьба, выраджаючыся, ператвараецца ў сфальшаваную гульню, якая з–за адсутнасьці ў ёй правілаў не прыносіць задавальненьня нікому з удзельнікаў.
Пры сумленнай барацьбе паміж тымі двума, што ўступілі ў спрэчку, для тых, хто глядзіць, мае сілу норма не замінаць, акрамя як крыкамі тым, хто змагаецца.
Вакол тых, хто спрачаецца, утвараецца кола. Той, хто падыходзіць, павінен трымацца ў коле і перайсьці мяжу ня здольны. Але таго, хто возьме на сябе цяжар увайсьці ў кола, у

якім адзін мерае другога паглядамі, адцягнуць назад за вопратку; ім абодвум належыць рабіць тое, што яны хочуць. Пытаньні застаюцца на потым. Тыя, хто ўжо сабраўся ў дарогу, вяртаюцца. Меншыя стаяць папарадзе, старэйшыя ззаду.
Таму, хто прыйшоў запозна, уваход забаронены. Калі ён пры дапамозе плячэй пачне праштурхоўвацца наперад, ён выкліча да сябе непрыязь і агіду; калі падыдуць яшчэ людзі, яму ні туды, ні сюды.
Перад тым як слоўная спрэчка перарасьце ў кулачную, наступае цішыня. Уладальніца шынка, рукі якой на стойцы падпіраюць твар, глядзіць на тое, што адбываецца. Калі ў задніх шэрагах уздымаецца шэпт, яна, падняўшы бровы, загадвае замаўчаць,.
А цяпер тыя, хто спрачаецца, перш як схапіцца ўсур'ёз, ходзяць адзін вакол другога на дыбачках. Адзін з тых, хто ўступіў у спрэчку, моцна скроены; ён да таго ж большы за другога і, задаючыся, дэманструе цяжкія косьці і жылы. Ягоныя рукі называюцца лапамі. Калені трывалыя, мускулы лытак пад нагавіцамі цьвёрдыя. Акрамя таго, выглядае на тое, што ўбойная сіла яго кулакоў большая. Косткі на кулаках з усіх бакоў выклікаюць баязь; рука мужчыны, якая абхоплівае чужую галаву, вядомая на ўсё мястэчка. Аднак ці давядзецца і яму тое–сёе перанесьці і занесьці ў пасіў? Гледачы няўпэўненыя, ім мроіцца ўсялякае. З–за доўгага лайдацтва, другі дык не, а гэтаму адвіс жывот, тулава ўсохла, на ляжках і грудзёх відавочна адклаўся тук; мала каму ня трапіцца на вочы, што сёньня ў яго з–за таго, што ён добра выпіў, ня лепшы дзень. Ці зможа ён рухацца дастаткова хутка? Праўда, ногі ў яго яшчэ працуюць уражвальна. Але калі другі выкарыстае ягоныя слабыя месцы, то ён, безумоўна, мае шанцы, хоць ён і здаецца квольшым, з доўгімі віслымі рукамі і выпетралым невыразным тварам; дзякуючы хуткасьці вачэй ён можа аспрэчыць доўгі досьвед першага. Таму бальшыня робіць стаўку на маленькага і воклічамі схіляе яго да атакі, уголас сьмеючыся над большым і кажучы яму ўсьлед, што ён баязьлівец.
Між тым бойка канчаецца перад тым, як пачацца.
Гэтую бойку заканчваюць перад тым, як праціўнікі пускаюць у ход кулакі.
Звычайна гэта той выпадак, калі яе заканчвае нейкая ўлада, правіламі закону зноў пазбаўляючы сілы супярэчныя законам

правілы бойкі. Але калі выпадзе так, што органы ўлады з карысьлівых намераў не захочуць мяшацца ў спрэчку, тады нічым не падмацаванае права будзе скіравана на само сябе, і кожны, калі паўнамоцны прадстаўнік бязьдзейны, можа сам лічыць сябе ў праве змагацца за свае правы. Таму што права не саступае няправу. Справядлівасьць, да якой павінен імкнуцца кожны праўны парадак, ёсьць, як кажуць, сьляпой: чаму ж тады не павінен паўстаць, калі яму пагражае бяда, сьляпы, які, пасьля таго як ён ужо доўга бадзяўся і ціскаўся каля ўваходу, сам на свой страх і рызыку дапамагае сабе прыйсьці да права, для чаго ён зь дзікім, для тых, хто стаіць навокал, амаль не пазнавальным больш тварам, быццам ён быў кімсь другім і відушчым, з паднятай проста ўверх рукой, тупаючы нагамі і равучы, прабіваецца праз арду і груба ўрываецца да дужбітоў у забароненае кола.

Правіла парушана выняткам з правіла. Тады вынятак у адпаведнасьці з ужыванай здаўна маўклівай дамоўленасьцю ўхіліўся ад новых правілаў барацьбы. Гэтае новае правіла цяпер адхіленае правапарушэньнем сьляпога. Падвойнае правапарушэньне, калі не прадпісваецца нічога іншага, дае як вынік зноў старое правіла, асабліва якая–любя знадворная форма, якая даўжэйшы час застаецца бязь зьместу, як гэта было ў гэтым выпадку, калі тыя, хто ўступіў у спрэчку, адно хадзілі адзін вакол другога, не даткнуўшыся адзін да аднаго, пабуджае да нудоты, а нудота да зьмены, хоць, праўда, заўвагі некаторых гледачоў пра зрыў барацьбы, а таксама пра жорсткія міны дужбітоў, чые пальцы ўжо раскрыліся з кулакоў для захвату, для сьляпога пасярод іх, які цяпер заікаючыся пачаў гаварыць да ўладальніцы за стойкай, усё яшчэ не абяцалі сьляпому нічога добрага, так што на нейкі момант здавалася, што барацьба адбываецца за тое, паддацца ці не сваволі адзіночкі, аднак сьляпы, хай сабе ён і заікаецца, не зьвяртаецца да іх ніводным з сваіх словаў: з поўным ротам ён рашуча працерабіў сабе шлях празь іхную гурму, не сказаўшы ні слова нікому, каму яно не было прызначана. Цяпер ён прамаўляе да сваёй сястры тое, што ён даўно ўжо прамовіў сам да сябе; ягоныя губы старанна ходзяць уверх–уніз, язык стукае па зубох, ягонае паднябеньне сыходзіць пенай ад шаленства, зубы выстрэльваюць словы.

Між тым дужбіты прыходзяць у сябе і пачынаюць зважаць на

яго; ягонае шчасьце, што ён сьляпы; у іншым выпадку зь ім бы нешта здарылася; яны зноў пачынаюць гаварыць; да таго ж іхныя твары хоцькі–няхоцькі разьнявольваюцца: з напружаным тварам нельга весьці слоўную спрэчку.
Паколькі яны, пікіруючыся, зьневажаюць адзін другога і паколькі гледачы, праходзячы наперад, разыходзячыся, адыходзячы, ідучы да крэслаў, лаюць абодвух дужбітоў баязьліўцамі, уладальніца шынка ня можа зразумець, што там гаворыць брат. Яна махае яму рукой, каб ён падышоў бліжэй; потым яна кліча голасам і перагінаецца да яго: няхай ён пры такім галасе гаворыць ёй на вуха.
Адным вокам яна глядзіць на сьляпога, які дужа зьдзіўляецца самому сабе і змаўкае, робячы паўзу і ня могучы больш выйсьці з водуму наконт таго, што зьляцела зь ягонага языка, другім вокам яна глядзіць на тых, хто спрачаўся, зь якіх меншы цягне крэсла ад сьцяны назад да стала, у той час як вялікі, быццам як пасьля істотнага посьпеху, ліхаманкава блукаючы вачыма, з трэскам валіцца на крэсла. Уладальніца шынка, рука якой на плячы сьляпога, вымалёўвае пальцам усьмешку на запацеласьці ад выпарэньняў кавaваркі.
І ўсё ж такі сакрамэнта, пачынае малы, які цяпер стаіць ля стала. Сантамарыя, звысака пярэчыць вялікі. Сакрамэнта лепш, настойвае малы. Сантамарыя, пагардліва выводзіць на бляшанай попельцы вялікі. Вы бачылі тады сакрамэнта? заклікае малы гасьцей у сьведкі: ён так можа. Сантамарыя, пазяхае вялікі. Сакрамэнта. Сантамарыя. Сакрамэнта. Сантамэнта. Сакрамарыя. Сакрамэнцыя. Сантамэрта. Сантрамэнт. Сантанта. Сантра. Санд. Сантамія. Станта. Вайна гэта ня забаўка. Гэта сур'ёзны сродак для сур'ёзнай мэты. Ён павялічвае няпэўнасьць усіх абставінаў і перашкаджае хадзе падзей. Вайна гэта абсяг выпадковасьці.

Сон

Аднойчы ўначы я пачуў, што вярнуўся мой брат і ляжыць па той бок падворку ў гумне. Я пабег у пакой і пабудзіў бацьку: брат ляжыць там насупраць у гумне. Ён вярнуўся. Давай устанем і пойдзем да яго. У той час як я гаварыў, суседзі мармычучы прасунуліся празь дзьверы і паселі справа і зьлева

вакол бацькавага ложка, адкуль яны нахіліліся над ім, дзе ён ляжаў і выпіхваўся, сьпіраючыся на локці з сну. Потым мне зноў паведамілі, што мой брат захварэў. Брат вельмі хворы, заклінаў я бацьку, а калі ён зноў толькі глянуў на мяне, я пайшоў па крузе ад аднаго суседа да другога і заклінаў іх, падымаючы голас, няхай бы яны мелі ласку і хутчэй ішлі да яго, і я гучна папракаў іх і прыніжана ламаў рукі: мой брат ляжыць хворы ў гумне на возе, хадзем, мы пойдзем усе да яго і перанясём яго у пакой. Але суседзі, у чорных востраверхіх капелюшох, зь якіх зьвісалі істужкі, адвярнуліся ад мяне і згуртаваліся разам і пачалі груба, па–хамску гаварыць пра мужчыну, які спакойна ляжаў сярод іх на голым сеньніку ў парваных нагавіцах, якія, як “прагалы паміж ліштвамі сьвіной клеткі на сьпячых сьвіньнях”, адкрывалі позірку ягоны зморшчаны віслы чэлес. Я бачыў ягоныя грудзі, сьпятралыя і безвалосыя, зь вялікімі радзімымі плямамі. Я бачыў пуп, вакол яго бруд, падобны да бруду з старога грабянца. Калі гэта ўжо склалася так і калі я ўсё яшчэ хадзіў у выцьвілым памяшканьні па крузе і ўмольваў мужчынаў, то мяне апанавала неўтаймоўнае шаленства, так што я мусіў глядзець убок, і я бачыў за вокнамі сьветлую і каляровую ноч, і я бачыў, як праз ноч перакідваецца нябачаны да гэтага мост, а на мосьце я бачыў аўтобус, тыпу тых, у якіх некаторыя электрапрадпрыемствы дэманструюць сваю прадукцыю, і аўтобус быў даўжэйшы за вёску і даўжэйшы за грузавы цягнік і вырастаў перад вачыма цераз усялякую меру, так што агляду не было канца. І зноў мне паведамілі, што кагадзе мой брат у гумне, у якім мне толькі на імгненьне прымроілася схаваная ў пілавіньні матыка і раскіданая складанка дроў, нікчэмна здох; аднак як толькі я паглядзеў, я ўбачыў колы аўтобуса, якія быццам каціліся з хуткасьцю кроку побач зь нейкім чалавекам, альбо гэта было толькі так, што я бачыў, як перасоўваюцца хмары за ягонымі шыбамі, і што рух аўтобуса я выводзіў з гэтага перасоўваньня хмараў; я бачыў, што доўгія і шырокія шкляныя панэлі пасярэдзіне гарызантальна падзеленыя насьцілам зь сьвежагабляваных смалістых хваёвых дошак, на якім, выцягнуўшыся, вэртыкальна пастаўленыя ступакі разьведзеныя пачынаючы ад пятак, цьмяна маячыў мой брат. Аднак тое, што я бачыў цяпер, не было болей вонках мяне, і гэта болей не было так, што я ня ведаў, ці гэта на самой справе

так альбо я толькі сьню; мяне не аддзяляла ад гэтага розьніца ў месцы і адлегласьць, якую можна было б вымерыць складной лінейкай, і каб пераадолець якую, я мусіў бы ісьці ад месца, дзе знаходзіўся цяпер, да месца, у якім было тое, што я цяпер бачыў, каб мне можна было няхай сабе пальцам напісаць на пакрытай пылам блясе аўтобуса знакі, якія даказалі б мне, што я там быў і што я ад гэтага месца перасунуўся ў нейкае іншае: тое, што я бачыў, я не заўважаў вачыма, не асэнсоўваў мазгамі, даючы яму звычныя назовы, гэта не было прыемна альбо непрыемна нэрвам, з чаго, магчыма, паўстае пачуцьцё: тое, што я бачыў, бачыў я ня вокам, а толькі дзякуючы паторгваньню саміх нежывых рэчаў, якія я болей не адчуваў іншымі і аддаленымі ад мяне, таму што яны адным тым, што я іх бачыў, узрэзвалі мне вены, быццам гэта нежывое, так сказаць, ня будучы болей відавочным, для таго, хто глядзеў на яго без вачэй, торгаецца ад болю і перадае гэты боль глядзячаму, і быццам сьмеху варты гнеў у маім нутры, які схіляў суседзяў да таго, каб, сагнуўшы рукі, малаціць імі па ляжках і ўголас сьмяяцца, толькі невыкараняльны, бесьперастанны боль гэтых рэчаў: вострага цяністага пратэктара кола зь сьветлымі плямінамі ўдушаных у шліцы каменьчыкаў, сухіх шэрых кляксаў размажджэраных аб ветравую шыбу інсэктаў, памалу, быццам у вадзе, дрыжачага брызэнту ў спляценьні трубаў пад дахам, закладзенай жалезнай лесьвіцы, якая цяпер выплывае каляровай плямай з туману, пасмаў сена, якія заматаліся за бампэр і выкідную трубу і цягнуцца цяпер па бэтоне мосту.

Наведваньне кавярні

Калі людзі напіваюцца, яны бадзяюцца па навакольлі і расказваюць пра сябе. Лёс мужчыны, калі ён напіўся, гэта ягоная гісторыя, зь якой ён атаборваецца ля кожнага наступнага стала. Яму ня трэба быць п'яным ад алькаголю ці іншага наркотыка; іншым разам яму блытае мазгі і робіць п'яным сонца, яшчэ часьцей гэта ўласная глыбокая стома. Калі ён сядзіць паміж людзей, язык працуе ў яго спраўна, прычым ён не каштаваў, скажам, акрамя гэтай кавы, якая стаіць перад ім, ніякага другога напою, і пнецца абысьці ўсіх у шынку, сьпіраць стоячы руку на пустое крэсла і зьверху апавядаць сваю гісторыю, як нешта яго заўсёды падштурхоўвала да гэтага. Ён прыдумляе сваю гісторыю, каб яна была зразумелая для другіх,

а ягоныя рукі разрываюць цэлафан і сыплюць з пакеціка ў карычневую каўную пену цукар, зь якой пасьля таго, як яе праб'юць крышталы, выбухае чорным кава, так што і паасобку падаючыя з пустога ўжо пакеціка пясчынкі, як толькі крышталы празь пену ападуць у каву, пры кожным падзеньні здаюцца таму, хто глядзіць, чорнымі. Потым належыцца маленькай лыжачкай зь нержавейкі старанна разьмяшаць каву. Словы не ліюцца ў яго з вуснаў. Ён чакае, што нехта падыдзе да яго і што–небудзь у яго спытае; ён хоча толькі крыху пагаварыць з кім–небудзь; ён хацеў бы пагаварыць пра колер шпалераў, пра паперу, на якой можна пісаць лісты, ён хоча пачуць, як зь яго выходзіць уласны голас, і расказаць уласную гісторыю; ён хацеў бы, каб і ўсе іншыя прыйшлі сюды, за ягоны звычны стол каля вешалкі, і па чарзе расказалі яму свае ганарыстыя гісторыі. У яго да ўладальніцы шынка адно жаданьне: ён ад яе хоча, каб яна яму прынесла шклянку вады; ён хоча, каб яна была павінна. Ён хоча. Яна павінна. Ён абгрунтоўвае сваю волю тым, што яны сваякі, і таму яна павінна, быццам гэта было б дастатковай падставай. Дзе ліст? дапытваецца ён. Які ліст? Ліст ад майго брата. Ты напіўся? Я патрабую ліст. Ты хлусіш. Мой брат Ганс напісаў ліст, алоўкам, на паперы з анучаў, на абрыўку пакавальнай паперы. Ён напісаў на мяккай вокладцы сшытка, алоўкам, на крэйдаванай паперы, на тонкай паперы, у якую загортваюць хлеб. Ты зноў ілжэш. Не. Ён сядзеў у траве, калі пісаў, у густой траве каля балота, у балотнай траве; вецер, калі ён пісаў, зьверху кудлаціў пучкі травы. Ён спрабаваў перанесьці цені ад травы на паперу, аднак бачны толькі размытыя, крывыя штрыхі, бо вецер увесь час вырываў травінкі з стану спакою. Ты, як заўсёды, ня ў стане перастаць ілгаць. Ён склаў паперу для пісьма, каб яе, тонкую, не прарваў аловак. Ён спачатку паспрабаваў пісаць, паклаўшы аркуш на далонь, — бо кароткім было тое, што ён хацеў напісаць. Але потым ён сеў, вецер растрапаў паперу ў руцэ, ён пісаў далей на кавалку скуры, на прамоклым ад дажджу кавалку скуры, чыя фактура адбілася на задняй старонцы ліста; наставіўшы пляскатыя далоні, ён прыціснуў паперу да скуры; ён пісаў седзячы далей, не падымаючы алоўка, і вецер шпурляў на вільготную паперу бурбалкі. Так, ён пісаў на скуры валізы, на скуры сумкі, на скураной аблямоўцы марацкай кайстры; аловак сасьлізгнуў і пакінуў на паперы шнар, ён завязваў петлі словаў карава і

цьмяна. Потым пайшоў брудны дождж, альбо нехта, хто бег праз балотную траву, пятамі напырскаў гэтыя кроплі на паперу. Аловак, якім чалавек пісаў сваю вестку, быў хімічны, таму што ў лісьце ад гэтых кропляў расплыліся сіняватыя кругі. Такім чынам, гэта было ў высокай і густой траве, думае ён сам сабе, пад небам, закрытым хмарамі; ад сонца папера хутка стала б жоўтай; вецер парывамі дзьмуў зьверху і прымушаў, скінуўшы іх на зямлю, вянуць травінкі і лісты дрэваў, а валасы на галаве чалавека то падымаліся дыбарам, то апускаліся. Ён лёг на сьпіну ў гэтыя высокія густыя хвалістыя пасмы травы, у якой вецер зьядаў травінкі; рукі ён падаткнуў пад ямкі пад каленямі сагнутых ног, твар песьцілі ледзьве ўлоўныя цені травінак. Але ж гэта не твая гісторыя, гэта гісторыя некага іншага. Уласная гісторыя замуроўвае яго думкі, так што яна для яго ўсё яшчэ цёмная. Ён цяпер не хацеў бы паварочваць галаву, рэагуючы на крокі сястры, — больш за тое, ён хацеў сабрацца з духам і, насьмеліўшыся, адкрыць рот ды пагаварыць зь ёю гучна. Між тым яна сьпяшаецца сюды–туды, складвае пустыя дзвэньгаючыя талеркі ў купу пад стойкай, папраўляе, ідучы да сталоў, перакошаныя этыкеткі на запацелых поўных бутэльках, разглядае, прымаючы з аднаго стала попелкі і шклянкі і выціраючы ручніком альбо пярэднікам калюгі з стальніцы, у загароджаным паліцамі люстры сьпіралі, якія яе рукі з скамечаным ручніком знутры павольнымі вывертамі праводзяць да краёў сталоў. Яна ўласнаручна прыносіць яму на падносе тое, што ён хацеў, і знаходзіцца ля ягонага крэсла, завязваючы ў люстры ззаду пярэднік, у нейкай меры ў ягоным распараджэньні. Цяпер ён можа ўзяць яе за руку, запрасіць да сябе і пагаварыць да яе; ён мог бы разьвязаўшы язык расказаць ёй як пасьвечанай сваю гісторыю. З–за таго, што ён даверыўся, захраслы язык мог бы разьвязацца. Аднак ён абмяжоўваецца глухой падзякай за ваду. Пасьля (калі?), адразу пасьля таго, ён просіць курава. У той час як яна разрывае вялікім пальцам пакунак і ацэньвае, што адбываецца, у сваёй павярхоўнай трактоўцы, ад яго залежыць, наважыцца ці не: рух у гэты час слабы, ніхто ня мае ахвоты пакідаць сваё месца альбо павышаць голас, каб запрасіць каго–небудзь іншага; бо і дзень ня рухаецца; да таго ж яна ад ягонага стала, пэўна, мала зважае на выхад і на вуліцу, — там звонку ад ейнае ўвагі ня высьлізгнула б нічога значнага. Вось яна тыкае яму цыгарэту ў

нахіленую чуйную галаву і запальнічкай дае прыкурыць. Аднак і агонь ня ўстане разьвязаць яму язык; ён згадвае толькі (альбо яму нагадваюць), што аднойчы з каптурка запальнічкі вырас хуткі блакітны сьветлячок. Ён блытаецца ў сваіх думках; ён ня зможа вымавіць тую ці гэтую літару альбо ўсё гэтае слова; гэта адымае ў яго навыкі штодзённай пабытовай гутаркі; калі ён пасьля дзён маўчаньня чуе дзесьці зь нікчэмнай нагоды свой голас, ён рэзка паварочваецца і, поўны падазронасьці, вышуквае таго, хто гаварыў; артыкуляцыя ягоных думак (думае ён сам сабе) замінае ягонаму вымаўленьню. “Так, гэтага”, кажа ён. “Ты сабе нешта напрыдумваў”, кажа ўладальніца шынка, і сама падкурваючы цыгарэту ад запальнічкі, “яна табе нейкага”, працягвае блытацца ён у думках, “не няправільна, не і не”, кажа ён. І другія ў пакоі гавораць і мармычуць самі сабе нейкія словы; адзін за сваім сталом кажа гэта, другі другое, кожны кажа тое, што мае сказаць і што мае і мог бы сказаць другому. Дзякую, нарэшце гнеўна кажа сьляпы навонкі да ўладальніцы шынка, якая ўжо зноў мые куфлі ў запененай вадзе мыйкі за стойкай куфлі. У таго, хто мае комплексы, шмат часу ідзе на ўдзячнасьць. Удзячны той, хто заўсёды ўспамінае, што зь ім здарылася. Ягоныя думкі, думае ён сам сабе, паколькі яны так аддаленыя ад яго, паколькі яны яго ніколі не датычаць, навейваюць на яго ў гэтым шынку нуду. Аднак ува ўсялякім выпадку шынок гэта прытулак, дзе ён можа прабавіць час да вечара; дома ён цяпер быў бы самотны; акно бадай што можна было б зачыніць. Неўзабаве з другога боку зноў абвясьцілі пасадку на аўтобус; ён мог бы ехаць насустрач яму ў Заморск. Ён ідзе далей і ў Заморск. Ён ідзе назад і дахаты. Ён застаецца тут, дзе яму варта быць. Новыя госьці вяртаюць яго з раздваеньня, дзіка ўрываючыся ў шынок. Ён прымае іх за футбалістаў. У той час як яны тупаюць нагамі і, выпінаючыся ды косячы пад вялікіх, вытурзваюць адзін аднаго з куртак, у той час як яны чапляюць нагамі ад сталоў вольныя крэслы і, везучы за сабой драпаючы гук ножак крэслаў, акружаюць сьляпога з усіх бакоў, яны на ўсе бакі распавядаюць свае гісторыі. Спачатку, калі яны ўбачылі, як ён сядзіць, нічога не гаворачы, з заглухлымі думкамі, яны яму зьдзівіліся і, замоўкшы самі, аглядзелі яго зь верху да нізу; але ён зь лёгкасьцю вытрымаў іхныя позіркі. Але вось цяпер апошні, зачапіўшы куртку на вялікі палец цераз плячо, яшчэ з вуліцы

выкрыквае сваю гісторыю. Усе ссоўваюцца і даймаюць сьляпога; кожны згодна з сваёй завядзёнкай расказвае яму сваю гісторыю; адзін раве, другі перамяжае кашлем, трэці прысьвіствае, яшчэ адзін сьмяецца і прыкладвае да шчакі халодны куфаль, апошні ў знак прызнаньня стукаючы сьляпога па плячы, так што той ня можа ні застацца, ні ісьці, хоць яму і карціць. Тут яму на дапамогу прыходзіць сястра: падышоўшы, яна цярпліва, чаму спрыяе і пагляд у люстра, пераймае ўсе іхныя гісторыі на сябе, забясьпечваючы брату, не сказаўшы яму, праўда, на дарожку ні слова, выйсьце з акружэньня.
Так у стане дзіўнага ап'яненьня ён апынаецца на вуліцы. Ён пытае сам сябе, ці ўсё, што зьдзеялася зь ім, праўда. Ён адказвае дадатна, ківаючы сам сабе — без засьцярог. Яго выгналі з шынка. Гэтае выгнаньне ёсьць адной зь яго апошніх гісторый у гэты дзень. У лістападзе ў гэты час ужо амаль цёмна; у адзін зь лістападаў, калі ён шукаў брата, у той час як другі брат–тапелец ляжаў пад палатняным покрывам, якім быў заменены саван, было ў гэты час ужо амаль цёмна, усё яшчэ ішоў сьнег. Да гэтага часу нічога ня зьдзеялася.

Раздвоенасьць

Зь ім не здараецца нічога асаблівага; што зь ім здараецца, ня ёсьць асаблівым здарэньнем, а ёсьць нечым, пра што ён думае, што яно супольнае для ўсіх. Таму ён гаворыць пра тое, што яго спатыкае, як пра нешта, што здараецца і з другімі: і ў другіх цяпер маглі б аспрэчваць адна адну думкі, куды ім накіраваць ногі. Асабліва ў яго — гэта ж толькі гэная ягоная сьлепата, ды і яна, мабыць, выдуманая. Множны лік ужываецца замест адзіночнага, адзіночны ўжываецца замест множнага, трэцюю асобу "ён" ён ужывае замест "я". Альбо гэта падман, пры дапамозе якога ён дарэмна спрабуе абараніцца, робячы рэч, хоць яна датычыць толькі яго самога, супольнай для ўсіх? Ён нібыта ставіць усім заданьне, хітра гаворачы: я (ён, здаецца, мае на ўвазе "хто заўгодна", "які–любя") стаю на вуліцы і сумняюся, куды мне ісьці, хіба (здаецца, ён мае на ўвазе прыклад) да кінатэатру, дзе на слуп ля прыпынку абапёрты вэлясыпэд, які я мог бы завесьці дахаты, альбо (здаецца, ён зноў мае на ўвазе толькі прыклад) у другім кірунку на шашы ў другое мястэчка да аўтобусу, і мае думкі ўступаюць у супярэчнасьць; як магу я разьвязаць гэтую раздвоенасьць?

можа, калі ён паставіць сябе так, нібыта ён адзін можа спытаць пра гэта за ўсіх, бо ужо так да гэтага наблізіўся, што ён пасьля, здавалася б, звычайнага пачатку заданьня падае ў яму сваёй сьвядомасьці; бо гэта ня прыклад, які мае сілу для ўсіх і які згадваецца тут, а гэта нешта, што ёсьць праўдзівым і дзейсным толькі для яго і датычыць толькі яго самога; і калі ён у “заданьні” кажа “я”, дык гэтае “я” другімі як у звычайным заданьні будзе зразумета як “які–любя”, то ён на самай рэчы мае на ўвазе сябе самога. Цяпер ён думае, што страхуе сябе ад сваёй гісторыі тым, што ён працэсы, суладныя часу, пазначае ў адпаведнасьці з часам праз абагульненьне. Тым самым ён заўсёды будзе замыкацца сам на сабе, і наапошку ён і ня выйдзе больш сам зь сябе. Ён можа гаварыць і пачаць: ці трэба мне ісьці ў тым альбо ў гэным накірунку, і калі. Тут ён пералічвае ўсе дадатныя і адмоўныя матывацыі для абодвух накірункаў; гэта будзе яшчэ супольным для ўсіх і ня так падазроным. Аднак няхай ён пералічыць матывацыі супраць аднаго. Да мястэчка Заморск столькі і столькі кілямэтраў, дарога туды займае столькі і столькі часу, “я” маю столькі і столькі грошай для падарожжа назад на аўтобусе. Да гэтага месца ягоныя развагі яшчэ будуць брацца ў разьлік. Цяпер чакаюць на канкрэтныя дадзеныя, каб можна было лічыць. Ён, відавочна, хацеў бы зрабіць з гэтага гаспадарчае заданьне абсалютнага маштабу. Як мне лепш трапіць туды, калі я прыму ў разьлік тое і тое. Аднак няхай ён і надалей бярэ ў разьлік: цяпер мне прыходзіць на розум, што на зваротную дарогу ў мяне няма сродкаў; апрача таго, я сваім п’яным выглядам выклічу ўвагу пасажыраў — больш за тое, паводзячы сябе дрэнна, я буду рабіць па сваёй уласнай волі, так што кіроўца па дарозе спыніцца, каб выкінуць „сьляпога пасажыра“* з аўтобуса. Ці здолею я спыніць лаянку, сказаўшы, што я толькі хацеў прыцягнуць да сябе ўвагу, з тым каб нехта, хто, можа быць, будзе знаходзіцца ў аўтобусе, змог убачыць і пазнаць мяне? Ці трэба мне наогул ісьці ў мястэчка? Калі ён гэта скажа, то ён сваім няўцямным, бессэнсоўным заданьнем сам загоніць сябе ў зробленую самім сабой пастку; бо ягоныя дадзеныя больш не ўнівэрсальныя, яны фармуюць заданьне толькі звонку, імі больш нельга апэраваць, бо яны несуадносныя, і нельга ўжываць для іх жадных канкрэтных пазыцый. Таму трэба яму самому даць адказ, якога ён адначасна і не чакае ні

ад кога і не спадзяецца ад каго–небудзь атрымаць. Ён пойдзе да кінатэатру і завядзе братаў вэлясыпэд празь мястэчка назад дамоў; калі той выйдзе, то яму пра гэта раскажуць сьведкі. Ён ня пойдзе: ён ужо хадзіў і знаходзіцца там; між тым разважаньні прывялі яго з шынка да кінатэатру. Ён пойдзе далей. “Я” пайду далей. Аднак магчымыя і другія рашэньні: скажам, я мог бы зноў чакаць на аўтобус ля сьцяны кінатэатру. Што мяне ўтрымала ад гэтага? Такое пытаньне больш не заданьне, а загадка, якая нікога не ашчасьлівіць. Як можа той, хто стаіць звонку, ведаць, што ён тады, калі шукалі ягоных братоў, ён хаваўся ад таго, што будзе, засоўваючы сябе ў сон тым, што еў хлеб, каб яны, можа, ужо былі дома, калі ён прачнецца, так, як ён цяпер, адыходзячы, адключае сваю сьвядомасьць ад месца, у якое мог бы прыбыць брат, якога ён чакае, быццам адно тое, што ён стаў бы чакаць ля мура, азначала б для яго няшчасьце і быццам ён мяняе гэта альбо што–небудзь тым, што ён аддаляецца з вэлясыпэдам?
* Гульня словаў - на ням. мове „der blinde Passagier" азначае таксама „заяц", „безьбілетнік". (Зацем перакладніка).

Дарога дадому

Хоць ён і ідзе па правільным боку, па правільнай шашы, у правільным кірунку, ён усё–такі думае, што ідзе няправільнай дарогай. Яму дае палёгку тое, што ён заўважае гук вітаньняў і мае адказваць на іх: калі яго вітаюць, то яго, відаць, пазналі, а пакуль яго пазнаюць, ён не зайшоў яшчэ ў чужы раён. Ён гучна ўпэўняе сябе, што ягоныя клопаты сьмеху вартыя, і ён сьмяецца сам зь сябе, калі пачынае непакоіцца, што нехта мінае яго не павітаўшыся. З гэтага часу ён вітаецца з усімі першы. Калі ён чуе галасы, ён намацвае і хапаецца ў сабе за слова, якім тут звычайна вітаюць; потым ён падымае яго “як капялюш”. Бывае, што ягоныя пошукі затрымліваюць яго, так што ён толькі пачціва змаўкае, быццам яму хацелася б павітацца інакш; язык расьцягвае яму літары адна ад другой і не дае выхаду словам. Тады яму нічога не застаецца, як сьціснуць іх рукой у кулак, а з кулака ў званок, які зьвініць адчужана. Зямля гарыць у яго пад нагамі. Ён супакойвае сябе; ён зноў настройвае сябе, што ён ня

йдзе чужымі сьцежкамі і што, калі ён і йдзе чужымі сьцежкамі, яму трэба зь *нічога* зрабіць *нешта*: бо ёсьць прасторы, якія: думае ён, разьбіваючы словы на склады.
Ён крыўдуе на сваё прадчуваньне, зьдзекліва ставячы мысок туфля на понаж; ён груба, пахабна лае свае рукі, якія вядуць яго туды ў дзікасьць, лаецца і крые на чым сьвет стаіць імя сваёй сям'і. Аднак ён, што б ні рабіў, ня можа вылузнуцца са сваіх думак; калі ён думае, ягоны лоб хмурны; ён бесьперапынна больш ці менш памысна дасьледуе сябе, дзе ён знаходзіцца на цяперашні момант, і спадзяецца на свой досьвед; ён называе нават нумар і перадусім дзяржаўны герб вуліцы, каб быць пэўным у сваім шляху. Праўда, ён зусім няпэўны ў другім: а менавіта атрымліваецца, што паступова ў яго вычэрпваецца запас словаў і выразаў для апісаньня таго, што належыць да яго; часткі ягонага цела няўцямна рухаюцца адна побач з другой: пад ім па друзе цягнуцца ногі, кулак вядзе за руль вэлясыпэд, другі кулак стукае каменем аб бардзюр; зь ім зноў здараецца тое, што і зь нейкім тым, хто бачыць, але ў каго якраз цяпер завязаныя вочы: ён не арыентуецца і баіцца зьбіцца з дарогі; толькі вэлясыпэд — вось адно тое, за што ён можа трымацца, прасоўваючыся краем дарогі наперад; яму здаецца, што ён ідзе па густой гразі альбо па рацэ супраць плыні. Яму прыходзіць на розум, што для пальцаў сьляпых, калі яны вучацца, рэкі робяць рэльефнымі: іх падымаюць над паперай на картах і пакрываюць слоем густога клею, так што мацаючыя пальцы могуць цячы разам зь імі ад вытоку аж да мора; і межы краінаў абазначаны шклянымі ўзвышшамі; часта ягоныя пальцы заблытваліся, калі ён ня мог аддзяліць рэкі ад межаў.
Ён праклінае сваю памяць, якая не дае яму запомніць, што знаходзіцца навокал яго, таму што цяпер яго хвалюе не геаграфічная карта, на якой, нягледзячы на ягоны падроблы ў міжчасьсі цень, ён ня быў бы нават мушыным гаўном, а ягоныя крокі, — вось што даймае яго; якія ён знае, не пазнаўшы, і якія ён называе сваімі крокамі: ягоныя крокі выпіхваюць яго з шашы зь віхляючым пярэднім колам, якое на траве ўсё больш а больш становіцца ўпоперак. Шаліць яго яшчэ і тое, што мусіць сачыць за чысьцінёй сваёй вопраткі. Таму ён імкнецца трымацца далей ад іржавай рамы; понаж, як толькі ён датыкаецца да яго косткай, ён кляне як падступны, а чмяканьне і шорганьне

ланцуга на зубчатцы ён праклінае больш зацята, чымся свайго бацьку.
Калі ён прысядзе, ён больш ня зможа падняцца; але калі ён працягне шлях, дарога зьесьць яго. Ён важыцца ісьці далей; таму што калі ён спыніцца, то ад цяжару праваліцца пад зямлю. Памалу плыве празь яго сьвядомасьць, стала і нястала, адзін сказ, у залежнасьці ад таго, пастаянна ці не ён крочыць наперад: “у яме з вапнай, пясок ляжыць у яме з вапнай”. Ён разважае, што стаіць за гэтым сказам; але потым да словаў дадаецца гаспода, у якой ён хутка будзе, аднак не *даслоўна*, а барджэй як *вобраз* гасподы з календаром адной страхавой кампаніі на сьцяне, у які ён яшчэ ўключае застылыя ў вадасьцёках кроплі вапны, якіх не хапала для гэтага вобраза. Хутка ён будзе там. Ён будзе сядзець перад добра зачыненым акном у любой паставе. Хоць ён і перасьледуе шмат мэтаў, для яго ідзе размова толькі пра гэтую. Ён будзе там. Увадначасьсе яму становіцца млосна ад гэтага, хай ён і гаворыць сабе, што наперадзе яго не чакае нічога; яму не па сабе, таму што гэта будзе так, як ён сабе ўяўляе, і таму ён нічога ня можа зьмяніць; гэтаксама і калі б ён ішоў у нікуды, ён наперад быў бы пэўны, што ён ідзе ў нікуды: ён заўсёды быў бы пэўны наперад, куды ён пойдзе і дзе ён будзе, і ён мусіў бы думаць: я буду там, і калі ён прыйшоў бы, ён заўсёды рабіў бы папярэдне прадуманыя рухі, чуў бы тое, што пачута папярэдне, уяўляў бы тое, што ўяўлена да гэтага. Інакш было б толькі тады, калі б ён рушыў некуды за мяжу, у чужы і невядомы край, пра які ён дагэтуль ні разу ня чуў і пра які яму яшчэ ніколі, ні ў аповедзе, ні ў апісаньні, не паведамлялі. А так ён ідзе дахаты і ведае, што яго чакае. Там на сьцяне будзе вісець каляндар; калі ён зачыніць за сабою дзьверы, той ад проймы захістаецца як ківач і будзе шкрэбсьці па тынкоўцы на сьцяне; гэты гук падпілка па кардоне пратне яго ад галавы да пят.
Ня можа ён зразумець таго, што ён *будзе* ў гэтай гасподзе. Ён спрабуе ісьці раўнамерна, так, як ён раўнамерна дыхае перад сном для таго, каб заснуць і спаць. Тое, як ідзеш, разважае ён, вызначае і тое, як думаеш; калі ён ідзе раўнамерна, то застанецца ў сьвядомасьці на тым месцы, паўзь якое ён цяпер ідзе, і тым самым ня трапіць у нейкае другое; калі ён спатыкаецца альбо паскарае крокі, альбо калі вэлясыпэд ад пярэпалаху цягне яго за сабою ў траву, — тады ён

выходзіць з раўнамернасьці сваіх думак.
Ногі крыжуюцца адна з другой; якая нага ёсьць якой; левая рука ня ведае больш, што робіць правая. Быццам ён развучыўся рухацца, кажа ён разгублена: быццам гэтыя рэчы (ён мае на ўвазе пясок у яме і каляндар) як–небудзь суадносіліся адна з другой.
Ён зьбіраецца з думкамі і выбівае дрыготкай рукой на сядле загады нагам. Аднак яны адмаўляюцца яму служыць. Паколькі ён цяпер у становішчы “і ні туды, і ні сюды”, ён выпускае з рук вэлясыпэд, каб была падстава нагнуцца і імітаваць язду. “Шум вэлясыпэда, перш як ён апракінецца, называецца ляскатаньнем; шум сьпіцаў, якія пасьля гэтага яшчэ круцяцца, гэта зумкатаньне, шум штангі, якая перад гэтым удараецца аб камень, гэта стуканьне”.
Цяпер у яго ёсьць падстава адпачыць. Аднак паколькі ён усё яшчэ стаіць, то заўважае, што яму хутка давядзецца апусьціцца на зямлю, у іншым выпадку ён ніколі не перастане стаяць. Ён дужы мужчына; ён мае сілы сабрацца і пранесьці сваё цела, з правай рукой як значкам на левым плячы, да памосту для малочнай тары; вэлясыпэд ён між тым пакідае траве на ўзбочыне.
Дзе–нідзе на аполках стаяць біклагі; аднак цяпер памост пусты. Ён сам ня ведае, сесьці яму на аполкі альбо на скрыжаваныя распоркі пад аполкамі. Яго агортвае слабасьць цела, перш як ён наважыўся, яна разьнявольвае яго суставы і апускае, у той час як ён схіляе галаву на грудзі, на распоркі. Для іх былі ўжытыя старыя рэйкі ад тартака, на краёх якіх ён яшчэ адчувае кару. Ён коса сядзіць у сваім прытулку, над галавой аполкі, якія там, дзе звычайна стаяць біклагі, пашкрэбленыя і паколатыя. Ён вельмі хоча сьпінай прытуліцца да аднаго з слупоў; можа, там было б месца, дзе сонца не даставала б болей ягоны твар; аднак ён баіцца, што калі будзе шукаць апірышча ззаду, то сілы могуць зусім пакінуць яго, настолькі, што ён перастане валодаць уласным целам, і ён перакуліцца назад у пыльную траву і запэцкае чыстую вопратку.
Стомлены, калі нарэшце прысядзе, выцягне ногі перад сабой; так ён меркаваў і сам да гэтага ў гэты дзень: у ягоным пакоі, у вэстыбюлі кінатэатру, у будцы таго самага кінатэатру ён сядзеў з працягнутымі перад сабой нагамі. Аднак цяпер здарылася так, што ён, сеўшы ў рыштаваньне, альбо забыўся на гэта,

альбо ўжо быў ня ў стане, калі ўжо сядаў, працягнуць перад сабой ногі; і вось, завостраныя і вузлаватыя, яны стаяць перад ім, зьнізу ў туфлях крыху раскрытыя ў форме літары; адпіхнуць іх было б звычайным жэстам стомленасьці; аднак ён ужо настолькі стомлены, што нават ня можа выцягнуць ногі; пяткі камякамі прырасьлі ў яго да зямлі.
Ён не злуе на сваю слабасьць; больш за тое, ён праставата і наіўна спадзяецца, што тым, што ён засьмяецца, ён зможа, сьмеючыся, зможа выцягнуць іх ад сябе.
Ён прастадушна сьмяецца, пакуль у яго ня йдзе кругам галава. Але ягоная стома — гэта, як ён меркаваў сьпярша, ня нешта, што ён мае і ад якога можна дзякуючы такой дзейнасьці, як гэты сьмех, пазбавіцца, але яна наступіла ад нечага, што яго пакінула; яна ёсьць нястачай, думае ён разважліва. Яго пакінулі сілы — яго пакінуў навакольны сьвет.
Сёньня яго ўжо колькі разоў апаноўвала галавакружэньне; цяпер, калі адхінутая назад галава з ашчэранымі пярэднімі зубамі перакульваецца на грудзі, ён думае, у той час як падае і ў той час як не перастае падаць і ў той час як адчувае вецер падзеньня ў шырака адкрытых вачніцах, таксама і пра ўсе тыя справакаваныя галавакружэньнем падзеньні, ад якіх галава з посьвістам перакульвалася з патыліцы на грудзі.
Ён выхоплівае час для дыханьня, каб захаваць свой твар, дарма што ён ганебным чынам сядзіць пад памостам; дыханьне зноў высмоктвае яму галаву і пярэкулем адкідвае наўскась, назад, ды стукае аб адзін з слупоў. Кара на рэйцы, да якой ён датыкаецца, непрыемная, але ён болей ня можа варушыцца: гэты гіганцкі памост для малочнай тары — вось што гняце яго ў ягонай стоме; яму прыходзіць недарэчны ўспамін пра станцыі ў дзіцячай гульні, якія пачынаюцца з стомы; ён узгадвае некаторыя жэсты, скурчаныя рукі і ногі, якія, выцягваючыся з вэртыкалі і пераходзячы ў гарызанталь, увасабляюць хаду гульні; ён забыўся на правілы; альбо ён занадта лянівы, каб зьвесьці іх у адно: ён ведае, што яму нельга нічога забываць.
Ён узгадвае другую гульню. Дзеці стаяць на сэктарах круга на зямлі; сэктары абазначаюць краіны і дзяржавы, прычым дзеці, выбіраючы ймёны, аддаюць перавагу вялікім імпэрыям, быццам гэта абяцала ім фору ў гульні. Адзін папераменна з другім абвяшчае адзін аднаму вайну; пасьля гэтага нават той, каму была абвешчана вайна, загадвае выбягаючым з круга спыніцца.

Ягоны крык гэта знак чакаць на тое, што ён будзе рабіць. На сваім участку ён кладзецца на жывот, ня могучы, праўда, пальцамі ног выйсьці з круга, і спрабуе, растапырваючы лежачы рукі, датыкнуцца да аднаго зь іншых; ад тых, да каго ён датыкнуўся, ён патрабуе заключэньня прымусовага міру, які прадугледжвае падзел варожае краіны на карысьць пераможцы, у адваротным выпадку пагражае ўжыць больш радыкальныя сродкі, бо нельга далей дапускаць таго, што абаронены міжнародным правам сувэрэнітэт дзяржаўнай прасторы ў натуральным для ўсіх сэнсе ганебна не прымаецца пад увагу; і да таго ж выносіць сур'ёзнае папярэджаньне супраць таго, каб мяшацца ў нутраныя справы дзяржаваў.
Ён не разьвівае далей свае думкі; чым далей ён іх адпускае, тым глыбей губляецца ў іх, і ягоны дыялёг з сабой і з кім–небудзь там яшчэ з–за таго, што ён хаатычны і бязладны, сыходзіць з загадзя пракладзеных рэек.
Што ён, уласна кажучы, губляе? Ён мае ўсё, каб знайсьці свае вытокі, жыцьцё ягонае рухаецца на пэўных шляхах. Ён сядзіць пад гэтым памостам, прызначаным для малочнай тары, і заглыбляецца ў тое, што, так бы мовіць, называецца ўласным лёсам. На што ён мог бы падаць скаргу? Пра што ён так агідна скрыгоча зубамі? І заўтра яшчэ будзе дзень. І пазаўтра яшчэ будзе дзень. Чаму ён сядзіць пад памостам з сур'ёзнай мінай трупа? Што заахвочвае яго да гневу?
Ён заклікае сябе да развагі, гладзячы рукой па лобе. Пасьля яму вялікую радасьць прынясе тое, што гэта яму ўдаецца. Цяпер ён крыху нагінаецца, і гэта таксама ўдаецца яму, і ён едзе і блукае рукой па цьвёрдай зямлі: ён намацвае і заваёўвае пальцамі купку друзу, голы круглы камень у друзе, разьедзеная дажджамі пушка запалак, якая вытыркаецца з друзу: так ён адваёўвае сьвет; тое, што ён намацвае і чуе, дапамагае яму адваяваць сьвет, які выйшаў зь яго галавы.
Яму пад дошкамі і балюча, і не балюча. Ён, не пацеючы, купаецца ў поце, нібыта нешта змушае яго не заставацца на месцы і не зьнерухомець, а рухацца і ісьці адсюль. Аднак ён заміраецца са сваёй бездапаможнасьцю дзякуючы таму, што ён разважае, альбо таму, што ён ашуквае сам сябе, робячы выгляд, быццам разважае. Але ён ня можа дапамагчы сабе і гэтай ашукай. Яго бесьперапынна перасьлядуе жаданьне пайсьці адсюль; ашука — гэта не адзіны шлях, якім можна пазбыцца

яго.
Ён спрабуе адно і другое; думка пра вэлясыпэд, які яму ўсё–такі давядзецца яшчэ весьці, спаралізоўвае ягоную волю. Ён спрабуе зьберці расьцярушаныя думкі разам; ён хацеў бы гаварыць а гаварыць; ён хацеў бы спытаць, ці другому гэтаксама кепска, як і яму; дзякуючы таму, што гаворыць, ён хацеў бы лучыць туды, куды ён ня можа дабрацца. Зь ім часта здараецца, што ён запаволена ўспрымае рэчы і ня можа ўлавіць іхнай існасьці; калі ён сутыкаецца зь імі, яны выкоўзваюцца ад яго, абараняюцца і акопваюцца за глухой сьцяной, празь якую ён ня можа ні ўслухвацца, ні ісьці; потым гэтыя рэчы самі раптам разбураюць сьцяну, паўстаюць і нападаюць на яго: да таго вада, якую ён намацваў, не была вадой, а словы, якія ён прамаўляў, ён прамаўляў ні да сябе, ні да людзей; аднак цяпер гэтыя рэчы захопліваюць яго самі і капітулююць перад ім, так што ён, хоць і пераадольвае сябе, яшчэ ня можа абараніцца ад іх, як нованароджаны.
Аднойчы ён бачыў, як нехта ішоў па дарозе.
Яго зьбіваюць з панталыку часы. Мінуўшчына, паўтарае ён для абароны афарызм, памерла.
Аднойчы ў нядзелю ён бачыў, як нехта ішоў па дарозе. У гэтым кірунку ён паехаў быў з бацькам, ім сустрэўся другі; хлопчык убачыў, што нагавіцы паміж нагамі гэтага нехта надзьмуваюцца і трапечуць. Яны паехалі ў мястэчка на брычцы. Аднак па дарозе назад ён усё яшчэ бачыў, як гэты чалавек ішоў там па дарозе ў сваіх надзьмуваных ветрам нагавіцах, і ён спытаўся ў бацькі, і бацька адказаў яму; бесьперапынна і няўхільна ішоў чалавек у тую нядзелю па зямлі. Цяпер ён думае, што ўсё гэта было б варта з кімсьці абмеркаваць: як чалавек няўхільна ідзе па зямлі, з трапяткімі, надзіманымі нагавіцамі паміж ног, і ён думае, што ён ня мог бы спыніцца, гаворачы, як людзі сяліліся і высяляліся, і як яны патроху прахаджаліся наўкола, і як іх надта займала, што там парабляюць другія, і што яму ад гэтага альбо разапрэ, альбо засушыць рот, і што нехта можа пра ўсё гаварыць так, як пра чалавека, які настойліва крочыць у сваіх надзьмуваных ветрам нагавіцах па зямлі.
Ён утаймоўвае брыклівыя думкі, вяртаючыся ў сучаснасьць. Дзе ён? Што ён мяркуе рабіць? Ён сурова асуджае сам сябе. У лістападзе ў гэты час ужо так цёмна, што нельга ўбачыць рукі перад вачыма; ён і цяпер ня бачыць рукі перад вачыма; скура

ягонай рукі з–за гарачыні пахне хрушчамі; вусенямі, пярэчыць ён сам сабе, сьвежымі, мокрымі вусенямі хрушча. У іншыя часы такі пах меў мех, альбо гэта быў пах талага сьнегу ў мяху, які ўзгадвае ён, альбо пах глею ад патанулага брата; і споўзлы з адхонаў пясок у пескавым кар'еры, дзе, як ён меркаваў, былі браты, калі ён тады іх шукаў, таксама меў падобны пах на рыючых руках.

Ён глыбака задумаўся, ён ня можа выцягнуць сябе з сваіх думак за ўласныя валасы. Раз, яшчэ раз ён злавіў сябе на тым, што ўбачыў, як зьнізу па дарозе ішла наверх і спынілася маці. Ягоная маці ўзышла ўверх па дарозе і спынілася. Не. Толькі пазьней яна стала і засталася стаяць, як стаяла. Пасьля гэтага яна, з кошыкам, напоўненым да верху травой перад сабой, крочыла сьпярша здалёк цяжкім, хапатлівым крокам, быццам пераступаючы на месцы перад ягонымі пільнымі вачыма за разнымі парэнчамі, але потым, паменшаная адлегласьцю, быццам вызваліўшыся ад клейкай, засмоктвальнай ліпучкі гарызонту і набліжаючыся зь нямаючага аб'ёму задняга пляну, яна цяпер сваімі больш выразнымі крокамі яўна перамагала прастору, будучы зьнянацку засьпетая маланкай спасярод чыстага неба, удараная громам, адцягнутая назад вяроўкай, так што ён болей ня верыў уласным вачам. Адным махам паветра ператварылася ў лёд і замарозіла маці. Ён задумваецца аб рухах паўсядзённага ўжытку і пералічвае іх; ніводзін зь іх тады не датычыў жанчыны: яна не выстаўляла нагі наперад і не апускала кошык на калена, каб адпачыць, хутчэй, кошык ні на сантымэтру ня споўз зь яе выгнутага наперад цела. Перад гэтым яна якраз расхінула хустку і патрэсла галавой, магчыма, адганяла з твару муху: у гэтым вар'яцкім руху яна і скамянела. Ён ня стаў гукаць да яе: поўны цікавасьці, ён прысьвяціў вочы таму, як стаяла і спынілася маці. У яго было такое адчуваньне, быццам страх альбо ўзрушаньне ўсё больш надзьмувалі жанчыну і нарэшце афарбавалі яе ў чорны колер. Якая небясьпека магла там паставіць пад пагрозу маці? Ці яна пачула нешта згубнае? Ці, можа, нешта ўбачыла? Час тады ў асноўным апісваюць, як мірны, хоць людзі, як кажуць, і зайздросьцілі адзін другому з–за кавалка хлеба, бо часта сядзелі бяз працы; нягледзячы на гэта, гавораць, што яны амаль без законаў і судзьдзяў ужываліся адзін з другім так, больш–менш; некаторыя мелі на пракорм за кошт мёду, які капаў з

скальнага дубу.
Колькі разоў ягоныя павекі ўвільгатнілі вочы, перш як маці нарэшце зноў падняла кош і прайшлася тварам па крузе перад чымсьці такім, што ён ня мог успрыняць? Тады, успамінае ён, яна насіла пад сэрцам ягонага брата. Што так узрушыла маці на гэтым мірным шляху? Чаму яна тады была сьведкай? Якая жамярына прымусіла яе застыць, ідучы?
Ён кратае пушку ў друзе. Зь ёй ён можа забаўляцца, пакуль да яго ня вернуцца сілы. Некаторыя валакуцца і ідуць міма па дарозе; некаторыя яго сардэчна вітаюць, у той час як ён сядзіць там пад памостам, іншыя старанна не заўважаюць; аднак ніхто не падыдзе да яго і, скажам, ня схіліцца да яго ў добрым гуморы, і не раскрые для пытаньня рот. Многія выкарыстоўваюць блізкі ўжо вечар, калі паветра зноў стане чыстым, каб адпачыць ад нэндзы дня. Усе ўхваляюць тое, што ён сядзіць пад аполкамі: ім здаецца, што гэта ягонае сталае месца. Па набухаючых гуках ён распазнае набяганьне імклівых аўтамабіляў; у адным ён чуе выцьцё сабакі. Ён прызвычаіўся да гэтага. Гэта гук тормаза; гэта гук ручкі, якой апускаюць уніз шыбу. Можа быць, можа ня быць, зацята думае ён у сваёй засадзе; ён уціскваецца ў суплёты распорак і глыбака засоўвае рукі паміж каленяў, каб яго не заўважылі. Але гэта толькі апісаная жонка ўладальніка аўтамабіля, якая сьпярша адным голасам на чым сьвет стаіць крые сабаку, а другім ціхамірна пытаецца, як маюцца бацькі. Ён аказваецца карысным, даючы з свайго прытулку даведку, што ягоныя бацькі, відаць, робяць цяпер праходку на сьвежым паветры. Супольна з сваім мужам яна шкадуе, што няма магчымасьці пабыць разам; халоднае разьвітаньне; гэтая жанчына раней не эканоміла сваю прыхільнасьць.
Між тым ён яе ня ведае; яму прыходзіць на розум, што і мужчыну ён ня ведае. Як змог ён адказаць ім нешта разумнае? Ён тут у недасьледаваным раёне. Ён на чужыне. Сорам з–за таго, што яму не хапае гонару, і цэнтрабежная сіла да ягонага здранцьвеньня сярод распорак памосту падымаюць яго і трымаюць на нагах, якія больш яму не належаць. У адно імгненьне ён знайшоў вэлясыпэд.
Пералічваючы сам сабе прынцыпы, якія могуць яму дапамагчы рухацца наперад, ён зноў падганяе сябе да пасьпеху. Яму застаўся толькі кароткі адрэзак шляху. Між тым думкі зноў і

зноў сьпяшаюцца папарадзе крокаў. Ён бачыць сваё цела, распасьцёртае, бы мёртвае, на ложку. Вечарам нельга ведаць, ці прачнешся ранкам. Ён узгадвае рэлігійнае павучаньне і выкладаньне павучаньня самім павучальным: нічога не падазраючы, аднойчы бацька чатырох дзяцей сядзеў якраз у гэтай мясцовасьці ў добрым настроі ды здароўі за вячэрай; але ранкам дзеці не знайшлі яго болей сярод жывых; кожнага(!) можа напаткаць такі лёс, які напаткаў яго. Увечары пасьля павучаньня ён гарэў агнём на сваім ложку і ад страху выядаў з коўдры лямцаватае пер'е; валасы стаялі яму дыбарам, і кожны паасобку калоў скуру на галаве.
Нягледзячы на гэта, ён мог цяпер уздыхнуць з палёгкай; чужыя ногі служаць яму. Ён мог бы, каб. Ён больш не арыентуецца ў замежнай мове. Як за сваімі ценямі, сочыць ён за словамі, якія праходзяць празь яго, не разумеючы ні аднаго; ён спрабуе ўтаймаваць іх, лагодна прагаворваючы іх сам сабе і правяраючы гукі на іхную знаёмасьць; аднак яны гучаць у ягонай галаве так бессэнсоўна, што ён кідае гэта; для ўцёкаў слоў ён сам сабе ўжывае параўнаньне з уцёкамі пацукоў. Пасьля дажджыстай ночы на дарозе ляжаць мёртвыя жабы. Ён убівае сабе гэты сказ у галаву і адцясьняе ім другія словы. Іншым разам ён сумняецца, ці гэтта пад ягонымі нагамі жаба альбо разьеханае гаўно. У сьвяточныя дні дарожны рабочы з сваёй шуфляй адпачывае; ужо на наступны дзень будзе цяжка адшкрабаць засохлых жабаў ад асфальту і пагрузіць у тачку. Ноччу яны бачныя, калі яны ў сьвятле фараў няўклюднымі скачкамі, якія ім дала ў дарогу прырода, сьпяшаюцца цераз дарогу, якая для незьлічонай колькасьці жабаў ня мае болей другога берага. Іхная пастава, калі яны, распляжаныя, валяюцца тут і там, з распырсканымі і выдушанымі кішкамі, падобная да паставы альпініста на вэртыкальнай строме. Правая рука чалавека на шматлікіх выявах зачэпленая зьверху за шчыліну ў скале, левая рука, наўскась ад правай, шукае апірышча для цела, асунута ў каленях; адна нага крыху сагнутая і падцягнутая да жывата; другая нага вольна ступае ў паветра над асфальтам, які фара блізкага ўжо аўтамабіля пасьля дажджу робіць зіхоткім і бяздонным. Сьцяна стромкая; дарога вэртыкальная. Чалавек яшчэ вісіць на скале; рука напампоўвае і выпампоўвае вузлаватую шыю; у сваёй безвыходнасьці ён выбівае мыском чаравіка з скалы гнілы

камень, які палохае сьпячых птушак, так што яны кеўкаючы і каркаючы ўздымаюцца з сваіх нор у скалах. Калі потым яго вылавяць наступныя фары, ён цягнецца ўсім целам і выдае вузлаватым ротам немы крык як знак таго, што зь ім робіцца. Ідучы з сваім вэлясыпэдам, за гэтымі думкамі ён ловіць сябе на другіх, якія яму не да твару. Гэта не ягоная задача — аблайваць натуральны ход рэчаў так, што ад яго ўцякае вэлясыпэд.
Ён дапасоўвае крокі да скачкоў і пасьпеху ўцякаючых словаў. Часьцей за ўсё, думае ён сам сабе, на дарогу гарачымі днямі высыпаюць травяныя казельчыкі. Хоць драўлянае сакатаньне і шкрабатаньне іхных крылаў не палохае яго болей, ён ня можа выбіць сабе з галавы жаданьня паразважаць, чаму яны выконваюць гэтыя законы; раптам на яго наплывае ўспамін пра кашападобныя зялёныя купіны распляжаных казельчыкаў; затаптаныя ў дарогу раздушаныя галовы і не пашкоджаныя бухматыя заднія часткі перад імі падбухторваюць яго на сьвятое справядлівае шаленства, якое коле яму ў бок і балюча б'е па дыяфрагме, як пасьля доўгага "распружваючага" рогату. Павеў ветру ад аўтамабіля ажыўляе скурчаныя целы зьвяркоў, казельчыкаў і пляскатыя целы жабаў, выпроставе іх і ўсяляе ў іх дух; тыя, якія не прыклеіліся сваім сокам альбо мясам да дарогі, тузінамі імчацца, сунуцца, куляюцца і з шолахам даганяюць адзін аднаго ў віраваньні струмянёў засмоктваючага паветра за аўтамабілем.
Хіба што, разважае ён, ад шуму аўтамабіляў ён можа агарнуць слыхам усю мясцовасьць, празь якую ідзе. Аб парэнчы маленькага мастка цераз невялікі ручай спаміж тоўстымі жэрдкамі парэнчаў шум ветра ад руху аўтамабіля і выкіданае аўтамабілем паветра пераламляюцца да грукатаньня трактара, які ўзьяжджае на пагорак. Дамамі ля дарогі шум звужаецца, адшліфоўваецца і зноў выслабаняецца; гэтаксама, думае ён далей, шум вады паміж дзьвюма скаламі адрозьніваецца ад шуму ў расшыраным рэчышчы гэтай вады пасьля скальнае цясьніны.
Ён бароніцца ад скачкоў сваіх разважаньняў.
Такім чынам, па шуме аўтамабіля чалавек можа распазнаць, кажа ён сабе, ідзе ён мясцовасьцю паміж дзьвюма сьценамі дамоў альбо няўробленым полем. Ён мог бы таксама з дапамогай адно толькі слыху адрозьніваць драўляныя пабудовы, такія, як гумны і памосты для малочнай тары, ад

мураваных жылых памяшканьняў; у горадзе вуліцы гучаць інакш, чым у вёсцы. Калі ён адмовіцца ад дапамогі аўтамабільных гукаў, то давядзецца думаць таксама пра тое, а што калі аўтамабілям з–за ўвядзеньня надзвычайнага становішча альбо ўведзеным у выніку надзвычайнага выпадка правам будзе забаронена альбо яшчэ неяк іначай немагчыма рухацца грамадзкімі шляхамі зносінаў: у гэтым выпадку для йдучага прыдаліся б уласныя крокі. Гэта спрацуе і выканае сваю мэту, калі паветра халоднае і добра перадае шумы, і тады ён зможа ўлавіць слыхам ваколіцу дзякуючы рэху і абмежаваньню шумоў. Іначай будзе гэта ў такі дзень, як гэты, у які гукі з–за сьпёкі даходзяць да ягонага слыху як скрозь сон; ён ня можа назваць з пэўнасьцю ніводзін з шумоў; а паколькі ён яшчэ да таго згубіў з–пад чужых ног дарогу, ён ня ў стане сказаць, куды ён рухаецца. Ідзе ён па шашы альбо па гравейцы, праз горад альбо празь вёску, ідзе ён полем альбо па замкнёнай прасторы населенага пункту, босы альбо ў запыленых чаравіках, ён ідзе, дзе ён думае, што ідзе; дзеля гэтага ён ідзе, не разьбіраючы дарогі.

Гэтая развага заблытвае ягоны твар і зьбівае з рытму хады ногі, так што ён абапёрты адно на гэты вэлясыпэд, які яму цяпер даспадобы. Увесь час, ужо ідучы, ён патайно і крадком праклінаў у сабе брата і раззлавана дакараў яго за ягоныя благія ўчынкі. Нядоўга давялося чакаць, і ён страціў магчымасьць адрозьніваць сваё ад чужога: ногі пад ім пайшлі далей, пальцы закінулі на плячо марацкую кайстру, вусны шапталі чужыя словы; ён узяўся ўпэўніваць сябе, што ягоны твар больш ніколі ня будзе скалечаны сьлепатой, што ён стаўся відушчым. Яго апанавала ганарлівасьць, ён развашэціўся і непамерна ўзвысіў сваю пыху, так што ён цяпер ня можа ні ўперад, ні назад; ён нават сам сябе ўсур'ёз прыцягвае да адказнасьці, нэрвова кратаючы хісткі руль вэлясыпэда.

Дык ён кажа.

Ягоны брат сказаў.

Потым ён ня чуе болей, каб хто–небудзь мінаў яго і што–небудзь гаварыў. Па розных прыкметах ён заўважае, што знаходзіцца на дарозе дадому; сам таго ня ведаючы, дзякуючы таму, што вэлясыпэд вывернуў убок, ён патрапіў на дарогу дахаты. З калідору пільны позірк мог бы праз разныя парэнчы лёгка пацэліць на яго. Да якога дому ён кіруецца? Ён ідзе да

дому свайго бацькі, якому кадастравая кніга згодна з адпаведнай велічынёй унёску гарантуе грамадзкі давер да ягонага права як уладальніка нерухомасьці; сын зноў–такі адпаведна нараджэньню валодае правам прайсьці гэтай прыватнай дарогай празь нечую зямлю. Сагнуўшыся над вэлясыпэдам, ён валачэцца зямельнымі ўгодзьдзямі свайго бацькі. Ключ ад уваходных дзьвярэй, напэўна, у кішэні. Аднак ён адводзіць пальцы ад кішэні; унутры, калі ён засуне іх туды, будзе ключ, які яму працягнула жанчына ў аўтамабілі. Ён трымае каля сябе тое, чаго баіцца; ён не дае волі занадта пасьпешным пальцам. Калі ён усё яшчэ нічога ня чуе, ён пачынае не давяраць свайму слыху. Ён трасе галавой, аднак шумы ані не мяняюцца. Пры небясьпецы найпершае, што ён мог бы зрабіць, дык гэта прыгнуцца за вэлясыпэдам.
Калі перастае ісьці сьнег, ён асучасьнівае для сябе гэтую гісторыю, крыкі ў таго, хто крычыць, замярзаюць на языку. Ён тады блукаў дзень да самага вечара ў глушэчы па сьнезе і, крычучы ды азіраючыся, шукаў зьніклага брата.
Ён пералічвае месцы, у якіх быў: іх так шмат, што назовы таюць у ягонай памяці: Сьвятаянаўка пры дарозе, Сьвятакасьмінаўка–і–Дам'янаўка ў ценю.
Ён паскарае хаду.
Нічога не чуваць.
Ён пачынае бегчы з вэлясыпэдам.
У той самы вечар, у які ён тады асьлеп, брат, згодна з апісаньнем, прыйшоў дахаты. Гэта была субота. У народзе, узгадвае ён, захаваўся звычай замятаць у гэты дзень падворак перад будынкамі. Але тады ішоў сьнег. Такая перашкода пазбаўляе звычай сілы. Да таго ж чалавек можа выдумаць падзею, якая прынясе жыхаром дому больш клопатаў, чым падмятаньне падворку. Вось, кажуць, ягоны брат цемрай вярнуўся дахаты і вымеў звонку сьнег з падворку. Паколькі ўва ўсіх жылых пакоях гучна галасілі па другім, патанулым браце, ніхто з галашэньнікаў не заўважыў, што ён вярнуўся. Гэта быў бацька, хто яшчэ з дарогі, якою ён падымаўся, пачуў цяжкае ляпаньне веніка. Чалавек пайшоў зь мястэчка альбо зь якога–небудзь другога месца дахаты; пазьней, калі ён быў да бяспамяцтва п'яны, расказваў ён, ён адразу пазнаў зьніклага сына. Цяпер сьляпы раздумвае і ламае сабе галаву, як чалавек мог пазнаць ў гэтай цемрадзі брата, які павярнуў назад. Нічога,

апроч сьнегу, не магло сьвяціцца на падворку. Сьвятло з залі, у якую набіліся бабы, што маліліся, асьвятляе апору лініі электраперадачы; сьвятло з пакойчыка сястры хоць і выходзіць у кірунку дарогі, па якой рухаецца далей бацька, аднак гэтым сьвятлом цемра пад сьвятлом бадай што яшчэ больш адцяняецца: падворак, які замятае брат, знаходзіцца якраз пад асьветленым акном сястры, так што гэты сьветлавы фон, у які, як у ваду, падае сьнег, для вачэй непераадольны і чорны. Брат стаіць ля сьцяны хлява. Па сьвежаапалым сьнезе, на якім ужо застылі шнарамі сьляды баб, рыпяць бацькавы крокі. Спачатку сын застывае ў сваім руху. Сьляпы думае, што ён трымаецца рукой за венік глыбака зьнізу, каля месца, дзе пруткі разыходзяцца. Ягоны твар застыў ад бруду двух дзён, калі ён, хаваючыся, беспрытульна сноўдаў па хмызох і балотах. Сьляпога займае думка, хто зь іх абодвух убачыў другога першым. У гэты час, згодна з апісаньнем бацькі і сястры, ваенная машына, паварочваючы, выяжджае на дарогу на ўзгорак да дому, у якім, як зноў–такі верагодна вынікае з блытаных уласных дадзеных і сьведчаньня аднаго местачкоўца, мае месца жыхарства на гэты час ужо прыбіты сьлепатой дзяцюк. Сьвятло фар, напэўна, вагаецца туды–сюды, кружляючы падворкам і вышэй муроў і вокнаў. Так хлопчыка зь венікам асьляпляе, і ён ня можа пазнаць бацьку, што стаіць далей; бацька ж наадварот ужо зь першага позірку ўпэўніваецца ў тым, што сын вярнуўся. Бацька на самай рэчы так апісваў развой і хаду падзеяў. Здалёк сьвятло фар заслабое, каб выразна адбіваць яшчэ бясформавыя і безаблічныя цені сукоў і галінаў паміж сабой і мурам на асьветленым муры; гэтае бляклае, непрыкметнае згушчэньне на муры — толькі цень ценю, які яшчэ будзе; потым, калі колы джыпу прарываюцца скрозь сьнег, з ростам сілы сьвятла на муры і перашкоды на шляху гэтага сьвятла ўсё больш рэзка і павялічана ўрэзваюцца ў вапну; цені перашкодаў нарэшце становяцца вышэйшымі за самі перашкоды. Калі глядзець з дарогі, то дрэвы яшчэ былі ва ўладзе праменьня; аднак чым бліжэй прасоўваецца аўтамабіль наперад, тым вышэй бягуць па сьветлавым палатне галіны дрэваў; іхны адбітак на муры расьцягваецца і, калі аўтамабіль праяжджае пад галінамі, зноў зацягваецца цемрай над дарогай. На мур праектуецца толькі тое, што стаіць на шляху праменьня: адбітак чалавека, які ўсё

яшчэ не крануўся зь месца, адкідваецца ўверх і размазваецца па сьцяне дому; а вось адбітак хлопчыка моршчыцца і дрыжыць, бо ён стаіць блізка ля мура, можа нават каля дзьвярэй хлява, у дрыжаньні сьвятла, такім чынам, што адлюстраваны з–за ўсё большай канцэнтрацыі сьветлавой плыні прымацоўваецца да сьцяны сваім ценем і, нарэшце, калі сьвятло глытае ягоны адбітак, бязь ценю сьціскаецца.

Калі ён угледзеў сына, бацьку, кажуць, апанавала ўзрушэньне, якое прымусіла яго засунуць рукі пад пінжак і ў кішэні. Ён ня можа болей стаяць тут, не адкрываючы рота і ня ведаючы, куды падзець пальцы: вось жа, ён рукамі, схаванымі ў кішэні і сьціснутымі ў кулакі, расьцягвае нагавіцы, неспакойна водзіць галавой і трасе нагавіцы, быццам згубіў пасок; ён рухаецца хаатычна і бязладна, каб вызваліцца з свайго недасяжнага далёкага далёка ад другога; таму што, так скажа ён пазьней, напіўшыся іншымі словамі, яму горка бачыць там сына. Альбо гэта так, што хоць ніхто і не адводзіць вачэй, але яны між тым і не глядзяць адзін на аднаго, альбо так, што бацька пазьбягае глядзець другому ў вочы і надта старанна рыецца ў кішэнях, каб, перакульваючы ў іх наверх тое, што ляжыць на самым сподзе, ён мог успрымаць падзеі, якія адбываюцца навокал. Ніхто ня робіць нічога падобнага.

Той, рукамі якога водзіць звычка, думае між тым сьляпы, з тым здараецца, што бегу звычкі замінае выпадак і, палохаючы яго, прымушае яго ўсьведаміць свае шукаючыя пальцы; апошнія, калі ня знойдуць ў кішані тое, на што яны ўжо настроіліся безь ягонага ведама, будуць шакаваныя выпадкам як ударам току; пасьля гэтага рухі рук будуць прагнымі і пасьпешлівымі; пальцы будуць дзіка сплятацца адзін з другім; стрыманы твар стане нястрыманым. Аднак ён яшчэ раз адмахнецца ад свайго прадчуваньня. Апрача таго, акно ягонага пакоя адчыненае, так што яму будзе лёгка абысьці вакол дому і падняцца ззаду па кладзе дроваў; ровар ён на хаду прыхіне да гумна; тады яму трэба яшчэ зьвярнуць увагу на ямку для вапны пад акном: дошкі маглі спаўзьці. Калі ён закрые аканіцы, зь ім далей ужо нічога ня зьдзеецца.

Між тым ён не заўважыў аўтамабіля, які пад'ехаў ужо так блізка, што чалавек хоцькі–няхоцькі змушаны быў даць яму дарогу. Колы разрываюць зрокавы кантакт паміж бацькам і сынам. Дарма што мужчына праславіўся тым, што выказваецца

пры дапамозе ўсім вядомых праклёнаў і жэстаў, ён нападпітку называе рэчы сваімі ймёнамі: калі наперадзе яго едзе аўтамабіль, так апавядае ён, яго поўніцай апаноўвае страшнае гора, пяршыць у горле і стварае ў ягоным страўніку вялікі голад, які ён можа спагнаць толькі тым, што згарне даланёй з слупка побач з сабой купку сьнегу і прагна заглыбіць у яго зубы; жэстамі, абараняе п'яны бацька сваю гісторыю, нельга ўсё растлумачыць.

Так што чалавек, які вярнуўся зь мястэчка альбо яшчэ аднекуль, стаіць там, там стаіць брат зь венікам, сам ён, які абдумвае гэта, стаіць тут; тут стаіць аўтамабіль, у якім ён ляжаў тады, і толькі яму вядома, як ён уяўляе сабе падрабязнасьці. Ён зноў непрытомны, ляжыць расьцягнуўшыся на насілках. Жэсты, якімі суправаджаецца няшчасьце, апісваюцца так: жанчыны пляскаюць над галовамі ў далоні, мужчыны, калі яны сядзяць роўна, абапіраюць локці на калені і хаваюць твар у далоні. Але калі яны стаяць, то яны імкнуцца моўчкі адыходзіць убок, дзе іх ніхто ня можа бачыць, альбо заставацца ў скамянелай паставе на сваім ранейшым месцы. Цемрадзь спрыяе — мужчына можа выкарыстаць яе, каб моцна прыціснуць кулакі да лоба; падае сьнег і павялічвае ягонае гора; Фармальнасьці суправаджальнікаў грузу перад бязладзьдзем няшчасьця даюць між тым чалавеку час, каб прыйсьці ў сябе; наадварот, некаторыя шумы і пахі абцяжваюць ягоны дзіўны стан і неяк робяць яго няшчасным: шапаценьне сечкі паміж зубамі ў кароў, віскатаньне і румзаньне ад галосячых баб, смак сьнегу на паднябеньні, перамешаны зь вінным перагарам з страўніка, шум каня ў стайні, які пад час паведамленьня жаўнераў пачынае зь сіпеньнем, пырсканьнем і хляпаньнем сікаць: усё гэта на нейкі час прылагоджвае на чалавеку міны і жэсты няшчасьця. Але потым чалавек не вытрымлівае свайго недарэчнага, амаль вясёлага спакою і раптам загадвае каню ў стайні спыніць сваё працяглае задавальненьне патрэбы; праўда, не пасьпеўшы гэта зрабіць, так кажа ён сам сабе потым, ён валей даў бы яму па мызе. Замест гэтага ён пасылае жаўнераў, якія з насілкамі ў руках пераступаюць з адной нагі на другую, і зьбянтэжана пераглядаюцца ў адказ на ягоны злосны крык, перакідваючыся некалькімі манатоннымі словамі, праз адчыненыя дзьверы ў дом, у той час як ён паказвае ім, бясконца абіваючы сьнег з

чаравікаў, дарогу праз калідор у пакой, ня кідаючы, аднак, да сыноў, ні да таго ля сьцяны хлява, ні да асьлеплага на ягоных насілках, ніводнага слова, так што гэтае кола пасьля таго, як усе увойдуць у дом, цяпер можа замкнуцца.
Другое кола яшчэ не замкнулася. Сьляпы яшчэ нават не пачаў цягнуць яго крок за крокам вакол будынка. У яго ўсё яшчэ ня можа выйсьці з галавы, чаму ў яго прапаў ключ. Ён адчувае сябе так, быццам зямля пасьля яе доўгага звароту, пад час якога да яго тады цераз падворак падкацілася машына з двума нетутэйшымі мужчынамі і трупам ягонага брата, дайшла цяпер да сваёй мёртвай кропкі і вокамгненна запыніла яго ў той момант, калі ён, нічога не прадчуваючы, зрабіў рух; але ў той час як ён цяпер сам працягвае рух, рэзка спрабуючы пазбыцца зьнерухомленасьці і выпіхваючы перад сабой вэлясыпэд, ён зноў пачуваецца так, быццам ён упершыню пасьля гэтага доўгага часу пайшоў на ўласных нагах і ўпершыню павінен, каб захаваць гэты рух, сьвядома ўжыць для таго, каб ісьці, волю: ён прымусіў сябе зьбегчы з вэлясыпэдам з пагорку, на роўнядзі далавах яму трэба ўжо самому націскаць на панажы.
Будынак знаходзіцца ў найглыбейшым спакоі. І куры не парушаюць ягонага кола. Ён імчыцца з грукатлівым вэлясыпэдам у кірунку, дзе, як ён мяркуе, знаходзіцца сьвіран. Прыхінуць вэлясыпэд да дошак і бегчы далей, гэта першае; другое, гэта цяпер рукамі і нагамі абараніцца ад звар'яценьня. Гэта калодзеж каля сьцяны хлява. Гэта ён называе рогам дому. У правым закутку ідзе далей другая сьцяна, уздоўж якой ён паўзе ўсімі сваімі канечнасьцямі. Ускаламучаны і прыбіты, ён рухаецца ля мура і дошак тока. Гэта на ягоных руках крэйда. Гэта на зямлі сьвіное шчаціньне і пасмы абрэзаных жаночых валасоў. Ён спадае на карачкі. Яму нельга забывацца на яму для вапны. Бацька і бацькава жонка лётаюць, высільваючыся, дзесьці разложыстай ваколіцай. Ён хоча прытуліцца сьпінай да мура і адкрыцца ім; ён хацеў бы паказаць, што ён тут; да таго ж, калі ён абароніцца мурам, ніхто і нішто ня здолее напасьці на яго ззаду.
Ён навастрае слых: нічога ня бачна. Яму карціць схавацца. Поле пахілае, думае ён. Гарызонт спакойны. Пасьля сьпякотнага дня вечар абяцае быць халаднейшым. Заўтра ў гэты час, думае ён, ён будзе дзесьці ў другім месцы. Гэта яма для вапны. Ён можа яе абысьці, залезшы на складанку. Яна складзеная так, што ён

можа ставіць ногі ў шчыліны паміж паленамі. Ён зачапляецца рукамі зьверху, каб сягнуць на толь. Цяпер зусім лёгка будзе закінуць сьледам другую нагу, падняць на толь калена і падцягнуць на руках, якія ўжо мацаюць кант падваконьня, засталую частку цела. Ён аднойчы шукаў зьніклага брата. Цяпер ён, высілены, ляжыць на складанцы дроў перад расчыненым акном. Месца, дрэнна прыдатнае для прамовы; да таго ж ён ляжыць, як мех, на жываце. Ён вінаваціць стому, якая з–за нагрэтай толі пагражае чысьціні ягонай вопраткі. Ён падымаецца. Ён сядае. Ён думае. “Нішто не паказвае на што–небудзь”. Ён сядзіць на складанцы, нахінуўшы галаву, правая рука на левым плячы. Пад вечар, думае ён, усходзіцца вецер і выклікае ў паветры сотні шумоў, розных у залежнасьці ад тэмы ветру. Калі напярэдадні ўночы ішоў дождж, то пазьней сьляды людзей, якія ішлі, прысохнуць на дарогах. Пыл, сухі пасьля дажджу, руды і гарэлы; ён крышыцца паміж босымі пальцамі тых, хто па ім ідзе.

Другім ранкам, калі яшчэ адно сьвітала, ён ішоў па густым белым пыле. Колер пылу, прыходзіць яму на розум, як і колер вады, часам стасуецца з колерам неба; іншым разам неба выглядае пакрытым пылам і пыльным. Асобныя кроплі яшчэ ня грымнулага дажджу выбіваюць у дарожным пыле шнары–восьпіны. Аднак калі ўпала шмат кропель, то з дарогі вылузваюцца круглыя гарбатыя камяні і зырка зіхцяць, у той час як пыл на дарозе яшчэ выглядае сухім. Табе прыемна ісьці тут.

Ён заглыбляецца ў сябе. На шчасьце, акно адчыненае. Востры і калючы боль працінае ягоныя вушы. Нічога не відаць. Ён шчэрыць зубы і доўга ўслухваецца вакол сябе. Кроў клякоча ў ягоным целе. Выстаяўшы, ён давядзе сваю сьмеласьць. Потым яго так падкідвае ад страху, што ён ляскае зубамі. І яшчэ нічога не чуваць. Яму цяжка дыхаць. Ён дапамагае сабе тым, што дыхае павярхоўна і похапкам, як сабака. Ён, мабыць, скочыў, думае ён. Сказы, якія ён думае, пакутуюць ад ягонай дыхальнай недастатковасьці. Ён скача. Ён скочыў у пакой. Гэта цьвёрдая падлога. Вось мыцельнік. Вось акно, якое цяпер зачыненае. Моцна зачыненае акно.

Калісьці даўно ён ішоў басанож па пыле. Аднойчы ён ішоў. Ён ішоў. Ён ідзе. Ягоны бацька гробся трысьнягамі. Ягоны брат бег па сьнезе праз поле і пераскочыў назад цераз драцяную

агароджу. Ягоны брат прыехаў на машыне. Ён стрымгалоў кідаецца на ложак. Ён скручваецца. Ён перавальваецца. Ён дрыжыць. Ён падымае рукі, быццам ён хоча паляцець. Ён круціцца, як ваўчок. Ён скавыча. Ён расьцягваецца.
Ён страціў прытомнасьць.
Ён сьніць сон наяве. Ён бяжыць дарогай, гразкай яшчэ ад дажджу. Ногі лёгка нясуць яго. Ён бяжыць так хутка, як толькі можа, ягоная галава апушчана, рукі матляюцца на ўзроўні ног. Гразь, перш як зноў запоўніць ягоны сьлед вадой, пазяхае і ўздыхае ўсьлед за ягонымі крокамі. Ён уцякае. Ён ня ведае, чаму ўцякае, і бегучы ён пытаецца ў сябе, які прымус гоніць яго. Ён не ўсьведамляе, што зрабіў нешта, што падлягае пакараньню. Аднак пакуль ён бяжыць, да яго даходзіць, што за прагалінай на яго чакае брат; ён уцёк яшчэ раней, манячыся спаткаць яго там. Ён успрымае вестку на бягу, не дзівуючыся; ён нават яшчэ паддае хуткасьці; ён чуе галасы, якія абмяркоўваюць ягоныя паводзіны і выражаюць сваю заклапочанасьць. Яму зноў чуецца, што гэта легкадумна — не хаваць ад перасьледаваньнікаў сваіх сьлядоў; усё яшчэ бегучы, ён аглядваецца на іх праз адно, другое плячо і перакошаным тварам бачыць у балотнай гразі сьляды, якія ён дакладна накрывае за сабой сваімі нагамі. Тут ён разумее, што выдасьць браташу схованку, і гэта, пакуль ён бяжыць, ад гора ледзь ня робіць яго вар'ятам. Яшчэ раз на ягоным шляху ён чуе, што ўся ваколіца пастаўленая на ногі з–за ўцёкаў; ужо прыведзенае ў гатовасьць войска, выдаюцца надзвычайныя ўказы, ультыматум, як сказалі, ужо быў перададзены; дзеля міру няхай ён здасца. Гэта вельмі зьдзіўляе ўцекача. Да гэтага часу час і надвор'е заставаліся для яго чужымі, але пасьля гэтай весткі яны становяцца яму важнымі, і ён задыхана пытаецца пра іх, зацята бегучы далей. Яму адкрываецца, што хоць на зямлі надвор'е пахмурае, але за хмарамі відаль выдатная. Хутка набліжаецца прагаліна. З гучнагаварыцеляў трансьлюецца спэцыяльнае паведамленьне, якое яму, аднак, з–за шчоўканьня — ён ня ведае, у апаратах альбо ў ягоных вушах — ня цалкам зразумелае; ён разумее толькі шматлікія пытальнікі ў сказах і выклічнік у канцы, які воклічам нэўтралізуе пытальнікі. Гэта прагаліна: высокія вэеры папараці і надцятая трава зь зязюльчынай сьлінай, усё меншыя і радчэйшыя хвойкі і яліны; зьлева, атрымлівае ён вестку, будзе

ісьці папарацямі, пальцамі абрываючы галоўкі травы, брат. Ён спыняецца і глядзіць у азначаным кірунку. На працягу ўсяго свайго жыцьця ён думаў, што нікога ня бачыў. Цупкая трава ў руцэ рэжа яму пальцы. Яму загадваюць падняць галаву; ён знаходзіць цудоўным тое, што той, хто падняў галаву, гэта *ён.* Ён глядзіць перад сабой на ладны абсяг: не падымаючы галавы вышэй, ён бачыць гарызонт, а неба такое нізкае, што яно проста ўпіхвае гледача ў траву. Потым ён бачыць, як зь мяжы небасягу выныраюць малыя хмаркі, чароды, раі, эскадры і гурмы хмараў, і голас кажа яму, што неба выцьвілае, а колер хмараў бляклы; трава на гэтым прасьцягу нібыта колеру выцьвілага неба. Што азначае гэтае гудзеньне, хоча ён яшчэ запытацца; аднак пасярэдзіне ягоных словаў праз гучнагаварыцелі ўкліньваецца вестка аб абвяшчэньні вайны. Ён нахінаецца і глядзіць на гэтае неба, якое, думае, ён нюхае, каштуе і адчувае навобмацак: яно пахне бэнзынай з выкідных газаў, мае смак пратухлага малака, на дотык яно гарачае, бы вада, у якую ён, нічога не падазраючы, засоўвае руку. Маленькія хмары, якія праносяцца па ўсім небе, гэта бамбавікі. Тут, у гэтай прасторы, словы маглі б у яго цяпер закончыцца і стаць бессэнсоўнымі; яму варта толькі прамаўляць складамі і гукамі альбо галасамі зьвяроў; яму варта, не губляючы раўнавагі, гаварыць толькі пра адну драбніцу: нягледзечы на гэта ягоны голас, калі б ён толькі выйшаў у яго з рота, грымнуўся б у гэтую ўжо даўно і старанна выкапаную шахту, якая зробіць гучным і значным усё тое, што б ён цяпер ні прамовіў; яму нават трэба гаварыць толькі пра тое, што драты лініі электраперадачы, хіба пасьля рамонту на электрастанцыі, раптам зноў пачалі зласьліва гусьці, хоць нікога зь іхных слухачоў гэта ня можа закрануць; яму трэба толькі адкрываць рот і прамаўляць. Прастора, у якой ён гаворыць, адказвае рэхам.

Аднойчы ён сасьніў ня што іншае, як прыраўнаньне. Ягоны брат сьмяецца так, нібыта з поўнай жмені на бэтон звонка падаюць зярняты кукурузы; потым курыныя дзюбы ўперамешку кідаюцца дзяўбсьці гэтыя зярняты.

Шэршні

Ня трэба паказваць, што ты ідзеш пыльнай дарогай. Назіральнікам няма патрэбы ведаць пра асаблівасьці дарогі. Даволі будзе таго, што яны ўбачаць, што ідзеш Ты. І што горача, няма патрэбы паказваць. Ты павінен адно зважаць на тое, падыходзіць так, каб гледачы меркавалі, што Ты не кагадзе пачаў ісьці, а рухаешся ўжо даўно, бо Ты ўжо на падыходзе. Ты падыходзіш так, быццам Ты падыходзіш не да гэтага пэўнага мястэчка, а да нейкага такога, якое падобнае да ўсіх другіх мястэчкаў, празь якія Ты прайшоў. Мястэчка, якога Ты дасягнеш і ў якім Ты зьявішся гледачам, не адрозьніваецца ад другіх мястэчкаў. Ты не ўваходзіш, Ты не ступаеш на сцэну, Ты хутчэй ідзеш скрозь позіркі. Прысутных няма. Рухі Тваіх ног такія, што ў назіральнікаў узьнікае думка, што яны скіраваныя да саміх сябе, што Ты ня ў стане неяк удзельнічаць у іхным поступе. Калі Ты азірнешся, гэта азіраньне павінна выглядаць для назіральнікаў так, быццам Ты сплянаваў гэта Сабе праз пэўную колькасьць крокаў. Калі Ты ішоў, Ты ні разу не адарваў вачэй ад сваіх ідучых ног. Ты азіраешся, як нехта, хто шукае на вялікім абсягу нейкі цень. Твая вопратка простая. Яна не павінна прыцягваць да сябе ўвагу гледачоў. Ты маеш на сабе кашулю без каўнерыка, як зьняволены альбо сялянін. Мала часу прайшло, як Ты прыйшоў. Што Ты ішоў даўно, да назіральнікаў ужо неяк дойдзе. Больш ім ня трэба ведаць. У Цябе цяпер ёсьць заданьне — за гэты кароткі адцінак часу, у які Ты будзеш ім бачны і які Ты можаш абмерыць згодна з Тваімі крокамі, адставіўшы вялікі палец ад указальнага, паказаць ім бязьмерна вялікі прамежак, які прайшоў ад Твайго першага бачнага ім руху да Твайго ўпынішча, зь якога Ты азіраешся. Будзе недастаткова паказаць сябе такім, які, ня маючы кепскіх прадчуваньняў, раптам быў ахоплены зьнядужанасьцю, зрабіўшы выгляд, што згодна з народным павер'ем Ты сеў і плюнуў, так сказаць, ад таго, што закалола ў баку, на камень, які Ты выкапаеш Сабе з дарогі. Ты ня маеш у наяўнасьці нічога, апрача Свайго твару і Сваіх жэстаў. Твой голас, якім Ты мог бы ім гэта сказаць, маўчыць. У тую хвіліну, калі Ты пайшоў, прайшло паўдня. Гэта тое, што павінны ўцяміць іншыя. За паўдня адмяняецца сьвятло і вецер. Адмяняецца дарога. Адмяняюцца цені таго, што ўзвышаецца над зямлёй. Толькі ўласную зьмену можаш Ты паказаць назіральнікам. І

наадварот, у хвіліну, калі Ты ім бачны, з Табой не адбылося нічога, апрача таго, што Ты ім прадэманстраваў. Гэтага замала, калі Ты кладзеш руку на вочы і азіраешся на дванаццаць крокаў, якія ты зрабіў перад імі. Гэтага недастаткова, зрабіць выгляд, што Ты ня можаш перастаць глядзець. Яны хоць і зразумеюць, што Ты маеш на ўвазе, і яны дадуць сябе пераканаць Тваімі жэстамі, што ім трэба павялічыць колькасьць крокаў, але яны не зразумеюць, колькі часу ўжо прайшло. Гэта ня дойдзе ім да сэрца. Каб паказаць ім гэта, Табе патрэбен будзе цуд, альбо вялікае майстэрства прамоўцы, альбо заклён, якім Ты зможаш заклясьці іхныя вушы. Аднак трэба, каб Ты маўчаў. Недастаткова будзе зьмяніць хаду Тваіх ног, недастаткова будзе зьмяніць твар і зіхцець вачыма, недастаткова будзе млява зьвесіць рукі з плячэй. У Цябе няма асьвятленьня, каб магчы зрушыць Твой цень. Табе не ўдаецца стварыць уражаньня, што Ты ад стомы зморшчваешся і ўрастаеш у зямлю. Ніякім жэстам альбо мінай Ты ня зможаш зьберці ў адно раздадзены час. Што б Ты ні рабіў, гэта было б лялечным тэатрам. Але калі Ты сам гуляеш у такую гульню, то Цябе высьмеюць — акурат як у тым выпадку, калі б Ты захацеў паказаць хаду часу тым, што Ты як храномэтар нясеш перад Сабой Сваю далонь, на якой Ты ўжываеш палец другой рукі як стрэлку, у той час як гледачы маюць перад вачыма нябачныя кропкі, якія азначаюць лічбы, і Твой палец, які зрушваецца з кожным крокам. У Цябе дванаццаць крокаў, якія адпавядаюць дванаццацём гадзінам. Цяпер стрэлка вярнулася ў тую кропку, зь якой пайшла. Адначасна Ты спыніўся і памкнуўся супачыць на ўзбочыне. Але цуд, які патрэбен Табе, каб давесьці гледачам, што такое час, замкнёны ў Цябе ў роце. Твой голас маўчыць. І надалей Твой голас будзе маўчаць. Шум, які прымушае Цябе пасярод руху, у якім Ты разьмяшчаешся, прыслухацца, ты прадказваеш, падымаючы наўкасяк галаву “як сьляпы”. Дарога пясчаная і размытая. Толькі выбоіны ад павозак засыпаныя друзам. Гледачам няма патрэбы больш дакладна тлумачыць, што гэта за шум, які Ты цяпер чуеш. І тое, што Ты бачыш, застаецца для іх невядомым. Толькі паводле Твайго выразу твару яны павінны здагадацца, што нешта зьмянілася. Ты прыйшоў у другое мястэчка. Яно зьмянілася. Ты бачыш перад сабой пясчаны кар’ер з пучкамі травы на стромах, зь якіх цёмна аддзяляюцца пясчаныя павалокі і хмаркамі пылу

рассыпаюцца на выгарэлых да сьветла–шэрага колеру адхонах. Тое, што Ты чуў, магло б быць якраз шапаценьнем гэтых пясчаных павалок, калатнечай друзу альбо грукатаньнем і бухканьнем гэтай сыравіны ў сіце, якое ўнізе на дне кар'ера трасе распрануты да пасу мужчына. Ты параўноўваеш сам сабе гэты гук з гукам, які ўзьнікае, калі народ у царкве падымаецца з лаваў. Мужчына якраз робіць апошні рух рукой, замыкаючы прылады працы ў драўлянай будцы. Ён перакідвае кашулю цераз плячо і тупае да Цябе. Калі мужчына раптам кідаецца бегчы, Ты бачыш паміж зьліплымі ад поту валасамі на галаве і ідучымі нагамі пасоўваньне тулава і пад ім зьлева і справа падскокваючыя ўверх калені. Табе ня трэба нікому тлумачыць, што Ты сядзіш каля пясчанага кар'ера і назіраеш бег мужчыны. Табе толькі трэба паказаць на Сабе стан жаху, які прымушае Цябе ўскочыць і даць мужчыну дарогу. Твой твар павінен быць люстрам мужчыны, якое застаецца для гледачоў па–за полем бачнасьці. Аднак Ты паказваеш не мужчыну, а ягоны жах. Ты найлепш разумееш гэты жах, выдумваючы на другім краю кар'еру дрэва, якое мае пад гузам першага сука дупло велічынёй з галаву. "Дрэва сонна пазяхае з дупла". Ты застаешся там, дзе Ты ёсьць цяпер. Табе ня трэба капіяваць жэсты і рухі мужчыны. І гледачы застаюцца на сваіх мясцох. Твая задача толькі перадаць ім Твой жах, альбо жах мужчыны, альбо наогул нейкі жах. І Свой твар Ты ўжываеш толькі на пачатку. Пералічваць паасобныя міны значыла б дарма губляць час. Адказ твару на тое, што Ты бачыш і чуеш, дадзены Табе ад нараджэньня. Ты яшчэ паглядзіш на дрэва ўласнымі вачыма, быццам пад ім быў засень, якую Ты шукаеш, каб знайсьці Сабе спакой. Ты яшчэ не пусьціў у ход Свой твар. Гледачы павінны адчуць сябе ў поўнай бясьпецы, каб Ты мог пазьней засьпець іх зьнянацку. Відавочна, Твае намеры яшчэ мірныя, хоць Цябе нешта чакае. Але потым Ты зірнеш на дрэва іншымі вачыма. Міны на Тваім твары пярэйдуць адна ў другую. Цяпер Ты зразумеў, пра што ідзе гаворка. І тым, хто глядзіць, ты па чарзе прапануеш Свой жахлівы позірк. Ты ўскокваеш. Ты ўскочыў. Ты стаіш. Ты паказваеш, што Ты не патрапіш уцячы. Што мужчына збоку спаўзае па адхоне, моўчкі і мулка забіваючы рукі і ногі аб сыпкі друз, — гэта Табе ня трэба паказваць. Другім ня трэба ведаць, што адбываецца. Пры гэтым Табе ня трэба думаць. Табе застаецца толькі крышку ўвесьці іх у зман. Аднак Ты не павінен

выпадаць з Сваёй ролі. Як стаіш цяпер на каленях, так і стой. І міны тых, хто глядзіць, застануцца такімі самымі, якімі кагадзе былі. Ты ўвасабляеш чаканьне чалавека, які кленчыць і які ня вернецца больш з адхону. Нешта блізкае ёсьць у яго з тым, што ў Цябе, і на ім з тым, што на Табе. Ніякі рух не скаланае яго болей. Ён — адна з камлыгаў пяску, на якую другія глядзяць і здранцьвеюць ад таго, што ён зноў і зноў сасквае са стромы, хаця ён і надалей застаецца нерухомы. Ты стрэлка электрычнага гадзіньніка, ад павароту якой гледачы дранцвеюць так, што ў іх ажно запальваюцца вочы. Ты дасьледуеш і вызукаеш момант ад аднаго канца Твайго нерухомага цела да другога. У цябе нават не засталося для Сябе цішыні ветру. Калі б Ты пачаў гаварыць і пры гэтым рухацца, то гэта б зьдзеялася. Калі б Ты маўчаў, Ты мог бы ацалець. Але калі Ты маўчыш, ніхто з гледачоў ня будзе ведаць, што Ты ім паведамляеш. Аднак калі Ты гаворыш і варушышся, Твае словы загубяць цябе.

Узьнікненьне гісторыі

Яго абыходзіць толькі тое, што ён ня ведае. Тое, што ён ведае, яго не абыходзіць. Калі ён пра што–небудзь хоць і ведае, але ня можа даведацца, што гэта такое і якое яно, то ён адчувае цягу даведацца. Недасяжнае надзіць. Надзіць і тое, чаго нібыта можна дасягчы. Часам яго надзіць толькі непраходны шлях, які апісаны ў кнізе. У аддаленых мясцовасьцях, дзе адбывалася гэтая дзея, некаторыя дарогі падобныя да тайных сьцежак, хай сабе згодна з вуснымі паданьнямі па іх раней і праходзіла армія. Новым для ягоных вушэй было рыпеньне крокаў па мокрым пяску. Калі яго не падманвае памяць, у кнізе апісваецца, што напярэдадні ўночы выпаў дождж ці сьнег. Аднак ён больш ня ведае, як прыйшоў да гэтае кнігі. Тое, што ён ад яе цяпер чакае, здаецца, адкінута і перайначана сучаснасьцю; пратаколы ў ягонай сьвядомасьці сканфіскаваныя, прысуд той кнізе, можна яе чытаць альбо не, скасаваны, тым, што ён забыўся фармулёўку прысуду. Між тым ён не сумняецца, што ён калісьці даўно чытаў гэтую кнігу; такім чынам, паколькі ён яе чытаў, то немагчыма, каб ён на той час ужо быў пазбаўлены зроку; адно што яго мучаюць сумневы

наконт падзеяў, якія адбываліся ў кнізе. Ён пачынае з апісаньня дарогі, на якой мужчына з сваім сынам заняты пошукамі зьніклага брата. Чаравікі, як было сказана, рыпяць у вільготным альбо яшчэ мокрым пяску пасьля дажджу, так, пасьля дажджу. Вечар. Ён ня можа памыліцца ў часе, бо згадвае адзін сказ з тых, пры дапамозе якіх паміж абодвума, пакуль яны ідуць, адбываецца гаворка пра колер дамоў. Тынкаваныя сьцены сьвецяцца бы перад навальніцай, у той час як навакольле ўжо спавіта сутоньнем. З другога боку, яму кідаецца ў вочы, што дарога, якой ідуць абодва, гэта нейкая горная альбо ўзбочная сьцежка, наўсьцяж парослая ляшчынаю; зь лісьця кустоў, калі яны працягвалі рукі, ліліся кроплі. Абодва маюць намер падрэзаць гэтай сьцежкай дарогу. Аднак ня можа быць, каб яны ў часе пошукаў бачылі дзе–небудзь дом; самі кусты непразрыстыя; гэтая мясцовасьць паўсюдна лічыцца малазаселенай, на адзін квадратны кілямэтар у сярэднім прыпадае ня больш за дваццаць чалавек, на гэтым ідуць, мабыць, адно гэтыя два. Таму ў згаданым месцы кнігі не магло быць гаворкі пра колер дамоў. Калі абодва яны гавораць не пра бліскучы колер дамоў, то гэта, мабыць, ня вечар; ён толькі напэўна ведае, што іхныя падэшвы рыпелі ў мокрым пяску, другое ў яго выпала з памяці.

Кніга апавядае пра двух братоў, адзін зь якіх пазьней, калі ён адзін шукаў зьніклага другога, сьлепне; з аповеду не зусім зразумела, з–за якой падзеі сьлепне хлопчык; адно што шматкроць гаворыцца, што ўведзена ваеннае становішча; аднак больш дэталёвых дадзеных пра няшчасьце няма, альбо ён іх забыўся. Аўтар выходзіць з таго, што сьляпы, калі ён ужо стаў дарослым, адной нядзелі прачынаецца, і нешта, што ён болей ня можа агарнуць думкамі, нагадвае яму пра ягонага адсутнага брата. З гэтага часу ў ягоных мазгах месцы, пра якія ён, як яму здаецца, успомніў, хаатычна пераскокваюць. Ува ўсялякім разе, для сьляпога мае значэньне прыбыцьцё аўтобуса ў мястэчка, каля якога ён жыве супольна з сваім яшчэ жывым бацькам і другой бацькавай жонкай, якую пасьля адбытага напярэдадні гэтага заканчэньня вайны “прыбіла” ў гэтую мясцовасьць. Падзеі гэтае нядзелі адпавядаюць падзеям у той дзень вайны, калі яго апанавала сьлепата, аднак ня ў вонкавых праявах і ня ў жэстах, а ў супадзеньні таго, што напаткала сьляпога, з тым, на што ён натыкнуўся аднойчы, прычым звонку першае не

падобна да другога. Складваецца так, што пэўныя рэчы яшчэ больш узмацняюць у сьляпога падазрэньне, што ад яго нешта хаваюць; не дае зьбіць сябе з панталыку і тады, калі ў адным месцы апісваецца ліст, які ў бацькавай жонкі выпадае з сукенкі; калі ён пытае, а на ягоныя пытаньні адказваюць відавочнай хлусьнёй альбо і наогул маўчаньнем, ён прымае хлусьню за прызнаньне; маўчаньне папытаных у шмат якіх месцах ён прымае за пацьверджаньне.
Падрабязнасьці дзеяньня выпалі зь ягонай памяці. Ён выбудоўвае перад сабой у асноўных рысах гэткі плян, які яму яшчэ падаецца верагодным. Толькі канец ён прыблізна запомніў і захаваў. Сьляпы ляжыць стомлены ў сваім пакоі на ложку і размаўляе сам з сабою, нешта сабе камбінуючы альбо ўяўляючы. Хто сьляпы, той нябачны. У замежных мовах як для таго, хто сьляпы, так і для таго, хто нябачны іншым, ужываецца адно і тое ж слова. Ніхто ня можа бачыць яго звонку, таму што ён сьляпы. Ніхто ня бачыць твару сьляпога ў люстры; калі перад люстрам стаіць асьлеплены, то перад люстрам не стаіць нікога. Акно ягонага пакою адбівае звонку тое, што ёсьць вонкавым; хто хоча зазірнуць унутро звонку (знутры), мусіць, падышоўшы ўсутыч да шыбы, глядзець праз уласны твар, каб убачыць сьляпога ўнутры. Пры гэтым яму нельга забывацца на адкрытую яму для вапны пад акном. Нябачны можа быць у тых мясцох, у якіх яму заманецца, абавязкова не трапляючы нікому на вочы. З другога боку, нябачны не сьляпы; што ён хоча бачыць, тое ён бачыць; калі ён бачыць. У яго ёсьць другі твар, якім ён можа бачыць далёка ў прасторы. І сьляпы можа бачыць, што ён хоча; паколькі ён нябачны, то яму ніхто не замінае пазіраць. Аднак ён ня можа бачыць, што будзе ў будучым; ён ня можа прадбачыць і сказаць загадзя, што пачнецца і што будзе. Яго гэта і не турбуе. Ён трымаецца за тое, што ён да таго і таго часу і так далей даведаўся і даведваецца. У шматлікіх паданьнях менавіта сьляпы гэта відушчы. Відушчы сьляпы. Аднак той, хто ляжыць у пакоі на лежаку, задавальняецца тым, што адносна таго, што сьпярша займала яго, яму наперад нічога не абвяшчаецца і ён не зважае ні на што, нават на ўласнае мысьленьне; ён думае пра тое, што здарыцца тое, што збудзецца або не як у іншых людзей; ён потым паставіць пад гэтым свой подпіс. Ён задавальняецца тым, што ён выдумляе, нават калі яно губляе сілу праз пазьнейшую прыдумку; тым,

што ён сабе нешта выдумляе, ён можа сьцьвердзіцца.
На гэтым месцы ўспамін пакідае яго. Прынамсі, з таго часу нічога не дадалося; сьляпы ляжыць у сваім пакоі і разважае. Ён робіць самога сябе значным, адкашляўшыся і соваючы пальцамі нагі туды–сюды па сьцяне каляндар альбо рэпрадукцыю; злоўленая ў павуціньне сіняя муха дзынкае і брынкае па не зусім шчытна зачыненым акне. Ён забыўся нават пра месца і пару года, у якую адбывалася падзея. Паколькі ён хоць і ня ведае болей ўсяго гэтага, але пэўны ў тым, што калісьці чытаў гэтую кнігу, яго з гэтае нагоды даймае жаданьне ведаць. Гэта вывела ягоныя думкі ў далёкі шлях. Аднак ягоныя згадкі ня маюць імпэратыўнай сілы; таму, што ён выдумаў, няма патрэбы быць праўдзівым, у тым сэнсе, што яно праўдападобна адпавядае падзеям кнігі; яму неабходна быць толькі магчымым і імаверным, таму што яно праўдападобнае само па сабе; фальшывае ненатуральнае выказваньне было б аспрэчана і адпрэчана досьведам. Чаго ён ня можа ўзгадаць напэўна — гэта як яго кінула ў жар. На адной з апошніх старонак, так яму здаецца, гаворыцца, нібыта сьляпы падыходзіць да акна і нейкім чынам вызваляецца ад “жахлівага” звону мухі; аднак гэтая думка малапрыцягальная, бо ён моцна прывязаны сваёй стомай да ложка, так што нельга паверыць, што ён здольны рухацца з гэтага месца ў другое. Ужо мала што можа датычыць сьляпога. Прыедзе апошнім аўтобусам брат ці не прыедзе — гэта яму ўжо ня помніцца. Нечакана кніга заканчваецца апісаньнем вячэры: сям’я есьць неразагрэтым тое, што засталося ад абеду. Сын знаходзіць у сваёй талерцы мурашку з крыламі. “Ноч не паддаецца ніякаму апісаньню”.

Сыход успаміну

Зноў яшчэ адзін раз я бачыў, як брат ішоў заільдзелым засьнежаным полем. Паверхня сьнегу на працягу дня часта натайвала на сонцы; мароз наступнае ночы пакрые засьнежанае поле слоем лёду; сонца, якое прыходзіць сьледам, у некаторых мясцох разьмякчае слой з шэранем у рыхлы наст. Той, хто ідзе засьнежаным полем, будзе зважаць, каб ісьці бязь цяжару, улегцы; пад настам слой лёду яшчэ цьвёрды. Ён будзе глядзець на тое, каб ня выбіцца са зладжанай хады рухаў, якай ён пачынаў ісьці. Калі ён саб’ецца з кроку, гэта з часам будзе азначаць правал; як ён падладжваўся ісьці, так ён прыладжаны

цяпер працягваць хаду. Спыніцца — і раптоўна прыслы цяжар праваліць яго праз слой лёду; саб'ецца на бег — і тады сіла крокаў праломіць ільдзяное покрыва. Каб цяжар цела быў аднолькавым ува ўсіх мясцох, ён, перад тым як ісьці, скіне зь сябе ўсе свае цяжары: буракі, школьную сумку, марацкую кайстру. Першыя крокі пакідаюць на шэрані толькі пляскаты адбітак ягонага чаравіка. Ён улавіў чарговасьць рухаў, якія выведуць яго да дома. Калі яго клічуць, яму нельга спыняцца і адказваць. Калі я гукнуў яму, ён спыніўся. Калі ён выцягнуў левую нагу, увалілася правая. Калі ён выцягнуў правую нагу, увалілася левая. Калі ён пачаў бегчы, то ўваліўся абедзьвюма. Пад покрывам лёду — сьнег з густога пылу.

Пераклаў зь нямецкай Яўген Бяласін паводле: Peter Handke. Die Hornissen.
© Suhrkamp Verlag. Frankfurt am Main, 1966.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.gis.com.by

[image][image][image][image][image][image][image][image][image][image][image]
Паталёгіі ў ARCHE 4(5)-1999 [image]

да ЗЬМЕСТУ да Пачатку СТАРОНКІ

E-mail рэдакцыі: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Чакаем вашых мэйлаў з пытаньнямі або камэнтарамі наконт гэтага сайту
Copyright © 1999 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 28-11-1999